ARCHE Зьмест № 1-2’06

1. Зьмест / Уводзіны
2. Віталь Сіліцкі. Выбары навыварат.
3. Выбары ў сатрапіі.
4. Іван Красцеў. Імперская Расія рыхтуе рэванш.
5. Сяргей Прозараў. Расійскі кансерватызм за Пуціным: пашырэнне гегеманісцкага дыскурсу.
6. Ёжэф Бёрач, Магуа Саркар. Што такое Еўрапейскі Звяз?
7. Андрэй Казакевіч. «Druvis»: праект балцкае ідэнтычнасці.
8. Даніла Жукоўскі. Крытэр дызеля.
9. Пётра Рудкоўскі. Ад ідэнтычнасьці да саборнасьці. Пару зацемак з нагоды дыскусіі вакол беларускай тоеснасьці.
10. Павал Усаў. Ці можа дзяржава існаваць без людзей? Новыя хітрыкі дзяржаўных ідэолагаў.
11. Анатоль Сідарэвіч. Антон Луцкевіч: ад краёвасьці да незалежніцтва (1916-1918). Агляд крыніцаў
12. Беларусь перажывае бурнае нацыянальнае адраджэнне пад уплывам камуністаў
13. Андрэй Хадановіч. Уладзімер Караткевіч і філязофскі камень.
14. Андрэй Катлярчук. Падарожжа ў сэрца Літвы.
15. Гаралд Пінтэр. Каханак.
16. «Клішэвіч у Нью-Ёрку на свае ліфцёрскія заробкі купіў томік гэтага вершаруба і даслаў мне». Размова з Янкам Сіпаковым.
17. Югася Каляда. Пакаленьне «Нуль».
18. Юры Пацюпа. Куды вядзе лёгіка балцкага аўтахтанізму?
19. Янаў Палескі. Прыгоды двайной прапіскі ў ансамблі дылемаў.
20. Алена Гапава. Міфы пра міфы беларускай сацыялогіі.
21. Фрагмэнты абмеркаваньня аналізу Андрэя Казакевіча...
22. Дзмітры Плакс. Пра «Дойчэ Вэле», хаос дэмакратыі і парадак смерці.
23. «Як ты адзін – ты больш за аднаго»
24. Павал Абрамовіч. Гутарка пад Вострай Брамай.
25. Сяргей Шыдлоўскі. Беларусь як раман.

26. Зьміцер Серабракоў. Нарцысізм ідэалёгіі.
27. Даніла Жукоўскі. Scripta manent.
28. Аксана Бязлепкіна. Дакторка Югася, альбо Як здабыць літаратурную нішу.
29. Віктар Корбут. Сыны і пасынкі ВКЛ.
30. Сяргей Шыдлоўскі. Больш, чым горад.
31. Францішак Корзун. Скразная лёгіка бабкоўскага будызму.

Мінарыя (9’2000)

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image]-[image]**2006**

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

[image]

З ь м е с т

C o n t e n t s

АНАЛІТЫКА

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Выбары навыварат

Круглы стол. **ВЫБАРЫ Ў САТРАПІІ**

ІВАН КРАСЬЦЕЎ Імпэрская Расея рыхтуе рэванш

СЯРГЕЙ ПРОЗАРАЎ Расейскі кансэрватызм за Пуціным: пашырэньне гегеманісцкага дыскурсу

ЁЖЭФ БЁРАЧ, МАГУА САРКАР Што такое Эўрапейскі Зьвяз?

КРЫТЫКА

АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ «Druvis»: праект балцкае ідэнтычнасьці

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Крытэр дызэля

ПЁТРА РУДКОЎСКІ Ад ідэнтычнасьці да саборнасьці. Пару зацемак з нагоды дыскусіі вакол беларускай тоеснасьці

ПАВАЛ УСАЎ Ці можа дзяржава існаваць безь людзей?

ГІСТОРЫЯ

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ Антон Луцкевіч: ад краёвасьці да незалежніцтва (1916-1918)

ІРЫНА РАМАНАВА Беларусь перажывае бурнае нацыянальнае адраджэньне пад уплывам камуністаў. Акадэмічная канфэрэнцыя 1926 г. у галасох відавочцаў

ЭСЭІСТЫКА

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ Уладзімер Караткевіч і філязофскі камень
АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК Падарожжа ў сэрца Літвы

ЛІТАРАТУРА

ГАРАЛД ПІНТЭР Каханак
«Клішэвіч у Нью-Ёрку на свае ліфтэрскія заробкі купіў томік гэтага вершаруба і даслаў мне». Размова зь **ЯНКАМ СІПАКОВЫМ**
ЮГАСЯ КАЛЯДА Пакаленьне «Нуль». Пяць апавяданьняў

ПАЛЕМІКА

ЮРЫ ПАЦЮПА Куды вядзе лёгіка балцкага аўтахтанізму?
ЯНАЎ ПАЛЕСКІ Прыгоды двайной прапіскі ў ансамблі дылемаў
АЛЕНА ГАПАВА Міты пра міты беларускай сацыялёгіі
Фрагмэнты абмеркаваньня аналізу Андрэя Казакевіча «Арыенталізм, або Некалькі заўваг пра «казус Беларусь»
ДЗЬМІТРЫ ПЛАКС Пра «Дойчэ Вэле», хаос дэмакратыі і парадак сьмерці
ПАВАЛ АБРАМОВІЧ «Як ты адзін – ты больш за аднаго»

РЭЦЭНЗІІ

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Гутарка пад Вострай Брамай
СЯРГЕЙ ШЫДЛОЎСКІ Беларусь як раман
ЗЬМІЦЕР СЕРАБРАКОЎ Нарцысізм ідэалёгіі
ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Scripta manent
АКСАНА БЯЗЬЛЕПКІНА Дакторка Югася, альбо Як здабыць літаратурную нішу
ВІКТАР КОРБУТ Сыны і пасынкі ВКЛ
СЯРГЕЙ ШЫДЛОЎСКІ Больш, чым горад
ФРАНЦІШАК КОРЗУН Скразная лёгіка бабкоўскага будызму

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/30
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image][image]2006

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Віталь Сіліцкі Выбары навыварат Дэманстрацыя адзінства народу і тыраніі прызначана на сакавік

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ палітэканом. Яго апошні аналіз у «ARCHE» меў назву «Карані і мэтады постсавецкай віртуальнасьці» (6/2005).

Заява, што наступныя прэзідэнцкія выбары адбудуцца ўсё ж увесну, а не ў ліпені, заспела беларускае грамадства ў сярэдзіне снежня. Варта было прайсціся па заснежаных менскіх вуліцах, каб зразумець усю «фішку» гэтага кроку ўладаў – перадсвяточны настрой, неўзабаве студэнцкая сесія і традыцыйны беларускі «рамадан» навыварат – гэта калі амаль месяц, з 25 снежня да 14 студзеня, сярэднестатыстычны беларус не расстаецца з чаркай ды скваркай. Каб высветліць, як ён будзе ставіцца да зборшчыкаў подпісаў, а таксама як збіраць тыя подпісы з каляднага бадуна, трэба зладзіць нейкі брутальны эксперымент – а там да здачы подпісаў якіх два тыдні...

Зроблена сапраўды элегантна і, здаецца, па законе. Элегантнасць, вядома, псуецца прыняццём вядомых паправак

да Крымінальнага кодэксу, але ж факт застаецца фактам: адным нескладаным прыёмам уладзе ўдалося звесці драматызм прэзідэнцкіх выбараў да трагікамедыі. Дарэчы, я ўжо ў першыя два дні пасля 16 снежня пачуў ад некаторых сяброў, якім Лукашэнка вельмі не даспадобы: «І дзякуй Богу, хоць раней адмучаемся...»

Ва «ўшчамленні», як нехта выказаўся, правоў прэзідэнта ёсць пэўны сімвалічны аспект: яшчэ адна акалічнасць беларускага жыцця шчыльна прыблізілася да савецкіх часоў. Мы зноў, як і калісьці, пойдзем галасаваць ранняй вясной. Камуністычным уладам так было зручней – не трэба было ламаць галавы, як забяспечыць яўку ўсіх адпускнікоў і дачнікаў. Дарэчы, летам, як правіла, зрываецца з месца і раз'язджаецца той электарат, які традыцыйна лічыцца апазіцыйным. Калі б у беларускіх выбарах была нейкая інтрыга, малаверагодна, што такі перанос адбыўся б. А калі перш за ўсё патрэбна яўка, то гэта зноў-такі нагадвае дэманстрацыю адзінства народу і партыі...

У прынцыпе, аднак, нечаканасцю падобны перанос выбараў стаў хіба што для некаторых фігур у перадвыбарным штабе адзінага прэтэндэнта ад апазіцыі. Чуткі аб выбарах у сакавіку распаўзаліся на працягу некалькіх месяцаў. Вядома, было моцнае падазрэнне, што гэта нейкая дэзінфармацыя, але магчымасці такога развіцця падзей ніколі нельга было скідаць з рахункаў. А можа, сапраўды не важна, гатовая апазіцыя ці не?

Усё ж такі, перанос выбараў немагчыма растлумачыць выключна выбарчай драматургіяй, памкненнем уладаў «зрабіць усё прыгожа». Сапраўды прыгожа было б з адкрыццём падземнага цэнтра на пляцы Незалежнасці і Нацыянальнай бібліятэкі, правядзеннем саміту СНД у траўні, грандыёзнымі святамі на 9 траўня і 3 ліпеня, «Славянскім базарам» і іншым, што цяпер замест складнікаў перадвыбарнай кампаніі Лукашэнкі, відаць, стане часткамі яго працяглай інаўгурацыі...

А калі справа не ў драматургіі, то ў чым? Ці значыць гэта, што ў выбарах застаецца нейкая інтрыга, ці, прынамсі, што ўлады чагосьці баяцца? Баяцца яны сапраўды шмат чаго, і нават гэтага не хаваюць. Колькі б ні заяўлялі незалежныя аналітыкі, што рэжыму асабліва нічога не пагражае, на працягу 2005 года

мы толькі і бачылі прыгатаванні на «апошні і рашучы». І не дарма. Калі ўлада Лукашэнкі мацавалася, з боку апазіцыйнай інтэлектуальнай супольнасці ўвесь час чуліся прадказанні яе хуткага калапсу. А цяпер гэтыя галасы раптам загаварылі пра яе стабільнасць і непахіснасць. Хлусяць, значыць, нешта тут не так... Дык чаго ж баяцца?

Магчыма, уздыму папулярнасці адзінага прэтэндэнта ад апазіцыі. Беручы пад увагу той факт, што апазіцыя бадай упершыню ў сваёй гісторыі пачала рыхтавацца да кампаніі загадзя і збольшага пісьменна (робячы ўпор на паездкі ў рэгіёны, а не ў замежжа). Цяпер жа апазіцыя апынулася ў цэйтноце. Аднак, па-першае, чатыры месяцы – гэта ж тэарэтычна і дадатковы час для таго, каб стварыць з асобы Мілінкевіча сапраўднае пудзіла да электарату. Па-другое, у той час, калі ў Беларусі яшчэ існавала магчымасць атрымання непадкантрольнай дзяржавай інфармацыі аб грамадскай думцы што да выбараў, было відавочна, што пасля веснавога авітамінозу народ робіцца больш лагодным да ўлады, больш гатовым яе падтрымаць... Дык што справа, бадай, не ў рэйтынгах.

Магчыма, узніклі нейкія сумненні ў надзейнасці падтрымкі Крамля? Ды не, цяпер гэтая падтрымка гарантаваная Лукашэнку як ніколі. Расійская эліта, таксама як і Лукашэнка, знаходзіцца пад моцным уздзеяннем аранжавага сіндрому, і нікуды ён да ліпеня не сыдзе. Іншая справа, што ў кантэксце газавых войнаў Масквы з суседзямі для «беларускага лідэра» зноў склалася вельмі спрыяльная замежнапалітычная кан'юнктура. Як і ў верасні 2004 года, калі можна рабіць любыя захады, не асабліва забіваючы сабе галаву тым, як павядзе сябе Крэмль. А што да травеньскага саміту васьмёркі ў Маскве – дык некаторыя беларускія і заходнія аналітыкі перабольшваюць важнасць гэтай падзеі. Ну збяруцца, паразмаўляюць. Ну, можа, хто з гасцей Пуціна (адзін-два) і выкажацца пра Беларусь. І што? Адкажа ім Пуцін, што Беларусь – суверэнная краіна, а на парадку дня гэтага пытання няма. І пачнецца зноў абмеркаванне тэмы міжнароднага тэрарызму.

Што да Расіі, то зазначым таксама, што бліц-візіт Лукашэнкі да

Пуціна напярэдадні абвяшчэння выбараў чарговы раз мусіць чамусьці навучыць як тых, хто бачыць у беларускім прэзідэнту латэнтнага Пазьняка, дый тых, хто ўсё яшчэ верыць, што Масква калі-небудзь будзе гуляць супраць яго. Лукашэнка сам расставіў усе кропкі над «і», прадэманстраваўшы, што падтрымка Расіі яму неабходна, і тое, што нікуды яна ад яго не дзенецца...

Застаюцца прошукі заходніх экспарцёраў рэвалюцыі, аб якіх так шмат кажа афіцыёз. Тут ужо ўдар нанесены канкрэтны і адчувальны. Аднак тое, што простым пераносам выбараў можна «вырубіць» гэтую пагрозу, сведчыць, што пагроза сама па сабе таксама мінімальная. Злобныя ворагі, якія спяць і мараць аб тым, каб скінуць Лукашэнку – гэта насамрэч вялікая і непаваротлівая бюракратыя, гара, якая нараджае мыш. Вось сказалі год таму, што выбары будуць у ліпені – вось яны і працуюць на ліпень. Размовы пра залатыя горы, якія праліліся на галаву апазіцыі – не больш чым казкі. Канечне, да ліпеня штосьці магло б разгарнуцца. Але праца ў такім, скажам, бюракратычна-прымусовым рэжыме толькі пацвярджае, што разгарнулася б зусім не шмат. Вось Беларусь атрымала ад Расіі палёгку ў выглядзе старой цаны на газ, што можна вымераць сотнямі мільёнаў долараў (калі параўноўваць з цэнамі для Украіны ці нават Закаўказзя). А Еўрасаюз яшчэ месяцамі, а то і гадамі будзе абмяркоўваць выдзяленне двух мільёнаў для незалежных медыяў (і што можна зрабіць на два мільёны)? Дык ці гэта сапраўды пагроза?

(Працягваючы тэму вонкавых пагроз, заўважым яшчэ адну акалічнасць, што прызначэнне выбараў на сакавік цалкам адсекла ад беларускіх выбараў Украіну. Канечне, аранжавых актывістаў можна было элементарна не пусціць у Беларусь альбо, упусціўшы, усіх пасля паарыштоўваць, аднак так выйшла яшчэ больш надзейна.)

Аднак, усё вышэйсказанае – гэта спроба аб'ектыўнага аналізу, памкненне разабрацца ў тым, што ёсць насамрэч. Але ёсць яшчэ рэчаіснасць, якая існуе ў галовах. Вось забілі ў галаву абывацелю, што на апазіцыю ліюцца залатыя рэкі з Захаду – і ён ставіцца да апазіцыі адпаведна, што б яму ні казалі

насуперак. Падавай інфармацыю штодзень на Карла Маркса, 38 аб тым, што рыхтуецца рэвалюцыя – і там будуць весці сябе адпаведна. Ва ўмовах, калі рэальныя палітычныя пагрозы для ўлады ліквідаваныя, страх выклікае ўжо само няведанне таго, чаго цяпер баяцца. Ірацыянальным такі страх назваць цяжка. Сапраўды, яго галоўнае наступства – гэта татальная мабілізацыя ўлады на барацьбу з вонкавымі і ўнутранымі ворагамі, якая дазваляе знішчаць крамолу, вальнадумства і пагрозы, сапраўдныя ды міфічныя, у зародку.

Аднак страх мае і свой адваротны бок. Яго наяўнасць увесь час гаворыць грамадству, элітам, апазіцыі простую рэч: што ўлада чагосьці баіцца, што яна не ўпэўненая да канца, што нават пры ўсёй ейнай вонкавай стабільнасці і непахіснасці яе можа чакаць крах. Улада Лукашэнкі аб'ектыўна будзе мець канец – сістэмы, заснаваныя на бязмежнай уладзе аднаго чалавека (нават калі ён сапраўды карыстаецца падтрымкай у народу) амаль ніколі не маюць працягу, калі гэты чалавек сыходзіць. Жыццё пасля Лукашэнкі калі-небудзь і надыдзе. Вядома, не сёння і не заўтра. Але ж кожны год, кожныя выбары, нават сакавіцкія, няўхільна набліжаюць гэты дзень. Пакуль што ўлада ў стане ліквідаваць любыя пагрозы для сябе. Але пры створанай сістэме ёй, як сапёру, дастаткова памыліцца адзін раз, каб гэты дзень надышоў.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/15
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image][image]2006

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Выбары ў сатрапіі

Чым тлумачыцца беспрэцэдэнтная жорсткасьць улады? І ці вечная слабасьць апазыцыі?

У круглым стале ў Рэдакцыі бралі ўдзел **Валер Булгакаў**, рэдактар «ARCHE», **Вера Гаўрыльчык**, палітоляг, **Тацяна Вадалаская**, сацыёляг, супрацоўніца Інстытуту сацыялёгіі НАН Беларусі, **Андрэй Дынько**, рэдактар тыднёвіка «Наша Ніва», **Мікола Кацук**, сацыёляг, супрацоўнік Інстытуту сацыялёгіі НАН Беларусі, **Сьвятлана Мацкевіч**, экспэрт у галіне адукацыі, **Уладзімер Мацкевіч**, палітоляг.

Валер Булгакаў: Чаму рэжым так беспрэцэдэнтна жорстка паводзіў сябе пры канцы 2005 году? Украінская рэвалюцыя гэтак налякала яго ці на тое ёсьць іншыя прычыны? У якім стане незалежнае грамадзтва выйдзе з прэзыдэнцкіх выбараў 2006 году? Ці ня будзе зьнішчаны фундамэнт для яго існаваньня ў наступную пяцігодку? Вось якія пытаньні мы выносім на сёньняшні круглы стол.

Уладзімер Мацкевіч: Улады дзейнічаюць так жорстка, бо Лукашэнка мяркуе, што гэтая кампанія вырашыць лёс краіны на дзесяцігодзьдзі. Зь Беларусі ствараецца Куба.

Мікола Кацук: Куба, Карэя, а можа Лівія? У Беларусі доўгі час ствараўся і ствараецца нэафэадальны парадак. У тым сэнсе, што пасьля 1996 году любая пазыцыя ўва ўладзе задаецца ня столькі ўжо адданасьцю пэрсоне, колькі адданасьцю сыстэме. Створаная абсалютна аўтаномная сыстэма ўзаемадачыненьняў: уладных, дзяржаўных і г.д., якая пранікае ўва ўсе сфэры грамадзтва, і чалавек, займаючы нейкую пасаду, набывае шмат ад дзяржавы. Любы ягоны крок супраць гэтай сыстэмы азначае, што ён гэта страчвае. Нават не абавязкова яму выказваць сваю нязгоду менавіта з палітыкай Лукашэнкі. Любы крок ад сыстэмы азначае страту нейкіх бонусаў.

Уладзімер Мацкевіч: Я б не пагадзіўся з тым, што ўсё роўна, з чым параўноўваць сёньняшні рэжым, з Паўночнай Карэяй ці Кубай. Я б настойваў на Кубе. Беларусь – эўрапейская краіна. Адрозьненьне эўрапейскай краіны ад Усходу ў тым, што ў Эўропе, як бы там ні было, сфармаваны інстытут асобы. У нас ёсьць асоба, асабістыя правы, асабістае меркаваньне і індывідуальнасьць. Чалавечай індывідуальнасьці надаецца каштоўнасьць, чаго няма на Ўсходзе. У Эўропе дыктатуры ў атачэньні дэмакратычных краінаў усталёўваюцца толькі ў тых краінах, да якіх сьвет на пэўны час страціў цікавасьць. Так было ў Партугаліі з 30-х па 70-я гады, і так адбылося на Кубе. Сёньня пра Беларусь таксама забыліся. Пра гэта гавораць амэрыканцы, эўрапейцы, мы самі ведаем пра гэта…

Валер Булгакаў: Мне здаецца, вы ідзяце аблуднай сьцежкай. Вы кажаце, што Беларусь забытая эўрапейскай і міжнароднай супольнасьцю і дзеля гэтага ўяўляе сабой палітычную анамалію. Але тым самым вы дэвальвуеце ўнутраныя высілкі да зьнішчэньня таго палітычнага парадку, які існуе. Нібыта вызваленьне можа нам прыйсьці толькі пры дапамозе Захаду…

Параўнаньне з Кубай мне незразумелае. Мне здаецца, Беларусь

ператвараецца ў тыповую эўразійскую краіну. І Казахстан ператварыўся ў «Кубу», і Ўзбэкістан. Няма сур'ёзных адрозьненьняў, каб клясыфікаваць беларускі рэжым як якасна іншы. Натуральна, маем іншы характар палітычнай сыстэмы, рэжым ня кланавы, але гэта прыватнасьці. Мяне больш цікавіць іншае: чаму гэтыя гайкі закручваюцца менавіта цяпер, у 2005 годзе?

Андрэй Дынько: Я схільны зьвязваць разгром незалежнае прэсы і ўвядзеньне крымінальнай адказнасьці за палітычную дзейнасьць з тым, што беларуская апазыцыя, дакладней, грамадзянская супольнасць Беларусі вылучыла адзінага кандыдата ў прэзыдэнты. Гэта адбылося ў кастрычніку. І рэакцыяй на гэта ў лістапа-дзе і стала ўзмацненьне рэпрэсіўнасьці. Рэжым убачыў у гэтым вылучэньні пагрозу, ён зьвязвае таксама яго з пэрспэктывамі павелічэньня цікавасьці да Беларусі з боку ЗША і ЭС.

Мікола Кацук: Не пагаджуся. Паводле маіх зьвестак, гэты закон (папраўкі Сухарэнкі. – Рэд.) распрацоўваўся пад 2001 год. І тады яго папросту не задзейнічалі.

Андрэй Дынько: Чаму ж яго тады не задзейнічалі, а цяпер задзейнічалі? Што памянялася?

Мікола Кацук: Ня ведаю, што памянялася, але, па-мойму, тэхналёгія тая самая. Там быў адзіны кандыдат і тут адзіны кандыдат.

Андрэй Дынько: Тады не было адзінага кандыдата. Ён зьявіўся за месяц да выбараў і фактычна ня быў прызнаны грамадзянскай супольнасьцю. Яго вылучэньне ўспрынялі як інтрыгу вонкавых гульцоў, а ніяк не выяву волі незалежнага грамадзтва. Цяпер адзіны кандыдат зьявіўся задоўга да выбараў і стаў вынікам кампрамісу ўнутры незалежнага грамадзтва, ён мае большую легітымнасьць, што пацьвердзіў выразны рост ягонага рэйтынгу. Ганчарык за месяц да выбараў

меў рэйтынг недалёкі ад статыстычнае памылкі, а Мілінкевіч ужо празь месяц пасьля Кангрэсу дэмакратычных сілаў акумуляваў сымпатыі перакананых праціўнікаў рэжыму. Пытаньне, наколькі ён мае патэнцыял далейшага росту, здольнасьці прыцягваць іншыя слаі грамадзтва, але вынікі сацыялягічных апытаньняў канца 2005 году паказваюць адрознасьць сытуацыі-2001 ад сёньняшняе.

Бо чым яшчэ можна вытлумачыць рост рэпрэсіўнасьці? Рэжым жа не зацікаўлены ўва ўзмацненьні рэпрэсіўнасьці дзеля рэпрэсіўнасьці. Наадварот, увесь час мы назіралі, што ён імкнецца ўнікаць маштабных рэпрэсій, як і любых крокаў, якія падважвалі б ягоную легітымнасьць унутры краіны, а зь іншага боку давалі б падставу міжнароднай супольнасьці для большага ціску на Беларусь. А апошнія меры моцна падточваюць імідж рэжыму. Цяпер ён ня можа больш казаць, што ў краіне дазволеная альтэрнатыўная прэса. А дзеяньне паправак у Крымінальным кодэксе будзе непазьбежна азначаць зьяўленьне ў краіне некалькіх дзясяткаў, а можа й сотняў палітвязьняў. Больш няможна будзе казаць, што альтэрнатыўная палітычная дзейнасьць у нас дазволеная. З рэжыму здымуцца апошнія маскі.

Уладзімер Мацкевіч: Для каго здымуцца?

Андрэй Дынько: Для насельніцтва Беларусі.

Тацяна Вадалаская: Калі такі закон рыхтаваўся ў 2001 годзе, значыць, раней не было дастатковага абгрунтаваньня, каб увесьці такія меры, а цяпер яны ёсьць. Пасьля нагнятаньня становішча, паведамленьняў пра баевікоў і г.д. можна такія меры абгрунтаваць патрэбай навядзеньня парадку ў краіне.

Валер Булгакаў: У нядаўнім аналітычным артыкуле на сайце http://worvik.com Мікола Кацук і Тацяна Вадалаская цьвердзяць, што адзіны кандыдат – гэта слабы кандыдат, у камандзе якога няма ўнутранай кансалідацыі, які праводзіць

некарэктную з пункту гледжаньня сёньняшняга права інфармацыйную кампанію. Там ёсьць нават такая фармулёўка: «вось і прыходзіцца імітаваць веру ў перамогу і мітусіцца, ствараючы бачнасьць дзейнасьці».

Другая пазыцыя была выказаная тут Андрэем Дыньком – вылучэньне адзінага кандыдата было моцным крокам апазыцыі, і мне такая ацэнка па-свойму сымпатычная. На самой справе, толькі нейкай агульнай прафіляктыкай пад узьдзеяньнем Памаранчавай рэвалюцыі немагчыма вытлумачыць вастрыню цяперашняга палітычнага моманту. Зьявілася нешта, нейкая акалічнасьць, новая якасьць, якая вымушае беларускі рэжым закручваць гайкі да канца. Магчыма, гэта было тое, што новы лідэр дэмакратычных сілаў пазыцыянуе сабе «як нацыяналіст» – я тут ужываю гэтае слова ў значэньні, прынятым цяперашняй уладай. Магчыма, гэтая зьвярыная нянавісьць, гэты выбух агрэсіі тлумачыцца тым, што Аляксандар Мілінкевіч ня гідзіцца нацыянальна-дэмакратычнага дыскурсу і адпаведнае рыторыкі, тым самым уваходзячы ў рашучае, лабавое сутыкненьне зь цяперашнім ідэалягічным дыскурсам. Ці вы бачыце на тое іншыя прычыны?

Мікола Кацук: Зразумела, што з магчымых кандыдатаў Мілінкевіч наймацнейшы. Але тое, што Мілінкевіча абралі такім спосабам, зьвязала яму рукі. Ён дамаўляецца ня з выбарцамі наўпрост, ён дамаўляецца перадусім зь «Пяцёркай», з штабам, з Нацыянальным камітэтам. Ён не свабодны ў сваіх дзеяньнях. А адносна сувязі між узрастаньнем жорсткасьці й Мілінкевічам – я яе ня бачу. Падстава лёгка знойдзецца, каб яго нейкім чынам ізаляваць. Што да паправак у КК, дык яшчэ ў верасьні было распараджэньне міністра юстыцыі, дзе ўсялякія кааліцыі, рухі ды інш. прыраўноўваліся да грамадзкіх аб'яднаньняў, якія павінны рэгістравацца. г.зн. рыхтавалася глеба пад гэтыя папраўкі. Таму мне здаецца, што гэты закон – не фінальны пункт, а падрыхтоўка да нечага яшчэ сур'язьнейшага. Таго, што будзе істотна ўплываць на нашу сытуацыю. Да чаго, пакуль не зразумела. Магчыма, ёсьць трэцяя сіла, якая ўяўляе небясьпеку для рэжыму. Тут можна гадаць, але зразумела, што ўдар робіцца, перадусім, па

грамадзянскай супольнасьці, г.зн. па людзкіх асновах палітыкі, па асобах.

Зьнішчэньне прэсы – гэта антыэкранная тэхналёгія. Прыбіраецца люстэрка, у якое чалавек глядзіцца. Зьнішчаюцца больш-менш афіцыйныя структуры, ад якіх чалавек можа прамаўляць ня толькі ад свайго імя, а ад імя нейкае супольнасьці людзей. І, па факце, складана казаць, што ўсе гэтыя асновы грамадзянскае супольнасьці змыкаюцца, прынамсі на сёньня, на Мілінкевічу. Узмацненьне жорсткасьці не зьвязана з гэтым. Можа быць і простае тлумачэньне: калі гайка ўжо насаджаная, проста надышоў час закручваць яе.

Андрэй Дынько: Я хацеў бы ўдакладніць. Я не казаў, што ўзмацненьне рэпрэсіўнасьці зьвязана зь Мілінкевічам. Я казаў, што яно зьвязана з вылучэньнем адзінага кандыдата. На месцы Мілінкевіча мог бы – мо зь меншым эфэктам – быць нейкі іншы. Але галоўнае, што апазыцыя ўжыла новую тэхналёгію. І гэта было вітана незалежным грамадзтвам Беларусі. І выклікала рэакцыю ўладаў, якая мае на мэце папярэдзіць далейшае разгортваньне гэтага праекту. Апазыцыя вылучыла лідэра, які можа ператварыцца ў пэрсанальную альтэрнатыву дыктатару – чаго дыктатар вельмі баіцца.

Сьвятлана Мацкевіч: Гэта ніякая ня новая тэхналёгія, а паўтарэньне старога.

Андрэй Дынько: У 1994 годзе такой тэхналёгіі не было, у 2001-м таксама.

Сьвятлана Мацкевіч: Тэхналёгія – гэта тое, што ляжыць у задумцы праекту, і яна была, гэтая тэхналёгія.

Уладзімер Мацкевіч: Толькі ў 2001 годзе яны ня здолелі зрабіць заранёў…

Сьвятлана Мацкевіч: А тое, што там яны раней выбралі ці пазьней выбралі, мае мала значэньня. І рэжым пралічыў сцэнар адказу на такую тэхналёгію. Таму для яго не ўяўляе пагрозы абраны адзіны кандыдат. Яму пагрозу можа ўяўляць нейкі іншы суб'ект. Існае заканадаўства, да паправак у Крымінальны кодэкс, ужо дазваляла гэтыя рэпрэсіўныя меры ўжываць. Хутчэй за ўсё, гэтая канкрэтызацыя Крымінальнага кодэксу мела на мэце запалохаць грамадзянскую супольнасьць, яшчэ ўзмацніць страх, якім і сілкуецца рэжым. Страх асобы, страх разрозьненых людзей, якія разумеюць сытуацыю і гатовыя былі б пры пэўных умовах удзельнічаць у апазыцыйных рухах. Таму гэта прэвэнтыўныя меры пэўнага кшталту. Але гэта ніяк ня выклікана тэхналёгіяй адзінага кандыдата.

Уладзімер Мацкевіч: Андрэй сказаў адну рэч, у якой ён безумоўна мае рацыю. Калі ён тлумачыў, што нарэшце зьявілася асоба, здольная пэрсанальна канкураваць з Лукашэнкам. Абстрагуючыся ад праекту «адзіны кандыдат», я б сказаў, што гэтая вэрсія мае рацыю. Што, сапраўды, на сёньня ёсьць асоба, якой Лукашэнка мог бы баяцца. Пераможаная замяталінская тэхналёгія, якая адпрацоўвалася з 1995 году, скіраваная на тое, каб на палітычным полі не зьяўлялася ніводнай асобы, якая мела б пэўны аўтарытэт. Мілінкевіч такую асобу ўяўляе. І гэта істотна. Больш істотна, чым бязглузды праект «адзіны кандыдат».

Валер Булгакаў: У сваім артыкуле спсп. Вадалаская і Кацук моцна крытыкуюць апазыцыйных палітыкаў накшталт Лябедзькі і іжэ зь нім. Маўляў, гэта несамастойныя фігуры, у іх шмат слабых месцаў, іхны праект адзінага кандыдата бязглузды – гэта прагучала і тут. Але возьмем украінскі досьвед кааліцыйнага будаўніцтва перад выбарамі 2004 году. Кандыдат Юшчанка браў у сваю каманду вельмі слабых палітыкаў, проста каб прэзэнтаваць максымальна шырокі апазыцыйны спэктар. Зь ім ішлі ўсякія Анатоліі Кінахі, і жук і жаба...

Уладзімер Мацкевіч: Юшчанка ніколі не залежаў ні ад Кінаха,

ні ад каго іншага.

Сьвятлана Мацкевіч: Ён браў іх у каманду, а не яны яго выбіралі.

Уладзімер Мацкевіч: Каб Мілінкевіч ішоў зь лета і далучаў да сябе аднаго за адным – гэта была б іншая стратэгія і зусім іншы шлях. А калі ён сказаў: «Ну, хлопцы, можа вы мяне абераце» – гэта бязглузьдзіца.

Валер Булгакаў: Вы кажаце так, нібы яго абірала вузкая групоўка асобаў ці нейкія закулісныя заправілы. Ды не – абіраў Кангрэс. Мы з Дыньком там былі і таксама галасавалі. І інтрыга захоў-валася да моманту абвяшчэньня вынікаў. Ведаеце, для мяне «Пяцёрка+» падаецца нармальнай прафэсійнай палітычнай арганізацыяй…

Уладзімер Мацкевіч: А для нас гэта тыя, хто раз за разам арганізоўваў паразы, раз за разам рабіў недарэчнасьці, ніколі не прызнаваў сваіх памылак…

Валер Булгакаў: Вашыя словы вытрыманыя ў стылі журналістаў «БелГазеты». Для мяне гэта шок. Яшчэ на што я хачу зьвярнуць увагу: пэрсанальная віна таго самага Лябедзькі, які раз за разам перажывае паразы, значна меншая, чым вы цьвердзіце. Сп.Мацкевіч выказаў добрую думку пра тую замяталінскую стратэгію. Што ўсе незалежныя палітыкі інфармацыйна зьнішчаюцца, хто тады ўяўляе сабой нейкую асобу і можа быць альтэрнатывай? Што прычына і што наступства гэтай сытуацыі? Пэрсанальныя якасьці гэтага чалавека альбо сам паталягічны фон, паталягічная сыстэма палітычных адносінаў у краіне?

Віталь Сіліцкі нядаўна выказаў цікавую думку, якую я таксама хачу выставіць на абмеркаваньне. Ён сказаў, што наступныя выбары – гэта ніякія ня выбары, а кампанія па заручэньні ўсенароднай падтрымкай пастаянна дзеючага беларускага

прэзыдэнта. Гэткі падыход папросту анігілюе аргумэнты кшталту таго, што вакол Мілінкевіча палітыкі слабыя. Калі не адбываецца нармальнага выбарчага працэсу, немагчыма ацэньваць па заслугах. Тады рацыянальная аб'ектыўная ацэнка робіцца немагчымай.

Мікола Кацук: Калі мы не ацэньваем па заслугах, мы страчваем які-кольвек рацыянальны грунт для ацэнак. Што да таго тэзісу Сіліцкага – ну, цалкам у духу п'есы «Забіць дракона», там быў бурмістар, які абіраецца трыццаты раз запар пажыцьцёва. То бок ён пажыцьцёва штораз абіраецца – але ўвесь час за адно. Але абіраецца. Так што гэта ўжо было. … Проста я гляджу на сытуацыю. Людзі займаюцца палітыкай. Вось у іх стартавыя ўмовы – 1994 год. Тыя самыя людзі займаюцца палітыкай у 1996 годзе… Рэч ня ў лічбах, рэч у тэндэнцыі: кожны год, з тымі ж лідэрамі – людзей, якія падтрымліваюць апазыцыю, робіцца ўсё менш а менш. Тэндэнцыя відавочная. У сувязі з гэтым, калі ўлада ўсё ўзмацняе свой уплыў, значыць, улада не такая тупая. То бок, па крытэры эфэктыўнасьці яна перайграе сваіх апанэнтаў.

Андрэй Дынько: Тады Сталін – вельмі эфэктыўны…

Мікола Кацук: Стоп. Ён эфэктыўны. Ён будуе Беламорканал абсалютна рабскай сілай, але людзі занятыя, яны ня думаюць пра тое, як скінуць Сталіна, яны думаюць, як дастаць міску юшкі. І ў гэтым сэнсе эфэктыўнасьць дзеяньняў на ўтрыманьне ўлады высокая.

А людзі, якія стала займаюцца палітыкай, прафэсіяналы ў гэтай сыстэме, не даюць рады сваім задачам, таму намі й выносяцца такія ацэнкі. Яны за адзінаццаць гадоў сваім бясьсільлем ператварылі краіну ў тое, што мы маем на сёньня.

Валер Булгакаў: Варта было б прааналізаваць, што сапраўды працуе на доўгатэрміновую стабільнасьць рэжыму і што не працуе на яе. Што сапраўды эфэктыўна ня з пункту гледжаньня

найбліжэйшых палітычных баталіяў, а з разьліку на доўгатэрміновую дынаміку. Напрыклад, яшчэ адзін сюжэт, які быў закрануты – Мікола казаў, што рэжым баіцца нечага трэцяга, раз пачынае закручваць гайкі. Давайце будзем рэалістамі: Лукашэнка сапраўды хоча правіць пажыцьцёва. Дык ці ня ёсьць гэтае трэцяе тым, што, напрыклад, сацыялягічныя апытаньні фіксуюць, што сярод моладзі або іншых сацыяльных групаў *de facto* расьце апазыцыйнасьць да сёньняшняга прэзыдэнта і што заўтра яны ня будуць успрымаць яго як палітычнага гегемона.

Сьвятлана Мацкевіч: Лукашэнка апынуўся закладнікам самім сабою створанай сытуацыі. Таталітарны рэжым, ты сам аднаасобна прымаеш усе рашэньні, ты ўсё ведаеш. Але ўсё ведаць немагчыма, і ты пра гэта таксама ведаеш. Нават калі табе ўсё падконтрольна, ты ня можаш валодаць паўнатой інфармацыі. І таму Лукашэнка лякаецца сам сябе. Ён пужаецца, што нечага можа ня знаць. Ён можа ня знаць уяўленага трэцяга суб'екта, які раптам, у адначасьсе можа зьявіцца і пачаць разгортваць дзеяньні, не спрагназаваныя ўладамі загадзя. І таму гэты трэці суб'ект – хто гэты трэці суб'ект? Лукашэнка проста шукае, прамацвае, дзе магчымае тое трэцяе.

Валер Булгакаў: Лукашэнка зацікаўлены ў як мага больш стабільнай і эфэктыўнай рэпрадукцыі цяперашняга палітычнага *status quo* зь нязначнымі зьменамі. Ці ўяўляе ў доўгатэрміновай пэрспэктыве для яго пагрозу цяперашняе пакаленьне, якое ў 1994 годзе маладым яшчэ было. Якім бачыцца гэтае пакаленьне ў сьвятле сацыялёгіі?

Мікола Кацук: Мне невядомыя такія зьвесткі, каб уся моладзь была супраць. Між моладзі трохі больш апазыцыйна настроеных людзей, чым у другіх узростах. Гэта заўжды было, гэта ў любым грамадзтве будзе.

Уладзімер Мацкевіч: А ў параўнаньні з папярэднімі гадамі?

Мікола Кацук: Людзі жывуць і паміраюць. І вось глядзіце. Пэнсіянэры ў 1994 годзе вельмі сур'ёзна падтрымлівалі Лукашэнку. Сёньня – тое самае. Што ж адбылося? Старшыя людзі памёрлі, і на іхнае месца прыйшлі іншыя людзі, якія рыхтык гэтак жа пачалі падтрымліваць гэтага лідэра. Разумееце, гэта натуральны дэмаграфічны працэс. І ў гэтым сэнсе рэжым рэпрадукуецца сам сабою. За доўгі час аб'ём яго электарату ня зьменшыўся, прытым што існуюць натуральныя дэмаграфічныя працэсы выбыцьця.

Андрэй Дынько: Але час не стаіць на месцы. 60 % пэнсіянэраў падтрымліваюць не таго Лукашэнку, якога 60 % пэнсіянэраў падтрымлівалі 10 гадоў таму. Тады людзі подтрымлівалі Лукашэнку, які хацеў аднаўленьня Савецкага Саюзу, таго Лукашэнку, які быў дэмакратычна абраным прэзыдэнтам. А цяпер сытуацыя памянялася, і 60 % пэнсіянэраў падтрымліваюць Лукашэнку як лідэра-незалежніка, а зь іншага боку як лідэра аўтарытарнага, які ня церпіць дэмакратыі. Аб'ектыўная рэальнасьць у тым, што Лукашэнка мяняўся ўсьлед за чаканьнямі грамадзтва, а чаканьні грамадзтва мяняліся, у тым ліку і пад уплывам грамадзянскае супольнасьці, прэсы, апазыцыі. Так-так, і мы з вамі на іх таксама ўплываем. Ёсьць сацыялягічныя зьвесткі аб тым, што сёлета ўпершыню свабода як вартасьць стала важнейшаю за дабрабыт. У грамадзтве адбываюцца глыбінныя зьмены. Па меры выхаду Беларусі з постсавецкага эканамічнага крызісу дабрабыт паляпшаецца, людзі пачынаюць забывацца шок інфляцыі, які вызначаў іхны сьветапогляд у 90-х гадах, і гэта можа прывесьці да вялікіх зьменаў у палітычных паводзінах людзей.

Што да словаў Сіліцкага, тут жа бачыце, што выходзіць: з аднаго боку, улады пакуль ня лічаць магчымым адмовіцца ўвогуле ад мэханізму быццам бы альтэрнатыўных выбараў, хоць мы ўсе тут былі ўнутрана гатовыя, што ў наступным годзе альтэрнатыўнасьці ўжо ня будзе. У сваю чаргу, апазыцыя мяркуе: раз улада ня можа дазволіць сабе раскошы безальтэрнатыўных выбараў, бо гэта забойча ўдарыла б па яе легітымнасьці ў вачах насельніцтва, апазыцыі трэба гэта

выкарыстоўваць, ісьці на тыя выбары, нават калі яны відавочна несвабодныя, няроўныя, несправядлівыя і нават безь ніякага шанцу, бо аднойчы можа здарыцца «цуд у скрынях». Мілінкевіч казаў, што сваю кампанію ён разглядае як магчымасьць палітызаваць грамадзтва, дайсьці да людзей, узбудзіць палітычную думку.

Выбары сапраўды суправаджаюцца палітызацыяй. Калі б ня выбары 1994 году, беларусы нашмат горш ставіліся б да дэмакратыі, а так яны пабачылі, што можна выбраць таго лідэра, якога хочаш.

Выбары 2001 году падрыхтавалі глебу для ўмацаваньня нацыянальнае ідэнтычнасьці, якое было зафіксаванае ў наступныя гады, калі лічба прыхільнікаў нацыянальнай незалежнасьці радыкальна перавысіла колькасьць праціўнікаў.

У чым сіла нашай дэмакратычнай апазыцыі, у чым сіла гэтых бясьсільных? Для Мілінкевіча галоўнае – настойліва сьцьвярджаць свае вартасьці, выкарыстоўваць выбары для таго, каб гуртаваць новых людзей вакол альтэрнатыўнай палітычнай плятформы і папулярызаваць нацыянальную ідэю.

Хачу таксама зрэагаваць на закід спсп. Кацука й Вадаласкай наконт некарэктнасьці з пункту гледжаньня сёньняшняга права інфармацыйнай кампаніі. Гляньма, як дзейнічала дэмакратычная апазыцыя ў краінах Цэнтральнай Эўропы ў гады савецкай акупацыі. Па-першае, яны дзе толькі магчыма і наколькі магчыма ігнаравалі юрыдычныя нормы тых рэжымаў, якіх не прызнавалі легітымнымі. Прафсаюз «Салідарнасьць» спачатку стварыўся і толькі пасьля, ужо па факце, прымусіў сябе зарэгістраваць. Для яго творцаў было няважна, зарэгіструюць іх ці не зарэгіструюць.

Калі нехта пачынае гаварыць, што апазыцыя, з аднаго боку, павінна дзейнічаць пераможна, а зь іншага боку не павінна парушаць літары закону, які цяпер дзейнічае, той заганяе яе ў немагчымасьць. Немагчыма гуляць па лукашэнкаўскіх правілах і выйграць пры гэтым. Калі апазыцыя хоча выйграць, яна павінна гуляць па сваіх правілах.

<...>

Сіліцкі таксама мяркуе, што ў цяперашняй беларускай сытуацыі трэба інвэставаць не ў тэхналёгіі, а ў вартасьці. Не магу не пагадзіцца. Калі ж апазыцыя будзе лічыць, што прайграе, бо выбірае ня тую тэхналёгію, то, баюся, яна будзе прайграваць бясконца. Бо немагчыма прыдумаць тэхналёгію, якая перамагла б такі рэжым. У ідэалягічным супрацьстаяньні тэхналёгіямі не пераможаш.

Валер Булгакаў: Вось гэтая думка Сіліцкага: «Каб тэхналёгіі спрацоўвалі, яны вымагаюць унікальнай канцэнтрацыі мэдыяў і іншых рэсурсаў. Палітычная тэхналёгія – гэта па азначэньні інструмэнт улады, а не апазыцыі, гэта інструмэнт дэмабілізацыі, тое, што ўтрымлівае абывацеля каля тэлевізараў, прымушае згадзіцца з выбарам, які за яго ўжо зрабілі эліты. Нават самая прыгожая віртуальная рэчаіснасьць ня можа матываваць чалавека, каб ён рызыкаваў здароўем, становішчам і нават жыцьцём».

Мікола Кацук: Я б тут удакладніў тэзіс пра тое, што тэхналёгія заўжды дапамагае моцнаму. Тэзіс добры, але ён жа нічога не дае, каб плянаваць дзейнасьць.

Уладзімер Мацкевіч: Не, ён увогуле – ня тэзіс, гэта мэтафара, якая невядома пра якія тэхналёгіі гаворыць.

Мікола Кацук: Скажам, Юшчанка выкарыстоўваў якія-кольвек тэхналёгіі? Выкарыстоўваў. Перамог? Перамог. Значыць, ён быў моцны. Хтосьці не выкарыстоўваў тэхналёгій – не перамог. Значыць, быў слабы. Мы заўжды вяртаемся, бяром во гэта для тлумачэньня таго, што ўжо адбылося. У кожным разе канечне выкарыстоўваць і тэхналёгіі, і вартасьці.

Вы ўспрымаеце тэхналёгіі й тых, каго называюць «паліттэхнолягамі», у такім тандэме, ці што. Мы ж гаворым пра іншыя тэхналёгіі. Польская «Салідарнасьць» таксама

стваралася паводле пэўнай тэхналёгіі. Няма знацьця, ці былі там паліттэхнолягі, але тэхналёгіі былі, бо немагчыма стварыць прафсаюз, седзячы на канапе й расказваючы, якія мы добрыя. Мусова нешта робіць строга, дакладна, паводле нейкіх правілаў. г.зн. трэ было кудысьці хадзіць, нешта гаварыць ды інш.

<…>

Андрэй Дынько: У абліччы Мілінкевіча мы маем кандыдата ў прэзыдэнты, які, мала таго, што блізкі нам маральна-этычна, яшчэ й жыве ў адным сьвеце з намі – чытае незалежную прэсу, у тым ліку газэту «Наша Ніва» і часопіс «ARCHE». Калі мне кажуць, што «ў вас ў 2001 годзе ўжо быў такі кандыдат», то я пытаюся: «А хто ж гэта быў?»

Мікола Кацук: Які ж тыраж «Нашай Нівы»?

Уладзімер Мацкевіч: Ды Мілінкевіч жа чытае… Гэтага аднаго дастаткова…

Андрэй Дынько: Якраз-такі ўлада баіцца сытуацыі, калі мы нарэшце выгадавалі палітыкаў, якія слухаюць радыё «Свабода» і чытаюць беларускія навіны ў Інтэрнэце. У гэтым вялікая сіла гэтых палітыкаў, бо яны пачынаюць рэальна глядзець на сьвет, Беларусь і яе грамадзянскую супольнасьць і ведаюць, на каго яны працуюць і на кім грунтуюцца. У гэтым я бачу зарок будучага посьпеху. Мы маем цяпер нашмат разумнейшых палітыкаў.

Валер Булгакаў: Андрэй дае цікавую адрознасьць паміж Мілінкевічам і Ганчарыкам…

Мікола Кацук: Адрознасьці можна шукаць да бясконцасьці, ды што з таго. Добра, што Мілінкевіч чытае. Але гэта ня тая ўмова,

якая канечне прывядзе яго да перамогі. Да перамогі прывядуць іншыя.

Андрэй Дынько: І што ж, па-Вашаму, здольна прывесьці да перамогі ў 2006 годзе?

Уладзімер Мацкевіч: Я паспрабую акрэсьліць, што. Эканамічнае становішча беларусаў паляпшаецца. У гэтым сэнсе ўпор апазыцыйнай прапаганды на ўзровень жыцьця, на сацыяльную праблематыку не спрацоўвае. А калі не эканамічныя прычыны прыводзяць да выбуху, зьмены ўлады, дык што іншае? Іншае – гэта каштоўнасьці. Свабода, правы, аўтаномнасьць асобы, нацыі.

Летась у мысьленьні апазыцыі адбыўся пэўны пералом. Апазыцыя стала менш гаварыць пра эканамічныя чыньнікі і пачала пераходзіць да нейкіх іншых дыскурсаў. Сёньня Мілінкевіч настойліва паўтарае, што рэвалюцыя будзе рэвалюцыяй духу. Але ж для гэтага не гатовая тэарэтычная і ідэалягічная база.

Зрэшты, ня толькі гуманітарная веда апазыцыі слабая, веда ўладаў на сёньня таксама не дазваляе ім тлумачыць, што адбылося ўва Ўкраіне падчас Аранжавай рэвалюцыі, што адбылося ў Сэрбіі падчас падзеньня Мілошавіча і што адбывалася, напрыклад, у Румыніі. Гэтыя зьмены для нашых уладаў невытлумачальныя. Для іх яны выглядаюць нейкімі цудамі. А мы ведаем, што калі нешта адбываецца як цуд, гэта значыць, хтосьці за ім стаіць. Улады знаходзяць адзінае тлумачэньне: жыдамасонская змова, амэрыканскія ЦРУшнікі там нешта зрабілі і г.д. Яны ведаюць, што трэба рабіць супраць ЦРУ: трэба ўмацоўваць разьведку, органы бясьпекі. Умацоўвацца! Пасьля, даведаўшыся больш пра Ўкраіну, яны разумеюць, што не ЦРУшнікі гэта зрабілі, яно не магло зрабіцца, каб ня мела падтрымкі ўнутры краіны. А на чым базуецца гэтая падтрымка ўнутры краіны, яны не разумеюць. Уладныя ідэолягі, уладныя паліттэхнолягі ня могуць сказаць, ці існуе сёньня нацыя ў краіне, ці існуе сёньня грамадзянская супольнасьць. Неразуменьне спараджае страх. На гэты страх

яны адказваюць далейшым узмацненьнем рэжыму. Людзі, якія прымаюць рашэньні, перастрахоўваюцца на ўсялякі выпадак... У гэтых умовах апазыцыя павінна тым ня менш распрацоўваць нейкія тэхналягічныя захады, якія маглі б спрацаваць у пэўнай сытуацыі, калі надыдзе час. Выбары маскіруюць гэты час. Трэба весьці размову не пра самі выбары, а толькі пра час выбараў, калі напружанасьць грамадзкай думкі дасягае пэўнай кульмінацыі, і пад гэта падцягваюцца розныя сілы. Розныя палітычныя сілы будуць карыстацца гэтым працэсам. Сёньня, напрыклад, улады карыстаюцца ім, каб узяць пад кантроль любыя магчымасьці існаваньня незалежнай асобы.

Па-другое, павінны быць тэхналёгіі, якія раскручваюць аўтарытэтаў, бо толькі праз аўтарытэтаў можна даносіць каштоўнасьці да іншых людзей. Таму трэба працаваць на аўтарытэт людзей, на давер паміж імі. Той самы Гавэл, напрыклад, быў такой асобай у Чэхаславаччыне. У Беларусі на той момант не было, на жаль, такіх асобаў, за выключэньнем некалькіх пісьменьнікаў. Менавіта да гэтага трэба сёньня ставіцца тэхналягічна. Бо глядзіце, у чым найбольш стараецца ўлада – зьнішчае аўтарытэты, падрывае давер паміж людзьмі…

Вера Гаўрыльчык: У мяне яшчэ такое пытаньне. Калі мы скідваем з рахункаў эканамічныя матывы рэвалюцыі, тады як патлумачыць сытуацыю з вэлязаводам?

Уладзімер Мацкевіч: А гэта ўжо патлумачана, і вельмі дакладна. Калгас ніколі не бывае эканамічна эфэктыўным.

Андрэй Дынько: А агракамбінат «Сноў»?

Уладзімер Мацкевіч: Пра гэта я менш ведаю. Хоць калі мы маем справу з прыватнымі прадпрыемствамі, якія існуюць хай сабе і ў квазірынкавых адносінах, там ёсьць канкурэнцыя: адны выжываюць, другія загінаюцца, як і ў самай лібэральнай эканоміцы.

Валер Булгакаў: Спадар Мацкевіч памыляецца, кажучы, што ўлады не разумеюць, што адбываецца. Гэта мне нагадвае мэлядраматычныя галашэньні: «Ах, як цяжка зразумець, чаму Сталін узяў і выразаў усіх беларускіх пісьменьнікаў у 30-я гады». Мэта была ясная: спыніць працэс тварэньня беларусаў у нацыю. Чаму? Бо акурат нацыя, якую ствараюць эліты, для цэнтральнаэўрапейскіх грамадзтваў уяўляе сабой найвышэйшы маральны аўтарытэт, а ня нейкі чалавек, які ўзурпаваў права кіраваць краінай. І адпаведна асноўнай мэтай нацыянальнага грамадзтва ёсьць росквіт нацыі, калі яна пачынае канкураваць зь іншымі, ужо сфармаванымі нацыямі, а не пабудова таталітарнай імпэрыі ці постсавецкай сатрапіі.

Лукашэнку зьбліжае з Сталінам тая рыса, што абодва гэтыя палітыкі не дапускаюць палітычнай канкурэнцыі, ня кажучы ўжо пра канкурэнцыю праграм нацыянальнага разьвіцьця. І для першага, і для другога прадметам сапраўднага пакланеньня ёсьць дзяржава і яе апарат, а не абстрактныя вартасьці накшталт нацыянальнай мовы. І, нарэшце, абодва робяць усё, каб насельнікі гэтай дзяржавы ідэнтыфікавалі сябе толькі зь ёй – ад лояльнасьці падданых да такой дзяржавы адзін крок да лояльнасьці да асобы яго правадыра. Калі ж першым аб'ектам лояльнасьці і ідэнтыфікацыі робіцца, напрыклад, нацыянальная мова, гэта разглядаецца як небясьпечная ерась і жорстка вынішчаецца. Дарэчы, апошняе, што, на мой погляд, зьбліжае Сталіна з Лукашэнкам, што абодва гэтыя палітыкі адзначаюцца духоўнай беднасьцю і таму заставаліся закладнікамі арахічных сьветапоглядных сыстэмаў. І Сталін, і Лукашэнка з тактычных меркаваньняў рабілі стаўку на расейскі нацыяналізм, ня будучы ў строгім сэнсе расейскімі нацыяналістамі – проста нічога больш цікавага ў ім да галавы не магло прыйсьці.

Дарэчы, сама назва новай папраўкі ў Крымінальны кодэкс «Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусі», як і пастаянная кадэбісцкая ахінея пра «антыдзяржаўную дзейнасьць апазыцыі», паказвае, што лукашысты цяпер цалкам сур'ёзна атаесамляюць нашу дзяржаву з створаным імі рэжымам. Мне здаецца, што гэта верх амаральнасьці – ніхто больш не здыскрэдытаваў нашу дзяржаву, чым цяперашняя адміністрацыя сваімі дзікімі плянамі тварэньня «саюзнай дзяржавы» і «аб'яднаньня з

Расеяй».

Наконт Памаранчавай рэвалюцыі. Лукашысты зразумелі, што ва Ўкраіне адбылося нацыянальнае паўстаньне і, каб такога ніколі ня здарылася ў нас, узялі і выкінулі фактычна ўсю незалежную беларускамоўную прэсу зь дзяржаўнага падпіснога каталёгу. І гэта прытым, што доля мэдыяў у краіне, якія выдаюцца па-беларуску, наагул каля 10%.

У нас ідзе вайна за каштоўнасьці і яна вядзецца на зьнішчэньне. Бо што такое Лукашэнка ў параўнаньні зь беларускай мовай?! Калі яму не перамагчы, яго месца будзе на сьметніку гісторыі.

Тацяна Вадалаская: Вяртаючыся да пытаньня, чаму рэпрэсіі актывізуюцца… Мне здаецца, гэта таксама зьвязана з тым, што ўлады не баяцца сёньняшняй палітычнай апазыцыі. Яны ведаюць яе мэтады, яны адсочваюць тэндэнцыю, пра якую казаў Мікола – страты даверу да яе. Але, раз апазыцыя губляе давер, гэта ня значыць, што людзі пераходзяць на бок уладаў, значыць, яны пачынаюць думаць пра новыя хады, шукаць новыя кірункі дзейнасьці. І каб папярэдзіць магчымасьць узьнікненьня гэтых плыняў, запалохаць грамадзянскую супольнасьць, заблякаваць ёй выхад у СМІ прыдумляецца такое татальнае дзеяньне.

Валер Булгакаў: Вы культывуеце лукашэнкаўскі міт, што «ўлада не баіцца апазыцыі». Раней мы, здаецца, прыйшлі да высновы, што ўлада апазыцыі акурат баіцца.

Мікола Кацук: Мы рознае ўкладаем у паняцьце «апазыцыя»… Партый – не баіцца дакладна.

Андрэй Дынько: Падзел на палітычную апазыцыю і грамадзянскую супольнасьць штучны. На самой справе, гэтай уладзе супрацьстаіць адзінае, нягледзячы на ўнутраную разнароднасьць, незалежнае грамадзтва.

Валер Булгакаў: Сапраўды, у цяперашніх варунках гэтая апазыцыя бясьсільная. Але варта заўтра здарыцца інсульту ў галоўнакамандуючага, а пасьлязаўтра – свабодным выбарам па прапарцыйнай сыстэме, і гэтая апазыцыя прыйдзе да ўлады. Яна прафэсійная і падрыхтаваная да палітычнай канкурэнцыі. Ужо сёньня ёй удалося неймавернае. Яна скансалідавала фактычна ўсіх, ад камуністаў да нацыяналістаў, і гэтая кансалідацыя будзе мець доўгатэрміновы характар.

Уладзімер Мацкевіч: Валер, гэты аптымізм трэба ўзяць у пэўныя рамкі. Чаму Бабкоў з Абушэнкам гавораць пра крэольскасьць? Яны глядзяць на прыклад Лацінскай Амэрыкі, дзе кароткія дэмакратычныя пэрыяды праз слабасьць дэмакратычных уладаў адразу зьмяняліся новымі дыктатурамі. Калі дэмакратыпрыйдуць да ўлады і акажуцца няздольнымі, нас чакае новая дыктатура.

Валер Булгакаў: Спадар Мацкевіч, тое, што Вы кажаце, – вынік дзеяньня яшчэ аднаго лукашэнкаўскага міту: што ў Беларусі моцная ўлада, а разам зь ёй эканамічны рост і ўвесь іншы пазытыў, абавязаны асабістым заслугам нашага прэзыдэнта. І варта толькі дарвацца дэмакратам да ўлады, пачнецца хаос і паняверка.

Тое, што моцная ўлада ў Беларусі магчымая толькі пры дыктатуры ўсім добра вядомага пэрсанажа – гэта адзін з галоўных лукашэнкаўскіх мітаў. Лукашэнка пастаянна гаворыць пра моцную ўладу. Я таксама за моцную ўладу. Няцяжка, аднак, зрабіць так, каб прыход дэмакратычнай апазыцыі да ўлады і далейшая дэмакратычная трансфармацыя нашага грамадзтва азначала акурат умацаваньне дзяржавы і дзяржаўнай улады.

Напрыклад, у Скандынавіі вельмі моцная ўлада. У любой заходняй краіне існуе моцная дзяржаўная ўлада, якая забясьпечвае напараўнальна большы дабрабыт, асабістую свабоду і, напрыклад, зьбіральнасьць падаткаў, чым у постсавецкіх сатрапіях, якімі кіруюць нязьменныя «сільныя лідэры». Дэмакратыя – значна больш эфэктыўна спосаб

забясьпечыць стабільнасьць і моц улады, чым набор аўтарытарных тэхнік кіраваньня, што генэалягічна сягаюць XIX і ранейшых стагодзьдзяў і якія так любіць ужываць наш гарант.

Уладзімер Мацкевіч: Не прыпісвайце мне, калі ласка, таго, чаго я не казаў. Я ўсюды казаў: самае дрэннае, самае злачыннае, што ёсьць у лукашэнкаўскай уладзе – гэта тое, што яна разбэшчвае грамадзтва і асобу, каб яны гублялі адказнасьць і здольнасьць кіраваць сабой. Я толькі баюся такога раптоўнага пераходу да квазідэмакратыі, калі да ўлады прыйдуць людзі, няздольныя адказваць за свае ўчынкі, ня кажучы ўжо пра краіну. У апазыцыі павінен быць вельмі жорсткі адбор лідэраў. А Лукашэнкавай рыторыкі мне не прыпісвайце.

Валер Булгакаў: Але хто ж прыйдзе да ўлады, апрача цяперашняй апазыцыі? Зь неба нам ніхто не спадзе.

Уладзімер Мацкевіч: Пачакайце, я таксама хачу прыйсьці туды і хачу, каб шмат разумных людзей прыйшло. Каб не было так, што Лябедзька ці яшчэ хто, нібы той Ясір Арафат, ня маючы ніводнай перамогі за ўсё жыцьцё, даседзеў да сьмерці, кіруючы гэтай апазыцыяй, робячы яе ўсё больш бязглуздай, як гэта сёньня ў нас адбываецца. Трэба ня проста аптымістычна ці крытычна ставіцца да апазыцыі, трэба ўнутры апазіцыі рабіць дэмакратычныя захады, скіраваныя на адбор найлепшых лідэраў. Сёньня гэтага няма.

Мікола Кацук: Вы дзеліце шкуру незабітага мядзьведзя. Ніякай перамогі ня будзе. Яшчэ раз скажу: будзе Куба, астравок таталітарызму ў Эўропе.

Валер Булгакаў: Я не падзяляю вашага пэсымізму, спадар Кацук. Так, апошнія лукашэнкаўскія захады – больш жорсткае заканадаўства, абмежаваньне мэдыяпрасторы – гэта відавочныя рэпрэсіі. Гэта акцыя, на якую грамадзянская супольнасьць мусіць адказаць рэакцыяй. У намеры ініцыятараў гэтага ўсяго

не ўваходзіць тая акалічнасьць, што ўсе гэтыя драконаўскія захады павялічаць засяг і якасьць грамадзянскай супольнасьці. Калі, не дай Бог, у Беларусі зьявіцца дзесяць ці нават сто палітзьняволеных, для грамадзтва гэта будзе вялікім шокам і большая колькасьць людзей будзе змушаная перастаць так стараніцца палітыкі, як староніцца яе цяпер. Тое самае датычыць і мэдыяў. Чым больш лукашэнкаўцы абмяжоўваюць мэдыя-поле ў сытуацыі, калі цалкам перакрыць інфармацыйныя патокі немагчыма, тым больш яны павялічваюць інфармацыйны голад па сапраўды сумленным слове. Пакуль гэты голад распаўсюджваецца не па ўсім грамадзтве, але ёсьць 20–30 % незадаволеных, асабліва чуйных і падаўкіх на гэты дэфіцыт.

Любое закручваньне гаек мае пэўную мэжу. З пункту гледжаньня нацыянальнага адра-джэньня Беларусі Лукашэнка сваімі бязглуздымі захадамі ўдыхае дух у цела нашай грамадзянскай або, калі хочаце, нацыянальнай супольнасьці. Яна яшчэ 10–15 гадоў таму была амаль не жывая, цяпер, глядзіш, ужо варушыцца.

Менск, 12 сьнежня 2005

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/15
[image]

ІВАН КРАСЦЕЎ
кіраўнік Цэнтру лібэральных стратэгіяў у Сафіі. Ён працаваў выканаўчым дырэктарам Міжнароднай камісіі па праблемах Балканаў.

Іван Красцеў
Імперская Расія рыхтуе рэванш

«Палітычная сутнасць савецкай улады на сённяшні дзень, – пісаў Джордж Кенан у славутым пасланні «Х», датаваным лютым 1946 г., – з’яўляецца прадуктам ідэалогіі і абставін». Палітычная сутнасць расійскай улады цяпер, у кастрычніку 2005 г., з’яўляецца прадуктам адсутнасці ідэалогіі і… зноў жа абставін. Д’ябал тоіцца якраз у абставінах. «Аранжавая эйфарыя» на Захадзе, якой суправаджаліся змены рэжыму у Грузіі і ва Украіне, настолькі моцная, што яе носьбіты лічаць незваротным заняпад расійскага ўплыву на постсавецкай прасторы. Гэтыя «заўзятары дэмакратычнага трыумфу» цяпер ідуць у заклад, колькі яшчэ тыдняў працягне ўлада Аляксандра Лукашэнкі і дзе адбудзецца наступная «каляровая рэвалюцыя».

На мой пагляд, аднамерны «заўзятарскі» падыход прэзентуе пажаданае як сапраўднае. Ягоныя прыхільнікі недаацэньваюць уразлівасць найноўшых дэмакратый і ігнаруюць стратэгічную прагу Расіі да ператварэння з дзяржавы, якая імкнецца да простага падтрымання статус-кво, у аплот рэваншызму на тэрыторыі СНД. Ці не выйдзе так, што пуцінская Расія атрымае з каляровых рэвалюцый найбольш карысці, а «новая Еўропа» ў сярэднетэрміновым перыядзе акажацца найслабейшым гульцом у гульні? Мы маем пераканаўчыя сведчанні таго, што Расія

цяпер ужывае «дэмакратызацыйны» падыход, інвестуючы ў развіццё інфраструктуры НДА і спадзеючыся скарыстаць іх у якасці найважнейшых інструментаў для дэстабілізацыі празаходніх урадаў і аднаўлення свайго ўплыву ў такіх краях, як Украіна.

Тры фактары спрыяюць развою істотна новай сітуацыі на постсавецкай прасторы:

1. Высокая цана на паліва, перадусім на нафту.

2. Крызіс мадэлі «мяккай улады» ў Еўрапейскім Саюзе, які выбухнуў, калі французы і галандцы адкінулі еўрапейскую Канстытуцыю.

3. Непасрэдны ўплыў украінскай Памаранчавай рэвалюцыі на расійскае палітычнае мысленне.

Разгледзім іх больш дэталёва.

Па-першае, сучасны энергетычны крызіс дае Расіі цудоўную магчымасць адысці ад мадэлі недарэчнай вайсковай звышдзяржавы і трансфармавацца ў новую звышмагутнасць, гэтым разам энергетычную. Спрыяльныя для Масквы цэны на паліва прынеслі расійскаму ўраду фінансавыя рэсурсы і міжнародны ўплыў, дастатковы, каб весці актыўную вонкавую палітыку ў блізкім замежжы. Па-другое, няцяжка прадказаць, якімі будуць вынікі канстытуцыйнага крызісу ў ЕС для суседзяў Еўрасаюза. Паўстанне «новага ЕС», які дэ-факта згарнуў курс на пашырэнне, зачыніўшы дзверы для Украіны, Грузіі, Малдовы і Беларусі, пакінула прастору для «мяккай улады» Расіі і знізіла прыцягальнасць выбару «еўрапеізатараў». Па-трэцяе, Аранжавая рэвалюцыя ва Украіне была для Расіі амаль тым, чым для ЗША сталася 11 верасня 2001 г.: яна прывяла да рэвалюцыйнага перагляду расійскага замежнапалітычнага мыслення. Да гэтай рэвалюцыі Расія схілялася да разгляду Еўрапейскага Саюза ў якасці добрасумленнага суперніка і стратэгічнага партнёра ва ўласным памкненні да «шматпалярнага свету». Цяпер расійскія эліты бачаць у ЕС галоўную небяспеку. Рэзкую змену настрою лёгка вытлумачыць. ЕС – адзіная звышсіла ў свеце, якая не мае

вызначаных межаў. Што нават больш істотна, ЕС – які ў Маскве раней лічылі інструментам для рэалізацыі замежнапалітычных візій восі Парыж–Берлін (і значыць, сродкам абмежавання гегемanічнай прысутнасці Злучаных Штатаў на еўрапейскім кантыненце) – цяпер трактуецца як інструмент ажыццяўлення амбіцый Вашынгтона і Варшавы.

Зыходзячы з вышэйсказанага, не дзіўна, што галоўнай мэтай новай расійскай палітыкі будзе маргіналізацыя ЕС як суб'екта замежнай палітыкі і зніжэнне статусу «новай» Еўропы. Расія будзе засяроджвацца на двухбаковых адносінах з ключавымі еўрапейскімі дзяржавамі – Францыяй, Германіяй, Італіяй і Вялікабрытаніяй – і пастараецца зрабіць усё магчымае для таго, каб на постсавецкай прасторы не вялося ніякай супольнай «еўрапейскай палітыкі».

ІМПЕРЫЯ ПАЛІТТЭХНОЛАГАЎ

Парадокс гісторыі палягае ў тым, што палітычныя тэхнолагі, а менавіта Глеб Паўлоўскі і ягонае кола – людзі, якія «праляцелі» ва Украіне – з'яўляюцца найбольшымі бенефіцыянтамі новых «постаранжавых» настрояў у Маскве. «Страта Кіева» вынесла гэтых палітычных тэхнолагаў на камандныя вышыні, далучыла іх да працэсу прыняцця рашэнняў у сферы расійскай замежнай палітыкі.

У сакавіку 2005 г. прэзідэнт Пуцін стварыў у сваёй адміністрацыі спецыяльны дэпартамент дзеля прасоўвання расійскага ўплыву на постсавецкай прасторы. Кіраўніком новага дэпартаменту быў прызначаны Мадэст Колераў, знакаміты паліттэхнолаг, які да нядаўняга часу працаваў намеснікам Паўлоўскага ў Фондзе эфектыўнай палітыкі (ФЭП). Насуперак усім прадказанням, групоўка Колерава набыла нечуваны ўплыў у фармаванні палітыкі Пуціна адносна блізкага замежжа. Голас гэтых людзей чуваць найбольш і ў цяперашнім публічным абмеркаванні, «што Расіі рабіць цяпер».

Цяперашні ўплыў палітычных тэхнолагаў на замежную палітыку Расіі ў блізкім замежжы параўнальны толькі з уплывам неакансерватараў на амерыканскую вонкавую

палітыку адразу пасля 11 верасня 2001 г. Паўлоўскага і ягоных памочнікаў ненавідзяць і высмейваюць у маскоўскіх ліберальных асяродках, але яны маюць ідэі – і іхнія ідэі добра кладуцца на цяперашні «постаранжавы» кансенсус у Расіі.

Калі ідзецца пра палітыку Захада ў дачыненні да Расіі, палітычных тэхнолагаў неабходна прымаць усур'ёз. У крамлёўскіх кабінетах, апанаваных пасрэднымі апаратчыкамі, афіцэрамі КГБ, кагэбістамі ў цывільным і бязлітаснымі палітычнымі прадпрымальнікамі з цёмным мінулым, палітычныя тэхнолагі здаюцца людзьмі з іншай планеты. Яны паходзяць з інтэлектуальнага асяроддзя і свету альтэрнатыўнай культуры, чытаюць кнігі і нават іх пішуць. Яны крайне цынічныя, але таксама вельмі вынаходлівыя (Глеб Паўлоўскі адыграў галоўную ролю ва ўвядзенні Інтэрнету ў расійскую палітычную сферу). Яны – антызаходнія заходнікі, экс-лібералы, антыкамуністы, ліберальныя імперыялісты. Гэтыя людзі, верагодна, насамрэч вераць у выгоды і стабільнасць «кіраванай дэмакратыі», вызначанай як умелае спалучэнне мяккіх рэпрэсій і масавага маніпулявання.

Большасць палітычных тэхнолагаў у пэўнай ступені паддаваліся заходняму ўплыву і ў сваёй цяперашняй працы выкарыстоўваюць многія сродкі, якім былі навучаны на Захадзе. Іх бачанне палітычнай сферы – абсалютна элітысцкае. Яно ўяўляе з сябе дзіўную сумесь французскага постмадэрнізму, дысідэнцкай манернасці, кагэбісцкага інструменталізму і постсавецкага цынізму. Да гэтага дадаюцца памкненні да эканамічнай эфектыўнасці і традыцыйная расійская патэтыка. Так, яны вераць у дэмакратыю, аднак іх сапраўдным крэда з'яўляецца не прадстаўнічая, а маніпуляцыйная дэмакратыя. Яны – новае пакаленне будаўнікоў імперыі.

Многія аналітыкі феномену палітычных тэхнолагаў фактычна недаацэньваюць іх ролю. Паліттэхнолагаў малююць або цынічнымі палітычнымі дарадцамі, што ўжываюць брудныя выбарчыя трукі, або бессаромнымі прапагандыстамі ўрадавай палітыкі (вельмі пранікнёны аналіз феномену можна знайсці ў кнізе Эндру Уілсана – *Virtual Politics: Faking Democracy in the Post-*

Soviet World (Yale University Press, 2005).

Па сутнасці, гэтая інтэрпрэтацыя памылковая. «Палітычныя тэхналогіі» складаюцца з людзей, ідэй і інфраструктуры («фабрыкі думкі», інфармацыйныя агенцтвы, медыявыпускі), якія найбольш яўна фармулююць новую палітыку, вызначаную для расійскага ўрада прынамсі да 2008 г. Палітычныя тэхнолагі – не проста інструмент пуцінскай палітыкі; яны – крыніца гэтай палітыкі. Менавіта іх уваходжанне ў сферы, дзе прымаюцца рашэнні, накладае новы адбітак на палітыку Расіі ў блізкім замежжы.

ПРАЕКТ ПАЛІТЫЧНЫХ ТЭХНОЛАГАЎ

У 2003 г. Анатоль Чубайс – колішні лідэр расійскага ліберальнага лагеру (менавіта лібералаў, а не кола прыхільнікаў Паўлоўскага) – абвясціў, што толькі расійская «ліберальная імперыя» выратуе рынкавыя і дэмакратычныя рэформы ў СНД. Уплыў гэтай імперыі мусіў распасціравацца перадусім на Украіну, Беларусь, Казахстан і Малдову, і ў меншай ступені на каўказскія ды цэнтральнаазіяцкія рэспублікі. Імперыя мусіла быць адбудавана ў інстытуцыйных рамках СНД. Меркавалася, што вядучая роля Расіі абумовіцца не так вайсковай магутнасцю, як энергетычнай залежнасцю краін СНД, а таксама прысутнасцю ў іх расійскіх бізнесоўцаў, рэшткамі настальгіі па СССР, расійскім культурным уплывам і панаваннем расійскай мовы. Аўтар праекту асабліва не хаваў таго, што чакае падтрымкі ад заходніх краін. Чубайс прапаноўваў Захаду гешэфт – Захад прызнае краіны СНД сферай расійскага ўплыву, а ўзамен атрымае вольны рынак і дэмакратыю (або прынамсі стабільнасць) у Расіі і ў расійскім наваколлі. На той выпадак, калі б праект «ліберальная імперыя» выклікаў істэрыку ў суседзяў Расіі, Чубайс меў гатовы «ліберальны» адказ: «ад істэрыкі найлепш дапамагае шок, а я маю рэпутацыю «шокавага тэрапеўта».

Аранжавая рэвалюцыя разбурыла гэты праект. Замест яго паўстала стратэгія адбудовы імперыі, дзе Расія спрабуе ператварыцца з дзяржавы, якая падтрымлівае статус-кво, у магутнасць, якая экспартуе змены на постсавецкую прастору (у

ЗША аналагічная трансфармацыя блізкаўсходняй палітыкі адбылася пасля 11 верасня 2001 г.).

Паводле апісанай візіі, Расія перастае быць закладніцай сваіх лаяльных або напаўлаяльных кліентаў, накшталт Эдуарда Шэварднадзе і Леаніда Кучмы. Новая палітыка, натхнёная палітычнымі тэхнолагамі, пазбаўляе Крэмль залежнасці ад мясцовых постсавецкіх эліт. Такім чынам, Масква аказваецца вольнай у кансалідацыі ўласных групаў уплыву. Сярод вагароў кансалідацыі – мабілізацыя этнічных расійцаў, эканамічная прысутнасць Расіі і яе роля як працадаўцы, «апошняй надзеі» для жыхароў еўразійскіх грамадстваў.

Стабільнасць і захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці постсавецкіх дзяржаў больш не з'яўляецца першаснай мэтай у замежнай палітыцы Масквы. Расійская новая стратэгія, якая, зрэшты, яшчэ фармуецца, заключаецца ў экспартаванні ўласнай версіі дэмакратыі і адбудове прарасійскіх груповак у постсавецкіх грамадствах. Пры гэтым у перакручаным выглядзе скарыстоўваюцца прыёмы «негвалтоўнага супраціву» – мадэлі, вынайдзенай моладзевымі рухамі ў суседніх заходніх і паўднёвых краінах. Галоўная мэта новай расійскай палітыкі – развіццё эфектыўнай інфраструктуры, ідэй, інстытуцый, сетак і сродкаў масавай інфармацыі, з дапамогай якіх можна будзе выкарыстаць прадказальны крызіс «аранжавых» рэжымаў для заваёвы ўплыву не проста на ўзроўні ўлады, а і на ўзроўні грамадства. Расія не будзе змагацца супраць дэмакратыі ў гэтых грамадствах. Расія будзе змагацца за дэмакратыю – за *свой* тып дэмакратыі.

Палітыка Масквы ставіць грамадзянскую супольнасць у цэнтр стратэгічных захадаў па «вяртанні» краін постсавецкай прасторы. Паводле аднаго з вядучых паліттэхнолагаў, Сяргея Маркава, рэвалюцыі XXI ст. будуць «рэвалюцыямі грамадскіх арганізацый». Такім рухам не патрэбны ні каардынацыйны цэнтр, ні адзіная ідэалогія; яны плануюцца і распачынаюцца найбольш адкрытым шляхам.

«Рэвалюцыі НДА» – натуральная з'ява ў эпоху глабалізацыі і інфарматызацыі. Бессэнсоўна пратэставаць супраць гэтай рэальнасці», – піша Маркаў. Ён дадае: «Кожны, хто хоча браць

удзел у палітыцы ў XXI ст. мусіць ствараць уласнае сеціва НДА, прыдаўшы ім ідэалогію, грошы і людзей».

Насамрэч, стварэнне структур НДА, дамінаваных Расіяй – фабрык думкі, СМІ, навуковых цэнтраў, – выходзіць на першы план у новай расійскай палітыцы на постсавецкай прасторы. Расія пазіцыянуе сябе як «экспарцёр дэмакратыі». Маскоўскія полісімейкеры запэўніваюць сябе, што наступная рэвалюцыя – скіраваная супраць Віктара Юшчанкі або Міхаіла Саакашвілі – будзе афарбавана ў расійскія колеры, і іх спадзяванні не выглядаюць утапічнымі.

Атрыманне пуцінскай Расіяй найбольшых выгад ад хвалі антырасійскіх каляровых рэвалюцый у Тбілісі і Кіеве – не фантастычны прагноз. Гэта – новая рэальнасць.

Пераклаў з англійскай Уладзімір Паўловіч паводле: www.opendemocracy.net з ласкавай згоды гэтага рэсурсу

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/26
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image][image]2006

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Сяргей Прозараў Расійскі кансерватызм за Пуціным: пашырэнне гегеманісцкага дыскурсу*

СЯРГЕЙ ПРОЗАРАЎ
палітоляг, супрацоўнік катэдры міжнародных дачыненьняў Петразаводзкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Аляксандра Неўскага. Ступень доктара сацыяльных навук атрымаў ува унівэрсытэце фінскага гораду Тампэрэ.

Можна ставіць пад сумнеў вартасць некаторых наступстваў рэвалюцыі, але немажліва не зважаць на выяўлены ёю стан.

Мішэль Фуко

УВОДЗІНЫ. КАНСЕРВАТЫЎНЫ ДЫСКУРС ЯК ПРАСТОРА ПАШЫРЭННЯ

* Друкуецца ў скароце.

У гэтым артыкуле мы паспрабуем вызначыць месца новапаўсталага дыскурсіў- нага поля «кансерватызму» ў кантэксце перафармавання палітычнай прасторы за прэзідэнтам Пуціным. Паколькі цяпер прэзідэнт засяродзіў у сваіх руках вярхоўную палітычную ўладу, на парадак дня выйшла пытанне вызначэння ў расійскай палітыцы вядучай

ідэалогіі. Падчас першай кадэнцыі Пуціна яна паступова артыкулявалася вакол стрыжнявога панятку «кансерватызм». Як спосаб палітычнага самавызначэння кансерватызм мае на мэце зняць бінарныя апазіцыі, характэрныя для расійскай палітыкі ў канцы 1980-х – 1990-х гг.: «дэмакраты» – «камуністы», «лібералы» – «патрыёты». Такім чынам, ідэалагічны гегеманізм шчыльна злучаны са скасаваннем палітычнай палярызацыі, якая пазначала ранні этап посткамунізму ў Расіі. Ён атаясамлівае сябе са стабілізацыяй і кансалідацыяй – паводле пашыранага меркавання, галоўнымі рысамі прэзідэнцтва Пуціна. Але разам з тым, кансерватыўны дыскурс нясе ў сабе і выклік прэзідэнцкай уладзе, бо схіляе яе да яснага палітычнага самавызначэння – а не абранага Пуціным тэхнакратычнага, дэпалітызаванага дыскурсу. Выбары 2003–2004 гг. прыцягнулі ўвагу да праблематыкі кансерватызму, бо абодва пераможцы парламенцкіх выбараў: прапрэзідэнцкая партыя «Единая Россия» і новы рух «Родина» – падкрэслівалі, што пераадолелі супрацьстаянне «левыя» – «правыя», і называлі сябе «кансерватарамі». У паразе традыцыйных «левых» і «правых» палітычных сілаў (КПРФ, СПС, партыі «Яблоко») аналітыкі з радасцю заўважылі расчышчэнне прасторы для новага дыскурсу ў расійскай палітыцы.

Такім чынам, «кансерватызм» стаў вызначальнай рысай паноўнага дыскурсу, адзнакай паўсталай за Пуціным ідэалагічнай гегемоніі. Пры гэтым дыскурсіўная прастора кансерватызму ёсць «прасторай пашырэння» – у поўнай адпаведнасці з азначэньнем дыскурсу, прапанаваным Мішэлем Фуко. Наш дослед дыскурсу расійскага кансерватызму засведчыць, што гэтая прастора *падзяляецца* на дзве антаганістычныя часткі: *ліберальны* і *левы* кансерватызм, як вызначаюць іх самі носьбіты. Больш за тое, гэтая лінія падзелу фактычна раскрывае асноватворную *апазіцыю* ў сучаснай расійскай палітычнай прасторы. Таму, калі разумець дыскурс як шэраг паслядоўных, узаемазвязаных пастулатаў, ідэалагічную або нарматыўную сістэму, немагліва гаварыць пра адзіны «кансерватыўны дыскурс» у Расіі. Насамрэч у гэтай дыскурсіўнай прасторы найбольш звяртае на сябе ўвагу выразная несупастаўнасць паміж рознымі складнікамі,

аб’яднанымі пад рубрыкай «кансерватызм». Аднак лініі падзелу ўнутры гэтай прасторы пашырэння *неад’емна ўласцівыя* расійскаму кансерватызму: яны паўсталі ў рамках самога дыскурсу, і таму ў іх выяўляецца неадрыўная рыса новай гегемоніі, а не сведчанне яго супярэчлівасці, непаслядоўнасці або нясталасці. Адрозна ад іншых нешматлікіх даследаванняў кансерватызму ў Расіі, у гэтым артыкуле не робіцца спробы супаставіць расійскі дыскурс з нейкім гатовым вызначэннем кансерватызму, каб выявіць, чаго бракуе кансерватызму расійскаму. Мы разгледзім «расійскі кансерватызм» як спосаб дыскурсіўнага *самавызначэння* яго носьбітаў. Такім чынам, нас цікавіць не тое, наколькі адпавядае расійскі кансерватыўны дыскурс нейкаму ўсталяванаму панятку, а тое, як перастварaецца сам панятак у кантэксце расійскага посткамунізму. Гэта азначае, што кансерватызм будзе разглядацца як панятак, што акрэслівае шэраг адлеглых дыскурсіўных практык, носьбіты якіх, аднак, называюць сябе кансерватарамі з розных, часам абсалютна несумяшчальных прычын. Зыходзячы з гэтай метадалагічнай перадумовы, мы зусім не ставім сабе спрошчанай задачы вымераць сучасны расійскі кансерватызм паводле нейкай меркі, вызначанай заходняй або расійскай інтэлектуальнай традыцыяй. Мы паспрабуем аддаць належнае паўсталаму кансерватыўнаму дыскурсу, падкрэсліваючы шмат якія ягоныя новыя праявы.

Вядома, выступаючы супраць наперад вызначаных катэгорый, мы адстойваем пазіцыю, супрацьлеглую самазадаволенаму традыцыяналізму, які знаходзіць суцяшэнне ў зацяганым радку Фёдара Цютчава: *«Умом Россию не понять»*.

«На жаль, шмат хто ў тлумачэннях спасылаецца на выключнасць Расіі, яе асаблівыя традыцыі, культуру, рэлігію і г. д. *Такім чынам, развагі пра «выключнасць Расіі» застаюцца абстрактнымі, тэарэтычнымі і ў канчатковым выніку аўтарытарнымі*»[1].

Гэты артыкул зыходзіць якраз з імкнення *«умом Россию понимать»*. Мы лічым, што падобную задачу лепш за ўсё вырашыць, разглядаючы новаўзніклыя практыкі ў іх адметнасці. Неабходна акрэсліць іх неад’емную (і таму

[1] Магун, А. Опыт и понятие

своеасаблівую) *рацыянальнасць*, не зводзячы яе да адзінага квазіуніверсалісцкага *разумення* даследчыка: «Калі *спрабуеш* нешта рацыянальна абгрунтаваць, галоўная праблема тут не ў тым, каб высветліць, ці стасуецца гэта з прынцыпамі рацыянальнага, а ў тым, каб высветліць, *якая канкрэтна рацыянальнасць* тут задзейнічаная»[2]. Замест таго, каб прыпісваць расійскай палітыцы хімерную «культурную выключнасць», мы сцвярджаем выключнасць посткамунізму як *падзеі*. Каб яе зразумець, трэба развітацца з гатовым паняткавым апаратам і пераасэнсаваць тыя падставовыя працэсы, што дзеяліся ў «новапаўсталай» расійскай палітыцы ў 1990-х гг. Да гэтых працэсаў спрабуюць прыстасавацца ўсе складнікі кансерватыўнага дыскурсу, пра якія пойдзе гаворка. Таму апірышчам у нашым аналізе сучаснага дыскурсу расійскага кансерватызму служыць не трывалы мысліцельны канструкт «расійскай традыцыі» (імперскай ці савецкай), а наадварот, глыбокі разрыў з гістарычнай традыцыяй, з якога і паўстала посткамуністычная Расія.

[2] Foucault, Michel. Politics and Reason // Kritzman, Lawrence D., Ed. Michel Foucault: Politics, Philosophy, Culture. Interviews and Other Writings 1977–1984. London: Routledge, 1988. P. 57–59. Курсіў наш.

«ГЭТАЯ ІНШАЯ ДУМКА»: ЛІБЕРАЛЬНЫ КАНСЕРВАТЫЗМ ПА ПУЦІНЫМ.

«ПРАВЫ ПАВАРОТ» І ПУЦІНСКІ ПРАЕКТ

Папулярнасць кансерватызму як спосабу палітычнага самавызначэння значна выросла падчас прэзідэнцтва Пуціна. Аднак сам панятак фігураваў у расійскім палітычным дыскурсе з 1991 г. Праўда, тады кансерватызм хутчэй мроіўся, як здань: існавала вялікая неадпаведнасць паміж няўлоўным ідэалам кансерватызму і яго эмпірычным увасабленнем, якое зрэшты несла расчараванне. Гэтую ідэю выкарыстоўвалі ў сваіх афіцыйных назвах некаторыя палітычныя партыі-прывіды розных арыентацыі: Кансерватыўная партыя Лява Убожкі, Кансерватыўны рух «Новая сіла» Сяргея Кірыенкі і іншыя. Называлі сябе «кансерватарамі» і вядомыя палітычныя аглядальнікі (напрыклад, Андранік Мігранян, Віталь Найшул), каб адрозніваць і ад пераважлівай «ліберальна-дэмакратычнай» палітычнай плыні, і ад апазіцыйных сіл, якія згуртаваліся ў 1990-я гг. вакол «левапатрыятычнай» платформы КПРФ. Упершыню кансерватыўны дыскурс набыў выразныя абрысы падчас выбараў 1999–2000 гг. Часткова на фоне аслаблення палярызаваных «левых» і «правых» сілаў ён

быў пазначаны з'яўленнем фігуры Пуціна, які супрацьстаяў і нацыянал-патрыётам «злева», і заходнікам «справа».

Папулярнасць прэм'ер-міністра Уладзіміра Пуціна хутка расла, і таму паўставала пытанне наконт яго палітычнай платформы. Многія лічылі яе неадназначнай, г. зн. яна не ўкладалася ў дамінантную бінарную схему. Найбольш яскрава гэтая няпэўнасць выявілася ў крылатай фразе «Хто такі містэр Пуцін?». Сур'ёзную спробу адказаць на пытанне зрабіў Леанід Палякоў у артыкуле «Ліберальны кансерватар». На думку Палякова, пуцінская праграма сацыяльна-эканамічных рэформаў *па сутнасці* ліберальная, і таму працягвае асноўны курс прэзідэнцтва Ельцына. Аднак *сітуацыйна* і *стылёва* яна кансерватыўная, таму і ствараецца ўражанне адрознасці паміж Пуціным і Ельцыным. У такім разуменні, якое нагадвае развагі Самуэля Гантынгтана, кансерватызм як «ідэалагічная» арыентацыя не мае ўласнага *сутнаснага ядра* (адрозна ад, напрыклад, лібералізму ці сацыялізму). Ён складаецца з шэрагу *стылёвых* рысаў, супрацьпастаўленых гэткім жа сітуацыйным арыентацыям, як, напрыклад, «рэвалюцыйнасць». Больш за тое, як давёў Гантынгтан, гэтыя стылёвыя рысы могуць выступаць на абарону любога ідэалагічнага зместу або інстытуцыйнага парадку, калі той ужо не бароняць ягоныя ўласныя сродкі. У кантэксце пуцінскага праекту гэтыя стылёвыя рысы ўключаюць у сябе рыторыку кансалідацыі і нармалізацыі жыцця пасля ўсіх закалотаў і супрацьстаяння ў 1990-х гг.; адмову ад вернасці палітычнаму дактрынёрству на карысць «прагматызму»; спыненне суцэльнага ганьбавання савецкай гісторыі; вяртанне да незалежнай міжнароднай палітыкі і г. д.

Палітычны маніфест Пуціна 1999 г. «Расія на мяжы тысячагоддзяў» адкрыта прапануе «прыстасаваць» асноўныя прынцыпы ліберальнай ідэалогіі да расійскай глебы, каб дасягнуць «арганічнага сінтэзу» (тыповая рыса кансерватызму): «Мы можам разлічваць на годную будучыню, адно калі здолеем *універсальныя прынцыпы* рынкавай эканомікі і дэмакратыі арганічна спалучыць *з рэальнасцямі Расіі*»[3]. Больш канкрэтна гэтыя ідэі ўвасобіліся ў пуцінскім праекце «пераўладкавання» вертыкалі і гарызанталі дзяржаўнай улады. Ён меў на мэце вызваліць дзяржаву як суверэнны суб'ект улады ад уплыву,

адпаведна, рэгіянальных і бізнесовых эліт, якія на працягу 1990-х гг. вялі рэй у прасторы дзяржаўнасці, ставячы пад пытанне саму суб'ектнасць дзяржавы. Уведзены Паляковым панятак «сітуацыйны кансерватызм» дазваляе танчэй зразумець «пуцінізм», чым гэта звычайна робяць тыя, хто бачыць у ім толькі «адкат назад» або «рэакцыю» ў параўнанні з ліберальна-дэмакратычным кірункам Ельцына. За Ельцыным антыкамуністычная рэвалюцыя *падштурхнула* да разлому. Далей былі спробы ўвесці элементы ліберальнага ладу пры ўсячасным палітычным супрацьстаянні ды рэзкім аслабленні дзяржаўнасці. За Пуціным відавочна адбываецца спроба *звузіць і прыстасаваць* да расійскай глебы нічым не абмежаванае палітычнае поле праз увядзенне інфраструктуры ліберальнага ладу і яго стабілізацыю – у адпаведнасці з «логікай нармальнага жыцця», як сказаў прэзідэнт.

На думку Ягора Гайдара, прэзідэнцтва Пуціна адкрывае магчымасць для эвалюцыйнай хады ліберальных рэформаў, якія будуць набіраць сілу ў агульнай сацыяльна-палітычнай стабілізацыі і кансалідацыі.

З Путин Владимир. Россия на рубеже тысячелетий // Независимая газета. № 230. 1999.

Дрэйф ліберальнага дыскурсу ў бок кансерватызму дадрабязна абгрунтаваны ў праграмным артыкуле аднаго з лідэраў СПС Аляксея Улюкаева «Правы паварот». Заклікаючы да «правага павароту», аўтар зыходзіў з неабходнасці скасаваць тыя бінарныя апазіцыі ў расійскім палітычным дыскурсе, якія прывялі да заняпаду і дыскрэдытацыі ліберальных сілаў на працягу 1990-х гг.: «рэформы» – «стабільнасць», «лібералізм» – «этатызм», «заходніцтва» – «патрыятызм». Улюкаеў мяркуе, што «правыя сілы» (альтэрнатыўная назва замест дыскрэдытаваных «лібералы» і «дэмакраты») здольныя прапанаваць стратэгію, якая ўключала б дадатныя вартасці абодвух лагераў, спалучала б рэформы і сацыяльную стабільнасць, моцную дзяржаву і свабодную эканоміку, сусветную інтэграцыю і патрыятычныя каштоўнасці.

Стратэгія Улюкаева палягала ў спалучэнні тыпова неаліберальнай універсалізацыі эканамічнай рацыянальнасці з адкрытым услаўленнем моцнай дзяржаўнасці. Дзяржава, на ягоную думку, і не «начны ахоўнік», і не Левіяфан, які

мяшаецца ва ўсе справы, а «служба ратавання». Для Улюкаева расійская вайсковая аперацыя ў Чачэнскай рэспубліцы была ключавым звяном ліберальнага кансерватызму, бо яна сцвярджала найвышэйшую ўладу расійскай дзяржавы насуперак неканстытуцыйнаму сепаратысцкаму рэжыму, нутраная палітыка якога выразна супярэчыла якой бы там ні было версіі лібералізму.

РАЗВІТАННЕ З ПОСТКАМУНІЗМАМ: КАНСЕРВАТЫЎНЫЯ ДЫСКУРСЫ ПАДЧАС ПЕРШАГА ПРЭЗІДЭНЦКАГА ТЭРМІНУ ПУЦІНА

Калі ў 2002–2003 гг. СПС пасунуўся «ўлева», кансерватыўны дыскурс страціў сваё інстытуцыйнае апірышча і расцярушыўся паміж рознымі платформамі. З гэтых дыскурсіўных групаў найбольш ідэалагічна цэльным выглядае «Серафімаўскі клуб», заснаваны ў студзені 2003 г. трыма тэлевядучымі публіцыстычнай праграмы *«Однако»* на расійскім Першым канале: Міхаілам Лявонцьевым, Максімам Сакаловым і Аляксандрам Прывалавым. Да іх далучыўся галоўны рэдактар часопіса для бізнесоўцаў «Эксперт» Валеры Фадзееў.

Мемарандум «Серафімаўскага клуба» (2003 г.) зыходзіў з таго, што немагчыма дасягнуць трывалага эканамічнага росту без адпаведнага «скачка» ў «ідэйным плане». «Ідэйны скачок» мусіць скасаваць бясплённыя палітычныя апазіцыі і запачаткаваць новы ідэалагічны дыскурс. Аўтары мемарандума лічаць асноўнай перашкодай для такога «скачка» псіхалагічную адчужанасць посткамуністычнай эліты ад новага сацыяльна-палітычнага ладу: «Спароджаная катастрофай эліта здольная адно адтварыць сітуацыю катастрофы. Галоўная *бяда расійскай эліты – упэўненасць у тым, што карабель тоне*. Наша млявая эліта скінула краіну з рахункаў». Гэты паразніцкі настрой эліты, на думку аўтараў, не дае заўважыць *ужо дасягнутых* поспехаў ліберальна-дэмакратычных рэфармаў. Сапраўды, «Серафімаўскі клуб» бачыць асноўную рысу ліберальнага кансерватызму ў тым, што ён разглядае 1990-я гг. як перыяд важных *дасягненняў* у палітычнай і эканамічнай трансфармацыі грамадства – цяпер іх трэба ўпарадкаваць, замацаваць і захаваць як падмурак новага ладу.

Дыскурс «Серафімаўскага клуба» ўважае ўмовай стабілізацыі і замацавання рэформаў развіццё «новага патрыятызму» як «арганічны сінтэз Расіі і Свабоды».

Ён набывае канкрэтныя абрысы ў сцвярджэнні ліберальнымі кансерватарамі прынцыпу вяршэнства дзяржаўнай улады як умовы палітычнай суб'ектнасці Расіі. Абарона дзяржавы як палітычнага суб'екта перад наступам глабалізацыі, бадай, цэнтральнае звяно ў (сама)вызначэнні ліберальных кансерватараў. Барыс Мяжуеў зазначыў, што *кансерватар* не столькі ўсхваляе мінуўшчыну, колькі супрацьстаіць *дамінантнаму вобразу будучыні*, які ў цяперашнім кантэксце сімвалізуецца паняткам «глабалізацыя»:

Сучасны кансерватызм можа быць толькі «антыглабалісцкім». Нацыянальны суверэнітэт – гэта свабода нацыі быць сабой. Што такое «быць сабой», вырашаецца ў залежнасці ад сітуацыі: гэтае бытаванне дапускае выбар манархічнай формы праўлення, практыку смяротнай кары і г. д. Я супраць таго, каб звязваць нацыянальную ідэнтычнасць з нейкім канкрэтным грамадскім інстытутам. Яна папросту складаецца са свабоды. А гэтая свабода ў наш час знікае.

Такім чынам, свабода разумеецца не столькі як уласцівасць *асобы*, колькі як характарыстыка *палітычнай супольнасці*, увасобленай у нацыянальнай дзяржаве.

Падобна, што ліберальны кансерватызм, выкладзены ў праекце Пуціна, праграмах лібералаў «правага крыла» і тэкстах «Серафімаўскага клуба», пачынае прэтэндаваць на статус гегемanісцкага дыскурсу. Як сказаў палітычны дарадца Пуціна Глеб Паўлоўскі, у абсягу ліберальнага кансерватызму Пуціну *«папросту няма роўных»*.

Вынікам такога гегемanісцкага насаджэння новага ладу стаў глыбокі разрыў з савецкім мінулым. На думку Глеба Паўлоўскага, «для Расіі СССР больш не з'яўляецца важным аб'ектам суаднясення. Расія *адмаўляецца быць постсавецкай (або антысавецкай) дзяржавай*. Расія – проста Расія, дзяржава, з

якой трэба лічыцца».

«Дэпраблематызацыя» савецкага камуністычнага мінулага яскрава выяўляецца ў прынятым у 2000 г. Законе аб дзяржаўнай сімволіцы, які зацвердзіў адначасова імперскі герб, рэспубліканскі трыкалор і савецкі гімн з новымі, знарочыста нейтральнымі словамі. Такім чынам, можна разглядаць пуцінскі гегеманічны праект як *постпосткамуністычны*, бо ён самаакрэсліваецца ў параўнанні не з савецкай гісторыяй, а з рэвалюцыйнай калатнечай 1990-х гг.

«КАЛАТНЕЧА» ПРАЦЯГВАЕЦЦА: ЛЕВЫ КАНСЕРВАТЫЗМ І ВЯРТАННЕ ПАЛІТЫКІ.

НОВЫ КАНСЕРВАТЫЗМ: ПЕРААСЭНСАВАННЕ ПАНЯТКУ

Ёсць пэўная іронія ў тым, што альтэрнатыўны кансерватыўны дыскурс пачаў з праблематызацыі акурат тых праяў, якія ліберальныя кансерватары лічаць найбольшым дасягненнем Пуціна: кансалідацыі, упарадкавання і дэпалітызацыі грамадскага жыцця. На працягу 2003 г. гэты дыскурс набыў палітычную вагу і ўвасобіўся ў палітычным руху «Родина», заснаваным Сяргеем Глазьевым і Дзмітрыем Рагозіным.

У выпадку з ліберальным кансерватызмам адносна лёгка вызначыць аб'ект «кансервавання» – дасягненні рэформаў 1990-х гг. На першы погляд, цяжка зразумець поўнае іх непрыманне, напрыклад, рухам «Родина», які ўважае сябе кансерватыўным. Таму першаснай задачай «новага кансерватыўнага» дыскурсу стала самавызначэнне і самалегітымацыя *як* кансерватараў. У выніку адбылося інтэлектуальна выбітнае пераасэнсаванне самога панятку «кансерватызм», стрыжнем якога сталі перадусім працы палітычнага філосафа Міхаіла Рэмізава.

Рэмізаў пачынае з эпістэмалагічнай рэканструкцыі панятку «кансерватызм» як «падкрэсленага партыкулярызму». Згадваючы класічнае вызначэнне кансерватызму, дадзенае Эдмундам Бэркам, – перавага прыватнага над усеагульным і звычаяў ды традыцый над рацыянальнымі схемамі, – Рэмізаў супастаўляе яго з іншым падыходам, які адстойвае вяршэнства прыватнага і кантэкстуальнага, – з прапанаванай левымі

«крытыкай ідэалогіі». Яна выкрывае *фактычную* абумоўленасць канкрэтнымі прыватнымі інтарэсамі, што стаіць за прэтэнзіямі ідэалогіі на універсальнасць. Між тым кансерватызм эстэтызуе *прыватнасці*, выяўляе і цэніць іх як такія, у іхных уласных праявах. Такім чынам, кансерватызм эпістэмалагічна вызначаецца як *апалогія традыцыі*, што прымае неадменны плюралізм усіх культур і спосабаў мыслення, *апроч тых*, якія прэтэндуюць на універсальнасць, пазакантэкставасць і шматкультурнасць.

Другая рыса кансерватызму – абавязкова супярэчлівы статус ягонага аб'екта. «Кансерватызм уяўляе сабой інтэлектуальную і эстэтычную *рэканструкцыю* страчанай суцэльнасці жыцця»[4]. Адрозна ад прапанаванага Паляковым сітуацыйнага разумення кансерватызму як замацавання *status quo*, Рэмізаў бачыць кансерватызм як экзістэнцыйна трагічнае ўсведамленне, што аб'екта кансервавання няма.

Рэмізаў разрознівае чатыры «антрапалагічныя» тыпы кансерватызму, прычым два з іх разглядаюцца як нядзейныя, апалітычныя «псеўдамарфозы». Першы, «рэалістычны», тып кансерватызму (не блытаць з традыцыяй палітычнага рэалізму) прымае прагрэсісцкую тэлеалогію і адводзіць сабе роль статычнага элемента ў мадэрнісцкім руху да прагрэсу, гэткага *«тормазу»* ў тэлеалагічным прасоўванні наперад. На расійскім палітычным полі гэтую функцыю выконвала, напрыклад, у 1995–1999 гг. «цэнтрысцкая» партыя «Наш дом – Россия». Яна не супраціўлялася агульнай хадзе ліберальных рэформаў, але крытыкавала спосаб іх вядзення – «шокавую тэрапію». Яна выступала за больш «памяркоўную», «збалансаваную» і «прагматычную» стратэгію рэформаў.

Другі «антрапалагічны» тып кансерватара, паводле Рэмізава, – «рыцар немагчымага». Гэтая постаць адмаўляецца ад усялякага ўдзелу ў «эвалюцыйным» працэсе і задавальняецца выкрыццём грахоў свету з бяспечнай адлегласці. «Рыцар немагчымага» выступае ў ролі суддзі і ахвяры наяўнага ладу, але, вырваны з прасторы і часу ў сваім амаль камічным чаплянні за рэшткі мінуўшчыны, ён фактычна толькі спрыяе захаванню гэтага ладу. У сучасным кантэксце прыкладам такой пазіцыі могуць

[4] Ремизов, Михаил. Опыты антрапологии консерватизма. Опыт первой кладоморфозы // Русский журнал, 2000. (У арыгінале «Консерватизм обретает себя как интеллектуальная и эстетическая реконструкция утраченной «полноты жизни».

служыць артадаксальныя марксісты-ленінцы з «левага крыла» КПРФ.

На думку Рэмізава, ці здолее кансерватызм набыць палітычную значнасць, залежыць ад таго, ці зможа ён прапанаваць кардынальнае эпістэмалагічнае пераасэнсаванне «малэрнага» светапогляду. Выконваючы гэтую задачу, *кансерватары не могуць не быць радыкаламі*, бо радыкалізм акурат і ёсць уменнем паставіць пад сумнеў самавідавочнае, трансфармаваць базавыя коды рэчаіснасці. У выніку, рэалісты зробяцца *цынікамі*, а «рыцары немагчымага» не прамінуць саслізнуць у *экстрэмізм*. *Цынікі* – гэта рэалісты, якія пазбавіліся ўсіх «ідэалаў» ды маральных нормаў і ставяць на першае месца грубую *эмпірыку існавання* ды выхваляюць найвышэйшую ўладу. Калі кансерватыўны рэалізм увасабляецца ў дэпалітызаванай постаці бюракрата, то цынізм – у фігуры «прыдворнага дарадцы», лаяльнага да любой наяўнай моцнай улады[5].

Адрозна ад цынізму, экстрэмізм застаецца пазіцыяй «вонкавага назіральніка», але ператварае ў палітычную сілу самога факту «вонкавасць». Экстрэмісцкі кансерватызм адкрыта спрабуе прапаноўваць акты палітычнай волі, што «зыходзіць зніадкуль», стварыць тое, што ўжо існуе. Такім чынам, новая аб'ектыўная дадзенасць ствараецца чыста суб'ектыўным актам, які *ўсведамляе сябе як такі*. «Гісторыя пойдзе туды, куды ёй загадаюць, і свет ствараюцца з нічога – ці ж не праўда, у гэтым апафеозе суб'екта кансерватызм становіцца *ідэалогіяй свабоды ў глыбокім сэнсе, антыліберальным сэнсе?*» – піша Рэмізаў.

Расійскі «новы кансерватызм», да якога належыць і Рэмізаў, вагаецца паміж цынічным і экстрэмісцкім полюсамі «радыкальнага кансерватызму». Аднак цынізм з ягоным «апафеозам палітыкі» ў расійскім кантэксце здаецца недзеяздольным, бо, па-першае, «новыя кансерватары» адчужаныя ад новай расійскай дзяржавы, і па-другое, Пуцін у часе свайго прэзідэнцтва імкнецца дэпалітызаваць грамадства.

ЛЕВАКАНСЕРВАТЫЎНАЯ АПАЗІЦЫЯ: ШЛЯХ ДА АГУЛЬНАЙ

[5] Вонкавага таксама: Ремизов, Михаил. Опыты антропологии консерватизма. Опыт второй: улица non grata // Русский журнал. 2000.

[5] Вонкавага таксама: Schmitt, Carl. Political Theology. Four Chapters on the Concept of Sovereignty. Cambridge: The MIT Press, 1985. P. 15–16.

ДЭЛЕГІТЫМАЦЫІ 1990-Х

Першая ключавая рыса «новага кансерватызму» – ягоная непрымірымая апазіцыя да палітычнага рэжыму, што склаўся ў выніку антыкамуністычнай рэвалюцыі ў жніўні 1991 г. «Новыя кансерватары» супраціўляюцца таксама *паступовай легітымацыі «алігархічнага капіталізму»* як «гістарычнага факта» і прызнанню пострэвалюцыйнага ладу як «новай аб'ектыўнай дадзенасці». На думку Рэмізава, лібералы, якія, на першы погляд, з трыумфам выйшлі з «грамадзянскай вайны» 1991–1993 гг., не здолелі стаць *пераможцамі* ў гэтай вайне якраз таму, што не ператварылі сваю перамогу ў гегеманісцкі праект, не дэпалітызавалі момант заснавання як падмурак новага ладу і ў выніку *не універсалізавалі* сваю выразна партыкулярысцкую, нават сектанцкую пазіцыю[6]. Рэмізаў бачыць у гэтым неадпаведнасць самога панятку «рэвалюцыя» датычна падзей пачатку 1990-х гг. Ён мяркуе, што гэты час трэба называць «калатнечай» («*смутой*»): «Рэвалюцыя *пачынаецца* ў той момант, калі прэтэндуючы на панаванне новамабілізаваны (новомобилизованный) суб'ект выходзіць на сцэну. Калатнеча ў гэты самы момант *завяршаецца*».

Калі ўспрымаць падзеі 1991 г. як рэвалюцыю, тады магчыма, ўспрымаць сучаснасць у ліберальна-кансерватыўным рэжыме стабілізацыі і нармалізацыі, крышталізацыі «грамадскай энергіі», вызваленай у рэвалюцыйны перыяд. І наадварот, калі ўяўляць 1990-я гг. як «час калатнечы», то цяпер трэба думаць не пра стабілізацыю, а пра *запачаткаванне* новай рэвалюцыйнай суб'ектнасці – аднак пуцінскі «прагматызм» зусім не адпавядае гэтай задачы. Гэтак выяўляецца асноўнае разыходжанне паміж ліберальным і новым кансерватызмам: апошні адмаўляе саму *легітымнасць* новай Расіі – а першы імкнецца замацаваць яе ў якасці *суверэннага палітычнага суб'екта*. «Новыя кансерватары» бачаць у «жнівеньскай рэвалюцыі» не момант заснавання новай расійскай гісторыі, а яе «чорную дзірку». Падзенне савецкага ладу ўспрымаецца ў чыста негатыўных танах – як катастрофа, з якой распачалася эпоха нігілізму і разбурэння. Таму тэксты прыхільнікаў «новага кансерватызму» ў 2003–2004 гг. адзначаныя горкай трывогай адносна «немагчымай» ліберальна-кансерватыўнай гегемоніі: «Дзесяцігоддзя рэформ хапіла, каб зжыцца з «закінутасцю-ў-рынку» як з чымсьці непазбежным; двух гадоў пуцінскага

[6] Речыма Мухаш. Прадчувствие суверена // Русский журнал. 2003.

«кіравання» хапіла, каб *спантанна… легітымаваць постсавецкую структурную дэградацыю соцыуму… як адбытую (состоявшуюся) і паўнавартую рэчаіснасць»*[7].

У 2003 г. «новая кансерватыўная» плынь дыскурсу вызначыла сябе як «*левакансерватыўную апазіцыю*» ўладзе Пуціна. «Левізна» новага кансерватызму канкрэтна ўвасабляецца ў патрабаванні карэнным чынам перагледзець вынікі прыватызацыі і ў непрыманні алігархічнага рэжыму, які паўстаў у 1990-я гг. Левыя кансерватары нічога не маюць супраць рынкавай эканомікі ў прынцыпе, але падкрэсліваюць неправамоцнасць расійскай прыватызацыі, асабліва ў галіне прыродных рэсурсаў.

[7] Земцов Михаил. Русский вне себя, или Консерватизм против национализма. Зимцов по следам.

Левакансерватыўную апазіцыю найперш адрозніваe крытычнае стаўленне да універсалізацыі *эканамічнай рацыянальнасці* – а ёю наскрозь працяты ўвесь дыскурс прэзідэнцтва Пуціна. Нават уладныя механізмы і захады дзяржавы падпарадкоўваюцца логіцы эканамічнай эфектыўнасці, а доўгачаканая «расійская нацыянальная ідэя» падносіцца ў форме «эфектыўнай дзяржаўнасці». Рэмізаў жа выкрывае эканомікацэнтрычны прагматызм як сродак татальнай дэпалітызацыі:

Рэч не ў тым, зразумела, наколькі згубная эканамічная рацыянальнасць, а ў тым, што згубныя спробы ператварыць яе ва універсальную мадэль грамадскіх адносін і разглядаць рынак як матрыцу самога грамадства. Але акурат гэта, здаецца, і адбываецца, калі прэзідэнт прапануе бачыць у эфектыўнасці і канкурэнтаздольнасці вычарпальнае выражэнне «нашай нацыянальнай ідэі». Прэтэндуючы на заступленне Цэлага, усякая рацыянальнасць выраджаецца ў рацыяналізм.

Крытыка «прагматызму» закранае і шырэйшыя аспекты пуцінскага праекту, асабліва ўключаную ў яго атмасферу нармалізацыі, кансалідацыі і згоды. Рэмізаў бачыць у гэтай «нармалізацыі» ўкараненне скрайняй абыякавасці да палітыкі, калі ў неструктураванай і аморфнай прасторы «пазітыўнай індыферэнтнасці» да прэзідэнта знікае сам змест палітыкі. Як паказваюць апытанні, т. зв. «пуцінскую большасць», або 70 % электарату, аб’ядноўваюць асцярожныя сімпатыі да прэзідэнта:

яму давяраюць значна менш, чым сямейнікам, і трохі больш, чым калегам па працы.

Апроч таго, левы кансерватызм істотна розніцца ад дактрынёрскай ідэалогіі савецкага камунізму прыманнем і актыўным прасоўваннем палітычнага плюралізму, нават у яго найбольш антаганістычных формах. Плюралізм бачыцца неабходнай умовай, каб разарваць дэпалітызаваны «апатычны кансенсус» у расійскім грамадстве.

Акурат таму, што левыя кансерватары не могуць у гэтым пункце заняць дыскурсіўную пазіцыю, блізкую да носьбіта ўлады (і стаць «цынікамі»), яны схіляюцца да экстрэмізму, калі канфлікт *вітаецца* як «момант Рэальнага» ў падманнай цішы дэпалітызацыі.

Для ліберальных кансерватараў пуцінізм – проста лагічнае завяршэнне нігілізму 1990-х гг.: калі Пуцін – патрыёт айчыны, ягоная «айчына» – «новая Расія» дэкадэнцкага геданізму. Левыя ж кансерватары бачаць у ёй жахлівую гістарычную выпадковасць. «Дыягназ» левых кансерватараў пацвердзіла пасланне Пуціна 2004 г. да Федэральнага сходу: у ім расійская нацыянальная ідэя фармулявалася ў выглядзе трыяды «бяспека, свабода і камфорт». Як адзначыў Станіслаў Бялкоўскі, «прамова засведчыла, што Пуцін – *апантаны антыкансерватар*, г. зн. *радыкальны ліберал* з галавы да ног», што дало аўтару падставу назваць свой артыкул *«Пуцін ператвараецца ў Чубайса»*[8].

Такім чынам, левыя кансерватары або застануцца вернымі сваім ідэалам, або разарвуць наяўны палітычны кансенсус і адмовяцца выказваць пашану да носьбіта ўлады.

[8] Belkovsky, Stanislav. Paternalism Abandoned: Putin Becomes Chubais // Moscow Times. 2004. May 27.

РАСІЙСКІ КАНСЕРВАТЫЗМ І 1990-Я: ТРАЎМА І СЦІРАННЕ ПАДЗЕІ

Пасля выбараў 2003 гг. часта прапаноўваецца такое бачанне палітычнага спектру, дзе супрацьлеглыя скрайнія пазіцыі акрэсліваюць Дзмітры Рагозін («Родина») і Анатоль Чубайс (СПС), а прэзідэнт Пуцін аднаасобна займае гегемanісцкае цэнтральнае становішча. Відавочна, гэта досыць спрошчаны

падыход – палітычны спектр Расіі застаецца моцна фрагментаваны. Але для нас істотна, што ў такім выпадку насоўваецца зусім нечаканая выснова: кансерватыўны дыскурс, пашыраны на «левых» і «правых», цяпер вызначае *ўсю* палітычную прастору Расіі. Аднак дзве дыскурсіўныя плыні скіраваныя на абсалютна розныя «аб'екты кансервацыі»: для ліберальных кансерватараў гэта паўсталая пасля 1991 г. «новая Расія», а для левакансерватыўнага крыла – футурыстычная «суверэнная Расія», шлях да якой палягае праз «рэстаўрацыю будучыні». Яднае гэтыя адрозныя плыні ў гегеманічны сплаў тое, што абедзве на першае месца ставяць прынцып суверэннай улады, бачаць Расію як незалежны палітычны суб'ект, «саматоеснасць» якога не залежыць ад прызнання звонку. Апроч таго, кансерватары ўсіх кірункаў імкнуцца пераадолець хісткасць і нестабільнасць, уласцівыя расійскай палітыцы ў 1990-я гг.

Разам з тым, падыход Фуко да дыскурсу як да сістэмы пашырэння вымагае чуйнасці да *тактычнага шматгалосся* дыскурсіўных практык, бо яны могуць дзейнічаць у рэжыме як падтрымкі гегеманічнага поля, гэтак і супраціву. Пры цяперашнім раскладзе акурат «экстрэмісцкі» левы кансерватызм спрыяе плюралізацыі палітычнай прасторы і ўвасабляе *супраціў* пуцінскай гегемоніі. «Рэпалітызацыю» дыскурсу нельга прыраўняць да настальгіі па савецкім часе: у левых кансерватараў з ідэалогіяй савецкага камунізму ёсць толькі адная супольная рыса – стаўленне да развалу СССР як да гістарычнай катастрофы. З пункту гледжання палітолага, адна з найцікавейшых рыс левага кансерватызму – ягоная інтэлектуальная навізна, асабліва выкарыстанне здабыткаў сучаснай заходняй філасофіі постструктуралізму, або «постмадэрнізму», і засваенне філасофскай спадчыны Ніцшэ і Хайдэгера. Дзіўна, але вызначэнне «маладыя кансерватары», як назваў французскіх постструктуралістаў Габермас, абсалютна пасуе да расійскага кантэксту: найбольш плённа ў рэчышчы постструктуралісцкай крытыкі працуюць у «кансерватыўным» палітычным лагеры, і найчасцей маладыя даследчыкі. Мабыць, у некаторай ступені гэта і заканамерна, калі бачыць у постструктуралізме *немарксісцкую крытыку лібералізму*. Да таго ж у кантэксце пастаянных высілкаў Расіі «дагнаць» Захад

або «інтэгравацца» ў яго моцная крытыка Захаду ў заходняй постструктуралісцкай філасофіі сапраўды можа прымусіць задумацца, а ці варта пераймаць заходнія ўзоры. Да гэтай праблемы ўвесь час звяртаюцца левакансерватыўныя крытыкі. Апроч таго, шмат у якіх аспектах левы кансерватызм сам выступае магутнай спробай *дэканструкцыі «пуцінізму»*.

Гэтая крытычная пазіцыя левага кансерватызму таксама сведчыць, што адзінай сапраўды апазіцыйнай сілай у сучаснай Расіі застаецца *апазіцыя да пуцінскага лібералізму*, якая спрыяе пашырэнню плюралізму ў расійскай палітыцы. Прыйсці да ўлады ёй замінае гегеманізм пуцінскай «кіраванай дэмакратыі». На ўзроўні *палітычнай анталогіі* левы кансерватызм, адрозна ад ліберальных кансерватараў з іх схільнасцю да дэпалітызацыі, вяртае да жыцця прывід палітыкі, выяўляе язвы новага парадку і спрабуе надаць ім палітычнае гучанне. У той жа час, на ўзроўні канкрэтнай праграмы перагляду вынікаў посткамуністычных сацыяльна-эканамічных рэформаў левыя кансерватары раскрываюць уяўнасць рэвалюцыйнай сітуацыі 1990-х гг., адпрэчваюць гэты перыяд як нешта «несапраўднае», «час калатнечы», не варты імя Рэвалюцыі.

Наважымся сцвердзіць, што, нягледзячы на іхныя адрозненні, *абедзве* плыні кансерватыўнага дыскурсу спрабуюць сцерці з памяці перыяд посткамунізму: адна – праз яго *дэпалітызацыю*, другая – праз *дэманізацыю*. Гэтая «нявернасць» рэвалюцыі сведчыць пра «траўму» ад сутыкнення з «Рэальным» – у прапанаваным Жыжакам сэнсе. «Рэальным» жа выступае досвед 1990-х гг. як сапраўды рэвалюцыйная Падзея. У эпіграфе мы прывялі выказванне Фуко, з якога вынікае, што рэвалюцыя – гэта хутчэй экзістэнцыйны стан, чым канкрэтныя перамены. Прапанаваны Жыжакам канцэпт рэвалюцыйнай траўмы таксама падкрэслівае: сутнасць рэвалюцыі – не ў яе дадатных набытках, а ў *негатыўнасці*, якую яна выяўляе ў самай глыбіні грамадскага ладу. Як сцвярджаюць і Шміт, і постструктуралісты, «грамадства» (ці любая іншая форма чалавечай арганізацыі) *не можа існаваць*, калі пастаянна патанае ў язвах. У расійскім кантэксце «1990-я гады» сталі акурат сімвалам гэтых балячак.

Тым не менш, было б залішне лёгка (і банальна як з філасофскага, гэтак і з палітычнага гледзішча) зрабіць адсюль выснову пра *няіснасць* падзеі заснавання. Замест гэтага мы ўслед за Жыжакам паўторым, што «Рэальнае *здараецца*», рэвалюцыйная падзея *адбываецца*, невырашальнае *вырашаецца* – акурат *гэта* і *немагчыма* прыняць. Такім чынам, расійскі кансерватыўны дыскурс у абодвух сваіх варыянтах адзначаны траўмай – усведамленнем немагчымасці таго, што насамрэч адбылося. Як пісаў Арцемі Магун пра адначасовую абмежаванасць і ўсёахопнасць расійскай рэвалюцыі 1991 г., «рэвалюцыйнае адмаўленне не мае ніякага зместу, яно ніяк не вызначана... Рэвалюцыя проста заключаецца ў тым, што *нешта* зрушылася з мёртвай кропкі, *нешта здзеялася*». У перыядзе палітызацыі 1990-х гг. можна ўгледзець Падзею, што *не зводзіцца да звыклага ладу быцця*, радыкальны акт свабоды, які выяўляецца ў адвольным заснаванні «зніадкуль». Таму ён нязручны і для ліберальных, і для левых кансерватараў. Для першых – бо даказвае абсалютна некансерватыўнае паходжанне аб'екта кансервавання. Для другіх – бо сведчыць пра поўную абыякавасць самога прынцыпу палітычнага да зместу канкрэтнага акта заснавання. І тым не менш, варта быць стрыманымі, асуджаючы расійскіх кансерватараў за непрыманне 1990-х гг., хоць бы таму, што *сапраўды палітычная палітыка* (г. зн. чуйная да «немагчымага», да апорый у сабе) яшчэ чакае свайго ўвасаблення.

З ангельскай мовы пераклаў Вольф Рубінчык паводле: Journal of Political Ideologies. 10 (2). June 2005. P. 121–143.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/26
[image]

Міфы ЕЗ (3'2000)

[image]
ARCHE Пачатак № 1,2 (41,42) - 2006
[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image] [image] [image] [

уніфікаванай аднаўзроўневай або шматузроўневай, цэнтралізаванай або дэцэнтралізаванай і г. д. Вядома нават спрэчка, ці можа ЕЗ як адзінка ўвогуле ўяўляць змястоўны аб'ект для аналізу (мы звернемся да гэтага пытання далей). Зразумела, дзяржавы – не адзінае, магчыма, цяпер ужо і не галоўныя дзейныя суб'екты рэгіянальнай (ц)і міжнароднай сістэмы. Тым не менш, агляд літаратуры па ЕЗ, аналіз яе канцэптуальных паняткаў і расстаноўкі акцэнтаў выяўляе, прынамсі, пакрыёмую схільнасць аўтараў бачыць ЕЗ праз акуляры «заходнееўрапейскай дзяржавы». Сюды дадаецца (і, на нашу думку, часткова тлумачыць такі погляд) ці не супольная для ўсіх тэндэнцыя абмінаць увагай вонкавыя аспекты дзейнасці структур ЕЗ. А яны маглі б дапамагчы кінуць свяцло на спецыфіку Еўразвяза як рэальнай адзінкі.

**На першым (агульнатэарэтычным) узроўні Еўразвяз можа быць добра ўпісаны ў тэарэтычныя выбары, якія ўжываюцца ў адносінах да іншых, вядомых і ўсталяваных, дзяржаў. Ён мае шматузроўневую бюракратычную сістэму, якая ўключае ў сябе Еўрапарламент, Раду міністраў, Еўрапейскую камісію, Еўрапейскі суд, Еўрапейскі цэнтральны банк, Еўрапейскі рахункавы суд і г. д. Ён мае свой бюджэт, свае ўласныя крыніцы даходаў, сваю сімволіку і гімн, свой грошавы знак – еўра, свой герб, свой сцяг, свой дзень нараджэння (9 мая), свой дзень Еўропы (5 мая), свой дзень Еўразвяза (1 мая), свой дзень Еўрапейскага суда (8 мая), свой дзень Еўрапейскага парламента (2 мая), свой дзень Еўрапейскага цэнтральнага банка (1 чэрвеня), свой дзень Еўрапейскага рахункавага суда (1 лістапада

паўстала толькі ў кантэксце «пашырэння на Усход» – на Амстэрдамскім саміце 1997 г. Інстытуцыйны палітычны механізм, што дзее ў маштабе ЕЗ, нядаўна выпрацаваў юрыдычны дакумент пад назвай «Канстытуцыя» – цяпер яго мусяць ратыфікаваць дзяржавы-ўдзельніцы. Апрача ўсяго, ЕЗ мае за мяжой пасольствы і стала падпісвае дамовы з асобнымі дзяржавамі. Нарэшце – магчыма, гэта самае важнае – ЕЗ набыў пэўную палітычную вагу, што выяўляецца і ва ўздзеянні на бліжэйшых суседзяў, і ў пашырэнні свайго ўплыву ў астатнім свеце. (Тут з Еўразвязам могуць параўнацца адно некалькі суб'ектаў сусветнай палітычнай сцэны, прычым усе яны – дзяржавы.) Калі браць пад увагу названыя рысы, ЕЗ смела можна назваць нейкай *уладнай структурай*, што ў некаторых важных аспектах нагадвае дзяржаву.

Аднак у арганізацыі ЕЗ ёсць адметнасць, якая істотна адрозніває яго ад дзяржавы ў агульнапрынятым значэнні: у ЕЗ *няма выканаўчага апарату*. Можна называць Камісію – «ўрадам ЕЗ», але пакуль у ЕЗ няма ўласных выканаўчых інстытутаў[3] на ніжэйшым за дырэкцыі ўзроўні, гэты орган застаецца проста метафарай. Паводле вызначэння, Макса Вебера, дзяржава – гэта арганізацыя, якая мае манаполію на законнае ўжыванне гвалту на пэўнай тэрыторыі. ЕЗ такой манаполіі не мае. Насамрэч, у яго практычна няма ўласных сілаў бяспекі, за выняткам нядаўна заснаваных, але не зусім дзейных сілаў хуткага рэагавання (іх камандны і структуры і задачы пакуль належным чынам не вызначаныя).

[3] Адзінае выключэнне – Еўрапейскі інстытут міжнароднай палітычнай эканоміі ў Мюнхэне, створаны ў 2007 г. Еўразвязам сумесна з Аўстрыяй, урад якой выдаткаваў на яго будаўніцтва 14 актаў байкоту. Тым часам старшыня Еўракамісіі Жазэ Мануэл Баршчу ўзначаліў камісію, якая распрацавала новую канстытуцыйную дамову ЕЗ, што ўступіла ў сілу ў 2009 г. Праект дамовы быў адхілены на першых выбарах пасля ўступлення Аўстрыі ў ЕЗ, усе дзяржавы ЕЗ прынялі рашэнне аднавіць дыпламатычныя адносіны з Аўстрыяй, якія былі прыпынены ў 2000 г. Прысутнасць крайне правых (ці ксенафобскіх партый) у розных урадах іншых дзяржаў ЕЗ не выклікала падобнай рэакцыі з боку ЕЗ.

[4] У панятку 2000 г. ўкалі ультраправая, ксенафобская партыя атрымала больш як палову месцаў у аўстрыйскім парламенце на першых выбарах пасля ўступлення Аўстрыі ў ЕЗ, усе дзяржавы ЕЗ прынялі рашэнне аднавіць двухбаковыя сувязі з Аўстрыяй, прыпыненыя 14 актаў байкоту. Тым часам старшыня Еўракамісіі Жазэ Мануэл Баршчу ўзначаліў камісію, якая распрацавала новую канстытуцыйную дамову ЕЗ, што ўступіла ў сілу ў 2009 г. Праект дамовы быў адхілены

бокуЕўракамісіі.

Нехта, вядома, запярэчыць, што існуюць дзяржавы – напрыклад, у посткаланіяльным або постсацыялістычным трэцім свеце, – у якіх апарат кіравання настолькі падарваны разнастайнымі палітычнымі і эканамічнымі крызісамі, што сама дзяржава фактычна не ў стане выконваць дзяржаўных функцый. Аднак ЕЗ не належыць да некіраваных дзяржаў з разбураным або бездапаможным перад абліччам вонкавых сілаў выканаўчым апаратам. У нашым разуменні ЕЗ адрозніваецца тым, што ён *ніколі не меў* і нават не спрабаваў развіць *ніякага выканаўчага апарату*, а тым не менш, даволі эфектыўна дзейнічае і набыў *значны ўплыў у свеце*.

УЛАДНАЯ СТРУКТУРА БЕЗ АПАРАТУ: АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ РАШЭННЯЎ ПРАЗ КАНАЛЫ ЗАЛЕЖНАСЦІ

Як жа тады ЕЗ з поспехам дамагаецца выканання *Acquis* і ў межах арганізацыі, і па-за імі? І што яшчэ больш істотна: калі Еўразвяз – не дзяржава, якім чынам ён выконвае найважнейшую геапалітычную задачу – змяняе сабе на карысць сваё атачэнне, што ўтвараецца з дзяржаў? Іншымі словамі, як можа дзейнічаць уладная структура без манаполіі на сродкі прымусу?

Пры бліжэйшым разглядзе адкрываецца разгалінаваная сістэма з чатырох галоўных механізмаў, праз якія ЕЗ дабіваецца выканання *Acquis* і распаўсюджвае свой уплыў вонкі. Яе складнікі – апараты дзяржаў-удзельніц, міжурадавыя арганізацыі, працэс «пашырэння на Усход» і, нарэшце, транснацыянальныя карпарацыі. Далей мы больш падрабязна засяродзімся на кожным з гэтых чатырох механізмаў дзейнасці Еўразвязу.

Апарат дзяржаў-удзельніц ЕЗ

Па-першае, ЕЗ забяспечвае выкананне *Acquis* і прасоўвае свае геапалітычныя інтарэсы праз апараты дзяржаў-удзельніц. Паўнапраўны ўдзел у ЕЗ вымагае, каб дзяржава трымалася

нормаў *Acquis* нароўні з уласным заканадаўствам. Безумоўна, гэта стварае пэўныя палітычныя цяжкасці, бо сістэма легітымнай улады дзяржаў у складзе ЕЗ радыкальна розніцца ад ягоных шматлікіх заканадаўчых і кіраўнічых органаў. У гэтым сэнсе добра вядомая элегантная афіцыйная фармулёўка, паводле якой ЕЗ – гэта арганізацыя, якая «падзяляе з дзяржавамі-ўдзельніцамі і яднае іх суверэнітэт»[5]. Гэта фраза апісвае дагаворныя сувязі, праз якія ЕЗ «едзе верхам» на дзяржавах-удзельніцах і ў выніку робіцца метадзяржавай.

Аднак метадзяржава не тое самае, што дзяржава. У дзяржаве выканаўчая ўлада абавязкова абапіраецца на сувязь заканадаўчых органаў з супольнасцю грамадзян як уособленую законнае ўлады. Без свайго выканаўчага апарату ЕЗ застаецца на крок далей ад крыніцы легітымнасці. Гэта дазваляе глыбокі, часта непераадольны разрыў у надзвычай складаных і далікатных стасунках паміж грамадзянамі і заканадаўчымі выканаўчым апаратам «іх» дзяржавы. Заходнееўрапейскія выяўляюць меншую актыўнасць на выбарах у Еўрапарламент, чым у заканадаўчыя органы сваіх краін. Разрыў складаў сярэднім 24,4 % галасоў, прычым вагаецца[6] ад 2,9 % у і 10,4 % у Літве да 53,4 % у Славакіі і 42,5 % у Шве толькі адно сведчанне, наколькі хісткая легітымнасць метадзяржавы. Калі сёння ў Заходняй Еўропе гучаць выступленні супраць Еўразвяза (як правіла, з боку правых), то ў іх пераважна падкрэсліваецца гэты сур'ёзна непакоіць грамадзян цяперашніх дзяржаў таго, ён дадае падстаў абвінавачваць ЕЗ у недэмакр

Міжурадавыя арганізацыі

Другі, і нават цікавейшы механізм, праз які Еўразвяз ажыццяўляе свой немалы ўплыў, асабліва па-за межамі ЕЗ, – адначасовая прыналежнасць дзяржаў ЕЗ да міжурадавых арганізацый і стратэгічных альянсаў: СГА, МВФ, ЕБРР, ЗЕЗ, АБСЕ, ААН з усімі яе спецыялізаванымі ўстановамі і НАТО. Ваенная моц застаецца адным з найістотнейшых дзяржаўных атрыбутаў і, відавочна, мае першачарговае значэнне ва ўздзеянні вялікіх дзяржаў на міжнароднае становішча. Таму, каб зразумець прыроду ўладнай структуры, трэба перш за ўсё

[5] Гэтая фраза ўжываецца ў афіцыйных дакументах ЕЗ. Найбольш яскравае яе выкарыстанне належыць былому прэзідэнту Еўрапейскай камісіі Жаку Дэлёру (1985–1994 гг.).

[6] Гл. Thomas Christiansen, Knud Erik Jørgensen, Antje Wiener (eds.), The Social Construction of Europe, London: Sage, 2001, p. 2.

разгледзець, як арганізаваная яе абарона.

Высвятляецца, што глабальная, стратэгічная абарона ЕЗ забяспечваецца сіламі НАТО – праз шэраг насамрэч значна буйнейшых інстытуцыйных механізмаў, зусім не падобных да простага «падзялення і яднання» ваеннага комплексу дзяржаў-

спасылкі даюцца па стане на 5 снежня 2003 г.

6 Вельніц Дж. Стэмбург зрабіў такім чынам ЕЗ сіламі НАТО, таму што іх мэты амаль (але не дакладна) супадаюць, а таксама таму, што ўдзел дзяржаў ЕЗ у такіх двух арганізацыях, як НАТО і Захадне-еўрапейскі саюз, ніяк не абмяжоўваецца. Гл. Wellenstein J. Der Sturz des Sisyphos. Die Europäische Union und die Nato. Baden-Baden, 2004. S. 11.

Такім чынам, гісторыя Еўразвяза бярэ пачатак з гэтага 45-гадовага геапалітычнага супрацьстаяння. Такім чынам, ЕЗ паспяхова перадае НАТО, хай і праз дзяржавы ў яе складзе, адзін з ключавых атрыбутаў дзяржаўнасці – абарону. Так бы мовіць, ЕЗ наймае НАТО субпадрадчыкам. Пагадненне сапраўды адметнае: вонкавая абарона Еўразвяза забяспечваецца (і ў пэўнай ступені аплачваецца) арганізацыяй, якую не кантралююць ні сам ЕЗ, ні яго дзяржавы-ўдзельніцы. Гэта сведчыць пра існаванне ў сучасным свеце асабліва моцных геапалітычных сувязяў паміж паўночнаамерыканскім і заходнееўрапейскім цэнтрамі эканамічных і палітычных інтарэсаў. Але да іх мы яшчэ неўзабаве вернемся.

«Пашырэнне на Усход»

Трэці важны механізм, праз які ЕЗ дасягае выканання *Acquis*, – праект «пашырэння на Усход», калі ўлада Еўразвяза распаўсюджваецца на дзяржавы ўздоўж яго ўсходніх і паўднёва-ўсходніх межаў. Найважнейшая *перадумова*, каб падаць заяўку на паўнапраўны ўдзел у ЕЗ, і адзін з вызначальных крытэраў, паводле якога ўвесь час ацэньваюцца дзяржавы-прэтэндэнты, – прыняцце і выкананне *Acquis*. Дзяржавы-прэтэндэнты пагаджаюцца наўпрост падпарадкоўвацца заканадаўству Еўразвяза і часткова саступіць суверэнітэт на карысць замежнага ўладнага органа – і наўзамен атрымліваюць права на асацыяваны ўдзел у ЕЗ і няпэўнае абяцанне паўнапраўнага ўдзелу калі-небудзь у будучыні. Шмат хто прызнае, што такая сітуацыя непараўнальна больш выгадная Еўразвязу як у эканамічным, так і ў геапалітычным плане.

Тут вельмі важна разрозніваць «пашырэнне на Усход» і «далучэнне». Апошняе азначае, што дзяржава-прэтэндэнт афіцыйна прызнаецца паўнапраўнай удзельніцай ЕЗ і атрымлівае належную колькасць месцаў у Еўракамісіі, Радзе, Еўрапарламенце і іншых органах. «Пашырэнне на Усход» можа і *не* завершыцца далучэннем – гэта нядаўна на сабе адчулі Румынія, Балгарыя і Турцыя. У сярэдзіне 1990-х гг. іх запрасілі паўдзельнічаць у працэсе «пашырэння на Усход» разам з іншымі дзесяццю кандыдатамі, але ў 2004 г. іх у ЕЗ не прынялі. Далей, далучэнне трэба адрозніваць ад поўнага ўлучэння, калі на ўсіх грамадзян дзяржаў ЕЗ распаўсюджваюцца роўныя правы. Афіцыйнае далучэнне не абавязкова тоеснае «поўнаму ўлучэнню». Большасць «старых» дзяржаў ЕЗ зусім не жадалі пусціць на свой рынак працоўную сілу з Усходняй Еўропы[7]. Таму поўны спектр правоў, гарантаваных грамадзянам ЕЗ (у т. л. права на свабодны рух, выбар месца жыхарства і працы), грамадзяне краін, што ўступілі ў Еўразвяз у 2004 г., набудуць толькі праз яшчэ сем гадоў. Само сабою зразумела, што на рух працоўнай сілы або капіталаў са «старых» у «новыя» краіны ЕЗ ніякіх падобных забаронаў няма. Прадугледжваюцца, праўда, пэўныя абмежаванні на непасрэднае набыццё сельскагаспадарчых зямель ва Усходняй Еўропе аграпрадпрыемствамі «старога» ЕЗ.

Каб лічыцца сур'ёзным прэтэндэнтам на ўваходжанне ў ЕЗ пры «пашырэнні на Усход», неабходна спачатку ўвесці ў дзеянне *Acquis*. Гэта азначае, што прыняцце заканадаўчых нормаў ЕЗ «паводле змоўчання» на некалькі гадоў папярэднічае далучэнню. То бок дзяржавы-прэтэндэнты вымушаны прыняць на сябе ўсе істотныя абавязкі паўнапраўных удзельніц ЕЗ – што датычыць адкрыцця граніц для капіталу ЕЗ. Між тым, прэтэндэнты не маюць ніякіх правоў, якімі карыстаюцца дзяржавы ў складзе ЕЗ. Так, покуль прэтэндэнты неадчужаюцца да Еўразвяза, яны вызваленыя ад абавязку сплачваць Аднак мяркуецца, што патокі субсідый і надзвычай ўкладанні ў інфраструктуру ад разнастайных фондаў ЕЗ шматкроць перавысяць суму ўнёскаў. Выходзіць, даўжэйшы перыяд паміж уцягваннем краіны ў працэс «пашырэння на Усход» і яе поўным улучэннем у ЕЗ, верагодна, што спадарожныя «пераходнаму перыяду

[7] [8] У ЕЗ
Вынікі
Усходняй

краіны-прэтэндэнта зробяцца хранічнымі, уеўшыся ў структуру яе грамадства – асабліва з улікам таго, што гэтыя дзяржавы, якія ўступілі ў ЕЗ у 2004 г., сталі таўром усходнееўрапейскага капіталізму.

Падпарадкаванне законам і пастановам іншаземных органаў структур прыпадабняе становішча ўсходнееўрапейскіх дзяржаў-прэтэндэнтаў да «залежных краін», «пратэктаратаў». А кантроль над дзяржаўнай уладай звонку нагадвае «ўскоснае кіраванне» з гісторыі каланіяльных імперый. У дачыненнях паміж ЕЗ і Усходняй Еўропай уздзеянне звонку асабліва адчуваецца ў сферы эканамічнай палітыкі. Для тых краін, што далучыліся да ЕЗ у 2004 г. і атрымаюць поўныя правы ў 2011 г., стан квазіпратэктаратаў расцягнецца на 18 гадоў. А для Румыніі, Балгарыі, Турцыі, якія ўступяць у ЕЗ у наступным раўндзе, калі арыентавацца на «аптымістычны» сцэнар з усяго пяцігадовай адтэрміноўкай, ён можа скласці блізу 23 гадоў.

Транснацыянальныя карпарацыі

Калі ахарактарызаваць вельмі складаную сетку ўзаемадачыненняў проста, ЕЗ, без сумневу, быў і застаецца супольным праектам часткі кіроўнай эліты ў Заходняй Еўропе і Паўночнай Амерыцы. З нядаўняга часу некаторыя даследчыкі нават гавораць пра «трансатлантычную ўладу» як асобны, пэўна акрэслены інстытут сучаснай глабальнай эканомікі. Адна няўрадавая арганізацыя, якая адсочвае працэсы вакол ЕЗ, нядаўна папярэдзіла[8], што ЕЗ і ЗША пад уплывам лобі шматнацыянальных карпарацый, якія дзейнічаюць на абодвух кантынентах, пачалі маштабныя перамовы наконт стварэння Паўночнаатлантычнай зоны свабоднага гандлю і мытнага саюза. Наколькі моцнае гэтае лобі, сведчыць той факт, што на адной з апошніх сесій перад выбарамі 2004 г. Еўрапейскі парламент прыняў рэзалюцыю, што заклікае да «ажыццяўлення 10-гадовага Плану дзеянняў па паглыбленні і пашырэнні трансатлантычнага рынку, а таксама трансатлантычнага эканамічнага і фінансавага супрацоўніцтва, з тым каб стварыць трансатлантычны рынак без усялякіх бар'ераў да 2015 г.»[9].

ЕЗ уяўляе сабою «пакт эліт», заключаны паміж некаторымі наймагутнейшымі сусветнымі кампаніямі –

[8] прыняты на 21 ліпеня

транснацыянальнымі карпарацыямі (ТНК), што маюць штаб-кватэры (ц)і працуюць у Заходняй Еўропе, – і групай, якую часам называюць «палітычнымі прадпрымальнікамі» з брусельскага цэнтру. Згодна з умовамі пакта, ЕЗ дае ТНК, што базуюцца ў краінах Еўразвяза, пэўны кантроль над эканамічнай прасторай і іншыя параўнальныя перавагі. Наўзамен нормы *Acquis* Еўразвяза і яго ўплыў распаўсюджваюцца яшчэ далей, часткова праз дзейнасць заходнееўрапейскіх ТНК на сусветным рынку. ТНК адыгрываюць немалую ролю ў эканамічным падпарадкаванні асобных дзяржаў, у тым ліку навязванні тэхналагічнай, фінансавай і гандлёвай залежнасці, а таксама ў трансфармацыі структур уласнасці і авалоданні імі.

Асабліва добра відаць, як утвараецца падобная залежнасць, на прыкладзе нядаўніх эканамічных трансфармацый у былых сацыялістычных краінах – суседзях ЕЗ. Да яе прыводзяць не толькі простыя замежныя інвестыцыі, гандаль і запазычанне тэхналогій, але і навязванне правілаў, сістэматычнае ўздзеянне на эканамічную палітыку, на заканадаўства ў вайсковай і памежнай сферах, у адукацыі, ахове здароўя і іншых сацыяльных пытаннях, прычым неістотна, уваходзяць яны ў кампетэнцыю ЕЗ ці не.

У апошні перыяд дзяржаўнага сацыялізму грамадствы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы жылі ва ўмовах унікальнай сістэмы вонкавых сувязяў, якую можна назваць «двайная залежнасць». Яна ўзнікла ў выніку ўвядзення рынкавых элементаў у эканамічную сістэму «заходніх» сацыялістычных дзяржаў ад канца 1960-х і да сярэдзіны 1970-х гг. і ўвядзення дзяржаўных датацый на тавары не першай неабходнасці. Нарэшце, да стварэння гэтай залежнасці спрычыніліся і цяжкасці, з якімі сутыкнуліся моцна залежныя ад энерганосьбітаў краіны Усходняй Еўропы праз скачок цэнаў на іх. Масква, як цэнтр сацыялістычнага свету, захоўвала ўладу над Цэнтральнай і Усходняй Еўропай у геапалітычным плане. Аднак тамтэйшае грамадства ўсё больш трапляла ў своеасаблівую залежнасць, характэрную для позняй фазы дзяржаўнага сацыялізму, і ад заходняга капіталу. Перш за ўсё яна выявілася ў імклівым росце вонкавай запазычанасці. Калі ў канцы 1980-х гг. адбыўся калапс дзяржаўнага сацыялізму,

9 са спасылкай на «Параграф 17 Рэзалюцыі Еўрапарламента аб стане трансатлантычнага партнёрства напярэдадні саміта ЕЗ–ЗША, Дубліне, 25–26 чэрвеня 2004 г.».

Савецкі Саюз паступова, «дысцыплінавана» здаў свае геапалітычныя пазіцыі ва Усходняй Еўропе. Такім чынам знік адзін з падважнікаў «двайной залежнасці», а з ім сышлі і рэшткі механізму ўсёахопнай сацыяльнай абароны – спадчына дзяржаўнага сацыялізму. Часткова таму, што ўжо склалася залежнасць ад размешчанага ў Заходняй Еўропе транснацыянальнага капіталу, а часткова ў адпаведнасці з геапалітычнай логікай паглыблення заходнееўрапейскай інтэграцыі грамадствы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы неўзабаве трапілі ў новую, жорсткую залежнасць ужо ад аднаго Еўразвяза. Безумоўна, ладная частка гісторыі Усходняй Еўропы Новага часу – гэта гісторыя залежнасці ад заходнееўрапейскіх дзяржаў. У гэтым сэнсе постсацыялістычная залежнасць мае толькі дзве асаблівасці. Па-першае, яна носіць надзвычай глыбокі характар. Па-другое, Заходняя Еўропа, з'яднаная, як ніколі раней, фактычна падпарадкавала краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы адзінаму суб'екту – гегемону на еўрапейскай палітычнай арэне, чаго ніколі раней гісторыя не ведала.

Даўгавая залежнасць часу позняга дзяржсацыялізму хутка перарасла ў гандлёвую і інвестыцыйную. І на той час, як дзяржавы-прэтэндэнты наблізіліся да ўступлення ў Еўразвяз, яны ўжо кардынальна трансфармаваліся ў экспартна арыентаваныя рэгіёны спажывання другасных паслуг і прадукцыі. Разбураная дзяржаўна-сацыялістычная прамысловасць аднаўлялася амаль выключна замежным капіталам, які атрымліваў велізарныя падатковыя льготы, каб вырабляць прадукцыю перадусім для рынку ЕЗ. Да першага раўнду афіцыйнага далучэння ўсходнееўрапейскіх дзяржаў да ЕЗ у 2004 г. заходнееўрапейскія вытворчыя ТНК разам з фінансавым капіталам узялі ў свае рукі кантроль над пераацэнкай рэсурсаў у былых краінах дзяржаўнага сацыялізму ўздоўж усходніх межаў ЕЗ.

Першапачаткова панятак вонкавай эканамічнай залежнасці стаў ужывацца ў эканамічнай і сацыяльна-палітычнай гісторыі Лацінскай Амерыкі ў 1960-х – 1970-х гг. Аднак аналогія паміж Лацінскай Амерыкай і Усходняй Еўропай не працуе, паколькі галоўная рэгіянальная метраполія Лацінскай Амерыкі, ЗША, – гэта дзяржава ў Веберавым сэнсе слова, магчыма,

наймагутнейшая дзяржава – эканамічны гегемон пасля Другой сусветнай вайны; ЕЗ – метраполія Усходняй Еўропы – не дзяржава, а ўладная структура, якая паўстае і развіваецца, шмат у якіх аспектах застаецца неаформленай, расплывістай. Эканамічная і геапалітычная магутнасць Еўразвяза сувымерная з амерыканскай, але ЕЗ не мае непасрэдных сродкаў гвалту, а функцыянуе праз шэраг вельмі складаных, але гнуткіх, апасродкаваных механізмаў, акрэсленых намі раней. У заключнай частцы артыкула мы звернемся да аналізу гнуткіх вонкавых дачыненняў ЕЗ і разгледзім, што з гэтага можа вынікаць.

АСНАВАТВАРНАЯ РОЛЯ ВОНКАВЫХ ДАЧЫНЕННЯЎ

У літаратуры аб Еўразвязе, асабліва ў дыскусіях палітолагаў наконт «федэратыўнай» альбо «канфедэратыўнай» сутнасці ЕЗ, заўважаецца моцная тэндэнцыя засяроджвацца толькі на *ўнутраных* аспектах. У гэтых спрэчках выяўляюцца тыя ж самыя слабыя месцы, што і ў формуле: «ЕЗ падзяляе з дзяржавамі-ўдзельніцамі і яднае іх суверэнітэт», пра якую мы ўжо гаварылі. ЕЗ тады ўяўляецца папросту нейкай сумай сваіх частак. І тыя, хто зыходзіць з гэтага, толькі агучваюць канкрэтныя інстытуцыйныя і заканадаўчыя палажэнні, якія замацоўваюць падобнае ўяўленне. Табліца 1. **Замежныя ўладанні дзяржаў ЕЗ**
(па стане на 2002 г.) у 1878, 1913–1914, 1933 і 1939 гг.

Аднак, на нашу думку, неабходна ўлучыць ЕЗ у шырэйшы, глабальны кантэкст. Вышэй мы назвалі чатыры інстытуцыйныя механізмы, праз якія Еўразвяз забяспечвае выкананне *Acquis* і дасягае ўнутранай і вонкавай стабільнасці, каб еўрапейская эканоміка магла і надалей расці і прыносіць высокія прыбыткі, спецыялізуючыся на сферы паслуг і высокіх тэхналогій. Вось жа, тры з чатырох названых механізмаў непасрэдна залежаць ад суб'ектаў, працэсаў, структурных умоў па-за ЕЗ і ўплываюць на сітуацыю вонкі ЕЗ. У тым, што ЕЗ абапіраецца на вонкавыя суб'екты, працэсы і структуры, няма выпадковасці. Хутчэй, яны нагадваюць стаўпы, на якіх трымаецца Еўразвяз.

Ёсць, мабыць, нават больш пераканаўчыя, глыбока гістарычныя

прычыны, чаму ЕЗ неабходна разглядаць у глабальным кантэксце. У дыскусіях пра ЕЗ, бадай, надта рэдка закранаецца роля дзяржаў у яго складзе і іх папярэднікаў ва ўтварэнні такіх падставовых рэалій, як сусветная эканоміка і сучасная міждзяржаўная сістэма. Краіны, што ўваходзілі ў ЕЗ на мяжы XX–XXI стст., усяго два-тры пакаленні назад былі імперыямі, што валодалі амаль паловай населенай часткі сушы па-за межамі Еўропы. На пачатку 1930-х гг. іх калоніі сягалі трох чвэрцяў усіх замежных тэрытарыяльных уладанняў і ахоплівалі амаль палову населеных земляў вонках Еўропы (гл. Табліцу 1).

	1878 (а)	1913 (а)	1914 (б)	1933 (а)	1939 (б)
Каланіяльныя ўладанні папярэднікаў дзяржаў ЕЗ (тыс. км^2)	38 627	57 196	55 392	57 533	36 206
Каланіяльныя ўладанні папярэднікаў дзяржаў ЕЗ адносна населеных земляў па-за межамі Еўропы (в)	31,1%	46,1%	44,6%	46,3%	29,2%
Землі, якімі валодалі папярэднікі дзяржаў ЕЗ, адносна агульнай плошчы калоній і залежных тэрыторый у свеце (г)	57,8 %	73,4 %		73,6 %	

а) Падлічана паводле: Grover, Clark. The Balance Sheet of Imperialism: Facts and Figures on Colonies. – Morningside Heights, NY: Columbia University Press, 1936, 23–4, Табліца I праз падсумаванне плошчы «мандатаў», «залежных тэрыторый» і «самакіраваных тэрыторый» Аб’яднанага Каралеўства,

Францыі, Італіі, Бельгіі, Данііі, Германіі, Нідэрландаў, Партугаліі і Іспаніі.

б) Падлічана паводле: Ansprenger, Franz. The Dissolution of the Colonial Empires. – London and New York: Routledge, 1998, які цытуе звесткі Вайта (Veit, Valentin. Kolonialgeschichte der Neuzeit. – Tubingen, 1915), датычныя 1914 г.

в) Агульная плошча сушы ў свеце складае 148 941 000 км^2. Ад гэтай лічбы мы аднімаем плошчу неабжытай Антарктыкі (14 235 000 км^2) і Еўропы (10 507 630 км^2). Рэшта – 124 198 370 км^2 населенай тэрыторыі па-за межамі Еўропы. Крыніца: Hammond Universal World Atlas. – Maplewood, NJ: Hammond, 1913.

г) Падлічана паводле : Grover, Clark. The Balance Sheet of Imperialism: Facts and Figures on Colonies. – Morningside Heights, NY: Columbia University Press, 1936, 32 шляхам аднімання ад плошчы «заходніх уладанняў» «уладанняў Злучаных Штатаў» і «міжнародных рэгіёнаў».

Гэтая простая табліца падводзіць да вельмі істотных высноў. Перш за ўсё яна нагадвае, што ЕЗ – гістарычны спадкаемца тых дзяржаў, якія стагоддзямі літаральна рэзалі астатні свет на кавалкі. Як адзначае Мішэль Фушэ, «па-за Еўропай прыкладна 60 % межаў на сучасных мапах свету навязаныя звонку, а не вызначаныя самімі дзяржавамі». Толькі Вялікабрытанія і Францыя правялі прыкладна 40 % гэтых межаў. Тое ж датычылася і самой Еўропы: практычна ўсе сучасныя межы ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе накрэсленыя заходнееўрапейскімі імперскімі дзяржавамі падчас распаду і пераўтварэння імперый у Еўропе.

Гісторыя мадэрных заходнееўрапейскіх імперый і каланіялізму (то бок фактычна гісторыя капіталізму і мадэрнай дзяржаўнасці ва ўсім свеце) – не што іншае, як доўгая гісторыя эксплуатацыі нееўрапейскіх грамадстваў у імперскіх мэтах купкай заходнееўрапейскіх дзяржаў і намеснікаў, якія дзейнічалі ад іх імя. Такім чынам, сённяшняя стаўка ЕЗ на вонкавыя суб'екты палітыкі, працэсы і структуры мае глыбокія гістарычныя карані: імперскія дзяржавы Заходняй Еўропы падпарадкоўвалі і эксплуатавалі суб'ектаў, працэсы і структуры

па-за яе межамі. Імперская мінуўшчына даецца ў знакі цэлым наборам сацыякультурных схемаў, шаблонаў мыслення і паводзін датычна «Еўропы», астатняга свету і самога адрознення паміж імі. Гістарычная спадчына імперыялізму абмяжоўвае суб'ектаў у выбары новых шляхоў развіцця і служыць інстытуцыйным складнікам сусветнай гегемоніі. Калі разглядаць ЕЗ як арганізацыю, якая «падзяляе з дзяржавамі-ўдзельніцамі і яднае іх суверэнітэт», тады трэба прызнаць, што ЕЗ таксама падзяляе і яднае іх гісторыю, у т. л. імперыялізму і каланіялізму.

Гісторыя імперыялізму і каланіялізму па-ранейшаму аказвае велізарны эканамічны, палітычны, культурны, маральны і геапалітычны ўплыў на сучаснасць. Акурат праз імперска-каланіяльныя сувязі некаторыя заходнееўрапейскія дзяржавы рана пачалі адыгрываць ролю сусветных гегемонаў. Самае відавочнае наступства каланіяльнай гісторыі – надзвычай выгаднае становішча Заходняй Еўропы ў сучаснай сусветнай эканоміцы. А эканамічная перавага і магутнасць на міжнароднай арэне, у сваю чаргу, вызначае сённяшні стан Еўразвяза і выступае галоўнай прычынай прывабнасці ЕЗ для прэтэндэнтаў на паўнапраўны ўдзел. Еўразвяз падзяляе з дзяржавамі-ўдзельніцамі і яднае нарабаванае ў каланіяльных зваяваннях, а прэтэндэнты на ўваходжанне цяпер просяць сваю долю.

Стварэнне Еўразвяза супала не толькі з пачаткам халоднай вайны, але і з крахам заходнееўрапейскіх каланіяльных імперый. Як відаць з планаў Францыі часоў заснавання ЕЗ у 1950-я гг., працяг эксплуатацыі калоній разумеўся тады як неад'емны, стрыжнёвы фактар паглыблення заходнееўрапейскай інтэграцыі. Напрыклад, чакалася, што Францыя, уступіўшы ў ЕЗ, безумоўна захавае «асаблівыя адносіны» з вялікай часткай нееўрапейскага свету праз *Union Française*, г. зн. французскую каланіяльную імперыю. Эме Сезер прадбачыў гэткую схему яшчэ ў 1950 г., у сваёй фундаментальнай працы «Дыскурс каланіялізму». Яна стала ў пэўнай ступені адказам на планы заснаваць усёахопную заходнееўрапейскую інтэграцыйную структуру, у якой Заходняя Еўропа бачыла дабрадайную мадэль інтэграцыі

«пасля нацызму».

Антыкаланіяльныя вызваленчыя рухі прывялі да распаду сусветнай каланіяльнай сістэмы. Таму не ўдалося стварыць заходнееўрапейскай метаімперыі, якая з'яднала б самыя магутныя імперскія дзяржавы *ўключна з іх калоніямі* ў адзіны заходнееўрапейскі каланіяльны маналіт. Тым не менш, было б наіўна сцвярджаць, што цяперашняе становішча ЕЗ можна зразумець без уліку імперскай гістарычнай спадчыны. І разнастайныя посткаланіяльныя «садружнасці» – канкрэтны напамін пра гістарычна вельмі працяглыя, няроўныя, неакаланіяльныя адносіны. Значная частка посткаланіяльнага «трэцяга свету» дасюль прыкаваная да сваіх былых гаспадароў у Еўропе ўсё новымі і новымі ланцугамі залежнасці. У гэтым сэнсе Еўразвяз падзяляе з дзяржавамі-ўдзельніцамі і яднае іх неакаланіяльныя праекты, у т. л. і іх выразна асіметрычныя сувязі з былымі калоніямі – большай часткай цяперашняга «трэцяга свету».

У дыскусіях пра будучыню Еўразвяза абмяркоўваецца толькі адзін аспект гэтай посткаланіяльнай залежнасці – чалавечы паток, які імкнецца ў Еўропу. Яго прычына – згаданыя асіметрычныя сувязі, а таксама ўдзел найбагацейшых заходнееўрапейскіх дзяржаў у аказанні дапамогі сваім былым калоніям. Каб не стварaць няёмкасці, збольшага замоўчваецца працяглае, велізарных маштабаў перапампаванне эканамічнага багацця з калоній у цэнтр, наступствы шырока ўжыванага палітычнага гвалту, імперыялістычных войнаў і генацыду, няспынны распаўсюд стратэгічнае вайсковае моцы праз «сферы ўплыву», разбурэнне культурных, палітычных, маральных і рэлігійных адметнасцяў былых калоній. Стаўшы цяпер фармальна незалежнымі грамадствамі, яны атрымалі толькі каліва ўласных рэсурсаў ці нічога ўвогуле. Калі былыя каланіяльныя повязі, безумоўна, бяруцца пад увагу ў іміграцыйнай палітыцы, то на іх неабходна зважаць і ва ўсіх іншых сферах – магчыма, найперш у пошуках адказу на пытанне, што такое Еўразвяз.

Дэкаланізацыя не завершаная і сёння. У электронным атласе свету[10] пералічваюцца 58 «залежных тэрыторый» у сучасным

свеце. З іх 15 усё яшчэ «брытанскія», 9 – «французскія», дзве «належаць» Данііі, і яшчэ дзве – Нідэрландам. Агулам 30 – больш за палову – фактычных калоній у свеце знаходзяцца пад простым кантролем каланіяльных дзяржаў у складзе ЕЗ. Паколькі ўдзельнікі Еўразвяза захавалі кантроль над некаторымі калоніямі, нельга адмаўляць, што ЕЗ вядзе каланіяльны бізнэс у тым самым сэнсе слова, які не змяніўся за 400 гадоў. Любая дакладная мапа ЕЗ мусіла б уключаць, напрыклад, Віргінскія астравы і Фальклендзы, Мартыніку і Рэюньён, Грэнландыю і Арубу. Калі ўлічваць каланіяльную мінуўшчыну дзяржаў ЕЗ, няма чаго здзіўляцца, што нядаўна Камісарам ЕЗ па міжнародных адносінах[11] стаў не хто іншы, як апошні брытанскі губернатар калоніі Ганконг. Калі Еўразвяз «падзяляе з дзяржавамі-ўдзельніцамі і яднае іх суверэнітэт», ён падзяляе і рэшту іх імперскіх праектаў, ужо не кажучы пра спадчыну ранейшых «подзвігаў».

Наўрад ці можна адмаўляць, што існуюць механізмы перадачы калектыўнага досведу, ведаў, менталітэту – карацей кажучы, культуры – з пакалення ў пакаленне. Таму каланіяльная мінуўшчына цяперашніх дзяржаў ЕЗ і роля імперый у стварэнні іх сучаснага багацця, магутнасці, прывілеяванага становішча і прэтэнзій на культурную перавагу істотна адбіваецца на калектыўнай свядомасці Заходняй Еўропы. Згодна з табліцай 1, у 2003 г. 90 % насельніцтва ЕЗ быў грамадзянамі каланіяльных дзяржаў. Такім чынам, ЕЗ – вельмі важны цэнтр, які пастаянна стварае і распаўсюджвае культуру каланіялізму і імперскасці.

[10] Чарадзіць (с)тварэнне – навядзенне 3 2003 г.

[11] Крыс Патэн увайшоў у Еўракамісію, калі ён кіраваў Польшчай. Тэрмін Польшчы скончыўся ў 2004 г.; і імя Патэна некаторы час фігуравала сярод галоўных кандыдатаў на пасаду новага старшыні Еўракамісіі.

Нарэшце, ёсць яшчэ адна імперская традыцыя, уласцівая сучасным краінам ЕЗ: гістарычная спадчына кантынентальных, сумежных імперый у Цэнтральнай Еўропе. Гісторыя сусветнай сістэмы Новага часу – гэта гісторыя каланіяльных імперый. Але гэта і гісторыя надзвычай складанай стратэгічнай гульні, якую вялі «кантынентальныя» імперыі: наступалі і адступалі, ладзілі падзелы і перадзелы слабейшых (ц)і меншых дзяржаў, каб набыць землі, людскія і іншыя стратэгічныя рэсурсы. Гэтыя працэсы адбываліся па ўсёй тэрыторыі Еўропы, у т. л. і ў яе цэнтральнай і ўсходняй частках. Чатырма галоўнымі дзейнымі асобамі ў імперскай гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы сталіся імперыя Габсбургаў, а таксама Асманская, Пруская і

Расійская імперыі. Па распадзе Асманскай імперыі на яе месцы ўзнікла свецкая дзяржава – Турцыя, цяпер прэтэндэнтка на ўступленне ў Еўразвяз, якую не надта збіраюцца туды прымаць. Расійская імперыя аднавілася ў форме СССР – імперыі зусім іншага кшталту; яго наступніцай стала Расійская Федэрацыя. Расія – адна з вядучых дзяржаў свету, фармальна амаль не ўлучаная наўпрост у еўрапейскія справы – хіба толькі забяспечвае Цэнтральную і Заходнюю Еўропу энерганосьбітамі і сыравінай ды стварае буферную зону бяспекі на ўсходзе. Дзве дзяржавы – спадкаеміцы астатніх імперый, Германія і Аўстрыя, уваходзяць у ЕЗ. А былыя сацыялістычныя краіны з ліку нядаўніх прэтэндэнтаў на ўступленне ў ЕЗ: Албанія, Балгарыя, Харватыя, Чэшская Рэспубліка, Эстонія, Венгрыя, Румынія, Славакія і Славенія – спрэс дзяржавы, у XIX–XX стст. збудаваныя на аскепках гэтых імперый. У набыцці Еўразвязам свайго цяперашняга ўплыву ў рэгіёне немагчыма пераацаніць непасрэдную ролю «кантынентальных» імперый.

ШТО Ж ТАКОЕ ЕЗ?

З улікам усяго вышэйсказанага, у якім ракурсе варта разглядаць Еўразвяз? Што сведчыць гэтая эмпірычная з'ява пра сутнасць уладных структур і ўлады ўвогуле?

Калі ацэньваць ЕЗ толькі праз прызму агульнапрынятага Веберавага крытэру манаполіі на законнае ўжыванне гвалту, то давядзецца адмовіцца ад думкі, што ЕЗ – дзяржава. Як мы бачылі, ён не мае выканаўчага апарату, а значыць, і ўласных сродкаў прымусу. Аднак ЕЗ мае выдатна распрацаваную, складаную сістэму залежнасцяў, якая стварае дадатковую адлегласць паміж структурамі Еўразвяза і грамадствам і ператварае ЕЗ у метадзяржаву. Таму каб зразумець, што такое ЕЗ, недастаткова засяродзіцца, як гэта звычайна робіцца, на «Бруселі», г. зн. на найвышэйшым для Еўразвяза ўзроўні палітычных і заканадаўчых працэсаў. Замест гэтага варта прааналізаваць узаемадачыненні ўсіх бакоў: дзяржаў ЕЗ, еўрапейскіх ТНК, трансатлантычных кіроўных эліт з іх інтарэсамі. Неабходна таксама разгледзець сацыяльную, культурную, палітычную і эканамічную дынаміку ўсяго агульнаеўрапейскага грамадства. Усе гэтыя ўзаемадзеянні

мусілі б вывучацца ў дадатак да «Бруселя» – як адзіны складаны суплёт дачыненняў з супольнымі геапалітычнымі інтарэсамі. У цэнтры гэтага суплёту апынаецца Еўразвяз – уладная структура, праз свае ўнутраныя й вонкавыя залежнасці на крок адсунутая ад механізмаў гвалту (паводле Вебера, вызначальнай рысы дзяржавы).

Гэтая дыстанцыя, што захоўваецца праз метасувязі з дзяржавамі-ўдзельніцамі, дазваляе ЕЗ заставацца «чыстым» там, дзе міжволі запэцкаюцца дзяржавы. Пераклаўшы цяжар стратэгічнай абароны на НАТО, ЕЗ можа элегантна трымацца на зручнай адлегласці ад ужывання гвалту – і пры гэтым не ставіць пад пагрозу сваю сістэму бяспекі. У «пашырэнні на Усход» значная частка «бруднай» працы дзеля рэфармавання эканомікі ўсходніх і паўднёваўсходніх суседзяў ЕЗ робіцца дзяржаўным апаратам і палітычнымі элітамі саміх гэтых краін. Транснацыянальныя кампаніі са штаб-кватэрамі ў дзяржавах Еўразвяза самі ажыццяўляюць на ўсім свеце гвалт у галінах эканомікі, экалогіі, у сацыяльнай і заканадаўчай сферах. У самога ЕЗ нават не ўзнікае патрэбы звяртацца да звычайных механізмаў дзяржаўнага гвалту. Захаваныя каланіяльныя сувязі, новыя ўзаемаадносіны з гістарычна залежнымі ад Прускай і Аўстрыйскай імперый дзяржавамі, неаслабныя неакаланіяльныя залежнасці бадай з усім «былым другім» і «трэцім» светам дазваляюць ЕЗ забяспечваць сябе сыравінай, энерганосьбітамі, працоўнай сілай, капіталамі і паслугамі. Усе гэтыя дачыненні стымулююць назапашванне багацця Еўразвязам. Але самому ЕЗ нават не трэба ўцягвацца ў брудную справу гвалту над грамадствам і прыродай – справу, неад'емную ад здабывання прыбытку. У вялікай ступені акурат дзякуючы дыстанцыяванасці ад інстытутаў гвалту ЕЗ пераважна паўстае ў вобразе «выспы дабра» ў сённяшняй сусветнай палітыцы*. Вядома, гэта ўзмацняе шматвекавую еўрацэнтрысцкую ідэалогію вышэйшасці. Рэкламуючы ідэю «добрай Еўропы», прыхільнікі палітычнага працэсу стварэння еўрапейскай ідэнтычнасці спрабуюць «зарыць як найглыбей» шкілет каланіялізму, але, безумоўна, працягваюць карыстацца ягонай матэрыяльнай спадчынай.

Гвалт – ключавы кампанент дзяржаўнасці, бо ён дазваляе ўтрымаць

падтрымліваць парадак. Тым не менш, сучасныя дзяржавы, маючы манаполію на законнае ўжыванне гвалту, вымушаны несці адказнасць перад сваім грамадствам – адрозна ад іншых структур гвалту. У ЕЗ няма выканаўчага апарату і, адпаведна, інстытуцыйнага падмурку для простага гвалту – але гэта азначае, што няма і жорсткай сістэмы падкантрольнасці толькі грамадзянам ЕЗ, але і астатняму свету. Такім чынам, грамадствам, якія закранае палітыка Еўразвяза, цяжка прыцягнуць да адказнасці заканадаўчыя органы ЕЗ, нягледзячы на эканамічныя і палітычныя кааліцыі, што за ім стаяць.

Вытанчаная сістэма размеркавання і перадаручэння функцый улады і гвалту, адсутнасць зваротнай сувязі і падкантрольнасці дазваляюць параўнаць ЕЗ з сучаснымі глабальнымі эканамічнымі вытворчымі карпарацыямі, якія таксама часта абапіраюцца на складаныя, шматступенныя сістэмы субпадраду і дэлегавання функцый. Зазначым, што даволі часта тое, што робіць ЕЗ, перагукаецца з вынікамі нядаўніх макракампаратыўных доследаў па гандлёвых сетках. Асабліва яскравае падабенства прасочваецца з «арыентаванай на пакупніка» мадэллю («buyer-driven type»). Яе сутнасць у тым, што ўладальнік камерцыйнага капіталу на адлегласці арганізуе вытворчы працэс у нейкім моцна дыверсіфікаваным сектары эканомікі з вельмі рухомай структурай попыту, падаляе яго паміж шэрагам падрадчыкаў, злучаных у складанае, разгалінаванае сеціва ўзаемасувязяў глабальнага ўзроўню. ТНК удаецца захоўваць надзвычай нізкія заробкі для наёмных працаўнікоў і пры гэтым пазбягаць абвінавачанняў у несправядлівым выкарыстанні працоўнай сілы дзякуючы разгалінаванай сістэме субпадраду. Гэтаксама ЕЗ удаецца заставацца па-за кантролем і не адказваць за ўсталяванне залежнасці і ўціск у выніку дзейнасці суб'ектаў, што працуюць ад імя ЕЗ і ў яго інтарэсах.

Такім чынам, Еўразвяз – выдатная прылада, увасабленне галоўнай мары мадэрнага заходнееўрапейскага лібералізму: ён забяспечвае прыбытак і выйгрышныя сацыяльныя змены, але дазваляе фармальна заставацца ўбаку ад брудных працэсаў, што за гэтым стаяць. Здаецца, «нябачная рука» ахоплівае ўжо не толькі рынак, а і палітычную сферу. У краінах ЕЗ жыве

Электронная версія артыкула
Беларускага
незалежнага
аналітычнага
цэнтра
Змяшчэнне
матэрыялаў
дазволена
толькі з
дазволу
аўтара і
спасылкай на
выданне, у
якім
апублікаваны
артыкул
Спасылка на
артыкул
«Еўрапейскі
вектар
развіцця //
Сайт
«Еўрабеларусь»
Шуманаўскага
таварыства).
Дата
парактл.

прыкладна 6 % насельнікаў планеты, аднак, згодна са звесткамі на канец 2003 г., у ЕЗ вырабляецца ад чвэрці да траціны сусветнага ВУП[12]. Практычна не паварушыўшы пальцам, Еўразвяз здолеў забяспечыць паслухмянасць амаль усіх постсацыялістычных дзяржаў па сваім перыметры, трансфармаваўшы рэгіён паводле даўняй заходнееўрапейскай геапалітычнай мары пра буферную зону і надзейную крыніцу прыродных і сацыяльных рэсурсаў. Еўразвяз валодае больш чым паловай калоній у свеце, ён абцяжараны гісторыяй прыгнёту, расізму і сістэматычнага палітычнага гвалту – але пры гэтым пераважна паўстае ў вобразе сілы «найвышэйшага палітычнага дабра». Карыстаючыся падтрымкай адзінай вайсковай звышдзяржавы ў НАТО, вайскова-стратэгічнай арганізацыі, краіны якой – у іх пражывае прыкладна адна дзесятая насельніцтва Зямлі – супольна валодаюць больш чым паловай сусветнага ВУП, Еўразвяз можа ствараць імідж нейтральнай, міралюбнай і добразычлівай да ўсяго свету супольнасці.

Калі сацыёлагі імкнуцца зразумець ЕЗ і ўвогуле феномен пазбягання адказнасці перад светам як грамадскія навукі, ім неабходна выйсці за межы агульнапрынятых тэарэтычных фармулёвак «дзяржаўнасці». Новая рэчаіснасць ужо не спасцігнуць яе – нялегкая задача навукоўцаў.

[12] Вялічана паводле цяперашняга курсу абмену валют на падставе звестак МВФ (2002 г.).

Пераклаў з амерыканскай з нязначнымі скарачэннямі і са згоды абаіх аўтараў Вольф Рубінчык паводле: Böröcz József and Sarkar Mahua. What is the EU? // International Sociology. June 2005. Vol. 20 (2). P. 153–173.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/05
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

крытыка

[image]-[image]2006

"аналітыка" • **крытыка** • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Андрэй Казакевіч «Druvis»: праект балцкае ідэнтычнасці

АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ

палітоляг, галоўны рэдактар часопісу «Палітычная сфера». Яго апошні тэкст у «ARCHE» «Арыенталізм», альбо некалькі заўваг пра «казус Беларусь» (6/2005) неўзабаве пасьля публікацыі быў перакладзены на ангельскую мову і апублікаваны на сайце www.eurozine.com.

Прускае слова Druvis дайшло да нас праз нямецкіх храністаў, якія ўжывалі яго як заменнік лац. credo і ням. der Glaube у значэнні «рэлігійная вера» і «сімвалы веры»…
З усяго гэтага можна вывесці, што словы са значэннем «вера» ўзыходзяць да словаў са значэннем «дрэва». Пры гэтым цвёрдае трывалае дрэва (найчасцей дуб) разумелася як вобраз свету (axis mundi), як крыніца найбагацейшае міфічна-паэтычнае сімволікі.

Зямля – аб’ект культурнага кшталтавання, а яго суб’ект – этнічная супольнасць.

«Druvis»

Druvis. Альманах Цэнтра этнакасмалогіі «Крыўя». 2005. № 1.

«Druvis» прэзентуе развіццё традыцыі, запачаткаванай у канцы

1980-х, і інтэлектуальнае развіццё, якое цягам 1990-х адбывалася галоўным чынам у межах Цэнтра этнакасмалогіі «Крыўя» («Kryuja»). Цэнтр ад пачатку надаваў вялікую ўвагу археалогіі, этнаграфіі, этналогіі і традыцыйнай культуры (доўгі час рэпрэсаванай у грамадскай свядомасці), спалучаючы навуковыя даследаванні і розныя практыкі сакралізацыі беларускай этнічнай культуры – у тым ліку і спробы старэння неапаганскага руху[1].

На пачатку свайго станаўлення рух цікаўных да традыцыйнай культуры спалучыў у сабе «балцкую тэорыю» этнагенезу беларусаў (да гэтага практычна ўсе такія спробы мелі «славянскі» характар, актуалізацыя балцкіх каранёў не мела тут вялікага значэння[2]) і спробы актуалізацыі наймення «крывічы» і «Крыўя» (беларускія аўтары XX ст. звычайна ўжывалі форму «Крывія»).

«Балцкая тэорыя» і «крыўская ідэя» знайшлі сваё адлюстраванне ў розных асяродках, але толькі ў «Крыўі» яны атрымалі пэўнае канцэптуальнае і рафінаванае заканчэнне. Акрамя гэтага, цэнтр «Крыўя» набыў пэўную манаполію на канцэптуальнае апісанне беларускай этнічнай культуры, адной з яскравых праяў гэтага можна лічыць выданне даведніка «Беларуская міфалогія»[3]. Выданне да пэўнай ступені «канструктывісцкае», але альтэрнатыва яму наўрад ці будзе калі-небудзь складзена. Недзе напрыканцы 1990-х адбываецца спалучэнне «крыўскай ідэі» з палітычнымі тэорыямі, галоўным чынам еўрапейскіх «новых правых». Палітызацыя была ўласціва, як падаецца, перш за ўсё, маладой генерацыі.

[1] Гэта можна заўважыць у спецыфічнай тэрміналогіі і праблематыцы – напрыклад, «сакральная геаграфія» або выкарыстанне «аутэнтычнай традыцыі» як метаду даследавання.

[2] Ва умовах паўстання і развіцця беларускага руху балцкая версія этнагенезу, натуральна, не магла мець вялікага пашырэння. «Балцкая ідэя» магла б актуальна трансфармаваць славянарускую традыцыю, але для яе легітымнасці быў патрэбны дастатковы археалагічны і лінгвістычны матэрыял, які з'явіўся толькі пасля Другой сусветнай вайны. Этнаграфія XX ст. адназначна апазнавала беларускую культуру як

Непасрэдным папярэднікам «Druvis» быў альманах «Крыўя», ад якога новае выданне пазычыла некаторыя элементы дызайну. Але калі «Крыўя» была больш падобная да спецыялізаванага выдання, а таму досыць цяжкачытэльная, то «Druvis» значна больш разнастайны. У пэўным сэнсе выданне дэманструе, як падаецца, новы этап развіцця «крыўскай супольнасці». Нумар атрымаўся канцэнтраваны і кадыфікаваны (кадыфікацыя тут, напэўна, ключавое слова).

Звернемся да аналізу зместу альманаха. «Druvis» займае памежную пазіцыю паміж навукай і практыкамі сакралізацыі,

«галамянскую» Беларусь, а гэты не аднаразовы ўмежаванне да пачатку XX ст., але больш не разводзіцца прыбытка рэдэтарагі, хоць і не толькі на гэта вобразу, прыметы, такі і «Druvis» ужо тут не ідэны сваёй знаходзіцца з добрага Слаўяна. Там беларускай беларусі сістэмы і дасягаюць дадаткова на фоне большага трабаванняў, якія падаюцца безнадзейна за кампенсацыі. Гэты ж, образ «разгуранне» не зрабіў ўсё гэта так складана, часцей, чым надзвычай з аналізам і рэфлексіяй, часам з міфатворчасцю і бедарускім «Druvis». Эдыкцыі дзеўчак / Нав. рэд. с. Санькар-Міласць, 2004.

[3] Беларускім «Druvis»: Эдыкцыі дзеўчак / Нав. рэд. с. Санькар-Міласць, 2004.

[4] Крыніцы літаратурнага і гэсталь, ён, «Druvis» пробіць тварэння «Іўёны бацькоўскага Крыўя» с. Сінерсуд «Крыўя», таму чытаюцца яны і нахаропім герметычнымі.

Асобна трэба адзначыць, што арыгінальны дызайн і акуратны й дакладны «навуковы апарат» (дарэчы, гэты апарат значна больш прафесійны, чым у большасці выданняў, якія лічацца акадэмічнымі) робяць чытанне артыкулаў прыемным і дадаюць сістэматызоўнай вартасці. Да прыкладу, тэкст В. Корбута, прысвечаны генеалогіі «крыўскай ідэі», утрымлівае 211 спасылак на крыніцы і з’яўляецца выдатнай сістэматызацыяй і, відавочна, надзейным увядзеннем у кантэкст «крыўскага руху».

Выданне якаснае і стылістычна, і канцэптуальна. Праўда, схільнасць да элементаў арыйскай стылістыкі не зусім адэкватная і ідэалагічна перагружаная (тым больш, што гэтая стылістыка, наколькі я разумею, не мае традыцыйнага паходжання, але звязана з феноменам урбаністычнай цывілізацыі 1920-х – 1930-х гг.).

Праблематыка «Druvis»: этналогія, этнаграфія, лінгвістыка, гісторыя, балтыстыка, літаратуры, ідэалогія і г. д. Але ўсю гэтую разнастайнасць можна разбіць на некалькі групаў, якія і вызначаюць сутнасць выдання.

Рэпрэзентацыя і генеалогія «Крыўі». Калі казаць пра сутнасць «крыўскага праекту», то ў яго аснове ляжыць імкненне да афармлення іншай нацыянальнай/этнічнай ідэнтычнасці як прынцыповай альтэрнатывы «беларускасці», якая была пакладзена ў падваліны палітычнага і культурнага руху XIX–XX стст. Асноваю новай ідэнтычнасці павінна стаць замена назвы,

новае разуменне паходжання (балцкае), а таксама традыцыйная і дахрысціянская культура (у больш узважаных версіях размова можа ісці пра неабходнасць далучэння традыцыйных элементаў да сучаснае ідэнтычнасці).

Як і трэба было чакаць, выданне асобную ўвагу надае прэзентацыі феномену «Крыўя», а таксама выкладанню генеалогіі «крыўскай ідэі». Праблема не ў тэрміне, як гэта часта падаецца, але ў дэкларацыі альтэрнатыўнае сутнасці Беларусі з уласнай генеалогіяй, міфалогіяй, гісторыяй і «тэорыяй».

Гэтай праблематыцы прысвечаны тэкст с. Санько «Імёны бацькаўшчыны. Крыўя», які ўтрымлівае спробы апазнавання Беларусі як індаеўрапейскай «Поўначы» (святарскай па сутнасці) на падставе «міфалагічнай тыпалогіі культуры», выкладання згадак пра тэрыторыю Беларусі ў антычных крыніцах, розных версій паходжання назвы «крывічы» і «Крыўя» («найбольш абгрунтаванаю з'яўляецца гіпотэза, згодна з якой наш этнічны назоў паходзіць ад імя міфічнага пачынальніка пэўнай рэлігійнай традыцыі – найвышэйшага святара Крыва», с. 11). Этымалогія ж словаў «крывічы», «Крыўя», паводле с. Санько, мае сакральны характар і звязана з сакральным статусам тэрыторыі, «дзе праходзіць г. зв. галоўны еўрапейскі водападзел», сучаснай тэрыторыі Беларусі. Рэпрэзентацыю «Крыўі» працягвае артыкул А. Дзерманта «Крывічы. Гістарычна-этнагенетычны нарыс», прысвечаны найбольш істотным момантам этнічнай эвалюцыі крывічоў. Ён апісвае паходжанне, антрапалогію, культуру і палітычную гісторыю гэтага племені з асаблівым націскам на прэзентацыі сведчанняў яго балцкага характару.

Кадыфікацыі генеалогіі крыўскай ідэі прысвечаны тэкст В. Корбута («Мы – раташ святла, крывічы». Тры вякі крыўскай ідэі»), які аналізуе «крывіцкі рамантызм» (XIX – пач. XX ст., сярод прадстаўнікоў называюцца, у прыватнасці, Я. Чачот і І. Насовіч), «нараджэнне ідэі» (1920-я гг., галоўная роля тут адводзіцца В. Ластоўскаму і Я. Станкевічу), пагром у савецкай Беларусі 1930-х гг. і пазнейшае развіццё. Напрыканцы даецца кароткі агляд дзейнасці цэнтра «Крыўя» і функцыянаванне «крыўскае тэмы» ў публічнай прасторы сучаснай Беларусі.

Трэба зазначыць, што часта размова ідзе не столькі пра гісторыю «ідэі», колькі пра акалічнасці ўжывання наймення «крывічы» ў адносінах да беларусаў, беларускага руху, ці метафары «Крывія» ў розных культурных пластах.

Замыкае «генеалагічную» праблематыку новая рэдакцыя тэксту с. Санько «Балцкая тэма» (упершыню надрукаваны ў 1993 г. у «Нашай Ніве»), які дапаўняе «крыўскую» версію этнагенезу беларусаў і заканчваецца знакамітай формулай: «беларусы – гэта славянамоўныя балты». Трэба заўважыць, што дагэтуль версію пра беларусаў як славянамоўных балтаў адстойвалі толькі некаторыя літоўскія ды латышскія інтэлектуальныя асяродкі, якія выкарыстоўвалі яе для рэалізацыі сваіх асіміляцыйных стратэгій на беларуска-літоўскім і беларуска-латышскім памежжы. Дарэчы, гэта адна з праблем – апісаць гэтую мікракаланіяльную стратэгію ў кантэксце «балцкай тэорыі». Нават калі беларусы і літоўцы маюць супольнае балцкае паходжанне, яны стварылі два асобныя нацыянальныя рухі, якія ў пэўных пытаннях канкуравалі паміж сабою.

Крытыка «беларускасці» з'яўляецца важнай часткай выкладання генеалогіі «Крыўі» і неад'емным складнікам «крыўскага праекту». «Беларускасць» і назва «Беларусь» апазнаецца як каланіяльная (звязаная з прыгнётам і залежнасцю), вонкавая (не мае гістарычнага характару і была сканструявана расійскай адміністрацыяй, а ўжо затым часткова перанятая «адраджэнцамі») і ненатуральная для тутэйшай рэальнасці ўвогуле. Крытычнае стаўленне да «беларускасці» пачынаецца яшчэ ў першай палове XX ст. Яно было выклікана імкненнем знайсці больш трывалы грунт для гістарычнай і культурнай легітымацыі нацыянальнага руху праз старажытнае паходжанне («Крывія») ці дзяржаўную традыцыю («Літва»). Найбольш канцэнтравана такая дэканструкцыя беларускасці прадстаўлена ў артыкуле А. Насуты «Харызма тутэйшасці».

Балцкая цывілізацыя і этнаграфічная эмпірыка. Разгортванне «крыўскае перспектывы» патрабуе ўводзінаў у больш шырокі кантэкст, а таксама збору і пэўнай інтэрпрэтацыі этнічнага матэрыялу. У якасці культурнага і палітычнага кантэксту

«Druvis» выступае тое, што ўмоўна можна пазначыць «балцкай цывілізацыяй», а матэрыялам – факты этнаграфіі і лінгвістыкі, якія тым ці іншым чынам можна звязаць з балцкім паходжаннем. «Балцкую цывілізацыю» прэзентуюць артыкул Т. Пятрыкаса («Уставы Крыве. Пра Брутэнаву і Відэвутаву рэлігійную рэформу ў Прусіі (права і рэлігія)») пра старажытную Прусію і тэкст Л. Дучыц («Крыўска-літоўска-латышскія паданні пра культавыя камяні»), які прысвечаны аналізу паданняў пра культавыя камяні. Тэксты Т. Кашкурэвіча («Касмаграфія і тапаграфія ў крыўскіх легендах пра камяні-краўцы ды пра паходжанне рэк Вялля (Нярыс) і Бярэзіна») і А. Дзерманта («Акоўскі лес») спрабуюць давесці сакральнае значэнне для старажытных балтаў пэўных геаграфічных зонаў (вытокі рэк), асобна прыведзены слоўнік «Крыўскіх (беларускіх) балтызмаў». Аддадзена даніна і індаеўрапейскай праблематыцы праз пераклад Дж. Дэя «У пошуку нашых лінгвістычных продкаў. Няўлоўныя вытокі індаеўрапейцаў».

Рэлігія (паганства). Часткаю «крыўскага праекту» з'яўляецца актуалізацыя дахрысціянскай этнічнай культуры, з гэтым непасрэдна звязаны пошукі прысутнасці паганства ў фальклорнай спадчыне, гістарычнай традыцыі і актуальных сацыяльных практыках (У. Лобач «Беларуская традыцыйная культура і хрысціянская царква ў XIX – пач. XX ст.», М. Кацар «Паганскае капішча ў Менску ў XIX – пач. XX ст.»). Гэта спалучаецца з дастаткова наіўнай, на нашу думку, крытыкай хрысціянства (Т. Суніч «Паганцы ў свецкім грамадстве»), якое абвінавачваецца ледзь не ва ўсіх заганах і праблемах сучаснасці. Як паказвае практыка, у гэтым можна абвінаваціць каго або што заўгодна – было б жаданне і ідэалагічны імпэт.

Настойлівасць у прасоўванні «балцкасці» часам здзіўляе, здаецца, што, у адпаведнасці з вядомай схемай, усё беларускае называецца балцкім толькі дзеля таго, каб потым усё балцкае назваць літоўскім. Напрыклад, змешчана мапа тэрытарыяльнага пашырэння літоўскай мовы XV–XVI стст., дзе да літоўскіх абшараў адносіцца не толькі Віленшчына, але і ўся паўночна-заходняя Беларусь. Найменне «літвіны» ўжываецца як раўнапраўны сінонім да слова «літоўцы» (у розных значэннях), трапляюцца меркаванні пра стварэнне ВКЛ літоўцамі і г. д.

Пазіцыя не зусім зразумелая, «супольныя карані», напэўна, не ёсць падставаю для такога зліцця, ды і формула, якую рэпрэзентуе «Druvis», здаецца, гучыць як «беларусы – славянамоўныя *балты*», а не «славянамоўныя літоўцы»[5].

Палітычныя тэксты. Як ужо было адзначана, спалучэнне «крыўскай ідэі» і «балцкай тэмы» адбылося пры канцы 1980-х – пачатку 1990-х, а спалучэнне з пэўнымі правымі палітычнымі ідэямі – яшчэ пазней (канец 1990-х). Тэкст М. Шкіранды «Еўрапейская новая правіца і беларуская перспектыва» можна лічыць пэўным маніфестам для беларускіх «новых правых». Па сутнасці, ён прадстаўляе адаптацыю асноўных заходнееўрапейскіх ідэй гэтага палітычнага спектру да беларускай рэальнасці. М. Шкіранда выкладае кантэкст «новых правых», іх праблематыку (бачанне Еўропы, крытыка сучаснасці і культурна-палітычная практыка) і спрабуе накласці гэта на беларускую перспектыву. Асноўным полем актыўнасці «новых правых», такім чынам, з'яўляецца не столькі палітычная, колькі «метапалітычная» барацьба, па сутнасці, змаганне за культуру, ідэнтычнасці і каштоўнасці. У гэтай сувязі цікавы таксама артыкул А. Насуты «Харызма тутэйшасці», які прэзентуе пэўную «правую» інтэрпрэтацыю сучаснай крызіснай сітуацыі ў культурнай і сацыяльнай сферы. Асноўнае, што вылучаецца ў палітычных тэкстах – націск на палітычную значнасць этнічнасці. Палітычны блок дапаўняецца перакладам артыкула Алена дэ Бенуа, аднаго з прызнаных інтэлектуальных лідэраў «еўрапейскай новай правіцы» («Зварот да дэмакратыі: даўніна і сучаснасць»), прысвечаны генеалогіі паняцця і гістарычнай практыкі дэмакратыі.

Літаратура, інтэрв'ю, рэцэнзіі і абвесткі. Гэты раздзел – добры дадатак для разумення логікі і стылю мыслення аўтараў і выдаўцоў «Druvis». У выданні прысутнічае невялікі блок эсэістыкі, больш шырокі – рэцэнзій і паведамленняў з канферэнцый і сустрэч, па-рознаму звязаных з «балцкаю» праблематыкай, а таксама інфармацыя пра «сяброўскія» арганізацыі ў балтыйскіх краінах (змешчана нават «Дэкларацыя супольнасці балцкай рэлігіі» і інфармацыя пра тое, што 22 верасня адзначаецца Дзень балцкага адзінства).

[5] Зрэшты, «літоўскі» будзе «новых правых» у Беларусі, ці ў Літве, ці ў Еўропе – пытанне.

Гэтыя чатыры тэматычныя блокі і складаюць «універсум» «Druvis». Як вынік, маем альманах, які прэзентуе адзін з сегментаў беларускага мыслення і ўтрымлівае свой праект, ідэалогію, даследчыя ды рэфлексіўныя практыкі.

«Druvis» прадстаўляе цалкам іншую інтэлектуальную і культурную мадэль Беларусі, відавочна, не падобную на ўсе астатнія, і ўжо дзеля гэтага варты прачытання.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/05
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

крытыка

[image]-[image]2006

аналітыка • **крытыка** • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Даніла Жукоўскі Крытэр дызеля

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ

крытык літаратуры. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» аналіз «Прымус захапляцца» (6/2005). На думку Леаніда Дранька-Майсюка і Рыгора Сітніцы, выказаную ў палеміцы «Пісьменьнік і перамога» (Народная Воля. 2005. 20 кастрычніка), Даніла Жукоўскі – «эстэтычна глухі

Апавяданне-2005 / Уклад. А. Бадака. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2005.

Пачаўшы ад красавіка і да канца кастрычніка, я амаль штосуботы сядаю ўранні ў дызель да прыгранічных Брузгоў і еду дваццаць хвілін разам з гурмой гэткіх самых дачнікаў, пераважна за мяне старэйшых, абцяжараных сем’ямі, дзецьмі, унукамі, аматараў (нібы ў творах Ю. Станкевіча) тэлесерыялаў і бульварнай прэсы. У вагоне дызеля я добра пазнаёміўся з жанрам кароткай «балады», якой пэўная катэгорыя гаваркіх пасажыраў цешыць слых менш гаваркіх на працягу сумеснай вандроўкі. Жанр вельмі дэмакратычны. Поспех залежыць у першую чаргу ад смеласці выкладаць сямейныя перыпетыі выпадковым слухачам ды ад узроўню шчырасці. Гэтаксама сціплыя і амбіцыі аўтараў – даволі, каб сплыў незаўважна час, разагналася ранішняя млявасць або сцішылася стомленасць пасля «адпачынку» на градах.

Пераважная частка гісторый ёсць пераказам падзей з кола сваякоў і знаёмых, не абцяжараным ані спробамі захаваць аб’ектыўнасць (якая, аб’ектыўна кажучы, была б і не да месца), ані канцэптуальнасцю ці спробамі інтэрпрэтацыі (бо высновы,

калі яны ёсць, звычайна абмежаваныя труізмамі жыццёвай мудрасці, а ў партрэтаванні персанажаў валадарацца растыражаваныя тэлевізарам і «Камсамолкай» кліша сама не заганы, а патрабаванні жанру: інакш як растлумачыць за некалькі хвілін змест сямейнай драмы выпадковаму гэтага зацікаўленаму слухачу?

Пагартаўшы анталогію «Апавяданне-2005», я выпрацаваў крытэр дызеля: вартай разгляду робяць кнігу тэксты, што стаяць вышэй за пачутае ў вагоне. Адказам на творы, адзіным зместам якіх ёсць прымітыўная факталогія жыцця жанчыны-гаротніцы, шаблонныя ўспаміны новага гараджаніна пра падрабязнасці юначага кахання на элегічным вясковым тле і да т. п. можа быць толькі аналагічная гісторыя, расказаная аўтару. А для гэтага трэба сустрэцца з ім на супрацьлеглых лаўках у вагоне дызеля. Тым, хто хоча пазнаёміцца з жанрам, раю «Марусю» Навума Гальпяровіча – коратка, дыхтоўна і з поўным захаваннем канона.

Пасля прасейвання з сарака шасці тэкстаў засталося менш за палову. Прапорцыя не самая прыемная, але каб гаварыць пра апавяданні беларускіх пісьменнікаў, давядзецца адкінуць яшчэ сёе-тое. Ганад Чарказян, перакладзены ўсёведным сп. Барадуліным, прадставіў цікавы твор, але выглядае ў кнізе госцем. «Крыж на хутары» Уладзіміра Мароза належыць хутчэй да жанру нарысаў або мемуараў, і ягонае змяшчэнне не робіць гонару складальнікам.

Застаецца два дзесяткі апавяданняў, дзе выразна прысутнічае намаганне стаць вышэй за простае паведамленне, гісторыяў, пабудаваных з веданнем законаў мастацтва: тэкстаў у высокім значэнні слова. Але нездарма тут слова «намаганне»: А. Глобус і М. Вайцяшонак, Л. Маракоў і г. Багданава, Р. Баравікова і Л. Дранько-Майсюк, У. Сцяпан і У. Міхно, на маю думку, маглі б выглядаць нашмат цікавей, і гэта зноў жа нагода падзівіцца выбару складальнікаў. Баюся, што не адзін з аўтараў, з чыёю творчасцю я знаёмы ў меншай ступені, таксама мае апавяданні, якія характарызавалі б яго з лепшага боку. Альманах не вельмі прыдатны, каб скласці ўражанне пра пісьменнікаў: гаварыць даводзіцца пра канкрэтныя творы.

шцёвай
ад крытыкі»,
а) Гэта не
ць з нічога
ўсё не нада
нам не
гаворыць,
таму яго ня
згадваем».

Г. Багданава з «Белай ружай...» ды А. Крэйдзіч з «Небакраем, за якім нічога няма» прыцягваюць спробамі асэнсаваць постсавецкія зрухі ў грамадстве і свядомасці. На вялікі жаль, творам не хапае канцэптуальнай цэльнасці. Фрагментарнасць аўтарскіх уяўленняў абясцэньвае каляпалітычную «злобу дня», іншы раз да ўзроўню кан'юнктуршчыны. Герой Крэйдзіча кранае сваім адчайна-наіўным пошукам «месца для подзвігу» ў сваім жыцці, але адсутнасць у ягонай горычы хаця каліва ацэнкі падзей мінулага (БАМ, Афганістан) выглядае нават большаю нацяжкаю, чым сумнеўная храналогія. Постаць Сілуяна-Славы з праваслаўнага кляштара, якога Багданава чамусьці называе раз юнаком, іншы – старцам, пададзеная нагэтулькі ўмоўна, што хочацца папросту перагарнуць старонку: але застанецца банальная гісторыя пра нераздзеленае (і хутчэй за ўсё нетрывалае) юнацкае пачуццё.

Тэма кахання, складанасці пошукаў роднаснай душы ў неспазнаным маладым чалавекам свеце паўстае ў «Ясным ранкам у Пінар-дэль-Рыа» А. Бравы. Калі ў ейнай аповесці «Каменданцкі час для ластавак» грамадска-палітычная экзотыка Кубы пераважае, у апавяданні яна толькі ўдала дапаўняе характарыстыку гераіні. Без непрымання агрэсіўнага прымітывізму фідэлеўскага рэжыму, без горкага «Чаму ім не сорамна гэтак жыць?» партрэт маладой ідэаліскі выглядаў бы саладжава і непераканаўча. Пісьменніца даводзіць: адухоўленая асоба не можа заставацца раўнадушнаю да грамадска-палітычных пытанняў, і ў гэткім кантэксце згадка пра ёга-рэвалюцыянера Шры Аўрабінда выглядае не снабісцкім прыбамбасам, якія гэтак любіць сп. Рублеўская, а вынікам працяглых пошукаў ідэалу. Вось гэтага не хапае героям апавядання Багданавай: натуральнай для чалавека з высокім духоўным развіццём увагі да навакольнага свету, памкнення без самацэнзуры асэнсоўваць ягоныя «добра» і «дрэнна».

Але заморскія дзівосы неабавязковыя. г. Каржанеўская ў «Кватаранце» распрацоўвае тэму каштоўнасці для грамадства цэласнае асобы, не выходзячы па-за межы адносін свайго героя з любімай жанчынай ды з гаспадынямі кватэр, якія ён здымае. Будзённымі дробязямі прыватнага жыцця малюецца партрэт сімпатычнага апартуніста, якога інстынкт да падладжвання і

хамелеонства вядзе да душэўнае няспеласці, страты дарагога чалавека і жыццёвай беспрытульнасці. Грамадскі кантэкст прысутнічае па-за фокусам, але надае апавяданню моц правакаваць чытача на не абы-якія пытанні: якое ж жыццё могуць пабудаваць для сябе ды іншых гэткія людзі?

«Аніякага жыцця яны не пабудуюць!» – голасна, упэўнена і імпэтна адказвае Ю. Станкевіч («У начы гучней бруяць фантаны»). Ягонай антыўтопіі змушана верыш, нават калі верыць не хочацца, нягледзячы на амаль што да прымітыўнасці сціплыя выяўленчыя сродкі. Змрочны Станкевіч пераконвае цэльнасцю светабачання, наяўнасцю катэхітычна простых адказаў на ўсе пытанні, веру ва ўласныя словы. Ён не гуляе, а тлумачыць, не стварае дзеля любові да чыстага мастацтва, а перасцерагае. Ягоная вера простая і цвёрдая, як у Морфіюса са слыннай «Матрыцы», і гэткі тэкст не можа не пакінуць следу ў памяці чытача.

Па кантрасце, шэраг апавяданняў можна залічыць да жанру літаратурнай гульні. П. Васючэнка ў «Бэзавай аблачынцы-2» апявае сустрэчу ў рэальным жыцці з гераіняю свайго даўняга апавядання, і трэ' сказаць, гэтая сустрэча прынясе чытачу больш асалоды, чым «аблачынка» № 1: у апавяданні напоўніцу разгарнуўся іранічна-інтэлігентны талент пісьменніка. Р. Баравікова ў «Лотаці мёртвага пляжа» знаёміцца з тапельцам на пінскім пляжы, але, на жаль, незразумела, чаму гэтую прыгоду а la Брэм Стокер яна палічыла вартай апавядання, бо больш там анічога не адбываецца, а сам тапелец хаця і сімпатычны, але нічым не цікавы, і гісторыя атрымоўваецца пуставатая, аўтарызаваны пераказ старога рамантычнага апавядання. Я. Сіпакоў («Русалка») таксама звяртаецца да старажытнага сюжэта пра дачыненні людзей і русалак, але з вялікім майстэрствам трымае напружанне ад першага да апошняга абзаца. «Апошні ваўкалак» А. Каска працягвае несмяротную тэму кахання і чараўніцтва.

Абысці крытэр дызеля на полі «чыстага рэалізму» ў кароткім апавяданні можна праз якасць: дасканала выштукаванаю мастацкаю формаю, псіхалагізмам, здольнасцю адлюстраваць дух эпохі, выразнасцю ашчадна адабраных дэталяў.

Тут дарэчы будзе сказаць колькі добрых словаў пра псіхалагізм, з якім чытач буйнейшых формаў апошнім часам амаль не сутыкаецца. «Паўночна-каталіцкі», паводле вызначэння «НН», Ф. Сіўко («Бацечка Зэн») прываблівае зваротам да гісторыі, але бліжэйшае знаёмства з апавяданнем крыху расчароўвае: глыбейшы пласт закапаны настолькі глыбока, што яго ці не цалкам даводзіцца дадумваць за аўтара. Апавяданне, аднак, уражвае (сапраўды адчуваецца каталіцкая закваска) прыкладамі някідкай падзеленасці беларускага грамадства, дзе кожны ўпэўнены ў сваёй стоадсоткавай правільнасці ды ў няпоўнай правільнасці іншых – і таму суседа лёгка аддаюць ворагу, кім бы ён ні быў: пошасцю або захопнікам-іншаземцам, а праява салідарнасці выглядае незразумелым выбрыкам.

Адчуваеш сапраўдную асалоду ад «Уцёкаў на край дажджу». А. Бадак праз дробязі і кароткія рэплікі малюе, як паволі адпускае сям'ю напружанне пасля страшэннай аўтакатастрофы, як вяртаецца жыццядайная моц да адвечнага суцяшэння чалавека – пачуцця кахання да блізкіх. Захапляе дакладнасць і далікатнасць, з якой аўтар адсочвае дробныя, але бясконца важныя «падзеі» сямейнага жыцця: асобныя словы, рухі, позіркі, паўзы. Кавалкі нутраных маналогаў гарманічна кладуцца ў агульную плынь дзеяння, словы і думкі персанажаў па-майстэрску індывідуалізаваныя, жыццесцвярджальная пасылка выглядае натуральна і пераканаўча.

Ва унісон гучыць «Кашулька-татулька...» М. Станкевіча. Сюжэт немудрагелісты (парушаную повязь паміж мужам і жонкаю аднаўляе наіўная любоў маленькага сына да бацькі) і лёгка мог бы стацца падставаю для вагоннае навелы. Але гэтак у вагоне не апавядуць. Там, хаця трошкі, будуць смакаваць падвойнае жыццё мужа, не здолеюць перадаць напружання нібыта беззмястоўнай размовы за сямейным сталом, павольнае і складанае выспяванне рашэння, без якога не мае сэнсу марнаваць словы на апісанне эфектоўнага, але павярхоўнага знешняга дзеяння.

Іншым шляхам пайшлі А. Бутэвіч («Вацікаў выбрык»), У. Дамашэвіч («Крайняя авечка»), А. Наварыч («Ліса ў тумане»). Ключавое месца ў іхніх творах займаюць нетыповы ўчынак і

ягонае тлумачэнне. Апавяданні пакідаюць уражанне добра расказанай займальнае і павучальнае гісторыі. Важна, што выключнасць падзеі не зводзіцца адзіна да п'янкі (некалькі іншых аўтараў відавочна перакананыя, што дэталёвае апісанне выпіўкі – вычарпальна дастатковая падстава для апавядання). Але нібыта просты прыём раскрыцця і тлумачэння ўдаўся не ўсюды. У «Графіці» А. Федарэнкі ўсё нібыта на месцы. Апавяданне хочацца назваць удалым. Але змест выслізгвае з памяці, постаць галоўнага персанажа расплываецца. Ключавая сцэна – несправядлівае асуджэнне падлетка за бязглузды надпіс на плакаце ў школе – не прапісаная, а пераказаная: яе не бачыш, не ўяўляеш асобаў удзельнікаў, і ўражанне несправядлівасці атрымліваецца недастаткова моцнае, каб паверыць у фатальны ўплыў на далейшы лёс героя. Замест жыццёвых аналагаў гісторыі пачынаюць вышуквацца літаратурныя паралелі, і тэкст, нягледзячы на добры ўзровень, набывае адценне другаснасці.

Пераглядаючы альманах, пачынаеш разумець крыніцы некаторых самаацэнак. Вось старанна адшліфаваная проза Б. Пятровіча ззяе ў атачэнні вагонных гісторыяў што той дыямент. Але згадваецца перамога Баскава над Газманавым: Баскаў выйграе несумненна, музыка застаецца, дзе была. «Фрэскі» ўздымаюцца над сярэднім узроўнем на дзесяць паверхаў, але што гэта за ўзровень і якой вышыні паверхі?

Калі параўноўваць мініяцюры аўтара «Пуціны» (не толькі змешчаныя ў альманаху, але і з тома «Шчасце быць...») з вышэйразгледжанымі апавяданнямі, бачыш розніцу: тыя аўтары змагаюцца і перамагаюць жыццёвы матэрыял, сп. Пятровіч змагаецца (і перамагае) словы і знакі прыпынку. Ягоныя дасягненні, хаця і несумненныя, не выходзяць за межы хараства формы ды прыгажосці фармулёўкі, у той час як іншыя, хай сабе менш кідкія, тэксты прымушаюць зазірнуць у глыбіню падзеі, адчуць рух думкі і пачуцця героя – а не толькі самога пісьменніка.

Можна параўнаць «Фрэскі» і з «Кароткімі былямі» А. Зэкава, дзе кожная карацелька не толькі прыпавесць, але і партрэт ва ўсёй чалавечай непаўторнасці. Два ў адным, як кажа рэклама.

Шматаблічная ісціна пераконвае мацней, наяўнасць паўнакроўных герояў выклікае давер да пісьменніцкіх канцэпцый, які немагчыма заваяваць самым бліскучым сілагізмам. Творы Б. Пятровіча ўпрыгожваюць альманах, але, хай даруюць мне яшчэ адну музычную метафару, гэта Сальеры. Добры кампазітар, але Моцарт – лепшы.

Наўрад ці па кнізе, дзе кожны з аўтараў, і не заўсёды ўдала, прадстаўлены адным творам, можна меркаваць, хто ў нас Моцарт. Але падаецца дарэчным паразважаць пра вытокі памылак складальнікаў, за якія, думаецца, неаднойчы будуць іх папракаць пакрыўджаныя аўтары. Перш за ўсё, чаму гэткім прывабным выдаўся дызельны фармат? Падаецца, гады масіраванага наступу маскульту, а дакладней, бескультур'я, не прайшлі дарма. Ціск да зніжэння культурных стандартаў пакінуў след што ў пісьменніцкай, што ў рэдактарскай свядомасці: не самі ж чытачы пішуць, рэдагуюць, выдаюць або пускаюць у эфір бульварныя газеты і pulp fiction, безгустоўныя серыялы і бяздумныя праграмы. Ваяўнічае бескультур'е з рэзервацыі антыўтопіі ўжо даўно выйшла на прастору рэальнага жыцця, з эфіру FM-станцый пратачылася ў тэатральныя залы, з бульварнай прэсы, якую гартаюць у вагонах прыгараднага дызеля, цішком перабіраецца на старонкі выданняў вышэйшага ўзроўню. Працэсы дэградацыі літаратуры адбіваюць логіку грамадскіх пераўтварэнняў.

Цікава і сімптаматычна, што ў альманаху толькі Ю. Станкевіч – і тое ўскосна – закранае гэтую тэму. Іншыя нічога не заўважаюць? Яшчэ не заўважаюць? Ужо не заўважаюць? Ці тыя апавяданні не ўваходзяць у лік «лепшых твораў айчынных пісьменнікаў, напісаных у гэтым жанры за апошнія гады»?

Калі замоўчванне нават важнае тэмы можна зразумець – не можа, урэшце, адзін альманах змясціць усяго, – недахоп патрабавальнасці растлумачыць цяжэй: дзеля гэтага дадатковыя старонкі не патрабуюцца, ды і крытэр тут нескладаны. Мастацкі твор побач з выразным выкладаннем і дакладным малюнкам павінен утрымліваць пэўную ступень канцэптуалізацыі жыццёвага матэрыялу. (Добрым прыкладам тут будуць «Сяброўкі» Л. Рублеўскай, якая выразна кажа, што

апісвае пэўны тып людзей.) У выпадку недахопу канцэптуальнасці атрымліваем або невыразную «баладу», або эцюд-замалёўку (хай сабе «Аўдольку і Міхалку» Л. Дранька-Майсюка, выкананую прафесійна). Ніжэй гэтай мяжы апавяданне выраджаецца ў паведамленне, творцу заступае пераказчык.

Калі ж, як у шмат якіх творах Б. Пятровіча або У. Сцяпана (прадстаўленага «Вяртаннем»), якія нібы вартуюць з двух бакоў іншую мяжу, канцэптуалізацыя перамагае жыццёвы матэрыял і пачынае распраўляцца з апошнімі слядамі прыватнага выпадку, атрымліваецца ізноў жа не апавяданне, а нешта іншае. Можа, эсэ, тут патрабуецца распрацаванасць аўтарскае думкі, або прыпавесць, тады неабходная празрыстасць жыццёвае навукі. Тэксты, створаныя на мяжы, пакутуюць на невыразнасць задумы і з цяжкасцю знаходзяць свайго чытача. Тое, што складальнікі «Апавядання-2005» легкадумна паставіліся да «жанравай чысціні», не прынесла карысці ані кнізе, ані прэзентаваным аўтарам.

Няўвага да жанравае прыналежнасці, недастатковая патрабавальнасць да ўзроўню, адсутнасць некаторых імён могуць тлумачыцца хіба што імкненнем складальнікаў альманаха да самазаспакаення. Гэта адчуваецца ўжо ў анатацыі, дзе ўсе прадстаўленыя творы залічаныя да найлепшых за апошнія гады, але найяскравей падкрэсліваецца шэрагам фатаздымкаў парадна-справаздачнага кшталту. У выніку, нягледзячы на наяўнасць моцных твораў, кніжцы наканавана выглядаць непрадстаўніча і, выбачайце, несур'ёзна. І гэта пры тым, што ідэя сабраць пад адной вокладкай найлепшыя апавяданні здольная выклікаць авацыю, і нават з улікам, што сам Саламон, наважыўшыся скласці альманах кароткага апавядання, не пазбегнуў бы памылак.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/15
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

крытыка

[image]-[image]2006

"аналітыка" • **крытыка** • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Пётра Рудкоўскі Ад ідэнтычнасьці да саборнасьці Пару зацемак з нагоды дыскусіі вакол беларускай тоеснасьці

ПЁТРА РУДКОЎСКІ

філёзаф, ляўрэат прэміі «ARCHE» «За сумленнае слова» (2005). Яго філязофская асьвета адбывалася спачатку ў арыстотэлева-тамістычнай (Дамініканскі калегіюм), а цяпер, на факультэце філязофіі Ягелёнскага ўнівэрсытэту, у аналітычна-пазытывістычнай (постаналітычна-постпазытывістычн атмасфэры. На думку

Ці чалавек *X* можа быць увесь час *тым самым*? Ці два чалавекі – *А* і *Б* – могуць быць *у нейкім сэнсе* тым самым? Ці група людзей *Г* можа ўтвараць *адно цэлае*?

Гэта нешта большае, чым проста тэарэтычныя пытаньні. Інтэрпрэтацыя гэтых пытаньняў і адказы на іх маюць далекасяжныя практычныя, у прыватнасьці, грамадзка-палітычныя і эканамічныя наступствы. У свой час адказ жыхароў Паўночнае Амэрыкі на пытаньне, ці зьяўляюцца яны *часткай* вялікабрытанскае мэтраполіі, ці ўтвараюць нешта *адрознае, самастойнае*, вельмі паўплываў на ход гісторыі ня толькі ў лякальным, але і глябальным маштабе. І аналягічна дзеецца заўжды тады, калі ідзе працэс пошуку і артыкуляцыі

сваёй тоеснасьці. Наступствы такога ці іншага самавызначэння заўжды будуць мець велізарнае значэньне, хай сабе цяпер, і не такое глябальнае, як у выпадку Паўночнае Амэрыкі.

Адсюль, хочацца выразіць вялікую сатысфакцыю з таго факту, што беларускія інтэлектуалы, засяроджаныя вакол інтэрнэт-старонкі *belintellectuals*, усур'ёз заняліся распрацоўкай філязафічных фундамэнтаў, на якіх будуецца канцэпт тоеснасьці. Маю на ўвазе перш за ўсё дыскусію паміж дамі Вольгай Шпарагай і праф. Рыгорам Мінянковым[1]. Незалежна ад гэтае дыскусіі на старонках «ARCHE» ўжо доўгі час вядзецца дыскусія вакол «Жэнэўскай канвэнцыі» ды «нацыянальнага праекту», дзе зноў жа праблема тоеснасьці ўвесьчасна паўстае «ўва ўсёй сваёй велічы і павазе».

Так сымбалічна склалася, што ў конадзень Новага году, які лічыцца годам «беларускага выбару», дзьве згаданыя дыскусіі, пачаткова «паралельныя» адна да другой, «перакрыжаваліся», а іх удзельнікі сустрэліся як на старонках «ARCHE», так і на сайце *belintellectuals*. Зьявіліся спробы вывесьці дыскусію вакол тоеснасьці ў новы гермэнэўтычны кантэкст (напр. прапанова Янава Палескага разглядаць дыскусію паміж беларуска- і расейскамоўнымі водле аналёгіі да дыскусіі паміж камунітарыянамі і лібэраламі[2]), нарысаваць трансфармацыю канцэпту ідэнтычнасьці ў эўрапейскай філязофіі (Рыгор Мінянкоў) ды паказаць спэцыфіку беларускай тоеснасьці як тоеснасьці «памежжа» (Вольга Шпарага). Варта зазначыць, што *сама дыскусія* моцна ўплецена ў працэс фармаваньня беларускай тоеснасьці/ідэнтычнасьці, яна выяўляе і сыгніфікуе праблемныя бакі гэтага працэсу, а таксама сьведчыць пра наяўнасьць «месцаў судакрананьня», патэнцыйных пунктаў перасячэньня розных дыскурсаў і ідэалёгіяў.

Заданьнем гэтага артыкулу будзе – згодна з інтэнцыяй, выражанай у падзагалоўку – «зрабіць пару зацемак» на палёх згаданых дыскусіяў, у прыватнасьці, дыскусіі Шпарага – Мінянкоў. Але гэта маюць быць не абы-якія зацемкі, а *разбуральныя*: іхняй мэтай будзе правесьці дэканструкцыю катэгорыі тоеснасьці/ідэнтычнасьці і падвесьці да прыняцьця іншае катэгорыі – *саборнасьці*. (Адразу зазначу, што ў гэтым

Выглядае, што моцная кірункі ці ідэалогіі ўстаноўка на эмпірычную рэфэрэнцыйнасьць.

[1] Ольга Шпарага. Поиск идентичности в контексте погранічья: беларуская версия. Григорий Минёнков. Концепт идентичности: перспективы определения. Часть I, Часть II // .

тэзіс будуць самі па раўнаважнымі.) Пры ўсім гэтым роздум гэты застанецца проста «зацемкай на палёх», г. зн. не прэтэндуе на ролю акадэмічнага дасьледаваньня, хоць, можа, і заслужыць на нейкую ўвагу з боку сур'язьнейшых дасьледнікаў.

1.

Пачнем ад панятку *тоеснасьці* ў наймацнейшым, то бок, лягічным сэнсе слова. Гэтую тоеснасьць схарактарызаваў пры дапамозе кантэкстуальнае дэфініцыі Готфрыд Лейбніц: *дзьве рэчы* – x *і* y *ідэнтычныя тады і толькі тады, калі кожная прымета* x *зьяўляецца адначасова прыметаю* y.

Такім чынам, два прадметы – каб быць *тоеснымі* – мусяць быць *неадрозьнівальнымі*. Філёзафы даўно ўжо заўважылі, што такога тыпу тоеснасьць дэ факта касуе ўсякі плюралізм: няма шанцаў знайсьці ў рэальным (а нават цяжна знайсьці ў ідэальным!) сьвеце два нумарычна розныя прадметы, якія будуць мець *тыя ж самыя* прыметы. Тоесны ў лейбніцаўскім значэньні можа быць толькі адзін і той жа прадмет, тоесны з самім сабой! Калі $x = y$, то гэта значыць, што x і y – гэта нумарычна адзін прадмет. (Хоць і тут, бадай, трэба дадаць, што гаворка йдзе пра *мамэнтальную тоеснасьць*, а ня *сталую*! Прадмет x у момант $t\text{-}1$ ня мусіць быць тоесны з самім сабой у $t\text{-}2$.)

У XX ст. Пітэр Гіч запрапанаваў адмовіцца ад панятку «моцнае» тоеснасьці і пачаць карыстацца паняткам *рэлятыўнае тоеснасьці*: два прадметы – x і y – тоесныя заўсёды *з увагі на...* Трохкроп'е ў гэтай формуле адкрывае надзвычай шырокую прастору для нашай творчасьці і вынаходлівасьці. Што рабіць з гэтым трохкроп'ем? З увагі *на што* будзем акрэсьліваць тоеснасьць беларусаў і проціпастаўляць яе іншым тоеснасьцям?

Заўважма, што пытаньне тут не стаіць: ці магчымы *адзіны адказ* на гэтае пытаньне (ясна, што немагчымы!), а ці магчымы які-кольвек *кансэнсус* у справе адказу? Заўважма таксама, што тут таксама гаворка вядзецца зусім *не пра вечны* кансэнсус, а пра часовы, пра кансэнсус Тут і Цяпер, калі можна пакарыстацца словазлучэньнем В. Шпарагі.

Водле маіх назіраньняў, адзінае, наконт чаго ўдалося паразумецца беларускім мысьлярам і інтэлектуалам, дык гэта наконт *памежнага характару* беларускай тоеснасьці, яе *архіпэлягічнасьці* (пар. Акудовічаў «Архіпэляг Беларусь») і *неакрэсьленасьці*.

«Памежжа – *гэта «прастора паміж» (...). Сытуацыя* памежжа, *у адрозьненьне ад франтыру, пазбаўляе нас ілюзіі схаваньня на сваім баку*» – піша спадарыня Шпарага. Мэтафара *архіпэлягу*, паводле інтэрпрэтацыі аўтаркі, абазначае фрагмэнтарычнасьць, разарванасьць беларускай нацыянальнай культуры, ну а *неакрэсьленасьць* – гэта лягічная выснова, зробленая на базе дзьвюх першых характарыстык.

Такім чынам, мы дасягнулі кансэнсусу наконт *адсутнасьці адказу* на пытаньне: «з увагі на што» беларусы павінны самі сябе ідэнтыфікаваць у прасторы і часе? Ці *такі* кансэнсус можа нас задавальняць? Ці мэтадычнае ўніканьне адказу на пытаньне: *хто мы*? ня ёсьць занадта цяжкім псыхалягічным выпрабаваньнем?

2.
Можна, аднак, стварыць некалькі гіпатэтычных мадэляў пазытыўнага адказу на гэтае пытаньне: *з увагі на што* мы тоесныя? Ніжэй я прапаную зь дзясятак такіх мадэляў. Інакш кажучы, на месца шматкроп'я ў фразе «мы тоесныя *з увагі на*...» можа ўскочыць прынамсі дзесяць «прэтэндэнтаў»:

1) Мова;

2) Рэлігія;

3) Аксіялёгія, г.зн. сыстэма каштоўнасьцяў;

4) Нацыянальныя сымбалі;

5) Звычаі;

6) Тэрыторыя;

7) Дзяржава;

8) Гісторыя;

9) Геапалітычная місія;

10) Назва «Беларусь».

Сьпіс можа быць яшчэ даўжэйшым, але для нашых патрэб пералічаных тут патэнцыйных падмуркаў тоеснасьці будзе дастаткова, каб зрабіць пэўныя высновы.

Калі прасачыць гісторыю нацыябудаваньня розных народаў, дык можна заўважыць, што першыя пяць элемэнтаў традыцыйна ўтваралі галоўную базу-субстрат нацыянальнае тоеснасьці. Яны найчасьцей станавіліся зьместам маральнага звароту нацыябудаўнікоў да люду, а ўсякія адукацыйныя ды асьветніцкія праекты былі часьцяком скіраваны на *інтэрыярызацыю* гэтых каштоўнасьцяў прадстаўнікамі пэўнае супольнасьці.

У сучаснай Беларусі маем такую сытуацыю: нам дагэтуль не ўдалося здабыць кансэнсусу наконт першых пяці «нацыязлучальных» фактараў. Нам наканавана жыць у сталым напружаньні, напружаньні, да якога мы ўжо нават прывыклі і ўспрымаем як нармальнае. Можна тут указаць на два галоўныя асяродкі напружаньня. *Першы*: ці патрэбная гамагенізацыя, г.зн. «уаднастайненьне» згаданых першых пяці элемэнтаў: мова *х*, і толькі яна, рэлігія *у*, і толькі яна і г.д., ці трэба пакінуць тут плюралізм?

Катэгорыя «памежжа», на жаль, не да канца тлумачыць сутнасьць праблемы. Яна адцягвае ўвагу ад згаданага напружаньня, а можа, дазваляе часткова інтэграваць яго, але, здаецца, не вырашае праблемы. «Быцьцё-паміж», сьвядомасьць «разарванасьці» ўласнае культуры, «фрагмэнтарнасьць» і г.д. – усё гэта *фактары дэзарыентацыі*, яны вынікуюць стан яшчэ большай разгубленасьці і разрозьненасьці.

І тут паўстае перад намі – разгубленымі і дэзарыентаванымі «памежнікамі» – сілавы інтэгравальны фактар: Дзяржава зь

вялікае літары, дзяржава-бог, які і гарантуе «стабільнасьць» і «еднасьць» беларускага «народу». І гэта другі, намнога больш небясьпечны, асяродак напружаньня, спароджаны тым першым асяродкам. На месца амбівалентнай *нацыянальнай* еднасьці прыходзіць яшчэ больш амбівалентная *мэханічная* еднасьць. Выходзіць так, што мы, не захацеўшы аб'яднацца вакол мовы, рэлігіі і нацыянальных сымбаляў, дазволілі аб'яднаць самых сябе ў *групу падпарадкаваных*, падпарадкаваных нейкай вонкавай сіле, якая кіруецца ўласнаю лёгікай, якую не цікавіць ані наш нацыянальны, ані «памежны» характар.

Я ўказаў на гэтыя два «асяродкі напружаньня» як на патэнцыйныя фактары канфлі-кту, якія і цяпер, і пазьней будуць даваць аб сабе знаць. Напружаньне – гэта ненатуральны для чалавека стан, у паасобных выпадках яно можа папросту паралізаваць сілы і замацоўваць «псыхалёгію пешкі», пачуцьцё глябальнай залежнасьці ад вонкавых фактараў (напр., моцнай Дзяржавы). Аднак псыхолягі і паэты ведаюць, што напружаньне можа стацца таксама крыніцай творчасьці. Такім чынам, думаю, калі нам ужо і наканавана застацца ў стане напружаньня на невядомы час, то застаецца толькі папытацца пра шляхі *творчага перажываньня* гэтага стану.

3.

«Hē tautotēs henotēs tis estin» – тоеснасьць зьяўляецца пэўнаю формай еднасьці, чытаем у «Мэтафізыцы» Арыстотэля. Калі ж гаворка пачынаецца весьціся пра беларускі фэномэн, дык слова «тоеснасьць» пачынае набываць зусім іншае, амаль супрацьлеглае значэньне: *беларуская «тоеснасьць» – гэта пэўная форма рознасьці*. Паўстае ў зьвязку з гэтым слушнае пытаньне: а ці апраўдана ў такім выпадку само стасаваньне гэтага тэрміну? Ці гэты тэрмін часам не фальшуе нашу сьвядомасьць, павялічваючы тым самым узровень напружаньня і дэзарыентацыі?

«Tauta men hōn mia hē ousia» – тоеснае ж тое, што мае адну і тую ж сутнасьць (субстанцыю) – піша далей Арыстотэль. Беларускі ж фэномэн славіцца якраз *ад-сутнасьцю*, быцьцём-бяз-сутнасьці, быцьцём, пазбаўленым устойлівага

інтэгравальнага ядра; ён славіцца згаданымі ўжо *неакрэсьленасьцю, фрагмэнтарнасьцю* і *архіпэлягічнасьцю*. Тое, што мяноўна ў Беларусі – амаль у цэнтры Эўропы! – паўстала стронг-дыктатура, якая характарызуецца небывалай жывучасьцю, падаецца заканамерным: арыентацыя на моцную Дзяржаву – гэта папросту «эфэкт кампэнсацыі». Адсутнасьць унутранай еднасьці спараджае залежнасьць ад вонкавага «яднальніка».

Некаторыя тут схільны акцэнтаваць неабходнасьць разьвіваньня *нацыянальнай сьвядомасьці* (Дынько, Булгакаў), а іншыя большы акцэнт кладуць на *грамадзянскую сьвядомасьць* (Мінянкоў). Але і адны, і другія сыходзяцца ў тым, што патрэбна разьвіваньне *пачуцьця аўтаноміі* ў стасунку да дзяржавы. Украінская рэвалюцыя-04 паказвае, што няма такой моцнай сілы, як прагненьне *свабоды*, асабістай і сумеснай свабоды. У якасьці «глыбіннай прычыны» Аранжавай рэвалюцыі некаторыя згадваюць пра нацыянальны ўздым, іншыя пра грамадзянскую салідарнасьць, а іншыя ўказваюць на прагматычныя калькуляцыі прадстаўнікоў сьвету бізнэсу (зусім «неідэйны» фактар). Насамрэч жа на Майдане былі і расейскамоўныя, і ўкраінскамоўныя, «ідэалісты» і «прагматыкі», «нацыяналісты» і «лібэралы». Самыя розныя фактары зрабілі магчымым посьпех гэтае рэвалюцыі.

Такім чынам, дыскусія вакол тоеснасьці павінна, на маю думку, быць перападпарадкавана дыскусіі *вакол свабоды*, свабоды-для-сябе і свабоды-для-іншых. І на гэтым месцы дазволю сабе выразіць паняверку: ці сапраўды *дыскурс тоеснасьці* здольны арыентаваць нас на *дыскурс свабоды*?

«Тоеснасьць» неаднойчы ўжо выклікала падазрэньні і крытыку з боку філёзафаў. Экзыстэнцыялісты, прыкладам, настойліва падкрэсьлівалі фундамэнтальную *адкрытасьць* чалавечае экзыстэнцыі. Нельга, на іх думку, акрэсьліць сутнасьць-натуру чалавека, чалавек ёсьць істотай *у станаўленьні*, якая мае ўвесь час мае магчымасьць ствараць і пераствараць сябе. Падобная выснова напрошваецца і ў зьвязку з Гайдэгеравым разуменьнем чалавечага тут-быцьця (*Dasein*) як «праекту» як *нахіленага-да-будучыні*. «Тоеснасьць» сталася, як вядома, пастаянным

аб’ектам атакі з боку постмадэрністаў, якія ўспрымалі яе як прынцып касаваньня рознасьці і рэпрэсіяў у стасунку да ўсяго, што ня ўпісваецца ў формулу накінутай тоеснасьці.

Вольга Шпарага ў сваім артыкуле (што згадваўся вышэй) абмалявала ўплыў «майстроў падазрэньня» (Маркса, Ніцшэ і Фройда) на разуменьне ідэнтычнасьці. Падагульняючы рэфлексію Шпарагі, можна сказаць, што адбыўся пераход ад безумоўнай тоеснасьці да *ўмоўнай, кантэкстуальнай* тоеснасьці. *«Ідэнтычнасьць – гэта ставаньне сабой, абавязкова патрабуе разгорненага ў часе культурна-гістарычнага апасродкаваньня і фармаваньня супольнасьцяў»*. На маю думку, нават ідэя ўмоўнай тоеснасьці павінна быць перагледжана.

Я асабіста глыбока перакананы, што праблема беларусаў не ў *слабой тоеснасьці*, а ў тым, што яны настроены менавіта на *моцную тоеснасьць*, якая і блякуе згаданы вышэй *дыскурс свабоды*. Ляяльнасьць значнай часткі беларусаў да кіруючага рэжыму сьведчыць пра тое, наколькі вялікая патрэба ў моцнай, таталітарнай тоеснасьці. Настальгія за моцнай тоеснасьцю назіраецца і ў дыскурсах, апазыцыйных у стасунку да беларускага афіцыйнага дыскурсу. У выніку заўважыць можна шэраг «стратэгіяў элімінацыі»: беларусы няспынна выклінаюць адзін аднаго ў імя жаданай Еднасьці або Аднароднасьці. Дыскурс тоеснасьці і цяпер, і ў будучым будзе схіляцца да Арыстотэлевага ідэалу: знайсьці *сутнасьць-субстанцыю*, якая настолькі моцна злучыць беларускі народ, што нельга будзе ад гэтага народу «адарвацца».

На маю думку, дыскурс тоеснасьці не спрыяе дыскурсу свабоды. Думаю, што ў выпадку Беларусі (а хто ведае, ці ня трэба гэта зрабіць і ў іншых выпадках?) катэгорыю тоеснасьці трэба закінуць на карысьць катэгорыі *саборнасьці*. Гэта катэгорыя, як няцяжка здагадацца, запазычана са спэцыфічнага кантэксту: яна выпрацавана расейскімі праваслаўнымі мысьлярамі і абазначае быццьцё-сабраным, быццьцё-скліканым Богам. Можна, аднак, стасаваць гэту катэгорыю і незалежна ад першапачатковага багаслоўскага кантэксту, г.зн. надаць ёй сьвецкую інтэрпрэтацыю. Саборнасьць здымае імпэратыў быць падобным да іншых (ці то ў аспэкце мовы, ці рэлігіі, ці

ідэалягічнай ляяльнасьці), кожны мае права *быць згодна са сваёй уласнай вольнасьцю*. Сутнасьцю саборнасьці ёсьць плерома разнастайнасьці. Няма аб'адноўваючай інстанцыі, ёсьць толькі Дух даверу і ўзаемапавагі.

Пераход ад тоеснасьці да саборнасьці абазначае паслабленьне ідэйнага фактару на карысьць пэрсаналісцкага: кожная канкрэтная асоба заўжды важнейшая за ідэю, нават самую шляхетную. Істотным складнікам саборнага мысьленьня ёсьць тое, што можна назваць *прынцыпам этычнай асымэтрыі*: прэзумпцыя добрае волі заўжды павінна быць мацнейшая за прэзумпцыю злой волі. Як дагэтуль, то дамінуе адваротнае мысьленьне: дзеяньне прадстаўніка «іншага» лягеру часьцей інтэрпрэтуецца як варожае а прыёры, сілай самога факту, што ён *іншы*. Такая пазыцыя наглядна бачная ў самых розных «памежных» сытуацыях: пры сутыкненьні беларускамоўныя – расейскамоўныя, праваслаўныя – каталікі, левыя – правыя, апазыцыя – улада. Колькі разоў давала аб сабе знаць гэтая заганная этыка: беларускамоўныя *а прыёры* станавіліся ў вачах расейскамоўных запозьненымі ў разьвіцьці нацыяналістамі, а расейскамоўныя ў вачах беларускамоўных – *а прыёры* здраднікамі альбо небясьпечным рэліктам каляніяльнай эпохі. Аналягічныя паставы можна спаткаць і ў іншых сытуацыях, калі беларусы стаюць перад абліччам канфэсійнай, рэлігійнай, сьветапогляднай ці палітычнай рознасьці.

Акцэптацыя саборнага характару беларускай супольнасьці і прыняцьце прынцыпу этычнай асымэтрыі здольныя зьдзейсьніць радыкальную зьмену атмасфэры ўнутры беларускага грамадзтва. Вызваленьне сваёй мэнтальнасьці ад субстанцыяльна-эсэнцыяльнай тоеснасьці дазволіць скіраваць энэргію на дыялёг і ўзаемапазнаваньне, а не на вайну і дабіваньне прадстаўніка іншае культурнай ці палітычнай опцыі. Пытаньне: «а што *дэманічнае* хаваецца за ягонымі ўяўна шляхетнымі паводзінамі?» павінна быць заменена на «што *канструктыўнае* хаваецца за дадзенымі паводзінамі».

Беспадстаўны давер мае заўжды вышэйшую этычную вартасьць, чым беспадстаўны недавер – вось сутнасьць прынцыпу этычнай асымэтрыі. Дыскурс тоеснасьці, на маю думку, тоіць у сабе

ўстойлівую пагрозу для ажыццяўленьня гэтага прынцыпу.

Саборнасьць не абазначае ні ў якім разе сьляпую *згоду на ўсё*. Дыскусіі і палемікі паміж паасобнымі субкультурамі захоўваюць сваю рэлевантнасьць, аднак здабываюць дзьве новыя якасьці: «нэгатыўную» і «пазытыўную». Пад «нэгатыўнаю» разумею *адсутнасьць «стратэгіяў элімінацыі»*, ачышчэньне ўласнага дыскурсу з такіх словаў і словазваротаў, якія наўпрост ці ўскосна пазбаўляюць права прадстаўнікоў іншай культурнай ці палітычнай опцыі на быцьцё беларусам. (Добрым прыкладам стратэгіі элімінацыі, стасаванай прадстаўніком беларускамоўных, ёсьць словазвароты ў дыскурсе Сяргея Дубаўца, агучаныя 15 лістапада 2005 году на «Радыё Свабода» ў перадачы «Перавагі беларускамоўнасьці»: «Расейскамоўе беларуса – гэта дэ факта саветамоўе. А паколькі мова – гэта таксама і мысьленьне, дык ён таксама і думае па-савецку. (...) Беларускамоўны а прыёры больш разьвіты, чымся ягоны расейскамоўны сусед».)

«Пазытыўная» якасьць у гэтым выпадку абазначае ўстаноўка на «зьбіраньне» (мяноўна гэта і сугеруе этымалёгія: саборны – «зьбіральны») і творчую перапрацоўку ідэяў, узятых з розных дыскурсаў. Толькі гэткім чынам можна зрабіць наша напружаньне, пра якое гаворка была вышэй, крыніцай канструктыўнае творчасьці.

Я веру, што саборнасьць не прывядзе да скасаваньня беларускай спэцыфікі, аднак, цалкам верагодна, што паўстане нечаканая, пакуль што нам невядомая спэцыфіка. Усё гэта нагадвае ў нечым ідэю – што праўда, цяпер ужо застарэлую – «нябачнай рукі» вольнага рынку: у выніку добразычлівага дыялёгу будзе фармавацца нейкая новая спэцыфіка Беларусі і беларусаў.

* * *

Беларусаў прынята называць талерантным і цярплівым народам. На жаль, гэты стэрэатып вельмі павярхоўна апісвае «беларускі характар» (бяру словазлучэньне ў дзьвюхкосьсе, бо гаварыць пра характар калектыўнага суб'екту можна толькі

ўмоўна). Часьцяком маем справу з *маўкліваcьцю, за якой хаваецца фундамэнтальная неталерантнасьць і агрэсія ў стасунку да «іншых»*. А неталерантнасьць, прыхаваная маўкліваcьцю, бярэцца са страху перад рознасьцю і разнастайнасьцю. І тут магчымы дзьве «тэрапіі» гэтага страху: альбо пераадолець гэту рознасьць шляхам *уніфікацыі*, альбо пазнаць і ўступіць у дыялёг зь *іншымі*. Першы варыянт бытуе ў дыскурсе тоеснасьці, а другі – у дыскурсе саборнасьці, то бок, дыскурсе свабоды. Я веру ў пэрспэктыўнасьць гэтага другога вырыянту.

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

№ 1,2 (41,42) - 2006

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/03/05

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

крытыка

[image]-[image]2006

"аналітыка" **крытыка** • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Павал Усаў
Ці можа дзяржава існаваць без людзей? Новыя хітрыкі дзяржаўных ідэолагаў

ПАВАЛ УСАЎ

палітоляг, кіраўнік магілёўскай гарадзкой арганізацыі аб’яднанай БСДП (НГ). У сакавіку летась быў прымушаны звольніцца з Магілёўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Куляшова з прычыны цвіх палітычных перакананьняў.

Гончаренко Р. М. *Политическая и правовая идеология государства*. – Минск: УП «Технопринт», 2005. – 279 с.

Основы идеологии белорусского государства: история и теория. – Минск: УП «ИВЦ Минфина», 2005. – 314 с.

Мельник В. А. *Цивилизационные основания идеологии белорусского государства*. – Минск: ООО «БИП-С ПЛЮС», 2005. – 118 с.

1. ІДЭАЛОГІЯ ЯК МІФАЛОГІЯ

Распачаты лукашэнкаўскім рэжымам працэс ідэалагізацыі палітычнай і сацыяльнай сфераў закрануў гуманітарную адукацыю, асабліва такія навукі, як паліталогія, гісторыя і філасофія, якія паступова ператвараюцца ў ідэалагічны рэсурс, а іх уласная тэарэтычная база прыладжваецца да строга

акрэсленых ідэалагічных рамак.

Гэтыя тэндэнцыі, а таксама шмат іншых рэчаў, цесна звязаных з працэсам ідэалагізацыі грамадства, можна прасачыць на падставе нядаўна выдадзенай кніжкі Рамана Ганчарэнкі.

Спярша аб яе фармальных баках. Напісанне і выданне такога кшталту літаратуры сведчыць пра тое, што ў справе стварэння і навязвання дзяржаўнай ідэалогіі ўжо распачаўся працэс стагнацыі, бо новыя ідэалагічныя тэксты не нясуць у сабе каштоўнаснай, эмацыйнай і сімвалічнай нагрузкі, а з'яўляюцца зборам ужо раней вядомай інфармацыі. Выяўляецца, што каб сфармаваць і развіць тую ці іншую палітычную дактрыну, аднаго адміністрацыйнага рэсурса і шматлікіх кніг па ідэалогіі мала. Каб ідэя магла захліснуць масы, прымусіць іх ісці за прэзідэнтам (а менавіта ў гэтым бачыцца першасная задача ствараной ідэалогіі), неабходна цярпець за яе, праліваць кроў, але не пісаць падручнікі па ідэалогіі ў рэчышчы бягучай палітычнай кан'юнктуры, а таксама дзеля прэмій ці пасоўвання па кар'ернай лесвіцы.

Пасля прачытання дапаможніка Рамана Ганчарэнкі вельмі цяжка зразумець, што прымусіла аўтара напісаць гэтую кнігу. Памылкі, мноства таўталагічных сцвярджэнняў, парушэнне паслядоўнасці і лагічнасці самога тэксту, а таксама правілаў афармлення літаратуры – усё гэта сведчыць пра тое, што аўтар напісаў гэты дапаможнік дзеля справаздачы і, напэўна, не перачытваў вынікаў сваёй творчасці.

Прыкладам парушэння лагічнай паслядоўнасці ў напісанні тэксту могуць быць абзацы, узятыя з параграфа 7.2 «Значэнне і роля палітычных партый у Рэспубліцы Беларусь». На с. 176 аўтар піша:

В настоящее время в Республике Беларусь появилось много различных политических партий. Они ***постоянно развиваются,*** *ведут между собой политическую борьбу,* ***идет их развитие,*** *объединение и выработка совместных позиций, для усиления влияния на государственные структуры и для выдвижения своих представителей в структуры власти*[1].

Праз два абзацы, на с. 177: *«В результате объединения многих **политических партий**, а также их самоликвидации и ликвидации по инициативе Верховного Суда Республики Беларусь в **настоящее время** **осталось 17** политических партий и свыше 2200 общественных объединений».*

Аналізуючы партыйную сістэму Беларусі і робячы такую выснову адносна аб'яднання і самаліквідацыі партый, аўтар не падае ніякіх прыкладаў. Больш за тое, ён нават не згадай ніводнай з тых палітычных партый і грамадскіх арганізацый, якія цяпер працягваюць сваю дзейнасць у нашай краіне. Замест сур'ёзнага аналізу палітычнай сітуацыі, звязанай з дзейнасцю партый, у тэксце можна сустрэць толькі агульныя эмацыйныя і лагічна не звязаныя выказванні ў адрас ананімных партый і іх лідэраў:

Несомненно, каждая из партий имеет право на свою социальную нишу, на свои предпочтения и особенности. Но не редко это лишь амбициозные устремления лидеров партий, которые направлены лишь на дискредитацию нынешнего политического курса государства. Понятно, это – болезнь роста, развития и самонедооценка личности большинства лидеров политических партий. К сожалению, она пока прогрессирует в период важных политических событий в обществе, но не имеет никакой поддержки среди подавляющего числа наших жителей и потенциальных избирателей (с. 179).

На працягу дзесяці гадоў партыйныя арганізацыі ў Беларусі маюць тэндэнцыю да расколаў, а не да аб'яднання. У сучаснай палітычнай гісторыі ёсць толькі адзіны прыклад спробы аб'яднання дзвюх палітычных партый БСДП (НГ) і БСДГ, аднак гэты працэс пакуль яшчэ не скончыўся. Акрамя таго, аб'яднанне дзвюх партый і звязаныя з гэтым супярэчнасці прывялі да ўзнікнення не адной, а трох партый сацыял-дэмакратычнага кірунку, гэта: БСДП (Грамада) (старшыня А. Казулін), БСДП (НГ) пад кіраўніцтвам М. Статкевіча і БСДГ, у якой свае лідэрскія пазіцыі захоўвае с. Шушкевіч.

Але вернемся да разгляду дапаможніка. На с. 177 напісана:

1 Цытаваны артыкул прысвечаны ідэі ўзнікнення ў Беларусі дзяржавы падаюцца на мове арыгіналу, каб пазбегнуць недарэчнасцяў і захаваць стылістыку. Некаторыя сказы і словы вылучаны, каб звярнуць увагу на тыя месцы, дзе дапушчаны хібы.

*Так, в Республике Беларусь политические партии **действуют на основе** принципов свободы ассоциаций, демократизма, самоуправления, законности, гласности и равноправия. Политические партии **основывают свою деятельность** согласно своим уставам и программам. Осуществляя свою **деятельность**, политическая партия не должна препятствовать органам государственной власти и управления, предприятиям, организациям и учреждениям в осуществлении ими своих функций.*

У тэксце можна сустрэць не толькі таўталагічныя выразы, але і цэлыя таўталагічныя абзацы, у выніку чаго ствараецца ўражанне, што аўтар проста «гнаў тэкст» дзеля таго, каб павялічыць аб'ём кнігі:

*Вместе с тем свои цели и задачи политические **партии осуществляют через разработку и пропаганду политических программ**, обращений и заявлений; проведение съездов, конференций и других партийных собраний; выдвижение кандидатов на выборах, **участие в избирательных кампаниях, в том числе путем создания избирательных блоков с другими партиями**, а также в контроле за ходом и результатами выборов. **Участвуют в подготовке государственных решений и управлении государственными и общественными делами.** Принимают участие в формировании представительных органов и органов местного управления и самоуправления, воздействуют в рамках существующего законодательства демократическими методами и способами на состояние общественного мнения.*

С момента регистрации политические партии имеют право: **свободно распространять информацию о своей деятельности, пропагандировать свои идеи, цели и решения**; образовывать свои печатные издания, осуществлять издательскую деятельность, а также пользоваться в установленном порядке государственными средствами массовой информации; проводить митинги, демонстрации в порядке, установленном законодательством; **влиять через**

своих представителей в выборных государственных органах на выработку соответствующих решений, а также участвовать в подготовке и проведении выборов, выдвигать кандидатов и вести агитацию за них, **образовывать избирательные блоки для участия в предвыборной кампании и выборах; поддерживать связи с другими политическими партиями и общественными объединениями**

(с. 177–178).

(Падобныя і іншыя хібы сустракаюцца на с. 80–81, 116, 123, 140, 144–146, 152, 180 і г. д.)

Што да структуры зместу дапаможніка: не зусім зразумела, паводле якога прынцыпу будаваўся змест раздзела 6 «Палітычныя рэжымы і іх ідэалогія», дзе ў наступнай паслядоўнасці разглядаюцца: 6.1 «Таталітарызм», 6.2 «Нацыяналізм», 6.3 «Аўтарытарызм», 6.4 «Анархія», 6.5 «Дэмакратыя». Зыходзячы з логікі пабудовы зместу дадзенага раздзела, можна сказаць, што аўтар альбо вызначае пяць палітычных рэжымаў, альбо надзяляе тры палітычныя рэжымы – таталітарызм, аўтарытарызм і дэмакратыю – такімі палітычнымі ідэалогіямі, як анархізм і нацыяналізм. Заўважым, што значэнне «анархія» часцей за ўсё служыць для характарыстыкі стану рэчаў у грамадстве ці ў дзяржаве, а для акрэслення адпаведнай ідэалогіі выкарыстоўваецца тэрмін «анархізм» ці «ідэалогія анархізму».

Аўтар разглядае анархію як асаблівы від палітычнага ці грамадскага ўладкавання: *«Она [анархия] проявляется как реакция, антипод тоталитарным и авторитарным политическим режимам и характеризуется полной противоположностью им»* (с. 160). Але, зыходзячы з класічнага ўяўлення аб палітычных рэжымах, поўнай супрацьлегласцю таталітарнаму і аўтарытарнаму ўладкаванню з’яўляецца дэмакратыя. Што да анархізму, то цэнтральнай ідэяй гэтай дактрыны ёсць ідэя скідання ўсялякай, нават самай дэмакратычнай дзяржавы і палітычнай улады.

Таксама незразумела, чаму аўтар разглядае нацыяналізм у

рамках раздзела аб палітычных рэжымах і ў той жа час выключае з яго разгляд камуністычнай ідэалогіі як тэарэтычнай базы таталітарызму і выносіць гэтую тэму ў раздзел 7 «Ідэалогія палітычных партый». Больш за тое, нацыяналізм разглядаецца асобна ў раздзеле 11 «Ідэалогія нацыяналізму і сепаратызму», § 11.1 «Ідэалогія нацыяналізму» як вельмі негатыўная з'ява сацыяльнай і палітычнай рэчаіснасці:

В тех случаях, когда национальная проблематика доминирует над социальной, когда содержание идеологии строится на противопоставлении наций, признании исключительности и превосходства собственной нации над другими и стремлении обеспечить ей привилегии за счет инонациональных групп, она является националистической (с. 156).

На думку аўтара, нацыяналізм быў падставай для афармлення нацызму, фашызму, сепаратызму, ізаляцыянізму і іншых негатыўных з'яваў. Даючы такую ацэнку нацыяналізму, Ганчарэнка забыўся адзначыць, што, напрыклад, італьянскі фашызм быў вынікам барацьбы не супраць іншых нацый, а з ліберальна-дэмакратычнай і камуністычнай ідэалогіяй. Папулярнасць фашызму ў Германіі стала магчывай толькі дзякуючы папулісцкім абяцанкам Гітлера вырашыць сацыяльна-эканамічныя праблемы нямецкага народу і перамагчы камуністаў з дэмакратамі. Сепаратызм і этнакратызм у постсавецкіх дзяржавах і краінах былой Югаслаўскай федэрацыі не былі непасрэдным вынікамі рэалізацыі нацыянальнай ідэі, але хутчэй наступствамі няправільнай нацыянальнай палітыкі савецкага і югаслаўскага кіраўніцтва. Нацыяналізм як ідэйна-палітычная з'ява вельмі разнастайны і супярэчлівы паводле свайго зместу, для яго вывучэння створаныя шматлікія падыходы, ён спараджае супрацьлеглыя меркаванні. Так, напрыклад, Э. Гелнэр характарызуе значэнне нацыяналізму з пункту гледжання палітыкі: «Нацыяналізм – гэта палітычны прынцып, згодна з якім палітычныя адзінкі павінны супадаць з адзінкамі нацыянальнымі, гэта значыць, што неабходна, каб этнічныя межы супадалі з дзяржаўнымі». г. Кон, прыхільнік псіхалагічнага аналізу нацыяналізму, пісаў:

«Нацыяналізм – гэта стан свядомасці, які пануе сярод большасці грамадства і абвяшчае народ-дзяржаву ідэальнай формай палітычнай арганізацыі грамадства, а нацыянальнасць – крыніцай творчай энергіі ў сферы культуры і эканамічнаго дабрабыту». На жаль, гэтыя ці нейкія іншыя падыходы да нацыяналізму не былі адлюстраваныя аўтарам, у выніку чаго складаныя сацыяльныя з'явы прымаюць спрошчаны выгляд, хоць у анатацыі да кніжкі напісана: «*Дается объективная оценка идеологии национализма, сепаратизма, терроризма, военной и экономической экспансии глобализации…*».

Кажучы пра змест кнігі, трэба падрабязна спыніцца на цэнтральным прадмеце даследавання – ідэалогіі дзяржавы, бо абгрунтаванне яе стварэння і прапаганды было асноўнай мэтай напісання гэтай кнігі. Аналізуючы ўяўленне Ганчарэнкі аб ідэалогіі, можна вылучыць тры ўзроўні: першы, характэрны асобным групам індывідаў; другі – для палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў; трэці ўзровень – метаідэалагічны, на якім і фармуецца так званая ідэалагічная канцэпцыя беларускай дзяржавы. Ганчарэнка піша: *«Политическая идеология Республики Беларусь – это свод основ конституционного строя…»* (с. 41). У тым разе, калі тая ідэалогія, якая ствараецца цяпер, з'яўляецца адлюстраваннем Канстытуцыі і нормаў права, то навошта казаць увогуле пра нейкую ідэалогію і падмяняць азначэнні «ідэалогія» – «Канстытуцыя»? Ідэалогія ні ў якім разе не можа выконваць функцыі Канстытуцыі і тым больш рэгуляваць і рэгламентаваць палітычны працэс у дзяржаве і грамадстве. Акрамя таго, Канстытуцыя, як і любы іншы закон, з'яўляецца абавязковай для выканання кожным грамадзянінам дзяржавы; ідэалогія, у сваю чаргу, вызначаная як сістэма поглядаў, меркаванняў, не можа быць абавязковай для ўсіх грамадзянаў і тым больш рэгуляваць грамадскія і палітычныя адносіны ў грамадстве, калі яна не з'яўляецца абавязковай палітычнай дактрынай. Атаясамліванне Канстытуцыі з ідэалогіяй ёсць не чым іншым, як спробай надаць ідэалогіі універсальны дзяржаўны статус і легітымізаваць яе ў вачах грамадскасці як дырэктыўную лінію для палітычнага і сацыяльнага развіцця краіны.

Гэтая недакладнасць у азначэнні сведчыць яшчэ і пра тое, што

пры адсутнасці суцэльнай сістэмы тэарэтычных уяўленняў аб месцы беларусаў і беларускай дзяржавы ў гістарычным працэсе, пры адмове ад сімвалаў і ідэй, якія маюць відавочна нацыянальную афарбоўку, новыя ідэолагі вымушаны штучна падладжваць палітычную і прававую тэорыю пад паняцце ідэалогіі без гістарычнага і філасофскага асэнсавання. Канцэпцыю дзяржаўнай ідэалогіі ў іх павінна ўтвараць і ўтварае ўсё тое, што не супярэчыць бягучаму палітычнаму курсу дзяржавы і будзе спрыяць яе ўмацаванню. Адсюль вынікае прынцып, які акрэслівае ідэалогію дзяржавы як *«совокупность официально признанных идеологий, концепций, доктрин»*. Гэтымі *«официально признанными идеологиями»* з'яўляюцца: ідэя саборнасці і народаўладдзя, грамады, «прававая ідэалогія», «ідэалогія гуманізму» і «ідэалогія патрыятызму». Гаворачы аб «ідэалогіі патрыятызму», Ганчарэнка падзяліў беларускае грамадства на сапраўдных і несапраўдных патрыётаў:

Настоящим патриотом можно считать только человека, постоянно укрепляющего свое физическое и нравственное здоровье, хорошо воспитанного, образованного и просвещенного, имеющего нормальную семью, почитающего своих предков, растящего в лучших традициях своих потомков, содержащего в надлежащем состоянии свое жилище и постоянно улучшающего свой быт, образ жизни и культуру поведения, работающего во благо своего Отечества (с. 58).

З прыведзенага акрэслення «истинного патриота» відаць, што такія катэгорыі грамадзянаў, як разведзеныя, бяздзетныя, халастыя і незамужнія, святары, законнікі і законніцы, а таксама беспрацоўныя і фізічна хворыя, патрыётамі не з'яўляюцца.

(Няма патрэбы гаварыць, шэраг Ганчарэнкавых «ідэалогій», напрыклад, «ідэя саборнасці», штучна прыцягнута з іншай культурна-цывілізацыйнай сістэмы.)

Нягледзячы на дэкларацыі асноўных прынцыпаў дэмакратычнага ўладкавання і правоў чалавека, аўтар,

фармулюючы і абгрунтоўваючы ідэалагічную канцэпцыю, цэнтральнае месца ў ёй адводзіць Дзяржаве, а таксама ролі яе кіраўніцтва ў развіцці сацыяльна-гаспадарчай сферы грамадства. Гэта надае дапаможніку яўна папулісцкую афарбоўку. Кароткія інфармацыйныя агляды аб пабудаваных басейнах, стадыёнах, узроўні заработнай платы ператвараюць кніжку ў справаздачу аб праведзенай дзяржавай працы, прычым (пра гэта ўжо гаварылася вышэй) аўтар не спасылаецца на крыніцы, з якіх ён браў інфармацыю.

Пры канцы варта сказаць некалькі словаў пра апісаныя ў гэтай кнізе метады і сродкі ўкаранення ідэалогіі ў свядомасць масаў. Асноўным такім метадам ёсць прапаганда, якая ўяўляе сабой не толькі прыладу для ўмацавання дзяржавы як такой, але і важкі элемент грамадскага развіцця ў цэлым. Аўтар не падае выразнага азначэння і не робіць аналізу таго, чым ёсць прапаганда, рэклама, палітычная камунікацыя, маніпуляцыя, ад чаго межы паміж гэтымі рознымі ў сваёй сутнасці з'явамі сціраюцца. Акрамя таго, зусім не закранаюцца такія формы камунікацыі, як палітычны маркетынг і «public relations»:

Пропаганда – это специфический вид комбинированного (информационного и, возможно, физического) воздействия, ставящий перед собой цель увеличить влияние и власть. Пропаганда состоит из рекламы и методов устрашения… Политическая реклама – основанный на изучении масс процесс информационного воздействия на них с целью побуждения к политическому поведению определенной направленности (с. 123).

З дадзеных аўтарам дэфініцый прапаганды і рэкламы цяжка не толькі зразумець, у чым іхная сутнасць як навуковых паняццяў, але і ў чым іх аб'ектыўныя адрозненні. Больш за тое, даючы азначэнне прапаганды, якое нясе відавочны негатыўны сэнс, аўтар, тым не менш, характарызуе працэс прапаганды ідэалогіі дзяржавы як пазітыўны: *«пропаганда идеологии нужна не только государству, но и населению. Это инструмент, который помогает обществу определить свое воззрение на мир, общество и человека, государство и человека, механизм, определяющий ту*

или иную ценностную ориентацию (это – хорошо, это – плохо) и линию поведения. Отсутствие же государственной пропаганды ведет к утрате координат, позволяющих человеку ориентироваться в обществе…» (с. 122).

Насамрэч прапаганда як такая ўяўляе сабой безальтэрнатыўнае навязванне шырокім масам насельніцтва спрошчаных ідэй і поглядаў на палітычную рэчаіснасць. Масам не прапануецца дадатковая інфармацыя ці факты дзеля фармавання ўласнага меркавання, але адразу даецца гатовая ацэнка і бачанне той ці іншай падзеі, а таксама прпаноўваецца акрэсленая праграма для дзеяння. Феномен прапаганды характарызуецца як працэс «навязвання такіх каштоўнасцяў, якія не звязаны з інтарэсамі грамадства. Калі адукацыя ставіць за мэту – як думаць, то прапаганда – што думаць»[2]. Праз прапаганду дзяржава, асабліва недэмакратычнага кшталту, імкнецца звузіць інфармацыйную прастору, абмежаваць доступ грамадства да іншых крыніц інфармацыі і ўсталяваць уласную манаполію на яе вытворчасць і распаўсюджванне. Калі прапаганда робіцца адзіным сродкам падання інфармацыі, у свядомасці грамадства выбудоўваецца псеўдарэчаіснасць, губляецца цвярозы погляд на палітычныя і сацыяльныя працэсы, што спрашчае кіраўнічым элітам кантроль над грамадствам. Прапаганда – гэта сродак палітычнага ўздзеяння, які належыць не грамадству, а выключна дзяржаве. Менавіта такой была прапаганда ў СССР, фашысцкай Германіі і Італіі.

Адным з асноўных элементаў функцыянавання прапаганды ёсць механізм штучнага размежавання грамадства на дзве супрацьлеглыя і канфліктуючыя паміж сабой лагеры «сяброў» і «чужых». У імя барацьбы з «ворагамі» і «абароны інтарэсаў» народа дзяржава можа ўводзіць вельмі жорсткі кантроль па ўсім грамадствам. На думку ж Ганчарэнкі, стварэнне «вобраза ворага» можа мець для грамадства пэўную карысць: *«технология создания «образа врага» выполняет позитивную функцию, если она используется для объединения широких масс вокруг священной для любого народа идеи защиты своего Отечества от внешней агрессии»* (с. 126). Дзіва што! Цэнтральнай мэтай у фашысцкай прапагандзе была менавіта мабілізацыя праўдзівых патрыётаў дзеля абароны Германіі ад

[2] Doob L. W. Public opinion and propaganda. London: The Cresset Press, 1948. P. 240.

жыда-масонскай і камуністычнай экспансіі і змовы ўнутраных ворагаў: жыдоў, сацыялістаў ды камуністаў. Вайна ж разглядалася не як агрэсія немцаў, а як прэвентыўная абарона. Шмат нямецкіх жаўнераў паміралa на франтах Другой сусветнай вайны з верай у тое, што яны аддаюць свае жыцці дзеля дабра сваёй Бацькаўшчыны і яе «вялікай будучыні».

Кніжка Рамана Ганчарэнкі не ёсць вынікам падрабязнага і аб'ектыўнага вывучэння палітычнай рэчаіснасці. Яго спрошчаны падыход да паліталагічных катэгорый, феноменаў і працэсаў (напр. глабалізацыі) фармуе ў чытача абмежаваныя ўяўленні пра палітычную сферу. Але ўсё ж такі палітолагі і сацыёлагі павінны вывучаць такую літаратуру, каб зразумець трансфармацыю і кансервацыю палітычнай свядомасці як кіраўнічых і навуковых эліт, так і ўсяго беларускага грамадства.

2. ШАБАС ІДЭОЛАГАЎ

Кніжка «Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы: гісторыя і тэорыя» не складаецца з суцэльнага ідэалагічна маркіраванага тэксту. Яна ўключае ў сябе навуковыя тэксты па сацыялагічных, паліталагічных і эканамічных дысцыплінах. Таму пры яе разглядзе можна вылучыць два блокі: навуковы (дастаткова кампетэнтна аналізуюцца ідэалогіі лібералізму, кансерватызму, камунізму, сацыялізму, сацыяльная і масавая камунікацыі і інш.) і ўласна ідэалагічны.

Апошні блок не выглядае суцэльным паводле сваёй структуры: у ім можна вылучыць дзве групы тэкстаў. У першай з дапамогай філасофіі і логікі робіцца спроба апраўдаць неабходнасць існавання ідэалогіі як такой і ўвядзення, вывучэння і распаўсюджвання ідэалогіі дзяржавы Рэспублікі Беларусь ў прыватнасці. Другая частка тэкстаў (раздзел 2, 3) – гэта спроба сканструяваць тэарэтычны падмурак і надаць ідэалогіі дзяржавы каштоўнасны змест.

Асноўнай перашкодай для ўвядзення якой заўгодна ідэалагічнай дактрыны як абавязковай для ўсіх з'яўляецца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Артыкул 4 забараняе

ўсталяванне адзінай для ўсіх дзяржаўнай ідэалогіі, якая адлюстроўвае інтарэсы нейкай палітычнай партыі, арганізацыі ці класа. Але, на думку аўтараў, калі змяніць паняцце «дзяржаўная ідэалогія» на «ідэалогію дзяржавы», то змяняецца прававы статус ідэалогіі, і сама канцэпцыя «ідэалогія дзяржавы» перастае супярэчыць Канстытуцыі.

Згодна з гэтым вельмі супярэчлівым і небяспечным падыходам, змена самой фармулёўкі пераводзіць ідэалогію з чыста палітычнай сферы ў сферу культурна-цывілізацыйную, што дае магчывасць разглядаць яе не з пазіцыі палітыкі, а значыць і закону, а з пазіцыі беларускай культуры і нацыянальнай спадчыны. Таму ідэалогія беларускай дзяржавы тут акрэсліваецца не як вузкая палітычная з'ява, а як універсальная адзінка, якая мае светапоглядную і цывілізацыйную сутнасць. Такая ідэалогія пазбаўлена катэгорыі суб'ектнасці, гэта значыць, яна не дэтэрмінаваная інтарэсамі пэўных сацыяльна-палітычных групаў, партый і арганізацый. Паспрабуем выкрыць закладзеныя ў такіх доказах супярэчнасці.

У палітычнай і сацыялагічнай навуках існуе шмат азначэнняў ідэалогіі. У ёй бачаць тэарэтычную праграму, у якой закладзены пэўныя ўяўленні аб сацыяльнай і палітычнай рэчаіснасці тых ці іншых сацыяльных групаў. Мяркуецца, што ідэалогія падказвае класам спосаб і метады для сацыяльных і палітычных зменаў. Яе існаванне цалкам звязана з працэсам барацьбы за ўладу.

Прыведзеныя характарыстыкі ідэалогіі сведчаць пра тое, што яе паняцце цесна павязана з палітыкай, а гэта значыць, што і «ідэалогія дзяржавы» не можа разглядацца па-за межамі палітычнага жыцця грамадства. Калі рэлігія і міфалогія апелююць да ірацыянальных элементаў свядомасці, і перадусім да веры ў тыя з'явы, якіх нельга даказаць і абгрунтаваць фактамі, то ідэалогіі, наадварот, уласцівыя сутнасныя доказы, пры дапамозе якіх тыя ці іншыя індывіды, сацыяльныя групы стараюцца рацыянальна патлумачыць існы сацыяльны і палітычны лад у дзяржаве, а таксама, карыстаючыся палітычнымі сродкамі, захаваць або змяніць яго. Таму гаварыць пра тое, што *«существует не доидеологическое, а доклассовое*

идеологическое общественное сознание, в частности, такие формы идеологии, как мифологическая, религиозная и т. д.» (с. 26) значыць увайсці ў супярэчнасць з устойлівымі навуковымі поглядамі на міфы, рэлігію, ідэалогію. Чаму ж тады ніхто не гаворыць аб праваслаўнай, каталіцкай ці пратэстанцкай ідэалогіі? У ідэалогіі вельмі часта выкарыстоўваюцца міфы і рэлігія, яна можа абапірацца на рэлігійныя каштоўнасці – як, напрыклад, кансерватызм, але, тым не менш, кансерватызм не ператварыўся ў англіканскую ідэалогію і наадварот.

Ідэалогія, будучы катэгорыяй палітычнай, павінна разглядацца толькі ў цеснай сувязі з сацыяльным суб'ектам, партыяй, класам, грамадскай групай, бо менавіта яна адлюстроўвае іх інтарэсы, чаканні, мэты. Ідэалогія, як дзейная палітычная канструкцыя, не можа існаваць як універсальнае, аб'ектыўнае паняцце, падобнае да «эйдасу» Платона, адарваная ад канкрэтных сацыяльна-эканамічных і палітычных умоваў функцыянавання грамадства. Гэта значыць, што для кожнай ідэалогіі характэрны ўласны сацыяльны суб'ект. Але аўтары дапаможніка ставілі мэтай не толькі доказ існавання ідэалогіі дзяржавы без сацыяльнага носьбіта ў выглядзе грамадскіх групаў або партый, але таксама імкнуліся прапанаваць у якасці суперсуб'екта беларускую дзяржаву.

Што ж разумеецца тут пад дзяржавай? *«Государство – особый социальный институт, который возникает для обеспечения безопасности людей с помощью введения в оборот общеобязательных идей и норм поведения»* (с. 35). Падобнае азначэнне не дае права надзяляць дзяржаву суб'ектнасцю. Калі гаворка ідзе аб суб'екце якой-небудзь ідэалогіі, г. зн. аб асобных індывідах, сацыяльных групах, партыях, класах, то мяркуецца, што ў іх ёсць розум, воля, эмоцыі, каштоўнасныя погляды. Гэтыя суб'екты ў стане асэнсаваць прыватныя і агульныя мэты і дасягнуць іх пры дапамозе спецыфічных прыладаў (выбараў, рэвалюцый) праз дзяржаву, калі палітычная ўлада і дзяржаўнае кіраванне трапляе ў рукі таго ці іншага суб'екта. Можна сказаць, што ўлада і дзяржава першапачаткова з'яўляюцца аб'ектам палітычных адносін, і толькі пасля рэалізацыі класамі, партыямі, палітычнай супольнасцю сваіх ідэалагічных, эканамічных і іншых мэтаў

шляхам заваёвы ўлады становяцца суб'ектам палітыкі. Стаўшы суб'ектам палітыкі, дзяржава бароніць канкрэтныя інтарэсы таго ці іншага класа, партыі, грамадскай групы, пры гэтым кіруецца ідэалагічнымі асновамі той палітычнай групы, якая прыйшла да ўлады. Таму нельга разглядаць дзяржаву ў адрыве ад таго сацыяльнага суб'екта, чые інтарэсы кіруюць ім самім. Так, напрыклад, нямецкай дзяржавай (як сацыяльным інтытутам) да апошняга часу кіравала сацыял-дэмакратычная партыя, якая выяўляла інтарэсы адпаведнай часткі грамадства, а гэта значыць, што ў сваёй дзейнасці дзяржава абапіралася на ідэі сацыял-дэмакратыі. Адпаведна, у 30-х гадах XX ст. яна была фашысцкай дзяржавай. Дзяржава як палітычны (сацыяльны інстытут) і як геапалітычны суб'ект акрэсліваецца не толькі згодна з ідэалагічна-тэарэтычнай, але таксама і сацыяльна-эканамічнай дактрынай. Такім чынам, дзяржава «як рэч у сабе» не можа мець уласнага розуму, мыслення, мэтаў, валодаць сваімі маральнымі прынцыпамі, а тым больш светапоглядам, як гаворыцца ў дапаможніку. Як сацыяльны інстытут, дзяржава не ў стане функцыянаваць без людзей, а гэта значыць, не можа не прадстаўляць чыіх-небудзь інтарэсаў. Урэшце, калі кіраўнічы апарат, палітычная эліта ці, інакш кажучы, «кіраўнічы клас», які забяспечвае дзейнасць дзяржаўнай машыны, не выяўляе інтарэсаў шырокіх слаёў насельніцтва ці іншых сацыяльных класаў, то ў гэтым разе дзяржава выяўляе і бароніць інтарэсы самой палітычнай эліты.

Такім чынам, ідэалогія беларускай дзяржавы ў тым выглядзе, у якім яна паказана ў кніжцы, ёсць палітычнай дактрынай і ўяўляе сабой ідэалогію кіраўнічага класа, а гэта значыць, што яе абавязковае вывучэнне ва універсітэтах, яе ўвядзенне на прадпрыемствах і шырокая прапаганда ў грамадстве пярэчаць Канстытуцыі.

Таксама трэба закрануць тэматыку, звязаную з метадамі распаўсюджвання ідэалогіі. Як асноўны аўтары вылучаюць прапаганду, надаючы ёй пазітыўны сэнс шляхам змешвання прапаганды з другімі метадамі камунікацыі («*даже беспристрастные информирование и коммуникация являются в определенном смысле* пропагандой, *распространением политических, философских, научных, художественных и других*

взглядов (идей с целью их внедрения в общественное сознание и активизации массовой практической деятельности» (с. 139). Згодна з аўтарамі кніжкі, першым беларускім прапагандыстам быў Францішак Скарына, які друкаваў на старабеларускай мове тэксты Святога Пісання.

У гэтым выпадку мае месца змешванне такіх паняццяў, як адукацыя, асвета, інфармаванне і прапаганда. Нават калі першапачаткова прапаганда не мела негатыўнай афарбоўкі, то, стаўшы сродкам укаранення ідэй камунізму і фашызму, яна пачала ўяўляць сабой працэс «прамыўкі мазгоў» у насельніцтва. Больш за тое, існуе прынцыповая розніца паміж прапагандай і інфармаваннем. Інфармаванне – гэта працэс такога пераказу інфармацыі, пры якім улічваюцца перадусім інтарэсы аб'екта камунікацыі. Інфармаванне адбываецца толькі тады, калі інфармацыя аб здарэннях ці якіх-небудзь з'явах суправаджаецца сапраўднымі фактамі і доказамі, напрыклад, паданне інфармацыі насельніцтву аб СНІДзе і захадах асаблівай бяспекі. Галоўнае адрозненне інфармавання ў тым, што ў яго працэсе заўсёды прысутнічае адваротная сувязь паміж суб'ектам і аб'ектам.

У выпадку, калі падчас інфармавання адбываецца мэтанакіраванае замоўчванне або скажэнне інфармацыі, то такую камунікацыю можна акрэсліць як маніпуляцыю ці падман. Што да прапаганды, то акрамя інфармацыйных скажэнняў яе галоўнай мэтай ёсць мабілізацыя грамадства вакол суб'екта прапаганды палітычнай эліты, правадыра, партыі, г. зн. аб'ект уздзеяння не ў стане рэагаваць на атрыманую інфармацыю крытыкай. Акрамя таго, у працэсе прапагандавання любых ідэй, дзеянняў палітычных эліт большая частка інфармацыі напаўняецца кідкімі лозунгамі, заклікамі, мэта якіх – уздзеянне на эмоцыі, а не на розум. Як гавораць самі складальнікі дапаможніка, *«всегда не менее 75 % имеющихся в распоряжении пропагандиста (информатора) фактов так никогда не становятся широко известными»* (с. 150).

Калі асноўным метадам распаўсюджвання ідэалогіі дзяржавы становіцца прапаганда, значыць, дадзеная ідэалогія

прадстаўляе пераважна інтарэсы палітычнай эліты і выкарыстоўваецца дзеля ўтварэння ў насельніцтва скажоных уяўленняў пра палітычную рэчаіснасць.

3. ПАЧАТАК І КАНЕЦ БЕЛАРУСКАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Ідэолаг У. Мельнік лічыць, што ад пачатку XIII да канца XVIII стагоддзя Беларусь не мела ўласнай дзяржаўнасці, была аб'ектам экспансіі з боку літоўцаў ды палякаў, і толькі ўвайшоўшы ў склад Расійскай імперыі, а затым СССР, атрымала магчымасць для самавызначэння: «І менавіта ў складзе расійскай дзяржавы беларусы прайшлі – і вельмі хутка, усяго толькі за стагоддзе, – вялікі шлях самаўсведамлення, з рук расійскага народу атрымалі свабоду і стварылі нарэшце ўласную дзяржаўнасць».

З уваходам Беларусі ў склад Расійскай імперыі нашых продкаў чакала яшчэ адна радасць: «з прыходам расійскай улады беларусы ў асноўнай сваёй масе з лёгкасцю вярнуліся да веры сваіх продкаў – праваслаўя». Паступова беларусы ўвайшлі ў іншую цывілізацыйную сістэму каардынат – расійскую, пазней савецкую, і вельмі хутка перанялі і засвоілі яе. Таму У. Мельнік уважае:

Пытанне аб цывілізацыйнай ідэнтычнасці беларускага грамадства ўжо вырашана. Гэта канчаткова адбылося, мы мяркуем, у працэсе дзяржаўнага развіцця беларускага народу ў складзе СССР. Дадзенае дзяржаўнае ўтварэнне – на славянска-расійскай цывілізацыйнай аснове, і беларусы ў масе сваёй ніколі не адчувалі сябе ў ім чужынцамі. Ужо ў момант утварэння СССР усведамленне беларусамі сваёй культурна-гістарычнай еднасці з расійцамі і ўкраінцамі з'явілася адным з вырашальных чыннікаў іх уваходжання ў гэтую саюзную дзяржаву… Краіна ў цэлым прасоўвалася па шляху фармавання агульнаграмадзянскай савецкай нацыі.

Згодна з Мельнікам, незалежнасць, набытая ў выніку распаду СССР, хоць і была ўспрынята з вялікай неахвотай, аднак

паставіла беларускі народ у новыя палітычныя ўмовы, канчаткова аформіла геапалітычныя межы беларуска-расійскай (савецкай) цывілізацыі. Яе асноўныя змястоўныя элементы:

1. Дзяржаўнае ўтварэнне Рэспубліка Беларусь.

2. Асноўная мова – расійская.

3. Арыентацыйная канцэпцыя альбо духоўная дактрына – «праваслаўны атэізм».

4. Палітычны лад можна ахарактарызаваць як недэмакратычны аўтарытарны.

(Пры гэтым няма сумневу, што з пазіцыі больш строгага цывілізацыйнага падыходу можна растлумачыць і сутнасць цяперашніх культурных і сацыяльных канфліктаў. Іх асноўнай прычынай ёсць не столькі палітычныя супярэчнасці, колькі цывілізацыйныя. Значная частка прыхільнікаў нацыянальнай культуры ідэнтыфікуе сябе з цывілізацыяй іншага тыпу, чым большасць сучасных беларусаў. Той палітычны курс, якім рухаецца цяперашняе кіраўніцтва краіны, вядзе да кансервацыі існуючага расколу.)

Разгляд зместу шэрагу твораў па афіцыйнай ідэалогіі дазваляе зрабіць выснову, што праца над яе стварэннем ідзе няўзгоднена, бессістэмна, а некаторыя пастулаты і вывады ад пачатку супярэчаць адзін аднаму. Яе стваральнікі, разглядаючы свой прадмет з палітычна-правовага пункту гледжання, мэтанакіравана спрабуюць пазбегчы ўжывання паняцця «дзяржаўная ідэалогія», каб не выходзіць за межы нормаў Канстытуцыі. Як мы паказалі, з мэтай памясціць ідэалогію ў іншае сэнсавае поле і была ўведзена катэгорыя «ідэалогія дзяржавы».

Тым не менш, у дапаможніку Уладзіміра Мельніка шырока ўжываецца катэгорыя «дзяржаўная ідэалогія». Па ўсім відаць, сам аўтар не да канца ўяўляе сабе сутнасць адрознення паміж дзяржаўнай ідэалогіяй і ідэалогіяй дзяржавы. Для яго – а гэта, безумоўна, аб'ектыўная адзнака ідэалогіі як такой – гэтыя дзве канцэпцыі маюць супольнае значэнне пэўнай палітычнай

дактрыны, якая выкарыстоўваецца пэўнымі палітычнымі групамі для ўмацавання сваёй палітычнай улады шляхам навязвання яе шырокім пластам насельніцтва як абавязковай і безальтэрнатыўнай. Каб завуаляваць рэальныя мэты стваранай ідэалагічнай дактрыны, ён намагаецца падаць яе як вынік развіцця беларускай цывілізацыі, як сацыяльна-культурны досвед насельніцтва. Тым не менш, такое жаданне зрабілася падставай для лагічных і навуковых супярэчнасцяў і дыскрэдытацыі ідэалогіі як такой, а саму кнігу з навуковага твору ператварыла ў інструмент палітычнай прапаганды.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/05
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

гісторыя

і, гісторыя-[image]2006

ад Зыкатук

аналітыка • крытыка • палеміка • **гісторыя** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Анатоль Сідарэвіч Антон Луцкевіч: ад краёвасьці да незалежніцтва (1916-1918) Агляд крыніцаў

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ (нар. 01.03.1948 на хутары Доўгі Лес, што на Піншчыне) – публіцыст, літаратурны крытык і гісторык, адзін з заснавальнікаў адноўленае Сацыял-дэмакратычнай Грамады. Скончыў філязофскае аддзяленьне гістарычнага факультэту БДУ. Укладальнік кнігі выбраных твораў Антона

Калі мы чытаем пра значэньне Першае сусьветнае вайны для Беларусі, ня можа ня кінуцца ў вочы адсутнасьць грунтоўных дасьледаваньняў тут, у БССР і Рэспубліцы Беларусі, і ў дыяспары. Тутэйшым працам, апроч таго, бракуе грунтоўных высноваў. Гэта мы бачым у параграфе «Беларусь у час першай сусьветнай вайны» «Нарысаў гісторыі Беларусі» (ч. 2, Менск, 1994) і ў пункце «Нацыянальны рух у 1915 – пачатку 1917 г.» параграфу «Барацьба за нацыянальнае адраджэньне» тае ж кнігі. Няма генэральных высноваў і ў кнізе «Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002)» праф. Захара Шыбекі (Менск, 2003). У вучэбным дапаможніку «Гісторыя Беларусі» (Менск, 1996) сказана катэгарычна: «У гады вайны склаліся неспрыяльныя ўмовы для разьвіцьця беларускага нацыянальнага руху». Панцеляймон Селіванаў, пішучы для ЭГБ (т. 5, 1999) артыкул «Першая сусьветная вайна» і згадваючы пра зьмены на палітычнай мапе сьвету як наступства вайны, не палічыў

патрэбным хоць слова сказаць у гэтым кантэксьце пра Беларусь. Не ўлучае гісторыю Беларусі пэрыяду Першае сусьветнае вайны ў шырокі эўрапейскі і сусьветны кантэкст таксама і аўтар даволі цікавае працы «Час выбару: Праблема самавызначэньня Беларусі ў 1917 г.» (2001) дацэнт (Мінск, 2003). Рудовіч.

Асьвятліць пэрыяд 1914–1918 гг. у гісторыі Беларусі ў больш шырокім кантэксьце і зрабіць больш шырокія высновы спрабуюць д-р Юры Туронак і д-р Янка Запруднік. У сваёй працы «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» (1989) д-р Ю. Туронак разглядае тэмы «Першая сусьветная вайна і самавызначэньне беларускага народу», «Беларусь і Нямеччына», а ў кнізе д-ра Я. Запрудніка «Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях» (1996), якая зьяўляецца нарысам гісторыі нашай краіны для далёкіх ад беларускае праблематыкі замежнікаў, адзначана, што ў 1916 г. «беларуская справа ўпершыню выйшла на міжнародную палітычную арэну». Пра тое ж пісаў нядаўна і с. Рудовіч[1]. Беларускае пытаньне ў міжнародных адносінах пэрыяду Першае сусьветнае вайны, Вэрсальскага ды Рыскага трактатаў пачаў вывучаць д-р Уладзімер Міхнюк, аднак ягоная праца засталася незавершанаю. Такім чынам, грунтоўныя дасьледаваньні на тэму «Першая сусьветная вайна і Беларусь» яшчэ наперадзе.

Між тым для нас каштоўнымі зьяўляюцца два тэзісы. Першы гучыць так: «Вайна 1914 году ломіць старыя рамкі жыцьця і пачынае новы пэрыяд гісторыі як Расеі, так і Беларусі». І належыць ён праф. Усеваладу Ігнатоўскаму. Другі тэзіс сфармуляваў у канцы 1918 г. праф. Фрыц Куршман, які пісаў, што беларусы калі-небудзь не без падставаў будуць з удзячнасьцю ўспамінаць нямецкую акупацыю 1915–1918 гг.[2].

Асьмелюся сьцьвердзіць, што бальшавіцкія гісторыкі і палітыкі рацыю, калі адным з вынікаў Першае сусьветнае вайны характэрнаю рысаю міжваеннага часу называлі крызіс каляніяльнае сыстэмы. Калі гаварыць пра Эўропу, дык распалася ня толькі Аўстра-Вугорская імпэрыя: страцілі Нямеччына і Расея. На месцы старых імпэрыяў узьнікалі пераважна поліэтнічныя ўтварэньні з паноўнымі, які

[1] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 4. Беларусь у XX стагоддзі. Кн. 1. Пачатак XX ст. — 1939 г. Мінск, 2007. С. 13–14.

і Югаславіі, або даміноўнымі[3], як у Чэхаславакіі, на канец XVIII (пачатак XX стст.) Былая Расейская імпэрыя ўзяла псэўданім – Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Калі польскі, сэрбскі і чэскі народы ўжо вызваліліся, дык народам, над якімі яны панавалі, дамінавалі, яшчэ належала вызваліцца. Для Беларусі пэрыяд Першае сусьветнае вайны быў часам хуткага росту нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў, узьнікненьня беларускага школьніцтва, ад пачатковых школаў па тыпаючы і Менскім беларускім педагагічным інстытутам заканчваючы[4], часам нацыянальнае рэвалюцыі, выхаду беларускае справы на міжнародную арэну, узьнікненьня ідэі дзяржаўнай незалежнасьці і спробы яе рэалізацыі ў форме БНР, пачатку нерапарэвянь беларусі аб акту міжнароднае палітыкі у яе суб'ект. Наступленьем вайны стала і утварэнные БССР – ненарэўнай папярэдніцы Рэспублікі Беларусі. У выніку Першае сусьветнае вайны і барацьбы польскага і бальшавіцкага імпэрыялізму наша краіна апынулася прыкліна у такім самым станоўішчы, як Босьнія і Герцагавіна, Македонія, Славакія, Славенія, Украіна і Харватыя. Амаль адначасна зь імі яна стане незалежнаю.

Прыход немцаў на тэрыторыю Беларусі даў беларусам шанец. І гэта выдатна праілюстравалі Луцкевічы. Антон Луцкевіч адкрыта пішаў пераможнымарох «Гоману» пра неабходнасьць «новага свабоднага жыцьця»[5], ён упэўнены, што Беларусь ужо ня вернецца ў склад Расеі. Але ён далёкі ад ідэі незалежнасьці Беларусі. Ім кіруе мара пра «вольны Беларуска-Літоўскі Край», які «ўжо ня вернецца ў старую няволю»[6].

ларуская зямля дайшла вольнага бытаваньня»[7], беларускія палітыкі бачаць нашу краіну як складовую частку новае поліэтнічнае дзяржавы, у якой народы жывуць як вольны з вольным, як роўны з роўным. Спачатку гэта ідэя Канфэдэрацыі Вялікага Княства Літоўскага, але з часам яна дапаўняецца ў творах А. Луцкевіча і ў плянах беларускіх палітыкаў ідэяю Злучаных Штатаў ад Балтыйскага да Чорнага мора.

У свой час я друкаваў тэкст рэфэрату беларускае дэлегацыі на Лязанскай канфэрэнцыі народаў Расеі, у якім выкладзены пункт гледжаньня Беларускага Народнага Камітэту на гэтае

---

1 Гл.: Туронак Ю. Беларусы пад нямецкай акупацыяй. Менск, 1993. с. 24.

2 Гл.: Туронак Ю. Беларусы пад нямецкай акупацыяй. Менск, 1993. с. 24.

3 Словы «панаваць» і «даміноваць» блізказначныя, але ў першым выпадку гаворка ідзе пра стасаваньне тэрору ў дачыненьні да іншых народаў, у тым ліку да больш разьвітых ім народаў (чэхаў і габрэяў у Польшчы, харваты і славенцы ў Югаславіі), у другім жа – пра відавочную экананічную і культурную перавагу адзінага народу (чэхаў у Чэхаславакіі) і больш-менш цярпімае яго стаўленьне да слабейшых.

4 Фармальна педагагічны інстытут быў адначасна і Менскага настаўніцкага інстытуту ў канцы 1918 г., але падрыхтойка дапатае пачалася пасьля вяртаньня апошняга з эвакуацыі ў верасьні таго ж году. Агульнавядома таксама, што Менскі настаўніцкі інстытут утрымліваўся на сродкі ўраду БНР і нямецкіх акупацыйных уладаў.

5 Нашаніўцы. 1916 ў 26 нумарох.

6 Наша Ніва. 1916. 14 кастрычніка.

7 Гомон. 1916 ў 16 нумарох.

8 Гл.: Свабода. 1990. № 2.

пытаньне[8]. Але ў артыкуле «На зьезд у Лязане» А. Луцкевіч піша, што ідэя «бліжэйшага зьяднаньня народаў ад Балтыцкага да Чорнага мора» ўзьнікла ня раптам, што яна «здабыла першае мейсца» ў беларускіх палітычных колах «за апошні дзясятак гадоў» і злучыла «ўсе кірункі беларускай мысьлі – ад крайніх левых да клерыкалаў»[9].

Выказваючы жаданьне, каб «уся Бе Абгрунтаваньню ідэі Злучаных Штатаў (праўда, без ужываньня самога гэтага тэрміну) прысьвечаны шэраг артыкулаў А. Луцкевіча ў «Гомане». Неабходнасьць зьяднаньня беларускія дзеячы бачылі ў самім геаграфічным становішчы Беларусі, якая, знаходзячыся ў басэйнах Балтыйскага і Чорнага мораў, разам з тым ня мае выхаду да мора. «Для кожнага краю выхад да мора, – пісаў Луцкевіч у дні абмеркаваньня рэфэрату, – гэта найважнейшае пытаньне эканамічнага жыцьця. Мора – гэта шырокі, вольны гасьцінец для гандлю – для вывазу і прывозу ўсялякіх тавараў»[10]. Гэтую думку А. Луцкевіч неаднакроць паўторыць. Мы ўжо ведаем, – і д-р Алесь Смалянчук гэта паказаў Но, што А. Луцкевіч зьяўляўся краёўцам. Незалежнікам ён быў у той ступені, у якой хацеў незалежнасьці Беларуска-Літоўскага Краю (слова «край» ён часта піша зь вялікай літары), Латвіі ды Украіне. Мы бачым, што яго нае краеўства мела патрыятычны і прагматычны характар: выступаючы за беларуска-літоўскую дзяржаўнасьць, за Злучаныя Штаты ад Балтыйскага да Чорнага мора, А. Луцкевіч меў на ўвазе дзьве мэты: 1) незалежнасьць ад Расеі ды Польшчы і 2) эканамічныя выгады для Беларусі.

[9] Ibidem. 1916. 16 чэрвеня.

[10] Гл.: Смалянчук А. Паміж краёвасьцю і нацыянальнай ідэяй: Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864 – люты 1917. 2-е выд., дапрац. – Санкт-Пецярбург, 2004.

[11] Гл.: Смалянчук А. Паміж краёвасьцю і нацыянальнай ідэяй: Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864 – люты 1917. 2-е выд., дапрац. – Санкт-Пецярбург, 2004.

З вышыні гістарычнага досьведу мы можам сказаць, што А. Луцкевіч перабольшваў значэньне мора для эканомікі краіны. Ён мог бачыць прынамсі дзьве краіны, чыя эканоміка знаходзілася ў добрым стане бяз выхаду да мора: Швайцарыя і Люксэмбург. Неўзабаве да іх далучацца Вугоршчына і Чэхаславакія. З другога боку, А. Луцкевіч недаацэньваў імкненьне Літвы, Латвіі і Ўкраіны да незалежнасьці. Калі, з пункту гледжаньня А. Луцкевіча, Беларусі патрэбная была еднасьць з суседзямі дзеля мора, дык суседзі патрэбы ў еднасьці зь Беларусьсю ня мелі.

З уласных паказаньняў А. Луцкевіча мы ведаем, што напачатку

сакавіка ён зьдзейсьніў вялікую памылку. Знаходзячыся разам зь літоўскімі прадстаўнікамі ў Бэрліне, дзе іх меўся прыняць імпэрскі канцлер, Луцкевіч пакінуў сталіцу Нямеччыны, як толькі пачуў аб рэвалюцыі ў Расеі. Антанас Сьмятона, Юргіс Шаўліс і Сьцяпонас Кайрыс былі прынятыя канцлерам безь яго[12]. Я пакуль што ня ведаю, пра што дамовіліся літоўцы з канцлерам у сакавіку 1917 г., але дастаткова добра вядома, што ў ліпені яны ўручылі канцлеру мэмарандум з патрабаваньнем надаць Літве незалежнасьць. Неўзабаве яны дасягнулі згоды нямецкага ўраду на далучэньне да Літвы беларускіх земляў, якія ўваходзілі ў склад Militär-Verwaltung Litauen, і на стварэньне прадстаўнічага органу гэтае тэрыторыі – Літоўскае Краёвае Рады (Тарыбы), у якой для беларусаў прадугледжвалася адно месца. Акрамя таго, палітыка літоўцаў была танчэйшая: прадчуваючы паражэньне Нямеччыны, асабліва пасьля ўступленьня ў вайну ЗША, яны дзеля дасягненьня незалежнасьці пачалі складаную гульню з запрашэньнем на пасад будучае літоўскае дзяржавы нямецкага прынца.

Пра папярэднія дамоўленасьці літоўцаў з Бэрлінам часткова становіцца вядома толькі бліжэй да сярэдзіны верасьня 1917 г.

А **напачатку верасьня** адбываецца канфэрэнцыя Беларускага Народнага Камітэту, Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Работніцкай Групы і Віленскага Камітэту БСГ. Універсал гэтае канфэрэнцыі, апублікаваны ў свой час у «ЛіМе»[13], пісаны праўдападобна Луцкевічам. У ім паўтараюцца ўжо вядомыя аргумэнты на карысьць Літоўска-Беларускае дзяржавы з дзьвюма аўтаномнымі тэрыторыямі. Мажліва, упершыню выказваецца патрабаваньне аб скліканьні Ўстаноўчага Сойму Беларусі і Літвы і вызначаецца тэрмін 23 лістапада.

Ня выключана, што ў той самы дзень адбылася канфэрэнцыя беларускіх сацыялістаў, бо менавіта верасьнем 1917 г. датаваныя «Асновы праграмы Беларускай Сацыялістычнай Грамады». Машынапіс гэтага дакумэнту зьберагаецца ў БДАМЛМ (ф. 3, воп. 1, адз. захав. 139, арк. 15[14]). У «Асновах праграмы...» выкладаецца погляд беларускіх сацыялістаў на

[12] Гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху: Выбраныя творы. Менск, 2003. с. 192–193.

[13] Гаруды і Літвы // ЛіМе. 1990. 23 лістапада.

[14] Гл. таксама: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху: Выбраныя творы. Менск, 2003. с. 192–193.

дзяржаўны лад будучай Беларуска-Літоўскай незалежнай дэмакратычнай рэспублікі:

1) аддача ўсей уласьці ў рукі народу;

2) унутранае разгранічэньне аўтаномных Беларускай і Літоўскай зямель паводлуг матчынай мовы жыхароў;

3) роўныя правы для ўсіх нацыянальнасьцяў краю; нацыянальная аўтаномія для нацыянальных меншасьцяў;

4) прызнаньне ўрадовых правоў за ўсімі мясцовымі мовамі; забясьпечаньне школьнай навукі ў матчынай мове вучняў.

Гэтыя пункты амаль даслоўна паўтараюць напрацоўкі Канфэдэрацыі Вялікага Княства Літоўскага.

8 верасьня адбываецца паседжаньне Беларускага камітэту Вільні. 66 беларускіх актывістаў прымаюць рэзалюцыю, у якой падтрымліваюць рашэньні канфэрэнцыі БНК, БСДРГ і Віленскага камітэту БСГ, а таксама палажэньні асноваў праграмы БСГ адносна дзяржаўнага ладу будучай Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Рэзалюцыю, якая захоўваецца ў БДАМЛМ (адз. захав. 140, арк. 87), пісаў А. Луцкевіч. Сьпіс удзельнікаў і гасьцей паседжаньня гл. на арк. 60.

У сувязі з тым, што Галоўная Камісія Райхстагу вырашыла ўжо ў час вайны ўвесьці пэўныя элемэнты мясцовага самакіраваньня на акупаванай тэрыторыі, удзельнікі паседжаньня ў Беларускім клюбе патрабавалі «абясьпечаньня беларусам належнага паводлуг іх чысьленасьці месца – з тым, каб усе землі Ober Ost станавілі пры дачэснай адміністрацыйнай арганізацыі суцэльны арганізм з разьдзелам на тры нацыянальныя округі: беларускі, літоўскі і латыскі – паводлуг матчынай мовы жыхароў».

Аднак неўзабаве стане вядома, што ў нямецкіх акупантаў і літоўскіх дзеячаў іншыя пляны. Ішла дзейсная падрыхтоўка Літоўскай нацыянальнай канфэрэнцыі і фармаваньня на ёй Тарыбы. Што Тарыба будзе распаўсюджваць сваю дзейнасьць і

14 Паколькі іншыя архіўныя дакумэнты захоўваюцца ў тым самым фондзе, далей будуць паказаныя толькі адзінка захаваньня і арк.

на беларускія землі, што беларусам, габрэям і палякам выдзелена ў ёй толькі па адным месцы, – пра тое, мабыць, нікому, апроч немцаў і літоўскіх правадыроў, яшчэ не было вядома. Але тое, што літоўцы вядуць сэпаратныя дзеяньні, не магло не ўстрывожыць беларусаў, і яны выступаюць ініцыятарамі правядзеньня мітынгу сацыялістычных і дэмакратычных арганізацыяў. Ува ўсякім разе накіды рэзалюцыі гэтага мітынгу пісаў А. Луцкевіч. Пісаў па-польску. Ягоныя накіды таксама захоўваюцца ў БДАМЛМ (адз. захав. 140, арк. 84, 97). У тым жа пакеце маецца і чыставы тэкст рэзалюцыі (арк. 88).

16 верасьня адбыўся мітынг сацыялістычных і дэмакратычных арганізацыяў, пра які А. Луцкевіч пісаў ува ўспамінах «Жыцьцё і праца Івана Луцкевіча»[15]. Адкрыў і вёў яго Пранас Эйдукявічус.

З рукапісаў можна зразумець, што і літоўцы, і габрэі, і Луцкевіч разглядалі тэрыторыю Обэр Осту як Літву і што толькі Да намаганьнямі беларускіх дзеячаў удалося ўставіць у тэзісы пра беларуска-літоўскія землі. Удзельнікі мітынгу сцвердзілі заявілі, што «разьвязаць пытаньне аб будучыні Літвы ў ўнутраных парадках, яе адносінах да суседніх дзяржаў і асновах супольнага бытаваньня з сумежнымі краямі правамочан толькі ўстаноўчы сэйм Літвы, выбраны свабодна ўсім насяленьнем Літоўска-Беларускіх зямель», і пратэставалі «проці кожнай спробы захвату вярхоўных правоў прадстаўніцтва Краю – яго ўстаноўчага сэйму, скуль бы яна ні выходзіла».

[15] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 98–99.

18–23 верасьня, нягледзячы на пратэсты, адбылася Літоўская канфэрэнцыя і абрала Тарыбу.

28 верасьня ў артыкуле «Краёвая Рада Літвы» А. Луцкевіч зьвярнуў увагу, што на Літоўскай канфэрэнцыі прысутнічалі «адны толькі літвіны», да таго ж не абраныя насельніцтвам. Але галоўнае, на чым аўтар засяродзіў увагу, – гэта нямецка-літоўскі плян чарговага падзелу Беларусі. Вось што ён пісаў:

...той факт, што Літоўская канфэрэнцыя, выбраўшая

кандыдатаў у Раду, засядала ў супольнай сталіцы Беларусі і Літвы, Вільні, навакол каторай жыве беларускае насяленьне, а таксама запаведзь князя Ізэнбурга, што да Рады маюць быць прызваны, між іншым, такжа і беларусы, – ясна паказваюць, што новая ўстанова мае абнімаць справы не літоўскага народу, а ўсяго таго абшару, каторы ўходзіць у склад Militär-Verwaltung Litauen. Вядома ж, што да гэтага складу ўходзіць ня толькі этнаграфічна літоўскі абшар, але і добры кусок Беларусі; гэтак беларускія землі акупацыі аказваюцца штучна разьдзеленымі, і пад той час, як меншая часьць іх аддаецца пад упраўленьне літвінаў, большая астаецца ў межах Verwaltung Biełastok–Hrodna пад упраўленьнем нямецкіх ураднікаў.

Аўтар працягваў:

Такі разьдзел Беларусі, і без таго разарванай на дзьве часьці ваенным фронтам, вызывае ў нас сур'ёзную трывогу: у межах «маленькай Літвы» беларусам, перажыўшым часы «пераварачываньня» ў маскалёў і палякаў, грозіць «пераварачываньне» ў літвінаў, аб чым кіраўнікі літоўскай палітыкі, засядаючыя цяпер у Радзе, апавесьцілі ўжо ў сваім мэмарыяле для нямецкага канцлера і ў выпушчанай нядаўна кніжцы з «этнаграфічнай» картай Літвы (P. Klimas. Lietuva, jos gyventojai ir Sienos. – Vilnius, 1917). Беларусы ня могуць спадзявацца пашаны сваіх правоў ад людзей, аб'явіўшых, што «хто каталік – той літвін», – а гэткім людзям даецца цяпер права ладжаньня і нашага жыцьця.

У новых абставінах перад беларускімі палітыкамі паўстаюць, здаецца, і новыя задачы: барацьба за незалежнасьць ад Польшчы, Расеі, а эвэнтуальна і ад Літвы. Аднак А. Луцкевіч стаіць на сваім: «Інтарэсы беларускага народу ў межах нямецкай акупацыі вымагаюць, каб устанаўленьнем Краёвай Рады Літвы беларусаў не дзялілі, а ўсіх іх злучылі б разам; каб у гэткай Радзе – не нацыянальна літоўскай, а папраўдзе агульнакраёвай – занялі б належнае месца ўсе нацыянальнасьці краю, а ў тым ліку беларусы; каб чысло прадстаўнікоў ад беларусаў адпавядала б чысьленасьці беларускага насяленьня ў

межах акупацыі і каб беларускае грамадзянства атрымала магчымасьць паводлуг сваёй думкі і сваёй волі выбраць сваіх даверaных людзей».

А. Луцкевіч не давярае Тарыбе, але і не адмаўляе, не адпрэчвае яе. Ён спадзяецца на кампраміс з Тарыбаю, на прапарцыйнае прадстаўніцтва ў ёй беларусаў і літоўцаў, на непадзельнасьць беларускіх абшараў Обэр-Осту, якія знаходзіліся пад уладаю вайсковых адміністрацыяў акруг Літва (Militär-Verwaltung Litauen) і Беласток–Горадня (Militär-Verwaltung Biełastok–Hrodna). Але літоўцам не патрэбная такая канфігурацыя, калі беларусы колькасна пераўзыходзяць іх.

Ці ўсьведамляў А. Луцкевіч марнасьць сваіх заклікаў і намаганьняў? Ня выключана, але, дбаючы пра нацыянальныя інтарэсы, ён імкнецца дасягнуць як мага большых выгадаў для свайго народу.

Разам з артыкулам «Краёвая Рада Літвы» А. Луцкевіч друкуе ў «Гомане» і артыкул «Вільня, 28 верасьня».

Аўтар ужо каторы раз сьцьвярджае:

Край бяз вольнага выхаду ў мора ў сваім матэрыяльным і духоўным разьвіцьці будзе заўсёды цягнуцца ззаду за ўсемі, а яркім прыкладам гэткага «востpава на сухапуцьці» служыць бедная, некультурная, слабая Сэрбія, каторай заўсёды кіравалі чужынцы і каторая шчэзла з карты Эўропы як ахвяра самагубнай палітыкі кааліцыі (маецца на ўвазе Антанта. – **А. с.**).

Луцкевіч не выключае, што пасьля падпісаньня міру Беларусь можа быць падзеленая на дзьве часткі: заходнюю і ўсходнюю. І зноў жа, гэтыя лініі франтоў, лініі падзелаў ён разглядае праз прызму эканамічных інтарэсаў Беларусі:

Празь Лібаву, Віндаву і Рыгу ішло за граніцу ўсё, што наш край меў дзеля прадажы на вываз і яго не сплаўляў па Нёмане. Рыга –

гэта перш за ўсё натуральны порт усяго басэйну Дзьвіны, значыць, усей Зямлі Віцебскай і часьці Віленскай, а сыстэма чыгунак зьвязвае зь ей Магілёўшчыну і далёкую Смаленшчыну. Лібава – гэта порт ня толькі для Віленшчыны і Гродзеншчыны, але і для вялізарнага абшару зямлі Менскай. Гэтак ваенны фронт зусім адрэзаў ад мора пераважную часьць Беларусі, і калі б мір умацаваў гэты разьдзел нашай Бацькаўшчыны, дык сем мільёнаў беларусаў з таго боку фронту, а такжа даволі чысьлены элемэнт жыдоўскі і польскі ў Беларусі аказаліся б засуджанымі на вечную эканамічную няволю, на долю Сэрбіі.

Луцкевіч па-ранейшаму выказвае жаданьне, «каб наша Бацькаўшчына не была пабіта на кускі, а каб усе Беларускія землі разам з этнаграфічнай Літвой і ў найцясьнейшай лучнасьці з Курляндыяй станавілі б суцэльную і вольную дзяржаўную арганізацыю ў зьвязі з тымі дзяржавамі, з каторымі наш край злучаюць жыцьцёвыя інтарэсы».

Тут трэба агаварыцца: гэтае жаданьне аўтар абвяшчае як «жаданьне ўсіх сьвядомых беларусаў». Насамрэч гэта было ня так: на ўсходзе Беларусі ў той час высьпявалі іншыя канцэпцыі.

Паўтараю: з вышыні нашага гістарычнага досьведу, досьведу Швайцарыі такія погляды можна крытыкаваць. Але гэта былі погляды ўсё ж такі беларускага патрыёта і прагматыка.

І зноў трэба зрабіць маленькае адступленьне. Мае права на існаваньне і такая думка: тое, што А. Луцкевіч упарта трымаўся за праект Беларуска-Літоўскае дзяржавы, паказвае, што ён добра ўсьведамляў негатовасьць беларусаў да дзяржаўнае незалежнасьці (Беларусь падзелена, няма належнай колькасьці падрыхтаваных для кіраваньня краінаю людзей і г. д.). Можна выказаць меркаваньне, што да праекту Беларуска-Літоўскае дзяржавы ён падыходзіў і з гледзішча эканамічных інтарэсаў нашае краіны, і з гледзішча (скажам так) інкубатарнага: маючы аўтаномію ў супольнай зь літоўцамі дзяржаве, беларусы, якія адстаюць ад іх у культурным і арганізацыйным плянах, набіраюцца эканамічнае і, ня менш важна, культурнае ды арганізацыйнае моцы, каб у адзін добры дзень абвясьціць незалежнасьць сваёй краіны. Гэтак, ня выключана, бачыліся А.

Луцкевічу будучыня ды аптымальнае разьвіцьцё падзеяў.

Нумар «Гоману», у якім зьмешчаныя артыкулы «Краёвая Рада Літвы» і «Вільня, 28 верасьня», выйшаў пад шапкаю «Беларусы, прыходзьце на сход у нядзелю».

30 верасьня, як і заклікаў «Гоман», у Вільні адбыўся беларускі мітынг, якім кіраваў І. Луцкевіч[16]. Удзельнікі мітынгу патрабавалі злучэньня «ў аднэй адміністрацыйнай арганізацыі Літвы» ўсіх беларускіх земляў акупацыі і прапарцыйнага прадстаўніцтва беларусаў у Краёвай Радзе Літвы. Тэкст гэтае рэзалюцыі таксама пісаў А. Луцкевіч. Ёсьць у рэзалюцыі і новае: удзельнікі мітынгу даручылі яго арганізатарам «учыніць патрэбныя крокі дзеля сазыву ў Вільні Беларускай Канфэрэнцыі з прадстаўнікоў усіх Беларускіх зямель акупацыі дзеля чыннага ўчасьця ў тымчасовай арганізацыі занятай немцамі часьці нашага Краю».

Рукапіс рэзалюцыі захоўваецца ў БДАМЛМ (адз. захав. 140, арк. 74–75). Тамсама зьберагаецца і чарнавік перакладу рэзалюцыі на нямецкую мову, а таксама копія машынапісу гэтага перакладу, зробленага Эміліяй Мэнке (адз. захав. 140, арк. 6).

[16] Гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху… с. 98–99, 193.

Пераклад быў патрэбны, каб прад'явіць яго начальніку Militär-Verwaltung Litauen князю фон Ізэнбургу-Бірштэйну.

4 кастрычніка прэзыдыюм беларускага мітынгу – Іван Луцкевіч, Вінцэнт Сьвятаполк-Мірскі, Казімер Шафнагель, Антон Луцкевіч, Вацлаў Ластоўскі, Язэп Туркевіч, Язэп Ліцкевіч і Язэп Салавей – зьвяртаецца да князя з просьбаю «аб пазваленьні асобам, каторыя будуць намі дэлегаваны, аб'ехаць беларускія ваколіцы і запрасіць прадстаўнікоў беларусаў з правінцыі на супольную з намі нараду аб арганізацыі Беларускай Канфэрэнцыі ў Вільні».

У БДАМЛМ маецца чарнавік гэтага звароту (адз. захав. 271, арк. 18), а таксама яго перакладу на нямецкую (адз. захав. 140, арк. 4–5).

Недзе ў той час А. Луцкевіч складае «Плятформу

Арганізацыйнага Камітэту дзеля сазыву Беларускай Канфэрэнцыі ў Вільні». У БДАМЛМ маецца копія машынапісу гэтага дакумэнту (адз. захав. 140, арк. 40).

Плятформа даволі кароткая. Галоўная мэта Камітэту – «злучыць у адно ўсе кругі і ўсе палітычныя кірункі беларускага грамадзянства дзеля агульнанацыянальнай справы: сазыву агульнабеларускай нацыянальнай Канфэрэнцыі ў Вільні». У другім пункце выкладаліся палітычныя лёзунгі, зь якімі беларусы ішлі на Канфэрэнцыю. Першы сярод іх – «незалежнасьць усіх Беларуска-Літоўскіх зямель акупацыі з далучэньнем закардоннай Беларусі». Незалежную Беларуска-Літоўскую дзяржаву меркавалася будаваць на наступных асновах: падзел яе на дзьве асноўныя аўтаномныя этнаграфічныя тэрыторыі – беларускую і літоўскую; забесьпячэньне роўных правоў усім нацыянальнасьцям і ўсім вызнаньням; забесьпячэньне правоў нацыянальных меншасьцяў; забесьпячэньне правоў беларускай мовы ва ўрадовых інстытуцыях, судзе, грамадзкіх установах, касьцёле, царкве і школе; увядзеньне выкладовай мовы ў школах паводле матчынай мовы вучняў.

16 кастрычніка беларускія актывісты пішуць да імпэрскага канцлера, які меўся прыехаць у Вільню (чарнавік: адз. захав. 140, арк. 47–51). Беларусы выказвалі трывогу ў сувязі з заплянаваным стварэньнем «у межах Verwaltung'a Litauen… літоўскай гасударственай арганізацыі». Падобную ж трывогу беларусы выказвалі і з прычыны намеру «кіраўнічых палітычных кругоў Польшчы» анэксаваць Беласток і Берасьце зь іх ваколіцамі. Ліст падпісалі 40 чалавек. Іх прозьвішчы можна прачытаць у асобным сьпісе (адз. захав. 140, арк. 59). Ліст гэты, або мэмарыял, быў пасланы канцлеру 19 кастрычніка. Аднак неўзабаве аўтары ліста зьвярталіся да кн. Ізэнбурга-Бірштэйна з просьбай пераслаць тэлеграфам імпэрскаму канцлеру «ніжэйпісаныя дамаганьні нашага народу ў справе *палітычнай будучыны* нашай Бацькаўшчыны *пасьля вайны*». У гэтым новым тэксьце мы сустракаем тыя ж патрабаваньні: Беларуска-Літоўская дзяржава зь дзьвюма аўтаномнымі тэрыторыямі, далучэньне да гэтае дзяржавы ўсходнебеларускіх земляў.

Рукапіс гэтага ліста, зноў-такі, зьберагаецца ў БДАМЛМ (адз. захав. 132, арк. 15–16). Маюцца і копіі машынапісу гэтага дакумэнту (адз. захав. 133, арк. 46–47), а таксама рукапіс перакладу на нямецкую, зробленага Э. Мэнке (адз. захав. 131, арк. 38–39). Тамсама (адз. захав. 131, арк. 37; адз. захав. 133, арк. 48) захоўваюцца і копіі машынапісу перакладу.

18 кастрычніка – праз два тыдні пасьля першага звароту да кн. Ізэнбурга-Бірштэйна – беларусы зноў зьвяртаюцца да яго. На гэты раз – з просьбаю зацьвердзіць «утвораны імі падгатавіцельны камітэт дзеля сазыву ў Вільні беларускай канфэрэнцыі з усіх Беларускіх зямель акупацыі ў зьвязку з будучай арганізацыяй нашага Краю».

Мы можам прачытаць чарнавік гэтага дакумэнту, які захоўваецца ў БДАМЛМ (адз. захав. 131, арк. 47), рукапіс перакладу гэтага дакумэнту на нямецкую, зробленага Юльянай Мэнке (адз. захав. 134, арк. 28), а таксама машынапісныя копіі гэтага перакладу (адз. захав. 134, арк. 27; адз. захав. 140, арк. 3).

На розныя ўзгадненьні зь немцамі пайшло ці не чатыры тыдні. За гэты час, магчыма, былі ўчыненыя і іншыя захады беларускіх дзеячаў, бо ўрэшце быў зацьверджаны не падрыхтоўчы, а арганізацыйны камітэт дзеля скліканьня Беларускае Канфэрэнцыі.

17 лістапада 1917 г. Аргкамітэт паведамляў аб сваім заснаваньні афіцыйна Жыдоўскаму Цэнтральнаму Камітэту ў Вільні. Захаваўся чарнавік гэтага паведамленьня (адз. захав. 140, арк. 54), а 20 лістапада «Гоман» пісаў, што «пытаньне аб Беларускай Канфэрэнцыі разьвязана памысна». 23 лістапада ў газэце быў апублікаваны пэрсанальны склад прэзыдыюму Арганізацыйнага Камітэту дзеля скліканьня Канфэрэнцыі, паведамлялася пра час і месца правядзеньня яго штодзённых паседжаньняў.

На мяжы 1917 і 1918 г. Арганізацыйны Камітэт зьвярнуўся да «сьвядомых і чынных беларусаў на ўсім абшары акупацыі з прызывам прыняць учасьце ў падгатавіцельнай рабоце дзеля сазыву Канфэрэнцыі». Ліст Арганізацыйнага Камітэту дзеля

скліканьня Беларускай Канфэрэнцыі ў Вільні ўжо даўнавата апублікаваны ў «ЛіМе»[17]. Цяпер дакладна вядома, што яго аўтарам быў А. Луцкевіч, бо ў БДАМЛМ (адз. захав. 140, арк. 41–46) захоўваецца чарнавік гэтага тэксту. Ён не датаваны. Наверсе першага аркуша напісана: *Wilnia.....191...* Гэта і дае падставу меркаваць, што дакумэнт быў складзены на мяжы 1917 і 1918 гг.

Такім чынам, Аргкамітэт быў зацьверджаны, але яму даволена было правесьці толькі падрыхтоўчую нараду, а не саміту Беларускую Канфэрэнцыю.

[17] Гл.: Літаратура і мастацтва. 1990. 30 лістапада.

25 студзеня 1918 г. нарада, як толькі яна сабралася, канстытуявалася ў Беларускую Канфэрэнцыю. Мы ня ведаем, ці гэта быў рэвалюцыйны крок кіраўнікоў беларускага руху, ці такое пераўтварэньне было ўзгоднена з акупацыйнаю ўладаю. Затое з матэрыялаў, якія захоўваюцца ў БДАМЛМ, мы можам даведацца аб працы Канфэрэнцыі і прынятых ёю дакумэнтах.

Матэрыялы Канфэрэнцыі можна падзяліць на тры групы: 1) пратакольныя запісы Канфэрэнцыі; 2) праекты рэзалюцыяў і рэзалюцыі, аўтарам якіх зьяўляецца А. Луцкевіч; 3) праекты рэзалюцыяў і рэзалюцыі, аўтарства якіх не ўстаноўлена.

Пратакольныя запісы Канфэрэнцыі захоўваюцца ў БДАМЛМ (адз. захав. 140, арк. 98–127). У тым самым канвэрце зьберагаюцца тэзісы рэфэрату А. Луцкевіча на Беларускай Канфэрэнцыі (арк. 90, 91) і накід рэзалюцыі ў культурна-нацыянальных справах (арк. 92).

Першы тэзіс рэфэрату ляканічны: «Дзеля забясьпечаньня правоў беларускага народу патрэбна незалежнасьць яго Краю». Аднак памыліцца той, хто падумае, што А. Луцкевіч адцураўся краёўства, бо ў другім тэзісе чытаем: «Беларускія і Літоўскія землі становяць адно цэлае і прыходзіцца гаварыць аб іх супольнай незалежнасьці з забясьпечаньнем аўтаномнасьці кожнай зь дзьвёх нацыянальных тэрыторый». Луцкевіч быў упэўнены, што «шанцы на незалежнасьць акупаванай Беларусі пераважываюць», а «ў Расеі жджэ беларусаў яшчэ вострая барацьба». Галоўнымі перашкодамі на шляху да незалежнасьці заходняе часткі Беларусі А. Луцкевіч лічыў Польшчу і

Нямеччыну.

Рэзалюцыя Канфэрэнцыі ў культурна-нацыянальных пытаньнях, прынятая паводле накіду А. Луцкевіча (адз. захав. 140, арк. 92), пакуль што ня выяўлена. Затое ў тым самым канвэрце маецца *другі накід* рэзалюцыі ў культурна-нацыянальных справах (арк. 95). Вось гэты тэкст стаў асновай рэзалюцыі, якая ня мае назвы і захоўваецца тамсама (арк. 83). Паводле праекту А. Луцкевіча (арк. 86) прынятая таксама рэзалюцыя «Аб беларускай мове ў Праваслаўнай Царкве», якая захоўваецца тамсама (арк. 82).

У БДАМЛМ маецца таксама чарнавік рэзалюцыі аб рэвіндыкацыі нацыянальнай маёмасьці, пісаны рукой А. Луцкевіча (адз. захав. 140, арк. 96).

Я ўпэўнены, што А. Луцкевіч зьяўляецца таксама аўтарам пяці галоўных рэзалюцыяў Канфэрэнцыі, аднак пакуль што ні рукапіс іх, ні чарнавік ня знойдзеныя. Маецца адно копія машынапісу, якая захоўваецца ў НАРБ (ф. 325, воп. 1, адз. захав. 16, арк. 16–17) і на якой фіялетавым алоўкам пазначана: *«З арыгіналам згода. Рак-Міхайлоўскі»*.

Першая з галоўных рэзалюцыяў, у якой гаворка пра Беларуска-Літоўскую дзяржаву, друкавалася ў артыкулах А. Луцкевіча «Палітычныя лёзунгі беларускага руху»[18] і «Зь беларускага палітычнага архіву»[19].

Другая галоўная рэзалюцыя трактуе аб роўных правах нацыянальнасьцяў, аўтаномных этнаграфічных тэрыторыях будучай Беларуска-Літоўскай дзяржавы ды аб забесьпячэньні правоў беларускай мовы ў публічным жыцьці і ў школах.

У трэцяй галоўнай рэзалюцыі Канфэрэнцыя канстатавала неабходнасьць «завязаць зносіны з адрэзанай ад нас ваенным фронтам часьцю Беларускага Народу» і зьвярталася да нямецкіх уладаў «з просьбай аб дапушчэньні гэткіх зносін».

[18] Гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху… Зборнік Навуковай Беларускай Камісіі. Вільня, 1923. Кн. 1. С. 3–5.

[19] Гл.: Голас Беларуса. 1924. 23 сакавіка.

Чацьвертая галоўная рэзалюцыя – «проці дамаганьня палякаў прылучыць да Польшчы Беларускія землі» – утрымліваецца ў артыкулах А. Луцкевіча «Беларусь за Познаншчыну»[20] і «Аб Беласточчыну»[21].

Пятая галоўная рэзалюцыя гаварыла «аб справе расейскіх і польскіх войск на Беларусі, што зьдзекуюцца цяперашнім безабаронным Беларускім Народам». Яна ўтрымлівала таксама «гарачы пратэст проці разгону расейскім войскам улічнага 30 на 31 сьнежня 1917 г. Беларускага Кангрэсу».

[20] Гл.: Homan. 1918. 1 лютага.

[21] Гл.: Homan. 1918. 5 сакавіка.

У БДАМЛМ можна прачытаць рукапіс праекту рэзалюцыі ў справах Каталіцкага Касьцёлу з устаўкамі А. Луцкевіча (адз. захав. 134, арк. 51). Гэты праект быў прыняты як рэзалюцыя аб беларускай мове ў Каталіцкім Касьцёле ў Беларусі. Рукапіс рэзалюцыі захоўваецца ў іншым канвэрце: адз. захав. 138, арк. 8. Тэкст гэтага дакумэнту апублікаваны 12 красавіка 1918 г. у «Гомане».

Ня выяўлена рэзалюцыя аб беларускай школе. З артыкулу А. Луцкевіча «Аб беларускую гімназію» вядома, што Канфэрэнцыя «дала загад Беларускай Радзе: учыніць належныя крокі дзеля арганізацыі беларускай сярэдняй школы – беларускай гімназіі»[22]. Акрамя таго, на Канфэрэнцыі ўтворана Беларускае навуковае таварыства[23].

Як вынікае з пратакольных запісаў, прымалася і рэзалюцыя аб германізацыі.

[22] Homan. 1918. 15 лютага.

Крыніцаю нашых ведаў аб Беларускай Канфэрэнцыі зьяўляецца і артыкул А. Луцкевіча «Пасьля Канфэрэнцыі». У ім збольшага перакананы таварыства // Гадавік Беларускага навуковага таварыства. Кн. 1. – Вільня, 1933.

[23] Гл.: Луцкевіч А. Пяцьдзясят Канфэрэнцыі. У ім збольшага перакананы таварыства // Гадавік Беларускага навуковага таварыства. Кн. 1. – Вільня, 1933.

Гэты ўсё яшчэ краёвая незалежнасьць: «Літоўска-беларускія землі, якія некалі станавілі незалежнае Вялікае Княства Літоўскае, павінны вярнуць свой утрачаны дзяржаўны быт, – і да незалежнага гасударственнага ядра, якое становяць землі акупацыі, павінна быць далучана і рэшта Беларускіх зямель, каторыя яшчэ астаюцца пад панаваньнем Расеі».

Канфэрэнцыя скончылася 27 студзеня, а артыкул «Пасьля Канфэрэнцыі» зьявіўся ў «Гомане» 5 лютага. Пачынаецца ён словамі: «Нягледзячы на нялічаныя перашкоды з розных старон, нягледзячы на незвычайныя труднасьці, Беларуская Канфэрэнцыя ў Вільні адбылася».

Перашкоды ў першую чаргу зыходзілі ад нямецкіх уладаў. Сярод матэрыялаў, якія зьберагаюцца ў БДАМЛМ, маецца рэзалюцыя, у якой выказваецца пратэст супроць недапушчэньня нямецкімі ўладамі на Канфэрэнцыю прадстаўнікоў Гарадзеншчыны і Беласточчыны (адз. захав. 140, арк. 124 адв.). З тае прычыны, што ад гэтага рэгіёну было мала дэлегатаў, Канфэрэнцыя даручыла Радзе кааптаваць у свой склад шэсьць прадстаўнікоў гэтага рэгіёну пазьней і давесьці такім чынам агульны лік сяброў Беларускае Рады ў Вільні да дваццаці.

Менавіта стварэньне Беларускае Рады ў Вільні (БРВ)[24] зьяўляецца самым важным вынікам канфэрэнцыі.

Каштоўнаю крыніцаю аб працы БРВ зьяўляюцца пратаколы яе паседжаньняў, якія захоўваюцца ў БДАМЛМ.

Этапным дакумэнтам у гісторыі нашай палітычнай думкі была «Рэзалюцыя Беларускай Рады на засяданьні 18 лютага 1918 г. у Вільні» (такая яе поўная назва). Арыгіналам рэзалюцыі з подпісамі сяброў Беларускае Рады ў Вільні валодае БДАМЛМ (адз. захав. 140, арк. 36). З пратаколу паседжаньня БРВ ад 18 лютага (адз. захав. 140, арк. 25–27) вынікае, што ў ім бралі ўдзел А. Луцкевіч, кс. Уладзіслаў Талочка, а. Міхал Галянкевіч, Вінцэнт Сьвятаполк-Мірскі, Ян Луцкевіч, Дамінік Сямашка, Вацлаў Ластоўкі, Язэп Салавей, Язэп Туркевіч, Казімер Фалькевіч, А. Дулька, Марка Пэрскі і Ян Станкевіч. З пратаколу вынікае таксама, што супроць рэзалюцыі галасаваў адзін Ластоўскі.

Рэзалюцыя пад загалоўкам «Пастанова Віленскай Беларускай Рады» была апублікаваная ў «Вольнай Беларусі» 28 красавіка 1918 г. Гэты тэкст з камэнтаром перадрукаваны ў «ARCHE» (2003, № 2). Трохі пазьней мне ўдалося высьветліць, што рэдактар «Вольнае Беларусі» Язэп Лёсік дазволіў сабе зрабіць у тэксьце рэзалюцыі лексычныя праўкі. З пэўнымі адступленьнямі ад арыгіналу рэзалюцыя друкавалася таксама ў кнізе Фёдара Турука «Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов» (Масква, 1921).

Маецца таксама (арк. 37) пераклад гэтае рэзалюцыі на

[24] У літаратуры яе называюць таксама Віленскаю Беларускаю Радаю (ВБР).

нямецкую мову, падпісаны А. Луцкевічам, М. Галянкевічам, У. Талочкам, К. Фалькевічам, А. Дулькам, Д. Сямашкам, І. Луцкевічам, Я. Туркевічам, Я. Салаўём, М. Родзевічам, Я. Станкевічам і М. Пэрскім, а таксама рукапіс перакладу, зробленага Э. Мэнке (арк. 38–39).

Мы ведаем, што ў сярэдзіне лютага 1918 г. пачалося наступленьне нямецкай арміі на ўсход. Ужо 24 лютага на сваім пленуме Віленская Беларуская Рада вырашыла паслаць дэлегацыю ў Менск. У склад дэлегацыі былі абраныя браты Луцкевічы, Я. Туркевіч, Д. Сямашка і прысяжны павераны Павал Кіршэўскі. Пазьней П. Кіршэўскага ў дэлегацыі замяніў Я. Станкевіч. Пакуль ня высьветлена прычына і дата гэтае замены.

Амаль цэлы месяц пайшоў на тое, каб дабіцца ад нямецкіх уладаў дазволу дэлегацыі на паездку ў Менск. Цяпер можна дакладна сказаць, што дэлегацыя БРВ прыехала ў Менск 22 сакавіка, а не 23-га, як я пісаў раней.

Месяц, што прыйшоў ад часу прыняцьця рэзалюцыі БРВ 18 лютага, быў багаты на падзеі. І ўсё ж галоўная зь іх здарылася па прыездзе дэлегацыі БРВ у Менск: 23 сакавіка кайзэр прызнаў незалежнасьць Літвы. Луцкевічаўская канцэпцыя беларуска-літоўскае фэдэрацыі страціла актуальнасьць (пазьней гэтую ідэю на свой капыл часова рэалізуюць бальшавікі). 25 сакавіка Антон Луцкевіч напіша свой галоўны твор – Трэцюю Ўстаўную Грамату Рады БНР.

Знаёмства з крыніцамі, агляд якіх зроблены тут, дае магчымасьць атрымаць уяўленьне пра эвалюцыю беларускай незалежніцкай думкі на захадзе нашай краіны ў 1916–1918 гг. Цяпер дасьледчыкам варта было б засяродзіцца на пошуку дакумэнтаў, якія дасылаліся ў Бэрлін і прадстаўнікам акупацыйных уладаў, у нямецкіх архівах. У нямецкіх архівах трэба шукаць таксама перапіску ў беларускім пытаньні паміж нямецкімі уўладамі на тэрыторыі Обэр Осту ды паміж Обэр Остам і Бэрлінам. І ўсё ж, ужо сёньня мы маем нябедную дакумэнтальную базу для напісаньня гісторыі беларускага руху 1916 – пачатку 1918 гг. На жаль, с. Рудовіч, пішучы свой «Час выбару» і адпаведную главу ў 6-тамовай «Гісторыі Беларусі»,

пра пошук аптымальнай канцэпцыі самавызначэньня Беларусі ў заходняй частцы нашай краіны напісаў вельмі сьцісла. Адсутнічае ў літаратуры і параўнаньне канцэпцыяў самавызначэньня, што выпрацоўваліся ў заходняй і ўсходняй частцы Беларусі, арганізацыйных формаў руху. Крыніцы, агляд якіх зроблены тут, дазваляюць у пэўнай меры выправіць гэты недахоп.

У заключэньне магу сказаць, што амаль усе дакумэнты, пра якія тут ішла гаворка, ужо набраныя на кампутары і ўключаныя ў кнігу выбраных твораў Антона Луцкевіча, якую абяцае выдаць «Беларускі кнігазбор».
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/05
[image]

[redacted]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

гісторыя

[image]-[image]2006

аналітыка • крытыка • палеміка • **гісторыя** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Беларусь перажывае бурнае нацыянальнае адраджэнне пад уплывам камуністаў Акадэмічная канферэнцыя 1926 г. у галасах відавочцаў

Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу, якая была склікана Інстытутам Беларускай Культуры і праходзіла ў Менску 14–21 лістапада 1926 г., на думку яе ўдзельнікаў, «выйшла далёка за межы звычайнага тыпу беларускіх навуковых канферэнцый, набыўшы больш шырокі навуковы... агульна-славістычны характар»[1]. Гэта было першае беларусазнаўчае мерапрыемства міжнароднага маштабу.

Падзея мела і вялікае палітычна-прапагандысцкае значэнне для бальшавіцкага кіраўніцтва, якое хацела засведчыць поспехі савецкага рэжыму ў культурным будаўніціве ў Савецкай Беларусі: замежныя госці павінны былі пабачыць на ўласныя вочы і расказаць пасля ўсяму свету пра паслядоўную нацыянальна-культурную палітыку; а беларуская эміграцыя – зразумець, што менавіта бальшавіцкі Менск ёсць тым

«Беларускім Домам», пра які яны ўвесь час летуцелі. Да таго ж менскі форум быў арганізаваны ў процівагу акцыі «недабітых» рэштак антысавецкай эміграцыі з Літвы, Чэхаславаччыны і Заходняй Беларусі. У. Ігнатоўскі засведчыў, што менская ініцыятыва «палітычна супрацьстаяла арганізоўваемай на Захадзе варожай нам канферэнцыі»[2]. Партыйнае кіраўніцтва Менска зрабіла ўсё, каб апярэдзіць беларускую эміграцыю ў правядзенні падобнага з'езду.

Увесь ход падрыхтоўкі і правядзення Акадэмічнай канферэнцыі знаходзіўся пад пільнай увагай ЦК ВКП(б). Так, напярэдадні яе беларускія камуністы паведамлялі ў Маскву:

ЦК КП(б)Б выдзеліў палітычную камісію па кіраўніцтве канферэнцыяй, парткіраўніцтва забяспечана. [...] Матэрыялы канферэнцыі набудуць сілу закона, зразумела, пасля абмеркавання пытання ў ЦК КП(б)Б. У сваім дакладзе ЦК КП(б)Б выкладзе асноўныя вывады і прапановы па рэформе правапісу і азбукі беларускай мовы. Мэтазгодна, каб яны былі абмеркаваны і пастаўлены на разрашэнне ў ЦК ВКП(б), паколькі могуць быць моманты, якія выходзяць за межы БССР[3].

Спіс запрошаных удзельнікаў узгадняўся з органамі ГПУ[4]. 12 лістапада, напярэдадні адкрыцця канферэнцыі, пытанне аб яе правядзенні разглядалася на закрытым пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б. Была прынятая пастанова: «Працы канферэнцыі надаць строга акадэмічны характар. У друку (цэнтральным і мясцовым) асвятліць акадэмічную канферэнцыю як вялікага палітычнага значэння факт нацыянальнай палітыкі пралетарыяту, у словах партыйцаў адзначыць лінію партыі». Слова, паводле рашэння бюро, давалася: Ігнатоўскаму ад Інбелкульта, Баліцкаму – ад Наркамасветы, Гельтману ад Камвуза, Пічэту – ад БДУ, ад секцыі навуковых працаўнікоў і сельгасакадэміі. «Тэксты прывітальных слоў узгадніць у паліт. камісіі па канферэнцыі»[5]. Меркавалася выкарыстаць знаходжанне шэрагу дзеячаў на канферэнцыі «па лініі работы ў беларускім руху за граніцай»[6].

Сюрпрызаў не павінна было быць.

[1] Працы Акадэмічнае канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі (14–21 лістапада 1926 г.). – Менск, 1927.

[2] Платонаў Расціслаў. Як у Мінску праходзіў «сусветны контррэвалюцыйны канграс беларусаў» // Беларуская мінуўшчына. 1996. №3. с. 54.

[3] НАРБ. Ф. 4. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 265.

[4] Тамсама.

Сталіца БССР у дзень адкрыцця канферэнцыі выглядала як святочнаму: былі вывешаны сцягі (у тым ліку некалькі бела-чырвона-белых), курсавалі агітацыйныя машыны з плакатамі, прысвечанымі дасягненням беларусізацыі. На прадпрыемствах і ва установах праходзілі ўрачыстыя мітынгі і сходы, на якія запрашаліся ўдзельнікі канферэнцыі. Для замежных гасцей была падрыхтаваная вялікая культурная праграма, выдаткоўваліся сродкі на арганізацыю сустрэч, банкетаў і інш.[7]. Газеты змяшчалі інфармацыю аб рабоце канферэнцыі, яе ўдзельніках, даклады і некаторыя выступы, прывітальныя тэлеграмы.

[image]

[image] На закрыцці канферэнцыі прадстаўнік латышскай дэлегацыі, дацэнт Блесэ сказаў:

Выносячы глыбокую падзяку Інстытуту Беларускае Культуры за яго ласкавае запрашэнне, павінен паўтарыць тое, аб чым я ўжо меў гонар не раз заяўляць, а менавіта: я вельмі абрадаваны тым, што я бачыў тут на Беларусі. Я павінен тут канстатаваць вялікія дасягненні Беларусі ў розных галінах культуры. Праўда, мая праца на Канферэнцыі была, магчыма, не асабліва актыўнай. У гэтым сэнсе, я павінен сказаць тое самае, што і праф. Фасмэр, але я думаю, што і мая прысутнасць тут прынясе мне вялікую карысць. Звярнуўшыся, я, безумоўна, пастараюся растлумачыць і даць весткі аб Беларусі, якія я тут паспеў набраць. Хоць мы і суседзі, але тое, што робіцца на Беларусі, нам было зусім не вядома, і дзеля гэтага погляды некаторых колаў нашае грамадскасці на становішча Беларусі далёка не адпавядалі запраўднасці. Я думаю, што цяпер мне ўдасца растлумачыць маім супляменнікам запраўднае становішча справы, і думаю, што гэта таксама паслужыць справе зносін на карысць абодвух народаў[8].

[image]

[image] У апошні дзень працы канферэнцыі ў клубе імя К. Маркса адбыўся канцэрт беларускай музыкі, на пачатку якога аркестр пасля «Інтэрнацыяналу» выканаў «беларускую

5 Тамсама. Воп. 21. Спр. 108. Арк. 25.
6 Тамсама. Спр. 108. Арк. 25.
7 Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 тт. Т. 1. — Мн., 1993. с. 78.
8 Працы Акадэмічнае канферэнцыі... с. 400.

марсельезу» – «Адвеку мы спалі...», якую спявалі ўсе прысутныя ў зале...

Госці раз'ехаліся па дамах. У хуткім часе нататкі аб паездцы ў Савецкую Беларусь з'явіліся ў некаторых СМІ за межамі БССР. Так, варшаўская газета «Siowo» ад 12 снежня 1926 г. пісала: «Мяцовыя ўлады савецкія і партыйныя зрабілі ўсё, што толькі было ў іх сілах, для таго, каб даць канферэнцыі палітычную афарбоўку, зразумела, у той ступені, у якой гэта было магчыма ў адносінах да філалагічнай канферэнцыі»[9].

Але Крэмль ходам правядзення і вынікамі канферэнцыі застаўся незадаволены. У ЦК ВКП(б) ужо ў снежні таго ж года паведамлялася: «Канферэнцыя выявіла нацыяналістычныя захапленні ў некаторых групах беларускай інтэлігенцыі»[10]. На карысць гэтага сцверджання сведчылі наступныя факты: вынясенне партрэта Леніна, адсутнасць сцяга СССР, цёплы прыём Ф. Аляхновіча, пытанне аб лацінцы, Баліцкі ў сваім выступленні не выявіў ролі партыі і інш.[10]
Цікава, што пра гэтак званыя «нацыяналістычныя захапленні некаторых груп беларускай інтэлігенцыі» пісалі пасланцы прадстаўнікі замежных дэлегацый, «прадстаўнікі заходніх, яшчэ не савецкіх, рэспублік». Вядомы латышскі паэт Ян Райніс на старонках рыжскай газеты «Social-Demokrat» адзначаў: «Нацыянальнае абуджэнне Беларусі нагэтулькі моцнае, што засланяе сабой усе іншыя духоўныя інтарэсы... беларусаў ахапіла цудоўная нацыянальная ўзнёсласць». Мовазнаўца Э. Блесэ змясціў свае ўражанні на старонках газеты «Latvis»:

Хоць Беларусь перажывае бурнае нацыянальнае адраджэнне пад уплывам камуністаў і ў камуністычным духу, але ўсё-ткі нацыяналістычныя элементы мацнейшыя за камуністычныя і не выключана магчымасць, што нацыяналізм перарасце камунізм і прыстасуе яго да сябе[11].

Апублікаваныя ў замежных газетах і часопісах уражанні ўдзельнікаў менскай акадэмічнай канферэнцыі супрацоўнікі менскага аддзела ГПУ акуратна занатоўвалі, а цікавыя фрагменты перадавалі ў ЦК КПБ. Увогуле, цяпер гэта відавочна: уся праца Менскай акадэмічнай канферэнцыі 1926 г. праходзіла пад «каўпаком» чэкістаў. Асабліва гэта тычылася

9 НАРБ. Ф. 4. Воп. 21. Спр. 108. Арк. 48.
10 Там самае. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 308–319.
11 Там самае. Воп. 21. Спр. 108. Арк. 33–35.

кантактаў тутэйшых нацдэмаў з замежнымі гасцямі і з прадстаўнікамі беларускай эміграцыі.

Для апошняй, дарэчы, удзел у канферэнцыі быў нагодай выведаць сітуацыю і адказаць на вельмі важнае пытанне: вяртацца ў савецкі Менск пасля абвешчанай савецкай уладай амністыі ці пачакаць і перасядзець на чужыне. Некаторыя з эмігрантаў (В. Ластоўскі, У. Жылка, Ф. Аляхновіч) купяцца на савецкую прапаганду.

Для гасцей, якія ўзялі ўдзел у канферэнцыі, мела значэнне ўсё: на якой мове шыльды, надпісы на манетах, як працуюць у Беларусі тэатры і музеі, навуковыя ўстановы, як апранаюцца людзі, чаму і як вучаць у школе, што тут адбываецца ўвогуле. В. Ластоўскі ў выдаваным ім у Коўне часопісе «Крывіч»[12] апісваў, як ён з заміраннем сэрца баяўся зазірнуць вучням у сшыткі: а раптам яго чакае падман і навучанне ў беларускай школе па-ранейшаму вядзецца на расійскай мове?

[image] Разам з усім ад Акадэмічнай канферэнцыі засталіся ўражанні яе гасцей, якія былі пазней надрукаваныя ў незалежнай прэсе. Яны дазваляюць аб'ектыўна паглядзець на тыя працэсы, што адбываліся тады ў Беларусі пад саветамі. Кароткія замалёўкі Э. Блесэ дазваляюць, акрамя таго, адчуць паўсядзённы лад жыцця Менска і Віцебска сярэдзіны 1920-х г., у перыяд «росквіту нэпа і беларусізацыі».

Э. БЛЕСЭ
Уражанні аб Беларусі[13]

(...) Канферэнцыя была склікана Інстытутам Беларускай Культуры, які заснаваны ў 1922 годзе для рознабаковага вывучэння беларускай культуры. Пры Інстытуце маюцца секцыя мовы, і канферэнцыя ставіла мэтай таксама ўдакладненне пытанняў беларускай мовы, алфавіту і правапісу. Адно пасяджэнне было прысвечана пытанням беларускай літаратуры. Для больш дэталёвага абмеркавання былі абраны камісіі алфавіту, правапісу і літаратуры, якія старанна працавалі ў апошнія дні канферэнцыі і якія прыйшлі да некаторых агульных высноваў. Напрыклад: для абазначэння

[13] Ці
дакумент
распаўсюджаны
ў
Беларусі,
невядома.
Вынятковая

беларускіх гукаў *дз* і *дж* пастанавілі ўвесці ў беларускую
спецыяльныя знакі, узятыя з сербскага алфавіту. Па
ўвесці таксама знак «й», пакідаючы пакуль для змяк
папярэдняга зычнага гука расійскія знакі «я», «ю», «
лічылі перайсці да лацінскага шрыфту, але асабліва
пераходам [вырашылі] не спяшацца, бо гэта азначала
моцны разрыў паміж расійскім і беларускім друкам
шырокія масы не падрыхтаваныя. Усё ж асобныя ар
лацінскім шрыфтам у хрэстаматыі будуць уведзены
спрэчкі разгарнуліся ў камісіі правапісу, і прынятыя
не маюць адзінства. Літаратурная камісія адзначыла
дасягненні ў беларускай літаратуры, яе значэнне, ха
задачы па даследаванні гісторыі літаратуры. Белару
работнікі да канферэнцыі рыхтаваліся сур'ёзна, і дз
удзельнічалі як прыехаўшыя іншаземцы, так і прад
расійскіх універсітэтаў, праходзілі дзелавіта. У спр
ўдзел толькі сапраўдныя члены канферэнцыі, але
хоць тая і шырока цікавілася канферэнцыяй. Бо зала

Відаць, што беларускія работнікі ахоплены нацыянальным
энтузіязмам. Неабходнасць духоўнага і культурнага
адраджэння беларускага народа падкрэсліваецца і
якія матывуюць гэта, вядома, сваімі камуністычнымі мэтамі.
Таму, нягледзячы на даволі цяжкае эканамічнае становішча,
шмат сродкаў адпускаецца на асвету і закладванне фундамента
беларускай культуры.

У асноўным асвета праводзіцца праз школу, па законе – з
сямігадовым курсам, але першыя чатыры гады якой складае
асобны канцэнтр – як бы школа першай ступені. У першую –
гэтак званую нулявую групу (класы называюцца групамі)
прымаюцца дзеці без усялякай граматы. Першы час заняткі
вядуцца прыблізна так, як у нашых школах, але з трэцяга года
навучання пераходзяць на гэтак званую комплексную сістэму.
Урокаў у нашым сэнсе дзеці ўжо не маюць, але па асобных
прадметах атрымліваюць двухтыднёвыя заданні. Школу дзеці
наведваюць, але ў свае гадзіны рыхтуюць сваю работу.
Настаўнік у класе прысутнічае, але калі дзеці пытанняў не
задаюць, спакойна чытае газету. Па кожным прадмеце ў школе

дазваляецца працаваць не больш за дзве гадзіны запар. Школу наведваць не абавязкова. Але ўсё ж такі наведванне рэкамендуецца, і частыя пропускі ўрокаў не дазваляюцца. Трагедыя толькі ў тым, што дзеці ўвогуле ставяцца да работы павярхоўна. Напрыклад: у час працы па расійскай і беларускай мове, як мне даводзілася назіраць, яны толькі гарэзяць і да канца тэрміну здаюць работу, якая складаецца з агульных стэрэатыпных фраз з камуністычным зместам, якія яны штодзень чуюць ці пачэрпнутых з газет. Таму такая праца, за малым выключэннем, прыносіць мала карысці, і самі камуністы прызнаюць, што дзеці канчаюць школу без сур'ёзных фактычных ведаў.

Скажу яшчэ, што вельмі многія семігодкі не канчаюць. Самі камуністы – кіраўнікі асветы пакуль прызналі б ідэалам, каб усе дзеці канчалі мінімум чатырохгодку. Але гэта ў жыццё яшчэ не праведзена і, паводле водгукаў саміх жа кіраўнікоў, 5 % гарадскіх і 20 % сельскіх [дзяцей] застаецца без усялякай адукацыі. Вядома, фактычны працэнт будзе большы.

Вучні апрануты даволі дрэнна, асабліва ў сэнсе верхняга. Нікчэмны таксама абутак. Рэдка сустракаецца вучаніца ў капелюшы. Дамінуючая большасць у хустках. Паводле выгляду таксама дзеці не робяць уражання інтэлігентных. Дысцыпліна ў школах, гавораць, палепшылася – аб вучнёўскіх выхадках паведамляецца бацькам, – але ўсё ж такі парушэнне дысцыпліны сустракаецца часта. Праробленую работу ацэньваюць баламі (добра, здавальняюча, сярэдне).

Аб стварэнні вышэйшых культурных каштоўнасцяў асабліва клапоціцца Інстытут Беларускай Культуры. Зараз ён мае ўжо каля 10 членаў, аплачваных у 200 р. штомесяц, якія вядуць работу толькі [ў] інстытуце, выпрацоўваюць праекты культурнай працы і кіруюць даследчыцкай работай беларускай культуры па ўсёй Беларусі. Інстытут Беларускай Культуры стаў ужо кіраўніком культурнай працы, і універсітэт прымушаны з ім лічыцца. У бліжэйшым будучым з найбольш моцных членаў Інстытута створаць беларускую Акадэмію Навук.

Развіваецца археалогія. Кожнае лета праводзяцца раскопкі, і экспанаты ў музеях растуць. Так, напрыклад, у Менску сабраны

новыя археалагічны і этнаграфічны музеі, у якіх ужо даволі шмат матэрыялу. Яшчэ багацейшы Віцебскі музей. Тут маюцца таксама знойдзеныя ў кургане (магіле) Лудзі нашыя латышскія старажытнасці. Сэрца маё сціснулася балюча, калі я ўбачыў гэтыя рэчы тут, месца якім было б у Рызе. У сваіх тлумачэннях дырэктар музея расказаў, што наш суродзіч праф. Балог лічыць гэтую культуру латышскай, іншыя прафесары фінскай, і што беларускай яе не лічаць таму, што яе не збіралі беларускія навуковыя працаўнікі. Там жа на сцяне адноўлены жывапіс па ўказаннях праф. Балога, быццам бы прадстаўнікі беларусаў IX–X стагоддзя – мужчына і жанчына са знойдзенымі ў кургане Лудзі ўпрыгожваннямі. Цалкам зразумела, што яны тыпова латышскія, толькі твары напісаны трохі ў сучасным беларускім стылі. Так нашымі старажытнымі каштоўнасцямі хваляцца ў сваім мінулым беларусы. Нейкая іронія лёсу і сімвалічнае ўказанне нашаму народу бачацца ў гэтым факце. Хіба не часта, як у мінулым, так і ў сучаснасці, мы, латышы, дапамагалі іншым народам дабіцца як славы, так і ўлады? Таксама ў Саўнаркоме Беларусі ёсць два камісары ці іх намеснікі латышы – Карклін і Калнін, якія займаюць вельмі адказныя пасады. А што далі нам іншыя народы за гэта?

Знешняе ўражанне аб Беларусі даволі сумнае. Людзі адзеты і абуты бедна. У Менску ўсё ж адзенне і абутак лепшыя, затое ў Віцебску зусім нікчэмныя.

Беларус лічыць зневажальным для сябе гаварыць з кім-небудзь ці сядзець дзе-небудзь без капелюша. Наагул, у паўсядзённым жыцці паўсюль назіраецца даўняя расійская неахайнасць і бруд. І ў гэтых адносінах да сялянскага духу бальшавіцкая культура так сама мала прычынілася, як і культура царызму.

Трэба прызнаць, што гаспадары ў Менску абыходзіліся з намі вельмі дыпламатычна і тактычна, не гаворачы нічога такога, што магло б задзець нашыя «буржуазныя» пачуцці. «Інтэрнацыянал» выслухоўваць не прымушалі. Адкрывалі і закрывалі канферэнцыю беларускім гімнам «Ад веку мы спалі і нас разбудзілі». Крыху інакш было ў Віцебску, дзе нас запрасілі на нядзелю 21 лістапада на адкрыццё II-га беларускага дзяржаўнага тэатра. На гэтай урачыстасці мясцовыя віцебскія

таварышы, жадаючы бліснуць сваім камунізмам перад прадстаўнікамі менскай цэнтральнай улады, віталі нас як «прадстаўнікоў заходніх яшчэ не савецкіх рэспублік». Прамовы тут былі строга вытрыманы ў камуністычным духу і стылі 17–19 г. Вайскоўцы бразгалі зброяй і таксама цалкам залішне прымушалі нас выслухоўваць «Інтэрнацыянал» па некалькі разоў.

Некалькі слоў аб беларускім тэатры. У дадзены момант беларусы маюць 2 дзяржаўныя тэатры. У Менску, які існуе ўжо некалькі гадоў, і другі толькі што адкрыты ў Віцебску. Беларускія артысты нядрэнныя. Артысты Віцебскага тэатра атрымалі адукацыю ў студыі Маскоўскага мастацкага тэатра. Бедны толькі рэпертуар. Усе п'есы напісаны тэндэнцыйна, і ў іх адлюстроўваецца ў празмерна змрочных фарбах ранейшае жыццё беларускага сялянства ці сялянскія паўстанні супраць памешчыкаў. Ва ўсіх п'есах доўгія цытаты аб барацьбе прыгнечанага народа супраць прыгнятальнікаў, аб правах сялян на зямлю і г. д., незалежна ад таго, наколькі гэтыя цытаты адпавядаюць адлюстроўванай эпосе і ідэям. Усё гэта, канечне, змяншае мастацкую каштоўнасць п'ес. Акрамя таго, празмерна шмат знешніх эфектаў – стралянінa, паўстанне і г. д. Цікавыя этнаграфічныя элементы сустракаюцца амаль у кожнай п'есе, а таксама і беларускія песні. Слухалі ў гонар нас арганізаваны ўрачысты канцэрт, мастацкае ўражанне аб якім сярэдняе.

Латышы, якія жывуць у Беларусі, як, відавочна, і па ўсёй Расіі, моцна абруселі. Сустрэў чалавека, які, на яго думку, ведае латышскую мову, але зразумець мову якога я не мог. Так як латышская мова газет, якія выдаюцца ў Расіі, наколькі я магу меркаваць паводле аднаго нумару «Латвешу Земнекс», скажоная. З нашымі дыпламатычнымі прадстаўнікамі ў Беларусі латышы ніякіх нацыянальных сувязяў не маюць, а мясцовы ўрад глядзіць скоса на такія сувязі, ужываючы рэпрэсіі ў адносінах да асоб, якія мелі калі-небудзь якія-ніякія справы з нашымі прадстаўнікамі. Яшчэ патрэбна адзначыць, што шмат латышоў у Арміі, асабліва на камандных пасадах. Так, напрыклад, камандзір корпуса, які знаходзіцца ў паўночнай Беларусі, Нэйман, – латыш.

Да Латвіі беларуская інтэлігенцыя праяўляе вядомую цікавасць. Некамуністычная інтэлігенцыя радуецца нашым дасягненням і зайздросціць нам, што можам вольна працаваць на славу сваёй радзіме. Інтэлігенцыя, якая мае больш левыя погляды, адносіцца да нас халадней і відавочна яшчэ верыць, што ў нас можа адбыцца бальшавіцкі пераварот. Матывацыя такая – існуюць жа[14] ў нас сацыял-дэмакраты, розніца паміж імі і камуністамі – рэактыўная.

Прынялі нас прыветліва, і харчаванне было больш чым у тэксце – дастатковым. Інстытутам Беларускай Культуры быў[14] ўзнаджаны ў гонар удзельнікаў канферэнцыі спецыяльны банкет. Прадстаўнік Маскоўскага Камісарыяту па замежных справах у Менску сп. Казюра запрасіў нас з Райнісам і літоўскім прафесарам Біржышкам на абед. Усе члены канферэнцыі былі запрошаны рэктарам універсітэта Пічэтам на чай. Таксама на чай запрасілі нас у Чырвоны Крыж. Пры развітванні з Менскам мы мелі агульную вячэру з членамі Інстытута Беларускай Культуры. З Менска ў Віцебск нас перавезлі ў II-м класе, а таксама аплацілі ўсе нашыя дарожныя выдаткі. Для нашай універсітэцкай бібліятэкі я набыў некалькі беларускіх навуковых выданняў. За аказаную прыветлівую сустрэчу арганізатарам канферэнцыі – наша глыбокая ўдзячнасць. Не магу не выказаць самай глыбокай удзячнасці працаўнікам нашага Віцебскага Кансулята – консулу спадару Гірчэнсону і яго сакратару спадарыні Акман, якія так сардэчна нас прынялі. Як прыемна адчуваць сябе на чужыне сярод сваіх людзей і ў мілай латвійскай атмасферы.

Агульныя ўражанні такія. Хоць Беларусь перажывае бурнае нацыянальнае адраджэнне пад уплывам камуністаў і ў камуністычным духу, але ўсё-ткі нацыяналістычныя элементы мацнейшыя за камуністычныя, і не выключана магчымасць, што нацыяналізм перарасце камунізм і прыстасуе яго да сябе. Новая культура развіваецца на нацыянальнай глебе з агульначалавечымі прынцыпамі і жаданнем уступаць у сувязі з еўрапейскімі навуковымі работнікамі і прасоўваць сапраўдную навуку наперад настолькі, зразумела, наколькі дазваляюць абставіны. У гэтым новым адраджэнні пакуль шмат захаплення, больш шырыні, чым глыбіні. Усё-ткі пажадана з гэтымі новымі

творцамі культуры падтрымліваць сувязі, абменьваючыся навуковымі дасягненнямі, адносячыся, безумоўна, да іх крытычна, паколькі ў палітычных адносінах паміж нашымі дзяржавамі існуе велізарная розніца. Шмат мы, вядома, не набудзем, але і нічога не страцім. Сачыць за тым, што здзяйсняецца на ўсходзе ад нас, неабходна, а то інакш можам дажыць да таго ці іншага сюрпрызу. Гэта зразумелі немцы, якія даслалі на кангрэс аднаго з найлепшых славяназнаўцаў праф. Фасмэра, які з'яўляўся цэнтральнай фігурай сярод іншаземцаў. Гэта зразумелі і літоўцы, якіх прадстаўляў праф. Біржышка. Абодва паны прывезлі Інстытуту Беларускай Культуры падарункі. Праф. Фасмэр – некалькі найноўшых выданняў па славяназнаўстве і праф. Біржышка – найноўшае рэпрадукаванае выданне на цынкографе «Дауктас Постіллас» – XVI стагоддзя. Думаю, што мы, латвійскія дэлегаты, сваёй паездкай аказалі Латвіі маленькую паслугу, прапагандуючы на чужыне нашу радзіму і адцягваючы ад яе тую ці іншую злосную ацэнку з боку беларусаў у выпадку непрыбыцця нашых дэлегатаў.

Сытыя ўсе, затое ў адзенні як мужчыны, так і жанчыны імкнуцца быць больш сціплымі. Знешні выгляд гарадоў даволі сумны. У Менску ўмовы лепшыя, затое ў Віцебску змрочна. Хоць крыху адрамантаваных дамоў у Віцебску сустрэнеш толькі на галоўных вуліцах. Але ўсё ж такі і тут агідныя балконы адваліліся, пакінуўшы за сабой іх заржаўленыя жоўтыя балкі. Як толькі сыдзеш з галоўнай вуліцы, стан дамоў і двароў прадстаўляецца ва ўсёй сваёй непрывабнай рэчаіснасці. Выветраныя фундаменты, прагнілыя ганкі, скрыўленыя, званыя платы. Прыйшлі ў непрыгоднасць і некаторыя цэрквы, частка з іх пераўтворана ў казармы, сярод якіх некалькі сінагог. Вулічныя надпісы сустракаюцца рэдка і тое толькі на расійскай мове. Шыльды дзяржустаноў на чатырох мовах: беларускай, расійскай, польскай і яўрэйскай. Аўтамабіляў зусім не відаць. Рамізнікі брудныя і абарваныя. Непрывабныя і іх брычкі.

Пераклад фрагментаў зацемкі Э. Блесэ, якая была надрукавана ў рыжскай газеце «Latvis» № 1547 і 1548 за 1–2.12.1926 г.,

выяўлены ў НАРБ: Ф. 4. Воп. 21. Спр. 108. Арк. 28–35, 43.

Райніс вярнуўся з Беларусі

(...) У Беларусі выходзяць дзве беларускія газеты і некалькі спецыяльных часопісаў. У Віцебску выходзяць газеты на дзвюх мовах – беларускай і яўрэйскай.

Справа друку (кнігі) і наагул асветы моцна ідзе наперад. У школах і вышэйшых навучальных установах заняткі ідуць на беларускай мове. У вышэйшых навучальных установах толькі некаторым прафесарам пакуль яшчэ дазволена чытаць лекцыі на расійскай мове. Прыбылыя на канферэнцыю госці агледзелі ВНУ, добра прыстасаваныя клінікі, багата пастаўленае заалагічнае сховішча, псіхіятрычную клініку. ВНУ, хоць яшчэ не поўны (удасканалены. – **Перакл.**)[15], усё ж даводзіцца прызнаваць, што добра пастаўлены.

Вялікія мясцовыя дзяржаўныя музеі: мастацтва, прыродазнаўства і этнаграфіі. У культурнай галіне дакумент шырокага развіцця не заўважна, толькі ў жывапісе і ў музыцы.

[15] Так у дакументе.

Існуе тэхнікум жывапісу і музыкі. Праз пару гадоў спадзяюцца адкрыць кансерваторыю, тады магчыма будзе стварыць і беларускую оперу.

Працуюць два дзяржтэатры пад адным упраўленнем у Менску. У адным 600 сядзячых месцаў, яго мяркуецца пашырыць удвая; у другім 500 сядзячых месцаў. Тэатр з 900 сядзячымі месцамі адкрыты 21 лістапада ў гор. Віцебску. Пры пастаноўцы п'ес у вялікіх памерах ужываюць музыку, ствараючы паступовы пераход да оперы. Самастойны Беларускі тэатр існуе ўсяго 5 гадоў, але, ужываючы папярэдні досвед, Беларускі тэатр дасягнуў высокай ступені развіцця. Ставяць не толькі арыгінал-п'есы, але таксама ўвесь рэпертуар Еўропы. У Віцебску тэатр адкрылі з нейкай беларускай арыгінал-п'есай, але ўжо на другі дзень ставілі «Сон у летнюю ноч» Шэкспіра. Артысты Віцебскага тэатра падрыхтоўваліся 4 гады ў студыі Маскоўскага мастацкага тэатра, і ў ігры можна было падмеціць моцна

развітую рэалістычную натуральную ігру.

У сталіцы Беларусі ў сучасны час – 120 000, у другім з найбольш буйных гарадоў Віцебску – 110 000 жыхароў.

Тав. Райніс, які быў да вайны ў Беларусі, адзначае, што ўвогуле ўражанне ад таго, што бачыў у Беларусі, калі не лепшае за тое, што было раней, то ва ўсялякім выпадку не горшае. Нацыянальнае абуджэнне Беларусі зараз такое моцнае, што засланяе ўсе астатнія духоўныя інтарэсы.

Пераклад фрагментаў артыкула з рыжскай газеты «Social-Demokrat» № 265 за 24.11.1926, выяўлены ў НАРБ: Ф. 4. Воп. 21. Спр. 108. Арк. 36–37.

Канферэнцыя ў Менску

Надовячы 14 лістапада адбылася ў Менску навуковая канферэнцыя, скліканая Інбелкультам. Апрача менскіх навуковых дзеячоў, ну і зразумела розных чырвоных генералаў, як Чарвякоў, Адамовіч і іншая чырвоная пошкудзь, што кампраметуе Беларускі Адраджэнчы Рух, былі на канферэнцыі прадстаўнікі часткі беларускай эміграцыі: В. Ластоўскі, К. Езавітаў, У. Пігулеўскі і іншыя.

З Заходняй Беларусі прадстаўнікоў не было, бо грамадаўцам улада не дала пашпартоў, а іншыя навуковыя ўстановы, як Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры (які перадусім павінен быў бы, здаецца, быць запрошаным), не атрымалі запрашэння, а атрымалі толькі некалькі асобаў.

Характэрна, што быў урачыста запрошаны бальшавіцка-змена-вехаўскі свісток у Празе «Прамень», у той час як паважаны журнал «Замежная Беларусь», выдаваны пад рэдакцыяй П. Крачэўскага, не атрымаў запрашэння.

Вынікі прац канферэнцыі яшчэ не вядомы.

Беларускае слова. Вільня, 1926. 14 снежня (№ 28).

Дакладная запіска загадчыка менскага клуба імя К. Маркса ў ЦК КП(б)Б за 22.12.1926 г.

УСІМ ЧЛЕНАМ БЮРО ЦК КПБ
Сакратару ЦК КП(б)Б тав. Крыніцкаму

Па Вашай просьбе паведамляю ў пісьмовай форме, як абстаяла справа з упрыгожваннем клуба К. Маркса да адкрыцця Беларускай Акадэмічнай Канферэнцыі і той часткі, сведкам, відавочцам якой я быў.

Па дагаворы з Інбелкультам апошні ўзяў на сябе цалкам упрыгожванне залы і прылягаючых пакояў. Мяркуючы, што маецца поўная палітычная партыйная адказнасць у такой вялікай справе, як скліканне Акадэмічнай Канферэнцыі з удзелам іншаземцаў «нацыяналаў» і г. д., справе, у якой *важныя і дробязі*, – ні я (загад. партыйнага клуба), ні члены Праўлення не лічылі патрэбным, ды і не мелі права, умешвацца ва ўсю падрыхтоўчую працу па ўпрыгожванні клуба.

Вечарам таго дня, калі Канферэнцыя павінна была адкрыцца (14 лістапада), за некалькі гадзін да адкрыцця я і яшчэ таварышы (з іх я памятаю тав. Кроля) зайшлі ў залу і некалькі былі здзіўлены. Зала патанала ў белых нацыянальных колерах (гэта было прыгожа і стылёва), але вельмі сціпла ці амаль зусім не выдзяляліся колеры і ўсё астатняе, што магло б гаварыць аб тым, што адкрываецца з'езд у сталіцы Савецкай краіны, што працуе ён пад кіраўніцтвам Партыі, Леніна і г. д. Усё гэта стушоўвалася.

Бачачы, што ў асноўным справа непапраўная (праз гадзіну адкрываўся З'езд), я і, калі памяць мне не змяняе, яшчэ таварышы, прасілі тав. Каранеўскага, які знаходзіўся ў гэтай зале, паставіць у зале «хаця б партрэт Леніна». Гэтым, тлумачылі тав., мы паказалі *б свой твар*, які, на нашу думку, няма на што і непатрэбна хаваць.

На гэта, а таксама на іншыя заўвагі, мы атрымалі адказ, што на гэты раз не трэба, *што гэта будзе лішне раздражняць* і г. д.

Ні аб якім малым партрэце са мною размовы не было. Можа быць, з другімі таварышамі.

Такі адказ некалькі абурыў, усхваляваў, але адзінае, што мне засталося рабіць – абурацца ў коле сваіх партыйцаў-сяброў, таварышаў, бо прапанаваць я не меў права.

Толькі заўтра пасля размовы з тав. Абрамчуком я ўзяў на сабой работніка АПА ЦК тав. Масевіча, пагаварылі з тав. Раманавай і партрэт *без пярэчанняў* з поўнай яго згодай быў пастаўлены. А на трэці дзень з'явіўся і чырвоны сцяг. Вось усё, што я ведаю і бачыў.

З таварышаў, якія знаходзіліся са мною падчас размовы з тав. Каранеўскім, памятаю толькі т. Кроля Л., які рабіў аналагічныя маім указанні і атрымаў такія ж адказы.

22.12.26 г. (А. Мітлін) чл. ВКП(б) пб. № 460023

Цэнтр. Кам. Клуб ім. К. Маркса.

НАРБ. Ф. 4. Воп. 21. Спр. 108. Арк. 93–94.

*Прадмова, падрыхтоўка да друку Ірыны Раманавай**

*Ірына Раманавай – гісторыя. З'яўляецца гісторыяй Беларусі 1920–1930 гадоў, спэцыялізуецца на ўзаемаадносінах грамадзтва і савецкай улады, а таксама гісторыі паўсядзённасьці, вуснай гісторыі. Апошнія публікацыі – артыкулы «Голад 1932–1934 гг. і Беларусь» (Спадчына. 2003/№ 1) і «Паўсядзённае жыцьцё Менску ў 1918–1938

гадах» (разам з У. Ляхоўскім: Спадчына. 2003/№ 2).

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/05
[image]

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

Андрэй Хадановіч Уладзімер Караткевіч і філязофскі камень

чалавек шырокай натуры. Паэт, перакладчык (з французскай, украінскай, польскай), літаратуразнаўца. Першая кніжка яго паэзіі («Лісти з-під ковдри» (Київ: Факт, 2002) пабачыла сьвет не ў арыгінале, а ва украінскім перакладзе. Цікава, што і апошняя на сёньня паэтычная кніга

Неяк мне здарылася браць удзел у міжнароднай літаратурнай імпрэзе. Аднаму зь яе галоўных герояў, майму ўкраінскаму раўналетку Сяргію Жадану, задалі пытаньне пра тое, ці былі ў яго калісьці сапраўдныя чытацкія ўзрушэньні. Жадан ўзяўся апавядаць пра адну са сваіх, як ён выразіўся, наймацнейшых дзіцячых фрустрацыяў. Калі найцудоўнейшай падзеяй яго дзяцінства стаў выхад на расейскай мове першага тому «Валадара пярсьцёнкаў» Толкіена, то найвялікшым «абломам», адпаведна, – адсутнасьць другога й трэцяга тамоў, якія не былі тады ў Савецкім Саюзе перакладзеныя й выдадзеныя. Такім чынам, цэлы «дзівосны новы сьвет», у які толькі ўступаў украінскі падлетак, ізноў быў для яго зачынены. Прайшлі гады, працяг, канечне, зьявіўся – але гэта была ўжо іншая эпоха дый іншы Жадан, а таму й зусім іншая кніга. Другі раз цуду не адбылося.

А я задумаўся, ці змог бы апавесьці аналягічную ці, прынамсі, у нечым падобную гісторыю, і зразумеў, што змог бы. Больш за тое, у маім выпадку яна мела значна шчасьлівейшы фінал, і цуд у ёй здараўся двойчы.

Ішоў 1989 год. Мне было 16. Я разгарнуў толькі што Хадановіча, надрукаваны чацьверты том васьмітомніка Ўладзімера Караткевіча зь першай часткаю раману «Каласы пад сярпом тваім». Уражаньне было неймавернае. Я страціў пачуцьцё часу й апрытомнеў адно цалкам праглынуўшы томік. Але тут усё й скончылася. Пятага тому з працягам гісторыі трэ было чакаць і чакаць. Я не даўмеўся тады знайсьці іншае выданьне Караткевіча, а таму некалькі месяцаў жыў у прадчуваньні сьвята. Якое пэўнага дня й напаткала мяне ў менскай кнігарні на вуліцы Енісейскай, цалкам узнагародзіўшы за чаканьне… Мабыць, з такой нецярплівасьцю сёньняшнія дзеткі чакаюць чарговых кніжак пра Гары Потэра, а таксама іх экранізацыяў, вось у маім жыцьці такіх чаканьняў цуду больш, на жаль, не здаралася ніколі[1].

Паспрабую вытлумачыць асацыяцыю Караткевіч–Толкіен. Гаворка пра стварэньне новых мастацкіх сусьветаў. Жыцьцяздольных сусьветаў, якія ў выніку робяцца нечым большым, чым проста літаратурнай фікцыяй, ушчэнт абвяргаючы тэзу Арыстотэля пра мастацтва, якое ёсьць толькі мімэзісам, толькі перайманьнем прыроды.

Некалі Францішак Багушэвіч прыдумаў Беларусь, своечасова выдудзеў яе ў сваю магічную дудку. Выклікаў Беларусь да жыцьця, адгадаўшы яе імя й назваўшы па імені. Намацаўшы сутнасныя характарыстыкі беларускага героя. Такім гэты герой, відаць, быў – і такім застаўся ў нашым пісьменстве вось ужо на стагодзьдзе: панам сахі і касы; дурным, як варона; з крыўдаю на руках у крыві, на нагах у лапцёх… Нездарма дзеткі, дагэтуль вывучаючы ўсё гэта ў школе на памяць, ня хочуць быць такімі беларусамі й жыць у такой краіне.

Але існуе й суцэльна іншая Беларусь. Віртуальная краіна, найхутчэй, ніколі й не існавала. Але гэта краіна, у якой хочацца пажыць, грамадзянства ў якой хочацца дамагчыся. Ідэальная Беларусь Уладзімера Караткевіча, населеная шляхетнымі рыцарамі, сымпатычнымі прайдзісьветамі, выпівахамі й вылівахамі, мужнымі патрыётамі, нацыянальнымі сьвядомымі арыстакратамі з паэтычнымі здольнасьцямі. Няма чаго дзівіцца, што ўжо чарговае пакаленьне маладых беларусаў

[1] Пішу гэта ў 2005 год, калі чацьвёртая частка «Каласоў» яшчэ не выйшла.

займае чаргу па візу ў гэтую краіну.

Краіну, якая стала радзімай такога ж віртуальнага народу, як, скажам, эльфы альбо, хутчэй, хобіты – ізноў паралель з Толкіенам абсалютна дарэчная. Народу, што, як і хобіты, вынік з рамантычнай веры ў чалавека, з наіўнага й мудрага перакананьня аўтара ў тым, што якім бы вялікім і трагічным ні выглядаў сусьвет, якімі б малымі й бездапаможнымі ні выглядалі мы ў ім, аднак ад нас усё адно шмат чаго залежыць. Нават ад хобітаў. Нават ад беларусаў.

Ня варта зьдзіўляцца, што я параўноўваю рэальную нацыю з плёнам пісьменьніцкай фантазіі, а пачынальніка жанру фэнтэзі – з, здавалася б, аўтарам гістарычных раманаў. Фантазіі маюць уласьцівасьць зьдзяйсьняцца – нездарма ж, калі верыць показкам, вялікая колькасьць «талкіенутых» на пытаньне пра нацыянальнасьць адказвае «эльф». Што ж да беларускага фэнтэзі, то дыскусіі пра неабходнасьць яго стварэньня значна прыпазьніліся. Беларускае фэнтэзі даўно існуе. Яго стваральнік – Уладзімер Караткевіч. З адным вельмі важным удакладненьнем.

Сутнасная розьніца паміж Караткевічам і яго ангельскім калегам ёсьць. Шчыры хрысьціянін, Толкіен сьціпла ўхіліўся ад спаборніцтва з Творцам на зямлі, прыдумаўшы паралельную тэрыторыю са сваімі мапамі й сваімі мовамі – туды цяпер масава ўцякаюць навасьпечаныя «эльфы», аматары так званых ролевых гульняў. Караткевіч жа дзёрзка й блюзьнерча паставіў магічны экспэрымэнт проста ў краіне, якую меў пад рукой, – і экспэрымэнт аказаўся пасьпяховым. Зямля «пад белымі крыламі» караткевічаўскай магіі нарэшце зьявілася на палітычнай мапе сьвету, а мова чым далей, тым болей пачала нагадваць фэнтэзійна-эльфійскую: сярод яе носьбітаў усё меней беларусаў Багушэвіча і ўсё болей гарадзкіх інтэлектуалаў, якія на дзіва падобныя да герояў Караткевіча.

Я ведаў і ведаю рафінаваных снобаў, якія цярпець не маглі й ня могуць тэкстаў Караткевіча, называючы іх то плягіятам, то безгустоўшчынай. Напраўду, нескладана заўважыць, дзе наш аўтар «пакарыстаўся» творчасьцю папярэднікаў. Скажам, верш «Калі паміраюць…» падазрона нагадвае Веліміра Хлебнікава,

аддалена падобнае: мне захацелася прысьпешыць зьяўленьне працягу. Гаворка пра два найнавейшыя раманы Людмілы Рублеўскай, адзін зь якіх па частках друкаваўся, а другі цяпер друкуецца ў часопісе «Дзеяслоў». Што ж, нарэшце караткевічаўскія традыцыі ў рамане працягваюцца ня толькі фармальна, але й сутнасна.

колькі сцэнаў з «Каласоў…» занадта блізка перагукаюцца з талстоўскімі, Балотныя Яліны раз-пораз так і цягне назваць Баскервіль-Холам, а прагляд фільму Бэргмана «Сёмая пячатка» са знакамітаю шахматнай партыяй са Сьмерцю можа падпсаваць настрой не аднаму аматару «Ладзьдзі Роспачы». Але ўвесь фокус у тым, што ў швэдзкага рэжысэра чалавек, як яму й належыць, прайграе, тады як у Караткевіча здараецца немагчымае, здараецца цуд, здараецца яўнае махлярства – і перамога. А пераможцаў, як вядома, ня судзяць – і чытачы ў захапленьні. Так і з караткевічаўскім плягіятам.

Абвінавачаньне ў безгустоўшчыне, на першы погляд, не такое й беспадстаўнае. Бо эпоха сур'ёзнай мітатворчасьці й выкліканьня да жыцьця цэлых краінаў і нацыяў, здавалася б, мінула разам з В. Скотам і г. Сянкевічам. Таму й мастацкі арсэнал рамантыкаў і пазытывістаў XIX ст. выглядае крыху анахранічна. Лякалізаваўшы сваё «Міжзем'е» на тэрыторыі рэальнай Беларусі, Караткевіч апынуўся на самай мяжы літаратурнага кічу, на якой удала балянсуе, але часам і зрываецца: *«Гэта наляцела, як навала, і слабы чалавек ня вытрымаў. Усё зьлілося, закруцілася ў чырвоным кругавароце, і яна даравала мне нават боль…»* – такое ў XX ст. можа належаць адно масавай літаратуры, папяровым сэрыялам – альбо постмадэрнісцкай іроніі.

Што ўжо казаць пра тое, як лёгка сапсаваць Караткевіча ў перакладзе, кампрамэтуючы «нашае ўсё» ў вачах замежнікаў. «Дубовый язык!» – ня вытрымаў «Дзікага паляваньня…» па-расейску мой знаёмы, пажылы габрэй, выхаваны на Джойсу, Музылю й Борхэсу. Яшчэ безнадзейней выглядаюць справы з экранізацыямі. Нядаўняя спроба паказаць фільм Рубінчыка, які за савецкім часам меў рэпутацыю «востраасюжэтнага» й ледзь ня «фільму жахаў», у дзіцячым летніку навучэнцам старэйшых клясаў добрых, дарэчы, гомельскіх школ скончылася тым, што да канца са 150 чалавек даседзелі два. Адным зь іх быў я. (Лішне казаць, што «Валадар пярсьцёнкаў» дэманстраваўся ў гэтым летніку з аншлягам.)

Чаму церпяць фіяска ўсе гэтыя экранізацыі, перайманьні, насьледаваньні? У чым прычына таго, што немагчыма

паўтарыць караткевічаўскага цуду ў ім самім зададзенай сыстэме мастацкіх каардынатаў? У самой сыстэме каардынатаў, якая парадаксальным чынам не пасуе нікому, апроч Караткевіча. Яшчэ раз нагадаю розьніцу паміж ім і Толкіенам: легендарны Прафэсар, прыдумляючы свой сьвет, не канкураваў з Творцам на Ягонай тэрыторыі. Што да Караткевіча, зьвярніце ўвагу, зь якой лёгкасьцю ён парушае запаведзь і марна згадвае Божае імя. То павешаныя 1864 г. ім параўноўваюцца са сьцягам волі, «якога й Богу нельга зьняць», то ў яго «на Беларусі Бог жыве», то «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», то сам лірычны герой аказваецца літаральна ўкрыжаваным «за ўсіх двуногіх». Перад намі чыста рамантычны комплекс творцы-дэміюрга, які, да таго ж, не задаволены роляй «намесьніка» й «пасярэдніка», а проста займае месца Творцы – у створаным самім сабою сьвеце. Аднак жа жыцьцяздольнасьць прыдуманага творцам сусьвету наўпрост прапарцыйная яго любові да свайго твору. І тут ужо – альбо звышчалавечая мера любові, альбо ўся сыстэма развальваецца, як картачны дамок.

Што й казаць, сытуацыя амаль безнадзейная, але хто ведае, можа, мы й атрымаем новую вэрсію міту пра Пігмаліёна, толькі ў якасьці канчаткова ажылай Галятэі выступіць цэлая ідэалізаваная краіна, ня кажучы ўжо пра яе мову й літаратуру. Прынамсі, літаратурная ноч, што заканамерна прыйшла на зьмену ўсім «прыцемкам» эўрапейскай культуры, яшчэ доўга не пагражае нам, запарукаю чаму апісаная тут шчасьлівая здольнасьць беларускага альхіміка ўсё, да чаго ён зь любоўю дакранаўся, ператвараць у золата. У блакіт і золата дня.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/05
[image]

Мінарыя (9’2000)

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]2006

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • эсэістыка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК

Андрэй Катлярчук Падарожжа ў сэрца Літвы

шматгадовы аўтар «ARCHE». Супрацоўнік стакгольмскага ўнівэрсытэту Södertörn.

20 кастрычніка 2005 г. надышлі 350-я ўгодкі Кейданскай уніі ВКЛ з Швэцыяй, вывучэньню якой я аддаў пяць гадоў свайго жыцьця. На жаль, мае спробы арганізаваць чытаньні з гэтай нагоды ў Менску скончыліся нічым. Літоўскія калегі, наадварот, адгукнуліся на маю прапанову. 18 лістапада я прыехаў у Кейданы (Kėdainiai), дзе ў рамках гарадзкога сьвята, прысьвечанага уніі з Швэцыяй, мусіла адбыцца канфэрэнцыя «Літва: Ад Кейданскай да Эўрапейскай уніі». Места знаходзіцца далёка ад мяжы Беларусі, у самым цэнтры сучаснай Літвы (за 7 км ад Кейданаў стаіць знак геаграфічнага цэнтру краіны).

Як і з большасьцю нашых мястэчкаў, «залаты век» Кейданаў даўно мінуў. Сёньня гэта правінцыйны цэнтар раёну з насельніцтвам 34 тысячы чалавек. Але калісьці Кейданы гулі на ўсё Княства. Росквіт Кейданаў наўпрост зьвязаны з імёнамі Крыштафа II ды ягонага сына, ваяводы віленскага і гетмана вялікага Януша Радзівіла (1611–1655). Радзівілы вырашылі зрабіць з Кейданаў пратэстанцкую сталіцу Жамойці (тое самае ў Беларусі яны спрабавалі зрабіць з Слуцкам). Каб «падняць» мястэчка ды злучыць яго зь міжнародным рынкам, быў зьдзейсьнены кардынальны крок: у Кейданы запрасілі шкотаў-кальвіністаў, якія ў той час масава ўцякалі зь Вялікабрытаніі.

Адным з такіх шкотаў быў будучы прафэсар Лейдэнскага ўнівэрсытэту і апякун беларускіх студэнтаў-пратэстантаў у гэтай навучальнай установе Джон Джонстан. У 1633 г. у Амстэрдаме ён выдаў працу «Thaumatographia naturalis», якая да XVIII ст. лічылася найлепшым эўрапейскім падручнікам з натуральных навук. Кніга была прысьвечана фундатарам выданьня Багуславу і Янушу Радзівілам.

Шкоты пабудавалі ў Кейданах цэнтар места, рынкі, паставілі шыкоўныя палацы і два кальвінскія зборы. Але галоўнае: шкоты зьвязалі Кейданы з рынкамі Караляўца, Стакгольму і Гамбургу. Як вынік, літаральна за 25 гадоў Кейданы зь мястэчка пераўтварыліся ў заможны горад з 5 тысячамі насельніцтва і шасьцю рынкамі, у якім працавала каля 300 цэхавых рамесьнікаў. У 1653 г. Януш Радзівіл надаў Кейданам магдэбурскае права. Сябрамі магістрату мелі права абірацца прадстаўнікі ўсіх шасьці (!) этнічных групаў: літоўцы, шкоты, палякі, русіны-беларусы, жыды і немцы.

Адкуль узялася ў Кейданах беларуская калёнія? Гісторыя прысутнасьці нашых продкаў у глыбі Жамойці наўпрост зьвязана з шлюбам у 1645 г. Януша Радзівіла з дачкой гаспадара Малдовы праваслаўнай прынцэсай Марыяй Лупу. Гэты шлюб зрабіў Януша Радзівіла (дарэчы, унука Канстанціна II Астроскага) галоўным пратэктарам праваслаўнай беларускай царквы. У 1-й палове XVII ст. кальвіністы Януш і Багуслаў Радзівілы зрабілі каля 50 фундацыяў на карысьць праваслаўнай царквы, і гэта ў самыя цяжкія часы яе барацьбы з уніяй. Пасьля шлюбу да кейданскага двара Марыі і Януша Радзівілаў пацягнулася праваслаўная беларуская шляхта. За ёю – купцы і манахі. Як вынік, на 1654 г. у горадзе былі дзьве праваслаўныя царквы і манастыр.

Сёньня прысутнасьць беларусаў у гарадзкім ляндшафце незаўважная. На месцы манастыра стаіць каменная расейская царква XIX ст. Драўляную беларускую царкву XVII ст. разабралі ды завезьлі ў скансэн, дзе яна дагэтуль ляжыць занядбаная.

З вуліцаў сучасных Кейданаў зьнікла разнастайнасьць моваў на карысьць адной літоўскай. Але зьніклыя народы пакінулі свой сьлед у гарадзкіх краявідах. На цэнтральнай плошчы стаяць

цудоўныя палацы ў амстэрдамскім стылі. Акурат Галяндыя была культурнай Мэкай кальвіністаў усёй Эўропы ад гугенотаў Францыі да эвангелікаў Беларусі. Насупраць палацаў кальвінскі збор, пабудаваны ў 1652 г., – самы вялікі храм гэтага тыпу ўва ўсёй былой Рэчы Паспалітай. Побач вялікія дамы прапаведнікаў. Тутэйшыя кальвіністы моцна спрачаліся ў XVII–XVIII стст. наконт чаргі ў парадку службаў, бо кожны дзень набажэнства ішло на трох мовах: ангельскай, літоўскай і польскай. Падобная сытуацыя існавала ў нашым Слуцку, дзе кальвінская служба гучала па-польску, па-беларуску і па-ангельску (для калёніі тамтэйшых шкотаў). Дарэчы, які сюжэт для пісьменьнікаў: шкоты ў ВКЛ ды ангельская мова ў нашых храмах.

[image] Кальвінскі збор Кейданаў уражвае сваёй веліччу, цішынёй, захаванасьцю інвэнтара. Цяжка ўявіць, што за савецкім часам у храме была баскетбольная заля. Акурат тут рыхтавалі чэмпіёнаў. Але падчас адной з трэніровак падлога збору абрынулася, шмат моладзі пакалечылася. Пад падлогай адкрыліся забытыя ўсімі саркафагі Радзівілаў. Большасьць касьцей павыкідалі, але найбольш багатыя труны пакінулі турыстам. Сёньня фамільны маўзалей кальвінскай галіны Радзівілаў у сутарэньнях збору адкрыты. У каштоўных дамавінах ляжаць Януш Радзівіл, ягоны бацька Крыштаф II, іх жонкі і дзеці. Хоць пратэстанты ВКЛ выпрацавалі адрозны ад каталіцкага вонкавы дэкор з расьлінным арнамэнтам, дамавіна Януша Радзівіла зроблена ў стылі «каталіцкага барока» і аналягічная труне караля Ўладзіслава IV Вазы, якая знаходзіцца на Вавэлі ў Кракаве. Лічыцца, што яе замовіў нехта з каталіцкіх суродзічаў першай жонкі Януша. Як вядома, Януш Радзівіл нечакана памёр у навагоднюю ноч 1655/56 гг. у сваім замку Тыкоцін. Ён належаў Радзівілам і быў выспай ВКЛ на землях Польшчы. Сьмерць гетмана паставіла крыж на уніі Швэцыі з ВКЛ.

Швэдзкія сэнатары лічылі, што Януша атруцілі езуіты. Тое самае напісаў у сваім дзёньніку менскі кальвініст Ян Цадроўскі, які ў той год хаваўся ад расейцаў на абшарах швэдзкай зоны акупацыі Літвы. Згодна Цадроўскаму, на скуры нябожчыка-гетмана выступілі плямы, што былі першай

прыкметай атруты. У 1656 г. падчас сумеснага з швэдамі наступу на Берасьце Багуслаў Радзівіл перавёз цела свайго дзядзькі ў Сялец. Мала хто ведае, што гэтае палескае мястэчка (сёньня вёска ў Бярозаўскім раёне) было значным цэнтрам Рэфармацыі. Тутэйшы кальвінскі збор зачыніла царская ўлада ў 1839 г., калі разам з уніятамі ўрад перавёў у маскоўскае праваслаўе рэшту беларусаў-пратэстантаў.

Толькі ў 1675 г. труна зь Янушам Радзівілам была перавезеная зь Сялецкага збору на ягоную бацькаўшчыну – у Кейданы. Стоячы ля труны Януша Радзівіла, я падумаў пра тое, дзе ляжаць іншыя нашы героі. Дзе магілы Францішка Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Яна Хадкевіча? Рытарычнае пытаньне, на якое сяроднестатыстычны беларус, пазяхаючы, адкажа: «Час не пашкадаваў помнікаў!» Але нацыя, што ня ведае магілаў сваіх герояў, ня годная павагі.

[image]
Гэтую тэму аднойчы мы абмяркоўвалі зь Міколам Нікалаевым. Той зазначыў, што ягонае найбольшае ўражаньне ад Японіі – гэта магілы яе імпэратараў. Японцы захавалі *ўсе магілы ўсіх сваіх каралёў*, пачынаючы з VI ст. Чамусьці адразу прыгадаўся лёс Багуслава Радзівіла – аднаго з самых вялікіх дзеячаў нашай гісторыі, не ацэненага нашчадкамі. Акурат Багуслаў зрабіў з правінцыйнага Слуцку квітнеючае места з 7000 насельніцтва, надаў гораду магдэбурскае права, заахвоціў пасяліцца шкотаў. Пабудаваў у горадзе будынак першакляснай рэфармацкай гімназіі, што дзейнічала да 1914 г., бібліятэку, дзе захоўваўся Радзівілаўскі летапіс, друкарню, два кальвінскія і адзін лютаранскі зборы, уфундаваў праваслаўны шпіталь і манастыр. У 1654 г., напярэдадні маскоўскай навалы, шкот Вільям Патэрсан пабудаваў вакол слуцкага замку галяндзкія бастыёны. У выніку Слуцак стаўся адзіным горадам Беларусі, які ў часе войнаў сярэдзіны XVII ст. не захапіла ніводнае чужынскае войска. Горад даў паратунак шматлікім шляхецкім сем'ям з Рэчыцкага і Мазырскага паветаў, жыдом з Усходняй Беларусі. Невыпадкова ў канцы XVII ст. Слуцак пераўтварыўся ў найбуйнейшы культурны цэнтар Беларусі – пратэстанцкую сталіцу, другі пасьля Магілёва цэнтар праваслаўя, сталіцу габрэйскага Ваада Літвы. А пасьля падзелаў Рэчы Паспалітай

Слуцак разглядаўся расейцамі як магчымы будучы адміністрацыйны цэнтар Беларусі.

Праз супрацоўніцтва з Швэцыяй Багуслаў Радзівіл скончыў сваё жыццё на чужыне. Памёр ён у 1669 г., будучы губэрнатарам Прусіі, і пахаваны ў Караляўцы. Ягоная магіла была зьнішчаная ў 1945 г. падчас штурму Кёнігсбэргу савецкімі войскамі. Каштоўны Радзівілаўскі летапіс яшчэ раней, у 1767 г., падчас сямігадовай вайны, быў вывезены расейцамі ў Пецярбург. Але Слуцак захаваў свой беларускі дух. Пратэстанцтва і беларуская традыцыя праваслаўя спрыялі ўмацаваньню нацыянальнай сьвядомасьці яго жыхароў. Няма досьледаў аб ролі ў беларускім адраджэньні выхаванцаў Слуцкай гімназіі, як і наагул пратэстантаў, але вядома, што гэтую гімназію скончылі Альгерд Абуховіч і «айцец БССР» Язэп Дыла. Зусім не выпадкова ў 1920 г. акурат Слуцак стаў цэнтрам збройнага чыну. Цяпер пабудаванае калісьці Радзівілам места страціла свае зборы і замкі, таму каб уявіць сабе старажытны Слуцак, трэба ехаць у Кейданы.

Габрэйскі квартал Кейданаў упрыгожваюць дзьве сынагогі – «белая» і «жоўтая». Яны стаяць адна каля другой, бо кошт зямлі ў цэнтры места быў шалёны. Калісьці паміж мурамі сынагог была арка зь вялікім сонечным гадзіньнікам і лічбамі па-габрэйску. Зроблена было для таго, каб толькі жыды маглі кантраляваць вымярэньне часу. Няма сёньня ў Кейданах габрэяў, іх смачнай ежы і сакавітай гаворкі. Галакост зрабіў сваю страшную справу. Але будынкі сынагог адрэстаўраваныя ў незалежнай Літве і выкарыстоўваюцца пад канфэрэнц-залю. Направа ад сынагог на гары я адведаў лютаранскі збор XVII ст., пастар якога Арвідас Маліна вольна гаворыць па-ангельску.

Сучасная Літва адбудавала рэфармацкую гімназію, блізьнячку слуцкай. Тут з 1625 да 1824 г. вучыліся студэнты-пратэстанты з этнічна літоўскай часткі ВКЛ. У адрозьненьне ад езуіцкіх калегіюмаў, дзе націск рабіўся на лацінскую мову, літаратуру і тэалёгію, дзьве пратэстанцкія гімназіі давалі на той час, так бы мовіць, «сучасную адукацыю». У праграме навучаньня штодзень стаяла нямецкая мова, якая дазваляла студэнтам з ВКЛ працягваць навучаньне ў найлепшых унівэрсытэтах Заходняй

Эўропы. Вывучаліся таксама ангельская і французская мовы, гісторыя, права. Кейданская гімназія была зачынена царскімі ўладамі ў 1824 г. за тайнае студэнцкае таварыства.

Адноўленая літоўская дзяржава ўклала ў рэканструкцыю 2,5 млн даляраў. Адчыняў школу сам прэзыдэнт Валдас Адамкус. Вялікі гімназійны будынак нагадаў мне старажытны корпус Віленскага ўнівэрсытэту – такі самы ўнутраны дворык, рэшты каналізацыйнай сыстэмы XVII ст., сутарэньні, дзе сёньня пакоі выкладчыкаў.

Думаю, што для працьверазеньня Кейданы абавязкова мусяць адведаць прыхільнікі аматарскай канцэпцыі Міколы Ермаловіча – «беларускай дзяржавы ВКЛ». Для іх будзе карысна агледзець у музэі кнігі, друкаваныя ў XVII ст. у Кейданах «на літоўскай мове», мясцовыя земскія акты на гэтай жа мове. Пагартаць панэгірык, што надрукаваў на літоўскай мове Янушу Радзівілу ў 1653 г. тутэйшы бурмістар кальвініст Сьцяпонас Цялега. Гэты заможны купец быў таксама знаным вучоным, выхаванцам Кёнігсбэрскага ўнівэрсытэту. У сваім панэгірыку Цялега дзякуе Радзівілу за ягоную падтрымку друку «на роднай літоўскай мове». Так, панове, ня жмудзкай, а літоўскай. Вядома, што Януш Радзівіл валодаў літоўскай мовай. Падчас вайны ва Ўкраіне супраць казакаў ён на гэтай мове, як індзейцы Наваха на службе выведкі ЗША, пісаў свае загады войску ВКЛ.

Удасканаляць Кейданы і веды гістарычнай геаграфіі. Горад месьціцца не ў Жамойці, як лічыцца беларускімі гісторыкамі, а падзяляецца ракой Нявежай на гістарычныя літоўскую і жамойцкую часткі. Да таго ж межы гістарычнага Жамойцкага старостваў не супадаюць зь межамі жамойцкага дыялекту, які пачынаецца далёка на поўнач ад Кейданаў. Гэта значыць, што ў Кейданах гавораць «па-літоўску», таксама як і ў іншых паветах гістарычнай і этнічнай Літвы (Коўна, Вількамір, Упіты, Панявежыс, Паўночная Віленшчына). Тым ня менш, у ваколіцах Кейданаў па шляхецкіх засьценках і вёсках шмат вякоў гаварылі па-польску. Кажуць, што літоўскія ўраднікі ў 1920-х гг. езьдзілі па вёсках толькі зь перакладчыкам, бо былі мясьціны, дзе яны зусім не разумелі літоўскай мовы. У адным з такіх засьценкаў Шатэняй пад самымі Кейданамі нарадзіўся ў

1911 г. нобэлеўскі ляўрэат Чэслаў Мілаш, які пісаў па-польску і слаба гаварыў па-літоўску. Сёньня на яго радзіме – сядзіба-музэй. Цікава, на якой мове пісаў бы Мілаш, калі б ён нарадзіўся на дзесяць гадоў пазьней?

Шмат цікавага можна ўбачыць у ваколіцах Кейданаў. Да прыкладу, самы высокі ў Літве татарскі мінарэт, мэблю з палацу Забелаў, цалкам зробленую з рагоў дзікіх жывёлаў. Палац Сьвірскіх (тых самых князёў зь беларускага Сьвіра) ды палац Шылінгаў зь сьценамі, дэкаравanымі мядзяным посудам.

Чытаньні, прысьвечаныя Кейданскай уніі 1655 г., прайшлі. Было цікава пачуць Гокана Норманда з Швэцыі, які давёў, што швэдзкія гісторыкі XVII ст. лічылі жамойтаў (samogoter) сваімі суродзічамі – нашчадкамі готаў. Гэты факт быў скарыстаны ў часе вайны 1655–1660 гг. у швэдзкай прапагандзе з мэтай абгрунтаваньня свайго права на Жамойць. Найбольш цікавай тэмай дыскусіі сталі гіпатэтычныя варыянты разьвіцьця ВКЛ у складзе Швэдзкай імпэрыі. Было адзначана, што толькі дзякуючы Кейданскай уніі ВКЛ захавалася на мапе Эўропы і ня зьнікла, як Украінскі гетманат, ужо ў сярэдзіне XVII ст.

Нашы суседзі латышы ўсяго 80 гадоў (1629–1710) былі ў складзе швэдзкай дзяржавы. Але за гэты час швэдзкі ўрад правёў аграрную рэформу, якая палепшыла стан сялянаў, заснаваў унівэрсытэт, заклаў сыстэму народнай адукацыі, спрыяў разьвіцьцю латыскай літаратуры, надрукаваў вялікім накладам Біблію на латыскай мове, праз выхаваньне настаўнікаў і пастараў стварыў першую ў гісторыі латыскую эліту. Як вынік – спынілася германізацыя латыскага этнасу, быў закладзены падмурак для посьпеху мадэрнага нацыянальнага руху. Магчыма, каб Беларусь і Літва зазналі ў XVII ст. швэдзкі пэрыяд, мадэрныя нацыянальныя рухі абодвух народаў былога ВКЛ не сутыкнуліся б з такой цяжкай праблемай, як суцэльная асыміляцыя (палянізацыя/русіфікацыя) адукаванай эліты ў XVIII–XIX стст.

[image] Скончылася кейданскае сьвята адкрыцьцём помніка Янушу Радзівілу. Раніцай чакала дарога назад у «крывіцкую Мэку» празь мястэчка зь вялікай мураванай царквой. Гэта быў Вэвіс-Еўе – мястэчка, дзе колісь пад патранатам Агінскіх

квітнела праваслаўнае брацтва і працавала наша друкарня.

Нядзельная Вільня сустрэла абсалютнай цішынёй, «на двары ні машын, ні людзей», як сьпяваў некалі гурт «Сябры». Каралеўскі палац амаль што ўжо адбудаваны коштам дзяржавы. У лютаранскім зборы ішла кальвінская служба. Пастар Шарнаш у інваліднай калясцы выявіўся знаным змагаром за незалежнасьць сваёй краіны. У 1991 г. ён быў адным з тых літоўскіх памежнікаў, якія ўсталёўвалі літоўскія пасты на адміністрацыйнай мяжы Літвы з СССР/БССР. У адказ байцы рыскага АМАПу ў ліпеньскую ноч 1991 г. стрэламі ў голаў забілі сямёх зь іх. Восьмы цудам выжыў і стаў служыць Богу.

У малюсенькім Віленскім аэрапорце было ажно тры вечаровыя рэйсы на Капэнгаген і два на Стакгольм. Гэтая частка ВКЛ ужо ў Эўропе.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/12
[image]

[image] (ў 2000)

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image] [image] 2006

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image] **ГАРАЛД ПІНТЭР**

Гаралд Пінтэр Каханак

ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ

Рычард.

Сара.

Джон.

Лета. Дом паблізу ад Віндзору.

Сцэна падзеленая на дзьве часткі. Справа – гасьцёўня з маленькім холам, у цэнтры – уваходныя дзьверы. Зьлева – спачывальня з бальконам. Да дзьвярэй у спачывальню вядзе невысокая лесьвіца на адзін пралёт. У глыбіні сцэны справа ад гасьцёўні – кухня. Каля левай сьцяны, па цэнтры сцэны – стол з аксамітным абрусам, які дастае да падлогі. У холе – убудаваная шафа. Мэбля ўтульная і зручная, падабраная з густам.

Раніца. У гасьцёўні Сара выкідае попел з папяльнічак, сьцірае зь іх пыл. На ёй сьвежая сьціплая сукенка. Зьлева, з купальні, у спачывальні зьяўляецца Рычард, ідзе ў хол, бярэ з шафы кейс, падыходзіць да Сары, цалуе яе ў шчаку. Нейкае імгненьне з усьмешкай глядзіць на жонку. Яна ўсьміхаецца ў адказ.

Рычард *(добразычліва, па-сяброўску)*. А твой каханак сёньня прыйдзе?

Сара. Э-э-м-м.

Рычард. А каторай гадзіне?

Сара. А трэцяй.

Рычард. Вы пойдзеце куды-небудзь… ці… застаняцеся тут?

Сара. Мабыць, пабудзем тут.
Рычард. А я думаў, ты хацела схадзіць на выставу…
Сара. Так… але сёньня мы зь ім лепей пасядзім дома.
Рычард. Э-э-м-м. Ну, я пайшоў.
Ідзе ў хол, апранае капялюш.
Рычард. Як ты думаеш, ён сёньня надоўга?
Сара. Э-э-м-м…
Рычард. Значыць, недзе да… шостай?
Сара. Так.
Рычард. Ну, жадаю прыемна пабавіць час.
Сара. Э-э-м-м.
Рычард. Пакуль.
Сара. Пакуль.
Ён адчыняе дзьверы і выходзіць. Яна працягвае сьціраць пыл. Згасае сьвятло. Раньні вечар. Сара з кухні зьяўляецца ў гасьцёўні. На ёй тая ж самая сукенка, але гэтым разам яна ў туфлях на шпільцы. Налівае сабе келіх, сядае ў шэзьлёнг, гартае часопіс. Гадзіньнік б'е шостую. У дзьверы заходзіць Рычард. Ён апрануты ў той жа строгі гарнітур, што і раніцай. Ставіць у холе кейс, ідзе ў гасьцёўню. Сара ўсьміхаецца яму і налівае віскі.
Сара. Прывітаньне.
Рычард. Прывітаньне.
Ён цалуе яе ў шчаку, бярэ келіх, падае ёй газэту і сядае зьлева ад яе. Яна сядзіць у шэзьлёнгу з газэтай у руках.
Рычард. Дзякуй.
Выпівае віскі, адкідваецца на сьпінку і задаволена ўздыхае.
Рычард. А-а-а-х.
Сара. Стаміўся?
Рычард. Крыху.
Сара. Складана было ехаць?
Рычард. Не, у прынцыпе, даехаў нармальна. Нават добра.
Сара. Файна.
Рычард. Дарога вельмі добрая.
Паўза.
Сара. Мне падалося, ты крышачку прыпазьніўся.
Рычард. Праўда?
Сара. Зусім крышачку.
Рычард. На мосьце трапіў у невялічкі затор.
Сара падымаецца, ідзе да століка з напоямі, бярэ свой келіх і зноў уладкоўваецца ў шэзьлёнгу.
Рычард. Ну, а ты як правяла дзень? Прыемна?
Сара. Э-э-м-м. Зранку зьезьдзіла за горад.

Рычард. Вось як? Сустрэла каго-небудзь?
Сара. Ды не. Проста паабедала.
Рычард. За горадам?
Сара. Так.
Рычард. І як там кормяць?
Сара. Даволі прыстойна.
Рычард. Ну, а пасьля абеду? Добра бавіла час?
Сара. О, проста цудоўна.
Рычард. Прыходзіў твой каханак, так?
Сара. Э-э-м-м. Так.
Рычард. Ты паказвала яму новыя ружы?
Лёгкая паўза.
Сара. Ружы?
Рычард. Так.
Сара. Не, не паказвала.
Рычард. А-а-а…
Сара. А што, трэба было?
Рычард. Ды не, проста, па-мойму, ты неяк казала, ён цікавіцца садоўніцтвам.
Сара. Э-э-м-м… Так.
Паўза.
Сара. Ну, ня тое каб надта…
Рычард. А-а-а…
Паўза.
Рычард. І вы ўвесь час былі дома ці куды-небудзь схадзілі?
Сара. Не, мы былі дома.
Рычард. Вось як. *(Глядзіць на жалюзі.)* Жалюзі неяк ня так навешаныя.
Сара. Але, трошкі крывавата.
Паўза.
Рычард. Сонца на дарозе моцна сьвяціла. Не, калі я выехаў, яно ўжо, вядома, пачало хавацца. Але, мабыць, удзень тут было вельмі цёпла. У Сіці стаяла сьпёка.
Сара. Праўда?
Рычард. Дыхаць немагчыма. Трэба думаць, усюды прыпякала.
Сара. Так, па-мойму, тэмпэратура даволі высокая.
Рычард. Гэта па радыё перадавалі?
Сара. Здаецца, так.
Лёгкая паўза.
Рычард. Яшчэ па адным перад вячэрай?

Сара. М-м-м…

Рычард налівае па кілішку сабе і Сары.

Рычард. Вы, бачу, апусьцілі жалюзі?

Сара. Так.

Рычард. Сонца сьвяціла неймаверна.

Сара. Проста жудасьць.

Рычард. Так, адно ў гэтым пакоі кепска: у сонечны дзень трапляе зашмат сьвятла. Вы не перайшлі ў іншы пакой?

Сара. Не, мы былі тут.

Рычард. Мусіць, пякло, як у пекле.

Сара. Таму мы і апусьцілі жалюзі.

Паўза.

Рычард. А як апусьціш жалюзі – адразу робіцца так горача.

Сара. Табе здаецца?

Рычард. А можа, і не. Можа, проста кроў кіпіць.

Сара. Так, хутчэй за ўсё.

Паўза.

Сара. А ты чым сёньня займаўся?

Рычард. Ды так, сустрэча… Размаўлялі доўга, але нічога канкрэтнага ня вырашылі.

Сара. Сёньня будзе халодная вячэра. Ты ня супраць?

Рычард. Не, ніколечкі.

Сара. Зусім ня мела часу гатаваць.

Ідзе на кухню.

Рычард. Дарэчы… Хацеў у цябе спытацца…

Сара. Я слухаю.

Рычард. Ты калі-небудзь задумляесься, што покуль ты мне здраджваеш, я сяджу за працоўным сталом, зьвяраю балянс, карпею над графікамі?

Сара. Дзіўнае пытаньне.

Рычард. Не, мне проста цікава.

Сара. Ты ніколі раней не пытаўся.

Рычард. Мне заўсёды хацелася ведаць.

Лёгкая паўза.

Сара. Ну, зразумела, у мяня зьяўляюцца такія думкі.

Рычард. Праўда?

Сара. Э-э-м-м…

Лёгкая паўза.

Рычард. І як табе гэта?
Сара. Надае яшчэ больш пікантнасьці.
Рычард. Сапраўды?
Сара. Вядома.
Рычард. То бок, ты хочаш сказаць, што калі ты зь ім… ты ўяўляеш мяне, як я сяджу за сталом, карпею над балянсам?
Сара. Толькі ў… пэўныя моманты.
Рычард. Зразумела.
Сара. Ня ўвесь час.
Рычард. Натуральна.
Сара. У асобныя хвіліны.
Рычард. Э-э-м-м… Але, прынамсі, ты не зусім мяне выкідаеш з памяці?
Сара. Ніякім чынам.
Рычард. Дзякуй табе вялікі.
Паўза.
Сара. Як жа я магу на цябе забыцца?
Рычард. Па-мойму, даволі лёгка.
Сара. Але ж я ў тваім доме.
Рычард. Зь іншым.
Сара. Але кахаю я цябе.
Рычард. Прабач, што ты сказала?
Сара. Але ўсё ж кахаю я цябе.
Паўза. Ён глядзіць на жонку, працягвае ёй келіх.
Рычард. Давай яшчэ крыху вып'ем.
Яна ідзе да століка. Ён адымае келіх, глядзіць на ейныя туфлі.
Рычард. Што гэта за туфлі?
Сара. Э-э-м-м?
Рычард. Туфлі. Я ніколі раней іх ня бачыў. Вельмі высокі абцас, праўда?
Сара *(ледзь ня шэптам)*. Я памылілася. Даруй.
Рычард *(не пачуўшы)*. Што-што? Прабач, што ты сказала?
Сара. Я… іх здыму.
Рычард. Па-мойму, ня самы зручны абутак, каб сядзець у ім увечары дома.
Сара ідзе ў хол, адчыняе шафу, ставіць туды туфлі на шпільцы, абувае туфлікі зь нізкім абцасам. Рычард падыходзіць да століка з напоямі, налівае сабе віскі. Сара спыняецца каля стала, запальвае цыгарэту.
Рычард. Значыць, сёньня ўдзень у цябе перад вачыма стаяў я? У офісе, за працоўным сталом?

Сара. Так, але вобраз быў нейкі расплывісты, ня надта пераканаўчы.
Рычард. А чаму?
Сара. Бо я ведала, што ты ня ў офісе, а са сваёй каханкай.
Паўза.
Рычард. Праўда?
Кароткая паўза.
Сара. Ты не згаладаўся?
Рычард. Я добра паабедаў.
Сара. Праўда?
Рычард падыходзіць да акна, спыняецца.
Рычард. Які прыхожы заход.
Сара. Хіба ты быў не ў яе?
Рычард *(паварочваецца і сьмяецца)*. Якая яшчэ каханка?
Сара. Ах, Рычард…
Рычард. Не-не, проста слова такое… састарэлае.
Сара. Няўжо?

Лёгкая паўза.
Сара. Я кажу табе ўсю праўду. Чаму ты ня хочаш быць са мной шчырым?
Рычард. У мяне няма каханкі. Я вельмі добра ведаю адну шлюху, але яна мне зусім не каханка. Гэта абсалютна розныя рэчы.
Сара. Шлюху?
Рычард *(бярэ аліўку)*. Але. Звычайная сучка, такіх хоць гаць гаці. Няма чаго пра яе і згадваць. Пакуль чакаеш электрычкі, і гэтая сыдзе.
Сара. Ты езьдзіш не на электрычцы, а на машыне.
Рычард. Так, праўда. Ну, замест какавы ў кавярні на запраўцы, пакуль мэханік праверыць аліва і тасол.
Паўза.
Сара. Паслухаць цябе, дык ты ёю страшэнна занудзіўся.
Рычард. Не, чаму ж…
Паўза.
Сара. Па праўдзе, я ніколі ня думала, што ты так лёгка прызнаесься.
Рычард. А што? Проста ты ніколі раней не казала пра гэта адкрыта. Шчырасьць любой цаной. Аснова здаровай сям'і, праўда?

Сара. Вядома.
Рычард. Ты згодная?
Сара. Абсалютна.
Рычард. То бок, ты са мною цалкам шчырая, так?
Сара. Дарэшты.
Рычард. Наконт свайго каханка. І я мушу адказваць табе тым жа.
Сара. Дзякуй.
Паўза.
Сара. Я штосьці такое падазравала.
Рычард. Праўда?
Сара. Э-э-м-м…
Рычард. Якая чуйнасьць.
Сара. Але, па шырасьці, нешта мне ня верыцца, быццам яна такая… як ты сказаў.
Рычард. Чаму?
Сара. Ну, гэта проста немагчыма. У цябе вельмі добры густ. Ты зьвяртаеш увагу на жанчын шляхетных, вытанчаных…
Рычард. І дасьціпных.
Сара. Так, і дасьціпных.
Рычард. Досьціп, з гледзішча мужчыны, – рэч надзвычай важная.
Сара. Яна дасьціпная?
Рычард *(сьмяецца)*. Ну як можна падыходзіць да яе з такою меркай? Разваж сама: нельга ўсур'ёз пытацца пра шлюху, ці яна дасьціпная. Якая розьніца? Гэта проста шлюха, абслуга, якая або прыносіць табе прыемнасьць, або не.
Сара. І табе зь ёю… прыемна?
Рычард. Сёньня – прыемна, а заўтра… Хто ведае?
Ён ідзе да дзьвярэй у спачывальню і здымае пінжак.
Сара. Трэба сказаць, мяне пачынае трывожыць тваё стаўленьне да жанчын.
Рычард. Чаму? Я не шукаў другой такой, як ты. Я не шукаў жанчыны, якую мог бы паважаць, як цябе, пялегаваць і кахаць, як цябе. Я ўсяго толькі шукаў… як бы гэта сказаць?.. нейкую істоту, увасабленьне жаданьня і спаталеньне жаданьня. І толькі.
Ён ідзе ў спачывальню, вешае ў шафу пінжак і абувае тапці.
Сара ў гасьцёўні ставіць на столік келіх і, крыху павагаўшыся, ідзе за мужам.
Сара. Мне цябе шкада – такі зусім не шляхетны раман…
Рычард. Для шляхетнасьці ў мяне ёсьць сям'я.

Сара. І без высокіх пачуццяў.
Рычард. І для высокіх пачуццяў таксама. Я ня гэтага шукаў. Дзеля гэтага ў мяне ёсьць ты.
Сара. Навошта ты тады ўвогуле кагосьці шукаў?

Лёгкая паўза.

Рычард. Што ты сказала?
Сара. Навошта ўвогуле… шукаць… на баку?
Рычард. Ну, дарагая мая… Ты ж шукала. Чаму мне нельга?
Паўза.
Сара. А хто першы пачаў?
Рычард. Ты.
Сара. Па-мойму, не.
Рычард. Тады хто?
Яна глядзіць на яго зь лёгкай усьмешкай.
Ноч. Балькон, заліты месяцовым сьвятлом.
Рычард у піжаме заходзіць у спачывальню. Бярэ кнігу, праглядае. З купальні ў начной сарочцы зьяўляецца Сара. Пасярод спачывальні – ложак на дваіх.
Сара сядае за туалетны столік, расчэсвае валасы.
Сара. Рычард!
Рычард. Э-э-м-м…
Сара. А ты ніколі ня думаеш пра мяне… калі ты зь ёю?
Рычард. Здараецца. Зрэдчас.
Паўза.
Рычард. Мы размаўляем пра цябе.
Сара. Ты размаўляеш пра мяне зь ёю?
Рычард. Калі-нікалі. Гэта яе забаўляе.
Сара. Забаўляе?
Рычард *(выбірае кнігу)*. Э-э-м-м…
Сара. І як жа вы… пра мяне размаўляеце?
Рычард. Далікатна. Як заводзяць старую музычную скарбонку. Можна паставіць, калі пажадаеш. Так прыемна ўзбуджае.
Паўза.
Сара. Ня буду прыкідвацца, нібыта гэтая карціна прыносіць мне вялікую асалоду.
Рычард. А яна на гэта і не разьлічаная. Асалоду атрымліваю я.
Сара. Так, вядома. Зразумела.
Рычард *(сядаючы на ложак)*. Пэўна, табе хапае ўласных паабедзенных радасьцяў. Няўжо табе трэба яшчэ і маіх?
Сара. Не-не, што ты!
Рычард. Тады нашто ўсе гэтыя пытаньні?

Сара. Ты сам пачаў… Так падрабязна распытваць пра… мяне зь ім. Гэта да цябе не падобна.
Рычард. З чыстай цікаўнасьці.
Дакранаецца да яе пляча.
Рычард. Ты ж ня хочаш сказаць, што я раўную?
Сара ўсьміхаецца, гладзіць яго па руцэ.
Сара. Мілы, я ведаю, што ты ніколі гэтак нізка не ўпадзеш.
Рычард. О Божа, зразумела, не.
Сьціскае яе плячо.
Рычард. А ты? Ты не раўнуеш?
Сара. Не. Мяркуючы па тым, што ты пра яе кажаш, я нашмат лепш за цябе баўлю час.
Рычард. Магчыма.
Рычард шырока расчыняе вокны, глядзіць на сад.
Рычард. Якая ціша. Хадзі сюды, паглядзі.
Сара падыходзіць да мужа. Яны моўчкі стаяць ля акна.
Рычард. Цікава, а што было б, калі б я аднойчы рана вярнуўся дадому?
Паўза.
Сара. Цікава, а што было б, калі б я аднойчы прасачыла за табою?
Паўза.
Рычард. Можа, як-небудзь пасядзім усе разам за горадам, гарбаты пап'ём?
Сара. Чаму за горадам? Чаму ня тут?
Рычард. Тут? Дзіўная прапанова.
Паўза.
Рычард. А твой каханак ніколі не глядзеў з гэтага акна ўначы?
Сара. Не, на жаль, ён мусіць сыходзіць да заходу сонца.
Рычард. І яму не надакучваюць гэтыя бясконцыя полудні? Я б звар'яцеў. Імбрык і малочнік – як нязьменны вобраз жарсьці. Напэўна, забівае ўсялякае жаданьне.
Сара. Ён вельмі лёгка да ўсяго прыстасоўваецца. І да таго ж калі апусьціць жалюзі, здаецца, што ўжо вечар.
Рычард. Так, праўда.
Паўза.
Рычард. А што ён думае пра твайго мужа?

Лёгкая паўза.
Сара. Ён цябе паважае.

Паўза.

Рычард. Дзіўна: я нават прыемна ўражаны. Здаецца, разумею, чым ён так табе падабаецца.

Сара. Ён вельмі-вельмі мілы.

Рычард. Э-э-м-м…

Сара. Не, вядома, і ён часам бывае не ў гуморы.

Рычард. З кім не здараецца?

Сара. Але, ведаеш, ён вельмі мяне кахае. Усё цела так і праменіць каханьнем.

Рычард. Аж млосна.

Сара. Не.

Рычард. Але ён хоць, спадзяюся, сапраўдны мужчына?

Сара. На ўсе сто.

Рычард. Ну і нудоцьце.

Сара. Няпраўда.

Паўза.

Сара. У яго выдатнае пачуцьцё гумару.

Рычард. Што ж, я рады. Значыць, вы часта сьмеяцеся? Толькі глядзіце, каб суседзі не пачулі. Плёткі нам зусім не патрэбныя.

Паўза.

Сара. Добра, што мы жывём адны, далёка ад дарогі, лічы, як самотнікі.

Рычард. Так, чыстая праўда.

Яны вяртаюцца ў спачывальню. Кладуцца ў ложак. Рычард бярэ кнігу, спрабуе чытаць, закрывае і адсоўвае.

Рычард. Абы-што нейкае.

Рычард выключае лямпу са свайго боку ложка, Сара – са свайго. Сьвеціць месяц.

Рычард. Ён жанаты, так?

Сара. Э-э-м-м…

Рычард. І шлюб шчасьлівы?

Сара. Э-э-м-м…

Паўза.

Сара. А ты шчасьлівы? Ты ж не раўнуеш мяне, праўда?

Рычард. Не, не раўную.

Сара. Выдатна. Па-мойму, Рычард, усё цудоўна складваецца.

Згасае сьвятло.

Раніца. Сара ў спачывальні апранае пэньюар, бярэцца засьцілаць ложак.

Сара. Мілы!

Паўза.

Сара. А садовыя нажніцы сёньня будуць гатовыя?
Рычард *(з купальні)*. Што?
Сара. Нажніцы.
Рычард. Не, ня сёньня.
Апрануты ў гарнітур, Рычард заходзіць у спачывальню. Цалуе Сару ў шчаку.
Рычард. Пачакай да пятніцы.
Ён выходзіць у хол, бярэ капялюш і кейс.
Сара. Рычард.
Ён паварочваецца.
Сара. Ты сёньня ня надта рана вернесься, праўда?
Рычард. Ты хочаш сказаць, што ён і сёньня прыйдзе? О Божа! Ён жа быў учора. Сёньня зноў?
Сара. Так.
Рычард. А, ну тады я ня буду сьпяшацца дамоў. Зайду ў Нацыянальную галерэю.
Сара. Добра.
Рычард. Пакуль.
Сара. Пакуль.
Згасае сьвятло.
Дзень. У гасьцёўні зьяўляецца Сара. На ёй вузкая чорная сукенка з глыбокім выразам. Яна пасьпешліва аглядае сябе ў люстэрку. Раптам заўважае, што ў яе на нагах – туфлі на нізкім абцасе. Хуценька ідзе да шафы, пераабуваецца ў туфлі на шпільцы. Зноў глядзіцца ў люстэрка, разгладжвае на клубох сукенку. Ідзе да акна, апускае жалюзі, закрывае іх так, што ў пакой трапляе толькі вузенькая палоска сьвятла. Гадзіньнік б'е трэцюю. Яна глядзіць на гадзіньнік на руцэ, падыходзіць да стала – на ім стаяць кветкі. Званок у дзьверы. Яна адчыняе. Гэта Джон, малочнік.
Джон. Вяршкоў не жадаеце?
Сара. Вы вельмі позна.
Джон. Вяршкоў не жадаеце?
Сара. Не, дзякуй.
Джон. Чаму?
Сара. У нас яшчэ ёсьць. Колькі зь мяне?
Джон. Місіс Оўэн узяла тры збаночкі. Згушчаных.
Сара. Колькі зь мяне?
Джон. Яшчэ не субота.
Сара *(бярэ малако)*. Дзякуй.
Джон. Можа, возьмеце вяршкоў? Місіс Оўэн узяла тры збаночкі.
Сара. Не, дзякуй.
Яна зачыняе дзьверы. Заносіць у кухню малако. Вяртаецца са сподам, на якім стаяць імбрык і кубачкі. Хуценька папраўляе кветкі на стале, сядае ў шэзьлёнг, закідае адну нагу на другую, здымае яе, кладзе ногі на шэзьлёнг,

разгладжвае пад сукенкай панчохі. Званок у дзьверы. Папраўляючы падол сукенкі, Сара ідзе адчыняць.

Сара. Прывітаньне,
Макс!

Заходзіць Рычард. Ён у замшавым пінжаку і бяз гальштука.
Ідзе ў гасьцёўню, спыняецца. Яна зачыняе за ім дзьверы. Павольна праходзіць паўзь яго, сядае ў шэзьлёнг, закідвае нагу на нагу.

Паўза.

Ён павольна падыходзіць ззаду да сьпінкі шэзьлёнга, спыняецца блізка-блізка ад Сары. Яна выгінае сьпіну, здымае нагу і пасоўваецца на нізкі зэдлік зьлева ад шэзьлёнга.

Паўза.

Ён глядзіць на яе, ідзе да шафы ў холе, вымае барабан бонга, нясе яго ў гасьцёўню, ставіць на шэзьлёнг. Падымаецца.

Паўза.

Яна ўстае, ідзе паўзь яго ў бок холу, паварочваецца, глядзіць на яго. Яны сядаюць паабапал шэзьлёнга. Ён пачынае лёгенька стукаць пальцамі па барабане, яе паказальны палец паўзе па барабане да ягонай далоні. Востры пазногаць драпае тыльны бок ягонай далоні. Яна імкліва адымае руку. Пачынае перабіраць пальцамі па барабане, паціхеньку пасоўваючыся да ягонай рукі, і спыняецца. Спачатку паказальным, потым усімі пальцамі драпае яму костачкі на руцэ. У яго напружваюцца ногі. Ён хапае ейную руку ў сваю. Пераплеценыя пальцы апантана б'юць па барабане.
Усё замірае.
Яна падымаецца і ідзе да століка з напоямі. Запальвае цыгарэту, падыходзіць да акна. Ён ставіць барабан на зэдлік справа, бярэ цыгарэту, набліжаецца да яе.

Макс. Выбачайце.

Яна кідае на яго вокам і адводзіць погляд.

Макс. Выбачайце, агеньчыку ня знойдзецца?

Яна не адказвае.

Макс. Я кажу, агеньчыку ня знойдзецца?
Сара. Вы б не маглі пакінуць мяне ў спакоі?

Макс. Чаму?

Паўза.

Макс. Я проста спытаўся, ці не дасьцё вы мне запаліць.

Яна адыходзіць ад яго падалей і азірае пакой. Ён ідзе за ёю, спыняецца ў яе за плячыма. Яна паварочваецца.

Сара. Выбачайце.

Ідзе паўзь яго. Ён – за ёю, не адстае ні на крок.
Яна спыняецца.
Сара. Мне не падабаецца, калі за мною нехта ідзе.

Макс. Дайце мне запаліць – і я пакіну вас у спакоі. Агеньчыку – і ўсё.
Сара *(скрозь зубы)*. Калі ласка, сыдзіце. Зараз прыйдзе мой муж.

Макс. Хто?
Сара. Мой муж.

Макс. Ты чаго саромееься? Га? Дзе запальнічка?
Ён мацае яе. У Сары займае дыханьне.

Макс. Тут?
Паўза.

Макс. Дзе запальнічка?
Ён мацае яе. Яна ўскрыквае.

Макс. Тут?
Яна вырываецца. Ён заганяе яе ў кут.
Сара *(сыкае)*. Ды што вы робіце?

Макс. Паліць хочацца жудасьць як!
Сара. Зараз прыйдзе мой муж!

Макс. Дай жа мне запаліць!
Яны моўчкі змагаюцца.
Яна адскоквае да сьцяны.
Ціша.
Ён падыходзіць да яе.

Макс. Міс, з вамі ўсё добра? Я прагнаў гэтага… джэнтэльмэна. Ён вас не пакрыўдзіў?
Сара. О, як гэта міла з вашага боку. Не-не, я ў парадку. Дзякуй вам.

Макс. Вам пашанцавала, што я праходзіў побач. Паверыць немагчыма, што падобнае магло здарыцца ў гэткім прыгожым парку.

Сара. Сапраўды, немагчыма паверыць.

Макс. Але добра, што ўсё абышлося.
Сара. Словаў няма, як я вам удзячная. Дзякуй вялікі.

Макс. Можа, вы б прыселі на хвілінку, супакоіліся б?
Сара. Я спакойная, але… дзякуй. Які вы спагадлівы. Дзе нам прысесьці?

Макс. Тут – няварта: ідзе дождж. Можа, у хатцы садоўніка?
Сара. Вы так думаеце? А садоўнік?

Макс. Садоўнік – гэта я.
Яны сядаюць у шэзьлёнг.
Сара. Я і не ўяўляла, што магу сустрэць гэткага добрага чалавека.

Макс. Так паводзіцца з прыгожай маладой жанчынай – проста злачынства.
Сара *(уважліва глядзіць на яго)*. Вы такі ўважлівы, такі… чулы.

Макс. Як жа іначай?
Сара. Такі ласкавы. Таму… мабыць, усё да лепшага.

Макс. Што вы хочаце сказаць?
Сара. Што мы сустрэліся. Спаткаліся. Вы і я.
Яна праводзіць пальцам па ягонай назе. Ён глядзіць на яе руку, затым здымае яе.

Макс. Я вас не зусім разумею.
Сара. Няўжо?
Яна праводзіць пальцамі па ягонай назе. Ён глядзіць на яе руку, затым здымае яе.

Макс. Выбачайце, калі ласка. У мяне ёсьць жонка.
Яна бярэ ягоную руку, кладзе сабе на калена.
Сара. Ты такі мілы. Не хвалюйся.

Макс *(вырывае руку)*. Не, праўда. Мяне чакае жонка.
Сара. І вы нават не размаўляеце зь незнаёмымі дзяўчатамі?

Макс. Так.
Сара. Ах, як вы мне надакучылі! Халодны, як рыба!

Макс. Даруйце.
Сара. Усе мужчыны аднолькавыя. Дайце мне цыгарэту.

Макс. Хвігу табе, а не цыгарэту.
Сара. Што-што вы сказалі?

Макс. Хадзі да мяне, Далорэс!
Сара. Э, не, дзякуй. Толькі ня я. Апёкшыся на малацэ, на ваду будзеш дзьмуць. *(Падымаецца.)* Бывайце.

Макс. Мілачка, табе адсюль ня выйсьці. Хатка зачыненая. Мы адны. Ты ў пастцы.
Сара. У пастцы! Як вы можаце! Я замужняя жанчына.

Макс *(падыходзіць да яе)*. Час палуднаваць. Мэры, пастаў, калі ласка, гарбату.
Яна лёгкімі крокамі ідзе да стала. Стаіць каля яго сьпінай да сьцяны. Ён падыходзіць да другога края стала, падцягвае штаны, згінаецца і паўзе пад стол, да яе.
Ён зьнікае пад аксамітным абрусам. Моўчкі. Яна глядзіць пад стол. Ейных ног не відаць. Яго рука – на ейнай назе. Яна азіраецца, твар скажае грымаса, яна скрыгоча зубамі, ловіць ротам паветра, павольна апускаецца і зьнікае пад сталом.
Доўгая ціша.
Голас Сары:
Макс!
Згасае сьвятло.

Макс сядзіць на зэдліку зьлева.
Сара налівае гарбату.
Сара.
Макс.

Макс. Што?
Сара *(пяшчотна)*. Любы мой.

Лёгкая паўза.
Сара. Што здарылася? Чаго ты такі задуменны?

Макс. Ды не, табе падалося.
Сара. Я ж бачу.
Паўза.

Макс. А дзе твой муж?
Паўза.
Сара. Муж? Ты выдатна ведаеш.

Макс. І дзе ж ён?
Сара. На працы.

Макс. Вось небарака! Працуе з ранку да вечара.
Паўза.

Макс. Цікава, які ён.
Сара *(са сьмяшынкай)*. М-а-а-к-с!

Макс. Цікава, ці мы б зь ім паразумеліся… Ці адчулі б… як гэта сказаць?.. родную душу?
Сара. Наўрад ці.

Макс. Чаму?
Сара. У вас вельмі мала супольнага.

Макс. Няўжо? Ён, пэўна, вельмі добра да ўсяго прыстасоўваецца. То бок, ён выдатна ведае, чым мы з табою займаемся, так?
Сара. А як жа!

Макс. Шмат гадоў ведае.

Лёгкая паўза.

Макс. Чаму ён гэта трывае?
Сара. Што ты раптам загаварыў пра яго? Дзеля чаго? Гэта да цябе не падобна.

Макс. Чаму ён гэта трывае?
Сара. Кінь!

Макс. Я задаў табе пытаньне.
Паўза.
Сара. Ён не пярэчыць.

Макс. Праўда?

Лёгкая паўза.

Макс. Я неўзабаве пачну пярэчыць.
Паўза.
Сара. Што ты сказаў?

Макс. Я неўзабаве пачну пярэчыць.

Лёгкая паўза.

Макс. Трэба спыняцца. Так далей працягвацца ня можа.
Сара. Ты сур'ёзна?
Маўчаньне.

Макс. Так ня можа працягвацца.
Сара. Ты жартуеш.

Макс. Не.
Сара. Чаму? Праз майго мужа? Спадзяюся, хоць не празь яго. Ты ўжо хапіў бы лішку.

Макс. Не, твой муж тут ні пры чым. Гэта праз маю жонку.
Паўза.
Сара. Праз тваю жонку?

Макс. Я не магу яе больш падманваць.
Сара.
Макс…

Макс. Я гадамі падманваў. Я больш не магу. Гэта невыносна.
Сара. Любы, паслухай…

Макс. Не дакранайся да мяне.

Паўза.
Сара. Што ты сказаў?

Макс. Ты чула.
Паўза.
Сара. Але твая жонка… ведае. Хіба не? Ты ёй усё распавёў… пра нас. Яна заўжды ведала.

Макс. Не, ня ведае. Яна думае, я сустракаюся са шлюхай, вось і ўсё. Нейкая шлюха, як выдасца хвіліна вольнага часу – і нічога больш.
Сара. Так, але разваж сам… любы мой… Яна ня супраць, праўда?

Макс. Была б супраць, калі б ведала праўду.
Сара. Якую праўду? Пра што ты гаворыш?

Макс. Яна была б супраць, калі б ведала, што насамрэч… у мяне ёсьць каханка, да якой я прыходжу разы два-тры на тыдзень, жанчына шляхетная, вытанчаная, дасьціпная, з багатым уяўленьнем…
Сара. Так, так…

Макс. І што наш раман цягнецца ўжо шмат гадоў…
Сара. Але яна ня супраць, яна не была б супраць: яна шчасьлівая, шчасьлівая – і ўсё…
Паўза.
Сара. До’ табе казаць пустое.
Бярэ спод з кубкамі і ідзе ў бок кухні.
Сара. Ты ўсё робіш, каб сапсаваць дзень.
Яна адносіць спод на кухню. Вяртаецца, глядзіць на Макс а, падыходзіць да яго.
Сара. Мілы, няўжо ты думаеш, што з жонкай можаш мець усё тое самае, што і са мной? Вось, напрыклад, мой муж – ён цалкам разумее, што я…

Макс. Твой муж! Як ён гэта трывае? Няўжо ён не адчувае майго паху, калі вяртаецца ўвечары дадому? Што ён *кажа*? Ён, мусіць, з глузду зьехаў! Колькі часу? Палова на пятую? Ён цяпер сядзіць у сябе ў офісе і ведае, чым мы тут з табой займаемся.

Што ён пры гэтым адчувае? Як ён вытрымлівае?
Сара.
Макс…

Макс. Як?
Сара. Ён радуецца за мяне. Разумее. Ён цэніць мяне такой, якая я ёсьць.

Макс. Мабыць, варта было б зь ім пазнаёміцца, пагутарыць.
Сара. Ты п’яны?

Макс. Бадай, так і зробім. Урэшце, ён таксама мужчына, як і я. Мы абодва мужчыны. А ты толькі жанчына, сучка.
Ён грукае кулаком па стале.
Сара. Кінь! Што з табой? Што на цябе найшло? *(Ціха.)* Кінь, ну калі ласка, кінь. Што ты робіш? Гэта гульня?

Макс. Гульня? Я не гуляюся ў гульні.
Сара. Няўжо? Гуляесься, гуляесься, яшчэ як. Звычайна мне падабаецца.

Макс. Я сваё адгуляў.
Сара. Чаму?

Лёгкая паўза.

Макс. Дзеці.
Паўза.
Сара. Што?

Макс. Дзеці. Я мушу думаць пра дзяцей.
Сара. Якіх дзяцей?

Макс. Сваіх. Жончыных. Яны з дня на дзень прыедуць са школы. Я павінен пра іх думаць.
Яна сядае бліжэй да яго.
Сара. Я хачу табе нешта шапнуць на вушка. Паслухай. Можна, я табе нешта шапну? М-м? Можна? Ну, калі ласка. Цяпер час шаптацца. Быў час палуднаваць, а цяпер час шаптацца, праўда?
Паўза.

Сара. Табе падабаецца, калі я шапчу табе на вушка. Табе падабаецца, што я кахаю цябе, і што я нашэптваю табе пра каханьне. Паслухай, ня трэба пераймацца наконт… жонак, мужоў, усяго астатняга. Гэта глупства. Сапраўды глупства. Галоўнае – гэта ты, ты, тут, цяпер, і ты са мною, і мы разам. Толькі гэта істотна, праўда? Ты шэпчасься са мною, п'еш са мною гарбату, і гэта ты, гэта мы, і мы такія… Кахай мяне, калі ласка.
Ён падымаецца.

Макс. Ты такая кашчавая.
Ідзе прэч.

Макс. Вось у чым бяда. З усім астатнім я мог бы зьмірыцца, але гэта… Ты такая кашчавая.
Сара. Я? Кашчавая? Не сьмяшы людзей!

Макс. І не зьбіраюся.
Сара. Як ты можаш казаць, што я кашчавая?

Макс. Пры кожным руху мяне колюць твае косткі. Яны мне абрыдлі.
Сара. Ды што ты кажаш?

Макс. Ты надта кашчавая.
Сара. Я ж тоўстая! Паглядзі на мяне. Ну, прынамсі, пульхная. Ты заўсёды казаў, што я пульхная.

Макс. Калісьці была пульхная. Цяпер – не.
Сара. Паглядзі на мяне.
Ён глядзіць.

Макс. Ты зусім ня пульхная. Табе да пульхнай далёка. Ты ж ведаеш мой густ. Мне падабаюцца вялізныя жанчыны. Падабаецца зад, набрынялы, як вымя. Велізарны – не ахапіць – зад, як вымя.
Сара. Ты пра кароваў?

Макс. Не, я не пра кароваў. Я пра вялізны, поўны жаночы зад, як вымя. Калісьці, даўным-даўна, ты крыху яго нагадвала.

Сара. Дзякуй.

Макс. Але цяпер, шчыра кажучы, у параўнаньні з маім ідэалам… у цябе адна скура ды косткі…

Яны глядзяць адно на аднаго.

Ён надзявае пінжак.

Сара. Ты добра пажартаваў.

Макс. Гэта ня жарт.

Ён выходзіць. Яна глядзіць яму ў сьлед. Вяртаецца, павольна падыходзіць да барабана бонга, бярэ яго ў рукі, адносіць у шафу. Вяртаецца ў гасьцёўню, глядзіць на шэзьлёнг, павольна ідзе ў спачывальню і сядае на край ложка. Згасае сьвятло.

Надвячорак. Гадзіньнік б'е шостую. У дзьвярох зьяўляецца Рычард. На ім звычайны строгі гарнітур. Ён ставіць у шафу кейс, вешае капялюш, азірае пакой, налівае сабе віскі. Сара заходзіць з купальні ў спачывальню. Яна апранутая ў сьціплую сукенку. Некалькі сэкундаў абое стаяць у розных пакоях, ня рухаючыся. Сара ідзе на балькон, глядзіць у сад.

Рычард заходзіць у спачывальню.

Рычард. Прывітаньне.

Паўза.

Сара. Прывітаньне.

Рычард. Глядзіш на заход?

Бярэ пляшку.

Рычард. Наліць табе?

Сара. Дзякуй, нешта ня хочацца.

Рычард. Вох, якое нуднае пасяджэньне. Зацягнулася на ўвесь дзень. Стаміўся страшэнна. Але, здаецца, добра папрацавалі. Прагрэс ёсьць. Даруй, што спазьніўся. Давялося затрымацца, прапусьціць кілішак з двума-трыма калегамі з аддзелу замежнага гандлю. Добрыя хлопцы.

Сядае.

Рычард. А ты як?

Сара. Добра.

Рычард. Тады файна.

Маўчаньне.

Рычард. Здаецца, ты нешта не ў гуморы. Што здарылася?

Сара. Нічога.

Рычард. Як прайшоў дзень?

Сара. Няблага.

Рычард. Але і нядобра?

Паўза.

Сара. Сярэдне.
Рычард. Спачуваю.
Паўза.
Рычард. Як добра вярнуцца дамоў! Ты не ўяўляеш, якая гэта палёгка.
Паўза.
Рычард. Прыходзіў твой каханак?
Яна не адказвае.
Рычард. Сара!
Сара. Што? Выбачай. Я была задумалася.
Рычард. Прыходзіў твой каханак?
Сара. Так. Прыходзіў.
Рычард. У добрай форме?
Сара. Ведаеш, мне разбалелася галава.
Рычард. Ён быў ня ў форме?
Паўза.
Сара. У кожнага здараюцца ненайлепшыя дні.
Рычард. І ў яго таксама? Я думаў, што ўвесь сэнс працы каханка – у тым, каб іх ня мець. То бок, калі б мне прапанавалі зьдзяйсьняць функцыю каханка і я быў бы схільны, скажам так, прыняць адпаведную прапанову, я б лепей адмовіўся, чым выявіў сваю няздольнасьць належным чынам выконваць абавязкі, якія адсюль вынікаюць.
Сара. Ты кажаш занадта мудрагелістымі словамі.
Рычард. Табе больш даспадобы простыя, як бот?
Сара. Не-не.
Паўза.
Рычард. Але я табе спачуваю – у цябе атрымаўся ня самы ўдалы дзень.
Сара. Нічога.
Рычард. Можа, усё зьменіцца на лепшае?
Сара. Можа.
Паўза.
Сара. Я спадзяюся.
Яна выходзіць са спачывальні ў гасьцёўню, запальвае цыгарэту, сядае. Ён ідзе за ёю.
Рычард. Як бы там ні было, але мне здаецца, ты вельмі прыгожая.
Сара. Дзякуй.
Рычард. Так, вельмі. І я кожны раз страшэнна ганаруся, калі

мяне бачаць разам з табою. На абедзе або ў тэатры.
Сара. Я ўсьцешаная.
Рычард. Або на балі.
Сара. Так, на балі.
Рычард. Мяне перапаўняе гонар, калі я зьяўляюся дзе-небудзь пад руку са сваёю жонкай. Калі бачу, як ты ўсьміхаесься, сьмяесься, рухаесься, размаўляеш, схіляесься, стаіш нерухома. Калі я чую, як ты ўстаўляеш у размову сучасныя слоўцы, як выкшталцона ўжываеш найноўшыя выразы, заўсёды трапна і далікатна. Я адчуваю, як мне зайздросьцяць іншыя, бачу, як яны дабіваюцца тваёй прыхільнасьці, ні перад чым не спыняючыся – так уражвае іх твая простая грацыя. І адна думка, што ты – мая жонка, прыносіць мне ні з чым не параўнальнае задавальненьне.
Паўза.
Рычард. Што на вячэру?
Сара. Я пра яе не падумала.
Рычард. Чаму гэта?
Сара. Мне ад адной думкі пра вячэру млосна робіцца. Лепей пра яе ня згадваць.
Рычард. Якая прыкрасьць. Я згаладаўся.

Лёгкая паўза.
Рычард. Ты ж не разьлічваеш, што я буду брацца гатаваць вячэру пасьля таго, як цэлы дзень працаваў, займаўся ў Сіці важнымі фінансавымі справамі?
Яна сьмяецца.
Рычард. Некаторыя сказалі б, што ты занядбала свае абавязкі жонкі.
Сара. О Божа!
Рычард. Мушу сказаць, я падазраваў, што раней ці пазьней нешта падобнае здарыцца.
Паўза.
Сара. Як твая шлюха?
Рычард. Шыкоўна.
Сара. Яна худнее ці таўсьцее?
Рычард. Выбачай, я не зразумеў, што ты сказала?
Сара. Яна худнее ці таўсьцее?
Рычард. З кожным днём худнее.
Сара. Напэўна, табе гэта непрыемна.

Рычард. Наадварот, мне падабаюцца хударлявыя жанчыны.
Сара. Я думала іначай.
Рычард. Праўда? Чаму?
Паўза.
Рычард. Вядома, твая няздатнасьць згатаваць вячэру ў вызначаны час абумоўленая тым ладам жыцьця, які ты вядзеш.
Сара. Ты так думаеш?
Рычард. Несумненна.

Лёгкая паўза.
Рычард. Мабыць, я жорстка з табою абыходжуся. Я жорсткі?
Сара *(глядзіць на яго)*. Ня ведаю.
Рычард. Так, жорсткі. Сёньня ў заторы на мосьце я, бачыш, прыняў рашэньне.
Паўза.
Сара. Так? Якое?
Рычард. Гэта мусіць спыніцца.
Сара. Што – гэта?
Рычард. Твая распуста.
Паўза.
Рычард. Тваё грахоўнае жыцьцё. Тое, што ты ідзеш супрацьзаконнай сьцяжынай пажадлівасьці.
Сара. Ты гэта сур'ёзна?
Рычард. Так. Я прыняў рашэньне – і ад яго не адступлюся.
Яна ўстае.
Сара. Хочаш халоднай вяндліны?
Рычард. Ты мяне зразумела?
Сара. Ніколечкі. У лядоўні ёсьць халодная вяндліна.
Рычард. Пэўна, занадта халодная. Факт застаецца фактам: гэта мой дом. Пачынаючы зь сёньняшняга дня я забараняю табе прымаць свайго каханка на гэтым абсягу. Забарона дзейнічае дваццаць чатыры гадзіны на дзень. Я зразумела выказваю сваю думку?
Сара. Я зрабіла табе салату.
Рычард. Вып'еш?
Сара. Так, налі мне кілішак.
Рычард. Што ты будзеш?
Сара. Ты ведаеш, што я п'ю. Мы дзесяць гадоў жанатыя.
Рычард. Але, слушна.
Ён налівае.

Рычард. Дзіўна, праўда, што мне спатрэбілася столькі часу, каб усьвядоміць усю ганебнасьць свайго становішча.
Сара. Я знайшла каханка ня дзесяць гадоў таму. Не падчас мядовага месяца.
Рычард. Гэта неістотна. Факт застаецца фактам: я – муж, які ласкава трымае дзьверы адчыненымі для каханка сваёй жонкі. Кожны дзень, калі ёй тое будзе заўгодна. Я праяўляў залішнюю дабрыню. Хіба не?
Сара. Вядома, ты вельмі добры.
Рычард. Ты б не магла перадаць яму мае найлепшыя зычэньні – у пісьмовай форме, калі хочаш – і папрасіць яго спыніць свае візыты *(глядзіць на каляндар)*… з дванаццатага чысла бягучага месяца.
Працяглая цішыня.
Сара. Як ты можаш такое казаць?
Паўза.
Сара. Чаму сёньня? Так зьнянацку…
Паўза.
Сара. М-м?
Яна падыходзіць блізка да яго.
Сара. У цябе выдаўся цяжкі дзень… на працы… Калегі з аддзелу замежнага гандлю. Ты стаміўся. Гэта глупства, гэта ж проста глупства – такое казаць. Я тут. З табою. І ты заўжды разумеў… як шмат для мяне азначаюць… гэтыя некалькі гадзінаў. Заўсёды разумеў.
Яна прыціскаецца шчакою да ягонай шчакі.
Сара. Разуменьне – рэч такая каштоўная, такая рэдкая.
Рычард. Думаеш, прыемна ведаць, што твая жонка здраджвае табе два-тры разы на тыдзень, з зайздроснай рэгулярнасьцю?
Сара. Рычард…
Рычард. Гэта невыносна. Болей невыносна. Я не зьбіраюся з гэтым надалей мірыцца.
Сара. Рычард… Мілы… Калі ласка…
Рычард. Што – «калі ласка»?
Яна адхіляецца ад яго.
Рычард. Сказаць, што я вам прапаную? Завядзі яго куды-небудзь у поле. Знайдзіце канаву. Ці гурбу шлаку. Сьметнік. Чым кепская ідэя?
Яна ня рухаецца.
Рычард. Купіце човен і адшукайце якую-небудзь гнілую

сажалку. Што заўгодна. Дзе заўгодна. Але не ў маёй гасьцёўні.
Сара. На жаль, гэта немагчыма.
Рычард. Чаму?
Сара. Я сказала: гэта немагчыма.
Рычард. Але калі табе так патрэбны твой каханак, хіба гэткае выйсьце не напрошваецца само сабою? Раз яму забаронены ўваход у гэты дом… Мілая, я хачу табе дапамагчы, бо я цябе кахаю. Ты ж бачыш. Калі засьпею яго ў сваім доме – усе зубы яму павыбіваю.
Сара. Ты звар'яцеў.
Ён не адрываючыся глядзіць на яе.
Рычард. Галаву праламлю.
Паўза.
Сара. А як жа твая чортава шлюха?
Рычард. Я даў ёй адстаўку.
Сара. Праўда? Чаму?
Рычард. Яна занадта кашчавая.

Лёгкая паўза.
Сара. Але ж табе падабалася… ты казаў, табе падабаюцца… Рычард… ты ж кахаеш мяне…
Рычард. Вядома.
Сара. Так… ты мяне кахаеш… ты нічога ня маеш супраць яго… ты яго разумееш… праўда?.. То бок, ты сам лепш за мяне ведаеш… любы… усё добра… усё добра… і ўвечары… і ўдзень… разумееш? Паслухай, я пажартавала. Вячэра гатовая. Ялавічына па-бургундзку. А заўтра будзе запечаная кура. Хочаш?
Яны глядзяць адно на аднаго.
Рычард *(ціха)*. Любадзейка.
Сара. Нельга так казаць, гэта нясцерпна, ты ж ведаеш – так нельга. Што ж ты робіш?
Яшчэ сэкунду ён глядзіць на яе, затым ідзе ў хол.
Адчыняе шафу і вымае барабан бонга.
Яна сочыць за ім вачыма.
Ён вяртаецца.
Рычард. Што гэта значыць? Я знайшоў яго колькі часу таму. Што гэта?
Паўза.
Рычард. Што гэта?
Сара. Ты ня маеш права да яго дакранацца.

Рычард. Але гэта мой дом. Адсюль вынікае, што гэты прадмет належыць альбо мне, альбо табе, альбо трэцяй асобе.
Сара. Звычайная рэч. Купіла на дабрачынным кірмашы. Нічога такога. А ты што думаў? Пакладзі на месца.
Рычард. Нічога такога? Барабан у маёй шафе?
Сара. Пакладзі на месца!
Рычард. А ён часам ня мае дачыненьня да тваіх распусных дзённых забаваў?
Сара. Ніякага. З чаго ты ўзяў?
Рычард. Вы ім карыстаецеся. Карыстаецеся, так? Я здагадаўся.
Сара. Нічога ты не здагадаўся. Аддай яго мне.
Рычард. Што ён зь ім робіць? Што вы зь ім робіце? Граеце на барабане, пакуль я на працы?
Яна спрабуе забраць барабан. Ён не аддае. Стаяць, удваіх трымаючыся за барабан.
Рычард. Дзеля чаго прызначаны барабан? Гэта ня проста аздоба, я так разумею. Што вы зь ім робіце?
Сара *(з пакутай у голасе)*. Ты ня маеш права мяне дапытваць. Ніякага. Мы так дамаўляліся. Не задавай гэткіх пытаньняў. Калі ласка. Ня трэба. Мы ж дамовіліся.
Рычард. Я хачу ведаць.
Яна заплюшчвае вочы.
Сара. Спыніся.
Рычард. Вы абое на ім граеце? Га? Разам?
Яна шпарка ідзе прэч, тады спыняецца, паварочваецца да яго.
Сара *(сыкае)*. Ты ідыёт!.. *(Яна халодна глядзіць на яго.)* Думаеш, да мяне прыходзіць толькі ён адзін? Так? Думаеш, ён адзіны, каго я прымаю? Ня будзь дурнем. Да мяне зьяўляецца шмат гасьцей, увесь час, і я заўсёды іх прымаю. У іншыя дні, увесь час. Калі вы ня ведаеце – ні ты, ні ён. Я частую іх суніцамі. Зь вяршкамі. Незнаёмых людзей. Абсалютна чужых. Але мне яны не чужыя – пакуль яны тут. Прыходзяць паглядзець на ружы. І застаюцца палуднаваць. Усе да адзінага.
Рычард. Гэта праўда?
Ён набліжаецца да яе, ціхенька пастукваючы па барабане. Глядзіць ёй у твар, не перастаючы стукаць, тады хапае яе руку і драпае ёю па барабане.
Сара. Што ты робіш?
Рычард. Вы зь ім гэтым займаецеся?
Яна адскоквае далей, за далёкі край стала.
Рычард. Вось так?

Паўза.

Рычард. Ну і забава!

Ён рэзка драпае па барабане і ставіць яго на зэдлік.

Рычард. Агеньчыку ня знойдзецца?

Паўза.

Рычард. Агеньчыку ня знойдзецца?

Яна адступае за стол, апынаецца зь яго далёкага края.

Рычард. Ну кінь, ня псуй мне задавальненьня. Твой муж ня будзе супраць, калі ты падзелісься са мной агеньчыкам. Нешта ты бледная. Адкуль гэтая бледнасьць? Такая прыгожанькая паненка.

Сара. Не кажы так.

Рычард. Ты ў пастцы. Мы адны. Я зачыніў дзьверы.

Сара. Як ты можаш?!

Рычард. Ён ня будзе супраць.

Пачынае набліжацца да стала.

Рычард. Ніхто больш ня ведае.

Паўза.

Рычард. Ніхто нас не пачуе. Ніхто ня ведае, што мы тут.

Паўза.

Рычард. Ну, давай. Падзяліся агеньчыкам.

Паўза.

Рычард. Табе, мілая, адсюль ня выйсьці. Ты ў пастцы.

Яны праз стол глядзяць адно на аднаго.

Раптам у яе вырываецца сьмяшок.

Маўчаньне.

Сара. Я ў пастцы.

Паўза.

Сара. Што скажа мой муж?

Паўза.

Сара. Ён чакае мяне. Зачакаўся. Мне ня выбрацца. Я ў пастцы. Вы ня маеце права так абыходзіцца з замужняй жанчынай. Хіба ня так? Задумайцеся, прашу вас, задумайцеся, што вы робіце!

Яна глядзіць на яго, схіляецца і паўзе пад сталом да яго. Вылазіць з-пад стала і кленчыць каля ягоных ног, глядзіць на яго зьнізу ўверх. Ейная рука паўзе па яго назе. Ён згары азірае яе.

Сара. Ты вельмі напорлівы. Сапраўды. Вельмі. Але мой муж зразумее. Ён усё разумее. Хадзі сюды. Хадзі сюды, да мяне. Я патлумачу. Урэшце, падумай пра маю сям'ю. Муж мяне багоміць. Хадзі сюды, я нешта нашапчу табе на вушка. Нашапчу. Цяпер час шаптацца, праўда?

Яна бярэ ягоныя далоні ў свае. Ён апускаецца на калені разам зь ёю. Яны вельмі блізка. Сара гладзіць ягоны твар.

Сара. Мы сёньня вельмі позна палуднуем. Але мне падабаецца. Які ты мілы. Ніколі раней ня бачыла цябе пасьля заходу сонца. Муж затрымліваецца – канфэрэнцыя зацягнулася. Так, ты выглядаеш зусім іначай. Чаму на табе гэты дзіўны гарнітур? І гальштук? Звычайна ты ня так апранаесься, праўда? Здымі пінжак. М-м? Хочаш, я пераапрануся? Хочаш? Дзеля цябе, любы. Хочаш? Ты гэтага хочаш?

Маўчаньне. Яна вельмі блізка да яго.

Рычард. Так.

Паўза.

Рычард. Пераапраніся.

Паўза.

Рычард. Пераапраніся.

Паўза.

Рычард. Пераапраніся.

Паўза.

Рычард. Ах ты шлюха, мая цудоўная шлюха…

Яны стаяць на каленях. Яна схілілася над ім.

Заслона.

Пераклала з ангельскай V.K.

[image]

[image]

№ 1,2 (41,42) - 2006

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/03/12

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1 2 [image] [image] [image] 2006

да Зьместу

ўналістыка • крытыка • палеміка • гісторыя • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

«Клішэвіч у Нью-Ёрку на свае ліфцёрскія заробкі купіў томік гэтага вершаруба і даслаў мне» Размова з Янкам Сіпаковым

ЯНКА СІПАКОЎ (нар. 15.01.1936 г. у вёсцы Зубрэвічы Аршанскага раёну) – пісьменьнік, перакладчык. Выдаў кнігі паэзіі «Сонечны дождж» (1960), «Лірычны вырай» (1965), «Дзень» (1968), «Зь вясны ў лета» (1972), «Веча славянскіх баляд» (1973), «У поўдзень, да вады»

– Як і Уладзімір Караткевіч, Вы нарадзіліся на Аршаншчыне. Ці былі ў Вас з Караткевічам нейкія зямляцкія стасункі?

– Асабліва блізкімі ці вельмі сяброўскімі адносінамі з Уладзімірам Сямёнавічам пахваліцца я не магу. Аднак, як Вы кажаце, стасункі з ім былі ў мяне яшчэ тады, калі мы не ведалі адно аднаго.

У 1957 годзе ў ліпеньскім нумары часопіса «Полымя» я прачытаў нізку вершаў маладога паэта Уладзіміра Караткевіча. Яна мяне ашаламіла. Цуд! Так у нас яшчэ ніхто не пісаў! І малады паэт – аршанец, мой зямляк! І як жа я быў здзіўлены і абураны, калі ў раённай газеце пачалося яго шальмаванне: у

тым жа ліпені месяцы з’явіўся разгромны аглабельны артыкул на публікацыю, а потым былі арганізаваны і «водгукі чытачоў». На цэлую старонку! Хто толькі ні вучыў маладога паэта, як і пра што трэба пісаць! «Нізкапробныя практыкаванні», «кашчунства новаз’яўленага прарока», «абраза для савецкага чытача», «творы не вызначаюцца высокімі літаратурна-мастацкімі якасцямі», «тэматыка яго вершаў далёкая ад сучаснасці», «усе вершы Караткевіча – сырыя цаглінкі», «капанне ў асабістых настроях», «шмат тугі, мала бадзёрасці» і г. д. «Жыццё ідзе ўперад, народ узводзіць новыя будынкі, а паэт не бачыць гэтага», – ганарліва павучаў маладога настаўніка і вучань 10 класа Окаракаў.

Змушалі напісаць такі «водгук» і мяне – не ставала пісьма студэнта, а я ў той час вучыўся ў БДУ. Нават пагражалі паведаміць пра мае паводзіны ў рэктарат. Але я пісаў такое «агалоссе» на земляка катэгарычна адмовіўся.

Як я казаў, мы не былі ў блізкіх адносінах з Уладзімірам Караткевічам, але сябравалі па-зямляцку годна і шчыра. Ён мне нават кнігі свае падпісваў так: «Другу не толькі па зямлі, але і па сэрцы». А якое эсэ напісаў Уладзімір Сямёнавіч пра маю кнігу «Веча славянскіх балад»! Дарэчы, яно змешчана ў восьмым томе збору яго твораў, можна прачытаць. Ведаеце, што ён там піша? «Готы хлопец, сэрца тагэ не жадаюць, даў радаслаў выдатка таатам майго пакалення, і ў тым ліку мне». Вядома, гэта перабольшанне. Але ясна адно, што б ні пісаў, заўсёды помню і заўсёды спагадаю на тое, што ведамі высокую ўхвалу Майстра.

Пераклаў на беларускую мову «Лісьце травы» У. Уітмэна (1978), «Турэмны дзёньнік» Хо Шы Міна (1985), «Санэты бяды» Ф. Прэшарна (1987), урыўкі з «Калевалы» і інш.

– Чаму Вы пацягнуліся да літаратуры? У Вашым дзяцінстве, напэўна, было не да кніжак і вершаў?

– А ведаеце, я мог стаць ваенным мараком. Меў бы нават свой караблік ці падводную лодку. Разумееце: лева руля, права руля, поўны наперад! Рэч у тым, што пасля вайны ў раён прыйшла разнарадка на адпраўленне ў Нахімаўскае вучылішча дзяцей – круглых сірот з Аршаншчыны. У гэты спіс трапіў і я. Але цётка, бацькава сястра, якая гадавала нас, не адпусціла:

(1976), «Вышыўкі» (выбранае, 1978), «Усміхніся мне» (1984), «Таксама збіраюся жыць» (1988).

Лучар кніг нарысаў «На зялёную маланку» (1971), аповесцяў, апавяданняў «Крыло цішыні» (1976), «Жанчына сярод мужыкоў» (1980), «Усе мы з хат» (1982), «Спадзяванне на радасьць» (1983), «Пяць струн» (1984), «Сад людзей» (1985), «Журба у стылі рэтра» (1990). Выйшлі выбраныя творы ў двух тамах (1985).

«Няхай будзе са мной, няхай вучыцца дома».

А марская форма мне была да твару, і мне здаецца, на моры я мог бы сяго-таго дасягнуць. Гэта я адчуў, калі, як артылерыст запасу, праходзіў вайсковую перападрыхтоўку на Ціхаакіянскім флоце і як супрацоўнік флоцкай газеты «Баявая вахта» пабываў на самых сучасных караблях, а падчас вучэння нават у атамнай падлодцы клаўся на дно Ціхага акіяна.

А пасля заканчэння сямігодкі зноў жа выбіраў сабе нечаканыя прафесіі: хацеў паступаць у Віцебск у нейкае міліцэйскае вучылішча, потым думаў таксама ў Віцебску вучыцца на хлебапёка – там бясплатна кармілі і апраналі. А цётка зноў за сваё: «Нікуды не паедзеш, вучыся ў Зубрэвічах».

І, мусіць, тое, што потым стварыла Янку Сіпакова, усё ж перамагло. І ў выніку – Белдзяржуніверсітэт, журфак. Двойчы паступаў, але ўсё ж паступіў. Дарэчы, і дакументы ў Менск, у прыёмную камісію, я вазіў на даху вагона, зайцам.

Вядома ж, пісьменніка з мяне найперш зрабілі кнігі. А магчыма, і тое, што я вучыўся ў школе і адначасова насіў у свае Зубрэвічы з сельсавета пошту. І як не штодзень сустракаўся з беларускімі – тады вёска была беларускамоўнаю! – газетамі і часопісамі: «Звязда», «Вожык», «Полымя», «Беларусь». Босы, перайду сваю Вуллянку ўброд, сяду пад кустом, гартаю газеты і часопісы, чытаю іх. Чым не бібліятэка?!

– Вы працавалі ў «Вожыку» амаль 13 гадоў. Ці не імкнуліся перайсці ў паўнавартасны літаратурны часопіс?

– У «Вожыку» я пачаў працаваць яшчэ студэнтам. Калі я быў на апошнім курсе, тагачасны рэктар Павел Кавалёў прапанаваў мне пасаду падлікоўца аддзела пісьмаў. Там я і стварaў дыпломную работу. Менавіта стварaў, бо гэта была першая на журфаку творчая работа: серыя нарысаў. Рашэнне па ёй прымаў нават рэктарат. З камандзіроўкаю «Звязды» ў кішэні, дзе да мяне ставіліся таксама добра, я паехаў у Салігорск, інкогніта, не паказваючы камандзіроўкі, уладкаваўся на працу вучнем

праходчыка і працаваў у брыгадзе Мургі, дужа каларытнага шахцёра, на прабіўцы першага ствала. Затым гэткім жа чынам працаваў на будаўніцтве Наваполацка ў брыгадзе мулярaў Стральцова. Горада яшчэ не было, мы будавалі адзін з першых жылых дамоў.

І «Вожык» не злаваўся, трываў маю доўгую адсутнасць, чакаў.

Потым, ужо з «вожыкаўскім» пасведчаннем, і літработнікам, і загадчыкам аддзела я аб'ехаў усю Беларусь, пабываў ці не ў кожным раёне.

«Вожык» выдаў у сваёй бібліятэчцы чатыры кніжкі маіх іранэсак: «Лысы юбілей», «Плюс на мінус», «Ланцуг для мух», «Пятніца ў суботу». Часам мне нават здаецца, што пачатак маіх прытчаў можна шукаць і ў маіх іранэсках.

Працуючы ў «Вожыку», мне, разам з Анатолем Клышкам, цяперашнім аўтарам «Буквара», удалося зрабіць падарожжа на рудавозе па Прыпяці, а затым мы сумесна напісалі свой нарыс «Паэма дарог», пра які ў свой час шмат гаварылі.

У «Вожыку» мы – Рыгор Барадулін, Барыс Сачанка і я – стварылі яшчэ аднаго сатырыка – Сібарсача, які часта выступаў на старонках часопіса, у якім тады адказным сакратаром працаваў найдабрэйшы і найзычлівейшы Сяргей Сцяпанавіч Дзяргай, што быў бацькам і сябрам усім маладым пісьменнікам.

У «Вожыку» ў мяне выйшла першая кніжка паэзіі, у «Вожыку» мяне прынялі ў Саюз пісьменнікаў, у «Вожыку» я ажаніўся, у «Вожыку» ў мяне нарадзіўся сын…

Скажыце, дык навошта мне было шукаць нейкі іншы, як Вы кажаце, паўнавартасны літаратурны часопіс, каб некуды пераходзіць?

«Вожык» тады сам жыў паўнавартасным інтэлектуальным жыццём. Аднак пасля працы, прызнаюся Вам, я ўсё ж бег у «Полымя», дзе шчыравалі ўжо мае раўналеткі Пташнікаў, Сачанка, Чыгрынаў, Адамчык, каб пасядзець ля іх ды паслухаць

Максіма Танка, Янку Брыля, Івана Мележа, Анатоля Вялюгіна, Аляксея Русецкага. Іншых старэйшых пісьменьнікаў, якія збіраліся ў рэдакцыі.

– Яшчэ даўжэй Вы працавалі ў «Маладосці» – дваццаць гадоў! Вам падабалася праца ў гэтым часопісе ці Вы проста па натуры не аматар зменаў?

– І тое і другое: і ў «Маладосці» мне падабалася працаваць, і па натуры сваёй я не люблю частых зменаў.

Завіталі неяк да мяне дадому Бураўкін, Сачанка і Чыгрынаў – агітаваць, каб перайшоў у «Маладосць». Угаварылі. Але, ці паверыце, я ледзь не плакаў, пакідаючы «Вожык», – там жа ўсё маё юнацтва прайшло, з людзьмі падружыўся… Але потым прывык і да «Маладосці». На дваццаць гадоў прывык! «Вожык» выходзіў два разы на месяц, а «Маладосць» – адзін. Столькі часу вольнага з'явілася! Цэлы месяц адзін нумар робіш! У «Маладосці» я пераседзеў аж чатырох рэдактараў – Бураўкіна, Зуёнка, Грачанікава і Далідовіча.

У маёй рэдакцыі ў часопісе ішла і «Споведзь» Ларысы Геніюш, і «Старажыная Беларусь» Міколы Ермаловіча. Дарэчы, і назвы гэтым кнігам даў я. У Ермаловіча спачатку была вельмі доўгая навуковая назва тыпу: «Падручнік па вывучэнні…», а дзённікі Геніюш увогуле не мелі ніякай прозвы.

У Ермаловіча я пакінуў увесь даведачны матэрыял, хоць ён у часопісе і займаў многа месца, – калі нехта захоча змагацца з гісторыкам, то хай змагаецца са зноскамі, а не з аўтарам і з часопісам.

А рукапіс Геніюш мне далі, калі я ўжо быў адказным сакратаром. Я прачытаў яго за ноч, назаўтра схаваў у сейф, пайшоў да галоўнага рэдактара Анатоля Грачанікава, сказаў сваю думку: «Гэта трэба абавязкова друкаваць. А калі што якое нейкае – звольніш мяне. Скажаш, што я вінаваты, не даглядзеў».

І яшчэ колькі разоў я быў пад пагрозай звальнення. Да прыкладу, у 1968 годзе. Падзеі ў Чэхаславакіі. А ў маім стале артыкул с. Панізніка пра М. Забэйду-Суміцкага. Абодва на той час былі ў Чэхаславакіі. Выклікае мяне тагачасны рэдактар на калідор, пытаецца: «Ты замаўляў артыкул пра Забэйду-Суміцкага?» «Не, – адказваю, – яго прыслаў сам аўтар». «Ну тады яшчэ паспрабуем абараніцца… Раяць цябе звольніць».

Так што змены маглі здарыцца і без майго жадання, насуперак маёй звычцы доўга сядзець на адным месцы.

– Ці прапаноўвалі Вам пайсці на працу ў які-небудзь аддзел ЦК КПБ?

– Не, не прапаноўвалі. І прапаноўваць не маглі – я ўсё сваё жыццё быў беспартыйным. А ў ЦК, здаралася, выклікалі. З тае ж самае прычыны: «Чаму не ўступаеш у партыю?» Маўляў, усе ж пад гэтым богам ходзім. На высакаватым узроўні гаварылі са мною. Нагамі тупалі, пагражалі: «Стопчам, сатрэм!» Але я не крыўдаваў на іх. На тых, што тупалі. Бо ведаў, што ўсё гэта яны рабілі з добрымі намерамі – хацелі хутчэй прыняць мяне ў партыю, каб адразу ж даць якую-небудзь важную пасаду, а то і запрасіць, як Вы кажаце, на працу ў ЦК.

Я ж усё сваё жыццё імкнуўся ўцячы ад гэткай мітусні, схавацца ад высокіх кіраўнічых пасад, каб застацца толькі сам-насам з творчасцю – я і тады не сумняваўся, што высокія пасады будуць замінаць пісьменніцкай працы. А я, Алесь, заўсёды хацеў быць вольным літаратарам.

Аднак я не быў супраць камуністычнага светапогляду. І толькі пабачыўшы, з якой апантанасцю некаторыя камуністы ірвалі і палілі свае партыйныя білеты, зразумеў: я правільна зрабіў, што не ўступіў у КПСС.

А я і цяпер, шчыра кажучы, спачуваю высокім марам пантэістаў, утапістаў Томаса Мора і Джавані Кампанелы, якія настойліва шукалі Горад Сонца і Краіну Нідзенію.

– Наколькі я заўважыў, пра Вас няшмат пісала крытыка нават у Ваш зорны час у 1970-я – 1980-я гады. Чаму? Таму што Вы неяк асобна трымаліся ад усіх у нашай сямейна-зямляцкай літаратуры?

– Крыўдзіцца на крытыку я не магу. Яна шанавала мяне не толькі ў «зорны час» і адгукалася на мае творы вельмі актыўна, за што я, наадварот, удзячны ёй. Амаль кожная кніга атрымлівала па пяць-дзесяць рэцэнзій. Нават на першы зборнік маладога паэта з'явілася аж сем водгукаў. Першую рэцэнзію на мой «Сонечны дождж» напісаў Анатоль Клышка. А на мой пераклад «Лісця травы» Уолта Уітмена адгукнуўся з ЗША Уладзімір Клішэвіч. Дарэчы, ён працаваў тады ліфцёрам у Нью-Ёрку, на свае ліфцёрскія заробкі купіў томік паэзіі гэтага выдатнага вершаруба на ангельскай мове і даслаў мне – з гэтай кнігі я і рабіў пераклад. Выхад томіка паэзіі Уітмена на беларускай мове Клішэвіч назваў «знамянальнай падзеяй»: «Па змесце і форме пісьма, – пісаў ён у «Голас Радзімы», – Уолт Уітмен у Янкі Сіпакова атрымаўся такім, які ён ёсць у сапраўднасці на англійскай мове. Перакладчык зрабіў вельмі карысную справу – пазнаёміў беларускага чытача з вялікім паэтам Злучаных Штатаў».

Сама болей рэцэнзій, водгукаў, грунтоўных артыкулаў атрымала «Веча славянскіх балад». Па ёй, я ведаю, у тыя гады, калі кафедру беларускай літаратуры ў Белдзяржуніверсітэце ўзначальваў Алег Лойка, было напісана шмат курсавых і дыпломных работ. Нават у некаторыя кандыдацкія ды доктарскія дысертацыі яна, як першая кніга балад у беларускай літаратуры, трапіла шырока.

Кніга прытчаў «Тыя, што ідуць» мела ўсяго толькі адну рэцэнзію. Яе напісаў вядомы літаратуразнаўца, выкладчык Гродзенскага універсітэта імя Янкі Купалы Аляксей Пяткевіч! Але якая гэта рэцэнзія! Па маштабнасці, грунтоўнасці, глыбіні, па шчырай спробе разабрацца ў тым, што хацеў сказаць аўтар, яна сягае да манаграфіі. Яна мне дарагая, бо ў ёй крытык зразумеў мяне як найлепш.

«Ахвярны двор», кніга паэм у прозе, не атрымала ніводнай

рэцэнзіі, прайшла незаўважанай. Праўда, выдавецтва «Мастацкая літаратура», якое выдала яе, хацела назваць выданне кнігаю года, аднак нехта з маіх сяброў, каму кніга не спадабалася і хто працаваў тады ў выдавецтве, арганізаваў супраць яе барацьбу і перамог: кнігаю года стаў зборнік іншага паэта.

А паэма «Хата» з «Ахвярнага двара» была перакладзена ва Украіне і надрукавана там у часопісе, і я атрымаў ліст, дзе чытачы пісалі, што такога твора пра Шаўчэнку ва ўкраінскай літаратуры пакуль няма.

А наконт таго, што я пазбягаў розных хаўрусаў, не ўдзельнічаў ні ў якіх групках і групоўках, Вы кажаце праўду. Я імкнуўся пагарджаць імі, абыходзіць іх, бо ўся наша беларуская літаратура была для мяне роднаю і ўсё вартае і таленавітае я прымаў і падтрымліваў – незалежна ад груповак. Таму некаторыя і казалі пра мяне незадаволена: «Кот, які гуляе сам па сабе».

– Мяне таксама дзівіць тое, што дасюль не ацэненая Вашая праца як эксперыментатара беларускай паэзіі. Па-мойму, Вы, як і Разанаў, арыентаваліся на досвед прыбалтыйскіх літаратур. Шырока выкарыстоўвалі форму верлібра, напісалі кнігу паэм у прозе.

– Арнольд Макмілін, доктар філалогіі, вядомы даследчык беларускай літаратуры з Англіі, у сваёй кнізе «Беларуская літаратура ў 50-я – 60-я гады XX стагоддзя» піша: «У паслясталінскі перыяд эксперыментальная паэзія асацыявалася пераважна з фігурай Янкі Сіпакова, якога неаднакроць як расхвальвалі, так і бэсцілі».

Так, я сапраўды шмат прыклаў намаганняў, каб прывучыць беларускага чытача да верлібра. У 1966 годзе ў «Дні паэзіі» надрукаваў свае нататкі «Імем натхнення», дзе наіўна, з юнацкай безагляднасцю тлумачыў сваю цягу да вольнага верша: «Куды смялей ехаць на зацугляным кані, моцна ўчапіўшыся за аброць. Але ж паэту няблага пракапыціць і на

вольным кані».

«ЛіМ» адразу ж друкуе артыкул вельмі паважанага мной крытыка: «Адказнасці, больш адказнасці».

Выходзіць кніга «Лірычны вырай» – гэта «даніна модзе», фармалізм, штукарства, «тое ж, што адзяваць штаны праз галаву». Што, там ёсць верш «Карэнне расы»? Глупства! Ніякага карэння ў расы няма! Мудры ўжо тады Міхась Стральцоў у сваёй рэцэнзіі ўсміхаецца: «Возьмем на сябе смеласць усё ж пахваліць гэты верш». І расказвае – чаму.

Адзін артыкул пра маю творчасць нават называўся так – «Разбурэнне словам».

«Верлібр – мода». «Вольны верш не прыжывецца ў нашай напеўнай паэзіі». Дзіўна, але сёння верлібрам пішуць нават тыя, хто зацята змагаўся з ім!

Аднак я ні з кім не сварыўся, ні на кога не злаваўся, ні з кім не спрачаўся. Проста пісаў. Хацеў нешта даказаць сваімі творамі.

Алег Лойка тады заўважыў: «Лірык з вялікім запасам творчых магчывасцяў, Сіпакоў, напэўна, і надалей будзе займаць значнае месца ў творчых спрэчках, што чакаюць нашу паэзію».

І – як у ваду глядзеў! Наступную маю кнігу «Дзень» два таксама паважаныя мною крытыкі стапталі зусім: сканструяваныя вершы, пазбаўленыя паэзіі, вымучаныя прыдумкі, паэт ставіць рэчы з ног на галаву, думае толькі пра форму, паэт быццам бы знарок пазбягае вострых сацыяльных праблем і канфліктаў…

І раптам гэтую кнігу вылучаюць на атрыманне Дзяржаўнай прэміі. Узнагароды яна, вядома ж, не атрымала, але погаласка пра яе пайшла. Пагаварылі добра. Мяне здзівіў Уладзімір Дамашэвіч, глыбокі празаік, ён напісаў прафесійны артыкул пра паэзію: «Важкі атрымаўся зборнік у Я. Сіпакова».

Вось так, Алесь, мы і жылі.

А цяпер пра арыентацыю нас з Разанавым на досвед прыбалтыйскіх літаратур. Не ведаю, як Разанаў, а ў мяне такой

арыентацыі не было. Якая арыентацыя і навошта патрэбна нам, калі наш народ верлібрам, вольным вершам, карыстаўся – маліўся і плакаў – спрадвек? Нашы старажытныя галашэнні – гэта ж і ёсць сапраўдныя верлібры. Памятаеце: «Вярніся ж ты, дачушка мая родная, мая залаценькая. А я ж цябе чакаць буду, а я ж цябе шукаць буду. Ці ты вырасцеш красачкай, ці прыпаўзеш мурашкай? А хоць прыляціш зязюлькаю, не размінешся з матулькаю».

Ці яшчэ: «А наша ж ты гараватніца! А наша парадніца! А куды ж гэта ты гэтак выradзілася, а куды проціў лецейка цёпленькага сабралася? А чым жа мы так угнявілі цябе, што ты нас і бачыць не хочаш і чуць не жадаеш».

А памятаеце, як, паводле «Баркулабаўскага летапісу», плакалі беларусы падчас найвялікшага паморку вясною 1602 года: «Матухна, зязюлюхна, утухна, панюшка, спадарыня, сонца, месяц, звёздухна, дай крошку хлеба…» Стаялі каля варотаў з раніцы да вечара, а то і паміралі з гэтым верлібрам-просьбаю на вуснах.

Так што карані нашага верлібра – у нашай старажытнасці. У малітвах. І пісаць вольныя вершы мы можам вучыцца ў свайго народу.

А эксперыменты мае ніколі не былі толькі дзеля эксперыментаў – яны заўсёды неслі ў сабе стваральную сілу.

І кожная мая паэтычная кніга задумвалася як паэма – таму ва ўсіх іх ёсць сюжэт.

– Ці ёсць у Вас пераемнікі ў цяперашняй беларускай літаратуры?

– Пераемнікаў у мяне няма. Нават тыя маладыя паэты – а я доўгі час быў старшынём камісіі па рабоце з маладымі ў Саюзе пісьменнікаў, – першыя кнігі якіх я рэдагаваў і па магчымасці якім дапамагаў, адказваючы на пытанні пра сваіх настаўнікаў, называюць зусім іншыя прозвішчы. І я, кажу шчыра, лічу гэта

нармальным, ні на кога не крыўдую, бо лічу, што ў пісьменніка не павінна быць пераемнікаў: прыйшоў у літаратуру – займай сваю дзялянку і касі. Пераемнікі, паслядоўнікі ў літаратуры – гэта ўжо, хоча нехта ці не хоча, а крышачку эпігоны: яны ж імкуцца пісаць, як ты! А сапраўдны пісьменнік павінен абавязкова стварыць сваю літаратурную сістэму каардынат, прапанаваць свой лад творчых каштоўнасцяў.

– Чаму ў XXI стагоддзі Вас амаль перасталі друкаваць у «Мастацкай літаратуры»?

– А хіба толькі мяне аднаго не выдаюць? Шмат хто ніяк не можа прыйсці да сваёй кнігі. А выдаюцца самыя прадпрымальныя, энергічныя. Час такі! А мой томік выбранай прозы ў серыі «XX стагоддзе» ўжо гадоў пяць пераносіцца з плана ў план. Кажуць, грошай няма.

Але ж часам здараюцца і нечаканыя падарункі.

Гады тры таму ў Індыі ў перакладзе на хіндзі выйшаў ладны том маёй выбранай паэзіі «Чорны Бог і іншыя вершы». Усю кнігу пераклаў прафесар Дэлійскага універсітэта імя Джавахарлала Нэру Вар'ям Сінг. Тады ж у Дэлі, у беларускім пасольстве, была прэзентацыя. На ёй прысутнічаў прэзідэнт Індыі. Кажуць, яму кніга спадабалася.

Пра гэта я даведаўся з беларускага радыё. Сам жа на прэзентацыі не быў.

– І напрыканцы традыцыйнае пытанне пра асабістыя планы.

– Хачу скласці дзевяцітомнік сваіх выбраных твораў. Ведаю, што рабіць гэтага не трэба, разумею, што яго ніхто і ніколі не выдасць, але ўсё ж складу.

Якім я яго бачу?

Два першыя тамы – паэтычныя. У першым – лірыка ды элегіі з кніг «Лірычны вырай», «Дзень», «У поўдзень, да вады», «Усміхніся мне», а ў другім – балады і паэмы ў прозе: «Веча славянскіх балад», «Ахвярны двор».

Трэці том – нарысы: «Акно, расчыненае ў зіму», «Ціхая Акіянія», «Па зялёную маланку», «Даверлівая зямля», «Паштоўкі ў Кіеў», «Аазісы», «Зямля перад кветам», «У сабакі на хвасце».

Чацвёрты – аповесці, пяты – апавяданні.

Шосты – прытчы і метафары, фантастыка: «Тыя, што ідуць», «Блуканне па іншасвеце».

Сёмы – раман у апавяданнях «Зубрыная сага». Дарэчы, я яго ўжо закончыў і выдрукаваў часткамі ў газетах і часопісах («Хуткія Ногі», «Паморак», «Мсье», «Русалка», «Па дарозе ў прыгожы зялёны сад», «Жонкі Ягайлы» і г. д.).

Восьмы – эсэістыка. Кніга «Зялёны лісток на планеце Зямля» – своеасаблівы партрэт Беларусі, у якім – усё пра нас: дзе мы жывём, што мы ямо, нашы людзі, наша зямля, нашы хаты, наша неба, нашы песні, нашы лясы, нашы замкі і г. д. Трыццаць эсэ. У гэтым жа томе – іншыя эсэ: «Коні», «Мужчыны», «Язычнікі», «Свята», «Паляванне» і інш.

А ў дзевятым – мініяцюры. Гадоў дзесяць запар я друкаваў іх у «Маладосці»: «Як птушкі ў лёце», «Наталенне смагі», «Узятак з маўчання», «Дні за спіною», «Такое сіняе неба», «Паміж сонцам і дажджом». «Водар дзядоўніка», «У свята Расы» і інш. Сюды ж хацеў бы ўключыць і свае развагі пра літаратуру, артыкулы пра «Боскую камедыю» Дантэ, пра Уолта Уітмена і Аляксандра Пушкіна, пра Янку Купалу, Максіма Багдановіча, эсэ пра Уладзіміра Караткевіча («Між Дняпром і крыкам жураўліным»), згадкі пра Сяргея Дзяргая («Сяргей Сцяпанавіч»), а таксама найлепшыя інтэрв'ю, сярод якіх хацеў бы бачыць і вось гэтую нашу гутарку з Вамі.

І яшчэ з планаў. Пішу экстрэмальныя апавяданні («Лета 2002 года», «На мядзведзя. З рагацінай», «Сабакі») і навэлы пра каханне («Суседка», «Элен», «У чуме»).

Бачыце, Алесь, як ён расхваліўся? Выбачайце за гэта і давайце ўсё спішам на юбілейнае інтэрв'ю. А за пытанні, якія далі мне магчымасць так разгаварыцца – дзякуй.

Гутарыў Алесь Аркуш
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/12
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1/2 [image] [image]2006

ад Зьмітрыя

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Югася Каляда Пакаленьне «Нуль» Пяць апавяданьняў

ЮГАСЯ КАЛЯДА (нарадзілася ў 1981) – пісьменьніца, настаўніца, вывучае крымінальнае права. Жыве ў Гомелі. Аўтарка кнігі «Галоўная памылка Афанасія» (2005).

---

1. ПЕРШАЕ ВЯРТАНЬНЕ

Ня маю ніякага жаданьня хлусіць, што гэта была найжахлівейшая вандроўка ў маім жыцьці. Праз усю Эўропу – ад Трыесту да Гомелю – на недабітым смуродным ЛАЗе! – мае бацькі жахаліся; я сама цяпер жахнулася б: мы спыняліся на рамонт разоў пяць, ня менш! Але мне тады было трынаццаць гадоў, палохацца кожнай дробязі (а па вялікім рахунку – сьмерці) я яшчэ сябе не прывучыла, і таму гэтае жорсткае выпрабаваньне – вяртаньне з Італіі на старым сьмярдзючым аўтобусе – было для мяне цудам і ажыўленай казкай.

Я ня памятаю ўсёй вандроўкі. Узгадваю – і здаецца, што пражыла ў ЛАЗе цэлую эпоху: ад мяжы да мяжы. А вось асобныя дробязі трэба як нератам выцягваць з памяці.

У Трыесьце мы начавалі. Спалі ў ЛАЗе. Фіранка не расьцягвалася на ўсё акно; мы завешвалі яго майкамі, коўдрамі, завязвалі сабе вочы ручнікамі: за вокнамі міргала чырвоным, не пускаючы ў сон, шыльда «MOTEL». Маё крэсла раскладалася рыхтык на калені хлапчуку ззаду; мы падпіралі

сьпінку заплечнікамі ды торбамі.

Дваццаць сем дзяцей – загарэлых, з валізкамі, поўнымі новых шмотак ды цацак, – за чатыры дні вяртаньня мы сталіся ледзь не сям'ёй: мы хацелі дахаты.

Мы забавіліся ў Італіі на лішнія тры тыдні: былі нейкія праблемы з дакумэнтамі, і мы з Вольгаю гэтыя тры тыдні сумавалі ўжо непрыкрыта: сядалі на гаўбцы, сузіралі дворык ды хацелі дамоў. Таму сустрэча зь сьмярдзючым ЛАЗам у Трыесьце была для нас абяцаньнем блізкай Радзімы.

Што я памятаю? Югаславію – тое, што нядаўна яшчэ было Югаславіяй – з ахайнымі домікамі ў квецені; памятаю сады на тле вечаровага ружовага неба; Вугоршчыну – як адну фразу кіроўцы: «Гэта – Буда, па той бок – Пэшт!».

З кіроўцамі мы здружыліся. Мы з Вольгай аддалі ім тры пачкі нашых крэкераў: «Біскоці! Грацыe пэр біскоці! – Дзякуй за печыва!» – вучылі мы іх італьянскай. А кіроўцы падзялілі на ўсіх дзяцей бохан чорнага хлеба – па скібачцы на кожнага, а нам з Вольгай, як «старэйшым» і «набліжаным», перапала яшчэ па кавалку сала. Дома я ня ела ні сала, ні чорнага хлеба, але ў аўтобусе ад замілаваньня ледзь ня плакала: чорны! сапраўдны!

А ва Ўкраіне мы зламаліся. А пятай раніцы пасярод поля. Мы выйшлі з аўтобуса ў вільготны туман, і я замерла: там… дзе займаўся сьвітанак… дзе неба ружавела… Поле! Гэта было поле! Першы раз за два месяцы – чысты далягляд!

У Італіі мы з Вольгай, выявіўшы ўласную недасьведчанасьць у геаграфіі, дапыталіся ў італьянцаў: што гэта ў вас за горы? Італьянцы дзівіліся: якія горы? Гэта пагоркі! Мы былі ўпартыя: не, якія пагоркі, гэта ў вас горы!

І вось яно: поле! Чысты далягляд! Такое поле, што ажно відаць: зямля круглая! А кіроўцы, пакуль мы ўмываліся з бутэлек, мянялі кола.

Кола заняло належнае месца, калі сонечныя промні ўжо разагналі туманы з палёў. І мы зноўку паехалі.

Мы ўсё ехалі ды ехалі; на ўкраінскіх дарогах наш ЛАЗік ужо ня быў чужынцам, перастаў вытыркацца з пэйзажу, зьліўся з навакольлем: стаў целам ад цела радзімы. Мы былі амаль дома.

А мы ўсё ехалі ды ехалі. Мне ды Вользе, як старэйшым, было дазволена сядзець побач з кіроўцамі: на адкідным крэсьле, удзьвюх, зьвесіўшы ногі над прыступкамі, стараючыся не абапірацца на дзьверцы ЛАЗіка, што трымаліся «на саплях». Мы сядзелі, боўталі нагамі, абедзьве схуднелыя, загарэлыя, нямытыя – і шчасьліва ўзіраліся празь неабсяжнае лабавое шкло ў дарогу.

Мы глядзелі на гэтую дарогу, якая шырокай стужкай наплывала на нас ды зьнікала пад коламі аўтобуса – і ведалі, што дарога не бясконцая. Нам было па трынаццаць гадоў; мы ўпершыню – і да таго ж самастойна, без бацькоў! – ажыцьцявілі такую далёкую вандроўку. Мы даведаліся, куды вядуць дарогі; мы заехалі глыбока ў Эўропу, мы былі ў Флярэнцыі! – а вось цяпер той самай дарогай мы вярталіся дадому.

Дарога – яна вілася перад намі, клалася пад колы аўтобуса, зьнікала за нашымі сьпінамі; мы спасьцігалі яе – кожны адціначак, кожны кілямэтар; мы лічылі дні, гадзіны, хвіліны; мы былі да сьлёз удзячныя ёй – той дарозе, што цяпер пэўна вяла нас да Радзімы.

Мы прысьпешвалі час; як моцна мы хацелі вярнуцца дадому!

* * *

Да Гомелю мы пад'яжджалі ўночы.

Гомель! Я ня здолела ўседзець на сваім зламаным крэсьле. Я падскоквала – і апускалася, стрымліваючы сябе думкай аб тым, што непрыгожа «дарослай дзяўчынцы» гойсаць у праходзе, – і зноў ускоквала, бо не магла стрымацца!

Маленькі Цімка, якога старэйшыя хлапцы ў часе вяртаньня ўжо тройчы жартам будзілі ў Вугоршчыне ды Ўкраіне: «Ціма,

Гомель!» – васьмігадовы Цімка таксама ня спаў: ён пільна, без усьмешкі, узіраўся ў цемрыва, слаба разбаўленае ліхтарамі: сапраўды, гэтым разам ужо пэўна Гомель!

Гомель! Гомель! Я хацела закрычаць ад радасьці, але зьдзіўлена заўважыла: не магу! Мне на хвіліну перахапіла горла: заняло мову, упершыню ў жыцьці. Цяпер, пасталеўшы, я самлела б, палезла б па валідол, схапілася б за сэрца: нішто сабе! – хачу сказаць слова й не магу! Але тады, у трынаццаць гадоў, я толькі рукой махнула: падумаеш, горла перахапіла; затое мы ўжо ў Гомелі! Вярнуліся! Мы – дома!

Аўтобус спыніўся на галоўнай плошчы, насупраць упраўленьня статыстыкі. Я вылецела з ЛАЗіка, павісла на татавай шыі ды закрычала:

– Тата! Тата! Я бачыла Давіда! Ён проста на вуліцы стаіць, уяўляеш! Сапраўдны Давід!

Бацька сьмяяўся; я ўжо цягнула за руку Вольку:

– Вось з гэтай дзяўчынкай я жыла!

А Воля, у сваю чаргу, таксама падцягвала мяне, каб паказаць, да сваіх родных. На пляцоўцы насупраць статупраўленьня сярод ночы ўсчаўся вэрхал: бацькі сустрэлі дзяцей, дзеці, якія жылі па двое, знаёмілі міжсобку бацькоў…

Урэшце тата пайшоў шукаць у багажы мае торбы; Воля з бацькамі ўжо сядала ў машыну; я на хвілінку засталася адна ды пачала азірацца.

І вось тады я ўбачыла Яго. Ён стаяў, вялікі, бронзавы, над плошчай свайго імя, аточаны елкамі, таемна пабліскваў у слабым ліхтарным сьвятле. Вялікі, вялікі, нямы, ён узіраўся невідушчымі вачыма ў непраглядную цемрадзь, не зважаючы на мяне, ні на кога; і ён мяне нечакана спалохаў. Я пра яго ня думала, я не хацела зь ім сустрэцца, я ўвогуле забылася, што ён тут ёсьць; а ён – ёсьць… Як я магла забыцца?..

Я хутка адвярнулася; тата ўжо прыцягнуў мае торбы.

– Стамілася?

І я ўспомніла, што стамілася.

– Вельмі! Зараз толькі памыцца – ды спаць…

– Не памыесься. Вады гарачай няма, – сказаў тата.

Наколькі магутнай была мая першапачатковая радасьць, нагэтулькі ж магутным сталася маё – што? Расчараваньне? Крыўда? Злосьць? Я не магла знайсьці адпаведнага слова, каб патлумачыць тату маю раптоўную зьмену настрою. Праз колькі гадоў я даведаюся, што з мной здарыўся звычайны культурны шок – якога не было, дарэчы, па прыезьдзе ў Італію. Культурны шок – наступным днём я ляжацьму, заплаканая, тварам да сьценкі ў роднай кватэры па праспэкце Кастрычніка.

А тады, на плошчы, я проста выкрыкнула, злуючы на сябе за страчаную радасьць вяртаньня:

– Дык навошта я прыехала?!

Тата злавіў таксоўку; мы селі ды паехалі. Я супакойвала сябе: ну падумаеш, няма гарачай вады! Затое зараз я ўбачу маму, Пашу, Дашу! Падумаеш: вада гарачая!

Мы ехалі ў таксоўцы па бязьлюдным начным Гомелі. Мне было трынаццаць гадоў. Ну так, правільна: жнівень 1994 году. На наступны дзень мне распавядуць апошнія навіны, і я даведаюся, якія зьмены адбыліся на Радзіме, пакуль я гуляла па Флярэнцыі; даведаюся, *куды* я вярнулася.

2. ЖОЎТЫ АЎТАМАБІЛЬ

Люка нецярпліва паторгаў левай рукой, каб гадзіньнік зьявіўся з рукава.

– Палова на дзясятую! Яшчэ зусім рана, Элен!

Агеньчыкі сьвечак здрыгануліся ад няўлоўнага скразьняку.

– Сапраўды, Элен! Заставайцеся з намі! – дзёрзка падхапіў афіцыянт, які нахіліўся над сталом, мяняючы попелку, ды пайшоў, стрункі, ахайны, вышкалены, пераможна зьнік у нетрах рэстарацыі.

Агеньчыкі сьвечак зноўку заторгаліся, і задрыжэлі зыбкія цені, штоімгненна мяняючы выразы твараў маленькай кампаніі за столікам ля акна.

Элен ледзь заўважна, з палёгкаю, уздыхнула; Франк адшукаў пад сталом ейную руку ды схаваў у сваіх далонях. Люка нарэшце падпаліў цыгарэту ды прыціснуў да сябе Шанталь; тая віскнула, нібы пратэстуючы; Сымона засьмяялася.

– Дык я пра што кажу, – узнавіў Люка перапыненую афіцыянтам гутарку, – нікому ейныя праблемы ня рупілі! Сама, усё сама, ад пачатку!

– Лухта, – запярэчыла Сымона, – ёй дапамагалі!

– Бацькі, напрыклад. Сябры, – прапанавала Шанталь.

Яна ўжо паклала галаву на плячо Люку, і той абыякава перабіраў пальцамі ейныя валасы, не страчваючы цікавасьці да размовы.

– Дапамагалі! Ну дык што? Калі б яна сама ня мела жаданьня…

Франк працягваў сьціскаць далонь Элен; раз-пораз ён трывожна пазіраў на яе, нібы хацеў запэўніцца, што сяброўцы нішто не пагражае. Элен ня ведала дзяўчыны, пра якую вялося, таму, безуважная да гутаркі, глядзела ў акно.

За шкляной сьцяною рэстарацыі панаваў бестурботны, бязмэтны рух. Бадзяліся ачмурэлыя пад вечар, уражаныя парыскай раскошай турысты; дзьве жанчыны палілі на лавачцы ды бязгучна сьмяяліся; на супрацьлеглым баку вуліцы людзі з дарожнай службы спрытна грузілі на эвакуатар незаконна прыпаркаваныя машыны, і ўжо нейкі маладзён выбег з рэстарацыі насупраць ды безвынікова нешта даводзіў.

І раптам завібраваў, зароў на ўвесь бульвар Сэн-Жэрмэн

незразумелага паходжаньня шум, магутна перакрыўшы ўсе іншыя гукі.

Элен першая прыкмеціла жоўтую, як канарэйка, спартовую машыну, якая нахабна, не зважаючы на эвакуатар, прытармазіла рыхтык насупраць рэстарацыі.

– Ого! Нішто сабе! – Франк, не выпускаючы далоні Элен, пасунуўся да акна, не зважаючы на абурэньне Сымоны: ён ледзь не перакуліў на сястру віно.

Люка таксама памкнуўся да акна, каб угледзець дзівосную машыну, і Шанталь давялося пасунуцца.

Шыкоўны спартовы аўтамабіль роў бесьперапынна; мурын, які сядзеў за рулём, задаволена ўсьміхаўся.

– Гэта «Лямбаргіні»! – сьцьвердзіла Сымона.

– Прыго-о-о-ожанькая якая! – замілавана прасьпявала Шанталь. – Жоўценькая!

Вакол машыны ўжо зьбіраўся маленькі натоўп. Нейкія падлеткі бессаромна абмацвалі жоўтае дзіва; у кагосьці нават знайшоўся фотаапарат.

Мурын, трапіўшы ў цэнтар увагі, вырашыў прадэманстраваць усе здольнасьці свайго аўтамабіля. Нечакана для ўсіх ягоныя дзьверцы, як матыльковыя крылы, лёгка ўзьняліся ўгару. Купка ашалелых ад шчасьця падлеткаў з падвоенай хуткасьцю зашчоўкала камэрамі ў мабільніках.

Тры здаровыя, як шафы, нэгры падбеглі да аўтамабіля; яны імпульсіўна размахвалі рукамі, можа, вітаючы сябра, ці, можа, нешта яму даводзячы. Кіроўца штосьці пракрычаў у адказ ды пачаў апускаць дзьверцы.

– Як яны там зьмесьцяцца? – жахнулася Шанталь.

Але мурыны спрытна, празь верх, ускочылі ў машыну. Аўтамабіль зароў з падвоенай моцай ды, на вялікі жаль падлеткаў, сарваўся зь месца ды зьнік, палохаючы Сэн-Жэрмэн

зьвярыным рыкам.

Усе вярнуліся на свае месцы.

– Панаехала рознай швалі, – нязлосна адзначыў Люка.

Нават абазнаны ў чалавечых эмоцыях афіцыянт не адразу прыкмеціў бы катастрофу. Прыгожая дзяўчына несла да вуснаў віно, але перадумала, не данесла, паставіла кілішак на стол, заправіла бялявую пасмачку за вуха, узяла цыгарэту…

Элен пабаялася перакуліць на сябе віно; яна сьціснула кілішак, апусьціла яго на столік і, каб пераканацца, што пальцы не калоцяцца, працягнула руку да цыгарэтнага пачка.

Франк не заўважыў, калі Элен пасьпела прыбраць ад яго руку, і цяпер зьдзіўлена сачыў, як яна шукае цыгарэты: рука ягонай дзяўчыны, чужая, не ягоная, самастойная! Ён бы паднёс Элен запальнічку, але яна пасьпела шчоўкнуць сваёй.

Элен зацягнулася, выпусьціла дым ды паглядзела ў вочы Люку:

– І я таксама шваль?

– А ты тут пры чым? – не дапяў Люка – але адразу ж выдатна зразумеў, як і Франк, Сымона і Шанталь.

Элен спакойна патлумачыла:

– Ну, я ж таксама панаехала!

Паветра рэстарацыі набрыняла катастрофай і скандалам.

Сымона паціснула вусны; Шанталь схавала вочы. Франк, ашаломлены – не ўратаваў! – пераводзіў спалоханы позірк зь Люкі на Элен, ня ведаючы, чый бок прыняць: палюбоўніцы ці лепшага сябра.

– Я цябе ня меў на ўвазе! – паспрабаваў абурыцца Люка. – Элен, ты што?!

– А чаму? Бо я белая? Не мурынка, не арабка? Ведаеш, чым гэта

патыхае? Зыггайль і бліцкрыг? Не, Люка, трэба быць пасьлядоўным! Панаехала рознай швалі – я таксама табе дыхаць замінаю?

Люка абурыўся:

– Што ты вярзеш?

Але сапраўды абуранай была толькі Элен; яна намагалася прамаўляць спакойна, але ейны голас зрываўся, нібы правальваўся ў вантробы, каб вырвацца рыкам ці то плачам.

– Вярзу што думаю! А цяпер ты, Люка, падумай – пра тых, хто панаехаў! Так, пра шваль! Гэта трагедыя – усяго жыцьця – зламанага жыцьця – разумееш? Не зразумееш ніколі, што гэта за боль. Мацнейшы за ўсё – і нераадольны. Якое там каханьне ў параўнаньні з гэтым болем? – так, катар! І нічога няма больш значнага ў жыцьці, разумееш, Люка? Думаеш сьпярша: як проста зьехаць! А потым разумееш, што да Радзімы як вяроўкамі прывязаны! І гэты боль, ён у сэрцы назаўжды, на ўсё жыцьцё – можаш уявіць? Кожны зь іх – кожны з нас – разумее, што ніколі – ніколі, Люка! – ня вернецца дамоў!

– Навошта трэба было эміграваць? – прабурчэла Сымона – з разьлікам, каб пачулі.

Элен адказала, не паварочваючы галавы:

– А чаму парыжане ўцякалі з акупаванага фашыстамі Парыжу? На радзіме жыцьця няма, на радзіме цябе трымаюць за быдла, думаеш зьехаць – а тут ты шваль! І замінаеш усім дыхаць! Цікавыя ідэалы гуманізму, праўда? Галоўнае, каб скура не пацямнела – так? Абаронім чысьціню нацыі! А куды падзецца чорным? Застрэліцца ўсім? Каб вочы ня мулялі?

Па шчаках Элен папаўзьлі сьлёзы; яна гэтага не заўважала. Франк не наважваўся суцяшаць сяброўку; ён не лічыў, што Элен мае рацыю. Ён сапраўды не разумеў, чаго яна так усхвалявалася; як не разумелі Люка, Сымона і Шанталь. Франк бачыў толькі, што Элен распальвае непатрэбную вайну ў іхняй кампаніі, і выдатна ведаў: калі сястра зь сябрам запатрабуюць

ад яго зрабіць выбар… Выбар будзе, пэўна ж, не на карысьць вечна няшчаснай Элен.

– Я ня маю дому, Люка. Я не магу вярнуцца. Я не магу жыць на Радзіме. І мне невыносна жыць тут. Я засталася без Радзімы. Ты не зразумееш…

Элен адчула, што яна больш не злуе; адчула няёмкасьць за зладжаны скандал. Яна хутка паднялася, каб сыходзіць.

– Даруйце, калі ласка. Вы маеце права думаць пра мяне што заўгодна. Даруйце, калі ласка! – і сьпешна выйшла з рэстарацыі.

– Вар'ятка, – адразу сказала Шанталь, – псыхапатка!

Франк зірнуў на яе спадылба, і Шанталь змоўкла.

– Нішто сабе, – выдыхнуў Люка.

Ён заўважыў, што раструшчыў у пальцах цыгарэту.

– Віншую, – сказала брату Сымона, – бяжы, суцяшай! А то праўда ж, пойдзе ўтопіцца! Знайшоў сабе… нявесту без радзімы!

Франк выбег на вуліцу ды пачаў азірацца, шукаючы Элен.

Яна сядзела на лаўцы, сьпінаю да рэстарацыі, працягнуўшы ногі да тэлефоннай будкі.

– Хадзем? – прапанаваў Франк.

– Хадзем, – згадзілася Элен.

Яны нясьпешна пакрочылі ў бок мэтро. Турыстаў крыху паменела.

Франк абняў Элен за плечы; яна больш не калаціласа і ўвогуле выдавала на цалкам супакоеную.

Крамы ўжо пачыналі патроху ўпрыгожваць, хоць да Калядаў

заставалася больш за месяц. Ад дрэва да дрэва цягнуліся гірлянды лямпачак, а ў некаторых вітрынах ужо зьявіліся ялінкі.

– Прыгожа, праўда? – міралюбна спытаў Франк.

– Хачу дамоў, – сказала Элен па-беларуску.

– Quoi? Je ne comprends rien! – перапытаў хлопец. – Не зразумеў!

– Ха-чу да-моў, – зноўку па-беларуску сказала Лена.

3. НЯМА. І БОЛЬШ НЯ БУДЗЕ

– А вось, глядзі, – Арцём павёў пальцам па цэляфане, у які была абгорнутая старонка мэню, – вось яшчэ торцік… з ананасамі. Хочаш з ананасамі?

– С-слухай, – шэптам, ажно перарывістым ад незразумелай злосьці, зашыпела Таня, – слухай, што ты да мне дачапіўся? Я сказала: не хачу! Ці зь першага разу не зразумеў? Зусім дурны?

Арцём моўчкі закрыў мэню й акуратна паклаў яго на край століка. Першы раз за ўвесь вечар Таня глядзела яму ў вочы: глядзела зь нянавісьцю, нібы наставіўшы на яго стрэльбу.

Упершыню за вечар Таня паглядзела на Арцёма, і ён баяўся перарваць гэтую вяровачку кантакту, баяўся страціць шанец зразумець, адкуль гэтулькі злосьці ў Таніных вачох. І што выклікала такі выбух нянавісьці? Пэўна ж, не ананасавы торцік…

Але Таня, мабыць, адчула недарэчнасьць апошніх словаў і перавяла позірк за акно, як мага далей ад Арцёмавых вачэй.

Арцём зноўку разгарнуў мэню, каб ніхто больш не заўважыў ягонай разгубленасьці. Усё. Размовы ня будзе.

І Таня яму нічога не патлумачыць! Хаця што яшчэ тлумачыць? Сказала ж: зусім дурны! Ну ясна. Значыцца, усе ягоныя здагадкі

апошніх тыдняў былі не пустым трызьненьнем, не беспадстаўнымі падазрэньнямі; значыцца, яму не здавалася: Таня пачынае сплываць ад яго, аддаляцца, як ветразі на далягляцзе, сыходзіць, сыходзіць… Значыцца, не здавалася яму: сапраўды, хавае вочы, унікае размоваў, раздражняецца на кожнае ягонае слова…

Сыходзіць. Чаму? Куды?

Ля століка нечакана ўзьнікла афіцыянтка, нібы вынырнула з паўзмроку кавярні.

– Што вы хацелі б заказаць?

– Яшчэ па адной каве, калі ласка!

– Чагосьці яшчэ?

– Не, дзякуй.

Афіцыянтка забрала мэню й зьнікла; Таня адвярнулася ад акна ды, абмінаючы позіркам Арцёма, узялася разглядаць кавярню.

– Усё адно нічога прыстойнага зрабіць ня могуць! Што за прэтэнзіі на эклектыку? Сьцены – як у замку, столь – як у замку, а лямпы – як у салуне каўбойскім! А стойка – як у пляжным бары! А дзяружка на вокнах! Вясковая хатка! А посуд! Лыжачкі розныя! Што за прыдурак гэта рабіў? – дыыызайнэр! Школу скончыў – і ўжо дызайнэр! Вывесьці іх усіх ды расстраляць, невукаў гэтых! Яны й слова такога ня ведаюць – эклектыка! Гэта безгустоўнасьць! Гімн безгустоўнасьці! Найвышэйшая песьня невуцтва! Краіна дурняў!

– А табе што за клопат? – Арцём марна намагаўся перавесьці размову ў спакойнае рэчышча.

– А што?

– Чаго ты псыхуеш дзеля нейкай кавярні?

– А табе што за клопат?

Арцём, нібы абыякавы, паціснуў плячыма.

– Цікава.

– Цікава… Ну й мне цікава, ведаеш! Колькі *ўсё гэта*, – Таня патрэсла рукамі, паказваючы, што *ўсё гэта* шырэй за кавярню, – колькі ўсё гэта будзе доўжыцца? Калі ў гэтай краіне навучацца хоць нешта рабіць добра? Хоць нешта – прыгожа! Я люблю, калі ўсё прыгожа ды густоўна! Я не магу жыць сярод дурняў, якія аздабляюць кавярню ў гатычным стылі ды ставяць у ёй стойку «Трапікана»! І зацягваюць вокны рызьзём! Я не люблю хадзіць па брудзе, я хачу, каб ліхтары паўсюль былі!

– Таня… Што такое?

– Адчапіся…

Таня зноўку ўтаропілася ў акно, абы ня бачыць Арцёма. Ён таксама перавёў позірк у акно, толькі ня ў тое, у якое глядзела Таня, а ў тое, што было за ейнай сьпінай.

Новая кавярня месьцілася на рагу Леніна й Чырвонаармейскай, за два крокі ад вакзалу. Арцёму яшчэ ніколі не даводзілася сузіраць гэты адцінак гораду з такога нязвыклага ракурсу. Дом Камуны, на які глядзеў Арцём, не зрабіўся лепшым ад таго, што цяпер быў відам з кавярні. Рыхтык наадварот: чорныя прагалы заміж вокнаў, карнізы, парослыя дрэўцамі, глухі бэтонны плот – усе гэтыя самыя што ні ёсьць руіны ўмомант абясцэньвалі, пазбаўлялі сэнсу прэтэнцыёзную раскошу кавярні. Рэстарацыя зь відам на руіны – хіба не баляваньне ў часе чумы?

Арцём ведаў, што й тыя відарысы, якія цяпер сузірала Таня, не дадавалі ёй радасьці. Чорная дзірка вуліцы Чырвонаармейскай: лістападаўская цемра, патрушчаны асфальт і – лужыны: вялікія, глыбокія, на ўвесь ходнік…

Афіцыянтка прынесла каву і – чамусьці – сьвечку.

– Нам зараз адключаць сьвятло, – патлумачыла яна, – ненадоўга. На паўгадзінкі…

Таня нават не павярнула галавы; Арцёму здалося, што ўласна

Таня й арганізавала адключэньне сьвятла, як частку няўцямнага пляну, таемнага пляну – і чым яму пагражае гэтая гульня, Арцём пакуль не разумеў.

– Слухай, – Таня рэзка павярнулася да яго, і Арцём адразу здагадаўся: усё.

Усё: канец. Таня глядзела на яго, як на барную стойку, як на афіцыянтку, як на пякельныя нетры Чырвонаармейскай: уважліва-абыякава.

– Слухай, – сказала Таня, – я на наступным тыдні паеду да цёткі ў Менск…

І ў гэты момант пагасла сьвятло.

Кавярня адразу страціла ўтульнасьць, нібыта лістападаўская вільготная цемра халодным імжыстым паветрам заплыла ўсярэдзіну празь вялікія вокны. Нават трымценьне сьвечак на століках не ратавала ад улады восені.

Раптам раздаўся пранізьлівы кароткі вой такой моцы, што можна было затыкаць вушы. Усе, хто былі ў кавярні, здрыгануліся.

– Што гэта? – хутка спытала Таня.

– Сыгналізацыя, – здагадаўся Арцём.

– А, нармальна, – Таня авалодала сабой, – дык вось, слухай, я на наступным тыдні еду да цёткі ў Менск. На месяц прыкладна.

Арцём гэтага не чакаў.

– Навошта? – падазрона спытаў ён.

– Трэба, – Таня зноўку хавала вочы, – ну, справы сямейныя… Ну, не магу я табе сказаць!

– На месяц? А ўнівэр? Таня, апошні курс, перад сэсіяй, куды ты паедзеш? На месяц цэлы, ты што?

– Ну не на месяц, Арцёмка, на два тыдні, я да сэсіі пасьпею, у мяне ўжо тэма зацьверджаная, слухай, ну чаго ты хвалюесься? – Таня загаварыла хутка, фальшыва-весела, і Арцём бачыў: хлусіць… Хлу-у-усіць…

Настойліва, пранізьліва завывала сыгналізацыя, зь якой, пэўна, ніяк не маглі справіцца дзяўчаты з кавярні.

– Усё, досыць, не магу я больш! – Таня паднялася, рэзка адсунуўшы крэсла, ды схапіла – каб апярэдзіць Арцёма – сваё паліто зь вешалкі.

* * *

Цягам двух тыдняў Арцём не званіў Тані, як яна загадала; не спрабаваў ён шукаць яе па менскіх нумарох: бо цётка нібыта не любіла «Таніных хлапцоў». Скончыўся лістапад, і ўжо сьнежань засычэў пазёмкамі па прамерзлых лужынах, як раптам Арцём адчуў цяпло.

Нечаканае цяпло тулілася ў ягоных грудзёх, як быццам сэрца запрацавала ў зімовым рэжыме ды пачало саграваць свайго гаспадара. Арцём сашчапляў далоні, і з-пад пальцаў нібы выплывалі струменьчыкі цёплага паветра. Цяпло сярод зімы, незразумелая пяшчота – гэта было такім дзіўным адчуваньнем, і Арцём здолеў патлумачыць яго толькі адным: «Таня тут!»

Ён шмат разважаў апошнія два тыдні. «Усё, досыць гэтага дзяцінства, колькі ж можна!.. Пайсьці, купіць кветкі і – жаніцца! Што там ейная маці ўжо скажа – лухта, яна ўжо дарослая… Прапаную, і ажэнімся ўлетку ці ўвосень, а прапаноўваць трэба зараз жа…»

Ля Танінага пад'езду цяпло, што ўмацоўвала Арцёмаву ўпэўненасьць, кудысьці схлынула, і ён вырашыў затэлефанаваць, перш чым падымацца ў кватэру.

– А Тані няма! – радасна паведаміла ейная маці.

Арцём ажно бачыў, як тая ўсьміхаецца: Таніна маці не любіла яго, «інтэрнацкага басяка», ды, можа, і цяпер сузірала яго з

акна, з кветкамі, як дурня.

– А калі яна будзе?

– Тані няма! – радасна паўтарыла маці. – І больш ня будзе! Яна выйграла конкурс па навучальнай праграме… Таня ўжо тыдзень як у Злучаных Штатах! І, спадзяюся, яна ня вернецца! Так што ты, Арцём, не звані больш!

Арцём акуратна націснуў «адбой» на тэлефоне, нібы баяўся пашкодзіць слухаўку. Потым, гэтаксама акуратна, паклаў ружы ў сьметніцу ля лаўкі.

Ён асьцярожна, марудна азірнуўся навокал, каб запэўніцца, што ўсё ў гэтым сьвеце засталося на сваіх месцах. Двор быў той самы. Дом быў той самы. Лаўка, сьметніца, агароджа дзіцячага садка… Арцём задзёр галаву і ўбачыў неба, прамерзлае, як лужыны пад нагамі. Усё было там сама, дзе й хвіліну раней.

– Зараз… Зараз я знайду сябе, – вымавіў голасна Арцём, і падлетак, які шыбаваў поруч, зьдзіўлена зірнуў на яго.

4. ЖЫЦЬЦЁ ЛЁЛІ

Першага верасьня, пасьля адпачынку, Марына ішла на працу. Яна працавала бухгальтаркай у раённым аддзеле адукацыі. Апрача яе, там працавалі яшчэ дзесяць бухгальтарак, іхняя начальніца, ейная намесьніца – група зарплаты; фінансавая група, матэрыяльная, гаспадарчая, эканамісткі, касірка, прафкам, кадры, рэвізоры, пэрсаніфікаваны ўлік, мэтадыст па фізкультуры, інспэктар па навучальнай рабоце… Кладаўшчыца, канцылярыя… Спэцыялісты па апякунстве, па надомным навучаньні, па выхаваўчай рабоце… І ўласна загадчык і ягоны намесьнік.

Марына не хацела ісьці на працу. Яна ўвогуле не хацела там працаваць: адразу, як уладкавалася, так пяць гадоў запар і не хацела. Але ўсё адно ішла.

Раённы аддзел адукацыі месьціўся ў будыначку, які ў часе вайны займала гестапа.

Марыне выклалі гэтую легенду, як толькі яна ўпершыню села за свой новы працоўны стол. Стол аказаўся стары: хісткі, ненадзейны, ён штохвіліны пагражаў вызваліцца ад цяжару папер ды кампутара, таксама старога. Марына была ўражаная: усе пяць гадоў сваёй работы ў аддзеле яна знаходзілася пад уражаньнем гэтай інфармацыі: гестапа! Нішто сабе! Яна так і казала маці шторанку: пайду ў сваё гестапа! А калі знаёмыя цікавіліся, дзе яна працуе, тлумачыла: ну, на Пляханава, побач з паркам ды музпэдам, на рагу за крамай агародніны, былое гестапа, памятаеце? Усе жахаліся; толькі аднойчы нейкі дасьціпнік падтрымаў жарцік:

– Ja, ja!

Ля крамы Марына збочыла ды запаволіла хаду: каб прамарудзіць апошнія крокі адпачынкавага жыцьця ды адцягнуць сустрэчу з родным аддзелам. Вось ён: шэранькі, непрыкметны, хаваецца за плотам дзіцячага садка; і які мінак ведае, што ў гэтым сьціплым двухпавярховым будыначку, у цеснаце, як зярняткі ў агурку, сядзяць амаль пяцьдзясят кабет? Сядзяць штодня, апрача суботы ды нядзелі, сядзяць упарта, зь дзевяці да шасьці, сядзяць ды балбочуць, балбочуць, балбочуць няспынна – хто ўявіць такое?

Але немінучы момант надышоў, і Марына, цяжка ўздыхнуўшы, пацягнула на сябе дзьверы канторы. Розныя спэцыяліскі па балбатні таксама падцягваліся да працы; Марына ўсьмешліва віталася.

Але не пасьпела Марына ўладкавацца за працоўным сталом, як яе адразу паклікалі да начальніцы.

З сваёй начальніцай – галоўнай бухгальтаркай – Марына сябравала. Начальніца шчыра хацела выдаць яе замуж.

Вольга Іванаўна таемна ўсьміхалася.

– А ну, дзьверы зачыні!

Марына паслухмяна, нічога не разумеючы, шчоўкнула замком.

У кабінэце начальніцы сабраліся: сама Вольга Іванаўна, намесьніца Каця Казьлевіч, ну й яна, Марына; а на падваконьні чамусьці сядзела незвычайна вясёлая Лёля Марчук. І ўсе, усе ўсьміхаліся, ажно прамяніліся; а Марына нічога не разумела.

– Ну, пакажы пярсьцёнкі! – загадала Лёлі Вольга Іванаўна, і тая растапырыла ўсе дзесяць пальцаў.

– Ой, – усьміхнулася Марына, – што, Лёлік, замуж выйшла?

Марчук, не губляючы загадкавай усьмешкі, адмоўна пакруціла галавой ды запытальна зірнула на начальніцу.

– Ня выйшла, але выходзіць! Ну, Лёля, давай распавядай! – дазволіла нарэшце Вольга Іванаўна. – Сядай, Марына, ды слухай уважліва! Распавядай, Лёля, усё як ёсьць!

– Слухайце, – сьпешна загаварыла Лёля, – ён з Нарвэгіі! З такога гораду… Назвы ўсё ніяк не запомню, у мяне запісана! Мы з Куртам пазнаёміліся ў чаце! А я ж наўмысна знаёмілася, ну, мне ўжо час, мне дваццаць восем ужо! Знаёмілася з адным, зь пятым, дзясятым – а ён мне адразу спадабаўся! І я яму! Мы так во балбаталі, потым ліставаліся, потым сазваніліся… Ну вось, дык мы вырашылі сустрэцца ў Турцыі. Як турысты паасобку паехаць ды ўбачыцца на нэўтральнай тэрыторыі. Я ў сваім гатэлі, ён – у сваім, ну, на трэці дзень я да яго ў нумар пераехала…

Лёля палезла ў торбачку па фатаздымкі; Каця, Марына й Вольга Іванаўна сышліся лбамі, зь цікаўнасьцю разглядаючы кавалачкі чужога шчасьця.

– Ну, Лёля, ну гэта твой тып, адназначна твой! – аўтарытэтна абвясьціла начальніца. – Вы зь ім нават падобныя! Пэўна твой! Зразумела, Марына, як трэба? Зразумела? Я ж цябе ня проста так паклікала!

– …І зь ягонымі бацькамі ўжо па тэлефоне размаўляла! Мяне там ужо ўвесь гарадок чакае! – Лёля ўсё расказвала ды расказвала, відавочна, ня ў першы раз, бо гаварыла занадта спрытна.

Хвілінаў празь дзесяць Марына спаслалася на занятасьць, павіншавала – ужо былую – калегу Лёлю ды пабегла ў прыбіральню: плакаць.

У прыбіральні Марына замкнула на засаўку спарахнелыя дзьверы, пусьціла ваду ды зараўла непрыхавана, уголас, ля адкрытага акна, не баючыся, што яе пачуюць дзеці з выхавацелькай на пляцоўцы ўнізе.

Марына плакала ад салёнай зайздрасьці да чужога шчасьця. Лёля! – хто б мог падумаць! – Лёлька Марчук! – выходзіць замуж у Нарвэгію! Марчук! – ейная шчасьлівая ўсьмешка ды новыя пярсьцёнкі нібы ўтыркнуліся Марыне ў вочы, ажно да самых мазгоў – Марчук, Лёля! – умомант яна ператварылася ў казачную прынцэсу, замежную зорку, акторку з галівудзкага фільму – нібы ня Лёля сядзела на падваконьні ў Вольгі Іванаўны, а ейная галяграма! Ня Лёля, а вокладка «Касмаполітэну»! А яна, Марына, захлынаецца сьлязьмі ў сьмярдзючай прыбіральні з патрушчанай кафляй! А яна, Марына, так і застанецца тут, у групе зарплаты, у бабскім царстве, у агідным шэрым дамку, спарахнелым, нядужным дамку, дзе жывое – толькі адно: вір плётак ды балбатні. Неспатольны сьверб у кабечых языкох, магутная, усёпаглынальная плынь нуды! Вось яно, тваё жыцьцё, Марына! – яна ўсхліпвала й не магла спыніцца.

* * *

Трыццаць першага сьнежня Марына ўцякла з працы апоўдні ды пабегла купляць шампанскае, крабавыя палачкі й яшчэ розныя дробязі на падарункі. Новы год выходзіў узорным, выдатным: мароз – але ня моцны! Сонца! І сьнегам усё замецена! І елка ля ўнівэрмагу! Ня Новы год, а проста шчасьце! – рэдка такі выпадае!

І, стоячы ў чарзе да банкамата, Марына раптам заўважыла Лёлю Марчук. Памылкі не было: менавіта Лёля задуменна пазірала на палатку з бананамі ды апэльсінамі.

Марына кінула чаргу ды акуратна, каб не пасьлізнуцца, рушыла да Лёлі: у госьці прыехала? на Новы год? з мужам?

– Здароў, Марчук! Ці хто ты там ужо? – Марына тарганула Лёлю за рукаў футра.

Лёля, марудзячы, павярнула да яе твар: без усьмешкі, згаслы, абыякавы. Марына асеклася, але па інэрцыі працягвала:

– Ты што тут робіш?

Лёля глядзела на яе змрочнымі, нібы пустымі вачыма.

– Мяне ня выпусьцілі.

Да Марыны не адразу дайшоў сэнс пачутага.

– Як так?

– А проста. Ня выпусьцілі. Нікуды я не паехала. Жыцьцё такое… Усё. Скончылася жыцьцё.

Марына хацела ёй адказаць, але ў віхуры ліхаманкавых думак ня ведала, з чаго пачаць: не, няможна так адпускаць Марчук! Вунь як кепска чалавеку!

А Лёля павярнулася ды пайшла, так і не купіўшы бананаў; пайшла прэч, як надалей ад Марыны, не жадаючы размаўляць.

А Марына, гледзячы на ейную сьпіну, што хутка аддалялася, умомант знайшла дарэчныя словы.

«Лёля! Ты ж жывая! Жыцьцё працягваецца! Гадзіньнікі круцяцца! Сонца! Сьнег! Мароз! Новы год! Ты ж жывая, Лёля!»

І ў гэтае імгненьне – а такія рэдка надараюцца – Марына адчула сябе абсалютна шчасьлівым чалавекам.

5. ПАКАЛЕНЬНЕ «НУЛЬ». КОЖНЫ ЧАЦЬВЕРТЫ

– Ну, як там ваш Славік?

– Ты ведаеш, цяжка! Але, калі параўнаць зь іншымі… Досыць, досыць! Я з малаком буду!

– Цукру колькі?

– Дзьве… А, сып тры! Памятаеш Дзімку? Ну, ён насупраць мяне жыў! Яны з Славікам разам паехалі… Ён вучыцца не пажадаў, з Славікам нашым пасварыўся, цяпер талеркі мые недзе, мабыць… Але Дзімка яшчэ добра ўладкаваўся. А вось іхні сябар… Забылася, як клічуць… Той у нейкіх грузінаў кур рэжа. З раніцы да позьняй ночы. Такі стомлены… Ягоная маці распавядала: яна зь ім па тэлефоне размаўляе, раптам – цішыня й грукат! У маці ледзь не інфаркт! Яна ў слухаўку крычыць! А з Амэрыкай, ведаеш, хвіліна даляр каштуе! Потым сынуля кажа: мама, не хвалюйся, гэта я заснуў ды ўпаў! Такі стомлены! Славік казаў: засынае дзе сядае – у прыбіральні, у транспарце…

– Дык што ваш Славік?

– Ну дык вось. Джэнэрал Эдукейшн – ну, як атэстат аб сярэдняй адукацыі – ён здаў на сто балаў з сотні! Фантастыка, праўда? Ён дома так не вучыўся, як там!

– Мо схлусіў?

– Што ты вярзеш! Ён цяпер вучыцца й працуе. Ня ўсё пасьпявае, мы яму рэфэраты робім ды дасылаем. Я пра белых акулаў цяпер усё ведаю! Але ён адзін так уладкаваўся, іншыя – ня вучацца… Зь сябрам машыны пераганяў: ад акіяну да акіяну…

– Зь якім сябрам?

– Зь дзясятай школы… Ну, лінгвістычная гімназія цяпер. Зь дзясятай ледзь ня кожны другі зьехаў!

– Ну, тое дзясятая…

– А з нашай школы хіба не? Толькі з паралелі – палічы, колькі!

– Ну…

– Ну і ўсе, хто ў лінгвістычны паступіў… Альбіна ў Нямеччыне недзе, дзяцей даглядае… Ой, лусьцік мне дай! З каўбасой… Задаволеная! На выходныя ў Амстэрдам езьдзіла: нішто сабе, га?

– А Наташку памятаеш? Яна ж адразу пасьля школы замуж выйшла ў Бэльгію…

– У Бэльгіі яшчэ Вова… У рэстарацыі талеркі мые…

– Нелегальна…

– Марынчына сяброўка, Каця, – з доўгімі валасамі такая – дзяцей глядзела ў Марсэлі паўгоду, потым вярнулася, замуж выйшла, і разам з мужам па запрашэньні паехалі – і не вярнуліся!

– У Марсэлі… А ў Парыжы ў нас хто?

– Цёма з Кірылам…

– Нелегальна таксама…

– А Паша паступіў ува ўнівэрсытэт! У Марсэлі таксама… І дзяўчыну сваю перацягнуў, і брата свайго… Усе паступілі! Там трэба было паказаць, што ў цябе на рахунку пяцьдзясят тысяч эўра, дык яны ўсе – па адной крэдытцы… Чужой… Сьмех!

– А ў маці на працы сяброўка, ейная дачка ўжо дзесяць гадоў у Парыжы жыве… Дзецям соплі падцірала спачатку, потым вучыцца пайшла… У трыццаць гадоў – студэнтка!

– А мая адна калега! Ейная сястра старэйшая ў Нямеччыне… горад такі… Аснабрук, ці што? Муж яе перацягнуў… Вучацца абое, працуюць… А яшчэ ў адной цёткі з працы дачка проста замуж выйшла…

– Замуж – найпрасьцей!

– Ну, не кажы!

– Можна ж фіктыўны шлюб…

– Што ты вярзеш! Там гэтыя службы імігранцкія могуць уночы прыйсьці паглядзець, ці сьпіцё вы разам!

– Дык ніхто ж ня будзе ведаць, што шлюб фіктыўны! Нават муж!

– Дасьціпна, га! Слухай, я ў цябе тут пакуру, так?

– Фортку адчыні… А вось у маёй сваячкі пляменьніца таксама замуж выйшла ў Лёндан! У чаце нейкім пазнаёміліся…

– А ведаеш, хто найчасьцей замуж выходзіць? Скаўты, гайды ўсялякія… У мяне ўжо дзьве сяброўкі павыходзілі: адна ў Манчэстэры, другая – пад Мюнхэнам… Фоткі глядзела – супэр проста!

– А Інэска? Суседка мая па лецішчы! З пудзялёчкам, памятаеш? Мы ж зь дзяцінства сябравалі. Яна ў Нямеччыну езьдзіла як чарнобыльскае дзіця, і за сына гаспадароў выйшла. Дачку ўжо нарадзіла, Эвэліну!

– Ага, аздаравілі нас пасьля Чарнобылю! Дзеці хоць даведаліся, што за замежжа такое! Амаль усе, хто езьдзілі ад фондаў усялякіх, – зьяжджаюць!

– Ну ясна! Калі ведаеш іншае жыцьцё, тут проста жыць няможна!

– Ну! Я ў Італію калі езьдзіла, дык наша кіраўніца Маня – такая ўжо страшная баба, і тая – замуж выйшла!

– А колькі ёй гадоў было?

– Трыццаць пяць зь нечым… Нам можна не пераймацца! Па нас яшчэ ў чэргах стаяць будуць! Там такіх беленькіх мала…

– Слухай… Цяжка ж, напэўна… Ня так, можа, і проста…

– Анягож! Славік ведаеш як сумуе? Штодзень нашыя фоткі патрабуе! А мы на камэру татаў юбілей здымалі, запісалі на дыск ды адаслалі з аказіяй. Кожны ў камэру крычаў: Славік, ні ў якім разе не вяртайся! Славік, тут кепска! Не вяртайся, у

Амэрыцы лепей!

– Не, ну цяжка! Ну скажы ж, цяжка безь сям'і там жыць!

– Ага… Славік казаў, як ён на Брайтан-Біч у падвале койку здымаў першы тыдзень, дык ляжаў тварам да сьцяны: культурны шок! Там, на Брайтане, падвалы такім во хлопчыкам здаюць, якія толькі што прыехалі… За шалёныя грошы: там такіх ачмурэлых эмігранцікаў натоўпы бадзяюцца! Хто ачомаўся – звальвае праз тыдзень з падвалаў, хто не адолеў тугі – так вось кур і рэжуць…

– А як яе адолець, тугу гэтую?

– Слухай, што за пэсымізм? Што ты ўсё псуеш! Мы ж вырашылі! А наконт тугі настальгічнай, лабуды гэтай, дык я рэцэпт ведаю.

– Ну?

– Галоўнае… З эмігрантамі нашымі не кантактаваць! Зусім! На мову забыцца! Тады ангельскую – ці французскую, што да нас, – хутчэй вывучыш! У іхнюю культуру трэба паглыбляцца! У грамадзтва інтэгравацца! У іхні соцыюм, так бы мовіць! Разумееш? Зрабіцца чалавекам іхняй культуры. Стварыць там сваю сям'ю… Толькі не з эмігранцікам – крый божа! Трэба забыцца, што мы тут нарадзіліся! Каб у нашых дзяцей была іншая радзіма! Тады пакутаваць ня будзеш! Мне Славік сказаў…

– Яшчэ кавы?

– Лі… Для малака месца пакінь! Тры лыжачкі…

– Слухай… Я баюся!

– Ну елкі-палкі! Колькі можна! Ну давай палічым, колькі з нашай паралелі зьехала.

– Наташа, Марына, Каця…

– Цёма, Вова, Кірыл…

– Паша, Макс, Кацька… доўгая такая, з «В» клясы! Хто яшчэ?

– Ленка…

– Усё? Замала нешта…

– Оля Задарожная, Сьвета Кудрыцкая…

– А! І Васіль… як яго? У акулярчыках! Во! Колькі? Лічы! Трынаццаць чалавек! Толькі з нашай паралелі! Што, хіба яны не баяліся? Што, мы за іх горш?

– Ой, ну…

– Не распускай сопляў! А калі зь лінгвістычнага палічыць? Кожны чацьверты! А калі ўсіх нашых знаёмых палічыць? Колькі выходзіць? А ўсіх знаёмых нашых знаёмых? Палова краіны ўжо звaліла, а яна ўсё баіцца! Ехаць баіцца! А заставацца ты не баішся? Мы тут згнеім, у гразі патонем, нас дажджом змые! Вёска Гадзюкіна…

– Ну…

– Што «ну»? Усе зьехалі – а мы хіба горш? Што мы, дуры, каб заставацца?

– Ну не катуй мяне! Згодная я, згодная!

– Ну, вось і добра. Дык у панядзелак, як дамовіліся…

❑ [image]

Затрымка рэйсу

Аднолькавыя шэрагі аднолькавых мэталёвых крэслаў з акуратнымі круглымі ад- тулінамі ў сьпінках спакойна пабліскваліў роўным электрычным асьвятленьні. Калі Ўорвік спрабаваў доўга, не міргаючы, глядзець на гэтыя безаблічныя мулкія сядзеньні, яны пачыналі памнажацца ды вібраваць, пульсуючы, супадаючы ў сваіх пагойдваньнях з рытмам ягонага сэрца. Тады Ўорвік, каб апярэдзіць непрацяглы прыступ

галавакружэньня, заплюшчваў вочы, павольна лічыў сам сабе да дзесяці, і прысутнічаў у гэтай аксамітнай мяккай цемрадзі нейкі драбочак няўлоўнага шчасьця: ведаць, што зараз ён, з уласнага жаданьня, расплюшчыць вочы, і навакольны сьвет – «аб'ектыўная рэальнасьць» – зноў узьнікне ў звыклых формах; але застанецца яшчэ на некалькі сэкундаў спачатку вострае, потым прыцішанае, але ўсё адно хвалюючае ўсьведамленьне сваіх чароўных сілаў, спрычыненасьці да таямніцы гэтага сьвету, да нетрываласьці, хісткасьці рэальнасьці.

Уорвік бязмэтна, у чаканьні, сузіраў вялізную залю аэрапорту. Яму здавалася, што тут няма нічога выпадковага; што неўпарадкаванае, на першы погляд, цыркуляваньне людзей па залі насамрэч злучана ў сыстэму, і кожны рух, кожнае, быццам адвольнае, перасоўваньне папраўдзе падпарадкаванае правілам гульні: складанай, шматступеньчатай, кшталту шахматаў. І здавалася яму, што людзі, якія паселі на мэталёвых крэслах у чаканьні рэйсу, – дзейныя асобы загадзя вызначанае дзеі; і кожнае з гэтых крэслаў зь дзіркамі ў сьпінцы ды сядзеньні насамрэч ёсьць пазыцыяй, поўнай сэнсу – сэнсу, вядомага камусьці невідочнаму, але вялізарнаму: маштабаў, недасяжных для дробнага чалавечага розуму.

І Ўорвік адчуваў амаль упэўненасьць у тым, што ён таксама – дзейная асоба агульнае дзеі; яму здавалася, што варта прыкласьці яшчэ крыху намаганьняў – і яму стане вядомы шыфр, код; ён здолее прачытаць сэнс кожнае пазыцыі; даведаецца пра мэту гульні – і пра ўласную ролю ў гэтай гульні. Толькі Ўорвік пакуль ня ведаў, якога кшталту маюць быць намаганьні; мабыць, шыфр захаваны зусім побач; мабыць, ён ужо ведае адказ – але ня ведае той звышчалавечай мовы, на якой выкладзеная таямніца гэтае рэальнасьці.

Да ўсіх аэрапортаў Уорвік меў два наборы пачуцьцяў.

Першы ён ужываў адразу па прылёце. Тады ён выразна баяўся любога аэрапорту і ціха ненавідзеў гэтае нагрувашчаньне шкла, мэталу і бэтону за прычынены страх.

І той самы будынак пачынаў выклікаць у яго пяшчотныя

пачуцьці кожнага разу, калі ён ляцеў дамоў, у Манрэаль.

Вось і цяпер ён абыякава-зычліва сузіраў вялікую шкляную сьцяну, у якой зь сямідзесяціпрацэнтнаю дакладнасьцю адлюстроўвалася хірургічна асьветленая заля. Уорвік даўно здагадаўся, чым выкліканыя гэтыя, шторазу тыя самыя, перапады ягонага настрою. Няведаньне найбліжэйшае будучыні, рэцыдывы незагоенай дарэшты антрапафобіі, неўладкаванасьць камандзіровачнага побыту, новыя кантакты з новымі людзьмі, заўсёдная адказнасьць за чужыя вялікія грошы… І – па сканчэньні ўсяго – вялікая палёгка праз тое, што ўсе дамовы падпісаныя, усе нюансы ўзгодненыя, усе складанасьці абгавораныя з кіраўніцтвам. Уорвіка не аднойчы ахоплівалі падступныя сумневы ў тым, што ён займаецца не сваёю справаю; такое хваляваньне перад кожнаю паездкаю ня можа быць добрым знакам; і толькі нядаўна ён усьвядоміў – нібыта прачнуўся – што ён займаецца гэтым бізнэсам ужо сем гадоў; што міжнародных перамоваў ён мае штогод мінімум восем; што ў яго, урэшце, няблага выходзіць – нават выдатна, «каштоўны спэцыяліст» і «вялікі стаж»…

Мішэль, ператвораны законамі пэрспэктывы ў маленькага чалавечка, стаяў ды азіраўся; нарэшце ён заўважыў Уорвіка, памахаў рукой, і пасьпешна, з подбегам, рушыў да яго: пэўна, былі важныя навіны. І ў той самы момант, калі Мішэль падышоў да Ўорвіка ды ўжо адкрыў рот для першага сказу, яго апярэдзіў, заглушыў узмоцнены, паўсюдны голас нябачнае жанчыны. Мішэль і Ўорвік адначасова каротка расьсьмяяліся.

– Вось, – Мішэль падняў дагары ўказальны палец, калі жаночы голас зьнік, – тое самае я і меўся табе сказаць. Усе рэйсы адкладзеныя да сёмай гадзіны раніцы.

У залі пачалося заўважнае, але бессэнсоўнае ажыўленьне.

– Я так і знаў! – крыху найграна скрушна сказаў Уорвік. – Я так і знаў! Такі дождж! Ня варта было нават і ехаць, у такую навальніцу, трэба было пазваніць ды не высяляцца з гатэлю!.. Дзе мне тут спытаць, мабыць, яны даюць гатэль для міжнародных рэйсаў? Я мяркую, што бясплатна, але я

згодзен…

– Не, не, не, натуральна, не! – Мішэль рашуча перапыніў яго, матаючы адмоўна галавой, і нават некалькі разоў узмахнуў рукою, як дырыжор. – Ведама, не! Які гатэль?! Пра што ты кажаш? Ты застанешся на ноч у нас, я ўжо затэлефанаваў жонцы, яна чакае… Які гатэль, за каго ты мяне прымаеш?

І Мішэль, у знак таго, што размова скончаная і ніякія пярэчаньні больш не прымаюцца, падхапіў цяжкі, на калёсіках, Уорвікаў кофр і шпарка пакаціў яго да выхаду, адначасна леваю рукою зашпільваючы на гузікі сваё кароткае чорнае паліто.

Уорвік даўно, яшчэ ў дзяцінстве, прыкмеціў: калі яго апаноўвае лёгкі, бестурботны настрой – зазвычай па завяршэньні адказных справаў – тады пачынаюць ужыцьцяўляцца ягоныя нават неакрэсьленыя жаданьні. Уорвік як адчуваў, што Мішэль запросіць яго да сябе – перачакаць начную непагадзь. Яму падабаўся гэты француз, вонкава ня вельмі падобны да сваіх суайчыньнікаў – гэткага растыражаванага кінэматографам стэрэатыпу – які, тым ня менш, быў квінтэсэнцыяй усяго французскага. Уорвік, ужо па першых хвілінах іхнага знаёмства, злавіў сябе на радасным дзіцячым зьдзіўленьні: «Я хачу сябраваць з гэтым хлопчыкам!» Такое пачуцьцё, прадчуваньне сяброўства, наведвала Ўорвіка радзей ды радзей; і вось яно зноўку зьявілася, упершыню гадоў за пяць. Магчымага будучага сябра выдзяляеш з натоўпу паводле нейкага адмысловага выразу твару; паводле нязначнай для іншых, аднолькава-безаблічных, фразе, у якой нібыта чытаеш прыхаваны, зразумелы толькі абраным сэнс. Уорвіку хацелася верыць, што прадчуваньне сяброўства нарадзілася ня толькі зь ягонага боку, што Мішэль таксама дасылае яму зашыфраваныя сыгналы: «Свой! Свой!» (так, да прыкладу, яны адначасова, без галаваломных рэвэрансаў адразу перайшлі на «ты») – і Ўорвік можа быць упэўнены, што ён, як Дыяген зь ліхтаром пасярод яснага дня, нарэшце знайшоў Чалавека.

Але набытая за трыццаць гадоў зямнога жыцьця антрапафобія, як менаваў свой жыцьцёвы досьвед Уорвік, стрымлівала яго, не дазваляла пачувацца з тыднёвым знаёмцам як з старым сябрам.

Уорвік, хаця і змушана, але палічыў патрэбным выканаць звычайны ў такіх выпадках рытуал ветлівасьці.

– Слухай, – Уорвік нарэшце нагнаў імклівага Мішэля і адабраў у яго свой кофр, – а твая жонка скандалу ня зробіць? Гэта я так, умоўна: у тым сэнсе, што гэта будзе няёмка, мабыць: прыцягнуў апоўначы незнаёмага мужчыну дахаты…

– А? – Мішэль перапытаў, нібыта не зразумеў сэнсу пытаньня, і раптам заўсьміхаўся: – Ірэн? Не, ніколі! Не турбуйся, гэта ж нармальна! Яна сама мне не дазволіла б кінуць чалавека начаваць на лаўцы! Так хоць будзеш спаць нармальна… Не, не пераймайся!

Пакуль яны прабіраліся па паркоўцы між бліскучымі, як целы невядомых вялікіх паснулых жывёлінаў, машынамі да чорнага «Рэно» Мішэля, яны пасьпелі добра вымакнуць; ад нахабнай пакрасавіцку навальніцы не ўратавалі нават парасоны, на якіх таксама нібыта паўплывала маладая вясна: парасоны, як гарэзьлівыя хлапцы, адразу заторгаліся ў руках, маючы намер вызваліцца ад чалавечага палону ды зажыць сваім жыцьцём.

У машыне Ўорвік сеў на пярэдняе сядзеньне; яны не заяжджалі ў горад, ехалі па кальцавой; Уорвік глядзеў, як дворнікі раз за разам здымаюць з лабавога шкла шчыльную заслону вады, нібы прабіваюць дарогу аўтамабілю ў фатальнай, катастрафічнай залеве. Бледна-жоўтыя, ружаватыя, блакітныя маланкі штохвіліны прарасталі ў небе, як фантастычныя нежыцьцяздольныя дрэвы. «Гэта ня ёсьць чалавечыя адбіткі» – Уорвік успомніў старую арабскую байку.

Мішэль, які напружана ўзіраўся ў небясьпечную цяпер магістраль, раптам загаварыў.

– Я часта думаю, асабліва ў час навальніцы: наколькі трывала мы замацаваныя ў гэтым сьвеце? Мне здаецца: а раптам якая-небудзь неасьцярожная маланка прарве тканіну нашага часу, і мы выпадкова ўскочым у іншае вымярэньне? Ці яшчэ якім-небудзь іншым чынам… Парушацца часава-прасторавыя сувязі… Я, на жаль, у фізыцы поўны нуль, у квантавай – пагатоў, але я чытаў у часопісе, там папулярна цытавалі

Айнштайна… Айнштайн прадказваў канец нашага часу: тады гэтыя сувязі будуць станавіцца ўсё больш ды больш нетрывалымі, паўсюль будуць узьнікаць часавыя шчыліны, і людзі – калі дажывуць – будуць правальвацца то ў сярэднявечча, то куды яшчэ… А Айнштайн дапускаў, што такія шчыліны і цяпер узьнікаюць, толькі вельмі непрацяглыя па часе… Я думаю: а якая верагоднасьць?.. Мабыць, мы ўжо праваліліся куды-небудзь, і цяпер апярэджваем гэтую рэчаіснасьць хвіліны на дзьве…

Уорвік, сапраўды ўпершыню за шмат гадоў, адчуў шалёную непадкантрольную радасьць. «Свой! Свой!» – нібыта пабеглі па лабавым шкле чырвоныя літары, і ён сьпешна, каб запэўніць Мішэля ў тым, што і ён – свой, падхапіў:

– Менавіта! Я гэтак сама думаю ў часе пералётаў. Што такое час па вялікім рахунку? Умоўнасьць! Тая самая тэорыя адноснасьці – так, я таксама ў фізыцы нуль, толькі збольшага: Айнштайн… Дык вось, я пра часавую розьніцу між кантынэнтамі. У мяне заўсёды патыліцу зводзіць, калі я ўяўляю, каторая гадзіна цяпер у Манрэалі. Я не магу – і ніколі ня мог! – прынамсі, уявіць: як там можа быць учорашні дзень? І яшчэ: як вымяраюць час на тых плянэтах, дзе сонцы абарочваюцца ў іншым тэмпе?

Мішэль таксама ажывіўся.

– Вось-вось! І галоўнае: хто гэта вызначае? Я аб першапрычыне, аб Пачатку зь вялікае літары… То бок, я хачу сказаць: нехта існуе… Або нешта… Як звышрозум…

Уорвік перапыніў Мішэля: ён адчуў, што цяпер між імі ўсталяваліся такія дачыненьні, калі парушэньне відочнай прыстойнасьці ня будзе лічыцца абразаю:

– Паслухай, я хвіліну таму прыпомніў арабскую байку, менавіта пра гэта. Француз – дарэчы! – вандраваў па пустыні ў таварыстве правадніка-араба, і той, заўсёды, як прыходзіў час, маліўся Алагу. Француз – ня ведаю, чаму менавіта француз там быў – захацеў урэшце зь яго пакпіць і запытаўся, маўляў, да каго ты зьвяртаеш свае малітвы? Адкуль ты ведаеш, што твой

бог існуе? Араб, у сваю чаргу, задаў пытаньне французу: а як ты даведаўся, што сёньня ўначы паўз наш намёт прайшоў не чалавек, а вярблюд? І зьдзіўлены француз адказаў: ну як, бо я бачыў адбіткі ног вярблюда! І тады араб паказаў рукою на сонца ды сказаў: «Гэта не адбітак чалавека!»

– Рэлігія – гэта ўвогуле такая падстава для разваг, – падтрымаў Мішэль, – я, у прыватнасьці, ужываю рэлігійную тэрміналёгію ў якасьці мэтафараў…

Мабыць, існуюць сярод людзей падвіды, раскіданыя па плянэце плямёны, найменьне якіх – аднадумцы. Як яны выхопліваюць адно аднаго з чалавечага акіяну, паводле якіх знакаў пазнаюць пасьвячоных – хто ведае, а можа, і еднасьці чалавечых душаў, у двукосьсі або без – таксама складаныя камбінацыі невядомае гульні?

Мішэль і Ўорвік запэўнілі адзін аднаго ў сваёй далучанасьці да тайнага таварыства і ўжо некалькі хвілінаў ехалі моўчкі, – але маўчаньне не было няёмкае, напружанае; наадварот, змова сяброў, якія маюць пра што памаўчаць – як Мішэль раптам пачаў гаворку на іншую, зусім іншую тэму.

– Мая жонка – не французанка, – Мішэль сказаў пра жонку так, нібы расказваў пра самога сябе: «Я нарадзіўся і вырас у Парыжы». – Яна з былога Савецкага Саюзу.

– Расейка? – зацікаўлена спытаў Уорвік; яму ўжо даводзілася па працы сутыкацца зь некалькімі расейскімі жанчынамі.

– Не, не, зь іншае краіны, маленькае. Зь Берасьця. Ірэн беларуска.

Уорвік нешта чуў пра гэтую мясьціну; ён лічыў, што гэта частка Расейскае Фэдэрацыі.

– І што, яны цяпер незалежныя?

– Так, абсалютна! Зь дзевяноста першага году! – Мішэль паведаміў гэта з такім гонарам, нібы сам браў актыўны ўдзел у атрыманьні незалежнасьці гэтаю краінаю.

Уорвіку чамусьці адразу ўявіліся абстрактныя шэрагі паўстанцаў-змагароў за незалежнасьць; крыху перакапаўшы ўспаміны, ён зразумеў, што на памяць яму прыйшла тэлехроніка з Бэрліна 1989 году.

Мішэль тым часам працягваў.

– Я ня памятаю дакладна, хто гэта сказаў, здаецца, нехта з нашых каралёў, нейкі Карл… карацей, такі трапны выраз: колькі моваў ты ведаеш, гэтулькі разоў ты чалавек. Мне дагэтуль дзіўна ўсьведамляць, што ў маёй жонцы быццам жывуць, прынамсі, два чалавекі, зь якімі я абсалютна не знаёмы.

– Два? Чаму два? – перапытаў Уорвік.

– Ну… Калі палічыць… Ірэн ведае, прынамсі, расейскую і родную, а яшчэ суседнія…

– Яны маюць сваю мову?! – ня вельмі ветліва зьдзівіўся Ўорвік.

– Ну натуральна! – усклікнуў Мішэль, але амаль адразу расьсьмяяўся. – Гэта цяпер мне натуральна, а раней я таксама нічога пра гэта ня ведаў… Ні геаграфіі – што ў іх там на ўсходзе робіцца, ні палітыкі – нічога! Ірэн мяне яшчэ называла цемрашалам… Мы, дарэчы, ужо пад'яжджаем; зараз вы зь ёю пазнаёміцеся…

Яны зноў замаўчалі. Уорвік паспрабаваў уявіць, якая можа быць жонка ў Мішэля; чамусьці яна зьявілася перад ім у выглядзе маленькай вёрткай чорнавалосай жанчыны сталага веку, якая кпліва крывіла вусны ды вымаўляла «Цемрашал!» Уорвік думаў, што ня можа быць такога шчасьця, каб вакол яго раптам сабраліся «толькі свае»; гэтая незнаёмая Ірэн магла аказацца той самай недарэчнасьцю, жартам пана Лёса, які падсоўвае табе ў пакунку «каханьня» абсалютна чужога чалавека; а раптам ягоны сябар – Уорвік ужо дазваляў сабе менаваць Мішэля сябрам – асьлеплены ды загнаны пад абцас якой-небудзь дурнаватай сквапнай сьцервай, з тых самых, з «эмігрантак» – у Манрэалі ён сутыкаўся з такімі? Да Ўорвіка нават прычапілася брыдкая блюзьнерская ідэйка: а што, калі

раптам гэтая Ірэн пачне заляцацца да яго? Уорвік жахнуўся ад гэтай адвольнай ідэйкі і адразу адагнаў яе – але ідэйка неадчэпна прыляпілася, ён нібыта бачыў вадэвільную сцэнку: хлусьліва-спакусьлівыя позіркі ды выпадковыя дотыкі ног пад сталом. Уорвік у адно імгненьне нават пашкадаваў, што не застаўся ў аэрапорце; ён ужо пачаў турбавацца; лёгкасьць ды бесклапотнасьць пакінулі яго.

– Пад'яжджаем, – коратка паведаміў Мішэль.

У навальнічнай цемры Ўорвік абсалютна не разьбіраў мясцовасьці; адзінае, што можна было заўважыць па незвычайных паводзінах ліхтароў – гэта вялікае возера леваруч.

Мішэль жыў у звычайным шматпавярховіку.

– Валізу тваю, я мяркую, пакінем у машыне! – крыкнуў ён Уорвіку праз шум залевы і ветру, ужо на вуліцы.

– Там ручнік! – крыкнуў яму ў адказ Уорвік, а Мішэль памахаў рукой ля вуха: ня чую! – але праз сэкунду зразумеў ды махнуў ужо інакш, найграна-пакрыўджана: маўляў, ну што, хіба я табе ручніка не знайду?

– Дзіўна, – Мішэль націснуў кнопку зь лічбаю дзевяць; дзьверы мякка зачыніліся, ліфт паплыў угару.

Падлога ў ліфце адразу стала мокраю; з парасонаў сьцякала вада.

– Што дзіўна? – не зразумеў Уорвік.

– У нас не гарыць сьвятло ў кватэры.

«Ну вось, – блюзьнерская ідэйка атрымала яшчэ адзін штуршок, – засталося толькі засьпець ягоную жонку зь якім-небудзь каханкам!»

Напэўна, ягоны калега меў рацыю, калі аднойчы заўважыў Уорвіку, што той кепска ставіцца да жанчын.

Мішэль першы выйшаў зь ліфта, і Ўорвік адразу пачуў глыбокі, крыху прыцішаны, жаночы голас:

– Ну нарэшце… Такая навальніца, як вы даехалі?

Не, скандалам тут ня пахла.

У маленькім холе Мішэлевай кватэры, куды яны ўвайшлі, было цёмна. У добра разбаўленым сьвятле, якое пранікала з адкрытых на пляцоўку дзьвярэй, Уорвік убачыў няпэўны сылюэт Ірэн: яна была высокая, стройная жанчына з доўгімі валасамі – Уорвік ня ўгледзеў колеру ў паўзмроку, – апранутая ў сьветлы швэдар. На плячы ў яе чамусьці вісела маленькая бухта нейкага дроту.

Жанчына працягнула Ўорвіку руку, каб прывітацца.

– Я – Ірэн.

– Дэніс Уорвік.

Ірэн адной рукою абняла свайго мужа за шыю ды пацалавала ў шчаку.

– Зноўку? – спытаў Мішэль у жонкі.

– Ужо хвілін пятнаццаць! – цьмяна паведаміла Ірэн пра нешта, Уорвіку невядомае.

– У нас чамусьці стала гаснуць сьвятло, – патлумачыў Уорвіку Мішэль, – толькі ў нашай кватэры, чацьверты ўжо раз.

– Пяты! – удакладніла амаль непрыкметная ў цемры Ірэн. – Але так доўга – першы раз!

– Заўтра трэба будзе выклікаць брыгаду, хай рамантуюць, пакуль мы тут не згарэлі ўсе.

– Ну ня стойце на парозе, праходзьце бліжэй, – раптам схамянулася Ірэн. – Я пайду пазычу агню ў суседняй пячоры! – і хутка выйшла на пляцоўку.

Уорвік нарэшце зразумеў прызначэньне дроту, які вісеў на ейным плячы.

Найгоршыя ягоныя чаканьні ня спраўдзіліся, ён зноўку адчуў палёгку.

Мішэль за руку зацягнуў яго ў нейкае памяшканьне; хутчэй за ўсё, гэта была кухня. Натуральна, гаспадар цудоўна арыентаваўся ў нетрах уласнай кватэры; празь некалькі сэкундаў Уорвік ужо сядзеў пры стале на падсунутым пад яго крэсьле.

Неўзабаве ля ўваходу пачуўся рух – гэта вярнулася Ірэн, і амаль адразу ў холе разьлілося маленькае жоўтае возера сьвятла.

Ірэн увайшла на кухню, трымаючы ў руцэ лямпу на доўгім складаным кранштэйне, і Мішэль адразу ўзяўся прыкручваць яе да стала. Па сьценах замітусіліся доўгія цені.

– Вады? Ці, можа, соку? – спыталася Ірэн.

– Негазаванай, калі ласка.

Уорвік абапёрся локцямі аб стол ды выпрастаў ногі. Ён прачнуўся сёньня а шостай, быў сьняданак, потым – офіс, і яшчэ адзін, і абед – афіцыйны; а калі згадаць, што ўчора ён лёг бліжэй да раніцы… Стома павольна перапаўзала па нагах да хрыбта, і Ўорвік амаль машынальна правёў рукою па лобе, нібы спрабуючы прагнаць сон. Уорвік праводзіў занямелымі пальцамі па скронях. Яму зноўку пачало здавацца, што плынь часу спынілася, як вада ў ручаі перад нечаканай гацьцю, і час пакінуў рэчышча, выйшаў зь берагоў, пацёк ў іншым кірунку. Замест таго, каб у чэраве самалёта ляцець ува ўчорашні дзень, ён сядзіць на кухні, і ўсё тут дзіўна ды незвычайна: таемна згаслае сьвятло, новы сябар, доўгавалосая і даўганогая ягоная жонка, прагарадны парыскі дождж… Уорвік аглядаў кухню: спакойны, таксама стомлены, Мішэлеў твар; Ірэніны рукі, выхапленыя зь цемры жоўтым возерам электрычнасьці – і яму падабалася гэтая пазачасавая сытуацыя, сем гадзінаў адпачынку ад сапраўднага жыцьця.

Ірэн нарэшце села за стол, побач зь Мішэлем і насупраць Уорвіка, і той здолеў пабачыць ейны твар. Ён зірнуў на Ірэн спадылба і раптам абамлеў. Цуд – той самы цуд, пачаты ў аэрапорце, гульня ў хісткасьць рэальнасьці – працягваўся, толькі што перайшоўшы ў іншую фазу: цяпер ня трэба было нават заплюшчваць вочы, каб падоўжыць дзеяньне магічных сілаў. Уорвіка зьдзівіла нават не Ірэніна прыгажосьць – незвычайная, рэзкаватая – як выклік стэрэатыпам: кашэчыя вочы, сьмелы просты (пра такі кажуць «доўгі») нос – Ірэн, бясспрэчна, была прыгожая, выразна прыгожая жанчына – але ашаламляла ня гэта.

Яны зь Мішэлем былі аднолькавыя, як дзьве карціны аднаго мастака. Як люстры, пастаўленыя насупраць адно аднаго.

Уорвік пераводзіў погляд з Ірэн на Мішэля, зь Мішэля на Ірэн, але эфэкт падабенства не зьнікаў. Яны былі аднолькавыя: вочы, вусны, нос – нават выраз твару – блізьняты не бываюць такімі падобнымі. «Гэта не адбітак чалавека» – невядомы Мастак, пэўна, быў геніяльны: некалькімі ўзмахамі пэндзля, невідочнымі для недасьведчанага мазкамі фарбы ён здолеў адрозьніць мужчынскі твар ад жаночага. Вакол твараў Мішэля і Ірэн не ставала толькі карцінных рамаў і аўтографа Аўтара ў правым ніжнім куточку.

Уорвік пераводзіў позірк з аднаго на другога, з жонкі – на мужа, як у дзіцячай гульні «Знайдзі дзесяць адрозьненьняў»; ён апусьціў вочы і ўбачыў, як на клятчасты, белы зь сінім, абрус стала лягла Ірэніна далонь, як яе накрыла далонь Мішэля, і раптам уся назапашаная стома ператварылася ў зайздрасьць – да чужога шчасьця; зайздрасьць, востра-салёная, сьціснула сэрца, засьвярбела ў горле і ледзь ня вылілася праз вочы – але адразу Ўорвіка накрыла пякучая, як сьпірт, хваля сораму і пакаяньня: гэта – цуд, жывы, уцелаўлёны Цуд, самы сапраўдны…

– Вы так падобныя... Як… Як вы пазнаёміліся? – хрыплым, перарывістым шэптам спытаў Уорвік.

Ірэн паглядзела на Мішэля; Мішэль паглядзеў на Ірэн, яны ўсьміхнуліся. Як запыталіся бяз словаў: раскажам? Уорвік

зьвярнуўся да іх зь негалоснай, сьпешнай, палымянай малітвай.

«Калі ласка! Калі ласка, раскажыце! Дазвольце мне ведаць! Я мушу гэта ведаць – Цуд, складаная частка Сусьвету, такое бывае, такое здараецца, такое здарылася з вамі – калі ласка, распавядзіце! Я мушу ведаць пра гэты Сусьвет усё – я мушу стварыць поўную карціну сьвету, я хачу ведаць, калі ласка, раскажыце, калі ласка!»

Мішэль ды Ірэн адначасова, як прачыталі ягоныя думкі, павярнуліся да Ўорвіка.

– Ну дык слухай.

– Мы раскажам.

– Мы пазнаёміліся кепска…

– Непрыгожа…

– Усё пачалося дрэнна…

– Мы пазнаёміліся праз шлюбную кантору.

Апошні сказ Мішэль і Ірэн вымавілі ледзь ня хорам, нібы адрэпэтавалі свой расказ.

Яны прамаўлялі гэтак спакойна, як іншыя людзі расказваюць пра летні адпачынак: сваякам па вяртаньні, без прыкрасаў ды не хаваючы галоўнага.

– Мы даслалі адно аднаму лістоў па пяць ды вырашылі ажаніцца…

– Без разваг…

– Бо кожны меў свой плян…

– Падступны.

– Хлусьлівы.

– Проста жах; мы былі такія ідыёты!

Уорвік пераводзіў вочы зь Мішэля на Ірэн, з Ірэн на Мішэля; калі б ён так уважліва слухаў настаўнікаў у школе, ён быў бы цяпер акадэмікам.

– Мішэль разьлічваў, што яму дадуць Нобэлеўскую прэмію міру! – Ірэн і Мішэль усьміхнуліся; пэўна, гэта быў сямейны жарт! – За тое, што прытуліў ды ўзяў на ўтрыманьне дзіця з трэцяга сьвету!

– Я цешыўся з таго, што такая прыгожая жанчына будзе цалкам залежаць ад мяне!

– А я проста хацела эміграваць. Мне было ўсё адно, хто ад каго будзе залежаць. Я хоць за чорта лысага замуж выйшла б!

– Колькі нам было гадоў тады?

– Па дваццаць сем.

– Не, калі пазнаёміліся – дваццаць шэсьць.

– А калі ажаніліся – дваццаць сем…

– Мы трэці год разам.

– Усяго толькі…

– Здаецца, як учора…

– Не, як сто гадоў таму…

Уорвік зь цяжкасьцю пракаўтнуў халодную ваду.

– А як вы… Як вы… даведаліся?

Мішэль і Ірэн пераглянуліся.

– На другі дзень…

– На трэці.

– Ты забыўся…

– Добра. На трэці…

– Ты мяне ня ўразіў…

– Ты мяне спалохала…

– А ты ўвесь час маўчаў…

– А потым ты пацягнула мяне ў Люўр…

– Гэта ты прапанаваў…

– І ты плакала ў Люўры, як немаўлятка…

– Няпраўда.

– Ну добра, ты плакала…

– Добра, я плакала…

– У залі, там, дзе грэцкія скульптуры… ты спынілася перад нейкаю Атэнаю – там так многа гэтых Атэнаў, проста мармуровы лес…

– Цемрашал!..

– Я іх цяпер таксама люблю… А ты спынілася перад адной Атэнай.

– Яна рабіла рукамі вось так, – Ірэн узьняла рукі над сталом ды закаціла вочы, каб паказаць мармуровую жанчыну.

– Вось так рабіла рукамі… А ты спынілася. І стала плакаць. У цябе ўсе шчокі былі мокрыя. Ты на мяне забылася. Ты так глядзела на гэтую Атэну…

– Мне здавалася, што яна рухаецца!

– І ты плакала. І ты з такім замілаваньнем на яе глядзела! І я тады зразумеў – я адчуў – што гэтая жанчына ніколі ня будзе ад мяне залежаць! І ні ад кога ніколі ня будзе залежаць. Ты

стаяла перад Атэнай, а я на цябе глядзеў… Я ніколі ня бачыў, каб хто-небудзь плакаў перад скульптурай. І я зразумеў, што калі ў чалавека ў сэрцы жыве такая любоў…

– Ты на мяне паглядзеў – вось такімі вачыма! Як маленькі хлопчык. Так глядзяць толькі маленькія дзеці. Вось такімі вачыма! Твае мазгі былі відаць праз зрэнкі!

– І я тады зразумеў…

– І я тады зразумела…

Зноўку патрапіўшы ў такт адно аднаму, яны прыпыніліся. Уорвік уважліва глядзеў на іх, не адчуваючы няёмкасьці.

– Дык вось… Вось з таго моманту мы і ўбачылі адно аднаго…

– Калі мы толькі-толькі сустрэліся, мы хацелі схлусіць…

– Падмануць…

– А потым мы вырашылі павянчацца ў царкве.

– У касьцёле…

– Я праваслаўная…

– А я каталік…

– Я не зьмяніла веры – бо я ня веру ў агульнапрынятым сэнсе… Можна мяняць рэлігію, калі ты быў ёй адданы, а я не была верніцай. Гэта была даніна традыцыі – я паходжу з краіны, дзе пануе праваслаўе.

– Я таксама не адданы каталік…

– Але мы вырашылі пайсьці ў царкву.

– У касьцёл…

– Каб сказаць адно аднаму нешта важнае…

– І мы сказалі…

– І мы ня схлусілі…

– Мы не падманулі…

– Нехта, – Ірэн зрабіла акцэнт на слове «нехта» – зусім ня ўлічваў нашых намераў! Нас абралі!

– Нам пашанцавала…

– І ўсё перамянілася…

– Мы зьмяніліся…

– Абсалютна! Я была такая… незалежная… Вельмі незалежная. І жорсткая. І нават злая.

(Уорвік адчуў ейны нястрачаны беларускі акцэнт: Ірэн вымаўляла гук «ш» занадта цьвёрда, і, нібы ведаючы гэта, цягнула яго, спрабуючы выправіць памылку, і слова «злая» выходзіла ў яе шыпячым, як зьмяя: «mechhhante»!)

– А я быў такі… разбэшчаны хлопчык!

– Проста распусьнік!

– І мы перамяніліся.

– Мы сталі спакойнымі…

– Упэўненымі…

– Шчасьлівымі…

– Мы сталі такімі… здольнымі жыць.

– А… як вы… – Уорвік шукаў словаў, ды ня мог знайсьці, – як вы мяркуеце… цяпер… З досьведам мінулага жыцьця… Ці можна жыць бяз гэтага?

– Можна! – упэўнена, аднагалосна, сьцьвердзілі Мішэль і Ірэн.

– Можна.

– Але складана.

– Трэба працаваць над сабой.

– Няспынна.

– Штодня.

– Гэта складана…

– Як бегаеш па замкнёным коле…

– У той час як трэба жыць, а ты заміж жыцьця змагаешся з сабою!

– А мы цяпер жывём…

– Нам пашанцавала…

– Проста так…

– Мы не спадзяваліся…

– Мы былі ў роспачы…

– Мы, мабыць, не заслужылі, а цяпер мы такія…

– Шчасьлівыя…

– Як багі!

– Мы жывём…

– Усё перамянілася, усё, усё! Жыцьцё набыло іншы сэнс. Як мне цяпер здаецца, адзіны магчымы сэнс. Мяне не хвалююць ні грошы, ні праблемы з працаю. Я гляджу на Ірэн і не разумею: прыгожая яна ці не? Мне здаецца, што яна адзіная жанчына ў сьвеце, іншых проста няма; мне ўсё адно, якога колеру ў яе валасы; калі б яна адрэзала вушы, я не заўважыў бы…

– Я блытаю, дзе я, а дзе – Мішэль! Калі ён зьяжджае, мне здаецца, што гэта я зьехала!

Яны глядзелі адно на аднаго, Мішэль глядзеў на Ірэн, Ірэн глядзела на Мішэля, Уорвіку здавалася, што яны абменьваюцца жыцьцём праз гэты позірк. Яны павярнуліся да яго.

– Такое бывае…

– Такое здараецца…

– Гэта здарылася…

– З намі…

– Мы ня ведаем, як.

Запанавала цішыня; за акном шаргатала па падваконьніку залева. Час стаяў у пакоі, як вада ў возеры.

– Мо спаць?

Ірэн не перамяніла тону, яна вымавіла гэтае простае пытаньне гэтак сама спакойна, як кагадзе расказвала пра звычайны цуд.

Зазвычай пасьля такога кшталту шчырасьцяў між незнаёмымі людзьмі ўзьнікае няёмкасьць; але – гэтая размова не была звычайнаю.

Уорвік ляжаў на канапе, безуважна сузіраў белаватую столь ды думаў, што ня зможа заснуць. Мішэль і Ірэн пачаставалі яго ледзяной, празрыстай крынічнай вадою, падзяліліся зь ім жыцьцядайнаю вадкасьцю, і ён баяўся цяпер упусьціць хаця б кроплю. Уорвік ляжаў ды думаў. Ён думаў пра тое, што людзей, злучаных такім вось каханьнем, начамі катуюць зусім іншыя дэманы. Ня тыя дробныя, злосныя, прыставучыя чэрці адзіноты, якіх адштурхоўваеш ад самотнага ложка, а яны ў шаленстве ўсё адно працягваюць скакаць вакол, зрываюць цёплую коўдру, штурхаюць пад сэрца стэнакардыяй, цягнуць сьпіну радыкулітным спазмам, адцягваюць табе павекі, каб ты ляжаў бяссонны, змучаны да самага сьвітанку – а дробныя чэрці адзіноты ў гэты час крывяць зьвярыныя пысы ды цягнуць іклы да твайго мяккага горла…

Не, шчасьліва каханым людзям ня страшныя такія непрыстойна дробныя чэрці. Да іх уначы, напэўна, прыходзяць іншыя, сапраўдныя дэманы. Спакойна, з усьведамленьнем уласнае магутнасьці, яны моўчкі стаяць над ложкам ды пасьміхаюцца: ніколі, ніколі вам ня стацца адным чалавекам! Якімі моцнымі ні былі б вашыя абдымкі, вы ніколі ня здолееце зьліцца – хіба толькі пасьля… Пасьля ўсяго…

А ў чалавечым жыцьці… Вам, разлучаным, адасобленым – ніколі не пазбыцца страхаў за ўласную другую палову! Наколькі розным бывае чалавечае шчасьце! – і ці бывае яно ўвогуле?..

Уорвік і не спадзяваўся заснуць, але прачнуўся ад мяккага стуканьня ў дзьверы.

– Прачынайся… Шэсьць гадзін! Прачынайся, я зараз выклічу таксоўку!

Мішэль, сьмешна патлаты пасьля сну, накінуў куртку ды спусьціўся правесьці Ўорвіка да таксоўкі. Уорвік дапамагаў яму выцягваць пакінуты ўчора ў багажніку кофр. Неба было чыстае-чыстае, як вымытае ўчорашняю навальніцаю; Уорвік ужо пасьпеў заўважыць, што ня кожны дзень над Парыжам, змучаным смогам, бывае ўраньні такое чыстае, маладое неба.

Перад тым, як разьвітацца, яны абняліся.

– Прыяжджай, – сказаў Мішэль.

– Абавязкова, – паабяцаў Уорвік.

Ён адчуваў, што сапраўды ня супраць вярнуцца.

– Вітаньні Ірэн! – сказаў Уорвік, калі таксоўка была крануўшыся.

Мішэль, ужо аддалены танаваным шклом, кіўнуў галавой: ну, ведама!

У машыне Ўорвік спаў. У аэрапорце ягонае цела яшчэ захоўвала прыемную млявасьць, спакойнае цяпло начнога сну;

але дакучлівай санлівасьці Ўорвік не адчуваў. Па залі, у вызначаных указальнікамі кірунках, рухаліся абцяжараныя багажом людзі; Уорвік, у хвалюючым прадчуваньні блізкага неба, падняў вочы на табло, і раптам лямпачкі падміргнулі і выдалі яму такі, аказваецца, нескладаны шыфр: «Бог ёсьць».
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/12
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2 [image]-[image]2006

аналітыка • крытыка • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ЮРЫ ПАЦЮПА

паэт, крытык літаратуры. Жыве ў мястэчку Азёры пад Горадняй, выкладае ў Гарадзенскім унівэрсытэце.

Юры Пацюпа Куды вядзе лёгіка балцкага аўтахтанізму?

Здавён лічыў сябе прыхільнікам канцэпцыі балцкага субстрату і ніколі ня думаў, не гадаў, што мне давядзецца выказваць запярэчаньні на даную тэму. На жаль, Аляксей Дзермант ды Сяргей Санько так старанна даводзілі балцкае паходжаньне беларусаў, што ўпершыню прымусілі мяне засумнявацца ў слушнасьці гэтае ідэі. Зрэшты, яны не пахіснулі маіх ранейшых паглядаў, а хутчэй прымусілі задумацца над абсягамі тарнаваньня данае тэорыі. Мала таго, я нават не прэтэндую на тое, каб аспрэчваць іхныя меркаваньні, бо не лічу сябе досыць кампэтэнтным для падобнае крытыкі. Мае запярэчаньні – гэта сумневы чалавека збоку, які абапіраецца не на адумысныя дасьледаваньні ў данай галіне, а толькі на лёгіку здаровага розуму.

Яшчэ ня так даўно, за маёю памяцьцю, усякі напамін пра балцкі субстрат запраўды ўспрымаўся як крамола. Рэакцыя на яго была чыста іррацыянальная, часамі проста дзікая. Да гэтае пары не магу забыцца карцінкі, якую мне давялося назіраць у 1990 годзе на нейкай канфэрэнцыі ў Інстытуце этнаграфіі і фальклёру АН БССР. Выступоўца апавядаў пра блізкасьць

матываў у беларускім і літоўскім фальклёрах. Які ж вэрхал усчаўся пасьля таго дакладу! Адна «навуковая» дама крычала з прэзыдыюму: «Я беларуска! І не хачу, каб мяне залічвалі да балтаў!» Гэты лямант мяне ўразіў тым, што гучаў у нетрах Акадэміі – бажніцы розуму і развагі. Відаць, тая дама апрыёры ставіла знак роўнасьці паміж беларускасьцю і славянскасьцю. Тады хацелася ўстаць і сказаць ёй: «Пытаньне ня ў тым, беларуска вы ці не, а ў тым, кім ёсьць беларус насамрэч! Дый ці мае для навукі які сэнс ваша асабістае жаданьне!»

З тае пары шмат вады ўцякло, шмат што зьмянілася. Але нашыя жаданьні ўсё яшчэ псуюць чысьціню навуковых выракаў. Таму хочацца запытацца: а ці не захапіліся шанаваныя мною аўтары ўласнымі тэарэтычнымі канструктамі, страціўшы лучнасьць з рэчаіснасьцю? У навуцы такое здараецца! Пагляд збоку, калі да яго ставіцца ўсур'ёз, заўжды карысны. Непаразуменьне з боку публікі – гэта толькі падстава, каб удакладніць прапанаваную тэорыю: зьясьніць цьмяныя мясьціны, дагаварыць недагаворанае, прыбраць узьніклыя супярэчнасьці – праўда, не за кошт грувашчаньня новых тэорыяў! Мушу зацеміць, у пляне мэтадалёгіі дужа карыснае цьверджаньне аўтараў: «Тэорыя тым жыцьцяздольнейшая, чым большую колькасьць фактаў яна можа тлумачыць, засноўваючыся на мінімуме зыходных прыпушчэньняў». Аднак, ці ўсе факты тлумачыць тэорыя, прапанаваная Дзермантам і Саньком? І ці няма ў гэтай тэорыі дамешку ідэалёгіі, жаданьня на гвалт менавацца балтамі, як тая дама мусова хацела быць славянкаю?

1. «Беларусы – гэта славянамоўныя балты». Так фармулююць сваю тэорыю «аўтахтанізму» Дзермант ды Санько. Мне ж падаецца, што прапанаваная «формула» зручная як слоган для ідэалёгіі, а для навукі яна занадта «гумовая». Пад гэты вырак можна падагнаць якія заўгодна факты і якія заўгодна высновы. Галоўнае ж у ёй тое, што акцэнт ставіцца на балтах. Як ні дзіўна, нешта падобнае пісаў Мікола Ермаловіч, якога наўрад ці можна назваць «балтафілам»: «Беларусы хутчэй за ўсё зьяўляюцца не збалтызаванымі славянамі, а аславяненымі балтамі». Усё ўдае на тое, што аўтара «Старажытнае Беларусі»

падвяла падступная гульня слоў, бо яго развагі цалком супярэчаць вышэй прыточанаму выраку. «Падкрэсьліваючы значэньне балцкага элемэнту ў фармаваньні беларусаў, мы адначасова не павінны і пераацэньваць яго», – папярэджвае Ермаловіч. «Формула», як бачым, нічога ня значыць, для навукі куды важнейшае яе рэальнае напаўненьне.

Далей я ня буду спрачацца наконт «формулы», а толькі працягну цытату зь Ермаловіча, бо ў яго ёміста выказана тое, што дагэтуль ня страціла актуальнасьці і што праціўляецца тэорыі Санька–Дзерманта:

Роля балцкага субстрату ў этнагенэзе беларусаў меншая, чым, напрыклад, угра-фінаў у этнагенэзе велікарусаў. Зьдзіўляе таксама і малая колькасьць балтыйскіх запазычаньняў у беларускай мове, хоць, на першы погляд, іх павінна б быць значна болей, асабліва ўлічваючы вялікую колькасьць балцкіх гідронімаў у Беларусі. І гэта ня дзіўна. Як мы ўжо бачылі, Беларусь у сілу яе геаграфічнага становішча была месцам, дзе асабліва канцэнтраваўся славянскі элемэнт, і таму ён мог значна перамагаць балцкі. Нельга забываць і пра слабую заселенасьць паасобных месцаў у балцкую эпоху.

Гэтыя словы не адпрэчваюць ідэі балцкага субстрату, але ўводзяць яе ў разумныя рамы.

2. Цяпер зьвернемся да зьместу канцэпцыі этнагенэзу, якую Дзермант і Санько называюць «аўтахтанісцкай». Яе ідэя палягае ў тым, што нашыя продкі – балты – спрадвеку жылі на гэтай зямлі і ніадкуль не прыходзілі. У якасьці доваду аўтары зьвяртаюцца да фальклёру, маўляў, «беларусы захавалі ўласны этнагенэтычны міт з арыгінальнай аранжыроўкай вельмі архаічных матываў». Ня буду й на гэты конт пярэчыць. Можа, так яно й было. Але чаму аўтары аўтахтанічнае тэорыі ўпэўненыя, што гэнымі продкамі былі акурат балты, а не славяне? На сёньняшні дзень у навуцы існуюць дзьве больш-менш імаверныя тэорыі прарадзімы славянаў. Паводле адной зь іх, славяне адпачатку жылі ў міжрэччы Віслы і Одэра, а паводле

другой – прарадзімай славянаў было міжрэчча Дняпра і Бугу. Дык калі паводзіцца другой канцэпцыяй, выходзіць, што аўтахтанічная тэорыя працуе не на балтаў, а на славянаў?

Зрэшты, я не прыхільнік ні дняпроўска-бускае тэорыі, ні аўтахтанізму Дзерманта–Санька, мяне хвалюе зусім іншае: ці не занадта яны зьлегкаважваюць ролю славянскае міграцыі? Высновы, да якіх вядзе разгляданая тэорыя, выклікаюць, мякка кажучы, трывогу, вельмі ж яны заблытваюць праблему глётагенэзу. І тут я ўжо ня стану прыбядняцца, бо маю ў данай галіне сякі-такі досьвед, пэўна што, абмежаваны, каб прэтэндаваць на самастойную канцэпцыю, але дастатковы, каб рабіць выракі, разважаць над моўнымі фактамі, праўда, да гэтага мы вернемся ў канцы тэксту. Цяпер жа паспрабуем разгледзець, у чым заганнасьць тэорыі Дзерманта–Санька, урэшце, якую небясьпеку яна ў сабе хавае. Мо' дарма я хвалююся?

3. Аўтары запярэчваюць супраць «мэтадалягічна неправамернага зьмешваньня этна-, глёта- і культур-генэтычных праблематык». Гэтае цьверджаньне само празь сябе, калі браць яго абстрактна, цалком праўдзівае. Аднак давайце падыдзем да яго зь іншага боку: ці слушна этнагенэз разглядаць ізалявана ад глётагенэзу? Або, урэшце, ці можа этнагенэз супярэчыць глётагенэзу? Думаю, на абодва пытаньні адказ будзе адмоўны. Дык вось! Падобна на тое, што шаноўныя аўтары сваім «несупярэчлівым» разьвязаньнем праблемы этнагенэзу заганяць праблему паходжаньня беларускае мовы ў беспрасьветны тупік. Бо як яшчэ можна схарактарызаваць тое, што яны пішуць: «Асыміляцыя мясцовых балцкіх плямёнаў магла (...) адбывацца толькі ў умовах славянамоўнага гораду, які дамінаваў над вясковай акругай». Хочацца запытацца: якога гораду? Калі адбывалася тая асыміляцыя?

Адказ, які прапануецца, нельга нават уважаць за адказ. Гэта нейкая цьмяная, размытая адгаворка і больш нічога. «Найістотнейшую ролю ў пашырэньні славянскай мовы адыгралі мэтаэтнічныя вайскова-гандлярскія карпарацыі «русі», сярод якіх пераважалі выхадцы з Скандынавіі», – на поўным сур'ёзе заяўляюць аўтары. Насамрэч, гэта голае дапушчэньне,

якое працуе на карысьць «аўтахтанісцкае» тэорыі, але не пацьвярджаецца жадным моўным фактам. Далей яшчэ горш: «Апрача «адміністрацыйнага», важным чыньнікам асыміляцыі быў, бясспрэчна, і рэлігійны, калі хрост балтаў у «рускую» (праваслаўную) веру ўрэшце прыводзіў да іх мэнтальнай і моўнай рутэнізацыі». Ага! З гэтае заявы нарэшце высьвятляецца, што тая «клятая» рутэнізацыя абывалася ў XI–XII стагодзьдзях, прынамсі, не раней за другую палову X стагодзьдзя. І тут усё сыплецца...

Падобныя заявы можна рабіць толькі цалком абстрагаваўшыся ад фактаў гісторыі беларускае мовы. І паверыць ім можа адно той, хто нічога пра гэтыя факты ня чуў. Рэч у тым, што мовай царквы ў даны пэрыяд была мова царкоўнаславянская, якая становіць сабой штучнае ўтварэньне, узьніклае на грунце паўднёваславянскага салунскага дыялекту. Тым часам беларуская мова, калі браць яе народную аснову, ня ўтрымвае, і даўней ніколі ня ўтрымвала, жадных паўднёваславянскіх элемэнтаў. Царкоўнаславянізмаў паддастаткам у расейскай мове, ёсьць нават падстава расейскую літаратурную мову ўважаць неаўтэнтычнай, узьніклай на кніжнай аснове (прычыны гэтай зьявы даўно ведамыя і добра апісаныя). Што да беларускай мовы, дык царкоўнаславянізмаў, як сабака блох, яна набралася якраз у савецкі пэрыяд. Ведама, у некаторых даўнейшых тэкстах назіраецца гэткі кніжны «налёт», але ён лёгка аддзяляецца ад тутэйшае асновы, нібыта тлушч ад вады.

А тое, што мова царквы ніяк не паўплывала на беларускія гаворкі, пацьвярджае якраз адваротнае: даволі ўстойлівую славянскую аснову. Нават расейскі глётагенэз недарэчна абмяжоўваць царкоўным уплывам, а наш – і пагатоў. Дзіўна думаць, быццам тагачасны горад за скрайне сьціслы тэрмін здолеў перастрававаць кансэрватыўную вёску. Таксама цікава было б даведацца, чаму гэты самы горад ня даў рады засьміляваць жмудзі ды аўкштоты на абшарах Вялікага Княства Літоўскага? Пытаньні паўстаюць адно за адным: адкуль тыя «выхадцы з Скандынавіі» несьлі славянскі элемэнт? як разьмяркоўваліся сьвецкія і царкоўныя ўплывы? як гэтыя ўплывы дачыняліся да іншых «рускіх» земляў? наколькі былі ўстойлівыя зьявы «славянізацыі»? Пад напорам новых і новых

пытаньняў прапанаваная канцэпцыя сыплецца як карткавы дамок. Яна нават больш хісткая, чым тэорыя раптоўнага ўзьнікненьня і раптоўнага ж распаду «старажытнарускае» моўнае еднасьці.

4. Ня менш, калі ня больш, заганная тэорыя Дзерманта–Санька і з ідэалягічнага боку. Я рады абмыліцца, але, баюся, бяда аўтараў у тым, што яны ўпэўненыя, быццам сваёй канцэпцыяй робяць вялікую паслугу беларускай культуры. Нездарма ж яны папікаюць Зянона Пазьняка за «славянафільства». Іх упэўненасьць падмацоўваюць расейскія ідэолягі, у якіх канцэпцыя аўтахтанізму выклікала страх. Але шаноўныя аўтары хіба што мала задумваюцца, што за цудоўную цацку яны даюць у рукі г. зв. «расейскамоўных» беларусаў. Калі беларуская мова – гэта ўсяго толькі «наслаеньне» (выпадковае? непажаданае? прыкрае?) на целе цалком балцкага беларускага народу, дык якая зь яе наўда? Ці ня ўсё роўна, на якой славянскай (польскай, расейскай, беларускай – усё роўна ж чужой!) мове мы гаворым? Раз мы лёгка страцілі балцкую мову, чаму ня страціць славянскую? А калі дадаць сюды тое, што частка расейцаў – таксама балты, дык няхай жыве заходнерусізм!

Паспрабуем далей разважаць у рэчышчы, прапанаваным Саньком і Дзермантам. Хай сабе беларусы не славяне, а толькі «славянафоны», тады ўзьнікае пытаньне, а хто з славянаў праўдзівыя славяне? Ці мо' славянаў наагул няма? Пойдзем далей: хто з германцаў праўдзівыя германцы? А хто зь фіна-вугорцаў праўдзівыя?.. А грэкі ці ня ёсьць грэцкамоўнымі туркамі?.. Само сабой, для навукі ўсе гэтыя пытаньні яйка выедзенага ня вартыя, затое ў ідэалёгіі ёсьць толькі два шляхі: або не правакаваць падобных пытаньняў або адказваць на ўсе адразу. Між іншым, менавіта для ідэалёгіі, а дакладней для «беларускае ідэі» пытаньне «мовы» куды важнейшае за пытаньне «крыві» ці пытаньне «веры». Як бы гэта парадаксальна ні дачынялася да запраўднасьці – усё ж беларуская культура – мовацэнтрычная, і ўсякі падкоп пад мову ёсьць «ідэалягічнай дывэрсіяй».

5. У якасьці замкненьня да сваіх пярэчаньняў мушу, як і абяцаў, даць некалькі заўваг аб беларускім глётагенэзе. Пачну з цытаты:

Што ся дзеіць па вярэмянем – то атыдзець па вярэмянем. Прыказана будзець добрым людзям: а люба граматаю ўцьвердзяць, как то будзець усем ведама, ілі хто пасьля жывы астанецца.

Таго лета, калі Альбрахт, уладыка рыскі ўмёр – уздумаў князь смаленскі, Мсьціслаў Давыдаў сын, прыслаў у Рыгу сваёга луччага папа Ерамея і зь нім вумна мужа Панцялея із сваёга горада Смаленска. Та была паслыма ў Рызе. Із Рыгі ехалі на Гоцкі бераг – тама цьвердзіці мір. Уцьвердзілі мір, што было нямірна праміж Смаленска і Рыгі, і Гоцкім берагам – усім купцом.

Пра сей мір трудзіліся добрыя людзі: Ральф із Кашэля дваранін, Тумаш-смалянін, аж-бы мір быў – і да века. Урадзілі пак мір, как было люба Русі і ўсяму лацінскаму языку, хто-то ў Рызе гасьціць.

На том міру, аж-бы мір цьвёрды быў – так было князю люба, і рыжанам усем, усёму лацінскаму языку, і ўсем цем, хто-та на ўсток мора ходзіць, – аж-бы налезл праўду, то напісаці, как то дзяржаці русі з лацінскім языком і лацінскаму языку з русьсю-то дзяржаці. Аж быхам што-тако ўчынілі – таго Бог ня дай! – аж-бы праміж намі бой быў, а люба чалавека ўб'юць да сьмерці. Как чалавека-то адплаціці, аж-бы мір не разрушан быў. Так плаціці, как то бы абоім люба было.

Зьдзе пачынаецца праўда.

Гэта ўрывак з даўнейшае граматы, дамовы смаленскага князя Мсьціслава 1229 году з Рыгаю і Гоцкім берагам. Зробленая мною адаптацыя граматы да сучаснага правапісу не прэтэндуе на навуковую дакладнасьць, але яна не нашмат менш навуковая, чым адаптацыя «Мужыцкае праўды» Кастуся Каліноўскага да сучаснага правапісу, чым адаптацыя «Дудкі

беларускай» Францішка Багушэвіча, чым замена ў тэкстах пісьменьнікаў-нашаніўцаў склонавых формаў: *на палёх, даць братом* – формамі *на палях, даць братам*. Затое мая адаптацыя – зробленая «з нагоды», насьпех – упершыню дазваляе шырокаму чытачу далучыцца да тэксту XIII стагодзьдзя. Хто заявіць, што перад намі не беларуская мова?! Кажуць, быццам ісьляндзкая мова за цэлы час так мала мянялася, што яе носьбіты разумеюць тэксты XII стагодзьдзя. А ці патрэбныя асаблівыя намаганьні, каб мы зразумелі свой тэкст XIII стагодзьдзя?

Што з сказанага вынікае? Тое, што дыялекты, якія леглі ў аснову сучаснае беларускае мовы, як зазначае Віктар Мартынаў, ужо на момант станаўленьня беларускае дзяржаўнасьці мала чым розьніліся ад сучасных гаворак. Ведама, у іх разьвіцьці важную ролю адыгрываў як балцкі, так і славянскі элемэнт. Да літаратурнае мовы тут было яшчэ далёка, але гэта ні ў якім разе ня нейкае выпадковае, насьпех засвоенае кайнэ. Тым больш царква тут ні пры чым. Царкоўнаславянская ж мова, як ні дзіўна яно гучыць, самая «неславянская» з усіх славянскіх моў (як і расейцы, паводле расейскага філёзафа Канстанціна Лявонцьева, самы неславянскі народ з усіх славянаў). Царкоўнаславянскіх элемэнтаў у прыточаным урыўку пад мікраскопам цяжка знайсьці. А што да «вайсковае адміністрацыі» тых «выхадцаў з Скандынавіі», дык наагул дзіўна, як гэта яны, самыя ня будучы славянамі, ды пры тагачасных камунікацыях, асымілююць тых бедных «балтаў»?

У XI – XIII стагодзьдзях на ўсіх землях, менаваных «рускімі» ці «ўсходнеславянскімі», склалася моўная сытуацыя, якую называюць дыглясія. Пры дыглясіі дзьве розныя мовы суіснуюць як два розныя стылі: функцыянальна разьмежавана. Адна зь іх, царкоўнаславянская, служыць для літаратурнае камунікацыі, а другая – дыялектная – абслугоўвае патрэбы камунікацыі вуснае. Пры дыглясіі на кніжнай мове не гавораць, а на гутарковай – ня пішуць. Менавіта з гэтае прычыны мясцовыя гаворкі атрымваюць толькі фрагмэнтарную пісьмовую фіксацыю. І менавіта з гэтае прычыны кніжную мову ня могуць засвоіць шырокія масы. Аднак у часы Вялікага

Княства Літоўскага дыглясія пераходзіць у дзьвюхмоўе: паралельна з царкоўнаславянскай узнікае беларуская літаратурная мова. Тым часам у расейцаў амаль да канца XVIII стагодзьдзя праіснавала дыглясія.

Беларуская мова (як даўнейшая, так і сучасная) разьвілася не на кніжнай, а на народнай аснове. Паміж старабеларускай і сучаснай беларускай мовамі няма такога разрыву, які ёсьць паміж расейскай старажытнай і расейскай сучаснай. Да таго ж, наша літаратурная мова на некалькі стагодзьдзяў апераджае расейскую літаратурную. Мова Статуту – гэта сучасная мова з дамешкам архаізмаў. Беларускі паэт XVIII стагодзьдзя Дамінік Рудніцкі на 35 гадоў старэйшы за Міхайлу Ламаносава, а яго мова нам больш зразумелая, чым мова Ламаносава яго супляменьнікам. Праўда, беларуская мова супраць расейскае куды менш унармаваная, але гэта ўжо іншая рэч. На гэтай глебе часамі ўзьнікаюць хістаньні, то на Ўсход, то на Захад. Аднак сыстэмны выбар моўных сродкаў лёгка рэглямэнтуецца пільна прааналізаванай і добра зразуметай гісторыяй мовы.

Часамі пытаюцца, якая мова стаіць бліжэй да беларускае – расейская ці польская? Само пастаноўка пытаньня абмыльная: у якім сэнсе бліжэй? Рэч у тым, што ёсьць дачыненьні сямейныя і хаўрусныя. З расейцамі нас зьвязваюць вытокі, базавыя элемэнты мовы, з палякамі – культура, кніжныя пласты мовы. Калі ў расейцаў маркерамі кніжнага стылю служаць памянёныя царкоўнаславянізмы, дык у беларусаў гэткую ролю выконваюць паланізмы. Я даўно спрабую давесьці, што на абсягах колішняе Рэчы Паспалітае склаўся балтыйска-чарнаморскі моўны хаўрус, у склад якога ўходзілі палякі, беларусы, украінцы і літоўцы. Пры выбары моўных сродкаў, беручы пад увагу ідэю моўнага хаўрусу, шкодна замыкацца як на ідэі абсалютнага пурызму, так і на і ўсходнеславянскасьці. Апошняе, паводле жорсткае «недыялектычнае» схемы (эўрапейскае – славянскае – усходнеславянскае – беларускае) некалі сьцьвярджаў Іван Чарота. Да нейкага «перакуленага» пурызму вядзе нас «балцкі аўтахтанізм»...

Аднак... падобна, што мае разважаньні пачалі адхіляцца ад тэмы. Ці не паставіць на гэтым кропку? Спадзяюся, беларускую

мову я адбараніў!
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/03/12**
[image]

Мінарыя (9’2000)

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image]-[image]2006

аналітыка • крытыка • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Янаў Палескі Прыгоды двайной прапіскі ў ансамблі дылемаў

ЯНАЎ ПАЛЕСКІ (нар. у 1968 у вёсцы Матыкалы Берасьцейскага раёну) – філёзаф, палітычны камэнтатар, рэдактар інтэрнэт-выданьня «Наше мнение». Скончыў асьпірантуру Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту. Быў галоўным рэдактарам сайту ЭГУ. Выбраныя публікацыі: Ісая Бэрлін пра свабоду //

Нярэдка тое, што ўяўляецца невырашальнай праблемай – і з гэтай прычыны выдае сябе за «кансэнсус», прыкідваецца поўнай адсутнасьцю канфліктаў, супрацьстаяньняў і праблемаў – мае ў сабе пэўныя карыстальніцкія выгады і пэрспэктывы. Такім чынам, з прыцэлам на «выгады» і «пэрспэктывы», магла б быць выкарыстаная і ўспадкаваная намі праблема дзьвюхмоўя. Максім Жбанкоў і Андрэй Расінскі ў сваіх дыялёгах, магчыма, адны зь першых прыступілі да сьвядомага выкарыстаньня Вялікага Білінгвізму ў якасьці фірмовага маркеру, культурнага брэнду sui generis (калі казаць сучаснай мовай)[1]. У прэамбуле да першага дыялёгу з гэтай сэрыі выдаецца папярэджаньне: «размову будуць весьці ня проста два суразмоўцы, а людзі, якія валодаюць тутэйшай (але крыху адрознай) культурнай прапіскай. Дзьвюхмоўе прынцыповае: мы разумеем адзін аднога, але мысьліць кожны па-свойму»[2].

Я схіляюся да думкі, што сапраўды адэкватнае разуменьне (адзін аднаго) магчымае толькі на ўмовах гэтага «па-свойму», на мовах, умоўна кажучы, сыстэмы дыфэрэнцыяльных

разыходжаньняў, якая прадугледжвае апазыцыю, канфлікт. «Сапраўды, як можна ня бачыць, – нагадвае П’ер Бурдзё, – што ў канфлікце і шляхам канфлікту нараджаецца пэўная форма кансэнсусу? Найперш таму, што для вядзеньня спрэчкі неабходна мець згоду адносна саміх паняткаў, тэрмінаў, разьмежаваньня, а таксама таму, што канфлікт інтэрвенцыйны прынамсі, дазваляе вызначыць супольную праблематыку, супольныя прынцыпы бачаньня (vision) і падзелу (division) сьвету, якія такім чынам эксплікуюцца, аб’ектывуюцца і становяцца агульнавядомыя»[3].

Зыходзячы з гэтага, варта было б прызнаць, што папярэднія вынікі разьмежаваньня, якое адбылося ў выніку моўнай палітыкі «Нямецкай хвалі», хутчэй абнадзейваюць, чым расчароўваюць[4]. «Вайна культураў», пра рэальнасьць якой нагадваюць Валянцін Акудовіч і Юры Дракахруст, падобная да ўсялякай іншай вайны ў тым, што ёсьць пэўнай разнастайнасьцю камунікацыі. Лічыцца, што гэтая вайна, барацьба, альбо, калі хочаце, камунікацыя ажыцьцяўляецца паміж дзьвюма сіламі, адну зь якіх прадстаўляюць беларускамоўныя інтэлектуалы, другую – расейскамоўныя (назавём іх адпаведна камандамі By і Ru). Паміж тым, блытаніну ў гэтую палеміку ўнесла тое, што В. Сілінкі, удзельнік групы By, выступаў на расейскай мове, у той час як Ю. Дракахруст, прыхільнік групы Ru, – на беларускай. Гэтая «нявінная» блытаніна стала для мяне дадатковым стымулам да пераапісаньня гэтага канфліктнага здарэньня ў тэрміналёгіі супрацьстаяньня «лібэралаў» і «камунікатарыстаў» (Р. Рорці называе іх адпаведна «кантыянцамі» і «гэгельянцамі»[5]), – падзел у пэўнай ступені індыфэрэнтны да моўнага крытэру на By і Ru, хаця я і ня пэўны, што ў мяне выйшла гэта паказаць.

Vision (бачаньне), якое мае на ўвазе такі – даволі ўмоўны – division (падзел) і непазьбежны зварот да праблематыкі права і дабра, выклікала шэраг нараканьняў на мой адрас. Нараканьняў справядлівых і ня вельмі. Значная іх частка, як мне падалося, была зьвязаная з тым, што мне прыпісваўся намер «палічыць» і «клясыфікаваць» удзельнікаў дыскусіі, у той час як я ставіў сабе на мэце іншае – падпарадкаванае пераапісаньню праблемы. Так, напрыклад, пазначаючы А.

Фрагменты. 2000. – № 8; Радикальное просвещение Жижека, трое вещей, текст, Берлин // Сборник научных статей по материалам Международного научно-образовательного форума «Европа-2002». – Минск: ЕГУ, 2003; Концепция социального соглашения в современной либеральной теории // Сборник научных статей по материалам Международного научно-образовательного форума «Европа-2003». – Минск: ЕГУ, 2003; Агональный либерализм Исайи

Адамянца, А. Фядуту і Р. Мінянкова (група Ru) у якасці «кантыянцаў», я зусім ня меў на ўвазе, што яны «сапраўды» ёсьць такімі ў тым сэнсе, што заўсёды і паўсюль трымаюцца ключавых прэзумпцыяў раньняга Ролза (Дворкіна, Акермана, Нагеля, Скэнлона). Я меў на ўвазе, што яны праяўляюць сябе такімі ў дыскусіі вакол «Нямецкай хвалі», то бок абаіраюцца на вакабулярыі і аргумэнты, падобныя да тых, якія выкарыстоўваюцца ў легалісцкай (працэдурнай) вэрсіі лібэралізму, у той час як іх супернікі (група Ву) выстаўляюць аргумэнты (предъявляют иски), уласьцівыя камунітарнаму кірунку (Сэндэл, Макінтайр, Уолцэр)[6]. Зь іншага боку, пазыцыі, якія займаюць Ru і Ву у межах поля, структураванага апісанай дыскусіяй, гамагенныя тым, якія сваім часам займалі «лібэралы» і «камунітарысты» ў межах поля, структураванага праблематыкай лібэральнай справядлівасьці.

Берлина // Лоуд. 2003. № 4–5.

[1] Гл. Жбанков М., Расінскі А. «Дети» Лукашенко: Поколение которого мы не теряли // Наше мнение; Жбанков М., Расінскі А. Бесконфликтные танцы в лифте. Кіно безь зямлі і бязь неба // Наше мнение.

[2] Жбанков М., Расінскі А. Резня мотопилой на первом национальном. Трэш культура ў беларускім кантэксьце // Наше мнение.

[3] Бурдье П., Шартье Р. Люди с историями, люди без историй // Пер. с фр. О. Кирчик // Новое литературное обозрение. 2003. № 60. С. 75.

[4] Гл. матэрыялы дыскусіі на партале «Наше мнение» (асобна не пазначаюцца).

[5] Rorty R. Postmodernist Bourgeois Liberalism // Objectivity, Relativism, and Truth. Cambridge: Cambridge University Press, 1979. P. 198–199.

Хацелася б зьвярнуць увагу на колькі істотных момантаў. Па-першае, уведзены падзел больш ці менш адэкватна характарызуе цяперашні стан «моўнага» дыскурсу, але існыя суадносіны сілаў не праграмуюць усіх наступных ягонастаў, не вызначаюць ягонага генэзісу. Па-другое, пазыцыі, якія займаюць удзельнікі дыскусіі ў полі, абмежаваным «моўнай» праблематыкай, ня варта праектаваць на іх жа пазыцыі, займаныя ў палітычным полі наагул, альбо субпалёх, якія ўтвараюцца вакол тых ці іншых сілавых лініяў (апазыцыяў). У сапраўднасьці можна казаць пра тое, што канкрэтныя дыспазыцыі ці перавагі не заўсёды зьвязваюць нам рукі ў адносінах да іншых пераваг. Таксама як адны ажыцьцёўленыя намі стратэгіі не заўсёды накладаюць абмежаваньні на іншыя тыпы стратэгіяў. Гэта ўсё ўскладняе[7]. Так, напрыклад, можна быць беларускамоўным лібэралам і атамістам, альбо лібэралам і халістам, альбо, урэшце, расейскамоўным камунітарыстам і халістам, – карацей, наш моўны лёс далёка ня ўсё паведамляе пра лёс нашых сацыяльна-палітычных уяўленьняў і прыхільнасьцяў.

Такім чынам, можна было б паказаць прастору палітыкі

[6] Варта было б зленіснуць: частаный прадстаўнікі «моўнага» моўнага боку абаіраюцца на аргумэнты, характэрныя ідэі нацыянальна-адзіных рулаў XIX м. рыс паведамляе пагадзіцца з Р. Мінянковым. Таму, даючы

(улучна з прасторай дыскусіі з нагоды палітыкі) у выглядзе ансамблю, канстэляцыі спэцыфічных палёў альбо субполяў, кожнае зь якіх уяўляе сабой аб'ектыўнае судачыненьне сілаў, навязанае «ўсім уваходным у гэтае поле, і якія ня зводзяцца да намераў асобных агентаў ці іх непасрэдных узаемадзеянняў»[8]. Агент ня можа займаць у адным полі адначасова дзьве пазыцыі, хаця можа, як агент Сьміт з «Матрыцы», адначасова прысутнічаць у некалькіх палёх, прычым падыходы (габітусы), выкарыстоўваныя ім у адным (дыскурсіўным) полі і пазыцыі, на вырашэньне аднаго спэктру праблемаў, не прадвызначаць адназначна падыходаў для разьвязаньня праблемаў, што спэцыфікуюць іншыя палі. Я абмежаваўся апісаньнем некалькіх прынцыповых для культурна-палітычнай сытуацыі Беларусі/эпсавых дылемаў – як яны бачацца з пазыцыі мноЙ пазыцыі (а яна зусім не зьяўляецца «артыкуляцыяй праекцыяй усіх пэрспэктываў») – якія ў тых ці іншых адносінах выявіліся ў спрэчцы з нагоды «Нямецкай ідэалогіі».

7 Чарлз Тэйлар заўважае, што калі гаворыць пра «ідэалаў» і «камунітарыстаў», то маюцца на ўвазе, што гэтыя тэрміны апісваюць некаторыя сукупнасьці ідэяў, зьвязаных з другімі тыпамі праблемаў, што прадвызначаюць спэктар вырашальных усіх іншых праблемаў. Аднак гэта ні іншая пазыцыя, што да аднаго тыпу праблемаў зусім ня зьвязвае рукі адносна іншых, паколькі гэты адрасат недакладна пазначаны. Што значыць «Масква ў галаве»? Гэта значыць, калі карыстацца мовай Лякана–Жыжака, што абавязковым элемэнтам канкрэтнага сацыяльнага фантазму зьяўляецца «Масква».

8 Taylor Ch. Cross-Purposes: The Liberal-Communitarian Debate // Liberalism and Moral Life / Ed. Rosenblum N. Cambridge: Harvard University Press, 1989. P. 164.

«МАСКВА У ГАЛАВЕ»

Я мяркую, што аргумэнт, выстаўлены В. Цыганковым, адным з удзельнікаў апісванай дыскусіі, удзельнікам групы Rn (альбо, як іх няправільна называюць, прыхільнікам «маскоўска-лібэральнага праекту»), не лаецца, так бы мовіць, адрасата, «Любая пазыцыя – піша Тэйлар – у спрэчцы атамізм–халізм можа спалучацца зь любой пазыцыяй па праблеме індывідуалізм–калектывізм. Існуюць ня толькі атамісты-індывідуалісты (Нозік) і халісты-калектывісты (Маркс), але таксама халісты-індывідуалісты накшталт Гумбальта і нават атамісты-калектывісты, як у жахлівай праграмнай уступе В. Ф. Скіпэра «На той бок свабоды і годнасьці». Таму ён Ch. Cross-

ўнізе
Вярніцеся
Вы
вернулися
Сюдзіньку
Ўверсе
даводзіцца
(сябраэгіі)
пэўнае.

адрозьненьні). Напрыклад, сацыял-дэмакратычны і грамадзянска-лібэральны праекты, хаця яны амаль не карыстаюцца маркіроўкамі «нацыянальнага», усё-ткі зьяўляюцца нацыянальнымі праектамі – у тым сэнсе, што ўключаюць набор уяўленьняў пра «аптымальную» альбо «прымальную» дзяржаву, з аднаго боку, і нацыю, якая пад эгідай гэтай дзяржавы магла б камфортна бытаваць – зь іншага. Калі грамадзтва знаходзіцца ў нармальнай (у сучасным разуменьні) кандыцыі, гэтыя праекты знаходзяцца ў стане ўзаемнай канкурэнцыі, калі ж не – яны маргіналізуюцца – на карысьць праекту, які выдае сябе за праект зь вялікай літары, адзіна правільны праект, альбо праект, адзіны ў сваім родзе (з пэўным артыклем).

У чым большай ступені агент знаходзіцца пад уплывам дзяржаўнай ідэалёгіі (Беларусі альбо Расеі – тут, як ні дзіўна, істотнай розьніцы няма) альбо ідэалёгіі, прадукаванай кансэрватыўным крылом БНФ, у тым большай ступені ён схільны абгрунтоўваць сваю пазыцыю з «Масквой у галаве» – ці то абвінавачаньні ў злоўжываньні падобным тыпам абвінавачаньня альбо ў недастатковай да яго ўвазе. Хаця ў рамках гэтых нацыянальных праектаў: афіцыёзнага, які абапіраецца пераважна на вульгарны кансюмэрызм (купляй беларускае) і ідэалёгію палітычнай ляяльнасьці (стабільнасьць назаўсёды), і альтэрнатыўнага яму праекту КХП БНФ зь ягонай дактрынай культурнага адраджэньня – роля Масквы ацэньваецца самым супрацьлеглым чынам, яны, тым ня менш, аказваюцца падобнымі ў структурных адносінах.

У першым выпадку «Масква» ёсьць рэпрэзэнтацыяй радыкальнага культурна-палітычнага недахопу, у другім – лішка. У абодвух выпадках сам нацыянальны праект фармуецца вакол элемэнту, які ўвасабляе ягоную фатальную немагчымасьць (недастатковасьць), прычым сам гэты элемэнт – «Масква» – па сутнасьці, ня мае ўласнага зьместу. Ягоная функцыя, з аднаго боку, структуратворная, зь іншага – чыста пэрфарматыўная. Паказальна, што беларуская стратэгія інтэграцыі выключае канкрэтныя аб'яднаўчыя працэсы і абмяжоўваецца стаўкамі на паляпшэньне ўмоваў гандлю альбо цьмянымі дэклярацыямі наконт «дружбы» і «адзінства».

Падобным чынам дэманізуецца ўяўленьне пра Расею і ў другім выпадку: праграма КХП БНФ не дае падрабязнага апісаньня беларуска-расейскіх стасункаў. У абодвух выпадках сацыяльны фантазм «нацыянальнага праекту» абапіраецца на прэзумпцыю цэльнасьці, замкнёнасьці («сувэрэнітэт»), якая дазваляе разглядаць усялякае – непазьбежнае ў сучасным сьвеце – умяшальніцтва «ўва ўнутраныя справы» як культурна-палітычную інтэрвэнцыю. Іншымі словамі, абодва праекты ў сваёй аснове зьяўляцца ізаляцыянісцкімі, хаця ў першым выпадку мяжа падзелу ідзе ўздоўж заходняй мяжы Беларусі, а ў другім – уздоўж усходняй. У абодвух выпадках мы знаходзім таксама і спэцыфічныя тэорыі змовы, якія даюць магчымасьць тлумачыць тыя ці іншыя палітычныя падзеі («змова брусэльскіх бюракратаў», «змова Масквы»).

Такім чынам, хаця прыхільнікі падобных уяўленьняў пра нацыянальны сувэрэнітэт зьяўляюцца пераважна прадстаўнікамі дзьвюх розных моўных групаў, яны сыходзяцца ў тым, што тычыцца ўяўленьня пра strong sovereignty (SS), а разыходзяцца ў тым, што тычыцца канкрэтнай канфігурацыі SS, у тым ліку – і ў пытаньні пра мову.

У чым меншай ступені агенты знаходзяцца пад узьдзеяньнем падобных установак (у тым ліку тых, якія спрабуе навязаць расейская кіроўная кляса), у тым большай ступені яны схільныя трымацца «слабога» (weak) уяўленьня пра сувэрэнітэт (WS). «Дзяржава-нацыя» ў гэтым выпадку мысьліцца непазьбежным і немінучым чынам уключанай у каскады «вонкавых» уплываў і ўзьдзеяньняў, якія не абавязкова ўспрымаюцца як інтэрвэнцыі. Дзяржаўны сувэрэнітэт, у выніку, разглядаецца як адпачатна стыгматызаваны дэфіцытам, які не патрабуе дапаўненьня за кошт элемэнтаў накшталт «Масквы». «Масква», такім чынам, дэміталягізуецца, то бок адкідвае дзьвюхкосьсе, становіцца проста Масквой і перастае адыгрываць ролю цэнтральнага пэрфарматыўнага элемэнту. І выходзіць «са складу» нацыянальнай ідэі. Няцяжка заўважыць, што ў такой пэрспэктыве сама нацыянальная ідэя губляе сваё выключнае становішча і займае сваё месца сярод іншых ідэяў.

Сярод прыхільнікаў WS можна знайсьці як нашых

беларускамоўных (у тым ліку некаторых актывістаў лібэральнага крыла БНФ), так і расейскамоўных суграмадзянаў. Вельмі павучальныя сюжэты дыскусіі, якая разгарэлася ў СМІ адносна ролі Масквы ў кантэксьце беларускай перадвыбарнай сытуацыі, калі частка расейскамоўных аналітыкаў і палітыкаў адвяла Расеі вельмі сьціплае (часьцей за ўсё ацэньванае нэгатыўна) месца ўва ўнутрыпалітычных баталіях.

Як супернік ідэі «экстрэмальнага» альбо «моцнага» сувэрэнітэту ўспрымае абвінавачаньні супрацьлеглага боку ў тым, што ёсьць інструмэнтам культурнай (палітычнай) інтэрвэнцыі з боку вонкавых сілаў, у прыватнасьці, «краіны-мэтраполіі»? Як кур'ёз, хаця і небясьпечны. Хацелася б настаяць на тым, што калі Аляксандар Фядута пісаў кнігу пра Пушкіна, яму не патрабавалася санкцыя Ельцына, у той час як я, выкарыстоўваючы ідэі Ісаі Бэрліна альбо Рычарда Рорці, ня маю патрэбы ўва ўхваленьні Лёндану і Вашынгтону. Зь іншага боку, Масква, Лёндан і Вашынгтон, як правіла, не даюць адпаведных указаньняў – ці не таму, што ўсе гэтыя канцэптуальныя рэсурсы могуць быць скіраваныя супраць іх? Іншымі словамі, Крэмль, Масква і нават расейскі народ ня мае манаполіі на Пушкіна, Бярдзяева альбо Ўладзімера Сьпівакова.

Я мяркую, што напружаньне паміж актывістамі SS і WS у меру эмансыпацыі дзяржаваў постсаветыкуму – а гэты працэс, на маю думку, незваротны – будзе паступова аслабляцца, хаця «нулявой кропкі» не дасягне ніколі.

ГУЛЬНЯ ВАКОЛ ІДЭНТЫЧНАСЬЦІ

Паколькі ўяўленьне пра ідэнтычнасьць закранае прынцыповае вымярэньне любога (альбо амаль любога) сацыяльнага праекту (незалежна ад таго, прагаворваецца ён пра гэта альбо не), то тут, як і ў папярэднім выпадку, напружаньні ўзьнікаюць паміж трыма асноўнымі сіламі (дзьве зь якіх сёньня знаходзяцца ў маргінальным стане), і, як і ў папярэднім выпадку, сілавыя лініі ня ў поўнай меры супадаюць з моўным разломам.

Афіцыйна ўзятая на ўзбраеньне дактрына «беларускага

славянства» трымаецца ідэі (калектыўнага) суб'екту, якую найбольш ёміста ахарактарызаваў галоўны яе выразнік: «беларусы – гэта расейцы са знакам якасьці». Іншымі словамі, усялякі сапраўдны беларус адрозьніваецца ад усялякага адвольна ўзятага расейца адно ў тым, што валодае гэтым магічным прыросткам – «знакам якасьці». Ня так важна, у чым менавіта гэта знак палягае, у чым ён выражаецца альбо як ён выглядае (на гэты конт можна пачуць самыя абсурдныя развагі), але ягоная наяўнасьць прынцыповая. Ня менш прынцыповая, чым наяўнасьць іншага знаку (дакладней, знакавай сыстэмы – беларускай мовы) у канцэпцыі ідэнтычнасьці, якая разьвіваецца прыхільнікамі дактрыны беларускага адраджэньня. У гэтым выпадку беларус – гэта нерасеец par excellence, прычым ягоная асобная мова ёсьць галоўным знакам адрозьненьня і, адпаведна, восевым элемэнтам калектыўнай ідэнтычнасьці. *«Няўжо трэба даказваць, што мы жывём у сьвеце, дзе нацыянальная ідэнтыфікацыя ёсьць неабходным чыньнікам жыцьця, а мова – яе асноўны кампанэнт?»* – задаецца пытаньнем В. Цыганкоў. Гэта рытарычнае пытаньне: яно не патрабуе адказу, прычым у гістарычнай сытуацыі, калі ні адказ, ні самое пытаньне ня ёсьць нечым самавідавочным. Асабліва ў тым самым сьвеце, у якім мы жывём. Калі, натуральна, вядзецца пра той самы сьвет.

Лічу неабходным заўважыць, што канцэпцыя ідэнтычнасьці, разьвіваная беларускамоўнымі інтэлектуаламі, у значнай ступені больш распрацаваная, чымся тая, што стыхійна склалася ў афіцыйнай ідэалягічнай плыні, але ў гэтым жа праяўляецца яе слабы бок, паколькі de facto яна апэлюе да практык выключэньня. Адзначым два істотныя моманты, у якіх абедзьве дактрыны аказваюцца падобнымі. Па-першае, праблематыка ідэнтычнасьці разьвіваецца ў *прымардыялісцкай* альбо *эсэнцыялісцкай* пэрспэктыве, то бок прызнаецца наяўнасьць нязьменнай сутнасьці чалавека, пэўнага саматоеснага ядра (ці то канкрэтная мова, ці то абстрактны знак якасьці)[9]. Па-другое, сам канцэпт ідэнтычнасьці выступае ў якасьці свайго роду «сярэдняга тэрміну» паміж індывідуўмам і грамадствам. Карацей, ідэнтычнасьць – гэта грамадства ў індывідзе і індывід у грамадстве. На гэты конт праграма КХП БНФ як бы прагаворваецца, прызнаючы «права чалавека і права

нацыі на самавыяўленьне роўнавялікімі»[10]. І з гэтай жа прычыны, зь якой ідэнтычнасьць пэўным чынам пераадольвае апазыцыю грамадзтва–індывід, энтузіясты (подвижники) адпаведных нацыянальных праектаў кожны раз апэлююць да «адзінства» як неабходнай умовы гэтых праектаў існаваньня і ажыцьцяўленьня.

Трэцяя сіла, якая апаніруе (актуальна альбо патэнцыйна) першым дзьвюм, у тым большай ступені будзе апэляваць да «салідарнасьці» – у супрацьвагу «адзінству» – у чым больш ступені яе прадстаўнікі прытрымліваюцца так званай *канструктывісцкай* мадэлі ідэнтычнасьці альбо наадварот – наагул ніяк не турбуюцца гэтай ідэнтычнасьцю. «*Солідарнасьць*, – падкрэсьлівае ў гэтай сувязі Р. Рорці, – *павінна быць сканструявана з маленькіх кавалачкаў, яна не чакае таго, каб яе знайшлі ў форме пра-мовы, якую мы ўсе адразу прызнаем, як толькі яе пачуем*»[11]. Што да беларускага грамадзтва, тэта, у прынцыпе, значыць, што яднаным актуальным і сапраўдным прадстаўнікам могуць (і павінны) быць ня толькі носьбіты беларускай мовы, але таксама і расейскай, польскай, украінскай, а таксама мовы нямых людзі, без усялякіх там «знакаў якасьці», якія купляюць на толькі беларускае, вераць ня толькі ў «стабільнасьць» у духу папулярнай ідэалёгіі, не суадносяць сябе з «бацькам нацыі» і нішто – здаецца, акурат гэта мяне на ўвазе Тыгор Мінянкоў, калі агітуе на карысьць грамадзянскай ідэнтычнасьці.

У выпадку з канструктывісцкай канцэпцыяй ідэнтычнасьці мы маглі б ужываць ідэнтычнасьць у ейным найбольш вымеру той разнавіднасьці кантыянства, якая знайшла сваё выяўленьне ў радыкальна індывідуалістычнай тэорыі Джона Ролза[12]. Рэч у тым, што адным з вырашальных фактараў гэтай тэорыі зьяўляецца адмова ад усялякага ўяўленьня пра асобу (і адпаведна ідэнтычнасьць). Але як жа без ідэнтычнасьці? – задамося пытаньнем А. Казакевіча[13]. Сапраўды, інтэлектуальны рух, названы «камунітарным», шмат у чым вызначаўся крытыкай так званага кантыянскага суб'екту. Крыху спрашчаючы, можна казаць і пра тое, што А. Макінтайр, Ч. Тэйлар, М. Уолцэр, Дж. Рац і Дж. Грэй настойваюць на тым, што суб'ект ня можа абстрагавацца ад сваіх мэтаў,

8 Бурдье П. Социология политики / Пер. с фр. Сост. Н. А. Шматова. – М.: Socio-Logos, 1993. С. 56.

9 Больш падрабязна пра ідэнтычнасьць у артыкуле Р. Мінянкова «Концепт идентичности: перспективы определения».

10 Политические партии Беларуси – необходимая часть гражданского общества: Материалы семинара. Минск: Фонд им. Ф. Эберта, 2003. С. 92.

11 Рорти Р. Случайность, ирония, солидарность / Пер. с англ. И. Хестановой, Р. Хестанова. – Москва: Русское феноменологическое общество, 1996. – 130 с.

12 Rawls J. A Theory of Justice. – Cambridge, MA: Harvard University Press, 1971; гл. таксама: Rawls J. Kantian Constructivism in Moral Theory // Journal of Philosophy. Vol. 77. 1980. № 9. P. 515–572.

13 Казакевіч А. Беларускасьць і канцэпцыі ідэнтычнасьці // ARCHE. 2004. № 4 (33). С. 52.

каштоўнасьцяў і сацыяльных прыхільнасьцяў (апынуцца «ў зыходнай пазыцыі» «пад покрывам няведаньня», у тэрміналёгіі Ролза) для таго, каб абмеркаваць пытаньні сацыяльнай справядлівасьці. Але ці азначае гэта ўсё рэстаўрацыю эсэнцыялісцкай альбо прымардыялісцкай ідэі ідэнтычнасьці? Зусім не. Вяртаньне асобе яе перакананьняў і прыхільнасьцяў, памяшчэньне яе, так бы мовіць, у колазварот рэляцыяў ня мела вынікам рэабілітацыі ідэнтычнасьці ў той вэрсіі, якой, здавалася б, можна было чакаць. Праблематыка ідэнтычнасьці зьмяніла сваю ідэнтычнасьць.

Р. Рорці, які называе сваю пазыцыю «постмадэрнісцкім буржуазным лібэралізмам»[14] (які засвоіў урокі камунітарнай крытыкі), прынцыпова не прымае гіпэр-індывідуалізму, уласьцівага «кантыянскаму» лібэралізму, і разглядае асобу (personhood) як канглямэрат перакананьняў і жаданьняў (некаторыя зь іх канструююцца грамадзтвам, паколькі ўсё, але ізаляваная ад яго) – але, і гэта прынцыповы момант – без якога-любя пакладзенага ў яе аснову ядра («няма ніякага субстрату па той бок атрыбутаў»), за кошт якога можна будзе б абгрунтаваць агульную сыстэму вераваньняў і перакананьняў[15]. Іншымі словамі, не існуе аніякай (калектыўнай) ідэнтычнасьці. Больш за тое, дадзенае структура вераваньняў і перакананьняў не фіксуецца шляхам суаднясеньня з пэўным крытэрам (маральным прынцыпам, гіпэр-азначальным і іншае), але мяняецца даволі выпадкова пад ціскам абставінаў. Наша асоба, кажа Рорці, ёсьць «хутчэй справай рашэньня, чым справай веды, хутчэй уклюпэньня другога ў супольнасьць, чым усьведамленьня адзінай [зь ёй] сутнасьці»[16].

Можна (з пэўнай імавернасьцю памылкі) сьцьвярджаць, што мы ў тым меншай ступені будзем схільныя злоўжываць паняткам «ідэнтычнасьць», у чым большай ступені будзем схіляцца да этычнага натуралізму ў духу Рорці, які можа быць таксама ахарактарызаваны як суб’ектывізм альбо інтэрсуб’ектывізм у супрацьвагу аб’ектывізму, паводле якога этычныя каштоўнасьці могуць быць абгрунтаваны нечым незалежным ад нашых жаданьняў і перакананьняў. Зь іншага боку, схільнасьць да этычнага аб’ектывізму ў духу І. Бэрліна альбо, скажам, Ч.

[14] Пазьней Рорці дыстанцыяваўся ад асобу постмадэрнісцкага лібэралізму, але Rorty R. Essays on Heidegger and Others. Cambridge: Cambridge University Press, 1999. P. 1.

[15] Rorty R. Postmodernist Bourgeois Liberalism // Objectivity, Relativism, and Truth. Cambridge: Cambridge University Press, 1979. P. 199.

[16] Rorty R. Philosophy and the Mirror of Nature. Princeton, NJ: Princeton University Press, 1979. P. 38.

Тэйлара таксама не азначае рэваншу «ідэнтычнасьці» ў традыцыйнай вэрсіі. У гэтай сувязі паказальна, што Рорці падпірае сваю пазыцыю Фройдам і Бэрлінам, якія, на ягоную думку, зьдзейсьнілі рашучую адмову ад разьдзяленьня самасьці на розум і жарсьць, трансцэндэнтальнага кантралёра і эмпірычны жмуток жаданьняў і паказалі гэтую самасьць як свайго кшталту драму, якая разыгрываецца паміж раўнавартымі сіламі[17].

Я мяркую, што варта было б прыгледзецца да прапановы Р. Мінянкова выкарыстоўваць тэрмін «ідэнтыфікацыя», памяшчаючы «ідэнтычнасьць» у працэсуальны вымер *ідэнтыфікацыі (альбо ўяўленьня), прычым без пачатковага меркаваньня, што такая праца непазьбежна будзе мець нейкую унутраную тоеснасьць, адрознасьць, групавое адзінства*[18]. Іронія сытуацыі ў тым, што канцэпт *пэрманэнтнай ідэнтыфікацыі* – у супрацьвагу «пошуку ідэнтычнасьці» – у практычных адносінах аказваецца больш выгадным для групы Ву, чым для групы Ru, паколькі пакідае надзею на больш шырокае выкарыстаньне беларускай мовы. Бо калі прызнаць, што ідэнтычнасьць ёсьць нечым накшталт вечнага вяртаньня таго ж самага, то ні на што, акрамя зыходных суадносінаў сілаў, разьлічваць не выпадае.

Сапраўды, калі канкрэтная мова зьяўляецца восевым кампанэнтам канкрэтнай формы ідэнтычнасьці, то «беларуская» ідэнтычнасьць ня можа стаць ідэнтычнасьцю беларускай большасьці. Магчыма, прадчуваючы небясьпеку такой высновы, Пётра Рудкоўскі зьвяртае ўвагу на тое, што для прадстаўнікоў Ru-супольнасьці ўласьцівае «інструментальнае» стаўленьне да мовы (то бок стаўленьне, якое яшчэ не сягнула чысьцец Drang und Sturm і «моўнага павароту»)[19]. І моўны інструмэнт тэарэтычна можна замяніць іншым, дасканалым, так бы мовіць, інструмэнтам, то праблемы і няма. Пярэчачы П. Рудкоўскаму, я хацеў бы настаяць на тым, што для прадстаўніка ўласьціва стаўленьне да саміх сябе як да інструмэнтаў мовы (то бок інструмэнтаў інструмэнта). Думаецца, што гэты стаўленьне можа быць перааддзелены за кошт адмовы ад цэнтроўных альбо адтвараючых сябе элемэнтаў таго, што называецца

[17] Ворці Р. Случайность, ирония и солидарность. Москва: Русский фенменологическое общество, 1996. С. 75.

[18] Кацюпа Ідэнтычнасьці: тэорыя і практыка канфлікта // Архіў беларускага самабытнасьці. Гісторыка-культурнага таварыства. Вып. 1.

[19] Рудкоўскі П. Нацыянальны дыскурс і дэбаральны кадэкс // ARCHE. 2005. №5. Тут жа зайважу, што я ўважліва азнаёміўся з гэтым артыкулам, які ў цэлым заслугоўвае ўвагі, хаця на фрагменты, датычныя маёй публікацыі, «Невозможность симбиоза» мне запярэчыць амаль нічога. З той прычыны,

ідэнтаўчага праекту.

Зь іншага боку, тэарэтызаванью ідэнтыфікацыі (адтварэньне «праграмы» асобы зь непазьбежным ссоўваньнем акцэнтаў) валодае пэўным крытычным патэнцыялам. Добра вядома, што кіраўнічая групоўка заклапочана «пошукам ідэнтычнасьці» – быць можа, у большай ступені, чым усе іншыя сацыяльныя клясы. Якую ролю адыгрывае ідэнтычнасьць у гэтым выпадку? Гэта інструмэнт легітымізацыі палітычнага рэжыму шляхам указаньня на нейкія «іманэнтныя» ўласьцівасьці беларусаў, якія – акурат дзеля гатых ці іншых палітычных мэтаў – зрабілі «правільны» выбар свайго дзеду і пра што ўвесь час нагадваюць. Гэта ня толькі ідэалягічны інструмэнт, але і інструмэнт кіраваньня, які ўключае ў сябе ня толькі ідэалягічныя, але і эканамічныя, сацыяльныя, культурныя і г.д. кампаненты. Гэта ня толькі ідэалягічны інструмэнт, але і інструмэнт кіраваньня, які ўключае ў сябе ня толькі ідэалягічныя, але і эканамічныя, сацыяльныя, культурныя і г.д. кампаненты.

Зь іншага боку, тэарэтызаванью ідэнтыфікацыі (адтварэньне «праграмы» асобы зь непазьбежным ссоўваньнем акцэнтаў) валодае пэўным крытычным патэнцыялам. Добра вядома, што кіраўнічая групоўка заклапочана «пошукам ідэнтычнасьці» – быць можа, у большай ступені, чым усе іншыя сацыяльныя клясы. Якую ролю адыгрывае ідэнтычнасьць у гэтым выпадку? Гэта інструмэнт легітымізацыі палітычнага рэжыму шляхам указаньня на нейкія «іманэнтныя» ўласьцівасьці беларусаў, якія – акурат дзеля гатых ці іншых палітычных мэтаў – зрабілі «правільны» выбар свайго дзеду і пра што ўвесь час нагадваюць. Гэта ня толькі ідэалягічны інструмэнт, але і інструмэнт кіраваньня, які ўключае ў сябе ня толькі ідэалягічныя, але і эканамічныя, сацыяльныя, культурныя і г.д. кампаненты.

ПРАВА VS ДАБРО

Частковая рызыкоўная задума выкарыстаньня аналёгіі паміж «моўнымі» дэбатамі і лібэральна-камунітарнай дыскусіяй зьвязана найперш з тым, што ўдзельнікі гэтых дэбатаў, калі можна так сказаць, трымаліся рознай манеры паводзінаў. Няправільна было б лічыць, што ўдзельнікі Ву-супольнасьці агітавалі за беларускую мову супраць расейскай мовы, у той час як гульцы каманды Ru паступалі супрацьлеглым чынам – супраць беларускай на карысьць расейскай мовы. Калі б мы сказалі пра тое, што яны праяўлялі сябе як пасьлядоўныя прыхільнікі дзьвюхмоўя – гэта выглядала б больш праўдападобна, але ўсё роўна не зусім адэкватна адлюстроўвала б сытуацыю. У сапраўднасьці яны дзейнічалі як пасьлядоўныя прыхільнікі *права* моўнага выбару, якое, на іх думку, валодае перавагай (анталягічнай, палітычнай, юрыдычнай) адносна той ці іншай опцыі гэтага выбару – дабром, якое разумеецца ў гэтым выпадку як дабро карыстаньня і валоданьня беларускай (расейскай) мовай. Гэта і вымусіла мяне зьвярнуцца да вядомай праблемы суадносінаў права і дабра.

Наколькі мне ўдалося высьветліць, тыя ці іншыя ўдзельнікі якой-любя дыскусіі з нагоды справядлівасьці ў тым большай ступені схільны запазычваць свае стратэгіі ў легалісцкага (альбо працэдурнага) лібэралізму (то бок лібэралізму, які ня мае канкрэтнага ўяўленьня пра дабро, што справядліва для тэорыяў Ролза альбо Дворкіна), у чым большай ступені іх супернікі схільныя кіравацца стратэгіяй дабра (якое зьяўляецца ў той жа час эквівалентам «дабрабыту» групаў, якія гэтым дабром валодаюць). Можна было б уявіць сытуацыю, пры якой ставіцца пытаньне пра тое, каб разглядаць расейскую мову ў якасьці неабходнага і непазьбежнага ўключэньня «сапраўднай дэмакратыі» – і тады, магчыма, удзельнікі Ву-супольнасьці зьвярнуліся да адной з прэзумпцыяў працэдурнага лібэралізму – настойвалі б на *сваім праве выбару* мовы. Гэта я да таго, што расейскамоўныя інтэлектуалы цалкам пасьпяхова могуць атакаваць сваіх супернікаў з камунітарных пазыцыяў (з пазыцыяў прыярытэту дабра над правам), у той час беларускія – наадварот – зь лібэральна-праўных (прыярытэт права над дабром).

Але гэта – тэарэтычна. Пакуль жа справы ідуць так, як яны ідуць. Варта яшчэ раз падкрэсьліць, што агенты, задзейнічаныя ў гэтай спрэчцы, ня цалкам свабодныя: поле, як ужо паказана, навязвае ўсім прысутным у ім аб'ектыўныя суадносіны сілаў. І калі «суадносіны аб'ектыўных сілаў, – падкрэсьлівае Бурд'ё, – імкнуцца адтварыць сябе ў тым бачаньні сацыяльнага сьвету, якое ўвесь час улучана ў гэтыя адносіны, то, значыць, прынцыпы, якія структуруюць гэтае бачаньне сьвету, карэняцца ў аб'ектыўных структурах сацыяльнага сьвету»[20].

Той просты факт, што ўдзельнікі дыскусіі з абодвух бакоў вельмі востра ўспрынялі недарэчную фармулёўку «Сацыялогія дэмакратыя – потым мова і культура», зьяўляецца сьведчаньнем таго, што гэтая фармулёўка – пры ўсёй сваёй недарэчнасьці і фікцыйнасьці – хавае рэальную праблему, рэальную апазыцыю, якая структуруе само поле барацьбы. Гэтую фармулёўку ня варта разумець у тэмпаральным сэнсе – альбо ў сэнсе прычынна-выніковай сувязі: сьпярша мы атрымліваем дабро дэмакратыі, затым – дабро (беларускай) мовы і росквіту культуры. Дэмакратыя – калі гэта, канешне,

[20] Бурдье П. Социология политики / Пер. с фр., общ. ред. и вступ. ст. Н. А. Шматова. – М.: Socio-Logos, 1993. С. 66.

сапраўды дэмакратыя – гэта, у строгім сэнсе, не дабро, і яна мала чаго гарантуе. Яе галоўны прынцып, хутчэй супрацьлеглы, і палягае ў абмежаваньні прэтэнзіяў і магчымасьцяў гэтыя прэтэнзіі ажыцьцявіць. Мы кажам, па сутнасьці, пра ансамбль працэдурных устанаўленьняў, пакліканых абмежаваць магчымасьць угрунтаваньня восевай фармулёўкі дабра – ці то беларуская мова альбо пэўным чынам зразумелая стабільнасьць, а роўным чынам – прэтэнзіі групаў, якія выступаюць галоўнымі «дабраўласьнікамі» («благообладателями») і «дабрачынцамі» (альбо «дабрадаўцамі»). Акурат з гэтай прычыны тыя агенты, якія прэтэндуюць на тое, каб беларуская мова стала дамінантнай (а беларускамоўныя грамадзяне – даміноўнымі сярод даміноўных), выступаюць прыхільнікамі погляду, у адпаведнасьці зь якім дэмакратыя пэўным чынам павінна быць абмежавана (з мэтай захаваньня «традыцыяў» можна было наладзіць схалястычныя спаборніцтвы наконт нашых традыцыяў).

Усё сказанае не азначае, што дэмакратыя не дае наагул аніякіх гарантыяў. Калі яна паводле вызначэньня абмяжоўвае права моцнага (альбо права большасьці: паводле вызначэньня Попэра, дэмакратыя ёсьць правам меншасьці запусьціць рэформу), то ў нашым выпадку яна гарантуе беларускамоўнай і расейскамоўнай супольнасьці пэўны «дэмакратычны мінімум». Яна гарантуе суіснаваньне.

У канцавым выніку, як паказала дыскусія паміж лібэраламі і (лібэральнымі) камунітарыстамі, апазыцыя права і дабра невырашальная (нават калі прызнаць, што дэмакратыя і дэмакратычная культура ёсьць у пэўным сэнсе камплімэнтарнымі паняткамі) – ува ўсялякім разе, на рацыянальным узроўні. На індывідуальным узроўні гэта, у прыватнасьці, і азначае, што розум агента губляе рэфэрэнцыю з інтэрсуб'ектыўнасьцю і пакідае яго аднаго з выбарам паміж той ці іншай пазыцыяй. Але ці азначае непераадольнасьць гэтай апазыцыі яе поўную невырашальнасьць? Я мяркую, што не. Тое, што ўяўляецца невырашальным для розуму, дэлегуецца палітычнай гульнёй, якая прапануе сэрыю кампрамісаў, кожны зь якіх не расцэньваецца як дасканалы, г. зн. які канчаткова і

назаўсёды вызначае сацыяльны лад (расстаноўку сілаў). Кожны з кампрамісаў ад пачатку прапануе магчымасьць перагляду і ўкладаецца такім чынам, каб па магчымасьці выключыць імавернасьць рэваншу.

Нарэшце, у заканчэньне – колькі словаў пра тое, з чаго я пачаў. «Вайна культураў» – калі, ведама, не даводзіць яе да кандыцыі вайны на зьнішчэньне, мае свае выгады. Гэтыя выгады становяцца заўважнымі толькі тады, калі ў існых апазыцыях мы можам угледзець ня толькі апазыцыі, ня столькі анамаліі, колькі нешта, сапраўды адэкватнае ўмовам, на якіх даецца чалавечае жыцьцё. Гэтыя меркаваныя выгады тым больш прыкметныя ў цяперашняй сытуацыі – калі пэўныя часткі беларускамоўнай і расейскамоўнай інтэлігенцыі знаходзяцца ў становішчы маргіналаў, калі існуе пільная неабходнасьць у салідарнасьці з двайной прапіскай.

З расейскай
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/03/12**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image]-[image]2006

[image]

аналітыка • крытыка • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Алена Гапава Міфы пра міфы беларускай сацыялогіі

АЛЕНА ГАПАВА

дацэнт, дырэктарка Цэнтру гендэрных дасьледаваньняў Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту ў выгнаньні (Вільня). Апошняя публікацыя – нарыс «О политической экономии «национального языка» в Беларуси» (Ab imperio, 3/2005). Гэты тэкст часам перагукаецца з ужо надрукаванымі ў мінулым «ARCHE»

Гэты тэкст ёсць вельмі кароткім аналізам надрукаванага ў «ARCHE» артыкула М. Кацука «Міфы беларускай сацыялогіі» («МБС»), дакладней, толькі той яго часткі, што тычыцца гендэрных даследаванняў. Артыкул бачыцца «культурным пасведчаннем» некаторых працэсаў, што адбываюцца ў беларускай інтэлектуальнай прасторы. Яго агульны пафас скіраваны на тое, каб давесці ангажаванасць беларускай сацыялогіі, якой аўтар процістаўляе ідэю «чэснай» навукі, свабоднай ад якой заўгодна апантанасці акрамя пошуку аб’ектыўнай ісціны. Між тым з самога тэксту відаць рожкі інтарэсу: як прыватнага інтарэсу аўтара, так і той групы, да якой ён сябе далучае. Іншымі словамі, тэкст ідэалагічна нагружаны, а ідэалогія выпрацоўвае тое, чаму дазволена лічыцца рэальнасцю. Я мушу растлумачыць, у чым палягае гэты інтарэс альбо дзеля чаго аўтару патрэбна менавіта такая інтэрпрэтацыя рэальнасці. Цікава, што зрабіць гэта дазваляе апошняя, самая маленькая і нязначная частка – незразумела, дзеля чаго яна аўтару ўвогуле спатрэбілася, – дзе размова ідзе пра «міфалогію полу». Таму welcome, як пісаў Славой Жыжак, у пустыню рэальнага.

Калі коратка, змест «гендэрнай крытыкі» «МБС» у наступным: сярод міфаў беларускай сацыялогіі ёсць і той, што за Л. «галасуюць жанчыны»; гэты міф стварылі гендэрныя даследчыкі. У доказ прыводзіцца адна цытата з газеты, але інтэрв'ю Альміры Усманавай, вырваная з кантэксту (аб тым, што яна ўвогуле займаецца іншымі праблемамі і ў гэтым выпадку адказвала на канкрэтнае пытанне), і адна – наступная: «Паводле статыстыкі, жанчыны ставяцца да А. Лукашэнкі, за мужчынаў і складаюць большасць яго выбарцаў. Падчас апытанняў НІСЭПД канца 1990-х, сярод прыхільнікаў прэзідэнта жанчыны складалі 58,3 %, а мужчыны – 41,7 %, паводле звестак агенцыі БелаПАН, падчас выбарчай кампаніі 2001 г. 63 % жанчын былі гатовыя прагаласаваць за А. Лукашэнку. Некалькі адсоткаў агульнай тэндэнцыі не мяняюць: яна відавочная і ў шырокіх публічных колах прынятая за адзін з фактаў беларускага жыцця»[1]. Гэтая цытата з надрукаванага летам 2004 г. у «ARCHE» тэксту «Як галасуюць жанчыны, альбо пра мужчынскае палітычнае неўсвядомленае», які нечакана для мяне выйшаў пад назвай «Што такое «бацька» і яго бацькоўскі клопат». Напэўна, рэдактар лічыў, што так будзе больш сексуальна, і я хачу скарыстаць гэтую магчымасць, каб сказаць, што пасля смерці яго чакае пекла (як і кожнага прадстаўніка яго прафесіі).

Але калі гаварыць «па справе», тэкст «пра бацьку», на які спасылаецца аўтар «МБС», ёсць аналізам таго, чаму патрэбны МІФ (які пачаў ствараццa прэсай з дня яго абрання), што менавіта жанчыны галасуюць за Л. Я лічу, што ў існаванні гэтага міфа зацікаўлены як улады, так і апазіцыя. Улада – таму што «жанчыны, згодна з іх рэпрэзентацыяй у савецкім дыскурсе, ёсць спажыўцамі ільгот, якія «радзіма» можа ім «даць»; і практыкі, праз якія дабрадзействы ўлады ў адносінах да жанчын як мацярок робяцца відавочнымі, ёсць часткай уладнай тэхналогіі... Жаночая масоўка абрана на ролю «ўдзячнага народу» і выкарыстоўваецца для дэманстрацыі палітыкі «ўсё на карысць чалавека», паколькі кожны рэжым мае патрэбу ў сімвалічным апраўданні. А. Л. успадкаваў і ўжывае дзеля гэтага дыскурсіўныя механізмы, распрацаваныя яшчэ савецкай ідэалагічнай сістэмай»[2].

Што тычыцца «другога боку», гаворыцца далей у артыкуле, у недзяржаўных СМІ можна сустрэць дзве фантазіі адносна «жаночай прыхільнасці» да прэзідэнта. Першая выкарыстоўваецца, каб замест аналізу сацыяльнай з'явы – чаму сапраўды значная частка жанчын галасуе за А. Л. – зрабіць выгляд, што жанчыны зачараваны міфам аб «(сексуальнай) моцы» пераможцы (не хачу паўтарацца – кожны можа звярнуцца да артыкула). Другая фантазія ўжываецца для выпрацоўкі пэўных жаночых вобразаў, якія патрэбныя (контрэкультуре пры канструяванні сябе праз канструяванне «іншага». Жанчына робіцца сімвалам нацыі, і тут пачынае працаваць фантазія авалодання жанчынай як краінай альбо нацыяй: «Александр Лукашенко – сторонник силовых методов управления страной. Александр Ярошук считает, что страной нужно овладевать нежно и ласково. Но твердо и настойчиво»[3]. Такім чынам, праз сексуалізацыю жаночага вырашаецца праблема ўласнага мужчынскага самаўяўлення і робіцца магчымай рэпрэзентацыя палітычнай пазіцыі часткі мужчынаў як агульнай «мужчынскай пазіцыі», г. зн. прынцыповай, бо жанчыны – гэта тыя, каго «маюць» (у тым ліку «пераможца»), а мужчыны – тыя, хто «мае».

Такім чынам, гендэрныя даследаванні, на якія спасылаецца аўтар, не ствараюць міфу, што жанчыны галасуюць за Л., дэканструюць яго, але мая мэта зараз не ў тым, каб паказаць, што аўтар чамусьці не кажа праўды. Таму вернемся да тэксту, які я мушу аналізаваць. Вядома, піша аўтар, за А. Л. галасуюць не толькі жанчыны, і існуе статыстычна значэнная сувязь паміж галасаваннем і полам. Але згодна з даследаваннем Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, дзе ў якасці залежнай пераменнай выступаў «давер прэзідэнту» («давяраю», «не вызначыўся», «не давяраю»), а незалежных – пол, узрост, рэгіён (абласныя цэнтры, іншыя гарады, сельская мясцовасць) і асноўная крыніца інфармацыі пра жыццё ў нашай краіне (тэлебачанне, радыё, газеты і часопісы, Інтэрнет, сябры і сваякі, афіцыйнае інфармаванне на працы), пол тут увогуле ні пры чым:

Переменная «пол» оказывается незначэннай, паколькі дзеля натуральных дэмаграфічных працэсаў працягласць жыцця сярод жанчын большая, чым у мужчынаў; і сярод людзей сталага веку жанчыны пераважаюць.

1 Гаўлейчык А. Что такое «бацька» і «бацькаўскі альянс» // ARCHE. 2004. № 4.

2 Тамсама.

3 Народная воля. 2001. 19 лютага.

Рэч у іншым:

Найбольш важным фактарам з’яўляецца наяўнасць адукацыйнага капіталу, які дазваляе, па-першае, крытычна інтэрпрэтаваць інфармацыю, і па-другое, адкрывае доступ да іншых крыніцаў. У сацыяльнай прасторы Беларусі гэтыя крыніцы размеркаваныя нераўнамерна, і чым большы населены пункт, тым болей гэтых крыніцаў. У сельскай мясцовасці дамінуе тэлебачанне з абмежаванай колькасцю праўрадавых каналаў. Адсутнасць у мадэлі пераменнай «месца жыхарства» можна лёгка вытлумачыць, бо пераменная «рэгіён» улучае яе ў сябе і мае болей градацыяў, а значыць і большую адрознівальную здольнасць. З іншага боку, адукацыя звязаная з узростам, паколькі людзі старэйшага пакалення мелі меней магчымасцяў для яе атрымання[4].

Інакш кажучы, узровень адукацыі не дазваляе жанчынам зразумець сапраўдных каштоўнасцяў: гэта з нагоды цемры і непісьменнасці галасуюць яны за таго, за каго галасуюць. І, калі працягнуць гэтыя разважанні да іх лагічнага заканчэння, апазіцыі застаецца толькі чакаць. Пакуль у грамадстве застануцца адно спажыўцы Інтэрнету...

[4] Камук М. Мімо беларускай канцэпцыі // ARCHE. 2005. № 5.

Я пастаралася выкласці сутнасць аргументацыі коратка (і сапраўды не хацела нічога сказіць, хаця б таму, што аўтар «МБС» будзе чытаць мяне ўважліва). Але што пра такі аналіз сказала б сацыяльная тэорыя, калі б магла размаўляць? Яна, як Каштанка (калі б, як піша Чэхаў, Каштанка была чалавекам), сказала б: «Далей так жыць нельга. Трэба ўдавіцца». І вось чаму.

Стратыфікацыйная катэгорыя, якую канструюе аўтар у «гендэрнай» частцы артыкула, не завецца «пол». Яна завецца «ўзрост» (age). Вядома, узрост не бывае без полу (як і пол без узросту), бо кожная стратыфікацыйная катэгорыя існуе ў перасячэнні з іншымі, але за аснову бярэцца нейкая адна лінія. Пол як сацыяльная катэгорыя вызначаецца роляй мужчынаў і жанчын у рэпрадукцыі: ад гэтага залежаць тыя жыццёвыя магчымасці альбо іх адсутнасць («структура рэсурсаў»), якія з

гэтага вынікаюць для кожнага полу. Ніжэй я растлумачу падрабязней, чаму гэта важна, але кароткі прыклад: ніхто не будзе адмаўляць бабулі ў працы на той падставе, што яна возьме дэкрэтны адпачынак – як тое адбываецца з жанчынамі, і ў гэтым сэнсе бабуля не вельмі адрозніваецца ад дзядулі, але абое знаходзяцца ў тым узросце, калі большасць ужо не працуе ўвогуле.

Таму для выяўлення электаральных паводзін мужчынаў і жанчын трэба браць групу, што знаходзіцца ў рэпрадукцыйным узросце (звычайна гэта ад 18 да 55 гадоў). А ў гэтай катэгорыі адукаванасць жанчын вышэйшая, а не ніжэйшая, чым у мужчынаў. Згодна з дадзенымі Міністэрства статыстыкі Беларусі, жанчыны складаюць 58,4 % сярод людзей з вышэйшай адукацыяй і 65,8 % – з сярэдняй спецыяльнай. З чаго вынікае, што не з нагоды адсутнасці «адукацыйнага капіталу, які дазваляе, па-першае, крытычна інтэрпрэтаваць інфармацыю», больш жанчын, чым мужчынаў, галасуе за А. Л. Такім чынам, дадзенае ў «МБС» тлумачэнне папросту не працуе; але яно не працавала б, нават калі б лічбы адукаванасці былі іншыя, таму што аўтар шукае тлумачэнне сацыяльных паводзін па-за сацыяльнай сітуацыяй: не ў рэчаіснасці, а ў «галаве» сацыяльных агентаў, у іх «свядомасці».

Калі ж паглядзець на факты, бачым наступнае:

Незалежны інстытут сацыяльна-палітычных і эканамічных даследаванняў рэгулярна ладзіць апытанне, каб даведацца пра матэрыяльнае становішча, эканамічныя, палітычныя і грамадзянскія погляды тых, хто галасуе за і супраць прэзідэнта. Удзельнікаў спачатку пытаюць: ці галасавалі б вы за Лукашэнку заўтра? Потым дзве групы (тыя, хто адказалі «так» ці «не») адказваюць на больш канкрэтныя пытанні (Ці хапае ім грошай на ежу? На адзежу і абутак? Працуюць яны ў прыватным сектары ці дзяржаўным? і г. д.). Такім чынам атрымліваецца партрэт апанентаў і прыхільнікаў прэзідэнта. Даследаванне выявіла, што пенсіянеры падтрымліваюць А. Л. больш, чым моладзь, жыхары вёскі больш, чым гараджане, жанчыны больш, чым мужчыны, тыя, хто пражывае на ўсходзе краіны, больш, чым заходнікі. Працаўнікі дзяржпрадпрыемстваў больш, чым

удзельнікі рынку. Бедныя больш, чым заможныя (і розніца складае не два ці тры, а 30, а мо і 40 адсоткаў)[5].

Ідэя, якая вынікае з гэтых лічбаў, палягае ў тым, што за што галасуе не пол, не ўзрост, не месца жыхарства: за яшчэ што галасуе КЛАС, г. зн. усе тыя, каму «не выгадны» рынак (між[5] Гл. Аванта Л. абяцае захаваць сацыялістычную сістэму размеркавання рэсурсаў), таму што іх «структура рэсурсаў» (узрост, навыкі, сувязі, наяўнасць стартавага капіталу альбо магчымасць «прыўлашчвання» праз прыватызацыю дзяржмаёмасці, наяўнасць маленькіх дзетак альбо хворых бацькоў, пражыванне ў сельскай мясцовасці – дзе аб'ектыўна менш магчымасцяў стварацца бізнес і г. д.) дае ім мала шанцаў на поспех ва ўмовах рынку. Рынкавая канкурэнцыя (і ліберальная дэмакратыя) пабудаваны на ўяўленні пра свабодных, незалежных, аўтаномных агентаў, і лібералізм доўга лічыў такія якасці «універсальнымі». Але яны паўстаюць з пэўнага досведу і магчымасцяў, і, калі гаварыць пра пол, у жыцці жанчыны амаль ніколі не з'яўляюцца такімі ж аўтаномнымі, як у жыцці мужчыны; яны не свабодныя для канкурэнцыі і рызыкі ў такой жа ступені. Грамадства патрабуе рэпрадукцыі – яно не можа існаваць без фізічнага і культурнага ўзнаўлення, а каб забяспечыць яго, павінна выпрацаваць такую структуру (сканструяваць такім чынам свае інстытуты), каб пэўныя сацыяльныя групы *не маглі адмовіцца* ад рэпрадукцыйнай працы: яны «засунуты» ў яе структурнай арганізацыяй штодзённасці, да якой далучаецца і ідэалагічная сістэма. Яе функцыя палягае ва ўслаўленні гэтай працы, каб прыкрыць такім чынам сапраўдную сутнасць таго, што адбываецца, бо праца гэтая не аплачваецца (не хачу цяпер разглядаць усяго комплексу праблем, якія паўсталі б з ідэі аплаты рэпрадукцыйнай працы – гэта складана і тут не да месца), і, такім чынам, суб'ект, што заняты ёю, заўсёды ад некага залежыць. Ад мужчыны, ад пашыранай сям'і, часам ад дзяржавы (праз сістэму сацыяльнага забеспячэння), але ў любым разе такі актар не ёсць такім жа аўтаномным і незалежным пры ўдзеле ў рынку як спаборніцкай сістэме, як той, ад каго ён залежыць. Таму ён (ці, у дадзеным разе, яна) не будзе зацікаўлены ў сістэме (ліберальным рынкавым спаборніцтве), якая робіць яго маргінальным і непаспяховым. І

таму будзе меней за яе галасаваць – згодна са сваімі інтарэсамі, якія ёсць ва ўсіх нас.

Прыведзенае тлумачэнне жаночых электаральных паводзін знаходзіцца ў адносінах «антаганістычнай супярэчнасці» з тым, што ўжывае аўтар «МБС». Яны не могуць існаваць адначасова: можа быць альбо адно, альбо другое. Першае зыходзіць з таго, што людзі – мужчыны і жанчыны, старыя і маладыя, бізнесоўцы і настаўніцы – маюць інтарэсы, згодна з якімі сябе паводзяць. Іх паводзіны рацыянальныя: у тым сэнсе, што яны прадыктаваны інтарэсам, а не ў тым, што яны сядзяць і думаюць над кожным крокам. Мы рэдка думаем пра свае інтарэсы спецыяльна: мы ведаем іх нейкім «іншым чынам». Альбо лічым, што ведаем. Ва ўсялякім разе, электаральныя паводзіны ў значнай ступені з'яўляюцца адлюстраваннем нашых інтарэсаў, што паўстаюць з сацыяльных абставін нашага жыцця. З гэтага зыходзіць існаванне палітычных партый, а сэнс палітычнай барацьбы ўвогуле палягае ў тым, каб прадстаўляць інтарэсы розных групаў.

Тлумачэнне жаночых электаральных паводзін у «МБС» зыходзіць з іншых меркаванняў: адно з «інтэлектуальнага багажу» выбарцаў («Найбольш важным фактарам з'яўляецца наяўнасць адукацыйнага капіталу, які дазваляе, па-першае, крытычна інтэрпрэтаваць інфармацыю, і па-другое, адкрывае доступ да іншых крыніцаў. У сацыяльнай прасторы Беларусі гэтыя крыніцы размеркаваныя нераўнамерна, і чым большы населены пункт, тым болей гэтых крыніцаў. У сельскай мясцовасці дамінуе тэлебачанне з абмежаванай колькасцю праўрадавых каналаў...»). Мне хочацца спадзявацца, што там, дзе цяпер знаходзіцца французскі сацыёлаг П'ер Бурд'ё, які распрацаваў канцэпцыю сацыяльнага капіталу, гэты тэкст не прачытаюць, бо ён ёсць здзекам з памяці нябожчыка. Капіталам у сацыяльнай тэорыі лічыцца тое, што можна абмяняць (на статус альбо ўладу) альбо прадаць, бо яно мае кошт. Адукацыя з'яўляецца капіталам тады, калі за яе працоўны можа атрымаць большы заробак, г. зн. «прадаць» сваю адукацыю. Лічыцца, што больш адукаваны чалавек мае пэўныя веды ці навыкі, якіх няма ў неадукаванага і якія маюць пэўную каштоўнасць; такім чынам, ён каштуе больш на працоўным рынку (у гэтым

сутнасць тэорыі чалавечага капіталу), але каб там апынуцца, трэба выйсці за межы сям'і (бо ў яе межах нічога не прадаецца ўвогуле: там няма рынку). Тая ж (пачатковая) адукацыя, якую маюць бабулі, капіталам не можа лічыцца ў прынцыпе: па-першае, на яе аснове нельга стварыць нейкіх каштоўных у сучасным свеце навыкаў. Але больш важна нават не гэта: старыя людзі ўжо нічога не прадаюць на працоўным рынку, бо з прычыны сталага веку яны там проста не прысутнічаюць. Іх адукацыя не з'яўляецца капіталам, і аўтар «МБС», гаворачы пра капітал, не згадвае ніякага абмену: яго ідэя палягае ў тым, што тыя, хто не мае дастатковай (вышэйшай? сярэдняй спецыяльнай?) адукацыі, не могуць адрозніць «кепскага ад добрага» ці крытычна інтэрпрэтаваць інфармацыю.

З гэтым тлумачэннем ёсць (як мінімум) дзве праблемы.

Праблема першая: тыя, хто маюць доступ да Інтэрнета, валодаюць не толькі лепшымі крыніцамі інфармацыі. Яны валодаюць гэтымі крыніцамі інфармацыі, таму што маюць іншую структуру рэсурсаў (у іх іншыя даходы, прафесія, узрост, навыкі ў сферы новых тэхналогій, яны жывуць там, дзе значна вышэйшая магчымасць зарабіць грошы і г. д.). Яны знаходзяцца ў іншай сацыяльнай сітуацыі яшчэ да таго, як пачынаюць атрымліваць інфармацыю. А гэта ўжо зусім іншая рэч (тут былі б да месца пытанні, якія параметры трэба ўключаць у статыстычнае даследаванне і як адбылося, што ўсё гэта засталося па-за рамкамі даследавання Інстытута сацыялогіі). Гэтыя сацыяльныя актары галасуюць за рынак не таму (ці не толькі таму), што больш ведаюць, але таму, што лепей жывуць і маюць на рынку лепшыя шанцы. Ёсць прычына – па-за рамкамі свядомасці, – чаму яны больш зацікаўлены ў рынку.

Праблема другая, самая галоўная праблема тэксту, дзеля якой адной варта было рабіць увесь гэты аналіз. Выходзіць, што ёсць нейкія «вышэйшыя веды», веды пра нешта беспамылковае і аб'ектыўна лепшае (бо ў іншым разе няўменне іх распазнаць не было б заганай), якія даступныя толькі «асвечаным». Рэч не толькі ў тым, што такой бясспрэчнай і беспамылковай ісціны не бывае ўвогуле, але і ў тым, што ўяўленне пра яе існаванне выгадна інтэлектуалам, бо такім чынам самымі разумнымі,

добрымі і каштоўнымі членамі супольнасці ёсць менавіта яны. Па сутнасці, аўтар хоча даказаць, што ведаюць ТОЛЬКІ ЯНЫ і што толькі яны ВЕДАЮЦЬ. Ведаюць, як жыць, якім чынам арганізаваць жыццё, ведаюць, што для каго лепей – нават калі тыя, пра каго ідзе гаворка, чамусьці лічаць інакш і зусім не хочуць, каб іх вялі «жалезнай рукой» да кімсьці ўяўленага шчасця.

Але – лагічна – тых, хто «не ведае» альбо «няправільна ведае», не трэба браць у разлік. Паноўнае сярод часткі інтэлектуальнай эліты ўяўленне, што паводзіны замбаванага электарату або «сацыяльнай правінцыі»[7] нерацыянальныя, што ён апазіцыя («электарат») ёсць люмпенам[8], плебсам і прымітывам, «крэйзанутымі бабулькамі»[10], што ён увогуле пасіўны і здольны да актыўных дзеянняў[11], звязаны з легітымацыяй права інтэлектуалаў на валоданне універсальнымі ведамі, а значыць на іх асаблівую ролю, г. зн. на немарэдукцыю канвертацыю культурнага капіталу ва уладу. «*Мы ўпэўнены, што апазіцыя павінна ісці ў народ, мяняць ці сваю палітычную платформу, робячы яе больш зразумелай?.. Нельга таксама забываць, што палітык павінен казаць тое, што хочуць пачуць да яго выбаршчыкі, а рабіць тое, што накіроўвае да яго нацыянальная інтэлігенцыя*»[9]. А у чым палягаюць гэтыя інтарэсы – «палітык» ведае і без выбаршчыкаў: яны – толькі дэмакратычная шырма ў гэтай гульні на карысць свайго інтарэсу. Ведае – а таму мае права. Як казаў герой Дастаеўскага, «не тварь дрожащая, а право имею». Незразумела толькі, чаму эліта, якая мае такое меркаванне аб народзе і сваёй пагарды да яго нават не хавае, чакала, што ён будзе за яе галасаваць; шчыра здзіўлялася, калі ён гэтага не рабіў і вельмі хацела ведаць, чаму. Нават апытанні праводзіла...

Невыпадкова, што ўсё гэта адбываецца ў рамках кардынальнай змены ідэі аб сацыяльнай справядлівасці: раней справядлівым лічылася становішча раўнапраўнага размеркавання (хай патрошкі, але ўсім). Цяпер – наадварот: справядліва, калі нераўнапраўна (адным больш, а іншым амаль нічога), бо гэта бачыцца пажаданым вынікам свабоднай канкурэнцыі (а тады адказнасці ніхто не нясе і не трэба нічога рабіць).

6 Лекцыя
7 Тэрмін «сацыяльная правінцыя» належыць В. Акуловічу; я буду разглядаць яго апублікаваную пазіцыю адносна «сацыяльнай правінцыі» далей у гэтым тэксце, а тут толькі яго нагадваю.
8 Фелікс А. Лукашенко: Политическая биография. Москва: Референдум, 2005. с. 124, 311.
9 Два сьветы, два сьветы // Наша Ніва. 2005. 8 ліпеня.
10 «Тэрмін» належыць Дз. Ушкіну і з'явіўся ў «Нашай Ніве».
11 Валізм Казначэй. Апазіцыя абмяркоўвае планы дзеянняў. 22 снежня 1997.
12 Халіка Ю.: У пастыках сялянь не пачуў // Наша Ніва. 2000. 26 чэрвеня.

Такім чынам будуецца тая «інтымная сувязь» паміж ведамі і ўладай, пра якую пісаў Мішэль Фуко. Веды – адзінае, што можа быць капіталам інтэлектуалаў ва ўмовах рынку (бо *не* яны робяцца ўладальнікамі эканамічнага капіталу пры перадзеле маёмасці; у адрозненне ад партнаменклатуры ці сілавых структур, яны не могуць канвертаваць свой сацыяльны капітал у эканамічны[13]), але каб абмяняць веды на рэсурсы, яны павінны пераканаць усіх, што толькі яны ведаюць. Іншымі словамі, пабудаваць «манаполію на веды» (пры сацыялізме яе быць не магло, таму што тады «ведала» партыя). У гэтым і палягае інтарэс інтэлектуалаў як сацыяльных актараў. Пра інтарэсы, што стаяць за вытворчасцю ведаў, і «прагаварыўся» «чэсны» сацыёлаг, калі мусіў стварыць аб'ектыўны і неангажаваны сацыялагічны прадукт.

Дэкларуючы «свабоду ад ангажаванасці», тэкст «МБС» кам'е, абгрунтаваннем «інтэлектуальнай прывілеі». У гэтым сэнсе і ўзорны тэкст, створаны ў сітуацыі, калі (у значнай ступені не ўключаныя ў дзяржаўную акадэмію) інтэлектуалы як групы пачынаюць турбавацца адносна свайго статусу[14], бо ўсведамляюць свой агульны (групавы альбо карпаратыўны) інтарэс. Тэкст таксама адлюстроўвае той факт, што розныя групы (беларускіх) сацыёлагаў уступаюць у перамовы (альбо барацьбу) адносна таго, хто будзе прызнаны «сапраўдным» сацыёлагам, г. зн. чые веды будуць лічыцца легітымнымі. А легітымнасць гэтая ўзнікае, як гэта ні прыкра, праз апеляцыю да нейкай вонкавай сілы: альбо да беларускага ВАКС (які «дае» навуковыя ступені) і акадэміі (г. зн. да легітымацыі тых ведаў калегамі), альбо да замежнага (заходняга) грантадаўца, замоўцы сацыялагічнай прадукцыі альбо выдаўца. Бо вытворчасць ведаў увогуле звязана з рэсурсамі (гэтая сувязь складаная і вельмі не хацелася б, каб гэта было зразумела прымітыўна[15]) і ўключана ў сацыяльныя зносіны, часткай якіх з'яўляецца акадэмія як інстытут вытворчасці і легітымацыі ведаў. Дарэчы, сама сацыялогія як навуковая галіна ўзнікла з пэўнага інтарэсу, менавіта з мадэрнізацыйнай патрэбы ў эфектыўным кіраванні: ведаць, каб кіраваць.
А што тычыцца гендэру – гэта не міф беларускай сацыялогіі. Гэта рэальная катэгорыя сацыяльнага аналізу сацыялогіі сусветнай. Праз якую шмат што можна ўбачыць.

[13] King I. Science I. Theories of the New Class. Intellectuals and Power. Chapter 5: The Full of the Class. Project of the Social Reform Intelligentsia. University of Minnesota Press, 2004. P. 99-123.

[14] Цікавыя і паказальныя дыскусіі

P. S.:

Гэтыя разважанні для мяне ўскосна звязаны з вельмі практычнымі рэчамі: ці мае апазіцыя шанец на выбарах 2006 г., бо сутнасць беларускага (інтэлектуальнага) процістаяння тычыцца палітычнай улады. Хоць наш знакаміты інтэлектуал мне сказаў: «Я паэт і філосаф. Мяне не цікавіць, якая будзе ўлада», – я яму не паверыла (дарэчы, у яго не было мэты мяне падманваць: ён ілжэ сам сабе). Гуляць ва «ўсё роўна» можна толькі да таго моманту, пакуль цябе не зачапіла, і твая праца нейкім чынам магчымая. А як зачынілі ЕГУ, большасць з тых маіх калегаў, якія на нашым другім паверсе на Броўкі, 3 займаліся рэчамі вельмі ад беларускай рэчаіснасці далёкімі (і да мовы з культурай «не ставіліся» ўвогуле), уваднача змянілі арыентацыю і цяпер пішуць пра сучасную беларускую сітуацыю, аналізуюць і асэнсоўваюць яе і лічаць гэтую тэматыку самай «постмадэрнісцкай».

Тэма выбараў-2006 вялікая, але паспрабую коратка. Той «мерідж», што апазіцыя мусіла данесці раней – што рэжым амаральны, што душыцца свабода слова, прэсы, прадпрымальніцтва і г. д. – адлюстроўваў яе «прыватны інтарэс»: гэта было праўдай, але для большасці «не пра тое». Як пісаў Валянцін Акудовіч, «не бачна з тых свабод ніякай карысці чалавеку, які жыве з мазаля»[16], бо «сацыяльная правінцыя» мае іншы лад жыцця і іншыя каштоўнасці. І прыводзіў прыклад сваіх вясковых бацькоў, якія за ўсё дарослае жыццё ўзялі ў рукі тыніжку, толькі калі гэта была кніжка іх сына, і таму свабода слова іх не цікавіць; але калі б у іх адабраць магчымасць саджаць бульбу і біць на каляды парсюка – вось гэта было б абмежаваннем свабоды. Ну і – чакала я далей, чытаючы (эсэ бліскучае, у ім апісана, хоць і не такімі словамі, паўстанне інтэлектуалаў як групы са сваім асобным інтарэсам) – вось цяпер ён напіша, што пакуль «мы» не зробім нешта такое, каб ад нашых «каштоўнасцяў» была карысць не толькі нам, каб гэта мела нейкі сэнс для тых, хто жыве з мазаля – не будзе мець наш «праект» ані маральнага права, ані рэальнай перспектывы... Не напісаў. Скончыў тым, што шкада, што «мала нас», каб адсунуць «правінцыю» на «належнае ёй месца»[17] (!), што «ў нас» з ёй розныя меры адказнасці, і што няхай бы мы

адносна таго, хто можа лічыцца інтэлектуалам, а хто не, каго дапусціць у супольнасць, а каго аб'явіць «некампетэнтным», можна бачыць на «Сайте интеллектуального сообщества Беларуси».

[15] Што тычыцца рэсурсаў: афіцыйная беларуская акадэмія, напрыклад, фармуе пакаленні даследчыкаў, якія – калі ім не удаецца вырвацца за яе краты – не маюць доступу да сусветных інтэлектуальных рэсурсаў, да тэкстаў, бібліятэк, навуковых дыскусій і г. д. і якія канкурэнтаздольныя толькі ў рамках той акадэміі, якая іх стварыла (чаму акадэмія і бароніць сябе што есць моцы ад «іншых ведаў»). Глядзі пра гэта: Усманова А. Философия и позиция критического интеллектуала сегодня // Топос. 2005. № 10. с. 40–62.

займаліся сваім, а яна сваім...

Але гэта магчыма толькі тады, калі тыя, што корпаюцца ў бульбай, падтрымаюць нашыя намаганні і далей бабваць нацыяльнальную свядомасць, чаму «ў народа» яе нямала ж, як ужо было сказана, чамусьці гэтага рабіць не хочуць.

І вось нядаўна Аляксандр Мілінкевіч сказаў, між іншым (гэта было, здаецца, у «Народнай волі»), што «тое добрае, што было пры Лукашэнку, мы захаваем, напрыклад, выплату пенсій і г. д.». Хутчэй за ўсё, улада не дазволіць, каб яго пачулі. Але нарэшце з'явілася маленькая надзея: ёсць палітык, які мусіць выйсці за рамкі «прыватнага інтарэсу». Няўжо сапраўды пачне гаварыць пра тое, што абмяркоўваюць палітыкі ва ўсім свеце? Пра тое, як суадносяцца праца і капітал, як канкрэтна захаваць сістэму сацыяльных гарантый пры рынку, калі бізнесоўцы супраць павелічэння падаткаў, ці сапраўды малыя падаткі стымулююць развіццё...[17] Пакуль што чынам павялічваюць колькасць працоўных месцаў, як забяспечыць рэальныя правы на вышэйшую адукацыю вясковай моладзі, якая аб'ектыўна не можа канкураваць з дзеткамі гарадской інтэлігенцыі на ўступных іспытах. Пра ўсё тое, што завецца сацыяльнай справядлівасцю і што адзінае маральна апраўдвае валоданне ўладай.

Апошнім часам, здаецца, з'явіўся яшчэ адзін палітык, да якога пачала даходзіць тая простая рэч, што людзі галасуюць, зыходзячы з інтарэсаў. Гэты палітык – кіраўнік «Маладога фронту» Павел Севярынец. Як вядома, ён быў асуджаны за... вось за што – мне зразумець так і не ўдалося... і прысуджаны да двухгадовага абмежавання волі ў вёсцы Малое Сітна, што на Віцебшчыне. Прымушаны займацца там фізічнай працай, ён кожны дзень размаўляе з вяскоўцамі. Пра розныя рэчы, у тым ліку і пра палітыку, а сайт «Маладога фронту» амаль штодзённа друкуе яго «справаздачы» з тых гаворак. І высветлілася, што народ не вельмі цікавіцца сцягам і гербам, а хоча ведаць адказы на наступныя пытанні, напрыклад:

«...3. У нас жа няма рэсурсаў, мы нішчыя: адкуль што возьмеце? Нафту, газ, метал?..

16 Акудовіч В. Вавацэя і яма. Свабода як форма вызвалення волі да улады // Акудовіч В. Разбурыць Парыж. Менск: Логвінаў, 2004. с. 108.

17 Акудовіч В. Вавацэя... с. 110.

4. Гэта што, зноў БНФ? Ды калі вы ўжо супакоіцеся? Дзе ваш Пазняк? І Шушкевіч таксама ж ваш… Не, за бээнэфаўцаў мы не пойдзем.

5. Ну чаго, чаго вы бунтуеце народ? Заводы працуюць, пенсіі плацяць, жывём сабе, хай і небагата, але ціха. Нашто падбухторваеце? Уся кроў, уся вайна праз гэта!..

6. А што вы нам дасцё? Ну, дапусцім, мы за вас прагаласуем – дык што нам будзе? Грошай заплаціце або цыстэрну спірту прывезяце?..

7. Пра вас нідзе ж не прачытаеш, не пачуеш, вы ўвогуле нічога не можаце – як жа вы пераможаце?..

8. Канкрэтна, якая ў вас праграма? Вось па пунктах: што прапануеце? Пра сцяг і мову ведаем. Добра, што далей?

9. Што, хочаце як ва Украіне? Аранжавая рэвалюцыя, натоўп на плошчы, а потым развал? Перасварыцеся, глоткі адзін аднаму рваць будзеце, эканоміку ўгробіце. І зноў крызіс?

10. Што, хочаце як у Польшчы? Каб беспрацоўе было, як там… Ці як у Прыбалтыцы, што пенсіянеры жабруюць? Ці як у Расіі, што мафія, алігархі і простаму чалавеку жыцця няма?..

Калі адкажам на ўсе вясковыя пытаньні так, каб і глыбінка пачула, – у 2006-м абавязкова пераможам»[18], – піша Севярынец.

Добра, што нарэшце дайшло. Прыкра, што такім ненамерным коштам (зняволеннем невінаватага чалавека). І дзіўна, як можна было не бачыць: усе апошнія дзесяць з лішкам гадоў Аляксандр Рыгоравіч менавіта на гэтыя пытанні і адказвае.

[18] Севярынец П. Малое Сіяво. 9 снежня 2005.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/12
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image]-[image]2006

аналітыка • крытыка • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Фрагмэнты абмеркаваньня аналізу Андрэя Казакевіча «Арыенталізм, або некалькі заўваг пра «казус Беларусь» на сайце www.belintellectuals.com

---

13.12.2005 17:42

Рыгор Мінянкоў

Факт агульнавядомы: калі мы чытаем той ці іншы тэкст, то мы ня столькі «вычытваем» нешта, колькі «ўчытваем» у тэкст сябе. Да канца пазбавіцца ад гэтага, хутчэй за ўсё, нельга, нават пры самым самакрытычным падыходзе, хоць і існуюць розныя стратэгіі ўласнай дэканструкцыі. Самая простая зь іх: прэзумпцыя чысьціні намераў крытыкаванага аўтара. Інакш кажучы, ня варта выкрываць «злыя намеры» аўтара і схаваны за пазухай камень, калі ўсё-ткі гэты камень пакуль ня кінуты.

На гэты ўступ мяне навёў тэкст Андрэя Казакевіча, на мой погляд, аднаго з самых падрыхтаваных і пэрспэктыўных сацыяльных дасьледнікаў цяперашняй Беларусі, працы якога я заўсёды чытаю зь вялікай цікавасьцю. Нагадаю, напрыклад, яго

абсалютна бліскучы тэкст «Пра калёнію». Але вось тэкст у форме рэцэнзіі на некалькі артыкулаў «Топоса» падаўся мне не зусім прапрацаваным і не адпаведным магчымасьцям ягонага аўтара. Найперш зьдзівілі маральныя ацэнкі, якія Казакевіч даў рэцэнзаваным аўтарам «Топоса»: інтэлектуалы ставяцца да Беларусі несур'ёзна, грэбліва й г. д. Думаю, гэта выключна канструкцыя рэцэнзэнта. Калісьці Пётар Струвэ казаў пра дзіўную здольнасьць бальшавікоў вычытваць у галовах апанэнтаў тое, што яны «думаюць насамрэч», і змагацца акурат з гэтым, а не з рэальнымі выказваньнямі (у «марксістаў-ленінцаў» гэта, здаецца, называлася «клясавым падыходам»). Я, канечне, не залучаю Казакевіча да «бальшавікоў», але структура падобнага мысьленьня вельмі жывучая. Калі б стаўленьне аўтараў «Топоса» да Беларусі было акурат такім, якое ім прыпісвае Казакевіч, то гэты нумар проста не зьявіўся б. Акурат боль за сваю краіну, спроба разабрацца, што зь ёй адбываецца і як выходзіць з гэтай сытуацыі і сталі асноўнай крыніцай (закрыцьцё ЭГУ было шмат у чым толькі нагодай і рэпрэзэнтатыўным case study) роздумаў усіх аўтараў (у тым ліку і маіх) гэтага нумару «Топоса». Усе гэтыя людзі, так бы мовіць, сур'ёзныя, і займацца несур'ёзнымі рэчамі ім папросту няма калі. Калі і дакараць іх, то хутчэй за тое, што яны не зьвярнуліся да праблематыкі Беларусі нашмат раней.

Канечне, значна большую цікавасьць маюць тэарэтычныя ацэнкі Казакевіча. На жаль, ён выразна не сфармуляваў сваёй пазыцыі. Яе даводзіцца рэканструяваць. Спадзяюся, што я гэта зраблю правільна. Наколькі я магу зразумець, гэтая пазыцыя ў гэтым тэксьце зводзіцца да двух момантаў: 1) аўтары «Топоса» пры расьсьледаваньні «казусу Беларусь» лічаць беларускае грамадзтва архаічным, вясковым і г. д., хоць насамрэч гэта мадэрнае грамадзтва; 2) аўтары «Топоса» ў духу клясычнага арыенталізму проста прыкладаюць без усялякага трансфэрту канструкцыі заходняй сацыяльнай тэорыі да беларускай рэчаіснасьці і падпарадкоўваюць апошнюю абстракцыям. У выніку выходзіць ці то каляж, ці то комікс, але зусім не сапраўдны малюнак. Цікава, праўда: а калі прыкладаць да Беларусі посткаляніяльную тэорыю, то мы цалкам гарантаваныя ад коміксаў?

Ня буду адмаўляць, што некаторыя падставы для такой крытыкі ёсьць. Прыкладам, той жа Т. Шчытцовай не зусім удалося пазьбегнуць эсэнцыялізму ў развагах аб «усходнеэўрапейскай культуры». Апошняя (разам з знакамітымі «славянамі») для мяне такая ж таямніца, як і для Казакевіча. Але пры гэтым тэкст Шчытцовай падштурхоўвае да сур'ёзнага культурна-антрапалягічнага аналізу сучаснай Беларусі. Магчыма, я памыляюся, але мне невядомыя такога ўзроўню тэксты з сучаснай культурнай антрапалёгіі Беларусі, нават калі Шчытцова і цалкам памыляецца. Альбо возьмем тэкст А. Горных. Я так і не зразумеў, чаму Казакевіч так рэзка паставіўся да высновы аб «сялянскім» характары беларускага грамадзтва. Так, мадэрнае грамадзтва – гэта гарадзкое грамадзтва, але ступень урбанізацыі, што цудоўна вядома Казакевічу як спэцыялісту, вызначаецца зусім ня колькасьцю гарадзкіх жыхароў. І, па-мойму, цудоўная мэтафара Горных пра «жакерыю XXI стагодзьдзя супраць сусьветнага Гораду» адкрывае вельмі далёкасяжны шлях у аналізе беларускай сытуацыі.

Я згодны з Казакевічам, што канструкты сучаснай сацыяльнай тэорыі нельга, як схемы, проста прыкладаць да беларускіх рэаліяў. Тут патрэбны пераклад. Пытаньне – у ягонай граматыцы. Дарэчы, і сам крытык працуе з гэтымі ж канструктамі, але чамусьці адмаўляе ў гэтым праве іншым. На жаль, іншага шляху аналізу няма. Здаецца, Казакевіча можна зразумець так, што мы мусім стварыць «сваю тэорыю» знутры ўласнага досьведу. Верагодна, так, але мне, на жаль, падобны досьвед невядомы. Больш за тое, мне здаецца, што мы ўжо з гэтым прыпазьніліся. І тыя, хто сапраўды грунтоўна «тэарэтызуе» Беларусь (напрыклад, І. Бабкоў, В. Акудовіч, У. Абушэнка, сам Казакевіч), працуюць з заходняй сацыяльнай тэорыяй. Спрэчка можа весьціся найперш пра тое, як зь ёй працаваць. Вось і давайце спрачацца пра гэта і не прыпісваць адно аднаму «злых намераў». Пры гэтым важна дакладна вылучаць узроўні аналізу: філязофскі, сацыяльна-тэарэтычны, культуралягічны, палітычны і г. д. Мне здаецца, што ў рэцэнзіі Казакевіча гэтыя ўзроўні крыху зблытаныя, што і вядзе да неперакананаўчасьці шэрагу момантаў ягонай цікавай крытыкі.

Я таксама згодны, што беларускае грамадзтва – гэта мадэрнае (і нават постмадэрнае, паводле З. Баўмана), па сутнасьці, грамадзтва, якое ствараецца мадэрнымі тэхналёгіямі. Але вось тут мы і маем вельмі цікавы фэномэн, што патрабуе сур'ёзнага аналізу. Гэта такое мадэрнае грамадзтва, якое заключана ў архаічныя формы і абапіраецца на архаічныя, дамадэрныя каштоўнасьці. Такім быў камунізм і падобныя да яго грамадзтвы. Мне здаецца, што аўтары «Топоса» часьцяком інтуітыўна і прыходзяць да гэтай высновы. Але падобны сымбіёз архаікі (ужываю гэты тэрмін у сацыялягічным сэнсе) і мадэрну нежыцьцяздольны ў далёкасяжнай пэрспэктыве. Гэта – грамадзтва самаразбурэньня, таму што ў ім адсутнічаюць асноўныя нясучыя канструкцыі мадэрну: вольны грамадзянін (не падданы, які чакае, калі яго «накормяць»), публічная сфэра, канкурэнцыя сацыяльных інстытутаў. Вось над гэтым і варта разважаць: што рабіць, калі такое грамадзтва пачне разбурацца, каб не апынуцца пад ягонымі абломкамі?

Такім чынам, тэкст Казакевіча, пры ўсіх ягоных недапрацоўках, вельмі своечасовы, змушае нас да сур'ёзных разваг пра пэрспэктывы сучаснай сацыяльнай (у шырокім сэнсе) тэорыі датычна да кантэкстаў Беларусі. Думаю, што нам варта да гэтага зьвярнуцца.

14.12.2005 10:13
Аляксандар Філатаў

Даволі цікавае супадзеньне – за гэты тыдзень давялося прачытаць вось ужо, напэўна, другі тэкст, у якім людзі з дастаткова актыўнай інтэлектуальнай пазыцыяй на беларускай мове выказваюцца з крытыкай на адрас інтэлектуальнай школы ЭГУ, што, маўляў, удзельнікі апошняй 1) беспадстаўна ў сваёй непасрэднасьці ўжываюць заходніцкія інтэлектуальныя канструкцыі датычна Беларусі, 2) недастаткова знаёмыя з рэальнымі сацыяльнымі практыкамі і становішчам у краіне («адарваныя» ад яе, чым і абумоўлена іх пазыцыя крытыкі як бы «звонку»), 3) нэгатыўна адгукаюцца аб беларускай культуры, інтэлектуальным патэнцыяле і рэсурсах і г. д. Апроч гэтага артыкулу я маю на ўвазе вядомую крытыку выступу рэктара Міхайлава ў Фрайбургу, зь якой можна азнаёміцца, напрыклад,

вось тут.

На мой погляд, супадзеньне дастаткова паказальнае і невыпадковае, пра яго варта сур'ёзна задумацца абодвум бакам. Будучы часткова салідарным з А. Казакевічам у шэрагу ягоных крытычных заўваг, што ўзьніклі, хутчэй за ўсё, з прычыны розьніцы ў канцэптуальным бэкграўндзе, хацелася б адзначыць і тое, што Андрэй усё-ткі, як я разумею, не вылучаў тэзісу пра тое, што, маўляў, Беларусь насамрэч мадэрнізаваная краіна, а не архаічная. Крытыка была скіравана, наколькі я магу меркаваць, у тым ліку і на ўжываньне самой гэтай схемы архаіка/мадэрн у дадзенай рэалізацыі як арыенталісцкай, каляніяльнай паводле сваёй прыроды. З гэтым можна было б пагадзіцца, аднак з боку такога роду апалягетаў беларускай культуры, самабытнасьці, жыцьцёвага, палітычнага ладу і г. д. вельмі хацелася б пачуць апроч крытыкі нарэшце і пазытыўныя цьверджаньні. Калі ня так, то як? І калі ня гэтыя канцэптуальныя мадэлі, то якія можна з аптымальнай эфэктыўнасьцю выкарыстаць для аналізу гэтай праблемы, казусу Беларусі.

Пакуль жа, прабачце за маю наіўнасьць і магчымую недасьведчанасьць, апроч нэгатыўнай працы (у сэнсе крытычнай апалягетыкі) абапірацца асабліва няма на што. А вось фармаваньне пэўнай дэмаркацыйнай лініі, што пралягае найперш па ацэнках і па мове, ужо цалкам відавочнае нават маладым дасьледнікам.

14.12.2005 23:36

Андрэй Казакевіч
Аляксандру Філатаву

Думаю, ня варта мяне стыгматызаваць за выкарыстаньне беларускай мовы і вызначаць як «такога роду апалягетаў беларускай культуры, самабытнасьці, жыцьцёвага, палітычнага ладу і г. д.». Думаю, беларуская культура ня мае патрэбы ў маёй апалягетыцы і абароне; што ж да майго стаўленьня да «жыцьцёвага і палітычнага ладу» – пакідаю без камэнтароў, з гэтым і так усё зразумела.

Тэкст ствараўся як рэцэнзія (рэцэнзія ня толькі на высновы, але і на мэтадалягічныя схемы). Гэта не праграмны тэкст, а адзін з тэкстаў у агульнай сэрыі крытычнай работы, якую мы (я маю на ўвазе «Палітычную сферу») у меру сваіх сьціплых магчымасьцяў робім. Тут не прадугледжвалася прэзэнтацыя альтэрнатыўных мадэляў аналізу. Для гэтага можна паглядзець: Казакевіч А. Беларуская сыстэма: марфалёгія, фізіялёгія, генэалёгія // ARCHE. 2004. № 4, альбо: Казакевіч А. Дэканцэптуалізацыя крэольства // Палітычная сфера. 2005. № 4.

Мая пазыцыя насамрэч палягае ў тым, што беларускае грамадзтва цалкам сучаснае альбо нават постсучаснае. Ня буду выкладаць падставаў, у рамках інтэрнэт-абмеркаваньня гэта немагчыма (калі цікава, можна зладзіць сэмінар альбо падысьці на наш паліталягічны сэмінар, што адбываецца шточацьвер). Тым больш ня буду прыводзіць бібліяграфіі. У Беларусі ўжо практычна няма ні калектыўнага (у абшчынным разуменьні), ні патрыярхальнага, ні вяскова-патрыярхальнага, і няма ўжо даўно. У любым разе гэтага кампанэнту ня болей, чым у іншых цалкам дэмакратычных краінах Эўропы. Сёе-тое паказана на ўзроўні сымболікі (галоўным чынам рудымэнтарна), і гэтая сымболіка даўно не трансьлюецца на ўсе без выняткаў сацыяльныя групы (гл.: Казакевіч А. Суперновая сучаснасць: Рэкляма сістэмы і канец гісторыі // ARCHE. 2005. № 4). Тое, што беларуская сытуацыя «ненармальная», зусім ня значыць, што яна «несучасная» і ўсё можна сьпісаць на архаічнасьць, патрыярхальнасьць і г. д., як гэта робіцца ў «парадыгме транзыту» альбо паводле аналёгіі з Туркмэністанам ці Танзаніяй. Гэта вельмі зручна і легітымна, але не стыкуецца з рэчаіснасьцю (як канкрэтную дэманстрацыю такой нестыкоўкі на прыкладзе рэлігійнай ідэнтычнасьці гл.: Васілевіч Н. «Праваслаўныя ТМ»: рэлігійная ідэнтычнасьць у рэгіянальных дасьледаваньнях // Палітычная сфера. 2005. № 5).

Што тычыцца падзелаў на групы і кланы, то я пакуль не разважаю такімі катэгорыямі (можа быць, не дарос). Я ня бачу сябе інтэлектуалам, які гуляецца ў культурныя войны альбо спрабуе «ўплываць на грамадзкую думку». Дэмаркацыйныя лініі непазьбежныя і нармальныя, але спадзяюся, яны пройдуць

не паводле лінгвістычнай прыкметы.

Рыгору Мінянкову

Дзякую за рэцэнзію… у большасьці згодны. Толькі паспрабую ўдакладніць некаторыя моманты. Я ні ў якім разе не выступаю супраць «заходняй сацыяльнай тэорыі», натуральна, аніякай іншай цяпер няма і быць ня можа. Я выступаю супраць, як мне падаецца, цалкам канкрэтнай «парадыгмы транзыту» і «парадыгмы мадэрнізацыі», зь яе мовай, бінарнымі апазыцыямі, штампамі і дапушчэньнямі (гл., у прыватнасьці, Карозэрс Т. Канец парадыгмы транзыту // Палітычная сфера. 2004. № 3). Таму мэтафара «паўстаньня вёскі супраць гораду» мне не здаецца пэрспэктыўнай, але гэта прадмет асобнай дыскусіі. Гэтую схему мы, дарэчы, у сябе абмяркоўвалі і ня здолелі спусьціць з мэтафары на больш канкрэтны ўзровень, асабліва пры кампаратыўным аналізе. Калі ўжываць яе пасьлядоўна, то Нарвэгія можа выявіцца значна больш «вясковай» краінай, чым Беларусь, і гэта зусім не наблізіць да разуменьня сутнасьці нашай сытуацыі.

Існуе і больш шырокая праблема. Я б сказаў, што ў інтэлектуальнай і акадэмічнай сфэры мы маем сытуацыю занадта высокай легітымнасьці тэарэтычнага дыскурсу, каштоўнасьць якога, як мне падаецца, беспадстаўна завышаная, і гэта зьніжае ягоную якасьць. Гэта нагадвае інтэлектуальную піраміду (як аналёгію піраміды фінансавай), калі тэарэтычныя схемы грунтуюцца на іншых тэарэтычных схемах, тыя знаходзяць трэція тэарэтычныя схемы, а капаньне ў рэчаіснасьці – справа непрэстыжная, яе можна адкінуць.

Я пазытыўна ацэньваю «паварот да Беларусі» з боку дасьледнікаў ЭГУ ўва ўсіх адносінах, думаю, што гэта ў нечым эпахальная падзея. І мая ацэнка не зьяўляецца ні ў якім разе маральнай, яна выключна мэтадалягічная. Я сапраўды лічу, што выкарыстаньне пэўных мэтадаў (парадыгмаў) у аналізе Беларусі ёсьць прыкметай несур'ёзнага альбо занадта эмацыйнага стаўленьня да аб'екту дасьледаваньня («пагарду» ў тэксьце варта разумець як «пренебрежение», а не «презрение»). На маю думку, эсэнцыялізм сам па сабе ёсьць прыкметай

несур'ёзнага стаўленьня да аб'екта, асабліва калі на ягонай падставе робяцца некаторыя сыстэмныя высновы, і гэта тычыцца ня толькі і ня столькі «Топоса», колькі акадэмічнай супольнасьці наагул.

Ацэньваць штосьці з маральнага гледзішча я сапраўды ня маю права ні ўласна маральнага (не валодаю аўтарытэтам, ведай і г. д.), ні грамадзянскага, бо разумею, што ні да якіх пазытыўных высноваў такія ацэнкі і дыскусіі не прыводзяць.

P. S. Прыкладаньне посткаляніяльнай тэорыі таксама часьцяком дае коміксы, гэта праблема ня «што», а «як», і роля эмпірыкі тут асноўная.

15.12.2005 16:08
Рыгор Мінянкоў
Андрэю Казакевічу

Дзякуй за адказ. Ён шмат патлумачыў, у тым ліку блізіню нашых пазыцыяў. Сапраўды, мы занадта часта захапляемся тэарэтычнымі пасыламі (не выключаю і сябе) без аналізу эмпірыі. І тут праблема агульная: як «перакладаць» тэарэтычныя мадэлі на мову канкрэтнай рэчаіснасьці. Мяркую, што гэта тая з праблемаў, якую ўсім нам трэба сур'ёзна абмяркоўваць. Але пры тым, падкрэсьлю яшчэ раз, варта адрозьніваць узроўні аналізу: адна рэч – тэарэтычная тыпалёгія сацыяльных структураў, іншая – канкрэтны аналіз палітычнага працэсу. Зразумела, што жорстка разьвесьці мы іх ня можам, але ўсё-ткі ў залежнасьці ад узроўню аналізу мы выкарыстоўваем розныя мэтады і канструкты. Асабіста для мяне гэта складаная праблема, і я зусім не лічу, што я яе пасьпяхова вырашаю. У вашых працах я таксама заўважаю гэтую праблему. Любы вобраз канкрэтнай рэчаіснасьці ёсьць нашай канструкцыяй. Пытаньне ў тым, як суадносіць гэтыя вобразы, каб не выбудоўваць, як вы ўдала зацемілі, «інтэлектуальнай піраміды». Прыкладам, той жа вобраз мадэрніці датычна Беларусі. Напэўна, тут можа працаваць канцэпцыя шматлікіх мадэрніці (Ш. Эйзэнштат, Б. Вітрок і інш.). Але гэтае пытаньне для спэцыяльнага абмеркаваньня. У адным з сваіх артыкулаў вы заўважылі, што ў апошнія гады

Беларусь нарэшце стала прадметам сур’ёзнага аналізу мясцовых інтэлектуалаў. І, напэўна, вы пагодзіцеся, што тут мы павінны скарыстоўваць самыя розныя канцэптуальныя структуры. Якая зь іх «сур’ёзьнейшая» – пакажуць вынікі і час.

З расейскай
[image]
[image]

№ 1,2 (41,42) - 2006

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/18
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image]-[image]2006

аналітыка • крытыка • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Дзмітры Плакс Пра «Дойчэ Вэле», хаос дэмакратыі і парадак смерці

ДЗМІТРЫ ПЛАКС

драматург, паэт, мастак і журналіст. Да выезду зь Беларусі працаваў у галерэі «VITA NOVA», у газэце «Имя». Прадусэр беларускай службы «Радыё Швэцыя». Ягоная п’еса «Барух-Эмануэль» ідзе на Малой сцэне Купалаўскага тэатру. Нядаўна ягоныя вершы былі апублікаваныя

Сітуацыя вакол мовы вяшчання «Нямецкай хвалі» падаецца мне вельмі цікавай. Дакладней кажучы, не сама сітуацыя, а тыя дэбаты, тое «жыццё», якое разгарнулася ў інфармацыйнай прасторы і якое цалкам пачалося з маленькай навіны аб тым, што еўрапейская радыёстанцыя пашырае тэматыку сваіх расійскамоўных праграм.

Адразу скажу, што крытыкаваць калегаў не буду. Прэрагатыву падзяляць журналістаў на «чэсных» і «нячэсных» я пакідаю за іншымі людзьмі. Магу толькі шчыра павіншаваць кіраўніцтва і журналістаў «Нямецкай хвалі» – каб мне магло ўвогуле прыйсці да галавы, што найлепшая рэклама для праграмы, якая закранае беларускую праблематыку – гэта расійская мова вяшчання, дык беларуская праграма «Радыё Швецыя» ўжо год як не сыходзіла б з вуснаў нацыянальна свядомай інтэлігенцыі.

Але я чалавек ад натуры тупаваты і таму спачатку біўся за тую новую для «Радыё Швецыя» мову, а цяпер на гэтай самай мове і працую. І вось вынік – год з гакам даволі плённай працы – і ні

табе дэбатаў, ні пікетаў, ні абмеркаванняў, ніякай, у сваю, увагі. Так, прыйдзе калі-нікалі ліст, у якім ляніва вклаюць наркамаўку, агульную млявасць або русізмы ці вымушэнне, ўсе астатнія водгукі – суцэльныя падзякі ды пажаданні. Сумна.

Зразумела, што змест праграм «Радыё Швецыя» на беларускай мове карэнным чынам адрозніваецца ад зместу вяшчання «Нямецкае хвалі» на расійскай. Шведскае радыё расказвае менавіта пра Швецыю, а беларуская тэматыка абмяжоўваецца амаль выключна шведска-беларускімі дачыненнямі ды не надта бліскучым жыццём нешматлікай дыяспары.

А калі так, то якая ж можа быць палеміка? Ну, споўнілася Пэпі Доўгаяпанчоха шэсцьдзесят гадоў, ну і дзякуй Богу, праз пяць гадоў шэсцьдзесят пяць споўніцца... Пра што тут спрачацца?

А пра што спрачаюцца прыхільнікі і праціўнікі новай праграмы «Нямецкай хвалі»? Хіба наконт зместу дыскутуюць?..

Магу адзначыць, што мне, як старому канцэптуалісту, уся гэтая дыскусія – проста бальзам на душу. Які там змест, даражэнькія мае, – форма, вось што галоўнае! Каго хвалюе, што яны там бухцяць, калі яны, перш за ўсё, бухцяць *не так*. Форма робіцца зместам, і мова нашмат важнейшая за тое, што на самай справе гучыць у эфіры...

Шчыра кажучы, у выпадку з «Радыё Швецыя» моўнага пытання як бы і не было з самага пачатку. Часткова менавіта таму, чаму такое пытанне ёсць у дачыненні да «Нямецкай хвалі», гэта значыць – праз «фармальны змест». Ідэя вяшчання на беларускай мове і была часткай зместу, або, дакладней – сэнсу стварэння новай праграмы. Замежнае вяшчанне Шведскага нацыянальнага радыё пабудаванае не паводле прынцыпу краіны прыёму, а паводле моўнага прынцыпу. Прасцей кажучы, праграма на беларускай мове не тое каб зарыентаваная на Беларусь, хутчэй яна прапануе магчымасць атрымліваць інфармацыю пра Швецыю на гэтай канкрэтнай, дадзенай мове.

Вядома, што беларуская мова – мова лакальная. Калі мы гаворым, напрыклад, пра ангельскую мову, то можна ўпэўнена казаць пра тое, што вяшчанне Шведскага радыё на гэтай мове

не разлічанае адно на Англію ці Злучаныя Штаты. З беларускай мовай (як, дарэчы, амаль з усімі з'явамі, падзеямі або рэчамі, для акрэслення якіх можна скарыстаць прыметнік «беларускі») – складаней. Большасць носьбітаў беларускай мовы жывуць, зразумела, у Беларусі. Да таго ж, як ужо гаварылася, жыццё менавіта беларускай дыяспары і дачыненні менавіта з Беларуссю адлюстроўваюцца ў праграме на беларускай мове.

Але падкрэслю яшчэ раз – адной з асноўных прычын пачатку вяшчання на беларускай мове ёсць ідэя, што ў слухача павінна быць магчымасць выбару. У тым ліку – выбару мовы. І тыя лісты, якія Беларуская служба Шведскага радыё атрымлівае з Літвы ці з Украіны, сведчаць пра тое, што і па-за межамі Беларусі ёсць людзі, якія выбіраюць праграмы пра Швецыю на беларускай, а не, напрыклад, на расійскай, нямецкай ці англійскай мове.

Магчымасць выбару – падмурак дэмакратыі. Я ўпэўнены, што і калегі з «Нямецкай хвалі» лічаць дакладна так. Розніца ў тым, што яны наіўна спрабуюць прапанаваць выбар крыніц інфармацыі пра тое, што адбываецца ў самой Беларусі, іншымі словамі – выбар зместу. А беларусам (асабліва прафесійным) гэтага не трэба. Беларусы – нацыя канцэптуалістаў, іх цікавіць канцэпт, форма. Выбіраць жа яны прывыклі пераважна з адной альтэрнатывы. Нават калі ёсць магчымасць выбраць нешта іншае.

Мне падаецца вельмі цікавым і надзвычай сімптаматычным той факт, што пэўная колькасць людзей, якія шчыра лічаць сябе дэмакратычна арыентаванымі, перакананыя і ўпэўненыя ў тым, што яны могуць і павінны забараніць незалежнаму і да таго ж замежнаму радыёканалу вяшчаць на той ці іншай мове. Калі беларускія дэмакраты маюць такія, на маю думку, дзіўныя ўяўленні пра тое, што такое свабода слова і дэмакратычныя каштоўнасці, то ўзнікае пытанне – чаму, уласна кажучы, беларускі ўрад павінен думаць неяк па-іншаму? А ад гэтай думкі ўжо недалёка і да дэбільнай фразы пра тое, што кожны народ мае той урад... ну, зразумела...

Вось, перачытаў я цяпер тое, што дасюль напісаў, і неяк здзьмуўся. Запал астыў. Калі б я сам гэтага не пісаў, а толькі

прачытаў дзе, то, напэўна, падумаў бы, што аўтар гэтага эсэ – нейкі нахабны дурань. Дурань гэты не задаволены тым, што ягоную працу не крытыкуюць, бо адзінай адзнакаю ўвагі лічыць скандал. Дурань гэты любіць павучаць, як каму жыць і паводзіцца. Дурань гэты так любіць свой асабісты пункт гледжання на ўсё без выключэння, а асабліва на беларушчыну, што тую беларушчыну гатовы знішчыць, каб толькі ніхто іншы не авалодаў «правам першай ночы», капірайтам на адзіны правільны погляд...

Можа, я сапраўды той самы дурань і ёсць? Можа, каб жыў цяпер у Беларусі, дык ужо крэмзаў бы гнеўныя лісты на «Нямецкую хвалю», хадзіў бы пікетам ля нямецкай амбасады або енчыў бы на плошчы Бангалор і ў любым разе адчуваў бы сябе вельмі абражаным з запляванай да самага краю душой...

Так, відаць, я той самы дурань. Шматгадовае жыццё ў Еўропе нічому мяне не навучыла. Як быў «саўком», які падзяляе ўвесь свет на «нашых» і «немцаў», так і застаўся. Як умеў акрэсліць самога сябе толькі «супраць» чагосьці або кагосьці, так і цяпер толькі тое і ўмею.

Ну, на самай справе, не вучыцца ж талерантнасці вось так, пад старасць... Што мне з таго, што паняцце «дэмакратыя» павінна распаўсюджвацца не толькі на тых, чые погляды аднолькавыя з маімі? Што мне, глядзець на «іншых розных шведаў» з іх дваццаццю пяццю афіцыйна прызнанымі дыялектамі ў маленькай, лакальнай і забруджанай «англіцызмамі» мове?.. Або ўспамінаць варшаўскага прафесара Вечаркевіча, які дэкларатыўна заяўляў, что польскай мовы не існуе і тлумачыў гэта тым, што ёсць толькі «польскія мовы» – у множным ліку, а «польская мова», як і ўсе іншыя «мовы адзіночнага ліку», мова штучная. (Пра Вечаркевіча гаварыў у адной з праграмаў «Радыё Швецыя» вядомы беларускі пісьменнік Сакрат Яновіч. Але яму даверу няма – ён жа з Беласточчыны, з Падляшша...)

І ўвогуле, нашто мне гэты множны лік? Я люблю канцэпты. А канцэпт – гэта нешта адназначнае, цэльнае, стабільнае. Тут не тое што мноству, двум тлумачэнням месца няма. Таму, мабыць, трэба адкінуць гэтае маладушнае інтэлігенцкае нежаданне крытыкаваць калегаў і сказаць як ёсць: мова павінна быць адна,

адзіная, сапраўдная і чалавечая... І дарэчы – а дзе тая славутая свабода выбару ў той самай «Нямецкай хвалі»? Калі маё права на выбар формы замест зместу будзе паважацца? Што яны мне прапануюць выбіраць? З расійскай мовы расійскую?.. Хаця там на сайце штосьці ёсць і па-беларуску, ды яны яшчэ, здаецца, абяцалі, няхай часткова, але ўсё ж на беларускую перайсці... Што даволі дзіўна, калі мець на ўвазе, што служба там усё ж такі расійская і пра беларускую праграму, яшчэ менш – службу, гаворкі ніколі і не ішло, толькі пра пашырэнне тэматыкі...

Зусім я заблытаў. Зноў штосьці не тое атрымліваецца. Ёсць гарачае жаданне напісаць артыкул пад назваю «Доколе?!» і надрукаваць яго ў «Советской Белоруссии». Але ж не дазволяць (ці, можа, так?). Няпроста гэта – быць прафесійным беларусам...

А калі ўсё, наадварот, вельмі проста? Мабыць, той самы хаос, які пануе і ў маёй галаве, і ў галовах некаторых маіх суайчыннікаў ды і ўвогуле на прасторы Бацькаўшчыны, і ёсць тым пажыўным асяроддзем, з якога выйдуць і мова, і дзяржаўнасць, і культура, і нацыя, і – даруйце ўжо мне такую занадта аптымістычную думку – дэмакратыя? Хаця б з той, зноў жа, простай прычыны, што хаос, разнастайнасць ёсць жыццём, а вось дакладны, стабільны і цудоўны – ідэальны – парадак амаль непазбежна, так бы мовіць – канцэптуальна, звязаны са смерцю, прынамсі духоўнай.

А што, калі адзінае, што трэба для росквіту і агульнага шчасця, – гэта проста змена канцэпцыі? З несвабоды на свабоду. І тут я маю на ўвазе не тую несвабоду, што звонку, для іншых, а тую, што ўнутры, для сябе. Таму што «не пушчаць» кагосьці, здаецца мне, хочацца толькі тады, калі не можаш дазволіць «пусціць» сябе. Ведаеце, калі думкі рухаюцца ў напрамку «мы тут церпім, а яны што ж, сукі?!».

Дык вось, калі пачаць з сябе і даць волю іншым, дык, можа, і жыццё будзе не такім ужо цяжкім, і той крыж беларушчыны будзе трошачкі лягчэйшы. Хай сабе, каму падабаецца, гавораць на расійскай, няхай вяшчаюць хоць бы і на кітайскай. Хай пішуць лацінкай, наркамаўкай, тарашкевіцай. Хай ужываюць нават трасянку, якая, дарэчы, з лінгвістычнага пункту

гледжання даволі цікавы феномен – гэткі каланіяльны дыялект, нешта кшталту крэольскай, а то і цалкам нешта арыгінальнае, як бы яе назваць – дзяржаўная мова дэкласантаў, ці што? («Дэкласантамі» я, дарэчы, не лаюся – сам менавіта такі.) Хай людзі робяць, што хочуць, але ж перш за ўсё – хай штосьці робяць!

Не ведаю, ці здолеў я сказаць хоць нешта разумнае або зразумелае, таму хачу прывесці прыклад. Я бываю ў Беларусі тры-чатыры разы на год. І вось аднаго разу, прыкладна год таму ці трохі меней, калі я ўжо ад'язджаў дадому, у нацыянальным аэрапорце «Менск-2» спатрэбілася мне нейкая даведка, не памятаю дакладна, ці там рэйс спазніўся, ці што. Я, вядома ж, звярнуўся да персаналу. І, зразумела (не ў мары жывём), па-расійску. І вось той чалавек, да якога я звярнуўся, вельмі ветліва, падкрэслю – без усялякай позы, проста ветліва, пацікавіўся ў мяне, ці я гавару па-беларуску. Я здзівіўся, але адказаў, што, маўляў, так, ёсць такі грэх. Тады на найчысцейшай літаратурнай беларускай мове ён адказаў на ўсе мае пытанні і пажадаў мне прыемнага падарожжа.

Што б яшчэ дадаць? А, ну так – выглядаў ён менавіта як службовец аэрапорту, «Жыве Беларусь!» не крычаў, па-змоўніцку мне не падміргваў і ўвогуле паводзіў сябе спакойна і абсалютна звычайна. Ні кроплі канцэптуальнасці заўважыць у ім было немагчыма. Тады я падумаў, што ці не ўпершыню бачу не прафесійнага беларуса, а проста беларуса.

На жаль, больш я яго ў тым аэрапорце не бачыў.

Стакгольм, 6 лістапада 2005
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/18

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image]-[image]2006

аналітыка • крытыка • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

«Як ты адзін – ты больш за аднаго»

Выступленьне таленавітага пісьменьніка ў газэце – гэта дужа цікава і важна, асабліва сёньня, калі многія з сумам згадваюць, як у апошняй чвэрці XX стагодзьдзя на ніве палітычнай журналістыкі працавалі беларускія пісьменьнікі і які розгалас мелі іх публікацыі. Узяць, да прыкладу, Алеся Адамовіча ці Сяргея Дубаўца. А пачатак мінулага стагодзьдзя? Кожны сучасны выдавец і галоўны рэдактар без сумневу марыць пра славу такіх публіцыстаў, такіх калюмністаў, як Янка Лучына, Вацлаў Ластоўскі, Максім Гарэцкі, Янка Купала. У апошняга чытаем: *«Самы найлепшы збаўца наш ад нашага ліхалецьця – гэта мы самі. І калі ня хочам загінуць, калі ня хочам быць вечнымі рабамі, – павінны пакінуць мы благую звычку думаць, што нехта прыйдзе і выратуе нас з нашай бяды, з нашай няволі. (...) Час праявіць нам і свае сілы ў будаваньні новага жыцьця для сваёй бацькаўшчыны...»* («Больш самачыннасьці», 1919). Якое гарачае жаданьне кансалідаваць грамадзтва! З такімі ўладарамі думак ня страшна было б сустрэць сакавік 2006 году...

Сучасныя пісьменьнікі, якія рэгулярна друкуюцца ў газэтах, пазьбягаюць вострапалітычных тэмаў. Як, прыкладам, аўтары «Нашай Нівы» – Адам Глёбус, Уладзімер Арлоў ці Ўладзімер Някляеў. Але ад гэтага іх чытаць ня менш цікава. Упэўнены, што і «СУчасьнікаў» Глёбуса, і падарожную прозу Арлова, і

«Знакі прыпынку» Някляева «нашаніўскі» чытач не абмінае ўвагай – гэта *патрэбныя* суразмоўцы, і яны (кажу бязь ценю іроніі) многаму могуць навучыць.

Аднак я быў непрыемна ўражаны, калі ў «Знаках прыпынку» (Наша Ніва. № 41. 2005) мяне разам з паплечнікамі па «ARCHE» назвалі «архараўцам» (іншымі словамі, «буянам», «галаварэзам») і абвінавацілі ў непавазе, варожым стаўленьні да супрацоўнікаў часопісу «Дзеяслоў». *«Нашы «архэўцы» (ледзь не напісаў «архараўцы» – тыя, хто групуецца пры часопісе «Arche»)*, – піша Някляеў, – *ня надта ладзячы паміж сабою, яшчэ больш ня ладзяць зь «дзеяслоўцамі», у якіх да «архэўцаў» гэткія ж моцныя зваротныя пачуцьці»*. Гэтыя абвінавачаньні абсурдныя: паводле лёгікі Някляева, я не ў ладах... з сабою, злую і крыўджу самога сябе, бо я, сталы аўтар «ARCHE», друкуюся таксама і ў «Дзеяслове». І гэтак жа злуюцца на саміх сябе, атрымліваецца ў аўтара «Знакаў прыпынку», іншыя літаратары альбо крытыкі, якія адначасова супрацоўнічаюць з гэтымі двума часопісамі. Вось дык галаварэзы – самі сябе рэжуць!

Сэнс нататкі Някляева затуманены: з аднаго боку, ён кажа, што ў беларускіх літаратурных колах «кожны крыўдуе на кожнага», зь іншага, адзначае, што падобная сытуацыя назіралася заўсёды й ня толькі ў нас («так яно між намі сёньня можа быць, як было яно заўсёды і між усімі»). Калі гэта так, і дадзенае пытаньне – вечнае і невырашальнае, як спробы ліквідаваць сацыяльную несправядлівасьць у грамадзтве, навошта тады яго ўздымаць? Тым больш што *аўтар не прапануе ні новага бачаньня праблемы, ні сродкаў яе вырашэньня*. Уладзімер Някляеў забываецца, што ён піша для газэты, што ягоныя словы балюча адгукаюцца ў сэрцах многіх чытачоў, паглыбляючы іх разгубленасьць, зьняверанасьць у сабе і іншых (у тым ліку ў айчынных інтэлектуалах). Ластоўскі альбо Адамовіч такой неабачлівасьці сабе дазволіць не маглі. А працавалі яны ў тых жа варунках, што і Вы, спадар Някляеў, а менавіта ўва ўмовах, калі Беларусь ня мела палітычнай і эканамічнай свабоды, і незалежнасьць была недасяжнаю мараю, за якую трэба было змагацца. Змагацца разам.

Да таго ж гэтая савецкая звычка не называць ніякіх імёнаў! «Калі размаўляеш з тым ці іншым літаратарам (зь любой групоўкі) паасобку...» – назавіце прозьвішчы, калі ласка! Ваш «сусед» па газэтнай паласе, Адам Глёбус, прозьвішчамі так і сыпле ў сваіх фацэцыях і нататках! Можа быць, у яго Вам трэба павучыцца шчырасьці, уменьню называць рэчы сваімі імёнамі, не ганяцца за абагульненьнямі?

Далібог, я не крыўдую на аўтара «Знакаў прыпынку», ні ў чым яго не абвінавачваю. Я толькі спрабую зразумець, чаму менавіта *цяпер* і менавіта ў такой *форме* знаны беларускі паэт і празаік Уладзімер Някляеў ставіць (дакладней, спрабуе паставіць) гэтае пытаньне. Чаму ён, аўтар бліскучага вершу «Як ты адзін» (Крыніца. 1994. № 8), гэтак няўмела і павярхоўна піша сёньня пра варожыя лягеры (праблема, асабіста для мяне, падкрэсьлю, – няісная):

Чужы чужым – яны знайшлі свайго,
Ня свой сваім – яны пайшлі з чужымі,
Ня тузайся ні з тымі, ні з другімі.
Як ты адзін – ты больш за аднаго.

У высі птушка,
Рыба ў глыбіні,
Вандроўнік на фантомным небакраі,
Як ты адзін – ты не змарнуеш дні
На тое, каб спазнаць законы зграі. (…)

У гэтым вершы падкрэсьліваецца, што сапраўдны творца не павінен губляць сябе ў «тузаньні» з рэчаіснасьцю. Сапраўдная паэзія і гармонія – яны з тымі, хто аддаў перавагу не «чужым-сваім», а адзіноце, хто пасябраваў з сабою. Можа быць, Някляеву ў «Знаках прыпынку» трэба было нагадаць беларускім літаратарам свой верш «Як ты адзін» і толькі? Вынік, упэўнены, быў бы больш пазытыўны. Аднак, не. Някляеў-паэт збочыў, каб Някляеў-публіцыст выйшаў наперад. І сказаў... не, ня глупства, а трывіяльнасьць, якой ад былога галоўнага рэдактара легендарнага часопісу «Крыніца», а сёньня – новаабранага старшыні Беларускага ПЭН-цэнтру і аўтара паважанага

тыднёвіка «Наша Ніва» мы зусім не чакалі.

Павал Абрамовіч,
літаратурны крытык
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/18
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image]-[image]2006

рэцэнзіі

"аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • **рэцэнзіі**

[image] [image] [image] **ПАВАЛ АБРАМОВІЧ**

Павал Абрамовіч Гутарка пад Вострай Брамай

крытык літаратуры. Рэгулярна друкуецца ў часопісе «ARCHE».

Дубавец, Сяргей. *Вострая Брама. Беларускі культурны кантэкст на мяжы стагодзьдзяў.* Выбраныя перадачы Радыё Свабода (1997–2004). – Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2005. – 520 с. – (Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе).

У «Бібліятэцы Свабоды» друкуюцца выбраныя перадачы Беларускай службы радыё «Свабода». Словы, якія *прамаўляліся* ў этэры, цяпер набываюць застылыя формы. На маю думку, гэты праект павінен быў увасобіцца ў сэрыю аўдыёкніг, але, на вялікі жаль, беларускае мастацкае і публіцыстычнае слова пакуль прыходзіць да сваёй аўдыторыі традыцыйным шляхам – праз друкарню[1] . Выключэньне складае хіба што літаратурны часопіс «Тэксты», адзіны нумар якога выйшаў у 2004 годзе, – яго можна набыць і на кампакт-дыску.

Слухач радыё «Свабода», узяўшыся чытаць кнігу «Вострая Брама», у якую ўвайшлі выбраныя скрыпты з аднайменнай перадачы гэтага радыё, міжволі пачуе голас Сяргея Дубаўца, уловіць ягоныя інтанацыі. Хоць «Вострая Брама» ствараецца, як правіла, калектыўнымі намаганьнямі, яна была і застаецца – ужо дзявяты год – «маратонам аднаго аўтара», як зазначыў у

прадмове да кнігі Аляксандар Лукашук. Дубавец адкрывае і закрывае «Вострую Браму», абірае тэмы, фармулюе пытаньні, кіруе гутаркай, робіць высновы. У ліку нямногіх Дубавец стварае *ідэалягічны* прадукт – (у тым сэнсе, у якім ідэалёгію разумеў Ралян Барт, які ў «Асновах сэміялёгіі» вызначыў ідэалёгію як няспынны пошук каштоўнасьцяў і іх тэматызацыю), таму яго сьветабачаньне, комплекс ведаўой жа перакананьняў сёньня нельга ня ўлічваць, калі аналізуеш сацыяльна-культурнае жыцьцё краіны.

Многія перадачы «Вострай Брамы» прысьвечаны «эстэтычнай рэчаіснасьці» – літаратуры, як і пілётны выпуск пад назвай «Вострая Брама і Курган Славы» (этэр ад 10.12.1997). Гэтым скрыптам пачынаецца кніга. Асноўная думка – у беларускай літаратуры існуе этычны і эстэтычны канфлікт паміж Вострай Брамай і Курганам Славы як хрысьціянскай і паганскай сьвятынямі (праз такую прызму беларускую літаратуру не разглядаў ніхто), і гэтую палярызацыю можна пашырыць на ўсе грамадзка-палітычныя і культурныя працэсы. Дубавец імкнецца ўплываць на хаду літаратурнага працэсу: «...я спрабую паставіць эстэтычную задачу – убачыць верш, у якім бы апяваліся Вострая Брама і Курган Славы адначасова». Калі сымбалі не паяднаюцца, калі між імі ня будзе пастаўлены злучнік «і», адзін зь іх мусіць канчаткова зьнікнуць, а значыцца, кансалідацыі нацыі не адбудзецца.

«Вострая Брама і Курган Славы» – вельмі складаны ідэалягічны тэкст, але яго пабудова – лёгка-празрыстая, акварэльная. Ён пазбаўлены складаных моўных канструкцыяў, строгіх навуковых дэфініцыяў, скрупулёзнага аналізу, бо напісаны прафэсійным журналістам з вобразным мысленьнем і тонкай інтуіцыяй, які хоча быць пачуты масавай аўдыторыяй. Гэта дазваляе параўнаць Сяргея Дубаўца з Алесем Адамовічам.

1. У Аўстраліі жа ніхто суседняй Расеі аўдыенцыі і карыстаюцца добрым попытам, у многім дзякуючы таму, што ў іх стварэньні удзельнічаюць папулярныя акторы тэатру і кіно, тэлезоркі. Так, напрыканцы 2003 году зьявілася аўдыевэрсія новага рамана культавага пісьменьніка Віктара Пялевіна «Шалом жаху», які агучвалі Леанід

Валадарскі, Марыя Галубкіна, Ціна Кандэлакі, Юлія Рутберг, Мікалай Фаменка, Аляксандр Ф. Скляр. Беларусам жа даводзіцца замаўляць гэтыя кнігі на знаёмай, але чужой мове праз распаўсюднікаў друкаванай прадукцыі.

Падобна Адамовічу, якога ў кансэрватыўных акадэмічных колах ніколі не лічылі сапраўдным навукоўцам, Дубавец крытык выклікаў і выклікае альбо гнеўныя абурэньні, альбо паблажлівыя ўсьмешкі з боку афіцыйнай навукі[2]. І дарэмна, могуць у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы сур'ёзна разглядаць артыкул Дубаўца «Загадка Караткевіча» ў тым аўтар вылучае гіпотэзу аб тым, што ў сваім вершы «Багдановічу» Караткевіч пад ізумрудам разумеў Вільню, прыслухацца да яго прапановы аб напісаньні грунтоўнай «Гісторыі таталітарызму ў Беларусі», адзін з разьдзелаў якой быў бы прысьвечаны беларускай савецкай літаратуры (ці «Рускі туман»)? Ці здольныя акадэмікі застацца абыякавымі, як Дубавец параўноўвае старшыняў беларускага Саюзу пісьменьнікаў з босамі мафіі («Нацыя паэтаў і яе хрэстаматыя бацькі»)? Ці могуць яны бяз кпінаў слухаць яго разважаньні пра тое, што Арсеньнева закахалася ў Гарэцкага і таму пачаў пісаць вершы па-беларуску («Натальля Арсеньнева. Таямніцы творчасьці»)? Ці дазволілі б Дубаўцу ў навуковым выданьні

[2] Артыкул Дубаўца «Тры крытык выклікаў і выклікае альбо. Дубаўцы, ці Тезіса) – і разглядаць артыкул Дубаўца «Загадка Караткевіча» ў уласцівым беспадстаўнай ілжывай фікцыі аўтар вылучае гіпотэзу аб тым, што ў сваіх вершах беларускіх паэтаў (Рускі туман»)? Ці здольныя акадэмікі застацца абыякавымі, як Дубавец параўноўвае старшыняў беларускага Саюзу пісьменьнікаў з босамі мафіі («Нацыя паэтаў і яе хрэстаматыя бацькі»)? Ці могуць яны бяз кпінаў слухаць яго разважаньні пра тое, што Арсеньнева закахалася ў Гарэцкага і таму пачаў пісаць вершы па-беларуску («Натальля Арсеньнева. Таямніцы творчасьці»)? Ці дазволілі б Дубаўцу ў навуковым выданьні

напісаць пра таго ж Алеся Адамовіча, што «ён парушаў гармонію кола, намаляванага вакол савецкага пісьменьніка, выходзіў за якую было непажадана, падазрона, злачынна»?

Адказ на ўсе пытаньні – «не». У вачах большасьці навукоўцаў Дубавец – журналіст са скандальнай рэпутацыяй, які спрабаваў зрабіць імя на літаратуры і які «задзіраецца, выпендрываецца, выскаляецца», «бессаромна танчыць на магілах, драмах і трагедыях блізкага і няблізкага мінулага» (А. Лойка). Паміж імі – сьцяна...

Пэўныя паралелі ў формах і спосабах падачы матэрыялу, узьдзеяньня на аўдыторыю можна правесьці паміж Дубаўцом і… тэлевізійнымі вядоўцамі. Ён умела актывізуе ўяўленьне, фантазію сваіх чытачоў і гледачоў, выклікае ў іхных сэрцах гарачае суперажываньне, прыводзіць у своеасаблівы транс, каб аўдыторыя адчула сутнасьць памкненьняў і ўчынкаў гістарычных пэрсанажаў, іх эмоцыі, пачуцьці, стала сьведкай тых падзеяў. Так, на пачатку перадачы «Тодар Кляшторны» Дубавец прапаноўвае слухачам «*уявіць сабе* (вылучана мною. – **П. А.**) веснавы дзянёк пачатку 1950-х і Якуба Коласа на падворку ягонага менскага асабняка». Ствараючы запамінальны вобраз Якуба Коласа, які «даглядае азіміну ў сваім агародзе на лапіку зямлі», Дубавец жадае даведацца, пра што думае ў гэты момант Колас, ці адчувае ён, якая страшэнная пустэча ўтварылася ў літаратурным жыцьці Беларусі пасьля гвалтоўнай сьмерці дзясяткаў пісьменьнікаў, ці баліць яму, ці шкадуе ён іх і саму літаратуру?

Пытаньні слушныя і, як гэта нярэдка адбываецца ў беларускай гісторыі, своечасова несфармуляваныя, незададзеныя. «Дзядзька Якуб на падворку мружыць вочы. Дасаджаюць хваробы, і хочацца ў лес... Быццам нічога й не адбылося за ягонай сьпінай. Проста зь літаратурнага працэсу выпала пакаленьне, а сам працэс на пакаленьне выпаў з часу...»

Мы, хто вучыў айчынную літаратуру па сухіх, як кара дрэваў, падручніках, у якіх кожны беларускі літаратар разглядаўся ізалявана ад іншых, у асобным параграфе-склепе, меў белыя плямы ў біяграфіі, быццам на час зьнікаў зь Беларусі, мы нават не задумваліся, якія таямніцы, які боль хавалі ў сваіх сэрцах

шытайцаў пазіцыі ўвогуле за Лойка А. // Літаратура і мастацтва. 1990. 22 чэрвеня. «С. Дубавец съцьвярджае, што сапраўдная проза – у мужчын, сапраўдная паэзія – у жанчын. Катэгарычна і адназначна. І напісана гэта ня ў дзень жаночага съвята». Дзюбайла П. Час, літаратура, крытыка. Мінск, 1992. с. 25.

нашыя пісьменьнікі. Што ім прыйшлося перажыць і пабачыць. А Тодар Кляшторны? Вось глядзіце, ён уваходзіць у «Вострую Браму» і пераўтвараецца – дзякуючы ўспамінам сваіх сучасьнікаў і зьвесткам, знойдзеным навукоўцамі, якія зьнітаваў між сабою Дубавец, – з напаўзабытага нябожчыка ў жывога чалавека. (Сьведчыць пісьменьніца Вольга Таполя: «Ён рэдка сьмяяўся, і ягоная ўсьмешка таксама была заўсёды сумнай. І яшчэ ён быў ціхі, спакойны, ураўнаважаны, ніхто ніколі ня чуў і ня бачыў, каб ён злаваўся...») Бачыце клетку з канарэйкай, якую Кляшторны, апрануты ў абдрыпаныя нагавіцы, нясе з сабою па Менску? Вось, чуеце, рабочыя-муляры са сьмехам пытаюцца ў яго, як сьпявае канарэйка? «Не сьпявае, а плача ў клетцы канарэйка», – адказвае паэт...

Высновы зь перадачы «Тодар Кляшторны»: «Прыпёртыя да сьцяны, яны проста не маглі ўцяміць, каму і навошта іх спатрэбілася забіваць. З-за іхнай паэзіі? Яны, ня маршавыя зусім людзі, былі акрасаю гэтага манатоннага і нуднаватага сьвету, адзінай у ім разнастайнасьцю – са сваёй вечнай прагай пісаць пра васількі, пра чыстую красу. Але... Той сьвет вырашыў пазбавіцца ад іх. І ад усіх такіх, як яны».

Ня ведаю, ці будуць у Дубаўца вучні, пасьлядоўнікі, а вось папярэднікі ў яго дакладна ёсьць. Адзін зь іх – Вацлаў Ластоўскі, уключаў у нацыянальны літаратурны кантэкст творы польска- і расейскамоўных пісьменьнікаў, што нарадзіліся ў Беларусі (нэкралёг «Эліза Ажэшка», крытычна-біяграфічны нарыс «Людвік Кандратовіч», эсэ «Тодар Дастаеўскі і Адам Міцкевіч – сыны крывіцкага народнага генія» і інш.). Частка перадачаў «Вострая Брама» таксама прысьвечана замежным дзеячам культуры, якія мелі беларускія карані[3]. Дубавец, як і Ластоўскі, ставіць мэтаю акрэсьліць «нашу прысутнасьць у культурнай прасторы сьвету» («100 гадоў Натальлі Сарот»), не абмінаючы ўвагай чыста асьветніцкай задачы («...А бабруйскія дзеткі ганарыліся б, што яны землякі сусьветна вядомай пісьменьніцы»). Родніць Дубаўца і Ластоўскага цьвёрдае пераканаьне: для замежжа нашыя культурныя дзеячы – адно, а для саміх беларусаў – другое. Параўнайце, да прыкладу: «У той час, калі шляхта на Беларусі зачытвалася творамі Кандратовіча, калі тут кожнае слова знаходзіла адгалосак,

кожны абраз – адбіцьцё ў душах чытачоў, польская крытыка сурова судзіла яго творы. Гэтак польскі крытык Барташэвіч пісаў, што Кандратовіч дае «ніжэйшага шэрагу творчасьць, а зьмест ягоных твораў убогі і прастацкі…» (Ластоўскі) і «Для літоўцаў Кухта – прадпрымальнік, які спрыяў нацыянальнаму руху, для беларусаў жа – культурны герой на ўсе часы» (Дубавец).

Акрамя таго, Ластоўскі і Дубавец вельмі падобныя адзін да аднаго шчырай вераю ў тое, што лёс літаратуры, як і гісторыі, могуць вырашаць адзінкі, асобы. «Адзін геніяльны твор, *напісаны па-беларуску* (вылучана мною. – **П. А.**), – пісаў Ластоўскі ў эсэ «Па сваім шляху!» (1914), – можа даць стацыю пашану нашаму народу». Праз 87 гадоў Дубавец яшчэ больш надзеі, што такі твор, створаны абавязкова на родным зьявіцца ў нашай літаратуры і рэабілітуе краіну ў вачах замежнай грамадзкасьці, якая ведае толькі наша бліскучае посьпех у сусьветнага чытача, Ластоўскі і Дубавец н што надае іх развагам сумную ўтапічнасьць.

Ластоўскі ўпершыню ў беларускай крытыцы пачаў ужываць паняцьцем «краса» (эсэ «Сплачвайце доўг», 1913). Дубавец у сваёй публіцыстыцы шырока ўжывае паняцьце «праўда». «У беларускай традыцыі – у літаратуры і гісторыі – слову «праўда» ніколі не супрацьстаіць слова «хлусьня», але «крыўда» («Аляксандар Салжаніцын. Жыць без ілжы»). Дубавец мае амбіцыю запачаткаваць новую традыцыю, калі на месца «крыўды» ставіцца «хлусьня»: «Нас так вучылі, што ўсе маладыя савецкія паэты былі нібы на адзін твар – як лётчыкі ў фільмах пра Чкалава. (…) Насамрэч гэта ўсё хлусьня» («Тодар Кляшторны»). У другім месцы кнігі «Вострая Брама» сустракаем іншае, але таксама правільнае «выпраўленьне», а менавіта – пару антонімаў *«праўда»* (у значэньні «тое, што адпавядае рэчаіснасьці») – *«вымысел»*: «У гэтым міжволі нашмат болей праўды і амаль не застаецца месца вымыслу» («100 гадоў Натальлі Сарот»).

Пакуль дзяржава будзе ўмешвацца ў справы літаратуры, літаратура пакідае за сабою права ўмешвацца ў справы

3 Сіра
і гісторыі
можа
нацыянальнага
ці стацыю
ашчыхтубіне
ваіхсу
тых
культурах
набыць
такія
ніякабы,
што сёньня
гэта ўжо ня
можа не
выклікаць
усьмешкі –
так, Дубавец
іранізуе,
што
габрэйскі
сьлед Элвіса
Прэсьлі
(«…няйначай,
прывёў бы
прасьцяком
у Бабруйск,
як гэе было
ужо нез
адной
сусьветнай
знакамітасьцю»
(«Элвіс

дзяржавы. Гэтая думка Іосіфа Бродзкага, агучаная ім у эсэ «Пруэсьлі»). Нобэлеўскай лекцыі, ілюструе і сутнасьць сёньняшняй літаратурнай сытуацыі ў Беларусі. Палітызацыя літаратуры (і крытыкі), пэрманэнтны канфлікт апошняй з уладамі, злоўжываньне ёю публіцыстычнымі прыёмамі маюць месца з часоў Францішка Багушэвіча, бо народ так і ня стаў нацыяй, і частка літаратараў і крытыкаў па-ранейшаму лічыць, што на іх ускладзена асаблівая нацыянальная місія. Дубавец, з аднаго боку, лічыць, што беларускі пісьменьнік нарэшце «перастаў быць палітыкам» і таму можа належным чынам выконваць свае прафэсійныя абавязкі, а з другога, заклікае беларускую літаратуру да стварэньня «магутнага раману пра дыктатара» («Восень патрыярха»). Але ці не супярэчыць ён сам сабе?

З артыкулу «Восень патрыярха» мне не зусім зразумела, да стварэньня якога паводле формы і зьместу раману заклікае Дубавец. Падобнага да твораў Маркеса і Астурыяса? Але ж у сусьветнай літаратуры ўжо прамоўлены галоўныя словы пра сутнасьць тыраніі, у тым ліку беларусамі Адамовічам і Быкавым. Ці, можа, Дубаўцу трэба, каб «праўда жыцьця пераўтварылася ў праўду мастацтва», як калісьці жадала сабе ілжыва-бадзёрая савецкая літаратура, і ён хоча, каб той твор меў усе прыкметы нашай сумнай гнятлівай рэчаіснасьці, праўдзіва-натуралістычна схопленыя пісьменьнікам N.? Невясёлае атрымаецца чытво, як на мой погляд. Актуальнае сёньня і нікому не цікавае заўтра, тым больш замежнаму чытачу, на ўвагу якога спадзяецца Дубавец. Затое ён піша, хто мусіць быць галоўным пэрсанажам гэтага гіпатэтычнага раману. Дыктатар. Бр-р-р! Ці ж нам замала кнігі Фядуты?

Асабіста я жадаю, каб гэты твор – раман пра сучасную Беларусь, які вельмі карціць пабачыць і пачытаць, бо ён, перакананы, надасьць усім нам упэўненасьці ў сваёй краіне і сваіх сілах, – быў бы пра немагчымасьць зьнішчэньня думкі, сумленьня, каханьня, сьмеху з *пошлай* тыраніі. Каб у цэнтры такога раману была альбо сям'я, як у Міхала Вівэга (раман «Цудоўныя гады сабаку пад хвост»), альбо каханкі, як у Мілана Кундэры (раман «Невыносная лёгкасьць быцьця»), альбо прафэсар, які вучыўся ў школе разам з будучым дыктатарам і валіў яго падножкай, як ва Ўладзімера Набокава (раман «Bend

Sinister»). Каб гэта была сюжэтная проза і адначасова – інтэлектуальна-філязофская рэч, цікавая яшчэ і сваёй формай. Вівэг, Кундэра, Набокаў здолелі спалучыць усё гэта ў адно. І нашыя пісьменьнікі, якія маюць багаты досьвед жыцьця пад дыктатурай, здолеюць. Літаратурным крытыкам трэба толькі пачакаць, не прысьпешваючы творцаў сваімі воклічамі.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/29
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

рэцэнзіі

[image]-[image]2006

“ аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура •

рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Сяргей Шыдлоўскі Беларусь як раман

СЯРГЕЙ ШЫДЛОЎСКІ (нар. 26.12.1973) – эсэіст, літаратурны крытык. Скончыў гістфак Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Выкладаў гісторыю культуры ў Полацкім дзяржаўным унівэрсытэце. Асьпірант Інстытуту мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклярыстыкі НАН Беларусі. Апошняя публікацыя «Шляхецкі саслоўны

Дубавец, Сяргей. *Вострая Брама. Беларускі культурны кантэкст на мяжы стагодзьдзяў.* Выбраныя перадачы Радыё Свабода (1997–2004). – Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2005. – 520 с. – (Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе).

Гісторыю Францыі французы ведаюць па раманах А. Дзюма. На польскую мінуўшчыну палякі глядзяць вачыма г. Сянкевіча. Стваральнікі «лёгкага жанру» ў XIX стагодзьдзі зрабіліся архітэктарамі эўрапейскіх нацыяналізмаў. Хіба толькі два народы Эўропы вылучыліся з мэйнстрыму: расейцы, «загадкавасьць» нацыянальнай душы якіх фундуюць раманы Дастаеўскага, дасьледніка этычнага падпольля, ды беларусы, якіх дагэтуль агортвае паэтычная смуга.

Яна, смуга, маскуе часам няведаньне прадмета, аб якім вядзецца размова. Беларусь бачыцца на адлегласьці. Прыкладна з ракурсу Яраслаўля. Там яе прымроіў Максім Багдановіч. Калегі з «Нашай Нівы» зладзілі паэту экскурсію па музэйных сховах Вільні. У аб’ёме разгледзеных Багдановічам экспанатаў з калекцыі Івана Луцкевіча беларускі нацыяналіст і ведае сваю Радзіму – элегічную, з налётам музэйнага пылу. Астатняя частка насельніцтва Беларусі да апошняго часу

літаратурныя ўражаньні пра сваю краіну чэрпала з ідэал у грамадзянскай лірыкі расейца Някрасава, нявольнага інсьпіратара лятэнтнага беларускага нацыяналізму.

Сэнтымэнтальная паэтычная рэальнасьць мае дзьве крайнасьці: сакральнае, урачыстае, сьвяточнае, якое было рэдукаванае за позьнімі Саветамі да юбілейна-банкетнага моманту, калі ўзроўнем беларускай паэзіі зрабілася вышыня зэдліка, на які паэт заскокваў зь вершыкам «на случай» перад высокім савецкім сходам. Другая крайнасьць – халопскі, калгасны нізтое «роднае карэньне», якое вычытваецца зь вершаў Купалы, прозы Гарэцкага, дасьледаваньняў Часлава Пяткевіча. Мы знаходзім сябе недзе пасярод ку – паміж беларускім небам і беларускай багнай – у хлудзе чужынскай мас-культуры. Пагражаць небу ці асушаць балоты бессэнсоўна, пакуль ня вымецены з хаты хлуд і не наведзены Парадак, ня створаны культурны канон, што рэглямэнтуе і дух законаў, прыманых у краіне, і форму кухляў у тутэйшых піўніцах.

Дубавец, разважаючы пра эўрарамонт у «хрушчоўцы», займаецца выхаваньнем пачуцьцяў і густу айчыннай буржуазіі. Нават тэза пра арыстакратызм беларускай культуры слугуе ўрэшце таксама кшталтаваньню сьветапогляду сярэдняй клясы. Арыстакратызм – прадмет прэтэнзій буржуазіі. Гэтаксама як і нацыяналізм акрамя яе не патрэбны ані арыстакратам, ані пралетарам.

Беларусь багатая на песьняроў. Але нацыю фармуе ня песьня, а міт, анэкдот, гістарычная адмена якога і ляжыць у падмурку раману-фэльетону XIX ст. Датрымлівацца тэхналёгіяў нацыянальнага будаўніцтва эпохі рамантызму сёньня, вядома, не выпадае. Пасьля Эка прадукаваць раманы ў стылі Дзюма – несамавіта. Жанр «плашча і шпагі» замяніў «культуралягічны дэтэктыў». І тут беларусы не спазьніліся. Мы маем дыхтоўныя тэксты, якія трымаюцца на інтэлектуальнай інтрызе – «Шукаецца клясык» г. Кісялёва, «Загадка Багдановіча» М. Стральцова, творы с. Дубаўца (згадаем, напрыклад, яго эсэ пра таямніцу паходжаньня Максіма Гарэцкага, што справакавала нязвыкла бурлівую палеміку ў айчынным друку).

Падобныя кнігі добра стасуюцца з фарматам сучасных

творах Яна Баршчэўскага» (Вестник Полоцкого государственного университета. № 7, 2005).
Жыве ў Наваполацку.

мэдыйных праектаў. Як узор – зборнік Сяргея Дубаўца «Вострая Брама», выбранае з аднайменнага цыклю перадачаў на радыё «Свабода», архіў якога можна знайсьці ў сеціве.

Што супольнага ў Дубаўца і Дзюма? Перадусім, мітатворчасьць. Дадам, нацыянальная мітатворчасьць. Па-другое, індустрыйны размах – «Вострая Брама» выходзіць на хвалях «Свабоды» ўжо восьмы год. Гэта інтэрактыўны раман з працягам, галоўнай гераіняй якога ёсьць Беларусь. Дэтэктыўная інтрыга трымаецца на таямніцы яе паходжаньня. Як і ў крымінальна-авантурным аповедзе, у гэтай гісторыі не абыходзіцца без ахвяраў, катаў і герояў. Яна мае містычна-кансьпіралягічны падтэкст, у кулюарах фігуруюць рыцары, масоны, езуіты ды пан Бог.

Раман-фэльетон, ускосным наступствам стварэньня якога ў Францыі зьявілася фармаваньне масавай гістарычнай сьвядомасьці, быў ня толькі новым папулярным жанрам, але і наватарскай мэдыйнай тэхналёгіяй. «Вострая Брама» – таксама экспэрымэнт у імя прарыву да незаангажаванага нацыянальна-культурнай тэматыкай спажыўца, пасярэднік паміж айчыннай гуманітарнай навукай і масавай сьвядомасьцю.

Дубавец адпрэчвае ляўры ідэоляга беларускага нацыяналізму, прэзэнтуючы сябе як літаратара. Але праўдзівы партрэт беларускага нацыяналіста пакаленьня next без дубаўцоўскай «Нашай Нівы» ў руцэ будзе няпоўным. Мы памятаем нашаніўскую публіцыстыку другой паловы 1990-х, якую можна аб'яднаць пад адзіным гаслам – «Ня зломіш!». І цяперашнія тэксты гэтага аўтара заўжды вызначаюцца выразнай інтанацыяй у асьвятленьні сацыяльна-палітычных падзеяў.

Беларусь Дубаўца цікавая і небясьпечная. Яе гісторыя – авантурнае чытво, інтэлектуальная прыгода. Верасовыя пусткі, якія зачароўвалі нас у тэкстах Стывэнсана – тыповы паўночнабеларускі ляндшафт, – асвойваюцца айчыннымі героямі. Кансьпіралягічныя павароты беларускіх сюжэтаў анічым не саступаюць вастрынёй інтрыгам мушкетэрскіх показак Дзюма. Беларусь – гэта чытэльна. Яе насяляюць пэрсанажы, поўныя жарсьці і амбіцыяў, але рухае імі не карысьць, а фаўстаўская цікаўнасьць да сьвету. Беларусь – гэта

небанальнае.

Разам з апавядальнікам мы выпраўляемся ў вандраваньні – Лёндан, Парыж, Нью-Ёрк – і там знаходзім Беларусь.

У суплёце размаітых тэмаў ёсьць у кнізе Дубаўца важная сюжэтная лінія, якую можна назваць «сямейная хроніка». Яна прысьвечана гісторыі моцнай беларускай радзіны на прозьвішча Карлеонэ. Яе шматлікія атожылкі бавяцца лірыкай, дзеляцца на гомельскіх і партызанаў, калекцыянуюць замест скальпаў рукапісы палеглых апанэнтаў. Ня ўсё мы ведаем, многія таямніцы хавае ружовы туман. Такім паўстае на старонках «Вострай Брамы» карціна літаратурнага працэсу ў Беларусі 1920–1970-х гг.

Шматгалосьсе ў «Вострай Браме» падтрымліваецца рупнасьцю супрацоўнікаў праекту: Севярынам Квяткоўскім, Сяргеем Харэўскім, Зьмітром Бартосікам, Андранікам Антанянам, а таксама хорам мінакоў на менскіх вулках.

Аўтар улучае ў поле беларускай культуры знакавыя падзеі, герояў і ідэі сусьветнай культуры: Сэлінджэр, Кізі, Прэсьлі. Такім чынам ствараецца кантэкст, задаюцца каардынаты нармальнасьці. Выбар пэрсанажаў і твораў абмяжоўваецца збольшага культурнымі іконамі 1970-х. Дубавец застаецца адданы свайму пакаленьню, ягоным эстэтычным густам ды ўпадабаньням. Аўтару даюцца жаночыя вобразы: Арсеньнева, Сарот, Пэгі Лі, Беларусь.

Безумоўна, «Вострая Брама» – віленская кніга. Дубавец мае сантымэнт да Літвы. Але яго Вэкаэл – хутчэй антытэза Бээсэсэру, саветчыне – вытвараная сынтэтычным шляхам, а ня колішняя гістарычная рэальнасьць. Так, напачатку, калі адбывалася лёсаваньне гістарычных шанцаў, у Літвы было болей падставаў перамагчы. Але акурат Беларусь сталася тым лятарэйным квітом, на які выпаў для нашага народу супэрпрыз – Незалежнасьць. Беларусь – імя нашага шанцу, і за яго нам трэба трымацца.

Чым больш чытаеш выказваньняў пра Беларусь, тым выразьней усьведамляеш, што гаворка ідзе пра розныя краіны. Сама мала

іх дзьве. Адна – Беларусь як задача, мэта. Другая Беларусь – дыягназ. Тых, хто спавядаюць першую Беларусь, адрозьнівае тэхналягічнасьць, рацыяналізм. Яны вылучаюць з гісторыі эўрапейскіх нацыяў узоры пасьпяховасьці, каб насьледаваць іх на беларускай глебе і, магчыма, пераўзысьці. Гэта браты Луцкевічы, Багдановіч. Іх адрозьнівае дух спаборнасьці і сацыяльнага аптымізму. Для другіх Беларусь – як радзімая пляма, таўро – назва іхных бядотаў – неразьдзеленае каханьне. Гэта Купала, Гарэцкі, Чорны. Апошніх – большасьць. Дубавец належыць да першых. Ён ведае сакрэт цуду і застаецца верным свайму альхімічнаму праекту.

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

№ 1,2 (41,42) - 2006

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/03/29

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image]-[image]2006

рэцэнзіі

"аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • **рэцэнзіі**

[image] [image] [image]

Сяргей Шыдлоўскі Нарцысізм ідэалёгіі

ЗЬМІЦЕР СЕРАБРАКОЎ

левы інтэлектуал. Выпускнік факультэту філязофіі Люблінскага каталіцкага ўнівэрсытэту. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – нарыс «Дзяцінаты год Лукашэнкіяны» (6/2005).

Основы идеологии белорусского государства. / Под ред. Н. С. Князева, с. В. Решетникова, Т. И. Абдуло. – Минск: Академия управления при Президенте, 2005.

Севярынец, Павал. *Нацыянальная ідэя. Фэнамэналёгія Беларусі.* – Рыга, 2005.

Дубавец, Сяргей. *Вострая Брама.* – Бібліятэка радыё «Свабода», 2005.

У разьдзеле рэкамэндаванай для абавязковага прачытаньня літаратуры да «Асноваў дзяржаўнай ідэалёгіі», выдадзеных Акадэміяй кіраваньня, пазначаная «Геніяльнасьць і вар’яцтва» Чэзарэ Лямбразо. Хто гэта растлумачыць і як гэта разумець? Геній у нас адзін, дакладней Адзіны, – гэта тое, што мусяць ведаць дзеці ў школах і дзіцячых садкох. Аднак у кніжцы італьянскага псыхіятра XIX стагодзьдзя Лямбразо ўсё ня так: дзе геній, там і вар’яцтва. Дык што гэта за намінкі? Хто кіруе намі? Падручнік не дае адказу на пытаньне, у ніводным з разьдзелаў няма згадак пра клінічнага дасьледніка геніяльнасьці. Альбо гэта прыхаваны знак для тых, хто любіць шукаць сэнс між радкоў, альбо промах укладальнікаў, якія не

знайшлі лепшага аўтара для ілюстраваньня беларускай ідэалёгіі, чым вышпамянёны доктар.

Але ж і Лямбразо далёка не адзіны адважны дасьледнік псыхічных хваробаў індывідуальнай і грамадзкай душы. Фройд цешыў сябе надзеяй, што ягоны псыхааналіз дапаможа габрэйскаму народу пазбавіцца архетыпу-комплексу віны за забойства прарокаў. Амэрыканскія соцыяпсыхолягі ставяць амэрыканскаму грамадзтву дыягназ «нарцысізм», як, напрыклад, прафэсар гісторыі Рочэстэрскага ўнівэрсытэту Крыстофэр Лэш у кнізе «Культура нарцысізму». Дэмакратычны і вытрымана ідэалягічна левы рэжысэр Майкл Мур у лялечным анімэ Трэя Паркера «Каманда Амэрыка» самазадаволена нарцысічны ня менш за эратычных лялек-камандас і лялек амэрыканскага прэзыдэнта. Драматург Артур Мілер за некалькі гадоў да сьмерці ў эсэ «Тэатар і палітыка» акрэсьліў здольнасьці апошніх двух прэзыдэнтаў ЗША як актораў і палітыкаў: Рэйган быў благім акторам, бо сваю ролю на палітычнай сцэне ўспрымаў надта сур'ёзна, а Клінтан – той наадварот: актор быў лепшы, бо адчуваў дыстанцыю між сабою й сваёй роляй. Гэтым самым тлумачыцца посьпех акторскага таленту Жырыноўскага і Лукашэнкі. У гуру маскоўскіх анархістаў Зьмітра Кастэнкі на стале партрэт Лукашэнкі, на палічках – аўтабіяграфія Кім Ір Сэна ў васьмі тамох. «Корейца Костенко любит по долгу лектора, а белоруса за то, что «он безбашенный совершенно» («Ночь длинных ножей», «Огонек», № 45, 2001). Застаецца пажадаць, каб сюжэт пра куміра антыглябалістаў ЛукаЧЭнку закупіў Дыснэй, тады тутэйшыя амэрыканафілы абавязкова палюбяць «дыктатара». Масавы герой – аб'ект жаданьня, праекцыя патаемных прагненьняў і памкненьняў прыгнечаных сацыяфобіяй аднамерных чалавечкаў.

У «Асновах ідэалёгіі» неспадзеўкі зьяўляецца згадка пра «нацыяналістычнае самалюбаваньне» як пра практыку, зь якой карыстаюць апазыцыйныя дзейснай уладзе нацыяналісты, практыку, ад якой ідэолягі адмовіліся як ад несумяшчальнай з тутэйшай мэнтальнасьцяй. Аляксей Маковец (вядомы як адзін з аўтараў кніжкі «Беларусь: сцэнары рэформаў» і аўтар «ARCHE» А. Екадумаў) на старонках газэты «Згода» заўважае гэтую рысу

ў дзяржаўных СМІ – радыё, тэлевізія й газэта «Советская Белоруссия» запэўніваюць грамадзянаў у бясьпецы, даючы той ідэнтыфікацыйны код, да якога яны прызвычаіліся (усё іншае – ідэалягічныя інсынуацыі). Бясплоднасьць выкарыстаньня такога ўнівэрсальнага пайма, як «нарцысічнае самалюбаваньне», у якасьці абвінавачаньня навідавоку: ніводны сацыяльны арганізм, які б не адлюстроўваўся ў чарадзейным люстэрку «хто на сьвеце найпрыгажэйшы?», ня здолеў бы праіснаваць. Славой Жыжак не дачакае адказу на сваё рытарычнае пытаньне «ці знойдзецца нацыя, гатовая прызнаць сваю другаснасьць?».

Доўгачаканы культурны прадукт – дзяржаўную ідэалёгію, ці, у іншай рэдакцыі, нацыянальную ідэю, выклікала зь небыцьця менавіта жаданьне падабацца самім сабе, «у-сьвеце». Ідэалёгія прапаноўвае, па сутнасьці, адказ на пытаньне «Хто мы?» – заўважым, адрозна ад пытаньня «Хто Я?», якое, насамрэч, азначае ўсё тое ж «хто на сьвеце найпрыгажэйшы» і не прадугледжвае адмоўнага адказу.

Нацыянальная ідэя ў выданьні Паўла Севярынца таксама адказвае на пэўнае «запатрабаваньне». Патрыёт – гэта чалавек, які любіць краіну, але ня любіць яе насельніцтва. Севярынцаў этнацэнтрызм у аснове сваёй мае Любоў да краіны і да народу – а любіць народ і не любіць урад не ўяўляецца магчымым з гледзішча лёгікі і здаровага сэнсу. Любоў увогуле рэч нерацыянальная і злая, таму любоў Севярынца разьмяркоўваецца наступным чынам: на першым месцы ў яго зямля, сажалкі, жывёлы і расьліны, на другім – культура і гісторыя, гістарычныя й культурныя постаці, а пасьля – прамысловасьць і спорт. Недзе ў разьдзеле пра прэзыдэнта-алімпійца Павал аддае належнае і кіраўніку краіны – здаровы мужчына, які прапагандуе спорт і здаровы лад жыцьця, за што ён падабаецца жанчынам.

Герой «Вострай Брамы» Сяргея Дубаўца (перадача «Пасаджэньне на кол») яшчэ належыць таму сьвету – сьвету дыхатаміі, процістаянньня, маніхейскага падзелу на чорнае і белае. Лукашэнка прэзэнтаваны як нашчадак казакоў, якіх лавілі і катавалі бязь сьледзтва шляхетныя прадстаўнікі

магнацкай эліты. «Нацыянальная ідэя» ў рэдакцыі Паўла Севярынца раўнае пратэстанта Сымона Буднага і дзеячаў Контрарэфармацыі. Можна параўнаць Севярынца з Дубаўцом яшчэ паводле адной неверагодна знакавай для Беларусі асобы – паэта і гісторыка Ўладзімера Караткевіча, які ў «Вострай Браме» выступае як «загадка». У чым «загадка» Караткевіча? Загадка ў яго паэзіі, у паэтызаваньні Беларусі такой, якой яна магла б быць, і такой, якая ёсьць, мроя паэта-рамантыка – містычная Белая Дама, зачараваная сурочым вокам Чарнакніжніка. У Дубаўца Караткевіч-паэт засланяе Караткевіча-гісторыка, які выкідвае з труны чэрап князя-крывасмока, які кідае войска Мужыцкага Хрыста на княскіх рыцараў і перамагае, бо адзінае, што было дазволена ў савецкі час гістарычнаму беларусу – гэта ўдзел у антыфэадальных паўстаньнях. Замілаваньне Дубаўца вялікакняскімі элітамі заносіць яго ў лягер праціўнікаў сялянскіх бунтаў, тых, каму Караткевіч прыпісаў парадыйны верш-эпіграму: *«І люба бачыць мне, як раб, што здуру кінуўся ў баі, бяжыць і кідае свой скарб, а войска гоніцца за ім!»* Караткевіч у пантэоне Паўла Севярынца – адзін з многіх, роўны сярод роўных, у сьпісе культурных герояў пасьля князя-ваўкалака Ўсяслава Чарадзея ідзе Станіслаў Шушкевіч (ёсьць месца і Машэраву). Калгас і шляхецкі засьценак упісваюцца ў адзіную гісторыю краіны. Гісторыя Дубаўца – гісторыя канфлікту, які яшчэ ня скончыўся, такая ж, як і гісторыя Беларусі ў рэдакцыі аўтараў «Асноваў ідэалёгіі». Візія Севярынца – не зусім эўрапейская ў традыцыйным сэнсе, ягоны іканастас моцна тхне капішчамі індыйскіх божышчаў, дзе паміж Вішну і Крышнам можна знайсьці выявы Хрыста і Марыі, прынесеныя руплівымі місіянэрамі. Справа Дубаўца – разьдзяляць, Севярынец яднае. Ідэалёгія Дубаўца – фэнтэзі на тэму контрарэфармацыйнага Срэбнага веку, ідэалёгія Севярынца – Нью Эйдж з будысцкай нірванай канца гісторыі.

Дзяржаўныя і недзяржаўныя ідэолягі так ці іначай выявілі прыхільнасьць да кансэрватызму ці якога навамоднага яго гатунку. Ключом да айчынных сцэнароў ідэалягічных маскарадаў можа быць спадчына рэфарматараў эўрапейскай думкі, гэтак званых «новых правых», французскіх інтэлектуалаў, якім пашчасьціла трапіць нават у «Асновы беларускай ідэалёгіі» ў якасьці «нэакансэрватараў». Прывабная на тле

ідэалягічнага вакуўму назва «Новыя кансэрватары» знайшла сваё ўвасабленьне як у дзяржаўных ідэолягаў, так і ў апазыцыйных існай дзяржаўнасьці соцыяканструктывістаў. Ален дэ Бэнуа, рэдактар «Элемэнтаў» і «Крызісу» напачатку 1990-х гадоў, асаблівую ўвагу зьвяртаў на расейскіх «чырвона-карычневых», якіх ён менаваў «бела-чырвонымі», што імкнуліся адрадзіць занядбаную бальшавікамі расейскую спадчыну ў спалучэньні з шырокай сацыяльнай праграмай. Расейцам імпанаваў дэкляраваны дэ Бэнуа «навуковы» расізм і рацыянальны антысэмітызм – аўтар «Як можна быць язычнікам» прапаноўвае новую Эўропу, пазбаўленую юдэйска-хрысьціянскай спадчыны, лічыць паганства супольнай плятформай для задзіночанай Эўропы. Цяпер, калі ў канстытуцыю Эўразьвязу не запісалі цьверджаньня пра хрысьціянскія карані Эўропы, «новыя правыя» выглядаюць прынамсі злавеснымі прарокамі.

Беларусь Вастрабрамская праграмна контрарэфармацыйна-каталіцкая; Сяргей Дубавец праводзіць культурную «зачыстку» беларускай гісторыі ад уплываў расейска-бальшавіцкай спадчыны: але канфэсія, як падаецца, ня мае для яго вялікага значэньня, галоўнае – шляхецкае паходжаньне. У адной зь перадачаў падкрэсьліваецца, што кальвіністам Радзівілам было даручана апякунства над праваслаўнай собскасьцю – царквой і брацтвам Пятра і Паўла, што, на думку аўтара, азначала вяршэнства факту шляхецкага паходжаньня над міжканфэсійнымі бар'ерамі. Але хутчэй гэта сьведчыць пра рэлігійную індыфэрэнтнасьць шляхты, якая ў пару так званага Залатога веку цягам аднаго пакаленьня здатная была тройчы мяняць веравызнаньне, пераходзячы з праваслаўя (веры бацькоў) у кальвінізм, а пасьля ў каталіцызм; калі б да турак было бліжэй, як у Сэрбіі, сытуацыя была б такой, як яе апісвае раман Вука Драшкавіча «Нож».

Тут, безумоўна, прыдалася б спасылка на доктара Лямбразо – так любага аўтарамі з Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнту. Яны не адмаўляюцца ад рэлігіі, паколькі праваслаўе надалей у большай часткі насельніцтва атаясамліваецца са структурамі ўлады, а нетрадыцыйныя канфэсіі традыцыйна палохаюць тую ж большасьць сваімі таталітарнымі памкненьнямі. Паганская

па сутнасьці сваёй Беларусь на чале з прэзыдэнтам-алімпійцам фармальна будзе заставацца хрысьціянскай краінай, зрэшты, як і ўся астатняя Эўропа. Павал Севярынец, які абвяшчаў крыжовыя паходы супраць піва «Балтыка», таксама запраграмаваны хрысьціянскі respecto, безумоўна, на карнэгіянскія тэхналёгіі.

Дэмаркацыйная лінія пад назовам «Антыамэрыканізм» разьдзеліць дзьве амаль аднолькавыя паловы згаданых ідэолягаў: «Новыя Правыя» выступаюць за Эўропу без Макдоналдсаў і Мікі Маўсаў, беларускія ідэолягі паводле савецкай звычкі яшчэ пабрэхваюць на амэрыкосаў: ім далёка да дубаўцоўскай апалягетыкі ЗША як апірышча дэмакратыі. Амэрыка – не імпэрыя, яна «змагаецца супраць імпэрыяў, каб у кожнай краіне была свая дэмакратыя». Але гэтае цьверджаньне, абсалютна прымальнае для ўпэўненых у слушнасьці дзеяньняў Кангрэсу ЗША журналістаў радыё «Свабода», ёсьць балючай праблемай для заходніх інтэлектуалаў:

Аднойчы ранкам Прынцэса Леа і Люк Скайўокер прачхнуліся і сказалі: «Мы больш не Рэспубліка. Мы – Імпэрыя. Мы – крутыя хлопцы і дзяўчаты…»

Славой Жыжак, «Revenge of Global Finance»

Розьніца паміж «правымі» і «левымі» з 1993 году пасьля прынароднага выступу Алена дэ Бэнуа, які сказаў, што няма правых і левых, а ёсьць цэнтар і пэрыфэрыя, застаецца размытай амаль да заціраньня. «Новыя правыя», якія на мяно «правых» не прэтэндуюць, галоўным ворагам называюць постасьветніцкі эгалітарызм. Іх слоган сфармуляваў Люі Павэль: жыць як да 1789 году і як пасьля 2100-га. Амэрыканізм Дыснэйлэнду паводле Алена дэ Бэнуа азначае колькасны эгалітарызм, дзе мера ўсяго – грашовая азнака супраць элітарызму якасьці. Сьвет Дыснэйўорлду – гэта праекцыя «амэрыканскай» сьвядомасьці, інфантылізаванага спажыўца на спакойны і мірны сусьвет-супэрмаркет.

Радыкальныя высновы французскіх інтэлектуалаў узмацняе Эржбэта Салаі, вугорскі эканаміст і сацыёляг. У сваёй працы

«Post-Socialism and Globalization» (Budapest, 1999), абапёртай на аналізе сучасных працэсаў капіталізацыі і глябалізацыі ў Вугоршчыне, яна адзначае факт разбурэньня індывідуальнасьці пры капіталізьме насуперак штампу, які склаўся ў постсавецкіх краінах, што менавіта сацыялістычная сыстэма задушыла ў людзёх усё творчае, асабістае, індывідуальнае, ператварыла ў шрубочкі і шасьцяронкі. На яе думку, сёньняшні гэтак званы «новы капіталізм», канцэнтраваны і глябалізаваны, і ёсьць беспасярэдняй пагрозай асобе і творчасьці, бо за адсутнасьцю асобы свабода і творчасьць ператвараюцца ў фікцыю, асоба ня мае ідэнтычнасьці, якая разбураецца пад націскам працэсаў глябалізацыі, што пад лёзунгам індывідуалізацыі прапаноўвае хутчэй атамізацыю і адчужанасьць.

Сацыяльная структура, што склалася ў новых капіталістычных краёх, характарызуецца няроўнасьцю, перадусім няроўнасьцю магчымасьцяў, больш за тое, гэта няроўнасьць мае спадкаемны характар. Узьнікае заблякаванае грамадзтва – тое, дзе практычна адсутнічае альбо мае вельмі нізкую роўню вэртыкальная сацыяльная дынаміка, дзе значная частка насельнікаў знаходзіцца па-за межамі сацыяльнай інтэграцыі.

«Асновы ідэалёгіі» прэзэнтуюць дыскурс рэальнай улады, левы, эклектычна-зьменлівы і здрадлівы. У іх Беларусь пакуль адна ўва ўсёй Усходняй Эўропе назірае за правалам палітыкі падаткаабкладаньня фінансавага капіталу, падзеньнем рэальнага кошту заработнай платы, скарачэньнем працоўных месцаў, адыходам ад прагрэсіўнай шкалы падаткаабкладаньня, паскарэньнем рэформаў прыватызацыі сацыяльнай сфэры (адукацыя, ахова здароўя) – усяго, што адпавядае інтарэсам і нават патрабаваньням глябальнага капіталу. Эстэтычныя гісторыясафізмы Дубаўца і нацыянальная ідэя Севярынца застануцца інтэлектуальным экспэрымэнтам, прадметам вывучэньня вузкага кола адмыслоўцаў.

Сама ж ідэалёгія і надалей працягне жыць у форме адчужанай культурнай спадчыны, што не дае духовых сілаў, а наадварот, спрычыняе раздражненьне й агіду атамізаванага індывіда, прададзенага культурнымі, эканамічнымі, бюракратычнымі і ўсімі іншымі элітамі.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/29
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image]-[image]2006

рэцэнзіі

ад Зыкату

ўдалітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура •

рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Даніла Жукоўскі

Scripta manent

Gimpelevich Zina. *Vasil Bykau, His Life and Works.* – Montreal and Kingston: McGill-Queen’s university press, 2005.

Ёмісты том на англійскай мове, прысвечаны Быкаву, не можа не зацікавіць. Але адно – перагартаць, зусім іншае – прачытаць. Кніга спадарыні Гімпелевіч валодае той асаблівасцю, што яе без высілку дачытваеш да апошніх старонак. Гэта тым больш нечакана, што чытача, які занадта даверыцца назве, чакае расчараванне: works прадстаўленыя добра, аднак life займае не настолькі шмат месца, каб прэтэндаваць на месца ў назве. На мой густ, кніга павінна б называцца «Уводзіны ў творчасць Васіля Быкава».

У пранізлівым уступе (наймацнейшыя старонкі ў кнізе) аўтарка трапна і пераканаўча характарызуе Быкава як пісьменніка, які стаў голасам пакалення яе бацькоў, пакалення, выцерабленага вайною, людзей, на шмат гадоў пазбаўленых нармальнага жыцця, паўнавартаснай адукацыі, траўмаваных вайною што фізічна, што псіхічна. У наступным раздзеле, грунтуючыся на шырокавядомых у Беларусі ўспамінах пісьменніка, яна апісвае дзяцінства і юнацтва свайго героя, ягоную шматгадовую вайсковую службу. На гэтым біяграфічная лінія перарываецца, каб паўстаць у канцы кнігі ў выглядзе кароткага аповеду пра

апошнія гады жыцця пісьменніка, і наперад выступаюць тэксты. Ідучы па старонках шасцітомнага выдання твораў і пазней выдадзеных кніг нават там, дзе выдаўцы не вытрымалі храналогіі, Зіна Гімпелевіч паслядоўна ўводзіць нас у свет герояў Быкава, падобны, але, як мы ведаем, не ідэнтычны (хаця б таму, што ён нашмат вузейшы) свету, у якім пражыў жыццё сам аўтар «Сцюжы» і «Трэцяй ракеты».

Задума аўтаркі спачатку не выклікае захаплення. Яна разбірае тэкст за тэкстам, старанна пераказвае сюжэт, сцісла тлумачыць малазнаёмыя заходняму чалавеку савецкія рэаліі. Меркаванні крытыкаў прадстаўляе ў мінімальным аб'ёме, да таго ж абмяжоўваючыся чыста мастацкімі пытаннямі. Грамадскі рэзананс, які для беларускага чытача і сучасніка ёсць неад'емнаю часткаю панятку «кніга Васіля Быкава», застаўся па-за разглядам. Адзіная асабістая рыса пісьменніка, на якой спыняецца спадарыня Гімпелевіч – ягоная беларускасць, якую яна пераканаўча паказвае ад першых апавяданняў да публіцыстычных артыкулаў і прыпавесцяў апошніх гадоў. Адзіная рыса палітычных перакананняў – антысталінізм. Агульныя меркаванні пра творчую манеру пісьменніка, эвалюцыю ягоных поглядаў не ідуць далей за інфармаванне пра ягоную прыналежнасць да «лейтэнанцкае прозы», зацікаўленасць французскім экзістэнцыяналізмам і зварот у познія гады да жанру прыпавесці. Большая частка кніжнай прасторы аддадзеная не асобе мастака слова і ягонаму асяроддзю, але асобам і суплётам лёсу ягоных герояў.

Тым не менш, нешта перашкаджае лічыць «Life and Works» дапаможнікам для лянівых студэнтаў-філолагаў, памылкова выдадзеным па-ангельску. Хутчэй за ўсё, гэта глыбокая і шчырая зацікаўленасць аўтаркі, абмежаванні якой паставілі, хочацца думаць, акадэмічныя патрабаванні да ейнае працы. Выклікае станоўчыя пачуцці тое, што спадарыня Гімпелевіч не забылася згадаць пра асаблівасці ролі расійскае мовы ў літаратурным лёсе Быкава і ягоных твораў, пра адрозненні паміж беларускамоўнымі і расійскамоўнымі выданнямі, а таксама ейнае паслядоўнае ўжыванне беларускіх назваў, імёнаў і словаў.

Што ж тычыцца ізаляванага разгляду твораў без гістарычнага ды іншага кантэксту, то думаецца, для таго ёсць тлумачэнне. Для далёкага ад былога СССР чытача Быкаў ёсць і, галоўнае, будзе менавіта тым, што ўяўляюць сабою ягоныя творы. Няма сумневу, што сапраўдная біяграфія гэткай яскравай асобы была б цікаваю чытанкаю, дазволіла б чытачу даведацца шмат пра век, час і эпоху, але гэта была б зусім іншая праца. Галоўнае ж –біяграфія, якая магла б у нейкай ступені папулярызаваць асобу, непазбежна б адсунула ў цень творы. У гэткай гіпатэтычнай кнізе было б больш таго Быкава, які быў, але менш – таго, які ёсць і застанецца.

Махмуда Газнэві памятаюць з аднае прычыны – гэты валадар не ацаніў, як належала, працу геніяльнага Фірдоўсі, складальніка «Шах-намэ». Кніга спадарыні Гімпелевіч – магчымасць зірнуць на дарагога нам пісьменніка і чалавека вачыма будучыні, калі суцішацца савецка-постсавецкія жарсці і сучасныя палітычныя фігуры і баталіі будуць успрымацца гэткім самым чынам. Дзякуючы ёй мы можам зрабіць гэта сёння: зірнуць і суцешыцца.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/29
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

рэцэнзіі

1,2[image]-[image]2006

"аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • **рэцэнзіі**

[image] [image] [image]

Аксана Бязлепкіна Дакторка Югася, альбо Як здабыць літаратурную нішу

АКСАНА БЯЗЛЕПКІНА літаратурны крытык. Дэбютавала таголета ў «ARCHE» сваім эсэ «Амбітная літаратура». Мае ў даробку кнігу прозы «Ляўша на тэнісным корце» і кнігу крытыкі «Разам і паасобку: Таварыства «Тутэйшыя».

Каляда Югася. *Галоўная памылка Афанасія.* – Менск: Мастацкая літаратура, 2005. – 206 с.

«Або крызіс у прыватным жыцці, або творчы крызіс», – зацята паўтарала Муза, прыдуманая Югасяй Калядой. Зрэшты, гэта і сапраўды не найгоршы творчы сцэнар: разбуральнае ўздзеянне рэальнага жыцця трансфармаваць у стваральны акт творчасці. Гэта так жыццесцвярджальна: з хаосу сваіх пачуццяў і думак стварыць мікракосм мастацкага твора. *І калі я дацягну свой смутак дадому, я паспрабую ператапіць яго ў натхненне.*

У трылогіі «Лета» смутак пераплятаецца эмоцыямі і пачуццямі, і чытач нібы прысутнічае пры іранічнай споведзі, калі прапануецца толькі адна версія падзей, магчыма – праўдзівая, магчыма – не, але ў кожным разе чытанне перацякае ў квазісяброўскае камунікаванне: размова выходзіць такой, якой часта і бывае ў рэальным жыцці – маналагічнай, нястрымнай і мазаічнай.

Калі ў стылёвай плыні трылогіі «Лета» ўстаўныя сюжэтныя аповеды выглядаюць своеасаблівымі выспамі і іх прыхільнікамі стануць чытачы, для якіх важней, *як* напісаны твор, то аповесць «Invicta, альбо Галоўная памылка Афанасія» задаволіць густы аматараў сюжэтнай прозы. Неідэальныя гераіні *густоўна, прыстойна, далікатна, вытанчана* спрабуюць адпомсціць за нешчаслівае каханне адной з іх праз напісанне апавядання (хаця складана вызначыць, у чым палягала віна хлопца: ці то ў ягонай нячуласці, ці то ў тым, што ён стаў аб'ектам неўзаемнага пачуцця). А вось напісанае імі апавяданне, героем якога і стаў Афанасій, прасякнута монтэ-крыстаўскім матывам справядлівай помсты: мужчына атрымлівае заслужаную кару за выкарыстанне напрацаваных тэхналогій у такой нерацыянальнай сферы, як каханне, уласна кажучы, за няздольнасць кахаць. Адпомсцілі дзяўчаты ўсё ж недалікатна, на што як аўтаркі мелі права: літаратар мае магчымасць адчуць сябе дэміургам для сваіх герояў, цалкам усведамляючы раённасць маштабаў свайго сусвету:

– Божа! – нячутна ўзмаліўся ён. <…> – Нашто ты стварыў мяне? <…>

Які ты дурны, Афанасі. <…> Гэта я стварыла цябе.

Гераіні Югасі Каляды (і з трылогіі, і з аповесці) выбіраюць для сябе не папулярныя пасіўныя ўцёкі ад жыцця праз чытанне чужых раманаў, але актыўны эскейпізм першага ўзроўню. Нават не эскейпізм, бо гэта ж зусім не ўцёкі. Гэта атака! Амаль аперацыйнае ўмяшальніцтва ў жыццё.

Усе мае наступныя візіты ў Кантору ператварыліся ў суцэльнае нервaванне ды калаценне рук, сэрца і каленяў: сустрэну ці не сустрэну? <…> Ну натуральна, што не сустракала – ён рэдка выходзіў з кабінета. І мой спачатку добры настрой змяніўся нечым, вельмі падобным да псіхозу. <…> Мне такі расклад не падабаўся. Я была сабой вельмі незадаволеная. Ёлкі-палкі, ну колькі можна! <…> Я пачала з гэтым змагацца. Я завяла дзённік, дзе штовечара прагназавала наступны дзень. Я

здзекавалася ды смяялася сама з сябе, бязлітасна апісваючы ўсе мае пачуцці ў залежнасці ад меркаваных падзеяў наступнага дня. <…> Я прэпаравала свае эмоцыі, як патолагаанатам. Я малявала схемы ды графікі. Праз месяц я ўжо мела ўсе стэрэатыпы маіх пачуццяў ды паводзін. Я складала іх у табліцы: «Стандартны дзень без паездкі ў Кантору», «Нервовы дзень з паездкай у Кантору без сустрэчы з Рэвізорам», «Звышнервовы дзень майго сутыкнення з Рэвізорам у бухгалтэрыі», «Супернервовы дзень майго беспасярэдняга сутыкнення з Рэвізорам з нагоды пералічэння рахунку. Здараецца раз на месяц». Праз два месяцы я адчула, што нешта змяняецца.

Гераіні Югасі Каляды – асобы звышэмацыянальныя, для якіх творчасць – гэта спосаб выпускання пары, спосаб накіроўвання лішняй энергіі ў сацыяльна прымальнае рэчышча. Фантазіяванне на паперы для іх – як пусканне крыві, што некалі практыкавалася дактарамі, і «творапусканне» ратуе гераіняў кнігі ад жыцця і адначасова вяртае іх у жыццё.

«Я адчуваю сябе багіняй», – кажа гераіня Югасі Каляды пасля акту творчасці. «Для чалавека творчасць – спроба пабыць Богам», – пацвердзіла Югася Каляда на прэзентацыі кнігі.

Хай сабе гэта не адкрыццё, але напраўду выратавальная пазіцыя для чалавека, які верыць, што народжаны для шчасця, ды чамусьці адчувае сябе няшчасным. У літаратурнай творчасці *Сусвет няспраўджаных жаданняў* перараджаецца ў прастору, дзе ўсё магчыма. Гераіні кнігі (як і рэальныя чытачкі) не могуць змусіць сябе закахацца альбо змусіць некага закахацца ў іх, іхняя актыўнасць не сягае так далёка, каб даць выспятка таму, хто меў неасцярожнасць іх пакрыўдзіць. Але – фантазія плюс папера і асадка (як варыянт – камп'ютэр) – і вось ужо крыўдзіцель складваецца напалам ад удару ботам. Навідавоку тэрапеўтычная функцыя літаратуры – і для аўтара, і для чытача.

На сайце Litara.net ішло вельмі актыўнае і вельмі страснае (аж да пераходу на асобы) абмеркаванне кнігі «Галоўная памылка Афанасія». Адна з удзельніц дыскусіі адзначыла інфантыльнасць гераіняў, маўляў, у 20 гадоў паненкі мусяць

быць іншымі. Іх неўтаймоўная экзальтаванасць сапраўды можа здавацца недарэчнай альбо нават смешнай. Ды варта толькі азірнуцца – і лёгка заўважыць, што ў школах, універсітэтах, у кавярнях і на канцэртах нас атачаюць іх *браты і сёстры па эмоцыях*. Тыя, хто штовечара спавядаюцца ў сваіх папяровых ці віртуальных дзённіках. Найноўшыя тэхналогіі далі магчымасць кожнаму, хто мае патрэбу, спраўджвацца ў сеціве. Я не кажу, што аматары пачуццяў без адчуванняў і ёсць героі нашага часу, але яны ёсць.

Вызначаць адпаведнасць людзей іх узросту – клопат псіхолагаў, але гэтая згадка пра інфантыльнасць падштурхнула мяне да наступнага пытання: хто яны, чытачы кнігі Югасі Каляды? У мяне адказ выйшаў такі: гэта маладыя людзі альбо людзі, якія памятаюць сябе маладымі (і больш верагодна, што гэта дзяўчаты, бо як напісаў мне ў эсэмэсцы знаёмы хлопец, адзін з чытачоў кнігі «Галоўная памылка Афанасія»: «Я з цяжкасцю пераношу жаночыя развагі»).

Ва ўсіх людзей бываюць узроставыя праблемы, якія на момант свайго ўзнікнення падаюцца невырашальнымі. А праз дваццаць год будзе смешна, што фізкультура – галоўны прадмет ва універсітэце і што нейкі там хлопец не пазваніў. Хтосьці памятае тыя свае перажыванні ці, прынамсі, разумее іх – гэта чытачы Югасі Каляды. А хтось грэбліва паглядае з вышыні ўзросту і забытага досведу – гэта чытачы іншых кніжак.

Для маладога пісьменніка, які піша не псеўдафіласафічныя нататкі, а творы пра сябе і сваіх раўналеткаў, самым небяспечным з'яўляецца ўзроставы снабізм дарослых ці тых, хто сябе такімі лічыць. «Што новага яна мне адкрые?» і «Пісаць прозу да трыццаці год бессэнсоўна». А чытаць? Што чытаць падлеткам і моладзі? Ка-рат-ке-ві-ча? Яго якраз чытаюць і без нашых парад. Хіба што зацяты фанат творчасці класіка праглыне ўсе ягоныя раманы і аповесці за год максімум. Прыхільнікі гістарычнай прозы знойдуць сабе чытанкі яшчэ гадоў на пяць. А потым? А калі не аматары гістарычнага? Калі ўлічыць, што літаратурныя густы людзей на працягу жыцця кардынальна не мяняюцца, то робіцца відавочным, што беларуская літаратура можа цалкам задаволіць чытацкія

патрэбы толькі аматараў вясковай і ваеннай прозы: каб на ўсё жыццё хапіла чытаць з улюбёнага.

Ганна Кісліцына ў адным з інтэрв'ю аднесла кнігу Югасі Каляды (як, дарэчы, і маю «Ляўшу на тэнісным корце») да падлеткавай літаратуры (як кажуць у такіх выпадках – «для старэйшага школьнага і малодшага студэнцкага ўзростаў»). З гэтай нагоды народ у беларускамоўным сеціве пачаў пакепліваць. А дарма: ніша вольная. Дзяцінства сённяшняй моладзі прыпала на беларусізацыю, многія з шаснаццаці-дваццацігадовых проста прагнуць беларускіх кніжак. Беларускамоўных кніжак наогул – не маючы права на пераборлівасць і дагаджэнне ўласным густам.

Напраўду, што можна прапанаваць пачытаць «няіснаму сярэднестатыстычнаму» падлетку падлеткавага – рамантычнага, вясёлага, прыгодніцкага? Маладому чалавеку наогул? За апошняе трыццацігоддзе наша «моладзевая літаратура» прыдбала «Бацьку ў калаўроце» Рыгора Семашкевіча, «Гісторыю хваробы» Андрэя Федарэнкі, «Белы мурашнік» Пятра Васючэнкі, «Ноч пацалункаў незалежнасці» Алеся Наварыча і некаторыя іншыя. Складана сказаць, чаму тады, напрыканцы 1980-х, не заснавалі серыю літаратуры для моладзі. Верагодна, паўторыцца сітуацыя, якая адбылася з дэтэктыўнай літаратурай: серыю заснавалі не тады, калі ў ёй была пільная патрэба і калі з'явіліся першыя тэксты беларускіх аўтараў, а ў 2004 г., у часы перанасычанасці рынку расійскамоўнымі дэтэктывамі.

Чаму наш літаратурны працэс такі грувастка-павольны? Фантастыка Андрэя Паўлухіна прабівалася ў друк з неверагоднымі цяжкасцямі і ўрэшце пабачыла свет у расійскамоўным варыянце. У іншай літаратуры Алена Брава напісала б пра кубінскую спёку і жарсць не адзін твор, а шэраг: пакуль не вычарпала б дарэшты чытацкую цікавасць. Нумары «Маладосці» з раздзеламі «Тэолага» Максіма Клімковіча і Уладзіміра Сцяпана немагчыма набыць – разбіраюць. А «Тэолаг-2» выйдзе ў друк толькі ў 2006 г. А як жа «касі, каса, пакуль раса»?

У незапоўненай нішы моладзевай літаратуры ў «Галоўнай

памылкі Афанасія» Югасі Каляды ёсць усе шанцы стаць настольнай кнігай для тых чытачак, якім у чаканні тэлефоннага званка ад каханага патрэбна падтрымка ў выглядзе аптымістычнай гісторыі пра недарэчнага і ленаватага анёла-ахоўніка.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/29
[image]

[redacted]ей

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image]-[image]2006

"да Зьмітуш"

рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ВІКТАР КОРБУТ

Віктар Корбут Сыны і пасынкі ВКЛ

журналіст. Супрацоўнічаезь дзяржаўнымі і недзяржаўнымі выданьнямі. Апублікаваў летась у «ARCHE» агляд «Культура вайны».

Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя: У 2 т. Т. І. – Мн., 2005. – 688 с.

Мы сёння ганарымся, што Вялікае Княства Літоўскае было «домам», так бы мовіць, нашых продкаў, што Беларусь была геаграфічным цэнтрам ВКЛ (замоўчваючы, што палітычным была ўласна Літва). Гэтае нашае сённяшняе ўспрыманне таго часу, вядома ж, не пазбаўлена рамантычнага ідэалізму. Усякае было ў ВКЛ – бо то быў не рай на зямлі, а адна з формаў існавання тутэйшага люду, як да ВКЛ такімі формамі былі рускія і нярускія княствы ў «пабалцкай» Паўночна-Усходняй Еўропе, невядомыя нам грамадскія формы «дарускай», далетапіснай, дагістарычнай Беларусі. Як і ўсякае было і пасля ВКЛ. Але з той гісторыі, што помніцца, з яе дзесяці, груба адмяраючы, вякоў, ВКЛ займае больш за палову. Дзесьці *там* шукаюцца вытокі беларускай ідэнтычнасці, мовы, высокай культуры. Нацыянальны гонар выводзіцца *толькі* з ВКЛ. Статут беларускай дзяржаўнасці – гэта Літоўскі Статут, бо ён – гэта ідэал Закону, узор кадыфікацыі мовы, Запавет для цэлага народу.

Якое ж месца *нашых* продкаў у ВКЛ? На гэтыя пытанні хацелася

б знайсці адказы ў незвычайным для цяперашняга часу выданні – двухтамовай энцыклапедыі «Вялікае княства Літоўскае». Першы яе том выйшаў у пару, калі дачыненні між Беларуссю і Літвою, маткаю і галоўнаю спадкаемніцаю ВКЛ, яго поўнаю цёзкаю, заставаліся досыць напружаныя. Аб'ект увагі кнігі – *«старажытная Беларуска-Літоўская дзяржава»*. Чаму Беларусь і Літва доўга былі *разам*, але сёння яны *паасобку*? Адказ на гэтае пытанне чытач мае знайсці сам.

(Цікава было б уявіць, як магла б выглядаць такая ж энцыклапедыя пра Расійскую імперыю, якую, праўда, нават пры вялікім жаданні Беларуска-Расійскаю дзяржаваю не назавеш. Іначай кажучы, мы бачым парадаксальную карціну: у варунках яднання Беларусі і Расіі выходзіць кніга, што сведчыць пра больш арганічную лучнасць Беларусі з Літвою, а ў больш шырокім кантэксце – яшчэ і з Польшчаю, Украінаю, а ўвогуле – з рэштаю Еўропы, але ж зусім не з Расіяй!)

Ідэалагічнае значэнне кнігі відавочнае. Але важны, між тым, не кан'юнктурны падтэкст – «антырасійскі», а дакладней – непрарасійскі. Важна, што пастулюе кніга: і не звонку, а з сярэдзіны. Тое, што вокладка першага тому аздобленая акварэллю літоўскага мастака Юозапаса Камараўскаса[1] з выяваю віленскай рэзідэнцыі вялікіх князёў, а не краявідам якога-небудзь беларускага (у сучасным разуменні) горада ў колішнім ВКЛ. Кніга «выслізнула» з-пад кан'юнктуры «ідэалогіі беларускай дзяржавы»[2].

Але ці выслізнула з-пад ідэалагізацыі агулам? Возьмем артыкул Анатоля Грыцкевіча «Гісторыя» ва ўводнай, «манаграфічнай» частцы энцыклапедыі, дзе розныя аўтары характарызуюць агульныя заканамернасці развіцця ВКЛ, ад яго ўтварэння да скону, ад культуры да гаспадаркі.

«Ядром ВКЛ пры яго ўтварэнні ў сярэдзіне 13 ст. былі Вось землі верхняга і сярэдняга Панямоння і землі па верхнім цячэнні Віліі», – сцвярджае Анатоль Пятровіч. Калі б фраза была дапоўнена паясненнем: *«паводле меркавання шэрагу беларускіх гісторыкаў, прыкл., М. Ермаловіча, А. Краўцэвіча»*, можна было б згадзіцца з гэтаю фармулёўкаю. Але ж чаканага ўдакладнення няма. Голы «факт». Такі ж «факт», як і тое, што *«ўтварэнне ВКЛ*

[1] Вось

з цэнтрам у Новагародку адносіцца да 1240-х гг., калі тут запрашэнні мясц. баяр тут стаў княжыць Міндоўг» (пад ім Але літаральна праз старонку мы бачым досыць падрабязную карту «пад артыкул» А. Грыцкевіча – «Вялікае княства Літоўскае ў XIII – першай палове XIV ст.». Яе аўтар – вядомы даследнік палітычнай гісторыі ВКЛ Вячаслаў Насевіч – навуковец, што істотна. Ён паказвае і *«непасрэдныя ўладанні «старэйшай» літоўскай дынастыі – «Літоўскую зямлю» 1245 гг.»*, якая ахоплівае ў асноўным сярэдняе і ніжняе цячэнне Вяллі (Нярыс) і часткова сярэдні Нёман (Нямунас), і *«тэрыторыю, непасрэдна падуладную Міндоўгу каля* зн. акрэсленая Літоўская зямля плюс далучаныя землі поўдні – з Гораднам, Ваўкавыскам, Слонімам ды Новагародкам). В. Насевіч – прызнаны аўтарытэт: і як картограф, і як гісторык. Тое, што на ягоныя карты спасылаюцца і літоўскія гісторыкі, сведчыць пра іх грунтоўнасць і аб'ектыўнасць[3].

Такім чынам, або мы маем справу з нейкімі двума аўтарытэтнымі меркаваннямі, або нехта – ці В. Насевіч, ці А. Грыцкевіч – памыляецца. Новагародак не фігуруе ў В. Насевіча як «сталіца» ВКЛ, пагатоў далучаны да Літоўскай зямлі ён быў толькі *«каля 1250 г.»* – значыць, каранацыя Міндаўга тут у 1240-я гг. сумнеўная, калі не сказаць немагчымая[4]. лакалізацыі пачаткаў ВКЛ, то прыведзеныя цытаты паказваюць усю супярэчлівасць успрымання гэтай падзеі беларускімі гісторыкамі. І калі спецыялісты «разбяруцца», паспаліты чытач застанецца ў неўразуменні. Або хутчэй паверыць не складанай карце В. Насевіча, а простым словам А. Грыцкевіча.

А. Грыцкевіч – выдатны абагульняльнік, ён добра піша, умее адсейваць факты – асноўныя ад дробных, чым і можна вытлумачыць выбар яго як «аналітычнага розуму» ў якасці аднаго з аўтараў энцыклапедыі. Між тым А. Грыцкевіч – адзін з аўтараў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (т. I–VI, Мінск, 1993–2003 гг.), вядомай сваім «нацыяналістычным» пафасам у асвятленні тэмаў, што тычацца літоўскага перыяду, асабліва ранняга, беларускай мінуўшчыны.

Між тым, акурат параўнанне ЭВКЛ з ЭГБ дазваляе сцвердзіць:

літам *што запрашэнні мясц. баяр тут стаў княжыць Міндоўг»* (пад ім Але літаральна праз старонку мы бачым досыць падрабязную карту «пад артыкул» А. Грыцкевіча – «Вялікае княства Літоўскае ў XIII – першай палове XIV ст.». Яе аўтар – вядомы даследнік палітычнай гісторыі ВКЛ Вячаслаў Насевіч – навуковец, што істотна. Ён паказвае і *«непасрэдныя ўладанні «старэйшай» літоўскай дынастыі – «Літоўскую зямлю» 1245 гг.»*, якая ахоплівае ў асноўным сярэдняе і ніжняе цячэнне Вяллі (Нярыс) і часткова сярэдні Нёман (Нямунас), і *«тэрыторыю, непасрэдна падуладную Міндоўгу каля* зн. акрэсленая Літоўская зямля плюс далучаныя землі поўдні – з Гораднам, Ваўкавыскам, Слонімам ды Новагародкам). В. Насевіч – прызнаны аўтарытэт: і як картограф, і як гісторык. Тое, што на ягоныя карты спасылаюцца і літоўскія гісторыкі, сведчыць пра іх грунтоўнасць і аб'ектыўнасць[3].

Такім чынам, або мы маем справу з нейкімі двума аўтарытэтнымі меркаваннямі, або нехта – ці В. Насевіч, ці А. Грыцкевіч – памыляецца. Новагародак не фігуруе ў В. Насевіча як «сталіца» ВКЛ, пагатоў далучаны да Літоўскай зямлі ён быў толькі *«каля 1250 г.»* – значыць, каранацыя Міндаўга тут у 1240-я гг. сумнеўная, калі не сказаць немагчымая[4]. лакалізацыі пачаткаў ВКЛ, то прыведзеныя цытаты паказваюць усю супярэчлівасць успрымання гэтай падзеі беларускімі гісторыкамі. І калі спецыялісты «разбяруцца», паспаліты чытач застанецца ў неўразуменні. Або хутчэй паверыць не складанай карце В. Насевіча, а простым словам А. Грыцкевіча.

А. Грыцкевіч – выдатны абагульняльнік, ён добра піша, умее адсейваць факты – асноўныя ад дробных, чым і можна вытлумачыць выбар яго як «аналітычнага розуму» ў якасці аднаго з аўтараў энцыклапедыі. Між тым А. Грыцкевіч – адзін з аўтараў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (т. I–VI, Мінск, 1993–2003 гг.), вядомай сваім «нацыяналістычным» пафасам у асвятленні тэмаў, што тычацца літоўскага перыяду, асабліва ранняга, беларускай мінуўшчыны.

Між тым, акурат параўнанне ЭВКЛ з ЭГБ дазваляе сцвердзіць:

Ка Гедыміна
1219–
1250 гг.
Вільні.
Намаляваў
графік сваю
карціну 10
мая 1894 г.
(паводле:
Drėma V.
Dingęs
Vilnius.
Vilnius,
1991. p. 110;
тамсама гл.
іншыя
рэканструкцыі
даўняй і
адлюстраванні
рэальнай
Вільні
аўтарства
гэтага ды
іншых
мастакоў
рознага
часу), калі
ні Ніжняга,
ні Верхняга
Замка
«жывымі» ён
не мог

першая перарасла другую. Вырасла пакаленне аўтараў, не абцяжаных псеўдапатрыятызмам. ЭВКЛ паказвае росквіт беларускай гістарыяграфіі ў агуле і ў прыватнасці. Сярод навуковых кансультантаў ЭВКЛ ёсць нават адзін літоўскі гісторык – Томас Баранаўскас[5]. Т. Баранаўскас напісаў 7 артыкулаў, сярод іх – біяграфіі літоўскіх гісторыкаў (дастаткова непадпісаныя, але, магчыма, таксама яго аўтарства). Для беларускай энцыклапедыі ўпершыню так шырока прадстаўленыя постаці літоўскіх даследнікаў суполкі мінуўшчыны.

Калі ўжо гаварылася пра карты, то апрача В. Насевіча ў гэтую дзялянку важкі ўклад зрабіў В. Цемушаў – ягоныя мапы, створаныя, відавочна, як на падставе напрацовак калегаў з суседніх краін, гэтак і на аснове ўласных знаходак. «Усходняя граніцы ВКЛ у канцы XV – першай трэці XVI ст.» (I, 369), «Вярхоўскія княствы ў канцы XIII – пачатку XVI ст.» (I, 477). Асабліва цікавая карта «Галіцка-Валынскае княства ў першай палове XIII ст.» (I, 484), што суадносіцца з разглядаемаю кагадзе тут Насевічаваю мапаю ВКЛ таго ж перыяду.

Мы звыклі бачыць на айчынных картах тэрыторыю паднейшай Заходняй Беларусі «падзеленаю» між Гарадзенскім, Новагародскім княствамі – незалежнымі або (нібыта) залежнымі ад Полацкага. Першая *беларуская* карта, паказвае стан справаў у гэтым рэгіёне з пачатку XIII ст. (бо што было раней – цяжка пэўна ўявіць[6]), блізкі да рэальнасці цемушаўская. Мы бачым, што сучасная Гарадзенская вобл. у 1205 г. належала да дзяржавы Рамана Мсціславіча з Гарадзенскім, Новагародскім ды іншымі ўдзеламі (княствамі), а ў 1263 г., год смерці Міндаўга, да Літвы, а вось цяперашняя Берасцейская вобл. заставалася ў руках галіцка-валынскіх князёў яшчэ вельмі доўга, першым увайшла ў склад ВКЛ.

Артыкул пра Галіцка-Валынскае княства напісаў Валеры Пазднякоў. Адзін з яго найбольш цікавых і «гарачых» артыкулаў – «Вільня»[7]. Віленская тэматыка займае ў энцыклапедыі досыць значнае месца (I, 408–444) і, на жаль, не заўсёды адпавядаецца сучаснаму паноўнай ідэалогіі. Праўда, наклад – 3000 экз. – адразу абмяжоўвае чытацкую аўдыторыю ЭВКЛ – як у Беларусі, так і за мяжою.

[5] Параўн.: прыкл.: Baranauskas T. Lietuvos valstybės istakos.

І таму яшчэ больш дзіўна выглядае не толькі выхад кнігі у дзяржаўным выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя», але і – і найперш гэта ўражвае – тое, што «выпуск выдання ажыццёўлены па заказу і фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь». Міністэрства, што выконвае функцыі былога Галоўліта, дае «зялёнае святло» прадукту, не зусім адпаведнаму паноўнай ідэалогіі. Праўда, наклад – 3000 экз. – адразу абмяжоўвае чытацкую аўдыторыю ЭВКЛ – як у Беларусі, так і за мяжою.

[6] Параўн.: прыкл.: Baranauskas T. Lietuvos valstybės istakos.

[7] Параўн.: прыкл.: Baranauskas T. Lietuvos valstybės istakos.

раўленасць «Віды» Ю. Самаўскаса – ўсе гэтыя (і некаторыя падрэнты, што яшчэ бачылі тое-сёе з вялікакняжацкай старасвецчыны жыўцом. Дарэчы, цяпер у Вільні адбудоўваецца нізкі замак, а таксама абмяркоўваецца ідэя рэканструкцыі Субачаўскай мескай брамы, разбуранай за царскай Расіяй.

Вільнюс, 2003. с. 172; Насевіча В. Тэрыторыя і межы Вялікага Княства Літоўскага // Атлас гісторыі Беларусі. Вып. 1. Ад старажытнасці да пачатку XVI стагоддзя. Мінск, 2009. с. 172–173; Насевіч В. Тэрыторыя і межы Вялікага Княства Літоўскага // Атлас гісторыі Беларусі. Вып. 2. Ад пачатку XVI стагоддзя да 1795 года. Мінск, 2010. с. 20–21; Nasevičius V. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės teritorija ir sienos // Lietuvos istorijos atlasas. Vilnius, 2001. c. 12 («Mindaugo karalystė XIII a. II pusėje»), 14–15 («Lietuvos Didžioji Kunigaikštystė XIII a. – XV a. viduryje»), Gudavičius E. Lietuvos istorija iki senaisių laikų iki 1569 m. – Vilnius, 2001. Priedas. Žemėlapiai («Lietuvos Didžioji Kunigaikštystė XIII a. – XV a. viduryje»).

Крыніку тэорыі «сталі пласт» Новагародку гл.: Баранаўскас Т. Новогрудок в XIII в.: история и миф // Castrum, urbis et bellum: Зборнік навуковых прац. Баранавічы, 2002. с. 29–44; Баранаўскас Т. Месца каранацыі Міндоўга // Спадчына. 2002. № 5–6. с. 26–31.

На жаль, насуперак заяве, што у стварэнні энцыклапедыі бяруць удзел не толькі «*вядомыя вучоныя Беларусі*, але і *навукоўцы з Літвы, Украіны, Польшчы і Расіі*» (I, 5), артыкулы апошніх амаль непрыкметныя на беларускім фоне. Апрача літоўца Т. Баранаўскаса замежжа ў рэдкалегіі прадстаўлене толькі Мікалаем Нікалаевым, беларуе паводле нараджэння, з Санкт-Пецярбурга.

Трыюлізны племянны падзел гэтай тэрыторыі да сярэдзіны XIII ст. гл.: Lietuvos istorijos atlasas. c. 10–11; параўн.: Дзярмант А. Крывічы // Гістарычна-этнагенетычныя нарысы // Druvis. 2005. № 1. с. 20 (карта «Тэрыторыя рассялення полацка-смаленскіх ды пскоўскіх крывічоў (IX–XII стст.)»).

7 Суперпатрыятычнасць некаторых пасажаў аналагічнага артыкула ЭГБ (параўн. пачатковую гісторыю горада: Ткачоў М., Галяронак С., Ліс А., Сакалова М., Шаўцоў Ю. Вільня // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Г. ІІ. Мн., 1994. С. 292–293) кантрастуе з навуковай і грунтоўнасцю ЭВКЛ.

Тэкст В. Насевіча «Тэрыторыя, адміністрацыйны падзел» энцыклапедычна сціслы і адначасова змястоўны. Асабліва каштоўныя ягоныя падлікі працэнтнага стасунку розных тэрыторый у складзе ВКЛ: пачаткова ВКЛ складалася з трох частак: зямлі Літоўскай (64 тыс. км2), Жамойцкай (27 тыс. км2) і Новагародскай (23 тыс. км2), чыста балцкая, або

Разам з Вільняю, *горадам з літоўскімі (к.ж.) жыхарамі, хто ведаў*, у іншых гарадах разглядаюцца іншыя літоўскія (а таксама ўкраінскія і, напэўна, польскія, расійскія, татарскія) гарады, што адпавядае канцэпцыі вядання – ахапіць усё ВКЛ, не толькі яго «беларускую» частку. Прынцып напісання тапонімаў выбраны паводле тых формаў, што існавалі ў часы ВКЛ і ўжываліся ў пісьмовых крыніцах на (старабела)рускай мове княства. Гэта досыць цікавы, эксперыментальны падыход, хоць ён, мабыць, не заўсёды апраўданы. Напрыклад, у артыкуле «Ашмяны» выклікае сумненні правільнасць напісання другаснай формы назвы гэтага паселішча – *Ашмена* (I, 269) – на карце М. Спірыдонава «Ашмянскі павет у канцы XVI стт. (I, 268) бачым тым часам *Ашмяна*. Як вядома, націск тут падае на апошні склад, таму больш адпаведным мясцовому і гістарычнаму вымаўленню быў бы адмецніх *Ашмяна* (< літ. *Ašmena*; традыцыйная беларуская форма дакладна паўтарае літоўскую).

У афармленні артыкулаў выяўляецца непаслядоўнасць: у адным выпадку загаловачным словам выступае «старое» – *Гародня*, а ў другім «новае» – *Ашмяны*, а не *Гродна* і *Ашмяны*, або *Городна* і *Ашмяна*. Перш, «карэктны», варыянт вымагаў бы тады пачынаць і «літоўскія» артыкулы формамі *Вілкавішкіс* і *Вільнюс*, а не *Ваўкавышкі* і *Вільня*. Маем *Берасце*, але *Вілейка*, чамусь *Вендэн*, але *Вэвіс* (I, 619), хоць паводле аўтэнтычнага вымаўлення мела б быць *Вевіс* і *Вэндэн*.

няруская, тэрыторыя займала 80 % дзяржавы. У сярэдзіне XIV ст. гэтыя землі разам складалі 38 % княства («палітычная Літва»), прычым балцкая частка дзяржавы складала менш за траціну ад агульнага яе абшару. Доля палітычнай і этнічнай Літвы няўхільна змяншалася. Прыкладам, у 20-я гг. XV ст. сучасная Літва займала 10 % ВКЛ, Беларусь – 30 % (у этнаграфічных межах XIX ст. – 38 %). Да пачатку XVI ст. на «Літву» прыпадала 14 %, на «Беларусь» – 45 %, у часы Рэчы Паспалітай – адпаведна 23 % і 77 %.

Зрэшты, вывады з гэтага можна рабіць толькі супастаўляючы гэтыя лічбы са звесткамі пра дэмаграфічную, эканамічную долю таго або іншага рэгіёну ў дзяржаве, палітычную ролю розных класаў і этнічных групаў. Некаторыя з гэтых пытанняў асвятляюцца яшчэ ў адным Насевічавым артыкуле – «Дэмаграфія, заселенасць».

Аналіз праблемы народаў і моваў ВКЛ зрабіў Уладзімір Свяжынскі. Разгляд этнічнай карты Беларусі і Літвы перыяду ўтварэння ВКЛ аўтар справядліва пачынае з ятвягаў, як найбольшага балцкага племя, што ўлілося ў склад беларускага этнасу на тэрыторыі, дзе паўставала княства. Беларускі навуковец салідарызуецца з літоўскім калегам Зігмасам Зінькявічусам: *«размежаванне літ. і слав. арэалаў у ранні час існавання ВКЛ з-за складанай моўнай сітуацыі – даволі цяжкая задача: «усходняя мяжа тэрыторыі літоўскай мовы вельмі няясная»*. Паводле Ігара Чаквіна, старабеларуская мова была *«афіцыйнай дзярж. мовай ВКЛ»* (I, 303), выконваючы ролю сродка камунікацыі між поліэтнічным насельніцтвам дзяржавы. Аб такой ролі г. зв. старабеларускай мовы можна разважаць з пэўнымі агаворкамі, бо дыскусія на гэтую тэму працягваецца. Функцыянаванне рускай (не расейскай) мовы ў ВКЛ адбывалася паралельна з іншымі «мовамі культуры» – лацінаю, польскаю, нямецкаю, не кажучы ўжо пра гаворкі простага люду, у т. л. літоўскую[8]. Сцверджанне ў артыкуле «Народы і мовы», што *«пачынаючы з 15 ст. носьбіты польскіх гаворак трыма міграцыйнымі патокамі перасяляліся на Палессе»* (I, 63) нагадвае старыя тэорыі аб польскай каланізацыі Літвы і Беларусі, што мусілі былі вытлумачыць прысутнасць тут значнай польскай меншасці. Цяпер ужо не выклікае сумнення,

што тутэйшыя палякі – гэта пераважна рэлігійная супольнасць.

У энцыклапедыі бракуе артыкула «Балты», да якога была б дарэчнаю і карта, што дала б магчымасць супаставіць граніцы рассялення даўніх балтаў у Беларусі і Літве і дазволіла б зрабіць выснову пра заканамернасць пашырэння літоўскай улады над значнымі абшарамі даўняй Русі, якая, у сваю чаргу, улучала вялікую частку старой Балтыі.

Надта «лёгкім» выйшаў у В. Пазднякова артыкул «Гуды» (I, 560), пры напісанні якога праігнараваныя некаторыя падставовыя работы, прысвечаныя гэтаму этноніму[9]. Аўтар мяркуе, што гуды паходзяць ад готаў, між тым сёння ёсць сур'ёзныя падставы бачыць вытокі гудаў на ўласна балцкай тэрыторыі, у т. л. на землях Беларусі, што паспрабаваў давесці літоўскі лінгвіст Сімас Каралюнас[10].

У раздзеле «Шляхта» артыкула «Саслоўная структура» не выклікае даверу сцверджанне, што на пачатку XVI ст. *«сярэднія і дробныя феадалы бел. паходжання складалі 80 % усіх феадалаў, 19 % – літ. паходжання»* (I, 73). Якія феадалы «хаваюцца» за «страчаным» 1 %, што маецца на ўвазе пад «беларускімі» і «літоўскімі» арыстакратамі – склад іх крыві, тэрыторыя пражывання, уласныя сведчанні пра родную мову і нацыянальнасць? Попіс войска ВКЛ 1528 г., на які спасылаецца яго аўтар, дазваляе канстатаваць намнога большую вагу літоўскіх феадалаў (хаця б паводле прозвішчаў). Даследаванні польскіх гісторыкаў, між іншага Яна Якубоўскага і Генрыка Лаўмянскага, сведчаць пра большую шчыльнасць, а адпаведна і колькасць насельніцтва ў этнічнай Літве ва ўказаны перыяд. Колькасць коней, якіх выстаўляла літоўская шляхта ў параўнанні з рускаю, складала больш за 60 % ад агульнага ліку[11]. Дзеля таго, што беларускія даследнікі схільныя даваць лічбы адваротныя, праблема як быццам дагэтуль застаецца неразвязанай, прынамсі, што да айчыннай гістарыяграфіі[12].

Раздзел «Харчаванне» ў артыкуле «Матэрыяльныя ўмовы жыцця», напісаны Алесем Белым, паказвае, што можна гаварыць пра існаванне адзінай беларуска-літоўскай кухні з яе рэгіянальнымі адметнасцямі, шчыльна звязанай супольнымі традыцыямі з польскай кулінарыяй (асабліва з XVI ст.; на жаль,

пра традыцыі харчавання ранейшага часу ў пісьмовых крыніцах захавалася вельмі мала звестак, таму тэма разглядаецца пераважна ў храналагічных межах, што адпавядаюць часу існавання Рэчы Паспалітай).

Ірына Махоўская не здолела выявіць рэгіянальных адрозненняў у адзенні насельніцтва даўняй Літвы, прынамсі яна нічога не піша аб іх у адпаведным раздзеле артыкула «Матэрыяльныя ўмовы жыцця». Што да іншых сфераў мастацтва, то і тут аўтары засталіся пераважна ў нацыянальнай шкарлупіне (параўн. раздзелы артыкула «Мастацтва»: I, 136–151; аналагічная сітуацыя ў артыкулах слоўнікавай часткі ЭВКЛ, прысвечаных «глабальным тэмам»: «Адраджэнне», «Асветніцтва», «Барока» ды інш.).

Шмат карыснай інфармацыі дае агляд «Крыніцы гісторыі». Толькі насуперак сцверджанню яго аўтара (I, 155) сучаснае навуковае выданне Першага Літоўскага Статуту выйшла не адным томам заміж запланаваных пяці, а ў двух тамах (трох кнігах (частках)) у Вільні ў 1983, 1985 і 1991 гг. (праект не завершаны), а пасля і аднатомнікам у 2001 і 2004 гг.[13]. Шкада, што няма ў аглядзе згадкі пра адзін з найважнейшых зборнікаў дакументаў –

«Chartularium Lithuaniae res gestas magni ducis Gedeminne illustrans = Gedimino laiškai» (Вільня, 2003 г.), хоць згадваецца ранейшая аналагічная публікацыя – «Gedimino laiškai = Послания Гедимина» (Вільня, 1966 г.) (I, 158), а на «Chartularium...» у артыкуле «Гедзімін» спасылаецца В. Насевіч (I, 520). Рэдактар В. Пазднякоў заявіў у прыватнай размове, што аўтарскія тэксты мінімальна падганяліся адзін да аднаго, а між тым узгадненне розных пазіцый і выпрацоўванне методыкі «згладжвання» відавочных супярэчнасцяў і недапрацовак дазволіла б узняць ЭВКЛ на вышэйшы ровень.

Здаецца, нашы навукоўцы ўсведамляюць многія праблемы. Як адзначаюць той жа г. Галенчанка і Ю. Бохан у артыкуле «Гістарыяграфія», *«развіццю бел. гістарыяграфіі ВКЛ*

перашкаджае адсутнасць моцных гістарыяграфічных традыцый, нераспрацаванасць шмат якіх сфер і кірункаў айчыннай гісторыі (...), *распаўсюджанасць спрошчаных гістарыяграфічных стэрэатыпаў і міфалагем у значнай частцы навук.-папулярнай літаратуры і падручнікаў»* (I, 193). Пра творчасць М. Ермаловіча гаворыцца: *«шмат якія аспекты яго прац заслугоўваюць увагі», але «яго канцэпцыя мае гіпатэтычны характар»*, канцэпцыя ж А. Краўцэвіча *«патрабуе дадатковага абгрунтавання»*, а што да пачаткаў ВКЛ, то *«больш рэалістычная выснова выкладзена ў працы Насевіча»*[14] (I, 175). (Гістарыяграфічны агляд ЭВКЛ, дарэчы, толькі фрагментарна ахоплівае работы небеларускіх аўтараў. Да таго ж сёння ў Літве актыўна перавыдаюцца крыніцы нацыянальнай гісторыі ў арыгінале і ў перакладзе на літоўскую мову, у гэтым плане Беларусь аказваецца на інтэлектуальнай перыферыі, нягледзячы на некаторыя станоўчыя выняткі[15].)

Калі Сямён Падокшын піша ў артыкуле «Адраджэнне» пра *«станаўленне нацыянальных (бел., укр. і літ.) культур у складзе поліэтнічнай і рознарэлігійнай інтэграванай дзяржавы ва ўмовах незавершанага працэсу нац. дыферэнцыяцыі бел., укр. і літ. народаў»* (I, 207), можна толькі здагадвацца, што хацеў ён сказаць. Як маглі афармляцца нацыянальныя культуры ў варунках незавершанага нацыягенезу, і агулам – ці маглі ў той час адбывацца хоць якія *нацыянальныя* працэсы, калі такая з'ява, як мадэрная нацыя, народзіцца толькі ў канцы XVIII ст.? Ці ведае аўтар розніцу між паняццямі *нацыя, народ, люд*? Гэта пытанне не да аднаго с. Падокшына. Ці мог «асветнік» Міхал Клеафас Агінскі, як цвердзіць Вячаслаў Шалькевіч, *«прапаноўваць» «ідэю адраджэння бел. дзяржаўнасці, страчанай у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай»* (I, 257)? Ці ведаў М. К. Агінскі пра такую дзяржаву, як *Беларусь*, ці мог ён яе хаця б сніць?..

Энцыклапедыя ВКЛ – гэта ўсё ж найперш унутраны беларускі праект, нягледзячы на ўдзел некаторых гісторыкаў з-за мяжы. Гэта беларускі погляд на Княства з усімі ўласцівымі яму супярэчнасцямі. Нічога заганнага ў гэтым няма. Але ёсць сэнс думаць над стварэннем усеагульнай энцыклапедыі пра ВКЛ – з рэальным удзелам гісторыкаў усіх краін-спадкаемцаў спадчыны даўняй Літвы, з міжнароднай рэдкалегіяй.

І ўсё ж, ЭВКЛ, бадай, – першая спроба ў беларускай

гістарычнай навуцы разгляду гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ў яго поўных граніцах, а не толькі на беларускім, хай сабе і «цэнтральным» «лапіку»[16]. Праз энцыклапедыю беларускі чытач упершыню можа ўявіць сябе адным з мільёнаў спадкаемцаў культурнай і гістарычнай традыцыі *ўсяго* ВКЛ, адчуць сябе «сваім» не толькі ў Вільні, але і ў Коўне, і ў Луцку. Чаго варта «адкрыццё» для беларусаў замка Радзівілаў у валынскай Алыцы (Олика) або ў літоўскіх Біржах (Biržai) – не менш уражвальных за нясвіжскі (I, 220–221, 332).

А пакуль ёсць надзея, што беларускія гісторыкі зробяць усё, каб «уз'яднаць» часткі колішняга цэлага – Вялікага Княства – у жывы арганізм і разбіць тыя стэрэатыпы, што ўскладняюць дачыненні найперш між літоўцамі і беларусамі.

Сяргей Дубавец параўнаў ВКЛ з іржаваю калошаю, што адляжала на дне свае чыгунныя бакі: *«Яна зноў хоча быць Залатым Караблём, усплысці з водаў зіхоткім еўрапейскім фрэгатам, абсыпаным зорамі»*[17]. ЭВКЛ падняла залаты карабель нашай гісторыі яшчэ вышэй з глыбіняў, бліжэй да паверхні, дзе шумяць хвалі нашага сённяшняга жыцця. Паглядзім, ці стануць яго ветразі для нас добрым арыенцірам на даляглядзе.

[image]

[image]

Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/29

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image]-[image]2006

рэцэнзіі

ада Зыкатук

ана Зыкатук • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • **рэцэнзіі**

[image] [image] [image]

Сяргей Шыдлоўскі

Больш, чым горад

Полацк. Фотаальбом / Аўтар-укладальнік Іван Каліноўскі, фота Эрнста Цецярэўскага. – Менск: Беларусь, 2004.

Рэспубліка Беларусь паўстала дзякуючы двум тэкстам: мастацкаму («Шляхціцу Завальні» Яна Баршчэўскага) ды юрыдычнаму – «Дэклярацыі аб Незалежнасьці».

Пераход пасавецкага грамадзтва ад засваеньня гэтай тэкставай прасторы да асвойваньня прыроднага й соцыякультурнага ляндшафту новай незалежнай краіны адбываецца паволі. Як вынік, звыклымі геакультурнымі асацыяцыямі ў нашага суайчыньніка застаюцца наступныя ланцужкі: помнік архітэктуры – Крэмль, вежа – Астанкінская, дрэва – бяроза... Беларус – пан сахі і касы.

Разрыў паміж Беларусьсю, вядомай нам з паэтычна-ўзьнёслай рыторыкі папулярызатараў гісторыі, і Беларусьсю, бачнай за фіранкай экскурсійнага аўтобуса, уражвае. Мы ўжо ўмеем расказваць, але яшчэ не даём рады выгодна паказаць сябе. Беларуская ідэя паўстае ў бляску міталёгіі й нішчымнасьці іканаграфіі. Гэта Беларусь кніжная, Беларусь кніжнікаў.

Заклік «Тутэйшых» у 80-х мінулага стагодзьдзя да стварэньня

папулярнага беларускамоўнага чытва сёньня варта было б перафармуляваць: кожнай вёсцы – па ўласнаму фотаальбому. Выдавайма паштоўкі зь беларускімі краявідамі, каб ня ўмёрлі. Візуалізацыя паэтычных нацыянальных сымбаляў, ідэалу незалежнай эўрапейскай краіны – актуальная праграма дзеяньня для айчыннай індустрыі турызму ды маскультуры. Зямля пад белымі крыламі чакае кваліфікаваных у пытаньнях культуры ўласнай краіны вандроўнікаў з фатакамэрамі, балазе сучасная лічбавая тэхніка падобнае паломніцтва дужа спрашчае.

Полацку ў пэўнай ступені тут пашэнціла больш. Сафійскі сабор ды Барысаў камень даўно сталі айчыннымі эквівалентамі Эйфэлевай вежы, прэзэнтуючы ў сьвеце беларускі стыль. Але побытавая культурная прастора гораду засталася ў засені манумэнтаў. Полацку, як сыстэме самабытных лёкусаў, яшчэ належыць у будучыні быць ня толькі асэнсаваным, але й «абжытым» уласнабеларускай навуковай ды мастацкай думкай.

Фотаальбом Івана Каліноўскага й Эрнста Цецярэўскага «Полацак», што выйшаў у выдавецтве «Беларусь» у 2004 годзе накладам 3000 асобнікаў, прадстаўляе новы фармат гэтага старажытнага места.

На фатаздымках паўстае горад-загадка, горад-містэрыя, які шмат бачыў, шмат ведае, але не сьпяшаецца выдаваць свае таямніцы. Горад як інтэлектуальная прыгода, картаграфія якога падначалена ня столькі законам горадабудаўніцтва, колькі інтрыгам і фантазіям гісторыі.

Імпануе ракурс, у якім паўстаюць гарадзкія краявіды, сьцёртыя ад шматлікага тыражаваньня на паштовых марках, значках ды паштоўках і цяпер нібыта рэстаўраваныя фатографам. Падобны эфэкт ствараецца не ў апошнюю чаргу дзякуючы адмысловай падсьветцы на фатаздымках, крыніца якой знаходзіцца долу, нібыта сьвет ідзе з самой зямлі, полацкай зямлі, з глыбіні яе вякоў.

У альбоме не сустрэнеш эпатажу ці экзотыкі – маргінальнага, андэграўнднага Полацку. Гэта парадны партрэт гораду, першай сталіцы беларускай дзяржавы, і дадзены жанр вытрыманы

аўтарамі кнігі прафэсійна-бездакорна. Адпаведна, няма на яе старонках і стамляючай эрудыцыі. Горад паказаны ў межах, калі можна так сказаць, школьнай праграмы, яго прэзэнтуюць хрэстаматыйныя аб'екты, якія лёгка апазнаюцца сярэднім абывацелем: гэта культавыя пабудовы, помнікі вялікім землякам… Клясычны стыль места акцэнтаваны зьмешчанымі ў кнізе старымі паштоўкамі з калекцыі Вячкі Целеша.

Сучасныя культурныя актуаліі прадстаўлены факультатыўна – няма выяваў камня ТВЛ, дуба Ластоўскага… Магчыма, тэхналягічныя абмежаваньні выхаду кнігі не дазваляюць пасьпяваць за дынамічнымі тэмпамі зьменаў культурных краявідаў сучаснага Полацку. Цяжка закінуць аўтарам фотаальбому ідэалягічную ці канфэсійную заангажаванасьць – на старонках кнігі прысутнічаюць праваслаўныя, каталіцкія ды ўніяцкія сьвятыні, хрысьціянскія й язычніцкія помнікі, крыжы й камяні.

Упрыгожваюць кнігу панарамныя здымкі. Вока сягае далёка за межы гораду, да ляснога далягляду, усьлед дзьвінскай плыні. І гэта сымбалічна – Полацак заўжды быў больш, чым толькі горад, маркуючы сваім іменем прастору ад Смаленску да Рыгі.

Краязнаўцы з нагоды разбурэньня ў горадзе камяніц сярэдзіны мінулага стагодзьдзя наракаюць, што выгляд Полацку амаль цалкам зьмяняецца на працягу жыцьця аднаго пакаленьня. Мяркую, аўтары фотаальбому ўсё ж патрапілі паказаць тое, што нязьменна ў прыродзе Полацку – яго веліч, узяўшы ў сьведкі непадуладнае руйнаваньню – неба, Дзьвіну, бель сьнегу на стрэхах полацкіх дамкоў.

***

Вы з правінцыі й толькі нядаўна прыехалі ў старажытную крывіцкую сталіцу? Шукаеце правадніка па месцах моцы, пунктаў таго-дзе-адбываецца? Адкладзіце кнігу ўбок. Вамі ніколі не патрапіць у Полацак такім чынам, зрэшты, як і ня ўбачыць Вільні. Чакайце, горад прыйдзе ў вашыя сны – і вы самі станеце тады месцам-дзе-адбываецца-Полацак.
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/29
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1,2 (41,42) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1,2[image]-[image]2006

рэцэнзіі

"аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • **рэцэнзіі**

[image] [image] [image]

Францішак Корзун Скразная лёгіка бабкоўскага будызму

ФРАНЦІШАК КОРЗУН нарадзіўся ў 1974 годзе ў Менску. Скончыў факультэт філязофіі ЭГУ (аддзяленьне культуралёгіі). Вучыцца ў магістратуры ЭГУ ў Вільні. У кола яго навуковых інтарэсаў уваходзяць таталітарная культура, культурфілязофія і праблематыка самавызначэньня інтэлектуала ў кантэксьце таталітарызму (на

Бабкоў, Ігар. *Каралеўства Беларусь. Вытлумачэньні ру[і]наў.* – Менск: Логвінаў, 2005. – 142 с.

«Каралеўства Беларусь. Вытлумачэньні ру[і]наў» – новая кніга Ігара Бабкова. Дарма што ўсе тэксты ў ёй ужо публікаваныя ў беларускай пэрыёдыцы (у тым ліку і ў «ARCHE»), некаторыя яшчэ на пачатку дзевяностых, яна сапраўды новая. Бо сабраныя пад адной вокладкай бабкоўскія тэксты дапаўняюць адзін аднаго, але не зьліваюцца разам, застаючыся асобнымі фрагмэнтамі аўтарскай думкі (што, у прынцыпе, лягічна для колішняга рэдактара часопісу пад назвай «Фрагмэнты»). Калі правесьці аналёгію з музыкай, то «Каралеўства Беларусь. Вытлумачэньні ру[і]наў» – гэта не сымфонія, дзе кожная частка зьяўляецца працягам папярэдняй, а, хутчэй, сюіта, фрагмэнты якой, будучы аб’яднаныя супольнай ідэяй ці настроем, захоўваюць сваю аўтаномнасьць. Адсюль інтанацыйная няроўнасьць кнігі: у тканіну ціхіх сузіраньняў і блуканьняў нечакана рэзка ўрываюцца вострапалемічныя «Лісты пра сучасную літаратуру» і «Пра адраджэньне», а культуралягічная аналітыка другога разьдзелу кнігі («Украіна – Беларусь:

падарожжа на край», «Сярэдняя Эўропа: новая мадэрнасць», «Этыка памежжа: транскультурнасць як беларускі досвед» і інш.) урэшце рассыпаецца на апошніх старонках эсэ ў чатыры фрагмэнтамі «Катакомбаў cogito» і «Цывілізацыі захаду будызму».

Сабраныя пад адной вокладкай, тэксты «Вытлумачэньняў…» дазваляюць прасачыць скразную лёгіку, што знутры аб'ядноўвае бабкоўскія фрагмэнты, і яскрава выяўляюць характар аўтарскага філязафаваньня, які захоўваецца нават у палемічных артыкулах. Ён не акадэмічны філёзаф і ня любіць тых, хто адчувае сябе «ў сытуацыі канторы (…), дзе яны пасьпяхова імітуюць працэс мысьленьня, складаючы плянавыя тэмы ды хаваючы іх у сэйфы пасьля зацьверджаньня» (с. 37–38). Але дыстанцыяваньне ад філязофскае «канторы» не перашкаджае яму быць прафэсіяналам высокае клясы, які валодае філязофскім рамяством у такой ступені, што можа тварыць паводле правілаў, ня думаючы аб правілах (У. Эка), умее працаваць з усёй эўрапейскай філязофскай традыцыяй ад Плятона да посткаляніяльных стратэгіяў, сплаўляючы пад адной вокладкай Беларусь і Космас і ведучы дыялёг то з Борхэсам, то зь Мінкіным.

Не адносіцца ён і да шоўмэнаў накшталт некаторых «левых крытычных інтэлектуалаў», якія робяць зь філязофіі бізнэс, нажываючы такім чынам сымбалічны і фінансавы капітал. Гэта не перашкаджае яму быць аўтарам некалькіх пасьпяховых інтэлектуальных праектаў.

У пэўным сэнсе Бабкоў зьяўляецца спадкаемцам таго тыпу эўрапейскага кантынэнтальнага філёзафа, які выпрацавала першая палова XX ст.: сацыяльна актыўны інтэлектуал, якога можна ўбачыць і на ўнівэрсытэцкім сэмінары, і на палітычным мітынгу, які ў перапынках паміж палемічнымі артыкуламі на актуальныя тэмы можа выдаць раман ці зборнік вершаў, потым зноў кідаецца ў бой, а пасьля раптам паглыбляецца ў мэтафізыку і піша эсэістычныя «Urfragen», «Journal Métaphysique» або «Поющее сердце». Тыя інтэлектуалы былі, як правіла, палітычна ангажаваныя, але сёньня тая ангажаванасьць канчаткова сышла ў партыйную палітыку,

пакінуўшы філязофскае поле, або ў той жа квазіфілязофскі шоў-бізнэс, ператварыўшыся ў самаімітацыю. Філязофіі ў спадчыну ад тых інтэлектуалаў засталася здольнасьць спалучаць мэтафізычны досьвед з актуальнасьцю «тут-і-цяпер» (альбо, як сказаў бы Карл Барт, «Сьвятое Пісаньне зь сьвежай газэтай»). Бабкоў бярэ на ўзбраеньне гэтую здольнасьць, адмаўляючыся пры гэтым ад волі да ўлады (ці трэба нагадваць, што атрымалася з заклікаў Маркса перарабіць сацыяльны сьвет паводле філязофскіх схемаў, або з памкненьняў Гайдэгера рэалізаваць філязофскую праграму ў якасьці палітычнай?). Ён становіцца самотным сузіральнікам, які «мэлянхалічна блукае сярод аскепкаў, фрагмэнтаў і руінаў, шукаючы ў іх тое, што яны самі ўжо даўно ня памятаюць – безуладзьдзе».

Гэтае сузіральніцтва сам Бабкоў называе будызмам, але гэта, зразумела, толькі мэтафара (сам жа прызнаецца: «Пра будызм я нічога ня ведаю» (с. 137). Пад такім «будызмам» можа падпісацца і хрысьціянін.

* * *

Вынесеныя ў загаловак кнігі «руіны» – галоўная канцэптуальная мэтафара. Руіны – гэта вынік фрагмэнтацыі культурнай прасторы пасьля шматлікіх культурных разрываў і катастрофаў:

Тая культурная прастора, сярод якой мы фатальна сябе знаходзім, нагадвае паверхню-палімпсэст, на якой пэрыядычна пакідае свае сьведчаньні Ўлада.

Улада падвойваецца і патройваецца, разнастайныя ўлады сутыкаюцца на прасторы культуры, спрабуючы прыўлашчыць паверхню, руйнуючы, перапісваючы, пакідаючы сьляды сваёй чыннасьці.

Назавём посткаляніяльным той складаны культурны ляндшафт, што ўтвараецца на скрыжаваньні чыннасьці разнастайнай улады ды знаходзіць сябе ў форме фрагмэнтаў

альбо руінаў

(с. 8–9).

І так, стан беларускае культурнае прасторы ў сёньняшнім «тут-і-цяпер» – гэта руіны.

Руіны не патрабуюць ні крытыкі, ні апалягетыкі. Яны патрабуюць прачытаньня і асэнсаваньня. Праз вытлумачэньне руінаў ажыццяўляецца набыццё традыцыі.

Інструмэнтаром для вытлумачэньня становіцца мэтадалягічны апарат посткаляніяльных штудыяў. У адрозьненьне ад каляніялізму і антыкаляніялізму, посткаляніялізм ня ставіць сваёй мэтай ні культурную гамагенізацыю і дамінацыю, ні супраціў. Ён арыентаваны на пошук мэтамовы, з дапамогай якой можна было б шукаць шляхі рэальнага набыцьця ўласнай культурнай традыцыі, выкарыстоўваючы, у тым ліку, і каляніяльную спадчыну.

«РУІНЫ: НАМ ЛЁС ПАДАРЫЎ ГЭТЫ ДОСЬВЕД, І МЫ МУСІМ СПРАЎДЗІЦЬ ЯГО ДАРЭШТЫ. САМАЕ НЯЎДЗЯЧНАЕ – НАРАКАЦЬ. НА БЕЛАРУСІ, НА ГЭТАЙ САКРАЛЬНАЙ ПРАСТОРЫ, МЫ МУСІМ ГЛЯДЗЕЦЬ У ВОЧЫ РУІНАМ – САМІМ САБЕ» (с. 22).

* * *

Такім чынам Бабкоў у другой частцы кнігі «Партызаны і мэнэджары» пераходзіць ад мэтафары руінаў да ўласна канцэптаў, што характарызуюць сучасную беларускую культурную сытуацыю: Сярэдняя Эўропа, памежжа, транскультурнасьць.

Сярэдняя Эўропа знаходзіць сябе ў палоне, у разрыве між цэнтраімклівымі й цэнтрабежнымі тэндэнцыямі: г. зн., між магутнымі дыскурсамі нармалізацыі (вэстэрнізацыі) і памкненьнем да ўнікальнай, аніякім унівэрсалізмам не абгрунтаванай аўтэнтычнасьці. Сама культурная топіка й

культурная рытміка пэрыфэрыі вызначаецца гэтым разрывам (с. 90).

Таму Беларусь (як і ўся Сярэдняя Эўропа) увесь час вызначае і асэнсоўвае сябе праз адсылку да Іншых, пад уплывамі якіх знаходзіцца (паміж Расеяй і Захадам, паміж праваслаўем і каталіцтвам, паміж індывідуалісцкай і калектывісцкай традыцыямі і г. д.).

…памежжа – гэта прастора, прылеглая да мяжы, злучаная і зьнітаваная мяжой, прастора, для якой менавіта мяжа ёсьць арганізуючым прынцыпам, сутнасьцю і цэнтрам прыцягненьня. Памежжа разьлягаецца паабапал мяжы, і ягоны тапалягічны статус парадаксальны: памежжа набывае пэўную цэльнасьць праз факт уласнай падзеленасьці, г. зн. праз дынамічную падзею разьмежаваньня, сустрэчы і пераходу Свайго і Чужога, альбо Аднаго і Іншага (с. 110).

Адсюль сам працэс фармаваньня культурнай ідэнтычнасьці задаецца і вызначаецца дынамікай гэтых сутыкненьняў, выключаючы магчымасьць канструяваньня статычнай ідэнтычнасьці паводле гамагенізатарскай формулы «Я = Я» (якая, дарэчы, не была зьдзейсьненая рэальна нідзе і ніколі). Адсюль панятак транскультурнасьці.

У дачыненьні да культуры гэта можа значыць безьліч усялякіх рэчаў: функцыянаваньне знакаў, паўсталых у адной культуры, – у іншай культурнай прасторы, размаітыя практыкі пераходу культурных межаў, шматполюсную ідэнтычнасьць, якая апэлюе да розных культурных традыцыяў, самі традыцыі, якія складаюцца з гетэрагенных, а часам і ўзаемавыключальных элемэнтаў і г. д. (с. 114).

Транскультурная традыцыя – гэта традыцыя, якая складаецца з фрагмэнтаў, народжаных у розных этнічных, моўных, мэнтальных, рэлігійных, палітычных кантэкстах, належыць адначасова да некалькіх нацыянальных традыцыяў. Такая

традыцыя можа быць зразуметая толькі ўва ўласнай гетэрагеннасьці.

* * *

«Каб убачыць, ці высока ўздымаюцца вежы ў горадзе, трэба выйсьці з гораду» (Ніцшэ). Каб «схапіць» гетэрагенную Беларусь у яе цэльнасьці, трэба выйсьці за межы звыклых інтэлектуальных схемаў, асабістых густаў і групавых інтарэсаў (прынамсі, настолькі, наколькі гэта магчыма). Адсюль вынікае пазыцыя аўтара, пра якую ўжо крыху гаварылася вышэй: не заканадаўца ідэяў, а сузіральнік, зьбіральнік, каталягізатар і інтэрпрэтатар культурнай рэальнасьці. Альбо, як ён сам сябе называе, скрыптар.

Скрыптар – гэта цела, якое піша. Гэта месьцішча ўнікалітэту, канкрэтнага «Я», душы, фантазмаў, сьвядомасьці і неўсьвядомленага (с. 78).

Гэтым абумоўленыя своеасаблівыя дачыненьні аўтара з сфэраю палітыкі.

«Усё ў сучасным сьвеце ёсьць палітыкай». На працягу апошніх ста гадоў гэтую тэзу ў розных варыяцыях паўтаралі многія палітычна ангажаваныя інтэлектуалы – ад Шпэнглера справа да Сартра і Альцюсэра зьлева. У гэтым праяўляецца той супольны для сучаснасьці дух волі да ўлады, пра які пісаў яшчэ Ніцшэ.

Палітыка не зьяўляецца прадметам разваг Бабкова. Але ў посткаляніяльнай краіне з дыктатарскім рэжымам, якая да таго ж знаходзіцца пад моцным уплывам былой мэтраполіі, культура не свабодная ад уладных дачыненьняў.

Гэта значыць, што за любымі франтальнымі зьменамі культурнай прасторы, як бы натуральна гэтыя зьмены ні выглядалі, стаіць фэномэн улады (с. 120).

Бабкоў дае нам гэта зразумець, але далей тэму палітыкі не разьвівае. Бо разважаньні неангажаванага інтэлектуала пра палітыку самім палітыкам нецікавыя. Ім патрэбны ідэолягі, а ня тыя, хто «адважваецца *запытацца аб праўдзе*» (с. 103). Апошнім застаецца партызанка.

Партызан вонкава нябачны. Пра яго ніхто ніколі нічога дакладна ня ведае. Ён дасканала карыстаецца мімікрыяй (посткаляніяльнай стратэгіяй аўтарства Гомі Бгабгі), што дазваляе яму адаптавацца ня толькі да традыцыйнага вясковага ляндшафту, існаваць у густых бэтонных пушчах беларускай мадэрнасьці, але й выжываць у прасторы сучаснай спажывецкай постмадэрнасьці (с. 72).

А цікава было б прааналізаваць палітыку ў транскультурнай краіне з пазыцыі самотнага скрыптара. Асабліва, калі ўлічыць, што апазыцыя, адмовіўшыся ад вычарпанага ў сучасных умовах гамагенізатарскага праекту «Нацыянальная ідэя», ніякага іншага ня мае ўвогуле. Затое той вычарпаны праект узяла на ўзбраеньне ўлада, элегантна ператварыўшы «нацыянальную ідэю» ў «идеологию белорусской государственности».

Але гэта, магчыма, зробіць хтосьці іншы.

«Усю каву мы вып'ем самі й дапішам прозу Ігара Бабкова» (Алег Дзярновіч).
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1,2 (41,42) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/03/29
[image]